З ГІСТОРЫЯЙ НА «ВЫ»

ТОДАР БЕЛАРУСКІ
Нашая прамова
на Агульным зьезьдзе
Задзіночаных Нацыяў

ПРЫСУТНЫ
Першы Сусьветны зьезд
беларускае эміграцыі

Д. ЯСЬКО
Новы Запавет
у беларускай мове

СТАНІСЛАЎ СТАНКЕВІЧ
У новых краёх —
новыя заданьні

ЯЗЭП КАРАНЕЎСКІ
Распачынаючы
новы этап

ЯЗЭП КАРАНЕЎСКІ
Чаму нас не разумее
Захад?

ЯЗЭП МЕНСКІ
На загад нацыі

ЮРКА ВІЦЬБІЧ
Мы дойдзем!

СТАНІСЛАЎ СТАНКЕВІЧ
Сны «аб вясьне
прыгожай і далёкай».
Канстанцыя Буйла —
новая ахвяра
бальшавіцкай крытыкі

НАТАЛЬЛЯ
АРСЕНЬНЕВА
У казахстанскай ссылцы

ЛЯВОН РЫДЛЕЎСКІ
З жыцьця й дзейнасьці
М. Абрамчыка

АЛЕСЬ КАРПОВІЧ
Мікола Равенскі

АЛЕСЬ КАРПОВІЧ
Памяці
Міколы Равенскага

ПЁТРА СЫЧ
Замоўкла ліра

ЯЗЭП МЕНСКІ
Язэп Лёсік

ЯНКА СТАНКЕВІЧ
Вацлаў Ластоўскі

ЮРКА ВІЦЬБІЧ
У пошуках
Альгердавага шляху

УЛАДЗІМЕР СЯДУРА
Пётра Міранович

Н. ПАЛОНСКАЯ-
ВАСІЛЕНКА
Даўнар-Запольскі

КВЕТКА ВІТАН
«Наша Ніва»
і Іван Луцкевіч

ФРАНЦІШАК КУШАЛЬ
Сорак два гады таму

А. ЭССОН
Мае ўспаміны
аб Алесю Прушынскім

ЛЕЎ АКІНШЭВІЧ
Парлямэнт
беларускай зямлі

ЛЕЎ АКІНШЭВІЧ
Пра «цывілізацыйныя
асновы» беларускага
гістарычнага працэсу

МІКОЛА КУЛІКОВІЧ
Беларуская музыка

ІГНАТ ДВАРЧАНІН
Беларусы
на Праскім Унівэрсытэце

Р. СКЛЮТ
Зь «яснай явы» —
у «ночнае царства»

АНТОН АДАМОВІЧ
Заходняфронтаўскі
бальшавізм і беларускі
нацыянальны рух

СЫМОН БРАГА
Міцкевіч
і беларуская плынь
польскае літаратуры

ЯНКА ЗАПРУДНІК
Справа
аўтаноміі Беларусі
ў Першай Думе
і «Наша Ніва»

ЯНКА ЗАПРУДНІК
Дварянства
і беларуская мова

З ГІСТОРЫЯЙ НА «ВЫ»

Прарок Самуіл памазвае Давіда на царства.

Тытульны ліст Першай Кнігі царстваў,
выдадзенай Францішкам Скарынам у 1518 годзе.

Самуилъ Прⷪркъ Гⷭдень Помаза Двда Нацарⷭтво :~

Книги первый царьствъ починають
сѧ • з уполне выложены нарусь
кий ѧзыкъ • доктором франъци
скомъ, скорининымъ сыномъ
изъславнаго града полоцька • богу ко
чти, илюдемъ посполитымъ кнаучению :~

З ГІСТОРЫЯЙ НА «ВЫ»

АРТЫКУЛЫ
ДАКУМЕНТЫ
УСПАМІНЫ

Выпуск трэці

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1994

ББК 63.3(4Беи)62
З-11
УДК 325.2(476)(092)

Укладанне і ўводнае слова
Янкі Запрудніка

3250200000—094
З ——————— 134—94
М 302(03)—94

ISBN 5-340-01322-7

©Укладанне. Я. Запруднік, 1994

Макар Краўцоў

МЫ ВЫЙДЗЕМ ШЧЫЛЬНЫМІ РАДАМІ

Мы выйдзем шчыльнымі радамі
На вольны родны свой прастор.
Хай воля вечна будзе з намі,
А гвалту мы дамо адпор!

Няхай жыве магутны, сьмелы
Наш беларускі вольны дух;
Штандар наш бел-чырвона-белы
Пакрыў сабой народны рух.

На бой! За шчасьце і за волю
Народу слаўнага свайго!
Браты, цярпелі мы даволі...
На бой! — усе да аднаго!

Імя і сілу беларуса
Няхай пачуе й бачыць той,
Хто сьмее нам нясьці прымусы
І першы выкліча на бой.

Браты, да шчасьця мы падходзім:
Хай гром грыміць яшчэ мацней!
Ў крывавых муках мы народзім
Жыцьцё Рэспублікі сваей!

1919

УВОДНАЕ СЛОВА

Адкуль матар'ялы? Вы трымаеце ў руках кнігу, якая дасьць Вам уяўленьне пра беларускую палітычную эміграцыю, у асноўным, канца 1940-х — пачатку 1950-х гадоў: пра ідэялягічныя пагляды, палітычныя кірункі, арганізацыйныя праблемы. Матар'ялы гэтага зборніка ўзятыя з трох крыніцаў: тыднёвае газэты «Бацькаўшчына», якая пачала выходзіць у Заходняй Нямеччыне 31 кастрычніка 1947 г. і выдавалася там да 1966 году, ды з часапісаў «Запісы» і «Конадні» ньюёркскага Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва. Сем нумароў «Конадняў» выйшлі ў 1954—1963 гадах, а «Запісы» пачалі выходзіць у 1952 годзе ды выдаюцца й далей.

Характар эпохі. Другая палавіна 40-х — пачатак 50-х гадоў — гэта час гарту «халоднай вайны», зацятага ідэялягічнага змаганьня паміж дэмакратычным Захадам і камуністычным Усходам. Гэта час спадзяваньняў сярод эмігрантаў, што пэрыяд выгнаньня не зацягнецца надоўга, што нейкім чынам (якім канкрэтна, ніхто ня мог сказаць) удасца вярнуцца на вызваленую Бацькаўшчыну. У вялікай спрэчцы з камунізмам іншы раз гаварыў больш інстынкт, чымся розум. Але, можа, у інстынкце й хаваецца частка рацыянальнасьці, якая выяўляе сябе тады, калі не стае розуму, каб сфармуляваць і выказаць глыбейшыя пачуцьці.

Першы пэрыяд эміграцыі. Палітычны й рэлігійны падзел. Пэрыяд другой палавіны 40-х — пачатку 50-х гадоў быў часам арганізацыйных намаганьняў. Тысячы беларусаў апынуліся параскіданымі па трох акупацыйных зонах Заходняй Нямеччыны — амэрыканскай, брытанскай і французскай. Частка беларускіх выгнанцаў жыла па сваіх або іншанацыянальных лягерох для перамешчаных асобаў (ДП-лягеры), а частка па прыватных памешканьнях. Вялікі высілак быў пакладзены на тое, каб стварыць свае арганізацыі, прышчапіць моладзі нацыянальны сьветагляд, а пасьля, па выезьдзе з Эўропы — наладзіць грамадзка-культурнае жыцьцё ў краёх новага пасяленьня, устанавіць лучнасьць зь

У кнізе захоўваецца правапіс беларускіх эміграцыйных выданьняў. *(Рэд.)*

іншымі беларускімі асяродкамі, скаардынаваць нутраную і вонкавую дзейнасьць.

Не абыйшлося сярод эмігрантаў і бязь міжсобных канфліктаў на палітычнай ды рэлігійнай глебе. Па лініі палітычнай падзел прайшоў галоўна паміж г. зв. крывічамі, прыхільнікамі Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (на чале зь Міколам Абрамчыкам), ды г. зв. зарубежнікамі, прыхільнікамі Беларускай Цэнтральнай Рады (на чале з Радаславам Астроўскім). «Крывічы» падтрымлівалі адноўленую ў 1948 годзе Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву. «Зарубежнікі», іерархі якіх выракліся ўстаноўленай у Менску ў 1942 годзе аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы й перайшлі ў Расейскую Зарубежную Праваслаўную Царкву (адсюль і мянушка «зарубежнікі»), падаліся ў юрысдыкцыю Канстантынопальскага Патрыярха. У палітычным сэнсе «зарубежнікі» засталіся на незалежніцкай платформе Беларускай Цэнтральнай Рады.

Кожны з гэтых двух бакоў меў свае друкаваныя органы. Газэта «Бацькаўшчына» трымалася БНР-аўскага кірунку.

Эмігранцкія настроі. Апошнімі гадамі ў менскіх выданьнях пра паваенную эміграцыю пішацца часьцей і шырэй, але звычайна прадстаўляюць яе як масу людзей, прыдушаных настальгіяй. Прыкладам, анталёгія эмігранцкай паэзіі, выдадзеная ў Менску ў 1992 годзе, загалоўленая «Туга па Радзіме». Туга ў эмігрантаў, бясспрэчна, была, бо глыбінную існасьць Радзімы, як пра гэта сказаў яшчэ выгнанец Адам Міцкевіч, спазнае толькі той, хто Радзіму страціў. Туга — гэта адчуваньне страты. Але туга сама па сабе — пачуцьцё пасыўна-адмоўнае. Нармальны чалавек, калі ён жыве ўва ўмовах свабоды, не абмяжоўваецца да тугі. Туга стымулюе яго да дзеяньня, стаецца маторам — тым магутнейшым, чым глыбейшае пачуцьцё страты Бацькаўшчыны. Тужыць па Радзіме — гэта ня значыць упадаць у пэсымізм. Наадварот, гэта значыць дзеяць, жадаць павароту на родную зямлю, прагнуць свабоды для яе, намагацца й змагацца за вызваленьне ды верыць, што ўсё гэта прынясе жаданы плён. Туга, гэткім чынам, можа быць дынамічным стымулам пазытыўнага дзеяньня і аптымістычнай перакананасьці. Гэткай яна і была ў пераважнае бальшыні беларускіх паваенных эмігрантаў. Іншай яна не магла быць, бо альтэрнатыва — няволя з абразаю чалавечай і нацыянальнай годнасьці — была відавочнай.

Беларуская эміграцыйная публіцыстыка, з узорамі якое можна пазнаёміцца ў першай палавіне гэтага зборніка, адлюстроўвае якраз — у адваротнасьць ад некаторае лірыкі паэтаў-эмігрантаў — баёвыя настроі беларускае паваеннае дыяспары, паказвае на ейны стан перакананасьці ў сваёй праўдзе, гатовасьць да ўпартае працы й змаганьня ды на здаровае ў сваёй аснове разуменьне міжнароднага пала-

жэньня й дасканальнае веданьне прыроды бальшавізму. Вось, прыкладам, што пісала «Бацькаўшчына» на парозе 1949 году: «Мы ўступаем у яго (у Новы 1949.— *Я. З.*) моцныя духам і зь ніколі няслабнучай верай, што ў найгоршым навет выпадку будзе ён адным годам бліжэй да зьдзейсьненьня нашых агульнанацыянальных ідэяў. Гэтая вера ў нас тым большая, што мінулы, так багаты падзеямі год канчальна разьвеіў фальшывыя ілюзіі сярод сільных гэтага сьвету — заходніх дэмакратыяў аб тым, што з бальшавізмам можна яшчэ наладзіць прыязныя дачыненьні й жыць у згодзе. А гэта для нас найвялікшая зарука, што хвіліна перамогі праўды й справядлівасьці над сусьветным злом становіцца што раз бліжэйшай, а тым самым зьяўляецца бліжэйшым час вызваленьня з-пад гэтага зла беларускага народу й адбудовы ягонае дзяржаўнае незалежнасьці». (З Новым Годам! *Бацькаўшчына.* 1/45. 2.01.49)

Раньняе бачаньне цэласнасьці сьвету. Пасьля развалу савецкай імпэрыі й міжнароднага камунізму ад аналітыкаў можна часта пачуць, што адным з важных фактараў гэтага развалу была рэвалюцыя ў сродках сувязі, выбух электронікі, які прадзіравіў жалезную заслону, пашырыў паток інфармацыі — тэлекамунікацыя, ператварыўшы зямную кулю ў «глябальную вёску», дала магчымасьць грамадзянам сьвету наладжваць лучнасьць праз галовы дыктатараў ды іхныя загарадзі й перагароды, паспрыяла інтэнсыфікацыі індывідуальнага й калектыўнага мысьленьня. Але ў 1948 годзе прадбачыць тэндэнцыю гэткага разьвіцьця мог далёка ня кожны. Вось чаму да гонару газэты «Бацькаўшчына» належыць факт апублікаваньня ў ёй шэрагу войстра аналітычных артыкулаў, а ў тым ліку глыбака ўніклівай і красамоўнай прамовы Тодара Беларускага (псэўданім) пра пагрозу чалавецтву камуністычнага зла з выкрыцьцём яго на прыкладзе Беларусі. Артыкул азагалоўлены «Наша прамова на Агульным Зьезьдзе (сёньня сказалі-б: Генэральнай Асамблеі.— *Я. З.*) Задзіночаных Нацыяў». Вось урывак зь яе, які паказвае на нештадзённыя якасьці лепшых узораў беларускай замежнай публіцыстыкі.

«Сьвет цяпер нагэтулькі адзіны, што калі села скула на грэцкі палец, дык боль ад яе адчуваецца на ўсім сусьветным арганізьме: палестынская гангрэна пашыраецца па ўсім сусьветным целе, а далёкаўсходні мазоль змушае чалавецтва значна падкульгваць.

Адзінства сьвету купленае чалавецтвам за цану найвялізарнейшых пакутаў і ахвяраў, але выкарыстаць яго ў поўнай меры тымчасам ня можна, пакуль сусьветны арганізм у стадыі сьмяротнае хваробы.

Спадары! Ваш сусьветны кансыліум пакліканы знайсьці спосаб вылечыць сьвет. (...) Вы дакладаеце ўсіх стараньняў вылечыць сусьветны арганізм, суняць чырвоныя плямы, што

выпаўзаюць навонкі, але не рызыкуеце дакрануцца да найгалаўнейшага, адкуль у хворы арганізм прасякае атрута раскладу й пагібелі.

Ніхто з вас, спадары, ня можа сказаць, што вылячэньне сьвету цяжкое тым, што хвароба няведамая. У сьпісаньні сацыяльных захворваньняў гэтая хвароба мае ўсім ведамы назоў, які ўва ўсіх мовах сьвету вымаўляецца: **камунізм.** (...)

Спадары! На Ўсходзе Эўропы ляжыць нашая родная старонка Беларусь, заселеная сумленным, добрым і гасьцінным народам. 30 год таму гэты народ, хоць і гэтак супраціўіўся, паў ахвярай вашае абыякавасьці да ягонае долі. Невялікая група палітычных нечысьцяў хапіла за горла шматмільённы наш ды іншыя народы й мэтадам крывавага тэрору, перад якім нікнуць у сьцені жорсткасьці супраць хрысьціянства мінулае даўнасьці, паставіла гэтыя народы на калені, змусіла іх прыгнуць галовы. Жывы, працавіты, здаровы арганізм нашага народу стаўся арэнай злачыннага сацыяльнага экспэрымэнту. Дыктатарскі рэжым, узброены жорсткімі мэтадамі тэрарыстычнае хірургіі, маніўся адсячы ў нашага народу здольнасьць думаць і адчуваць, вылегчаць супраціў нацыянальнага арганізму й прышчапіць народу рысы нявольніцкае пакоры. (...)

Будучыня сьвету была-б безнадзейна страшной, каб цалкам удаўся гэты экспэрымэнт над нашым народам. На шчасьце, гэта ня здарылася. Беларускі народ не ператварыўся ў камуністычнага нявольніка. Жыве ў ім пачуцьцё імкненьня да праўды й волі, не забітае сумленьне й справядлівасьць, не памерла мужнасьць змаганьня за сваё нацыянальнае й сацыянальнае адраджэньне. (...)

...Запраўдны голас нашага народу падаём мы, *Displaced persons*[1], якіх народ вызначыў за сваіх абаронцаў. (...) Мы сумленна будзем выконваць свае абавязкі перад сваім народам. Высака будзем уздымаць наш нацыянальны сьцяг, сьцяг справядлівасьці й волі. З пашанай будзем берагчы нашы нацыянальныя традыцыі, веру й звычаі. Прыслухайцеся да голасу нашага народу! Будзьце справядлівыя: вы самі кажаце, што камунізм шкодны для вашага народу, а чаму-ж вы не разумееце, што ён ня можа быць лепшым і для нас?»

Гэтак вось, хай сабе рытарычна, але глыбака праўдзіва й зусім на часе, калі Беларусь крывавілася й пакутавала пад сталінскім тэрорам, беларуская дыяспара падавала перад сьветам голас ад імя свайго народу.

Эміграцыйныя публіцыстыка, беларуса- й саветалёгія 1940—1950-х гадоў маюць у сабе шмат вартага ўвагі нашымі

---

[1] Перамешчаныя асобы *(анг.)*. У шэрагу артыкулаў чытач сустрэне ўтвораны ад гэтых ангельскіх слоў скарот — ДП.

днямі, бо ў іх мы знаходзім ня толькі сьляды гістарычнага шляху беларускае паваеннае дыяспары, але таксама пагляды на нацыянальна-палітычны быт Беларусі й прынцыпы дзяржаўнага будаўніцтва, выказаныя ўва ўмовах свабоды й бескарысьлівага зацікаўленьня доляю свайго народу.

Савецкая партыйная публіцыстыка даўгі час намагалася размалёўваць беларускіх эмігрантаў, «бебурнацаў» як «ворагаў» свайго народу. Рэха такіх адмоўных ацэнак прабіваецца часамі яшчэ й цяпер у менскіх публікацыях. Але дарма Вы будзеце шукаць пацьверджаньня такому зьнеслаўленьню ў друкаваных эміграцыйных крыніцах. Частковым пацьверджаньнем сказанаму няхай і будзе гэты зборнік матар'ялаў.

Нью-Ерк, лістапад 1992 г.

Янка Запруднік

БАЦЬКАЎШЧЫНА ЗДАЛЁК

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Чаму — «Бацькаўшчына», калі мы на чужыне? — пэўна, спытаюцца некаторыя. А хто-ня-хто можа паставіцца да гэтага і з рэзэрвай, з пабойваньнем навет...

І ня будзе ў гэтым ніякага дзіва — усё зразумела кожнаму з нас адразу й не патрабуе лішніх тлумачэньняў. Занадта жывыя яшчэ ўявы нядаўніх трагедыяў, калі чалавек, брытваю па собскім горле ці інакш як адбіраючы сабе жыцьцё, бараніўся якраз перад гэтай... бацькаўшчынай... Занадта ўедлівая горыч атруты, тонкім шпрыцам навачасных знахароў-ведзьмакоў укропленая ўва ўсе, бадай, адвечныя сьвятыні чалавека — і ў тую Бацькаўшчыну, і ў Свабоду, і ў Шчасьце, і ўва ўсё-ўсенькае аж да розных дэмакратыяў і сацыялізмаў — ідэалаў, створаных людзтвом у заўсёдным імкненьні да лепшага й дасканальнейшага... У адным «спрыце рук бязь ніякага ашуканства», як гаворыцца, паводля простага рэцэпту гэнага вядзьмарства-крацельства, далікатна званага дзеля людзей «дыялектыкай», няўзнак усё «перайшло ў сваю процілежнасць»: шчасьце — у нядолю й злыбяду, свабода — у няволю й катаргу, а Бацькаўшчына-Маці абярнулася ў сіберную Мачыху-Чужыну, куды трэба гнаць-турыць чалавека гвалтам у каршэнь, як на кару за найцяжэйшыя злачынствы. І калі ўсё гэта можа й ня кажнаму яшчэ на сьвеце ясна й зразумела, дык, пэўна-ж, аж занадта добра ведама яно нам, «перамяшчэнцам»-выгнанцам, на

чыіх скурах і сьпінах якраз разгульваліся гэныя «пераходы процілежнасьцяў», чые душы яны катавалі й шматавалі, чые жыцьці паламалі й пакалечылі.

І ўсё-ткі мы важымся сяньня напісаць тут на сваім сьцягу толькі гэтае адно-адзінае слова — «Бацькаўшчына». І ўсё-ткі мы важымся цьвердзіць, што ня мае права чалавек, дый ня можа проста, адвярнуцца ад свае Айчыны, разарваць зь ёй усё, як ня могуць, ня ў стане навет адвярнуць і адлучыць яго ад яе ніякія ў сьвеце гвалты, ніякія зялезныя заслоны ці запоны.

Бо Бацькаўшчына — гэта-ж ня толькі зямля бацькоў і бацькоў бацькоў, аж углыбкі сівых пакаленьняў. Бо Бацькаўшчына — гэта найперш уся спадчына гэных пакаленьняў, увесь духовы набытак іх, пераказваны з роду ў род і не дзеля таго, каб яго занядбаць, ці зусім выкінуць, ці схаваць, закапаць у зямлю назаўсёды, а якраз на тое, каб пашыраць і павялічваць, памнажаць і пераказваць далей нашчадзі. І гэткая Бацькаўшчына — не ў зямлі, а ў людзях першым і галоўным чынам. Яна ў нас самых, у нашых душах, і адцурацца ад Яе ня можам, «як рукі, як вока», як няхітра пяець аб гэтым адна нашая просьценькая, дзіцячая, можа, навет, а глыбока праўдзівая нацыянальная песенька.

Так, запраўдная Бацькаўшчына — гэта найперш людзі, гэта й мы таксама. І хіба ня мы тут, на чужыне, сяньня ня толькі можам і маем, але навет проста мусім быць спадкаёмцамі, і перахавальнікамі, і памнажальнікамі-разьвівальнікамі ды далейшымі пераказьнікамі тае спадчыны бацькаўскіх і дзядоўскіх-прадзедаўскіх пакаленьняў? Хіба ня мы першым чынам і хіба ня мы навет бадай адзіныя? Бо-ж гісторыя сяньня павярнулася так, што там, на зямлі бацькоў, якраз няма месца гэтай запраўднай Бацькаўшчыне,— няма месца пад сонцам, хіба што ў глыбокіх падзямельлях, хіба што ў глухмяні пушчаў-лясоў, хіба што сярод дзічыні балатоў-багнаў, дый то да часу толькі, пакуль не асоча, не апора і ня выпара адтуль пройда-чужынец, кат-прыблуда. Бо гэная вядзьмарская «дыялектыка», распаношыўшыся чыста біблейнай «гідасьцяй запусьценьня на сьвятым месцы тым», устанавіла сяньня запраўдную чужыну на нашай Бацькаўшчыне. І ці-ж не адзіным адказам на гэта, ці не адзіным ратункам мусіць быць ад-

варотнае — станаўленьне й згуртаваньне **Бацькаўшчыны на Чужыне?** Да гэтага мы й хочам імкнуцца, да гэтага будзем заклікаць і ўсяляк прычыняцца праз гэтую, зь вялікімі цяжкасьцямі нарэшце здабытую трыбуну свае нацыянальнае газэты. Хай-жа й будзе гэтта такая трыбуна Бацькаўшчыны на чужыне!

Але ў гэтай-жа роўніцы ляжыць абавязак і ня толькі ўсіх нас як нацыянальнай грамадзкае цэласьці з усімі ейнымі органамі й пляцоўкамі, а й павіннасьць кажнага з нас, кажнага суродзіча ўпаасобку. Нашыя сябры ў долі-нядолі, «перамяшчэнцы» іншых народаў — украінцы, летувісы, палякі, расейцы і інш., якім пашчасьціла раней за нас здабыць сваю нацыянальную прэсу, ужо даўно й намагальна арыентуюць празь яе сваіх суродзічаў-эмігрантаў у тым адзіна правільным кірунку, што *кажны выгнанец мусіць стацца сьведамым адказнасьці прадстаўніком і паслом-амбасадарам свае запраўднае Бацькаўшчыны.* Гэтае заданьне ня менш актуальнае й для кажнага з нас, і стала нагадваць на яго нашым суродзічам ды адпаведна зброіць іх дзеля выкананьня гэтае важнае й разам пачэснае ролі — таксама будзе нашым заўсёдным імкненьнем.

І яшчэ адно, гэтым разам апошняе. Ставячы наперад Бацькаўшчыну, як людзей, мы зусім не манімося зракацца й бацькаўскае зямлі, адварочвацца ад родных бацькаўскіх гоняў ці прапаведваць такое зрачэньне й адварот. Мы толькі цьвёрда перакананыя, што зварот гэным гоням іхнага запраўды роднага й бацькаўскага для нас характару можа й мусіць адбыцца адно празь людзей, што самыя захаваюць у сабе гэты характар, захаваюць як тут, у нас, так і там, на сяньняшняй чужыне — на бацькаўшчыне.

Мы глыбока верым у вешчыя словы нашага Прарока — у прасякнуты сьветлай надзеяй запеў нашага гімну: *«Не загіне Край Забраны, пакуль будуць людзі!»*

І нам таксама верыцца й роіцца тое, пра што натхненна-візіяністычна пяяў адзін із нашых паэтаў-пакутнікаў якраз дваццаць год таму:

Будзе дзень сьвяточны,
Дзень Другога Прыйсьця,
Прыйдуць Маці з Сынам, на услоне сядуць.
Расшумяцца клёны, расшуміцца лісьце,
Будзе сьвяткаваньне песеннае ў садзе.

Прыйдуць зь песьняй тыя, што сабе ня лгалі,
Шо сьлязу ранялі на сырым кургане.
Параходы ў ходзе падаюць сыгналы,
Размываюць хвалі цёс гранітных граняў.

Сяньня і для нас — эмігрантаў — гэтыя словы набіраюць і яшчэ спэцыфічнага й прытым вельмі рэальнага адценьня, аб якім пэўна ня думаў, дый ня мог думаць тады паэт. Але сяньня ўжо мы чуем у іх сыгналы ня толькі аддаленьня-адплыцьця яшчэ далей ад родных берагоў, адплыцьця нямінучага, пэўна-ж, для шмат каго з нас,—але й магутную пабудку, што скліча нас некалі-хоць і з краю сьвету — на Вялікі Дзень Другога Прыйсьця, на сьвяткаваньне песеннае ў садзе бацькоўскім — да Маці-Краіны.

Адно няхай Яна-Бацькаўшчына-Маці — вечна будзе з намі і ў нас, у сэрцах, у душах, у думах і ў чынах нашых.

І няхай станецца!

«Бацькаўшчына», № 1,
31 кастрычніка 1947 г.

ДЭКЛЯРАЦЫЯ РАДЫ БНР

(Беларускае Народнае Рэспублікі), прынятая 29-га сьнежня 1947 г.

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі, сабраўшыся на сход у гістарычны дзень 30-х угодкаў абвешчаньня 1-м Усебеларускім Кангрэсам у Менску Беларускае Народнае Рэспублікі, урачыста заяўляе, што яна й надалей:

1. імкнецца да ўжыцьцяўленьня волі беларускага народу да незалежнага гаспадарствавага жыцьця, выказанай ім вуснамі 1-га Ўсебеларускага кангрэсу й Актам 25 Сакавіка;

2. не прызнае й ніколі ня прызнае БССР за форму беларускага незалежнага гаспадарства, уважаючы яе за расейска-камуністычную фікцыю беларускае гаспадарствавасьці, накінутую Масквою, як сродак паняволеньня беларускага народу, ягонага нацыянальнага, матар'яльнага, а навет і фізычнага вынішчэньня;

3. не прызнае й ніколі ня прызнае на будучыню, як неабавязваючыя беларускі народ, усе ўмовы й забавязаньні, якія няпраўна ад імя беларускага народу падпісалі ўрады СССР, Польшчы й г. зв. «урад БССР» — маскоўская акупацыйная адміністрацыя ў Беларусі;

4. маючы мандат ад 1-га Ўсебеларускага кангрэсу, застаецца адзінапраўным і найвышэйшым рэпрэзэнтантам гаспадарствавае волі беларускага народу, упаўнамочваючы выступаць ад ягонага імя ўрад БНР;

5. выказвае давер і застаецца вернай Прэзыдэнту Беларускае Народнае Рэспублікі — найвышэйшаму прадстаўніку сувэрэнных правоў беларускага народу;

6. імкнецца да салідарнасьці й супрацоўніцтва з усімі паняволенымі й загрожанымі маскоўскім камуніз-

мам народамі, якія прызнаюць сувэрэнныя правы беларускага народу ў ягоных этнаграфічных межах.

Рада ўважае, што ў пераживаны мамэнт ейным галоўным абавязкам ёсьць поўная кансалідацыя ўсіх нацыянальных беларускіх сілаў і змабілізаваньне іх на змаганьне за канчальнае вызваленьне беларускага народу ад маскоўскае няволі й аднаўленьне Беларускае Народнае Дэмакратычнае Рэспублікі.

Рада
Беларускае Народнае Рэспублікі

«Бацькаўшчына», 22 лютага 1948 г.

БНР ЖЫВЕ — ЖЫВЕ БНР!

Сяньня мы маем высокі гонар першымі апублікаваць на сваіх балонах Дэклярацыю Рады Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР), прынятую яшчэ 29 сьнежня 1947 г., але толькі цяпер атрыманую намі ад Сакратарыяту Рады БНР (праз Швайцарыю) дзеля зьмяшчэньня ў друку. Хоць ад часу прыняцьця гэтае Дэклярацыі прамінула ўжо блізу два месяцы, аднак актуальнасьць ейная за гэты час ня толькі ані не абнізілася, але наадварот, у бегу сяньняшніх падзеяў набірае шораз большае значэннасьці. Дый ня дзіва. Бо, будучы апошнім у часе дакумэнтам існаваньня, дзеяньня й волі найвышэйшага органу Беларускае Народнае Рэспублікі, Дэклярацыя адначасна становіць і першае публічнае выступленьне гэтага органу пасьля даўжэйшага часу ягонае дзейнасьці, хоць і навонкі, дзеля пэўных абставінаў, невыяўлянае, але ўнутры бязупыннае, упорыстае працы ўсё ў тым-жа духу й кірунку, запаведаным самым улададаўцам — Народам, у духу й кірунку ўжыцьцёўленьня запраўднае, бязумоўнае гаспадарстваўскае незалежнасьці Бацькаўшчыны.

Ужо трыццаць год, як зацеплены пад злымі, няспрыяльнымі віхурамі на ўсенародным сходзе Першага Усебеларускага кангрэсу ў Менску, а на ўсю магутнасць распалены пасьля ў вялікім гістарычным Акце 25 сакавіка — бязупынна гарыць і палае гэты няўгасны агонь-зьніч нацыянальнае нашае гаспадарстваўшчыны. Дармо, што тыя-ж злыя, няспрыяльныя віхуры не далі яму ўзгарэцца там, на Бацькаўшчыне, загасіўшы, заліўшы груба й без пары лютымі сваймі наваламі. Вынесены з Бацькаўшчыны на чужыну ў выгнаньне вернымі сына-

мі ў каганцох-сьветачах, у іскрамётных паходнях, пераношаны часта зь месца на месца, перадаваны з рук старэйшых і адыходзячых у маладзейшыя й дужэйшыя рукі — гарыць ён і сяньня ў гэных трох, сьвятых для кажнага сьведамага суродзіча літарах БНР. Гарыць і ня гасьне, як ні стараюцца дастаць яго й тут подзьмухі гэных віхураў здалёку, а часам і зблізку. Наадварот — такія подзьмухі сіберных вятроў часам толькі мацней разьдзьмуваюць гэты сьвяты агонь, і разгараецца ён яшчэ больш, як-бы на запавет вялікага нашага паэты:

Разгарайся хутчэй, мой агонь, між імглы,
Хай цябе шум вятроў ня пужаець!
Пагашаюць яны аганёчак малы,
А вялікі — мацней разьдзьмуваюць.

(Максім Багдановіч)

Бо гэта запраўды вялікі агонь — Зьніч самога Народу.

Апублікаваньне сяньня апошняе Дэклярацыі Рады БНР — новы ўспалох гэтага агня-Зьніча — якраз супадае ў часе з трыццатымі ўгодкамі аднае зь векапомнейшых падзеяў нашае нацыянальнае гісторыі — з трыццацігодзьдзем першага пераняцьця ўлады якраз тэю самаю Радаю БНР. То-ж бо якраз трыццаць год таму — у днёх 19—21 лютага 1918 г.—упяршыню ў сталіцы Рэспублікі вольна ўзьвіўся наш гаспадарстваўскі сьцяг і пачаў сваю службу народу першы запраўды народны ўрад — Народны Сакратарыят БНР. Апублікаваньне сяньняшняе Дэклярацыі Рады БНР, хоць мой і выпадкам, але прыпала якраз на трыццацігодзьдзе абвешчаньня Першае Ўстаўнае Граматы БНР — урачыстага акту аб пераняцьці ўлады на вольнай ад ворага Бацькаўшчыне. І зноў-жа — дармо што не дала доля надаўжэй утрываліцца гэнай уладзе над Бацькаўшчынай, над ейнай зямлёю — улада тая над сэрцам людзей зямлі — дзяцей Бацькаўшчыны, дзе-б яны ні былі, трывае няўхільна й сяньня. І цяперашняя Дэклярацыя Рады БНР адно прыпамінае людзям аб гэнай уладзе, аб тым, што стырно яе ня выпушчанае з рук і прыймае пад сябе ўсіх суродзічаў добрае волі й ідэі.

Але што яшчэ тут важней і значэньней, дык гэта тое, што такі напамінак зьверху спатыкаецца з адначасным сустрэчным стыхійным рухам із самых нізоў, ад самых тых людзей, рухам, ськіваным напярэймы недасяглага яшчэ закліку верху. Першыя выявы гэтага руху мы

таксама маем прыемнасьць падаць нашым чытачом сяньня, друкуючы на іншым месцы ліст Беларусаў Французскае зоны да Прэзыдэнта БНР і рэзалюцыю актыву Згуртаваньня Беларусаў Вялікае Брытаніі. Гэтыя першыя дакумэнты сьведчаць, што людзі й самі, без напамінку, аддаюць сябе зноў пад уладу гэтага адзінага аўтарытэту, які, як добра кажуць яны, «быў створаны самымі Беларусамі й на працягу дзесяцігодзьдзяў выказаў непагрэшную нацыянальную палітычную й рэпрэзэнтацыйную дзейнасьць» (гл. «Зьезд Беларусаў Французскае зоны» ў папярэднім № 4 (7) нашае газэты). Гэтым самым даецца выразны й станоўкі адказ і адпор пэўным спробам апошняга часу гальванізаваць некаторыя, вельмі падмочаныя (і то з розных бакоў...) «аўтарытэты», накіданыя сваёй парой усялякімі «панамі», што мелі магчымасць гаспадарыць над нашай зямлёй і над целамі, але ня душамі й сэрцамі нашымі... *БНР і толькі БНР — рэспубліка Першага Ўсебеларускага Кангрэсу, рэспубліка 25 Сакавіка — адна можа мець уладу над душой і сэрцам нацыі.*

І з асаблівым задавальненьнем трэба падчыркнуць яшчэ й тое, што найвышэйшым пэрсанальным носьбітам гэтага аўтарытэту й улады, аб якім успамінае Дэкларацыя, стаіць сяньня чалавек крыштальнае нацыянальнае й індывідуальнае чысьціні, стойкі змагар з усімі варагамі й акупантамі нашага краю — і варшаўскім, і маскоўскім, і бэрлінскім — чалавек, які нават у сваім асабістым характары так шчасьліва спалучае ўсе бадай пазытыўныя рысы нашае нацыянальнае псыхікі — і сьціпласць, але й станоўкасьць, і ініцыятыўнасьць, але й разважнасьць, і лагоднасьць, але і ўпорыстасьць, і згодлівасьць, але й прынцыповасьць. Але-ж, асоба сяньняшняга Прэзыдэнта БНР — гэта мо адна з найбольшых зарукаў таго, што стырно нашага нацыянальнага карабля сяньня ў пэўных і цьвёрдых руках і курс настаўлены на адзіную і ўсім жаданую мэту.

Пэўна — Прэзыдэнт БНР для нас зусім ня тое, што для людзей пэўнага кірунку й настаўленьня які-небудзь «правадыр» — «фюрэр» «з ласкі Божае» (ці «з ласкі Божае Гары», як кажуць цяпер некаторыя). Прэзыдэнт Рэспублікі — толькі найвышэйшы выканавец найвышэйшае волі народу. Дый наагул, ці-ж магла-б адна асо-

ба, навет і найпазытыўнейшая й найвыдатнейшая ў сваіх якасьцях, навет і з найбольш «сьветлымі намаганьнямі», як выказваюцца нашыя суродзічы з Французскае зоны — забясьпечыць поўную й канчальную ўдачу цэлае справы? Ведама, патрэбныя тут — навет ня тое каб асобы — найбольш патрэбен гурт, грамада, зьнітаваная сталёвай сьцяною. Ды першыя рады гэтага гурту — Рада БНР — ужо сабраўшыся зноў пад старым баёвым сьцягам, зьбіраецца й гуртуецца пад ім і шырэйшая ды далейшая грамада, а цяпер, закліканыя да гэтага, пачнуць зьбірацца й гуртавацца яшчэ болей, шырэй і далей — ды, пэўна-ж, зьбяруцца й згуртуюцца ўсе суродзічы добрае волі й ідэі дзеля канчальнага шыхтаваньня радоў і пільнай баёвай гатовасьці.

Бо пры ўсіх «сьветлых намаганьнях» ніколі нельга забывацца на тое, што ня дрэмлюць і цёмныя сілы, а сяньня навет асабліва пагрозна нахмарваюцца й намерваюцца — таксама да бою і, можа, як для іх — да апошняга бою. Дык-жа хай паважнаю перасьцярогаю будуць для нас словы таго-ж паэта з таго-ж вершу:

Разгарайся хутчэй, зіхаці, аганёк,
Каб, калі і замёр ты бяз долі,—
Ўсіх спужаў-бы страшны, абступіўшы іх, змрок —
Хай агнёў не гасілі-б ніколі!

Праўда, тое вогнішча, ля якога зьбіраемся мы сяньня,—гэта ўжо ня той калішні сьціплы нашаніўскі «аганёк», які знаў паэт і аб якім запраўды можна было мець страх, каб ён не «замёр бяз долі». Сяньня гэта ўжо запраўды няўгасны агонь — Зьніч Нацыі. Але ўсё-ж падтрыманьне яго залежыць ад нас, і ад нас-жа залежыць, каб ня даць яму прыцьміцца ці зусім выгаснуць, або, крый Божа, каб самым як прычыніцца часам да гэтага... Праўда й гэта, што ніякай пражорнай цемры ня дасца праглынуць гэты агонь навет надаўжэй, ня тое каб назаўсёды. І дармо, што гэта ўсё яшчэ — агонь-зьніч Ідэалу, а ня цэлае паўніні рэальнасьці — наадварот, мо якраз у гэтым і найбольшая ягоная няўгаснасьць. Бо, як сказаў пра гэта другі паэт — наступнік-спадкаемец першага:

...Лятуценькі ня зьмерклі ў гальлі,
Лятуценьняў згасіць немагчыма.
Расьцярушацца ў далі і ў высь,
Каб нагадваць аб сьветлым над чорным...

(У. Дубоўка)

Гэтак і сяньня, «аб сьветлым над чорным» валадарна нагадвае нам Дэклярацыя Рады БНР. І, можа, найгалаўнейшае ейнае значаньне ў тым, што яна найперш нагадвае аб гэным галоўным — аб тым,

што Беларусь жыве,
нераможная у працы сьціплай,
што долю гадавала на жарстве
ня горш каралявых паліпаў...
(У. Дубоўка)

— аб тым, што жыве Яна і ў часох жудасьнейшых забойстваў народаў, якія толькі-толькі пачынае браць пад сваё асуджаньне цывілізаваны сьвет, і што, нарэшце, і самая верная варта ейная — *БНР — таксама жыве.*

Дык як-жа не адгукнуцца на гэты факт, ужо навет адзін, сам сабою, найважнейшы й найдаражэйшы сяньня, як-жа ня гукнуць усхваляваным выклічам новае веры, надзеі й жаданьня:

— ЖЫВЕ БНР!

«Бацькаўшчына», 22 лютага 1948 г.

ВІТАЮЧЫ ЗЬЕЗД

Сяньняшнім перадавым артыкулам мы маем асаблівую прыемнасьць прывітаць зьезд давяроных абраньнікаў нашае нацыянальнае эміграцыі ў Нямеччыне — дэлегатаў, упаўнаважаных свабодным волявыяўленьнем масы гэтае эміграцыі да перавыбараў нашага нацыянальнага прадстаўніцтва ў Нямеччыне — Беларускага Цэнтральнага Дапамаговага Камітэту.

Прадстаўніцтва нашае эміграцыі ў Нямеччыне — інстытуцыя яшчэ маладая, хоць, зрэшты, ня шмат маладзейшая за ўсю гэтую эміграцыю. Паўстала яна стыхійна, але зусім заканамерна, у моц прыроднае патрэбы нацыянальнага самазахаваньня й самаабароны на чужыне ў абставінах найзацяцейшых пасяганьняў ня толькі на духовую існасьць, але й на само фізычнае існаваньне катаваных гістарычнаю несправядлівасьцяй выгнанцаў з краіны, аддаўна й блізу бязупынна адзначанае цяжкім таўром «Забранага Краю». Запачаткавалі гэтае прадстаўніцтва людзі, якія найлепш адчувалі гэную прыродную патрэбу й знайшлі ў сабе найбольш мужнасьці адразу-ж, не палохаючыся й не вагаючыся, паставіцца ёй на адданую й ахвярную службу. Закладаючы першыя мясцовыя нацыянальныя камітэты, пашыраючы іх да акруговых і зонных, канцэнтруючы нарэшце ў цэнтральным, людзі гэтыя не чакалі на фармальныя пакліканьні, упаўнаважаньні ці выбары, а браліся адразу за работу й рабілі, як толькі маглі, ды наагул, як толькі можна было. І вынікаў гэтае работы — зарганізаваных нацыянальных лягераў і групаў, выступленьняў перад уладамі й арганізацыямі, прадстаўніцтва ў міжнацыянальных эмігранц-

кіх арганізацыях, здабыцьця нацыянальнае ліцэньзіяванае прэсы, стварэньня нацыянальна-культурных пляцовак у школьніцтве, мастацтве і г. д. і г. д.— не адбера ніхто ад нас, ад нашае агульнай нацыянальнай справы на эміграцыі, ды, нарэшце, ад імя й гонару гэных людзей упаасобку. Калі гэтыя вынікі, можа, і не заўсёды супастаўныя да здабыткаў, дасягненых іншымі нацыянальнасьцямі на эміграцыі, ды затое яны сьцісла прапарцыянальныя да магчымасьцяў эміграцыі нашае, да моцы інтэлігентнага прапластаваньня ў ёй, да ступені нацыянальнае сьведамасьці нашае народнае масы, бяручы яе йшчэ ў ейным папярэднім стане на Бацькаўшчыне, нарэшце,— да самое колькасьці й магчымасьцяў гэных піянэраў-ініцыятараў.

Цяпер гэтыя людзі, пакліканыя часам і ўсьведамленым абавязкам, свой мандат-упаўнаважаньне, атрыманае, можна сьмела сказаць, ад самое гісторыі, здаюць зьезду зусім свабодна й паводля ўсіх дэмакратычных нормаў выбраных прадстаўнікоў нашае эміграцкае масы ў Нямеччыне з усіх куткоў ейнага расьцярушаньня тут. Здача гэтага мандату адбываецца не запозна, бо нельга было яе, без рызыкі для дабра справы, правесьці тады, калі ўся арганізацыйная праца эмігрантаў у Нямеччыне наагул магла праходзіць адно ў паўлегальных абставінах, ані датуль — і гэта найважнейшы ўжо для нашае канкрэтнае нацыянальнае сытуацыі мамэнт — пакуль не раскрыла свайго запраўднага аблічча (ці пакуль не ўдалося яго раскрыць) уваччу кажнага, хто толькі мае вочы, каб бачыць, і вушы, каб чуць,— глыбака запушчаная, дэмагагічная й дынамічная антынацыянальная чужацкая дывэрсія. Тварэньне безадказнымі адзінкамі й групкамі новага г. зв. «цэнтральнага беларускага прадстаўніцтва» на зусім голым месцы, адкідаючы ўсе здабыткі папярэдняе працы (хоць і маўкліва карыстаючыся найважнейшымі зь іх ды стараючыся выкарыстаць усе наагул) — пры поўнай магчымасьці ўсім узяць удзел у як найрадыкальнейшым перафармаваньні на строга дэмакратычных асновах прадстаўніцтва ўжо традыцыйнага, заслужонага і ўсебаковага ўвязанага як у нутраным, так і ў вонкавым дачыненьні, навет пры адкрытым запрашэньні да гэткага ўдзелу (гл. хоць-бы «Бацькаўшчыну», № 8/11) — гаворыць само за сябе, ставіць апошнюю кропку над і. І ў гэтым — вялікі пазытыўны мамэнт для змаганьня:

станы ягоныя канчальна разьмяжоўваюцца, вораг нутраны сам раскрывае сваю вонкавасьць, застаецца толькі проба сілаў. Баяцца таго, што пэўная частка ня зусім усьведамленае масы дасца яшчэ нейкі час сябе баламуціць і эксплёатаваць — значыла-б наагул ня мець пэўнасьці ці хоць веры ў праўднасьць усяе нашае нацыянальнае справы. Праганяць гэтую боязь, калі ў каго яна ёсьць, працаю й толькі працаю над нацыянальна-палітычным усьведамленьнем і гуртаваньнем — адзіны мужны й чэсны выхад для ўсіх, хто не гатовы ці псыхалёгічна няздольны да змаганьня. Бо толькі праца й змаганьне — ад пачатку назначаныя й ці раз бліскуча выпрабаваныя сьцежкі-дарожкі нашага нацыянальнага руху.

У працы й змаганьні ўзростала й нашае нацыянальнае прадстаўніцтва БЦДК, у працы й змаганьні будзе дужэць яно й надалей. Няхай сабе шмат каму шмат што ў гэным змаганьні можа здацца лішнім і магчымым да абміну ці ліквідацыі. Пэўна-ж, эканомія сілаў мусіць быць заўсёды і ўсюды, асабліва пры нашым такім небагацьці на іх. Але кажнае змаганьне вымагае й ніяк неабмінных выдаткаў ды ахвяраў. Калі толькі верыцца ў праўднасьць усяе справы — нельга ня верыць і ў тое, што выдаткі гэныя аплацяцца й акупяцца.

Аднак таксама шмат каму, і найбольш асобам, далёкім ад сяньняшняга актыўнага рэчышча руху, найчасьцей людзям простым і ціхамірным — усё нашае цяперашняе змаганьне, нутраное сваім месцам, хоць і вонкавае паходжаньнем, кіраваньнем ды ськіваньнем — выдаецца нейкім бязмэтным, дробным, мо нат асабістым і аж проста ледзь ня сьмешным. У папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» мы мелі нагоду й прыемнасьць зьмясьціць вялікі й шчыры «ліст да беларускае інтэлігенцыі» нашых суродзічаў з аднаго лягеру ў Ангельскай зоне. І хоць аўтары ліста добра бачаць, хто цяпер і каго атакуе ў змаганьні, хоць яны добра клічуць «да згоды» ўсіх суродзічаў, што маглі-б быць карыснымі цэлай нацыі, а ня толькі самым сабе ці, яшчэ горш, адвечным варагом Бацькаўшчыны — усё-ткі тое нашае змаганьне ў іхным ваччу выглядае проста «дзяленьнем пустога мяха».

Пэўна, здалёк і без развагі гэтак зусім можа здавацца. Бо калі той «мех» разумець у чыста матар'яльным

сэньсе, дык ён і запраўды ў нас даволі-ткі пуставаты. Але й тут трэ было-б задумацца найперш над некаторымі пытаньнямі: чаму ўсё-ж да гэтага «пустога меху» так дабіваюцца цяпер шырака й даўно ведамыя спэцыялісты якраз ад «мяхоў» поўных? Чаму ня цікавіліся яны ім тады, калі «мех» і запраўды быў пусьценькі і трэба было цягаць у яго, дый яшчэ з гарачага прыску, першыя каштаны — зьбіраць у гурт, выдзіраць із чужых лапаў запалоханых і здэзарыентаваных суродзічаў? Ці ня чуюць іхныя дазнаныя насы выразнага паху нечага істатнейшага — ня печаных каштаноў (ці, калі ўжо, «нацыянальнай формаю» карыстацца, дык бульбы хіба), а нейкіх — і то нелапых — скварак? Вунь пачынаюць газэты як у бубен біць аб недалёкім прызнаньні замежных эміграцыйных урадаў, сымпатыі — і ня толькі адны плятанічныя — да паняволеных бальшавізмам растуць увачавідкі. І раптам «мех можа прарвацца» — ня нашая пуставатая яшчэ торба з тымі бульбінамі, а тугі мех сусьветнае сілы й можнасьці. Тады адно — падстаўляй гэныя торбы й торбачкі ды завязвай — ці мо лепш, не «падстаўляй», а «прадстаўляй» добра напрактыкаванымі ў гэтых «мехавых» справах «прадстаўніцтвамі» — і стане й самому, і дзеткам, і добрым суседкам...

Запраўднае нашае нацыянальнае прадстаўніцтва — нашыя дапамаговыя камітэты з БЦДК на чале — усёй сваёй дасюлешняй працай, адданасьцяй, ахвярнасьцяй і, нарэшце,— беднасьцяй, спрычыненай мо й ня зусім ужо пахвальнай непатрабавальнасьцяй (асабліва прыраўнаўшы да падобных установаў іншых нацыяў, што выяўляюць напару надзвычайную энэргію ў спаганяньні розных нацыянальных складак ды падаткаў) — сьведчаць аж занадта, як далёка яны ад падобных «мехаватых» канцэпцыяў. Дык усё тое, што тут ёсьць ці быць можа — сяньня аддаецца да рэшты ў рукі прадстаўнікоў самое масы эміграцыі. І, найгалаўнейшае — аддаецца ў гэтыя-ж давяроныя рукі ня толькі «мех» які-небудзь, пусты ці поўны, рагожавы ці сап'янавы — а нічым ня сплямлены сьцяг нацыянальнае ідэі. Аддаецца ня з тым, каб перашыць яго ў якую-такую сабе торбу, а каб несьці й далей у тэй-жа чысьціні й на тэй-жа вышыні, галоўна — наперад і наперад! Бо мы ў змаганьні баронім толькі гэты сьцяг, толькі пад ім наступаем, толькі за яго ходаемся й ахвяруемся. І будзем ходац-

ца, каб ня лучыў ён у якія, аб усе «мяхі» сьвету зацухмоленыя лапы, каб ня высклізнуў зь іх ды не пайшоў на паганыя анучы, да чужацкіх і ворагавых ботаў.

А пакуль — аддаючы чэсьць тым, што горда несьлі гэны сьцяг дасюль тут, на чужыне, вітаем тых новых, што панясуць яго далей, можа, аж да перамогі — зычым ім гэтага ад усяго шчырага сэрца, жадаем ад поўнае добрае волі!

«Бацькаўшчына», 25 красавіка 1948 г.

ТОДАР БЕЛАРУСКІ[1]

НАШАЯ ПРАМОВА НА АГУЛЬНЫМ ЗЬЕЗЬДЗЕ ЗАДЗІНОЧАНЫХ НАЦЫЯЎ

Мы — людзі бяз бацькаўшчыны. Displaced persons, як завёмся мы новай афіцыйнай, або displeased persons[2], як лепш назвалі-б мы самі сябе ў душы, застаўшыся запраўды пакрыўджанымі ад урадаў, што ў вас фігуруюць і выступаюць ад імя народаў, ад якіх яны ня маюць паўнамоцтваў.

Спадары! У нас перад вамі тая асаблівасьць, што мы ня крывім душою, калі гаворым. Для нас няма тых «вышэйшых дзяржаўных меркаванняў», якія ператвараюць часам ваш язык у орган хаваньня думак, а ня ў орган выражэньня іх. Мы не баімся быць абвінавачанымі ў непаважаньні да «некаторых урадаў»,— прызнаёмся, што гэтай павагі ў нас да іх няма. Ня чуем і страху перад такімі ўрадамі. Мы добра бачым, як гэтыя восенскія мухі лятуць да свае гібелі. У сваёй прамове мы можам увайсьці ў супярэчнасьць із тымі статутамі, на моцы якіх дзеіць вашае Высокае Зграмаджэньне. Але й гэта ня можа нас застрашыць: за зьмест статутаў адказваюць урады, што падпісалі іх, а не народы, ад імя якіх дзеялі й дзеюць некаторыя так званыя «ўрады».

Гэткім парадкам мы прамаўляем да вас тут як найсвабаднейшыя людзі ў сьвеце, не зьвязаныя ні з статутамі, ні з прыналежнасьцяй да тае ці іншае дзяржавы,— ня скутыя нічым, што перашкаджала-б нам кіравацца сваім собскім сумленьнем.

Выступаем мы тут як грамадзяне сьвету.

Але, мы такія і ня маем права маўчаць, калі пад будынак нашае сусьветнае бацькаўшчыны падкладаецца бомба страшэннае разбуральнае сілы. Ня можам

[1] Псэўданім няведамага аўтара.
[2] Пакрыўджаныя асобы *(анг.)*.

маўчаць, ня прасім, а вымагаем, вымагаем выслухаць нас.

Спадары! У сьвеце няма благіх і добрых народаў, усе народы добрыя, усе яны імкнуцца да спрадвечнае мэты — дабра. Але ў гэтых народаў ёсьць не толькі добрыя, а таксама й нягодныя ўрады, якія тым і благія, што перашкаджаюць гэтым народам жыць у прыязьні, робячы тое, чаго самі саромеюцца назваць уголас.

Ды дармо, усё-ж сьвет цяпер больш адналіты, чымся гэта некаторым здаецца. Чалавецтва перастала быць мэханічным задзіночаньнем нацыянальных арганізмаў, а ператварылася ў адзінае, зялезнае цэлае, народжанае й загартаванае ў бязьлітасным змаганьні за сваё адраджэньне на працягу даўгіх гадоў. У чалавецтва няма нічога даражэйшага, чымся гэтае адзінства, за якое заплачана цяжкой працай безьлічы лепшых народных дзеячоў і крывёю, пралітай у гэтым змаганьні. Сьвет цяпер нагэтулькі адзіны, што калі села скула на грэцкі палец, дык боль ад яе адчуваецца па ўсім сусьветным арганізьме; палестынская гангрэна пашыраецца па ўсім сусьветным целе, а далёкаўсходні мазоль змушае чалавецтва значна падкульгваць.

Адзінства сьвету купленае чалавецтвам за цану найвялізарнейшых пакутаў і ахвяраў, але выкарыстаць яго ў поўнай меры тымчасам няможна, пакуль сусьветны арганізм у стадыі сьмяротнае хваробы.

Спадары! Ваш сусьветны кансыліум пакліканы знайсьці спосаб вылячыць сьвет. Чалавецтва на ўсёй неўпарадкаванай земнай кулі прыслухоўваецца да галасоў, што йдуць з вашага Высокага Зграмаджэньня. Прыслухоўваецца й траціць надзею. Вы намагаецеся дакладна й сумленна вывучыць грэцкую скулу, заклеіць пляйстрам далёкаўсходні мазоль, прыпісваць мікстуру запаветранаму атамнай трасцаю сьвету, цяпер — знайсьці нейкую раду ад палестынскае гангрэны. Вы дакладаеце ўсіх стараньняў вылечыць сусьветны арганізм, суняць чырвоныя плямы, што выпаўзаюць навонкі, але не рызыкуеце дакрануцца да найгалаўнейшага, адкуль у хворы арганізм прасякае атрута раскладу й пагібелі. Вы змагаецеся супраць сымптомаў, пакідаючы нат не дасьледванай самую хваробу, і гэтым самым даяцё ёй магчымасьць паглыбляцца далей у заслабелы арганізм чалавецтва. Інакш кажучы, вы падобныя да тых лекароў далёкае мінуўшчыны, якія

мала давяралі сваім веданьням у мэдыцыне й злучалі іх із чарадзействам ды забабонамі ў надзеі, што калі не адно, дык другое мусіць хвораму памагчы.

Мэтадам гэтага лячэньня можна стварыць на кароткі час ілюзію ачуняньня, але хвароба, загнаная глыбака ў сярэдзіну, ізноў пакажацца навонкі, ізноў на твары чалавецтва выступяць чырвоныя плямы, і штораз, то ўсё ў большым памеры, і ўжо цяжка будзе даваць рады.

Ніхто з вас, спадары, ня можа сказаць, што вылячэньне сьвету цяжкое тым, што хвароба няведамая. У сьпісаньні сацыяльных захворваньняў гэтая хвароба мае ўсім ведамы назоў, які ўва ўсіх мовах сьвету вымаўляецца: **камунізм**. Сымптомы гэтае хваробы дакладна вывучаныя, сьмяротная небясьпека ня выклікае страху, і ход адно аб тое, каб вы падпісалі рэцэпт на лякарства.

Галоўнае, спадары, сумленнасць, мужнасьць і здольнасьць дзеіць бязь белых рукавічак. Сьвету добра ведама, што залоза вытварэньня атруты камунізму ў сусьветным арганізьме — гэта адна зь дзяржаваў, прадстаўнікоў якое мы, на жаль, ня бачым яшчэ на лаве падсудных, але тут, сярод вас, на гэтым Высокім Зграмаджэньні...

Спадары! На Ўсходзе Эўропы ляжыць нашая родная старонка Беларусь, заселеная сумленным, добрым і гасьцінным народам. 30 год таму гэты народ, хоць і гэтак супрацівіўся, паў ахвярай вашае абыякавасьці да ягонае долі. Невялікая група палітычных нечысьцяў хапіла за горла шматмільённы наш ды іншыя народы й мэтадам крывавага тэрору, перад якім нікнуць у сьцені жорсткасьці супраць хрысьціянства мінулае даўнасьці, паставіла гэтыя народы на калені, змусіла іх прыгнуць галовы. Жывы, працавіты, здаровы арганізм нашага народу стаўся арэнай злачыннага сацыяльнага экспэрымэнту. Дыктатарскі рэжым, узброены жорсткімі мэтадамі тэрарыстычнае хірургіі, маніўся адсячы ў народу здольнасьць думаць і адчуваць, вылегчаць супраціў нацыянальнага арганізму й прышчапіць народу рысы нявольніцкае пакоры. Беларусь і іншыя народы пры абыякавасьці сьвету сталіся найвялізарнейшай лябараторыяй, у якой з жывога й паўнавартаснага народу вытвараецца народ-нявольнік. Трэба быць зусім сьляпым, каб ня бачыць, да чаго вядзець гэты экспэрымэнт, натхненны сьценямі жорсткага нявольніцтва далёкае

мінуўшчыны. І сьвет быў сьляпы, каб прадбачыць гэта, і глухі, каб чуць стогны аб дапамозе. Сьляпы, глухі й неразумны, бо не разумеў, што стварэньне народу нявольніка — гэта толькі першая частка пляну кастрацыі сьвету ў імя варожае чалавецтву камуністычнай дактрыны.

Будучыня сьвету была-б безнадзейна страшной, каб цалком удаўся гэты экспэрымэнт над нашым народам. На шчасьце, гэтага ня здарылася. Беларускі народ не ператварыўся ў камуністычнага нявольніка. Жыве ў ім пачуцьцё імкненьня да праўды й волі, не забітае сумленьне й справядлівасьць, не памерла мужнасьць змаганьня за сваё нацыянальнае й сацыяльнае адражэньне. У мінулай вайне беларускі народ змагаўся за сваю волю як із бурнатым, гэтак і з чырвоным фашызмам, але на сьвяткаваньні перамогі яму не давялося дастаць месца, гэтае месца захапіла тая самая дыктатура, што вытварае экспэрымэнт над народам-змагаром і прабіваецца далей на міжнародную арэну, выступаючы ад імя гэтага народу адзіным правам сілы і ўчыненых злачынстваў.

У цёмным завулку сяньняшняга дня сьвет падпілноўваюць людзі, якія пастанавілі, што настала часіна іхнага трыумфу й можна ўжо пачаць у сусьветным маштабе тое, што яны зрабілі там, на нашай Бацькаўшчыне. Даўно ўжо ўся жыцьцёвая мараль і ўся іхная ідэялёгія зводзілася да пастаўленага іхнымі правадырамі пытаньня: «Хто каго?» І яны разьлічваюць выкарыстаць заблытаную пасьля вайны сытуацыю й зьбянтэжаную вайной актыўнасьць народаў, каб ператварыць сьвет у паслухмянае камуністычнае стада, павярнуць гэтую справу ў сваю карысьць.

Яны стараюцца схаваць пад маскай добрасьці свой запраўдны подлы твар. Яны выступаюць як «абаронцы правоў малых народаў» (мы гэтых абаронцаў добра ведаем), стараюцца запэўніць усіх у тым, што толькі яны бароняць інтарэсы працы, што не перашкаджае ім перабірацца жыць у раскошныя палацы, абстаўляць сябе слугамі, прыбіраць сваіх жонак у найдаражэйшыя хутры й пэрлы. У маскараднай зьмене масак камунізмам няма нічога дзіўнога, але дзіву годная трагічная няздольнасьць або нежаданьне сьвету бачыць, хто такія ў запраўднасьці гэтыя лаўцы душаў людзкіх.

Голас нашага народу паходзіць не ад тых, хто высту-

пае перад вамі. Прыслухайцеся, спадары, вы пачуеце голас запраўднага народу, і гэты голас гавора зусім ня тое, што вы тут чуеце ад прадстаўнікоў савецкае дыктатуры. Гэты запраўдны голас нашага пакутнага народу падаём мы, Displaced persons, якіх народ вызначыў за сваіх абаронцаў. Гэта мы — амбасадары нашага народу, які давярае нам гаварыць ад ягонага імя. Нездарма камуністычныя інтрыганы дакладалі й дакладаюць гэтулькі стараньняў, каб перацягнуць нас на свой бок і гэтым заткнуць горла праўдзе. Не, гэтага ня станецца! Мы сумленна будзем выконваць свае абавязкі перад сваім народам. Высака будзем уздымаць наш нацыянальны сьцяг, сьцяг справядлівасьці й волі. З пашанай будзем берагчы нашыя нацыянальныя традыцыі, веру й звычаі. Прыслухайцеся да голасу нашага народу! Будзьце справядлівыя; вы самі кажаце, што камунізм шкодны для вашага народу, а чаму-ж вы не зразумееце, што ён ня можа быць лепшым і для нас?

Прыслухайцеся да плачу нашых мацярок, жонак і сёстраў, сэрцы якіх перапоўненыя горам і тугой, якія аплакваюць ня толькі загіненых блізкіх сваіх, нас, выгнанцаў, але горкімі сьлязьмі аблiваюць і свае собскія пакуты — голад, холад і зьдзекі. Яны працягваюць у ваш бок свае крывава-мазалістыя рукі, каб разам з вамі працаваць, жыць у згодзе й прыязьні ды карыстацца хараством свабоды, як вы.

Дык слухайце! Мы разам з вамі хочам голасна пракрычаць на ўвесь сьвет: брацтва народам і справядлівасьць для ўсіх! Адчынеце нам вашыя сэрцы, і няхай у іх зазьзяе ясны вогнік помачы нашаму народу, што нясець на сабе страшэнна цяжкое камуністычнае ярмо!

Лёндан

«Бацькаўшчына», 9 траўня 1948 г.

СЬВЯТАЯ ПРАЦА

5 чэрвеня (23 травеня старым стылем) царква ўшаноўвае памяць сьв. Аўфрасіньні-Прадславы, князёўны й ігумені Полацкае (1102—1167 гг.). У чыста царкоўным сэньсе дзень гэты не становіць якога-небудзь адмысловага сьвята, як і сама сьв. Аўфрасіньня не разглядаецца іначай як вузка мясцовая, полацкая сьвятая. Дык ня дзіва, што папулярнасьць ейная ў шырокіх масах вернікаў за межы Полацку і, можа, Полаччыны ў нас не сягала і шмат дзе пра гэтую, так заслужоную для нашае нацыі сьвятую часам навет і ня чулі. Аднак у нашым грамадзтве, і ня толькі рэлігійным ці рэлігійна-клерыкальным, але й наагул нацыянальна сьведамым, даўно ўжо паўстала тэндэнцыя і навет завязалася пэўная традыцыя ўважаць сьв. Аўфрасіньню-Прадславу за нацыянальнага сьвятога-патрона Беларусі, так, як, скажам, у ўкраінцаў уважаецца сьв. Міхал Архангел, у палякоў — сьв. Станіслаў, у расейцаў — сьв. Юр'я і г. д. З матывамі й асновамі гэтае тэндэнцыі й традыцыі ня можа не згадзіцца аніводзін нацыянальна сьведамы суродзіч, тым болей што тут не паўстае й ніякіх вузка-канфэсіянальных перашкодаў, паколькі і праваслаўная царква і каталіцкі касьцёл аднолькава прызнаюць князёўну Аўфрасіньню-Прадславу за сьвятую. Аднак разважыць усю гэтую справу ў ейнай паўніні, выясьніць і ўсьведаміць як найглыбей увесь ейны сэнс — якраз на часе сяньня, у пару яшчэ не завершанага, але блізкога да свайго завершэньня ўстанаўленьня нашых найвышэйшых нацыянальных каштоўнасьцяў і годнасьцяў.

У сваёй багатай і слаўнай мінуласьці народ наш выдаў зь сябе шмат сьветлых і сьвятых постацяў, што

знайшлі сабе поўнае прызнаньне й адзначэньне з боку сусьветных хрысьціянскіх цэркваў. Сярод іх сьв. Аўфрасіньні-Прадславе Полацкай, бясспрэчна, належыцца адно з найпершых і найпачэсьнейшых месцаў. Казачна-прыгожая князёўна Прадслава, не пазбаўленая нічога з добраў зямных, ведамых толькі таму часу, апанаваная так панаднымі кожнай іншай дзяўчыне сватаньнямі багатых, дужых і прыгожых гэтага сьвету — зракаецца ўсяго гэтага з свае чыстае добрае (але-ж якое моцнае!) волі, каб прысьвяціцца цалком службе Богу й свайму Народу. І то службе ў цярплівай, маруднай, упорыстай, сьціплай працы, зусім мо не спасьцераганай, не адзначанай і не ўслаўлянай, а часта мо й не разуметай, мо й нат — хто ведае — высьмейванай сучасьнікамі — няўдзячнай працы... А што можа быць для нас сяньня сьвяцей за такую самаадданую працу ў службе Богу й свайму народу — тую працу, што й зрабіла князёўну Аўфрасіньню-Прадславу сьвятой? Запраўды-ж, сьв. Аўфрасіньня — гэта сама Сьвятая Праца — адна з найвышэйшых каштоўнасьцяў, усё больш і больш ацэньваных і ўшаноўваных ня толькі нашым працавітым сьціплым народам, але й цэлым цывілізаваным чалавецтвам. Ды ці можна знайсьці нам больш годнага патрона-сьвятога, апякуна й заступніка нашае нацыі?

Аднак навет жыцьцё цэлага чалавецтва, ня тое каб аднаго нашага, цяжка данятага й дайманага гісторыяй народу, уладжанае так, што праца, сама сьвятая праца, ня можа быць ані адзіным, ані галоўным навет ягоным шляхам. Бо зусім побач тут бяжыць, і часта пераплятаецца-перавіваецца, і другі, ня менш вялікі й ня менш слаўны, ды ня менш і цярністы, а таму ня менш сьвяты шлях жыцьця — шлях змаганьня. І на гэтым шляху наш народ даў ня менш сьветлых і сьвятых постацяў, таксама прызнаных і адзначаных. Чаму-ж ня маем мы сяньня зь іх абранага сьвятога патрона-заступніка, пуцяводніка гэтага, сяньняшнім часам ды для нашага народу мо й найадказьнейшага шляху — шляху змаганьня? Гэтае пытаньне ня шкодзіла-б адпаведным колам узяць пад развагу. Чаму, побач із прыгожай традыцыяй сьв. Аўфрасіньні-Прадславы — Сьвятой Працы, як патронкі Беларусі, не запачаткаваць — пакуль ня позна, а якраз на часе! — і традыцыю нейкага другога сьвятога-змагара, як патрона змагарнае Баць-

каўшчыны? Абкружаны народнымі легендамі й славаю яшчэ больш, як сьв. Аўфрасіньня, мужны й ахвярны змагар-ваяр супраць чужацкае навалы, абаронец Бацькаўшчыны й хрысьціянства зь мячом у руках сьв. Мэркур Смаленскі найбольш заслугоўваў-бы на годнасьць такога патрона. А традыцыя іншых народаў знае ня толькі аднаго, але й двух нацыянальных патронаў (як, прыкладам, у чэхаў сьв. Ян Непамук і сьв. Вацлаў). У нас-жа гэтыя два патроны — заступнікі Бацькаўшчыны мелі-б і такі глыбокі ды шматгранны сэнс.

Аўфрасіньня Полацкая і Мэркур Смаленскі. Заступніца й Заступнік. Сьвятая Праца й Сьвятое Змаганьне. Адвечнае адзінства супрацьлежнасьцяў захаду і ўсходу ў нас (як-бы ні зьмяняліся ягоныя асяродкі: на той час — Полацак і Смаленск, пасьля — Вільня й Полацак, яшчэ пасьлей — Вільня й Менск, цяпер — эміграцыя і Бацькаўшчына). Навет у сьвяткаваньні — веснавая Аўфрасіньня й восенскі Мэркур.

Але гэта ўжо справа прапановы й развагі. Сяньня-ж у нас — сьвята Аўфрасіньні-Прадславы, ужо ўзьведзенай на шлях традыцыі патронкі Беларусі. *Яно ўжо мусіць стацца вялікім нацыянальным сьвятам для кожнага сьведамага суродзіча.* Бо гэта — сьвята самой Святой Працы. І пры гэтым, што яшчэ мо важней — працы нацыянальнай, працы культурнай і прасьветнай, якраз тэй працы, якой мы найбольш заўдзячваем усё сваё нацыянальнае абуджэньне й адраджэньне. Ды разам з тым — сьвята працы сьціплай, не настаўленай на багацьце й славу — і працы волевай, напорнай і ўпарыстай, самаадданай у пасьвяце аж да манаства. Такой працы, якой найбольш трэба нам сяньня, каб не заглушыў палын нядолі ці які-небудзь блёкат зводу нацыянальныя сьцежкі-дарожкі.

І ў гэтым-жа агульна нацыянальным сьвяце павінны асабліва абходзіць і свае асобныя сьвяты некаторыя зь перадавых і баёвых аддзелаў нацыі. Найперш, можа,— нашыя маткі, сёстры й сяброўкі, для якіх гэты дзень Жанчыны. Працаўніцы мусіць стацца ня менш дарагім, як нядаўна адзначаны агульналюдзкі Дзень Жанчыны-Маці. А гэта-ж да таго й дзень жанчыны-працаўніцы нацыянальнай, жанчыны-культурніцы...

Нарэшце-ж, мо не наапошку, павінна быць тут-жа й нашае, мо прафэсійнае сьвята — сьвята працаўнікоў

размнажэньня пісанага слова, якому найбольш і была пасьвяціўшыся сьв. Аўфрасіньня, у сяньняшнім сэньсе — сьвята друку і пры гэтым — нацыянальнага друку.

Гэты вялікі й шматзначэнны нацыянальны дзень і ўшануйма сяньня хоць у сэрцах сваіх, супоўніўшы іх цёплай і шчырай малітвай да Тае, Каго ўжо абралі сабе за Апякунку-Заступніцу, малітвай за Бацькаўшчыну, ейныя крыжавыя пакуты сяньня й ціхую радасьць у сьціплай упорыстай Сьвятой Працы, што ня можа ня быць укаранаванай вянцом збаўленьня ў спадзяваным сьветлым Заўтра.

«Бацькаўшчына», 5 чэрвеня 1948 г.

КАНСТАНЦА

імя Канстанцы добра ведамае ня толькі зь гісторыі рэлігійнага жыцьця Эўропы, але, празь яе, і з агульнай сусьветнай гісторыі. Гэта тут, у невялічкім цяпер нямецкім гарадку на ўзьберажжы Бодэнскага возера, на мяжы з Швайцарыяй, адбыўся сваім часам адзін з найвялікшых і найдаўжэйшых царкоўных зьездаў сярэднявечча — славуты Канстанцкі Сабор (1414—1418), на пастанову якога, між іншага, быў спалены найвыдатнейшы чэскі рэлігійны рэфарматар і адзін зь першых дзеячоў царкоўнае рэфармацыі наагул — Ян Гус. Той самы Ян Гус, за адзін з галоўных грахоў якога тады была прызнаная ягоная спроба нацыяналізацыі царквы ў Чэхіі праз увядзеньне ў набажэнства народнае чэскае мовы, пераклад у яе Сьвятога Пісьма (зроблены самым Гусам) і г. д.

Гісторыя захавала сьведчаньні, што і сам Ян Гус і ягоныя прыхільнікі — гусыты вельмі цікавіліся нашай Бацькаўшчынай ды пераважнай у ёй і тады нацыянальнай праваслаўнай рэлігіяй. У абвінавальных пунктах, пададзеных інквізытарам таму-ж Канстанцкаму Сабору супраць аднаго з бліжэйшых Гусавых паплечнікаў і супрацаўнікоў Гароніма Праскага, апошні вінаваціцца ў тым, што, прыбыўшы ў 1413 г. разам зь вялікім князем літоўскім Вітаўтам у Віцебск, дзе жыхары ў бальшыні праваслаўныя, ён публічна заяўляў, што вера праваслаўных беларусаў «будзе й ёсьць дасканальная», намагаўся й намовіць самога вялікага князя Вітаўта застацца пры праваслаўі, у Полацку ўвайшоў у праваслаўную царкву і, «ухіліўшы калены, паў ніцма», а навет «каб больш і больш падабацца» ды «паказаць, што ён спагадае» праваслаўным беларусам

«у абычаях, так-жа, як і ў веры» — «адпусьціў сабе даўгую бараду й валасы»...

І вось тая-ж нямецкая Канстанца, што нейкіх паўтысячы з гакам год таму сталася была за Гальгофу чэскім нацыяналізатарам царквы — гусытам, сяньня — воляю зьбегу акалічнасьцяў, выпадку, ці воляю долі, ці мо й нейкай Вышэйшай Воляю — апынілася за сьведку аднае з найвызначальнейшых падзеяў у жыцьці тае самае Беларускае Нацыянальнае Праваслаўнае Царквы, якой так сымпатызавалі калісь гэныя гусыты, і то за сьведку падзеі якраз у кірунку далейшае нацыяналізацыі гэтае Царквы.

Пэўна-ж, нядаўнае ўрачыстае зьняцьце «ўдоваго стану» зь Беларускае Праваслаўнае Аўтакефальнае Царквы, што адбылося 4—5 чэрвеня сёлета, пры абходжаньні дня сьвятое Патронкі Беларусі Прп. Прадславы-Аўфрасіньні Полацкае, у Канстанцы — калі не фармальна, дык ува ўсім сваім сэньсе заслугоўваючы для нас на назоў нашага Канстанцкага Сабору — урачыста ўпісвае старое ймя бодэнзэйскага гарадка і ў нашую як рэлігійную, так і наагул нацыянальную гісторыю. І няхай сабе гэтая нашая сяньняшняя Канстанца ані колькасна не дараўноўвае таму калішняму, ледзь не статысячнаму збору царкоўнікаў, ані размахам не сягае й ня можа сягаць ягоных усеэўрапейскіх межаў, дык затое духам сваім, непакорным і несьмяротным духам нацыянальнага і ў рэлігійным — перакрывае яна яшчэ раз хоць у нейкай малой частачцы той стары сярэднявечны дух закоўваньня народаў і спальваньня іхных жывых ідэяў ды імкненьняў — дух старое Канстанцы. Але-ж, жывуць народы, жыве іхнае неадымнае права славіць Бога й Хрыста самым і па-свойму, па кажнай часовай страце здабываецца зноў і зноў упорыстым і напорным змаганьнем.

Праўда, могуць сказаць, што Ўсяленская Праваслаўная Царква наагул ніколі не вызначалася гэным духам скоўваньня нацыянальнага, што й не яна гэта спаліла Яна Гуса й тых гусытаў, якраз ейных-жа сымпатыкаў. Што ад самых сваіх пачаткаў яна як найшырэй дапушчала ў сябе нацыянальны прынцып як у арганізацыйным разрэзе (царкоўная аўтакефалія), так і ў разрэзе рытуальным (народная мова аж да літургічнага ўжытку). Што заўсёды станоўка адкідала ўсякую строгую цэнтралізацыю рымскага тыпу і, калі так сказаць,

«інтэрнацыяналізацыю» праз адзіную ўнівэрсальную лаціну (з пазьнейшымі папраўкамі на карысьць некаторых толькі, але далёка ня ўсіх, дапушчаных да літургіі моваў). Гэта ўсё так, так было і, на шчасьце, яшчэ тымчасам ёсьць. Але ўжо ці цяперся за ўсім гэтым хоча прабіцца і ў межах гэтае царквы тая-ж самая цэнтралізацыйная і нат «інтэрнацыяналізацыйная» тэндэнцыя. Бо калі гэта ўжо найбольшая прэтэндэнтка на найбольш «ісьцінае» праваслаўе — Масква абвесьціла сябе «Трэйцім Рымам», і то найперш, можа, у царкоўным сэньсе, ды нязломна прастуе да гэтае ролі «праваслаўнага Рыму», а сяньня праціскаецца да яе якраз асабліва напорна. І нікому не сакрэт, што якраз сучасная бальшавіцкая Масква — гэтая найвярнейшая спадкаеміца ўсяго адвечнага маскоўскага духу — у сваёй «новай царкоўнай палітыцы» выкарыстоўвае спакораную ўнутры краю, зьвязаную-скутую сваю праваслаўную царкву найперш як вонкавы дзейнік для апанаваньня ўсім праваслаўным сьветам. Заканчваецца поўнае падпарадкаваньне Маскве ўсіх праваслаўных цэркваў па той бок «зялезнае заслоны», вядзецца ўпорыстае змаганьне навет за пасад «першага між роўных» Усяленскіх Праваслаўных Патрыярхаў — Патрыярха Канстантынопальскага. Не на апошнім месцы й далейшая маскалізацыя-русыфікацыя літургічнае ў бальшыні славянскіх краёў царкоўна-славяншчыны. У апошнім вельмі дзейная, спачуваючы ды памагаючы і ў шмат чым іншым (калі не ўва ўсім чыста), як тайна, так часьцяком і зусім яўна,— белая, «зарубежная», а ўсё тая-ж Масква.

І чырвоная, і белая Масква даклала ўсіх намаганьняў, каб давесьці да стану блізу поўнае ліквідацыі і нашую Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву. У абсягу свае беспасярэдняе ўлады на савецкіх землях чырвоная Масква дасягнула гэтага адразу-ж на ўсе 100 %. Белая, «зарубежная», Масква тут, на чужыне, перанадзіўшы да сябе большыню вышэйшае герархіі Беларускае Праваслаўнае Аўтакефальнае Царквы, спрычыніла дасюлешні «ўдові», безьепіскапскі стан у гэтай Царкве. Ды нязломная вернасьць вернікаў і часткі духаўніцтва ўсьцяж бязупынна шукала шляхоў да аднаўленьня гвалтам і здрадаю здушанага, але праўнага стану. Гэтыя шляхі й прывялі да тае нашае Канстанцы, і ад ейнага зваротнага пункту пачына-

ецца сяньня новы разьдзел у будаўніцтве Беларускае нацыянальнае праваслаўнае царквы.

Ведама ўсім і кажнаму, як цярністым будзе яшчэ далейшы шлях гэтага будаўніцтва. Ведама, якія атакі прыпусьціць тут тая-ж Масква ўсіх каляровых адценьняў — і беспасярэдня, і праз сваю сьведамую ды нясьведамую агентуру. А сярод такое агентуры будуць — дый цяпер ужо ня купіць! — і такія шчыракі, у якіх ужо даўно сьвярбяць далані на раскладаньне новых вогнішчаў і паленьне «гарэтыкаў» — дармо што цяпер ужо з другога боку. Будзе ўсяго... Ды ўсёдна сьвятая й праўдная ідэя не загіне й пераможа канчальна поўнасьцяй. Сяньня, па Канстанцы, пачалося ўжо трыумфальнае шэсьце гэтае перамогі. І няўхільны кірунак гэтага шэсьця — у пэўнае, вялікае сьветлае Заўтра.

Але-ж, жыве Беларуская Праваслаўная Аўтакефальная Царква!

«Бацькаўшчына», 20 чэрвеня 1948 г.

СПЛАЧВАЙМА НАШ ДОЎГ!

Мы, беларусы, што ў выніку вайны і паўторнай акупацыі нашае Бацькаўшчыны маскоўскім бальшавізмам апынуліся на чужыне, зьяўляемся ўсе палітычнымі эмігрантамі. Тут не адыгрывае ніякай ролі факт, ці нехта быў прымусова вывезены немцамі на працу, высланы ў канцэнтрацыйны лягер, прымусова эвакуаваны, ці выехаў дабравольна перад наступам савецкай арміі. Сяньня важным і вызначальным мамэнтам зьяўляюцца прычыны нашай адмовы павароту на Бацькаўшчыну.

Гэтыя прычыны ёсьць чыста палітычныя й аднолькавыя для ўсіх: жаданьне ўратавацца ад масавага палітычнага тэрору, ад фізычных і маральных катаваньняў, ад мучаніцкай сьмерці ў савецкіх турмах ці канцэнтрацыйных лягерах прымусовае працы, куды, як ведама, трапляюць цэлыя мільёны нявінных людзей толькі за тое, што для бяздушных бальшавіцкіх экспэрымэнтаў зьяўляюцца нявыгоднымі.

Паколькі тады мы ўсе — адныя сьведама, а другія сілаю фактаў — сталіся палітычнымі эмігрантамі, гэтым самым мусім прыняць на сябе й усе тыя абавязкі, што звычайна ўскладаюцца на палітычныя эміграцыі наагул.

Палітычная эміграцыя — гэта такая катэгорыя людзей, што, не згаджаючыся з палітычным рэжымам, заведзеным на Бацькаўшчыне, ды будучы ім загрожаная, ідзе на выгнаньне, пераважна дабравольна, каб на чужыне дэманстраваць прасьледаваныя на бацькаўшчыне ідэі й змагацца за іхнае ажыцьцяўленьне. Людзі, што за ідзю дабравольна пакідаюць свой край, выракаюцца асабістага шчасьця й ідуць на выгнаньне, дзе

іх чакае незавіднае жыццё й невядомая будучыня, выяўляюць гэтым вялікі духовы гарт, сілу волі й няштодзённыя маральныя вартасьці. Такім чынам, з паняццем палітычных эмігрантаў само сабой неразьдзельна вяжацца паняцьце высока вартасных з духовага гледзішча людзей.

У якім-жа тады сьвятле вылядаем мы, беларусы на чужыне, і ці адказваем гэтаму высокаму званьню палітычных эмігрантаў?

Гэтае пытаньне павінна прымусіць нас глыбей задумацца над нашай роляй і заданьнямі на чужыне, перагледзець і паддаць рэвізіі дасюлешнія нашыя паводзіны ды прывесьці нас да моцных і канкрэтных пастановаў.

Мы сталіся палітычнымі эмігрантамі і адмовіліся вярнуцца на Бацькаўшыну дзеля таго толькі, каб пазбавіцца тых мукаў і цярпеньняў, якія сталіся сяньня ўдзелам ня толькі асабіста нам найбліжэйшых пакінутых там бацькоў, братоў і сваякоў, але й усяго беларускага народу наагул. Мы ўсе, даўжэй ці карацей знаходзячыся пад бальшавіцкай няволяй, былі навочнымі сьветкамі й непасрэднымі ўдзельнікамі ўсіх жахаў бальшавіцкага зьдзеку, а таму дакладна здаём сабе сяньня справу з таго бязвыхаднага палажэньня, у якім знаходзіцца беларускі народ. Ведаем таксама, што гэты народ ня толькі цягне ярмо няволі, тоячы ў глыбіні душы сваёй бязьмежную нянавісьць да акупанта, але й здабываецца на гэройскія чыны, змагаючыся зь ім. Перадавая частка народу — беларускія партызаны хапіліся за аружжа, каб адпомсьціць за ўсе народныя крыўды, ведаючы пры гэтым, што тым больш незавідны за гэта чакае іх лёс.

І вось усьведамленьне сабе таго палажэньня, што пануе на Бацькаўшчыне і ў якім знаходзіцца наш народ, павінна стацца вызначальным мамэнтам нашае працы й нашых паводзінаў на чужыне.

Многія сяньня ўважаюць, што сам факт іхнага прымусовага выгнаньня зьяўляецца ўжо свайго роду геройствам і дастаткова іх апраўдвае перад тымі, што змушанымі былі астацца на Бацькаўшчыне. Дзеля гэтага ў сваім эгаізьме й самалюбстве думаюць толькі аб сабе, стараючыся як найлепш уладзіцца ды спакойна й бястурботна перачакаць час, калі будзе магчыма вярнуцца назад.

У розных і няроўных умовах апынуліся нашыя людзі на чужыне цяпер, яшчэ больш розныя й няроўныя ўмовы жыцьця іх спаткаюць у найбліжэйшай будучыні. Але найгоршае палажэньне на эміграцыі ёсьць і будзе без параўнаньня куды лепшым за найлепшае на Бацькаўшчыне, пакуль там будзе рабіць свае злачынныя экспэрымэнты маскоўска-бальшавіцкі акупант.

Таму ўсе тыя, каму пашчасьціла вырвацца з бальшавіцкага пекла, не павінны забывацца аб беларускім народзе й ягоных патрэбах, змагацца й працаваць у тым кірунку, які вядзе да вызваленьня нашае Бацькаўшчыны й адбудовы собскае дзяржаўнасьці. Гэта абазначае, што мы як палітычныя эмігранты павінны ўзброіцца ўсімі тымі якасьцямі, якія мусяць характарызаваць палітычных эмігрантаў наагул.

Беларуская нацыянальна-вызвольная праблема яшчэ маладая й малаведамая заходняму сьвету, ад якога ў вялізарнай меры залежыць наш будучы лёс. Прыпомнім сабе, як посьле развалу гітлераўскай Нямеччыны сярод прадстаўнікоў акупацыйных уладаў амаль зусім ня ведалі аб нас як прадстаўнікох самастойнага й вялікага народу. Нас усюды й бадай заўсёды зьмешвалі з расейцамі, «белымі расейцамі», да чаго ня мала, як ведама, прычыняўся й наш нацыянальны назоў. З намі не хацелі гаварыць як з асобнай нацыяй і заспакойваць нашых слушных патрэбаў.

Гэтак было тры гады назад. А сяньня? Палажэньне зусім зьмянілася. Сяньня нас ведаюць, нас цэняць і з намі лічацца. Каб гэтага дапяць, трэба было прарабіць вялізарную й няўдзячную работу, трэба было пісаць, езьдзіць, стукацца, прасіць, а галоўнае — пераконваць, і то пераконваць ня толькі на словах, але й на фактах, у канкрэтнай арганізаванай працы. Такім спосабам першыя масты для нашага «выхаду ў людзі» былі праложаныя. І гэта ўсё зрабіла невялічкая жменька адданых справе й сьведамых сваіх заданьняў людзей, якія, нягледзячы на ўсякія труднасьці, прыкрасьці, а нярэдка й асабістую небясьпеку, рабілі што маглі.

А ў колькі-ж разоў былі-б большыя вынікі нашае працы і на колькі беларуская нацыянальная справа на эміграцыі стаяла-б вышэй і салідней, калі-б ня толькі жменька, а ўсе беларусы ўключыліся ў творчую арганізацыйную працу і кажны, паводля сваіх сілаў і маг-

чымасьцяў, стараўся чэсна й сумленна сплачваць свой доўг перад народам? Адказваць на гэтае пытаньне будзе лішнім. Няхай у душы адкажуць на яго ўсе тыя, што зь недаверам і абыякавасьцю прыглядаліся толькі да гэтае працы і, стоячы з боку, чакалі, што з гэтага выйдзе. Але няхай таксама адкажуць і ўсе тыя, што, называючы сябе сьведамымі беларусамі й нат «беларускімі дзеячамі», ня толькі нічым не прылажыліся да супольнай нацыянальнай справы, але сьведама й злосна падстаўлялі нагу — і падстаўляюць сяньня — усім тым, што ў гэтую працу ўпрагліся.

Прыведзены прыклад аб выніках дасюлешняй нацыянальнай працы беларускай эміграцыі паказвае, што многа ўжо дагэтуль зроблена, але ня менш пераконвае й аб тым, што куды больш яшчэ зрабіць асталося ў кажнай дзялянцы нашага эміграцыйнага жыцьця, як і ў галіне нашых вонкавых дачыненьняў зь іншымі народамі і перад заходнім сьветам.

Сярод іншанацыянальных эміграцыяў існуе пагляд, што кажны палітычны эмігрант дадзенае нацыянальнасьці зьяўляецца свайго роду амбасадарам свайго народу сярод заходнядэмакратычнага сьвету. Правільней нельга й азначыць тых запраўды вялізарных заданьняў, што ўскладваюцца на нас як палітычных эмігрантаў. Бо як мы сябе пакажам перад сьветам, якімі сябе прадставім у вачох іншых народаў, так будуць думаць і аб цэлым нашым народзе й так яго ацэняць. Якую мы правядзём працу перад адказнымі дзейнікамі захаду, у такой меры й будзе разьвязанае імі ў будучыні нашае пытаньне.

І ў гэтым нашым зарэпрэзэнтаваньні самых сябе на чужыне перад іншымі народамі, у настойлівай і энэргічнай абароне нашых нацыянальных інтарэсаў і правоў перад сьветам і заключаецца наш доўг перад беларускім народам і Бацькаўшчынай.

«Бацькаўшчына», 5 верасьня 1948 г.

У ВЯЛІКУЮ ГАДАВІНУ

З году ў год беларускае грамадзянства ўрачыста адзначае гадавіну Вялікага Слуцкага Чыну — Слуцкага збройнага паўстаньня супраць бальшавікоў, якое пачалося роўна 28 год таму — 27 лістапада 1920 г. Паўстаньне гэтае было адным з этапаў нацыянальна-вызвольнага змаганьня беларускага народу за вольную й незалежную Беларускую Народную Рэспубліку, абвешчаную 25 сакавіка 1918 г., і найбольш яркім і вымоўным актам ейнае абароны спасярод многіх іншых падобных актаў, што мелі месца перад гэтым, як і пасьля гэтага.

Слуцкае паўстаньне — гэта ня стыхійны ўзрух беларускага народу, пазбаўлены ясна азначанай мэты, узрух, якіх на працягу нашае гісторыі было вельмі многа. Наадварот, Слуцкае паўстаньне зьяўлялася, бадай, першым вялікіх разьмераў агульнанародным актам, сьведамым сваіх заданьняў і сваёй канчальнай мэты, дарма што падзеі Слуцкага паўстаньня абмежаваліся да невялікай тэрыторыі Случчыны. Гэтай мэтай было змаганьне за захаваньне й абарону перад варожымі чужацкімі наступамі Беларускай Народнай Рэспублікі ў ейных этнаграфічных межах. Гэтую мэту сьцьвердзіла, як ня трэба лепей, Рада Случчыны напярэдадні паўстаньня, 21 лістапада 1920 г. у сваёй дэклярацыі, у якой між іншым было сказана, што «Слуцкая Рада дэкляруе цьвёрда стаяць за незалежнасьць роднае Беларусі і бараніць інтарэсы сялянства ад гвалту з боку чужаземных захопнікаў і ў выпадку патрэбы навет сілаю аружжа, нягледзячы на лічбовую перавагу ворага, думаючы, што наша справа — справа праўдзівая, а праўда заўсёды закрасуе». Слуцкае паўстаньне зьяў-

лялася тады арганічным актам у працэсе адбудовы гаспадарстваўскай незалежнасьці нашай Бацькаўшчыны. І ў гэтай сьведамай мэтаімклівасьці й накіраванасьці й заключаецца адно з найвялікшых значэньняў Слуцкага паўстаньня.

Але Слуцкае паўстаньне было таксама найбольш вымоўным задакумэнтаваньнем перад сьветам і гісторыяй велічы й сьвятасьці нацыянальнай ідэі беларускага народу, які за гэтую ідэю патрапіў здабыцца на так вялікую самаахвярнасьць. Палітычнае палажэньне Беларусі, якая апынулася тады паміж бальшавіцкім молатам і польскім кавадлам, выключала магчымасьць абараніць толькі собскімі скромнымі сіламі маладую беларускую дзяржаву. Нягледзячы, аднак, на гэта, геройскія случчакі спаткалі з боем пераважаючыя сілы бальшавікоў, што йшлі на Беларусь, каб узьдзець волялюбнаму беларускаму народу новае ярмо маскоўскае няволі. Зь безнадзейнасьці свайго збройнага выступленьня, бясспрэчна, і самі случчакі здавалі сабе дакладна справу, аб чым між іншым вельмі красамоўна сьведчыць вышыты рукамі слуцкіх сялянак надпіс на сьцягу паўстанцаў: «Тым, што першыя паўсталі й пайшлі памірaць, каб жыла Бацькаўшчына». Гэтыя словы найглыбей расшыфроўваюць вялікую мэту й значэньне Слуцкага паўстаньня. Адважныя случчакі кідаюцца ў крывавы бой ня толькі па тое, каб жыць у вызваленай імі Бацькаўшчыне, але й па тое, каб памерці для вялікае нацыянальнае ідэі, якая сама па сабе ёсьць несьмяротнай, а праз ахвярны Слуцкі Чын павінна стацца больш блізкім ейнае ажыцьцяўленьне ў будучыні. Такім чынам, Слуцкае паўстаньне было сьведамай падзеяй, што зьмяшчала ў сабе далёкасяжную думку, вартасьць якой не агранічвалася да патрэбаў сучаснасьці, але сягала ў будучыню.

І якраз дзеля гэтага гераічны чын адданых справе случчакоў зьяўляецца такім нам дарагім і блізкім, зьмястоўным і павучальным. Бо й мы ў нашым сяньняшнім змаганьні з тым самым ворагам, зь якім змагаліся случчакі, не павінны разьлічваць толькі на тое, што з вынікаў гэтага змаганьня мусіць карыстацца сучаснае нам пакаленьне й разам зь ім мы самі. Нельга выключаць думкі, што й мы, як слуцкія паўстанцы, кідаемся ў вір змаганьня ня толькі па тое, каб адразу перамагчы й цешыцца вынікамі перамогі, але й па тое,

каб памерці й ахвяраю сьмерці спрычыніцца да перамогі ў будучыні, якая станецца ўдзелам тых, што пасьля нас прыйдуць.

Кажная вялікая ідэя ня ёсьць абмежаная ў часе. Гісторыя дае нам мноства прыкладаў, калі за дасягненьне пэўнае ідэі змагаліся цэлыя пакаленьні ў сьведамасьці, што калі ня ім, дык іхным наступнікам суджана дачакацца перамогі. Але такое ўсьведамленьне не паўстрымоўвала ўзапраўды ідэйных людзей ад найвялікшых навет ахвяраў, бо чалавек, які здольны ўсяцэла пераняцца вышэйшай ідэяй, здольны таксама аддаць для яе ўсё, нягледзячы на тое, які лёс спаткае ў гэтым змаганьні яго асабіста.

І толькі такое змаганьне можа забясьпечыць хуткую й поўную перамогу, удзельнікі якога ня шукаюць асабістае карысьці й славы для сябе, але ахвяроўваюць сябе поўнасьцю агульнанароднай ідэі. Такім якраз было змаганьне слуцкіх паўстанцаў. З прычыны тагачасных няспрыяльных нам абставінаў галоўнае ў выніку пераважаючых сілаў ворага й поўнай адсутнасьці падтрыманьня звонку, Слуцкае паўстаньне ў сваім зачатку было асуджанае на няўдачу. Але й пры іншых абставінах, навет найбольш выгадных і спрыяльных, могуць прынесьці перамогу нашай нацыянальнай ідэі толькі вялікі гераізм і бязьмежная ахвярнасьць у змаганьні, якімі вызначаліся якраз слуцкія паўстанцы. Мы цьвяроза павінны здаваць сабе справу з таго, што зьнішчэньне бальшавізму не разьвязвае яшчэ справы вызваленьня й дзяржаўнай незалежнасьці нашае Бацькаўшчыны. На месца бальшавізму, бясспрэчна, прыйдуць іншыя варожыя нам сілы, якія для сваіх імпэрыялістычных мэтаў будуць імкнуцца захапіць Беларусь, а наш народ і далей трымаць у няволі. Таму збудаваць нашую будучыню зможам толькі мы самі шляхам ахвярнага й непахіснага змаганьня пры выяўленьні ўсіх нашых сілаў і ўсяе нашае волі.

Таму якраз глыбока ідэйны характар Слуцкага паўстаньня зьмяшчае многа павучальнага й для нас сяньня. Палажэньне беларускага народу пад бяспрыкладным бальшавіцкім гнётам і крывавым тэрорам ёсьць нязвычайна цяжкае й трагічнае. Аднак беларускі народ не заламаўся пад цяжарам няволі й ня страціў веры ў лепшую будучыню. Ягоны здаровы сялянскі інстынкт і загартаванасьць у доўгім змаганьні не

дазволілі зламаць ягонае волі й імкненьняў да лепшага жыцьця, на якое мае ён натуральнае права. Гэтую веру захавалі й мы, беларускія палітычныя эмігранты. Як увесь наш народ на Бацькаўшчыне, так і мы на эміграцыі зьяўляемся заўсёды гатовымі змагацца за ажыцьцяўленьне нашай агульнанацыянальнай ідэі, як толькі наступіць адпаведны для гэтага мамэнт. А прыгатаўляючыся да гэтага вялікага змаганьня, мы павінны ўзброіцца ўсімі тымі высокімі ідэйнымі якасьцямі, якія вялі ў бой адважных случчакоў. Усяцэлае й безагляднае ахвяраваньне сябе для ідэі без увагі на собскі інтарэс зьяўляецца адзінай і неабходнай перадумовай для дасягненьня перамогі.

Маючы ўсюды й заўсёды гэта на думцы, мы павінны вызбыцца ўсякіх эгаістычных інстынктаў, а старацца разьвіць у сабе глыбока ідэйныя вартасьці, каб стацца падобнымі да слуцкіх паўстанцаў.

«Бацькаўшчына», 28 лістапада 1948 г.

ПЕРШЫ СУСЬВЕТНЫ ЗЬЕЗД БЕЛАРУСКАЕ ЭМІГРАЦЫІ

Рушымся, брацьця, хутчэй
У бой з жыцьцём, пакідаючы жах;
Крыкі пужлівых людзей
Ня стрымаюць хай бітвы размах...

М. Багдановіч

Так моцна й прыгожа пісаў каля 30 год таму наш вялікі рэвалюцыянэр-патрыёт і паэт, заклікаючы сваіх суродзічаў да змаганьня за сваё шчасьце, свабоду й незалежнасць. На ягоны заклік зьявіліся новыя сотні й тысячы найлепшых сыноў і дачок беларускага народу, павялічылі шэрагі змагароў. Ад гэтага часу расьце, магутнее й шырыцца наш вызвольны рух, набліжаецца да свае канчатковае мэты — вольнае й незалежнае Беларусі.

Аднак вораг таксама ня сьпіць. Рознымі падступнымі спосабамі стараецца ён разьбіць, здэмаралізаваць нашы шэрагі, унесьці атруту зьняверу ў сэрцы іх, мала сьведамых ці прыпадковых удзельнікаў. Нашы запраўдныя патрыёты, аднак, не абмяжоўваюцца толькі дэмаскаваньнем гэнае варожае нам акцыі. Не, яны добра разумеюць, што найлепшым адказам на такога роду акцыі зьяўляецца арганізацыйнае й ідэялягічнае ўзмацненьне нашых шэрагаў.

З другога боку, сучасныя эміграцыйныя ўмовы раскідаюць нас па ўсім сьвеце, расьцярушваюць і аслабляюць нашы сілы. Каб не дапусьціць да гэтага, наадварот, каб яшчэ болей выкарыстаць новыя абставіны й магчымасьці, кіруючыя беларускія дзейнікі прыступілі да зьдзейсьненьня новых заданьняў нашага вызвольнага руху — стварэньня каардынацыйнага цэнтру ўсяе беларускае эміграцыі.

У выніку гэтага Ініцыятыўным Камітэтам беларускае эміграцыі ў Францыі быў скліканы Першы Сусьветны Зьезд Беларускае Эміграцыі ў Парыжы на 28 лістапада 1948 г., які працягнуўся пяць дзён. Зьезд пачаўся а 10-й гадзіне раніцы ў залі Сындыкату Беларускіх Работнікаў у Францыі. У склад Прэзыдыюму Зьезду былі выбраныя: за старшыню — інж. Уладзімер Тамашчык, за заступніка старшыні — праф. Вінцук Жук-Грышкевіч, за сакратароў — інж. Уладзімер Шыманец, Янка Сурвіла й Сьпічонак. Пасьля гэтага Зьезд прыступіў да пакліканьня Мандатнае Камісіі, у якую былі выбраныя Манькоўскі, Лашук і Лысуха.

Першым прывітаў Зьезд Яго Эксцэленцыя Прэзыдэнт БНР інжынер Мікалай Абрамчык, які прыняў удзел і ў працах Зьезду. Пасьля гэтага былі сказаныя й зачытаныя шматлікія прывітаньні ад прадстаўнікоў нашых арганізацыяў і паасобных беларускіх дзеячоў з Англіі, Францыі, Амэрыкі, Канады, Аргентыны, Аўстраліі, Даніі, Швэдыі, Нямеччыны й Бэльгіі. Спасярод пісьменных прывітаньняў на асаблівую ўвагу заслугоўвала прывітаньне Яго Блажэнства япіскапа Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы Сяргея, якое падаём тут поўнасьцю:

«Вітаю Вас, мае дарагія Браты й Дзеці!

Усе дастойнікі паважанае Беларускае Канфэрэнцыі!

Благаславіць Вас Госпад на ўсякі добры пачын! 1-е пасланьне да Карынтыянаў сьв. Апостала Паўлы (1 : 10): «Гэта-ж малю Вас, браты, імем Гаспода нашага Ісуса Хрыста, каб Вы ўсе гаварылі тое самое і каб ня было між Вамі нязгоды, але каб Вы былі задзіночаныя ў адным розуме ды ў думцы аднэй!» Пасланьне да Рымлянаў сьв. Апостала Паўлы (16 : 17): «Малю Вас, Браты, каб Вы высьцерагаліся тых, што чыняць нязгоды й спакусы супраць навукі, якой Вы наўчыліся, і унікайце іх!»

Вітаю Вас, мае дарагія Браты й Сёстры й веручыя беларусы Хрыстовай Беларускай Аўтакефальнай Царквы! Вітаю Вас, наймілейшыя, упаўнаважаныя на гэтую пачэсную Беларускую Канфэрэнцыю! Няхай Вам Госпад пасылае сілу, розум і аднадушша ды адзіную братнюю любоў! Божае Багаславеньне клічу на Вас. Памажы Вам Божа на ўсякую добрую справу!

Япіскап Сяргей усяе Францускае зоны
Апякун Беларускай Праваслаўнай
Аўтакефальнай Царквы».

Пасьля прывітаньняў, ушанаваўшы памяць загінуўшых змагароў мінуткай маўчаньня, зьезд, на чале з Прэзыдэнтам, накіраваўся ў беларускую царкву на ўрачыстую Багаслужбу, падчас якой прыгожыя беларускія рэлігійныя песьні кранулі да сьлёз не аднаго дэлегата, а заклік сьвятара будаваць Беларускі Дом з Богам глыбока запаў у сэрцы ўсіх прысутных.

Вечарам таго-ж дня Хаўрус беларускіх работнікаў у Парыжы зрабіў скромнае, але мілае прыняцьце ўсіх дэлегатаў і гасьцей у сваім Сындыкаце. Мілая атмасфэра была вынікам самаахвярнае працы нашых жанчын у Парыжы. Гэтая атмасфэра, як і зразуменьне гістарычнага значэньня адбываных нарадаў спрычыніліся да таго, што ўсе 22 паўнамоцныя дэлегаты ні на часіну не паслабілі свайго сур'ёзнага й уважлівага адношаньня да кажнага пытаньня парадку дня й прыйманых рэзалюцыяў.

Перадусім адбыліся справаздачы зь дзейнасьці нашых арганізацыяў ва ўсіх краёх, куды лёс закінуў нашых суродзічаў. Дэлэгаты пры гэтым з радасьцю сьцьвярджалі самаахвярнасьць нашых патрыётаў, нашы вялікія посьпехі на працягу прыблізна двохгадовае працы.

Нашы французскія сябры маглі пахваліцца сваім аддзелам пры хрысьціянскім сындыкаце французскіх работнікаў, арганізацыяй прафэсыянальных курсаў для беларускіх работнікаў, выступамі нашых жанчын на міжнародных зьездах, выданьнем брашуры «Беларусь» у французкай мове, складаньнем розных мэмарандумаў аб Беларусі на розных міжнародных канфэрэнцыях і г. д. Беларусы з Англіі напоўнілі радасьцю й гонарам сэрцы прысутных фактам куплі ўласнага дому ў Лёндане й другога на правінцыі, што было зроблена выключна дзякуючы самаахвярнасьці сьведамых сяброў. Бязумоўна, гэта не адзіны іх посьпех. Беларуская прэса — «Беларус на чужыне», «Моладзь», часапіс 12 «Наперад» сьветчаць таксама аб іх вялікай пазытыўнай працы.

Беларусы Нямеччыны таксама маглі паказаць зьезду шмат канкрэтных вынікаў свае працы: яшчэ каля году таму назад яны ня мелі там правоў асобнага народу. Сяньня існуюць шматлікія беларускія лягеры й беларускія нацыянальныя групы. Ува ўсіх беларускіх лягерах і групах працуюць беларускія пачаткавыя

школы, 3 гімназіі, розныя курсы. У арганізацыйна-грамадзкім жыцьці працуюць зонныя й акруговыя камітэты, на чале якіх стаіць Беларускі Нацыянальны-Цэнтральны Камітэт. Згуртаваньне Беларускіх Скаўтаў з гонарам прапагуе імя беларуса шырока паза межамі Нямеччыны, таксама як і Цэнтраля Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў. Працуюць саюзы Настаўнікаў, Лекараў, Вэтэранаў, Жанчын, Беларускае Навуковае Таварыства і г. д. Выдаецца шырокая беларуская прэса зь ліцэнцыяванай «Бацькаўшчынай» і «Сакавіком» на чале.

Беларусы ў Бэльгіі таксама пачалі добра працаваць. Той факт, што яны дамагліся прызнаньня стыпэндыяў для 20 беларускіх студэнтаў, зьяўляецца іх добрым посьпехам. Беларускі Камітэт у Аргентыне ўжо добра вядомы шырокім колам нашай эміграцыі здабываньнем візаў на ўезд у гэтую краіну. Ягоны старшыня сп. Мерляк сваім выступам на мітынгу паняволеных народаў у Буэнас-Айрэс шырока спапулярызаваў імя Беларуса ўва ўсёй Аргентыне.

Беларусы ў Канадзе, Амэрыцы, Італіі й Аўстраліі пасьпяхова праводзяць арганізацыйнае афармленьне Беларускіх Нацыянальных Камітэтаў.

Бязумоўна, прыгэтым было выяўлена таксама шмат недахопаў і балячак, як — нашы слабыя матарыяльныя рэсурсы, брак кадраў, недамаганьні інфармацыі й сувязяў, слабая прапаганда нашага вызвольнага руху й гісторыі наагул і г. д. Па ўсіх гэтых пытаньнях была праведзена шырокая дыскусыя й прынята шэраг пастановаў і рэзалюцыяў.

Пасьля гэтага былі ўтвораныя дзьве камісіі: рэзалюцыйная й статутовая. Запрапанаваны гэтай апошняй камісіяй статут новае арганізацыі быў паддадзены шырокай дыскусіі, якая цягнулася паўтара дня. Паводля прынятага статуту нова заложаная беларуская цэнтральная эмігрыцыйная арганізацыя называецца: *«Сусьветнае Аб'яднаньне Беларускае Эміграцыі»* зь месцам свайго знаходжаньня ў Парыжы. Сябры Аб'яднаньня могуць быць беспасярэднія й пасярэднія. Беспасярэднімі зьяўляюцца ўсе цэнтральныя беларускія арганізацыі паасобных краёў (у Нямеччыне — Беларускі Нацыянальны Камітэт на Нямеччыну), а пасярэднімі — усе іншыя беларускія арганізацыі.

Урад Аб'яднаньня быў выбраны ў наступным скла-

дзе: старшыня — інж. Лявон Рыдлеўскі (Францыя), заступнікі старшыні — праф. Вінцук Жук-Грышкевіч (Англія), інж. Уладзімер Тамашчык (Нямеччына), інж. Уладзімер Шыманец (Францыя). Сакратар — Янка Сурвіла (Францыя), рэфэрэнты духовае апекі — Яго Блажэнства япіскап Сяргей (Нямеччына) і айцец Францішак Чарняўскі (Францыя), рэфэрэнт сацыяльнае апекі — айцец Леў Гарошка (Францыя), рэфэрэнт архіваў і дакумэнтацыі — праф. Мікола Нікан (Англія) і рэфэрэнт культуры й асьветы — праф. Вінцук Грышкевіч (Англія), рэфэрэнт прэсы й інфармацыі — Пётр Манькоўскі (Нямеччына), фінансавы рэфэрэнт — інж. Ул. Шыманец. Апрача ўраду была таксама выбраная Наглядная Рада й Грамадзкі Суд.

На Зьездзе былі ўпаўнаважаныя дэлегаты з правам пастанаўляючага голасу з наступных краёў: Францыя — 9 дэлегатаў, Англія — 4, Нямеччына — 2, Бэльгія — 1, Данія — 1, Швэдыя — 1, Італія — 1, Канада — 1, Аргентына — 1 і Аўстралія — 1.

Нарэшце неабходна падчыркнуць, што амаль усе пастановы й рэзалюцыі Зьезду былі прыняты аднагалосна ўсімі дэлегатамі. Гэтая аднадумнасьць дэлегатаў была, бязумоўна, выяўленьнем аднадумнасьці ўсяе нашае патрыятычнае грамадзкасьці ўва ўсім сьвеце.

Вычарпаўшы поўнасьцю ўсе пытаньні парадку дня, старшыня Зьезду пажадаў выбранаму Ўраду Сусьветнага Аб'яднаньня Беларускае Эміграцыі плённае працы і, 2 сьнежаня а 14-й гадзіне, зачыніў Зьезд.

Такім чынам, беларускі вызвольны рух станоўка «рушыўся ў бой з жыцьцём, пакідаючы жах»... Ніякія ворагі «ня стрымаюць нашай бітвы размах»...

«Бацькаўшчына», 12 сьнежня 1948 г.

ЗВАРОТ ПЕРШАГА СУСЬВЕТНАГА ЗЬЕЗДУ БЕЛАРУСКАЕ ЭМІГРАЦЫІ ДА БЕЛАРУСАЎ І БЕЛАРУСАК УВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ

Дарагія браты і сёстры!

Здаўна ўжо з году ў год тысячамі пакідалі беларусы сваю паняволеную зямліцу, каб шукаць на далёкай чужыне волі й хлеба, якога замала было ў родным краі пры чужым праве й насільлі. Мільёны кідалі родныя нівы, на якіх ня стала месца для шчырых сыноў Беларусі й патрыётаў роднае справы. Але на гэтых мільёнах «старых» эмігрантаў ня кончыліся пакуты беларусаў на чужыне. Вось мінула ўжо 9 год з тае часіны, калі на землях Беларусі прагрымелі першыя стрэлы тае сусьветнае буры, што новым мільёнам з нас адабрала ўсё найдаражэйшае — родную хату, цяпло сямейнага кутка, шматок уласнага загону й братнія душы блізкіх і знаёмых. Гэтая сусьветная завіруха раскінула нас па ўсім сьвеце, яна пазакідала нас у найдалейшыя закуткі гэтае плянэты ў чужое акружэньне.

Пры суровых абставінах цяжкае працы і ў адзіноцтве хай-жа шукае свой свайго, бо толькі ў братнім беларускім сэрцы знойдзе шчырую спагаду ў горы й няшчасьці.

1-ы зьезд беларускае эміграцыі выявіў радасны факт, што амаль усюды, дзе знайшліся хаця-б невялікія групы беларускіх эмігрантаў, яны дружна гуртуюцца ў нацыянальныя беларускія арганізацыі, каб бараніць сваіх слушных правоў і жыць сваім беларускім жыцьцём.

Зьезд сьцьвярджае затым, што згоднае сужыцьцё і арганізацыйная згуртаванасьць ёсць жыцьцёвай не-

абходнасьцю й першым практычным заданьнем для кажнае групы беларускіх эмігрантаў, роўна ў кажным краі і на ўсіх кантынэнтах. Дзеля таго, каб гэтае важнае жыцьцёвае заданьне стала запраўднасьцю, трэба ймкнуцца да ідэйнага задзіночаньня ўсіх чэсных і шчырых беларускіх патрыётаў у змаганьні зь сіламі, варожымі беларускаму народу. У імя высокіх ідэалаў свабоды й лепшае долі для народу нашага і дарагое Маці — Беларусі, за якія ўжо палі бязьлікія ахвяры, і за якія й мы ўсе церпім нягоды выгнаньня — адкідаючы ўсе дробязі і асабістыя ўразы, змагаймася з дэструктарамі, што сеюць сярод нас нязгоду й разлад. Мы ня можам ніколі забывацца, што ўсюды й заўсёды нашым вялікім абавязкам ёсьць утрымаць суцэльнымі духовыя вязі з пакутуючым народам беларускім і дарагой Бацькаўшчынай, із слаўным нашым гістарычным мінулым і з духам тых пакаленьняў, што цярпелі й гінулі за нас — з традыцыямі цяжкога змаганьня за адраджэньне й свабоду беларускага гаспадарства. З увагі на гэта і ў поўнай сьведамасьці вялікае адказнасьці кажнага з нас паасобку і ўсіх разам перад маестатам зьняволенае Бацькаўшчыны й перад судом будучых пакаленьняў мы, поўнамоцныя дэлегаты ад беларускіх арганізацыяў Англіі, Аргентыны, Аўстраліі, Бэльгіі, Даніі, Італіі, Канады, Нямеччыны, Францыі й Швэдыі, горача клічам нашых сяcьцёр і братоў-беларусаў гуртавацца пад родным сьцягам Беларускае Народнае Рэспублікі, якая цераз Раду БНР, Прэзыдэнта Рэспублікі інж. М. Абрамчыка і Ўрад БНР зьяўляецца беспасярэднім злучвом з прыгожымі традыцыямі нашага вызвольнага змаганьня, яго найвышэйшым дасюль здабыткам і адзінай для нас надзеяй і гарантыяй павароту на вольную Беларускую Зямлю!

Хай-жа сардэчны наш заклік дасягне ўсіх закуткаў зямлі і ўзварушыць сэрцы людзей добрае волі, у каго ня выгасла яшчэ каханьне роднае старонкі.

Дзеля гуртаваньня ўсіх нацыянальных сілаў беларускае эміграцыі й каардынацыі яе арганізацыйнатворчае працы паклікаецца да жыцьця Сусьветнае Аб'яднаньне Беларускае Эміграцыі зь сядзібаю ў Парыжы.

Беларускія арганізацыі ўва ўсіх краінах сьвету заклікаюцца гэтым неадкладна навязаць сувязь із САБЭ ды ўтрымоўваць зь ім сталы й цесны кантакт.

Няхай жыве Беларуская Народная Рэспубліка!
Няхай жыве вольны Беларускі Народ!

Сакратар Зьезду
Старшыня Зьезду

Парыж, 2 сьнежня 1948 г.

Адрас Сусьветнага Аб'яднаньня Беларускай Эміграцыі:
65 Rue des Gravilliers
Paris (3), France.

«Бацькаўшчына», 12 сьнежня 1948 г.

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПЕРШАГА СУСЬВЕТНАГА ЗЬЕЗДУ БЕЛАРУСКАЕ ЭМІГРАЦЫІ

Выслухаўшы даклады аб жыццьці і грамадзкай працы беларускай эміграцыі ў Нямеччыне, Вялікай Брытаніі, Францыі, Бэльгіі, Швэдыі, Даніі, Італіі, Злучаных Штатах Амэрыкі, Канадзе, Аргентыне і Аўстраліі, Сусьветны Зьезд Беларускай Эміграцыі ў Парыжы 28.11 — 2.12.1948 г. пастанавіў за неабходнае правесьці наступныя мерапрыемствы сярод беларускай эміграцыі ў вышэй успомненых краінах.

1. Узмоцніць акцыю ўсьведамленьня, гуртаваньня й арганізаваньня беларусаў.

2. Зьвязаць і здысцыплінаваць грамадзкія актывы пры помачы канкрэтнай праграмы дзеяньня і тактыкі, дастасаваных да мясцовых патрэбаў і ўмоваў так, каб праца вялася рацыянальна, плянава і сыстэматычна бязь ніякіх перарываў.

3. Старацца стварыць сталыя матар'яльныя базы для беларускай грамадзкай працы, выкарыстоўваючы для гэтага мясцовыя ўмовы й магчымасьці.

4. Стварыць адзінае ўсебеларускае кіраўніцтва ўсёй беларускай работы на эміграцыі і ўсестароньняй апекі над беларускімі эмігрантамі ўва ўсіх краінах, дзе-б яны ні былі, з прадстаўніцтвамі ад усебеларускага кіраўніцтва.

5. Сканцэнтраваць і скаардынаваць усе высілкі ў справе беларускай прэсы і выдавецтва наагул.

6. Стварыць Цэнтральную Беларускую Інфармацыйную Службу і архіў дакумантаў.

7. Правесьці рэгістрацыю беларускіх эмігрантаў ува ўсіх краінах.

8. Дзеля аб'яднаньня і скансалідаваньня ўсёй беларускай эміграцыі — праводзіць сталае, пляновае і сы-

стэматычнае змаганьне з усякага роду дэструкцыйнай работай і дывэрсыяй, скіраванымі на разьбіцьцё беларускага жыцьця,— з асаблівай увагай на зарубежніцтва й астроўшчыну.

9. У грамадзкай рабоце праводзіць рацыянальны падзел працы, не дапускаючы, каб кіруючы актыў, які перагружаны арганізацыйнай работай, займаўся яшчэ тэхнічнай працай, не вымагаючай спэцыяльных кваліфікацыяў.

10. У парадку грамадзкай дысцыпліны забавязаць да актыўнай працы ўсе інтэлігенцкія кваліфікаваныя адзінкі, якія дагэтуль адзначаюцца бязьдзейнасьцяй.

11. Узмоцніць высілкі дзеля павялічэньня колькасьці студыюючых беларусаў з мэтай запэўненьня росту кадраў беларускай інтэлігенцыі і арганізацыі беларускіх школаў і навуковых установаў.

12. Зьвярнуць увагу на арганізацыйна-грамадзкую і ўзгадаваўчую работу беларускіх жанчын — матак беларускіх пакаленьняў.

13. Ува ўсёй рабоце прыслухоўвацца да голасу масаў беларускай эміграцыі і ўзгадняць зь імі і іх патрэбамі бягучую штодзённую дзейнасьць.

14. Стварыць цэнтралю беларускіх камбатантаўвайскавікоў у сусьветным значэньні дзеля кансалідаваньня і каардынаваньня іх арганізацыйнай работы.

15. Сабраць усе паданыя на Зьезьдзе справаздачы на пісьме, адбіваючыя абраз жыцьця і працы беларускай эміграцыі, і выдаць іх друкам.

Сакратар Зьезду
Старшыня Зьезду

Парыж, 2 сьнежня 1948 г.

«Бацькаўшчына», 12 сьнежня 1948 г.

Д. ЯСЬКО

НОВЫ ЗАПАВЕТ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

«Слова Тваё — сьветач для стоп маіх
і сьвятло на сьцежцы маёй» (Пс. 119:105).

На пачатку XVI стагодзьдзя перадавы беларус з заходняэўрапейскаю адукацыяй, доктар Францішак Скарына добра ведаў вялікую сілу слова Божага як у жыцьці адзінкі, так і ў жыцьці цэлага народу. Ніхто ня можа запярэчыць таму, што агульная асьвета найбольш пашырана там, дзе шырока распаўсюджана і чытаецца Евангельле ў роднай мове. Гэтага жадаў для беларусаў д-р Ф. Скарына і з гэтаю мэтаю ўзяўся за пераклад і выданьне Бібліі. У той самы час, калі доктар Марцін Лютар перакладаў Біблію на нямецкую мову (1522—34 гг.), Біблія на беларускай мове ўжо друкавалася (1518—23 гг.), насамперш у Празе Чэскай, а пазьней — у Вільні. На вялікі жаль, тады на Беларусі мала хто карыстаўся словам Божым як сьветачам для стоп сваіх, людзей адукаваных і, наагул, пісьменных было ня шмат, таму ад перакладу Ф. Скарыны захаваліся і перахоўваюцца цяпер у музэях толькі некаторыя кнігі сьв. Пісаньня.

Таксама сьведамы беларус і рэлігійны дзеяч, Васіль Цяпінскі, каля 1570 г. у сваёй вандроўнай друкарні надрукаваў Евангельле ад Мацьвея і Марка, якія былі пераложаны на беларускую народную мову. Аднак дзеля таго, што пратэстантызм на Беларусі быў тады разьбіты на некалькі кірункаў, а да таго слаба ўкараняўся сярод сялянства, яму было цяжка змагацца і, з часам, утраціў сваю сілу як распаўсюджваньня, так і выдаваньня рэлігійнай літаратуры. Час заняпаду беларускай незалежнай дзяржаўнасьці стаўся і часам заняпаду пратэстантызму на Беларусі і цесна зьвязанага зь ім распаўсюджваньня слова Божага ў роднай мове.

Перад Першаю сусьветнаю вайною пратэстантызм (пераважна евангельска-баптыскі напрамак) паволі

пашыраўся на Беларусі, але набажэнствы адбываліся ў мове расейскай, бо ані бібліяў, ані рэлігійных сьпеўнікаў на беларускай мове ня было. Пасьля-ж той вайны на гэты недахоп зьвярнуў сваю ўвагу баптыскі сьвятар Л. Н. Дзекуць-Малей, які працаваў у Берасьці. Разам із сваёю жонкаю, С. А., узяўся ён перакладаць Евангельле на беларускую мову. Не давяраючы собскім сілам, зьвярнуўся па фаховыя парады і папраўкі да ведамага беларускага дзеяча і крытыка А. Луцкевіча, які ахвотна ўзяўся дапамагчы ў гэтай карыснай для народу працы. У 1927 годзе баптыскае выдавецтва «Компас» надрукавала паасобныя Евангельлі (Мацьвея, Марка, Лукі, Іоана) і некалькі брашураў на беларускай мове. Бог паслаў ахвярнага англійца, які фінансаваў гэтае выданьне.

Прафэсар А. Луцкевіч, як і чатырыста год таму назад доктар Ф. Скарына, зразумеў, што слова Божае ў роднай мове можа зрабіць нешта вялікае ў жыцьці народу, і ўзяўся перакладаць увесь Новы Запавет. Ён маніўся пералажыць і цэлую Біблію, але, на вялікі жаль, яму ня суджана было зрабіць гэтую вялікую працу. Свой пераклад ён аддаў Брытанскаму і Замежнаму Біблійнаму Таварыству (БЗБТ), якое і выдала ў 1931 годзе (у Гэльсінгфорсе, Фінляндыя) Новы Запавет з Псальмамі на беларускай мове. Як і заўсёды, знайшліся праціўнікі гэтай працы, якія ганілі і паніжалі яе. Некаторыя прабавалі даказваць, што гэта праца — «сэкцярская». Праўда, дзе-якія словы ў перакладзе і карэктарскія памылкі ня шкодзіла-б паправіць, але ў большасці выпадкаў, дзе пераклад праф. А. Луцкевіча разыходзіцца з расейскім, ён рабіў гэта сьведама на карысьць дакладнасьці ў перадачы арыгіналу.

Напалоханыя прывідам, што народ возьмецца чытаць Евангельле ў роднай мове «сэкцярскага выданьня», бо без усякіх камэнтараў, і зразумее так, як там напісана, каталіцкія сьвятары зрабілі разважны крок і хутка перад Другою сусьветнаю вайною выдалі Евангельле і Дзеяньні Апосталаў з кароткімі камэнтарамі. Для народу было-б вельмі пажаданым і карысным, калі-б яны выдалі і цэлую Біблію на беларускай мове.

Другая сусьветная вайна, як гураган, ня толькі зьмяла шмат местаў, ня толькі выкінула тысячы людзей з родных сяліб на бадзяньне па чужых краёх, але зьнішчыла і ўсе Новыя Запаветы, якія знаходзіліся на скла-

дзе Біблійнага Таварыства ў Фінляндыі. У часе вайны і па заканчэнні яе быў вялікі попыт на беларускія Новыя Запаветы, але нідзе ня можна было іх дастаць.

Доктар В. Тумаш у 1946 годзе першы зьвярнуўся да Брытанскага і Замежнага Біблійнага Таварыства з просьбаю аб выданьні, калі ня цэлай Бібліі, дык хоць-бы Новага Запавету на беларускай мове. Да ягонай просьбы далучыліся просьбы некаторых пратэстанцкіх сьвятароў, якія апрача гэтага зьвярталіся і да амэрыканскіх капэлянаў, і да Сусьветнай Рады Цэркваў, і да Швэдзкага Біблійнага Таварыства. Брытанскае і Замежнае Біблійнае Таварыства адгукнулася адумысловым лістом да перадавых сьвятароў праваслаўнага, каталіцкага і евангельскага веравызнанняў, у якім пыталася, ці пераклад іх выданьня Н. З. з 1931 г. добры, ці беларусы канечна патрабуюць сьв. Пісаньня ў роднай мове і сколькі больш-менш беларусаў знаходзіцца на эміграцыі, каб ведаць, якую колькасьць Н. З. трэба выдаць. Адказы былі настолькі разьбежныя, што англійцы страцілі давер да беларусаў і зьвярнуліся да сп. Я. Дыка, сакратара нямецкай «Місыі для Распаўсюджваньня Евангельля» (цэнтр у Штутгарце) з просьбаю даць аўтарытэтныя дадзеныя аб колькасці беларусаў на эміграцыі (бо адзін беларускі сьвятар налічыў іх усяго 5000, а другі — 50 000). Сп. Я. Дык сабраў адпаведныя дадзеныя, далучыў да іх сваё жаданьне мець 3000 Н. З. у беларускай мове і паслаў БЗБТ. Гэта вырашыла справу. Чысты, мала ўжываны паасобнік Н. З. выданьня 1931 г. захаваўся ў расейца, баптыскага сьвятара Г. Болтнева, які ахвотна аддаў яго для перадрукаваньня. Справа зацягвалася нейкі час дзеля нястачы то паперы, то палатна на аправу. Нарэшце ў канцы 1948 г. патрэбную колькасьць Новых Запаветаў на беларускай мове Брытанскае і Замежнае Біблійнае Таварыства прыслала ў Нямеччыну. Цяпер кажны беларус мае магчымасьць набыць гэтую сьвятую кнігу, чытаць яе і паслугоўвацца ёю як «сьветачам для стоп сваіх» у сваім вандроўным жыцьці. Слава і падзяка Богу, што Ён зноў даў нам цераз сваіх людзей гэтую сьвятую кнігу. Спадзяюся, што беларуская грамадзкасьць будзе ўдзячна кажнаму, хто прылажыў сваю руку да таго, каб беларускі народ меў Новы Запавет на сваей роднай мове.

«Бацькаўшчына», 30 студзеня 1949 г.

СТАНІСЛАЎ СТАНКЕВІЧ

У НОВЫХ КРАЁХ — НОВЫЯ ЗАДАНЬНІ

Ад некатарага часу эміграцыйная акцыя сярод перамяшчэнцаў-ДП у краіны сталага побыту настолькі ўзмоцнілася, што сяньня ўжо можна гаварыць аб ейнай масавасьці. Калі яшчэ нядаўна выезд тэй ці іншай сям'і зь лягеру ДП прадстаўляў сабою да некаторай меры сэнсацыю, рэдка спатыканую ў лягеры, то ўжо сяньня такія выпадкі належаць да звычайных штодзённых зьявішчаў. Пры гэтым эміграцыйныя ўстановы для ДП заяўляюць афіцыйна, што ў хуткім часе тэмп эміграцыі яшчэ больш узмоцніцца.

Усё гэта, бясспрэчна, павінна нас толькі цешыць. Нягледзячы на тое, што не заўсёды нашыя суродзічы могуць ехаць у тыя краіны, куды яны хацелі-б, і нягледзячы на тое, што сам падход да вэрбоўкі нашых людзей на эміграцыю часта зьяўляецца для нас крыўдным і абразьлівым, калі галоўнай падставай прыняцьця кандыдата зьяўляецца ня толькі ягоны сямейны стан і сьцісла абмежаваны век, але навет адпаведная сіла мускулаў, то ўсё-ж такі факт астаецца фактам — ладная колькасьць нашых людзей ужо выехала й шмат спасярод яшчэ астаўшыхся, а мо й большыня мае ўсе дадзеныя хутка разьвітацца зь негасьціннай Нямеччынай і з тымі цяжкімі, ненармальнымі й дэмаралізуючымі ўмовамі жыцьця, у якіх трэба было знаходзіцца на працягу некалькіх апошніх год у лягерах ДП. Бо трэба сказаць адкрыта, што сказармаванае лягернае жыцьцё, поўнае самых элемэнтарных недастаткаў, часта недапушчальныя ў культурным сьвеце бытавыя ўмовы, бязьдзейнасьць, а галоўнае — няпэўнасьць свайго будучага лёсу й страх перад тым, каб узноў не папасьці ў крывавыя абоймы «любімага бацькі», вельмі

адмоўна адбіліся на псыхічным і маральным стане ўсяе масы перамяшчэнцаў. Таму іменна мы й вітаем сяньняшнюю эміграцыйную акцыю, нягледзячы навет на ўсе ейныя недахопы.

Але раўналежна ізь перасяленьнем нашых суродзічаў зь Нямеччыны ў іншыя, пераважна заморскія краі й у сувязі з расьцярушваньнем іх на далёка большым прасторы, чымсьці адна шостая частка сьвету, войстра выныраюць перад намі пытаньні ня толькі жыцьцёвага, але й нацыянальнага характару. Галоўныя вогнішчы беларускага палітычнага й нацыянальнага жыцьця, якія дагэтуль знаходзіліся ў Нямеччыне, у сілу абставінаў будуць цяпер перанесеныя ў тыя краі, куды ў сваёй аснаўной масе пераедуць нашыя людзі. Беларускія нацыянальныя арганізацыі ў паасобных краёх дэмакратычнага сьвету цяпер, з прыплывам новых сілаў, будуць мець магчымасьць значна пашырыцца й узмоцніцца. Ходзіць толькі пра тое, каб нашыя нацыянальныя арганізацыі, як у Нямеччыне, гэтак і ў тых краёх, куды прыбываюць новыя эмігранты, праявілі дастаткова энэргіі й арганізацыйных здольнасьцяў дзеля таго, каб ніводзін зь беларускіх эмігрантаў, апынуўшыся ў новай краіне далёка ад сваіх суродзічаў, не загубіўся ў чужой яму масе, але каб быў ахоплены сваёй нацыянальнай арганізацыяй.

Гэтае адказнае заданьне стаіць, аднак, ува ўсёй сваёй вастрыні ня толькі перад нашымі арганізацыямі, але ў роўнай меры й перад самымі перамяшчэнцамі. Кажны спасярод апошніх павінен глыбака ўсьведаміць сабе, што найвялікшым ягоным абавязкам на чужыне ёсьць захаваньне таго найдаражэйшага скарбу, які ён вынес із сваёй роднай хаты на Бацькаўшчыне — *сваёй беларускай нацыянальнасьці*. Захаваць-жа сваю нацыянальнасьць зможам лёгка тады, калі, нягледзячы на вялікія прасторы, што нас будуць дзяліць, захаваем між сабою цесную арганізацыйную сувязь. Ужо сяньня сярод беларускае эміграцыі існуе адпаведная арганізацыйная сетка: у кажнай краіне, дзе ёсьць большая колькасьць беларускае эміграцыі, існуюць беларускія нацыянальныя арганізацыі ці камітэты, якія гуртуюць там нашых суродзічаў і праводзяць сярод іх нацыянальна-грамадзкую працу ды аказваюць ім неабходную дапамогу. Гэтак, апрача Нямеччыны, існуюць такія арганізацыі ў Францыі, Ангельшчыне, Бэльгіі, Швэдыі,

а з краёў заакіянскіх — у ЗША, Канадзе, Аргентыне й Аўстраліі. На чале ўсіх гэтых арганізацыяў стаіць Сусьветнае Аб'яднаньне Беларускае Эміграцыі (САБЭ) у Парыжы, якое каардынуе іхную дзейнасьць.

Вось-жа ніводзін беларус не павінен выехаць зь Нямеччыны без адрасу свае арганізацыі тэй краіны, у якую ён эмігруе, каб, прыбыўшы на месца, неадкладна навязаць зь ёю сувязь і ўліцца ў лік ейных сяброў. З другога-ж боку самі арганізацыі на чале із САБЭ павінны сяньня праяўляць асаблівую актыўнасьць у кірунку вэрбаваньня новых сяброў спаміж новае эміграцыі й разгортваньня сярод іх нацыянальнае працы.

Як ужо няраз зазначалася, мы зьяўляемся палітычнымі эмігрантамі ў сьціслым значэньні гэтага слова. Гэты палітычны характар прыдае нам ня гэтулькі тое, із-за якіх прычынаў пакінулі мы нашую Бацькаўшчыну, сколькі тое, чаму мы не захацелі да яе вярнуцца. А прычыны, што нас паўстрымалі ад павароту, зьяўляюцца выключна палітычнага характару. І наш побыт на чужыне ёсьць наяўным задакумэнтаваньнем перад сьветам нашага пратэсту супраць нялюдзкіх гвалтаў і крывавага тэрору бальшавіцкіх акупантаў і з другога боку — маніфэстанцыяй перад тым-жа сьветам нашае нацыянальна-вызвольнае ідэі. Таму, як звычайна гавораць аб сабе й эмігранты іншых нацыянальнасьцяў, *кажны беларускі эмігрант павінен быць сяньня амбасадарам сваёй Бацькаўшчыны сярод народаў сьвету.* Мы не павінны забывацца, што як мы сябе пакажам на чужыне, так — паводля нашых паводзінаў — будуць цаніць ня толькі нас, але й увесь наш народ на Бацькаўшчыне. Іншыя народы сьвету й адказныя палітычныя дзейнікі ў вялікай меры так паставяцца да справы нацыянальнага вызваленьня й дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі, як мы, будучы прадстаўнікамі беларускага народу на чужыне, на гэта заслужым.

Што нашая адказнасьць на чужыне зьяўляецца вялізарнай, ня трэба ў сувязі з вышэйшым даводзіць. Трэба толькі мець яе заўсёды наўвеце ў кажнай нашай дзейнасьці, у кажным выступленьні навонкі, у кажным нашым захаваньні, навет найдрабнейшым, здаючы сабе справу з таго, што на падставе дробных рэчаў чужынцы ствараюць агульнае ўяўленьне аб дадзенай адзінцы й аб цэлым народзе, да якога адзінка гэтая належыць. Нашыя арганізацыі ўва ўсіх краінах павінны праводзіць

інтэнсыўную ўсьведамляючую работу, а дзе трэба, і самае вострае грамадзкае ўзьдзейваньне, каб нашыя суродзічы паказалі сябе перад чужынцамі з найлепшага боку — былі сумленнымі працаўнікамі, добрымі беларускімі патрыётамі й стаялі на належнай этычна-маральнай вышыні.

Мы верым, што наш побыт на чужыне будзе часовым і што яшчэ дачакаемся вызваленьня нашае Бацькаўшчыны з-пад ярма маскоўска-бальшавіцкае няволі. Сусьветныя палітычныя падзеі, што разьвіваюцца цяпер з маланкавай шыбкасьцю, абгрунтоўваюць спадзяваньні беларускае эміграцыі на паварот у вольную Беларусь. Няўпыннае змаганьне беларускага народу супраць чырвонага акупанта, збройная акцыя нашых гераічных партызанаў сьветчаць аб тым, што беларускі народ не заламаўся пад крывавым тэрорам Масквы, ня спыніў свайго імкненьня да волі, наадварот — у заўзятым, хоць няроўным змаганьні гартуе ён свае сілы для канчальнага зудару з адвечным ворагам. Гэта найлепшая зарука таго, што новая сусьветная завіруха, якой спадзяецца сьвет, ня пройдзе бяз нашага актыўнага ўдзелу й што пры перабудове эўрапэйскага Ўсходу знойдзецца на парадку дня й пытаньне незалежнасьці Беларусі.

Вось чаму й мы не павінны замыкацца ў цесных рамах эміграцыйнага жыцьця, але мусім з усёй сур'ёзнасьцю прыгатаўляцца да будучага змаганьня за вызваленьне Бацькаўшчыны й да творчае працы над адбудоваю ейнае дзяржаўнасьці. *Дрэнны бо той беларус, што, згубіўшы веру ў магчымасьць павароту на Бацькаўшчыну, зьбіраецца векаваць на чужыне.*

Аб гэтым кажны беларускі эмігрант заўсёды павінен помніць і згодна гэтага мусіць весьці сваю працу.

«Бацькаўшчына», 1 чэрвеня 1949 г.

ЯЗЭП КАРАНЕЎСКІ[1]

РАСПАЧЫНАЮЧЫ НОВЫ ЭТАП...

Зь бягучым годам беларуская эміграцыя ўваходзіць у новы пэрыяд свайго існаваньня. Выпадкі й акалічнасьці, што замыкаюць пэрыяд дасюлешні й распачынаюць новы, зьяўляюцца настолькі важнымі для нас, што нельга абыйсьці іх моўчкі.

Перш за ўсё бягучы год ёсьць для нас важным годам у сувязі з тым, што ў гэтым годзе аснаўная маса нашае эміграцыі, што жыла дасюль часова ў Нямеччыне на ласцы IPO[2] ужо выэміграваля або знаходзіцца ў працэсе эміграцыі ў краіны сталага побыту. Людзі, што дагэтуль жылі ў няпэўнасьці і няведаньні сваёй будучыні, цяпер здабываюць больш-менш нармальныя ўмовы жыцьця й працы, паколькі наагул можна гаварыць аб нейкай нармальнасьці на эміграцыі. Хаця й тут не абыйшлося без мамэнтаў ярка адмоўных, якімі было пазбаўленьне права на эміграцыю ладнае колькасьці беларусаў і астаўленьне іх у ўмовах поўгалоднага існаваньня ў Нямеччыне, сам факт выэміграваньня аснаўное бальшыні іх ёсьць бясспрэчна фактам вельмі пазытыўным.

Масавая эміграцыя нашых суродзічаў зь Нямеччыны пацягнула за сабой ня толькі перанясеньне нашых палітычна-грамадзкіх цэнтраў у іншыя краіны, але й выклікала неабходную патрэбу грунтоўнае рэарганізацыі нашае дзейнасьці і значнае перастаноўкі сілаў. Нашыя людзі, што жылі дасюль у беларускіх лягерах

---

[1] Псэўданім рэдактара газэты «Бацькаўшчына» Станіслава Станкевіча.

[2] International Relief Organization — Міжнародная арганізацыя дапамогі *(анг.)*, якая займалася справамі ўцекачоў.

або зарганізаванымі нацыянальнымі групамі ў лягерах чужых, без асаблівых арганізацыйных натугаў маглі жыць собскім нацыянальным жыццём. Цяпер зьяўляюцца яны расьцярушанымі сярод чужога ім элемэнту розных краінаў сьвету й дзеля гэтага наражаныя на небясьпеку асыміляцыі, а ў найлепшым выпадку нацыянальнай індэфэрэнтнасьці. Таму ў першую чаргу мы павінны парупіцца стварыць такія ўмовы, каб нашыя людзі, раскінутыя па шырокім сьвеце, адчувалі патрэбу собскага нацыянальнага жыцьця. Ня трэба й даказваць, што найлепшымі й незаменнымі сродкамі для гэтага могуць быць спраўна дзеючыя нацыянальныя арганізацыі й роднае друкаванае слова.

Для беларусаў, што мелі шчасьце выэміграваць зь Нямеччыны, тыя панурыя гады недастаткаў і галіты, якія яны перажывалі ў ДП-лягерах, належаць ужо да мінуўшчыні. Дзеля гэтага пры наяўнасьці добрае волі нашае інтэлігенцыі й разумнага кіраўніцтва зь ейнага боку адкрываюцца цяпер шырэйшыя пэрспэктывы й магчымасьці нацыянальнае працы. Дык усебакова іх выкарыстаць і закцівізаваць нашае нацыянальнае жыцьцё ў краінах новага асяленьня зьяўляецца першай патрэбай дня.

Бясспрэчна, зьмены на лепшае зарысаваліся і ў іншай галіне нашага грамадзка-палітычнага жыцьця. Пяць апошніх гадоў прайшлі ў нас пад знакам нутраной кансалідацыі грамадзянства й змаганьня з зарубежніцкай дывэрсыяй, якое праглынула шмат энэргіі й часу. Гэты нэгатыўны мамэнт нашае дзейнасьці быў, аднак, канечны й няўхільны. Агенты расейскага імпэрыялізму ўсёроўна якога колеру ўнікалі, як мага, адкрытага ідэялягічнага змаганьня, добра здаючы сабе справу, што калі-б выступілі яны адкрыта супраць беларускай незалежніцкай ідэі, а за «едіную неделімую», то адразу пацярпелі-б поўную няўдачу. Таму яны выбралі шлях дэструкцыі й дывэрсыі, імкнучыся ўнутры беларускага грамадзянства выклікаць крайнія супярэчнасьці й распаліць міжсобнае змаганьне. Гэта зрабіць ім удалося галоўна дзякуючы нізкай нацыянальнай сьведамасьці эміграцыйнай масы, палітычнай бязграматнасьці значнай часткі інтэлігенцыі, як і той акалічнасьці, што знайшліся сярод нас людзі, якія ахвотна пайшлі на чужацкую агентурную службу.

Мэта зарубежніцкае дзейнасьці была ясная: разьбіць

ды аслабіць беларускі нацыянальна-вызвольны рух для інтарэсаў Масквы, а так-жа скампраметаваць яго ў вачох заходняга сьвету, і гэтым самым здэградаваць ягоную ўдзельную вагу. Маскуючы на вонкі сваю праступную дзейнасьць нацыянальнымі лёзунгамі ды цынічнымі дэклярацыямі аб службе незалежніцкай ідэі, у самай сутнасьці ўсе зарубежнікі павялі супраць гэтае ідэі й ейных носьбітаў самы рашучы бой. А аружжам у гэтым баі былі фальш, дэмагогія, распальваньне ўзаемнае нянавісьці сярод беларусаў, паліцыйныя даносы альянцкім уладам і правакацыі, адным словам, поўны арсэнал сродкаў, якімі карыстаюцца якраз бальшавікі.

Таму зусім зразумела, што змаганьне з зарубежніцтвам было аснаўным мамэнтам у нашым грамадзкім жыцьці за мінулых пяць гадоў, якое адсоўвала на бок іншыя, часта куды важнейшыя справы. Аднак у гэтым змаганьні зарубежніцтва было пабітае. Яно ў вачох усіх сумленных беларусаў поўнасьцю скампраметавалася, а ягоныя агентурныя мэты былі ўсебакова й дакумэнтальна здэмаскаваныя. Пры зарубежніцтве асталіся амаль выключна людзі, якіх пераконваць няма ўжо найменшага сэнсу, для якіх белае ёсьць чорным, а чорнае белым, значыцца, толькі пераканаяныя шчыра ці каньюнктуральна й сьведамыя сваёй праступнай ролі зарубежнікі.

Гэта, аднак, ня значыць, што расейская дывэрсыя сярод беларусаў ужо зьліквідаваная й што яна ў тэй або іншай форме ўжо болей не паўторыцца. Наадварот, як доўга будзе існаваць загроза расейскага імпэрыялізму з мэтаю паняволіць наш край і народ, так доўга будуць знаходзіцца ў нас людзі тыпу Астроўскага, Сабалеўскага ці Ермачэнкі, якія ахвотна згодзяцца для інтарэсаў ворага разбураць і аплёўваць усё сьвятое для кажнага беларуса. Гэта абазначае толькі, што расейская дывэрсыя ў сваёй сяньняшняй форме, званай зарубежніцтвам, і ягоныя сяньняшнія носьбіты, як у царкоўных рызах, так і ў сьвецкай вопратцы, настолькі ўжо скампраметаваныя й здэмаскаваныя ў сваім рэнэгацтве, што асаблівай шкоды для нашай вызвольнай справы прынесьці ўжо ня змогуць.

Дзеля таго што на працягу мінулага часу галоўная нашая ўвага мусіла быць зьвернутая на нутраныя дачыненьні і абарону перад расейскім наступам, справы

нашае вонкавае рэпутацыі й дыпляматычнай дзейнасьці як сярод іншых паняволеных бальшавізмам народаў, так і перад заходнімі палітычнымі дзейнікамі былі моцна занядбаныя. Праца навонкі ў нас вялася прыпадкова, несыстэматычна, без дакладна апрацаванага на даўжэйшую мэту пляну. Калі-ж цяпер нашыя нутраныя справы з'яўляюцца больш-менш упарадкаваныя, то, не пакідаючы й іх бяз увагі, трэба, аднак, напружыць усе сілы, каб адрабіць недаробленае на грунце міжнародным.

Палючая патрэба сяньняшняга дня пераканальна гаворыць за тым, што новы пэрыяд нашага выгнаньня павінен быць як найшырэй і як найразумней выкарыстаны дзеля заваяваньня сабе апініі заходняга сьвету. Трэба паінфармаваць шырокі сьвет аб нашых нацыянальных патрэбах і імкненьнях, трэба паралізаваць сярод чужынецкіх колаў ілжывую прапаганду ворага, ведзеную на нашую шкоду, трэба напасьледак пераканаць адказныя палітычныя дзейнікі Захаду, што бязь зьнішчэньня ня толькі бальшавізму, але й усякага ресейскага імпэрыялізму й без распадзелу расейскае імпэрыі на незалежныя гаспадарствы паняволеных ёю народаў ня можа быць і мовы аб трывалым міры на сьвеце.

Сяньняшні нязвычайна адказны мамэнт, плодны гістарычнымі падзеямі вялікае міжнароднае вагі, ускладае на нас як палітычных эмігрантаў ня менш адказныя абавязкі й вызначае нам спэцыяльную ролю ў працэсе нашага вызвольнага змаганьня.

Таму мала ўзалежняць нашыя паступаньні толькі ад добрае волі адзінак, яны павінны выплываць із зразуменьня нашага нацыянальнага абавязку перад Бацькаўшчынай і Народам. А паколькі нашая Бацькаўшчына стогне ў найжахлівейшай бальшавіцкай няволі, якой ня ведае гісторыя ўсяго чалавецтва, і народ наш крывавіцца, як яшчэ ня крывавіўся, ад зьдзекаў Масквы, дык і мы на чужыне, што знаходзімся ў бясспрэчна шчасьлівейшым палажэньні ад нашых братоў з таго боку жалезнай заслоны, павінны таксама прынесьці адпаведную дань для народнае справы калі ня ў крыві, дык, прынамсі, ў працы.

Першы збройны зудар камунізму з дэмакратычным сьветам на Далёкім Усходзе, які таксама адкрывае новую балону ў гісторыі паваеннага сьвету, родзіць

надзеі, што вырашальная расплата з праступным камунізмам у сусьветным маштабе зьяўляецца няўхільнай і недалёкай. Гэта паказвае, што канчальнае разьвязаньне й нашай нацыянальнай праблемы — быць або ня быць — хутка можа знайсьціся на парадку дня. А таму да гэтай вялікай і доўгажданай гістарычнай хвіліны мусім пасьпешна прыгатаўляцца ў кажнай галіне нашае дзейнасьці. Калі ўвесь вольны сьвет пасьпяхова гатуецца сяньня да абароны перад няўхільнай загрозай камуністычнай агрэсыі, то мы, што зьяўляемся ўжо тры дзесяткі год ахвярамі гэтае агрэсыі, павінны з тым большай энэргіяй мабілізаваць усе нашыя нацыянальныя сілы на змаганьне за нашае вызваленьне.

Дык распачынаючы новы этап на нашым шляху выгнаньня, напружым усе нашыя сілы й волю, каб апраўдаць вялікія абавязкі, ускладзеныя на нас у сяньняшні адказны й вырашальны мамэнт. А ўсім нашым пачынаньням няхай заўсёды прысьвечвае бясспорная праўда, што нашая дзейнасьць на чужыне, калі яна будзе праводжаная ў поўным зразуменьні гэтага абавязку, можа заашчадзіць шмат крыві на Бацькаўшчыне, калі надыйдзе адпаведны мамэнт вырашэньня справы нашага незалежнага палітычнага існаваньня.

«Бацькаўшчына», 15 верасьня 1950 г.

КРЫВАВЫ ЗЬДЗЕК НАД БЕЛАРУСКІМ НАРОДАМ

Для нас не сакрэт, што чырвоная Масква з мэтаю фізычнага вынішчэньня беларускага народу, побач зь іншымі жахлівымі спосабамі крывавага тэрору, практыкавала й практыкуе цяпер масавыя расстрэлы беларусаў бязь ніякага суду, ані доказу стаўлянае ім віны. Масавыя расстрэлы ні ў чым невінаватых людзей на аснове аднастароньняе і ў адсутнасьці абвінавачанага прынятае тайнае пастановы НКВД — гэта адна з найбольш пашыраных праяваў савецкае «справядлівасьці».

Але Масква, асабліва на міжнародным грунце, катэгарычна аднекваецца ад падобных чынаў, заяўляючы, што калі й здараюцца ў СССР прысуды сьмерці, то бываюць яны вынесеныя згодна абавязваючых законаў, толькі пасьля правядзеньня судовае працэдуры й дакладнага ўстанаўленьня віны. І людзі, што жывуць у свабодных дэмакратычных дзяржавах, наіўна верылі ў такія тлумачэньні Масквы, ня могучы навет уявіць сабе, каб у наш век можна было бязь ніякіх падставаў і бязь ніякіх судовых працэдураў пазбаўляць жыцьця ні ў чым невінаватых людзей.

Тымчасам тайныя арыгінальныя дакумэнты савецкай пракуратуры НКВД, што папалі ў рукі эміграцыйнага ўраду БНР, апублікаваныя нядаўна прэзыдэнтам БНР М. Абрамчыкам у выдадзенай ім у Канадзе брашуры ў ангельскай мове п. н. «Я абвінавачваю Крэмль у забойстве майго народу». У гэтых тайных дакумэнтах Масква сама прызнаецца, што на працягу толькі двух гадоў (1937—38) было расстраляна на Беларусі 13325 нявінных людзей.

Што-ж гэта за дакумэнты?

Есьць абшырны тайны пратакол ад 29 ліпеня — 2 жнівеня 1939 г. «Кантрольнай Камісіі», зложанай з памочніка пракурора Ленінградзкай Ваеннай Акругі Колакава, памочніка пракурора Беларускай ССР Дзмітракова й Загадчыка Спэцыяльнай Першай Сэкцыі НКВД Беларускай ССР Гарбачэўскага, якая, на загад пракурора СССР Панкрацьева ад 23 ліпеня 1939 г., выехала ў Менск і правяла сьледзтва дзейнасьці былога заступніка пракурора Беларускай Ваеннай Акругі А. Кісялёва.

Гэтая «Кантрольная Камісія» праверыла толькі акты, што знаходзіліся ў Менску — у Спэцыяльнай Першай Сэкцыі НКВД БССР, і на падставе гэтага сьцьвердзіла наступнае (цытуем паводля Пратаколу):

«Перагляд наяўных альбомных даведак (г. зн. сьпісак-картатэк.— *Рэд.*) у Спэцыяльнай Першай Сэкцыі ўстанавіў, што Кісялёў падчас усяго пэрыяду (г. зн. 1927—38 г.— *Рэд.*) падпісаў 11.564 альбомныя даведкі (паводля загаду № 00485). Згодна іх, было:

Прысуджаных да найвышэйшае меры пакараньня (г. зн. на кару сьмерці) 11.009 асобаў.
На розныя тэрміны 379 асобаў,
Звольнена 176 асобаў.

Тым-жа Кісялёвым, у складзе Тройкі, было таксама падпісана прыгавораў на 3.045 асобаў, зь якіх:

Прысуджана да найвышэйшае меры пакараньня (сьмерці) 2.316
На розныя тэрміны 576
Звольнена 154».

Гэта, аднак, яшчэ ня ўсё. Камісія, як сказана вышэй, задаволілася толькі праверкай тых справаў, што знаходзіліся ў Менскім НКВД. Як сьцьвярджае сама Камісія ў сваім Пратаколе, «пададзеныя лічбы не адказваюць запраўднаму стану, бо вялікая колькасць альбомных даведак знаходзіцца ў Спэцыяльнай Першай Сэкцыі НКВД СССР». Камісія не задавала сабе клопату праверыць гэтыя справы й устанавіць дакладную колькасьць замардаваных людзей. Апрача гэтага, загадчык Другой Сэкцыі Трэйцяга Аддзелу НКВД БССР Кацаў заявіў Камісіі, што некаторая часьць справаў была пасланая Кісялёвым у абласныя пракуратуры, копіяў якіх Кісялёў не пакінуў. Гэтых справаў Камісія таксама не правярала. Дык калі-б падлічыць усе чыста ахвяры Кісялёва, расстраляныя на яго загад на працягу двух

гадоў, дык іхная колькасьць напэўна ў некалькі разоў перавысіла-б афіцыяльна пададзены лік — 13 325 асобаў.

Пратакол дакумэнтальна пацьвярджае няведамую ў цэлым культурным сьвеце жахлівую сьледчую практыку савецкага НКВД. Гэтак Камісія ўстанавіла, што ў бальшыні выпадкаў Кісялёў адносіўся да справаў абвінавачаных ім беларусаў хаатычна, нядбала, а нярэдка сьведама фальшаваў факты. І так успомнены ўжо загадчык 2-й Сэкцыі 3-га Аддзелу НКВД БССР Кацаў сьцьвердзіў, што «да чэрвеня 1938 г. Кісялёў меў звычай падпісваць альбомныя даведкі (у якіх былі ўжо вынесеныя прысуды абвінавачаным.— *Рэд.*) перад тым, чымсь пазнаёміцца ізь сьледчымі пратаколамі». Нярэдка ордэры на арышт былі выстаўляныя на адныя асобы, а на аснове гэтых ордэраў арыштоўваліся зусім іншыя й караліся сьмерцю за праступкі, прыпісваныя першым. Прывядзем адзін із многіх прыкладаў: «Ордэр на арышт быў выпісаны абласным пракурорам на Станіславу Валяр'янаўну Плавінскую, народжаную ў 1909 г., тады, калі на аснове гэтага ордэру была арыштаваная Анеля Валяр'янаўна Плавінская, народжаная ў 1894 г. Анеля Плавінская поўнасьцю прызналася да стаўляных ёй абвінавачаньняў, за што была прысуджаная да найвышэйшае меры пакараньня».

Пратакол адкрывае цэлы рад выпадкаў, калі людзі былі пакараныя сьмерцю за праступкі, якія ня толькі ня былі сьледзтвам устаноўленыя, але ў якіх арыштаваныя навет зусім не абвінавачваліся. Вось два із многіх доказаў гэтага.

1. «Справа № 30463 абвінавачанага Адама Васільевіча Дворака. У альбомнай даведцы паказана, што Дворак атрымаў даручэньне зьбіраць шпіёнскія інфармацыі аб вайсковых адзінках Работніцка-Сялянскай Чырвонай Арміі і на выпадак вайны між Польшчаю й Саветамі прыняць удзел у збройным паўстаньні, выконваючы дывэрсійныя акты ў тылох Работніцка-Сялянскай Чырвонай Арміі. У паказаньнях Дворака, як і ў матарыялах справы, наагул няма ані слова аб усім гэтым».

2. «Справа № 29581 абвінавачанага Язэпа Сьцяпанавіча Несьцяровіча. У альбомнай даведцы пададзена, што абвінавачаны браў удзел у нелегальных зборках кіраўнікоў контррэвалюцыйнай арганізацыі «ПОВ», дзе

былі абгаварваныя праблемы дывэрсыйнай і тэрарыстычнай дзейнасці. У пратаколе справы, аднак, няма абсалютна нічога аб гэтым».

У вельмі многіх, можна сказаць масавых, выпадках беларускую нацыянальную прыналежнасьць арыштаваных беларусаў мэханічна зьмяняў Кісялёў на польскую. Вось некалькі із многіх дадзеных Пратаколу:

«Справа № 133390 абвінавачанага Міхаіла Міхайлавіча Малевіча. Згодна ўсіх дакумэнтаў ён уважаецца беларусам, але згодна альбомнае даведкі ён ёсьць паляк».

«Справа № 29777 абвінавачанага Канстанціна Сямёнавіча Лісоўскага. У альбомнай даведцы цьвердзіцца, што абвінавачаны зьяўляецца палякам, а паводля сацыяльнае прыналежнасьці — кулаком. У запраўднасьці, аднак, Лісоўскі ёсьць беларусам, селянінам-бедняком і, у дадатку, зусім няпісьменным».

«Справа № 13390 абвінавачанага Аляксандра Сямёнавіча Руткоўскага. У альбомнай даведцы гаворыцца, што Руткоўскі ёсьць паляком, тады, калі згодна ўсіх іншых фактаў справы ён ёсьць беларусам».

«Справа № 32750 абвінавачанага Івана Іванавіча Завілейскага. У альбомнай даведцы ён уважаецца паляком і кулаком, а ў запраўднасьці ёсьць ён беларусам і работнікам-сталяром».

«Справа № 44185 абвінавачанага Паўлы Адамавіча Янушэўскага, Пятра Віктаравіча Караткевіча і Мікалая Гіпалітавіча Браткоўскага. Ува ўсіх дакумэнтах яны фігуруюць як беларусы, а ў альбомных даведках як палякі». І г. д., і г. д.

Матываў перарабляньня беларускае нацыянальнасьці на польскую адгадаць ня цяжка. Вялізарная колькасьць арыштаваных абвінавачваюцца Кісялёвым у польскім шпіянажы і ў прыналежнасьці да няіснуючай у Беларусі «ПОВ» — Польскай Вайсковай Арганізацыі. Але паколькі ў абвінавачаньнях НКВД такая арганізацыя дзеіла, яна мусіла мець і сваіх сяброў. Так як у Усходняй Беларусі палякаў было зусім нязначная колькасць і паколькі нелягічным было-б прыпісваць беларусам належаньне да польскае арганізацыі, дык Кісялёў знайшоў просты з гэтага выхад: назваў патрэбную колькасьць арыштаваных ім беларусаў палякамі і гэткім чынам сваё заданьне перад Маск-

вой выканаў. Агульнаведама, што калі Масква дае загад арыштаваць адпаведную колькасьць людзей, дык нярэдка згары вызначае, які павінен быць нацыянальны склад арыштаваных.

Але найбольш цынічнымі ёсьць абурэньні аўтараў Пратаколу супраць таго, што пры сьледчых допытах прымяняліся Кісялёвым біцьцё й іншыя спосабы фізычнага ўзьдзеяньня, у выніку чаго здараліся выпадкі забіцьця насьмерць арыштаваных. Гэта-ж у Савецкім Саюзе навет кажнае дзіця ведае, што вымушаньне прызнаньня да нязробленай віны пры помачы найбольш вырафінаваных спосабаў фізычнага катаваньня зьяўляецца агульнапрынятай штодзённай практыкай савецкага сьледзтва.

Ня менш таксама цынічным і фальшывым ёсьць абурэньне «Кантрольнай Камісіі» супраць таго, што Кісялёў пры помачы катаваньня сваіх ахвяраў змушаў іх да фальшывых удаваньняў і даносаў на іншых, якія на гэтай падставе былі арыштоўваныя й расстрэльваныя. У Пратаколе між іншым чытаем: «Такім чынам, адзін з абвінавачаных Міхаіл Ізаакавіч Александровіч данёс у сваіх паказаньнях на 121 асобу. Іншы абвінавачаны Сямён Міхайлавіч Якубовіч удаў 104 асобы. Павал Гарасімавіч Бабчонак — 107 асоб, Іван Сьцяпанавіч Вольнатс і Сямён Ківавіч Баўч — 120 асоб кажны. Барыс Вячаслававіч Спарыгін — 241 асобу, Фама Фаміч Жылінскі — 244 асобы і Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч — 249 асоб».

Але-ж змушаньне да даносаў і ўдаваньняў, пры гэтым фальшывых, пры помачы фізычнага тэрору зьяўляецца чарговым агульнапрынятым мэтадам савецкага сьледзтва.

«Кантрольная Камісія», абвінавачваючы ўсё падпарадкаванае Кісялёву Кіраўніцтва НКВД БССР у тым, што ягоная дзейнасьць «была кіраваная на вынішчэньне найлепшых савецкіх людзей», адначасна сьцьвярджае, што «ў той самы час гэтае варожае кіраўніцтва старанна абараняла перад арыштам многіх запраўдных і найгоршых ворагаў народу». Гэтае сьцьверджаньне ёсьць ня чым іншым, як выразнай дырэктывай для наступнікаў Кісялёва, заданьнем якіх, пэўне-ж, было вылавіць і зьнішчыць тых запраўдных і найгоршых «ворагаў народу», якіх быццам прыхоўваў Кісялёў. Іншымі словамі гаворачы, і пасьля зьнішчэньня Кіся-

лёва будзе й далей шалець у Беларусі крывавы тэрор НКВД з масавымі арыштамі, ссылкамі, расстрэламі...

Толькі людзі злое волі або пазбаўленыя здаровага розуму могуць паверыць, што Масква, пасылаючы ў Менск «Кантрольную Камісію» дзеля праверкі дзейнасьці Кісялёва, рабіла гэта із шчырым намерам устанавіць на Беларусі справядлівасьць ды пакараць вінаватых. Ніхто таксама, праводзячы на Беларусі на працягу двух гадоў крывавую расправу над беларускім народам, ня мог рабіць гэта на собскую руку бязь ведама і згоды Масквы.

Пры савецкай сыстэме шпіянажу, перад якім звычайна нічога ня можа ўтаіцца, які пранікае навет у прыватныя справы людзей, ёсьць выключанай справай, каб Масква ня ведала, што дзеілася на працягу цэлых двух гадоў у Беларусі. Прагаварылася ў гэтым і сама «Кантрольная Камісія», калі сьцьвердзіла, што вялікая колькасьць актаў Кісялёва не магла быць ёю праверана, бо яны былі перасланыя Кісялёвым у Маскоўскае НКВД. Значыцца, Масква была ў поўным курсе ўсяго таго, што дзеілася ў Беларусі.

Дык, можа, зьявіцца пытаньне, для якой мэты Масква пасылала ў Беларусь сваю «Кантрольную Камісію» й праводзіла сьледзтва дзейнасьці Кісялёва?

Калі прасочым галаўнейшыя этапы масавага тэрору ў Саветах, дык адказ на гэтае пытаньне прыйдзе сам сабой. Крэмль, каб адгарадзіць сябе ад праступкаў, дакананых ім над народам, звычайна прыпісвае іх таму, хто іх на загад Крамля непасрэдна праводзіў у жыцьцё, удаючы пры гэтым, што ані Сталіну, ані іншым савецкім правадыром нічога аб гэтым ня было ведама. Такая тактыка Крамля паўтаралася, як правіла, пасьля кажнай масавай тэрарыстычнай акцыі ў Саветах. Гэтак усе крамлёўскія праступкі за часоў усесаюзнага кіраўніка ГПУ — НКВД Ягоды былі яму-ж і прыпісаныя, за што быў ён у 1936 г. расстраляны. Гэтак пазьней у 1938 г. быў зьнішчаны наступнік Ягоды Яжоў за масавыя расстрэлы на тэрыторыі ўсяго Савецкага Саюзу, праводжаныя ім на загад Крамля. Гэтак былі прызнаныя ворагамі народу й зьнішчаныя кіраўнікі НКВД БССР Бэрман, Наседкін, Гэпштэйн і іншыя за іхную тэрарыстычную акцыю над беларускім народам, праводжаную быццам бязь ведама і супраць волі Масквы. Гэтак, напасьледак, быў зьнішчаны й Кісялёў.

Такім чынам, «Кантрольная Камісія» была высланая ў Беларусь толькі па тое, каб даказаць, што ў вынішчэньні беларускага народу Масква невінаватая, а вінаватыя толькі Кісялёў і ягоныя супрацоўнікі, якія, будучы замаскаванымі ворагамі народу, сьведама дзеілі на шкоду савецкай улады. У «Вывадах» «Кантрольнай Камісіі» вельмі красамоўна аб гэтым сказана: «Цераз сваю крымінальную безадказнасьць Кісялёў памагаў былому варожаму кіраўніцтву НКВД БССР (Бэрман, Наседкін, Стаяноўскі, Гэпштэйн і другія) з мэтаю праводжаньня ў жыцьцё контррэвалюцыйнай дзейнасьці, скіраванай на вынішчэньне найлепшых савецкіх людзей».

Але дарма! Вышэй прыведзеныя довады не пакідаюць найменшага сумліву ў тым, што Кісялёў быў толькі сьляпым выканальнікам і паслухмяным аружжам у руках Масквы. За Кісялёвым стаіць сам Сталін, увесь Крэмль і ўвесь расейскі бальшавізм.

Жахлівыя факты, што раскрываюць перад намі тайныя савецкія дакумэнты, ёсьць яшчэ аднэй Віньніцай і яшчэ адным Катынам, ахвярамі якіх былі тысячы бязьвінных беларусаў. Толькі калі праступкі Катына й Віньніцы бальшавікі намагаюцца за ўсякую цану зь сябе скінуць, наіўна прыпісваючы іх немцам, то з масавым забойствам беларускага народу зрабіць ім гэтага ня ўдасца. Тайныя дакумэнты, ганебна кампраметуючыя Крэмль у вачох цэлага сьвету, знаходзяцца сяньня ў беларускіх руках. Яны зьяўляюцца найлепшым абвінавачаньнем крамлёўскіх катаў на чале із Сталінам за масавыя забойствы беларускага народу.

«Бацькаўшчына», 27 студзеня 1951 г.

ЯЗЭП КАРАНЕЎСКІ[1]

ЧАМУ НАС НЕ РАЗУМЕЕ ЗАХАД?

Праз расейскія акуляры

Адным з найбольш ненармальных і шкодных нам зьявішчаў у дачыненьні Захаду да падрасейскага, а цяпер падсавецкага Ўсходу ёсьць пагляд, што ўсе тыя тэрыторыі, якія ляжаць на ўсход ад Буга й Сану — гэта Расея, а ўсе тыя народы, што гэтую вялізарную тэрыторыю засяляюць,— гэта ў аснаўным расейцы. Праўда, кажны інтэлігентны чалавек Захаду ведае, што на тэрыторыі аднэй шостай жыве цэлая мазаіка розных народаў і плямёнаў, аднак ён не здае сабе дастаткова справы з таго, якая ступень іхнае апрычонасьці, якое іх гістарычнае мінулае, як яны апынуліся ў складзе расейскае імпэрыі, якія іх нацыянальныя імкненьні й палітычныя асьпірацыі, а галоўнае — на чым гэтыя імкненьні базуюцца.

Для шэрага заходняга інтэлігента, не гаворачы ўжо аб простай народнай масе,— нерасейскія славянскія народы — беларусы, украінцы й казакі — гэта толькі адгаліненьні аднаго й таго самага народу расейскага, а народы неславянскія — гэта яшчэ першабытныя плямёны, перамешаныя з расейцамі, якія ня маюць ані гістарычнай традыцыі, ані выразных нацыянальных імкненьняў, а зьяўляюцца толькі этнаграфічнай масай, што знаходзіцца яшчэ на прымітыўным узроўні свайго разьвіцьця й незалежна ад Расеі існаваць ня можа. Для такога роду заходніх ляікаў — а іх большыня навет сярод інтэлігенцыі — грузін або туркестанец у сваёй нацыянальнай дасьпеласьці й гістарычнай традыцыі нічым ня розьніцца ад якута або чэраміса.

[1] Псэўданім рэдактара газэты «Бацькаўшчына» Станіслава Станкевіча.

Паўстае тады пытаньне, дзе фактычна хаваецца прычына такога хвальшывага пагляду й няведаньня ўзапраўдных нацыянальных дачыненьняў на ўсходзе Эўропы й у падсавецкай Азыі, дзе прычына такой ігнаранцыі й замарочаньня паняцьцяў у паглядах на ўсходнюю праблему? Бо ў той час, калі гэты-ж шэры заходні інтэлігент больш-менш здае сабе справу з нацыянальных дачыненьняў зусім прымітыўных каляровых народаў Афрыкі ці паўдзённа-ўсходняй Азыі, ён зьяўляецца поўным анальфабэтам у сваіх паглядах на такія народы, як беларусы, украінцы, туркестанцы ці каўказцы, якія маюць куды багацейшую гістарычную мінуўшчыну за расейцаў, а сяньняшняя культурная ўзроўня якіх зусім ня ніжэйшая, чымсьці ў расейцаў, якія ў дадатак зьяўляюцца ягонымі недалёкімі суседзямі.

Калі заходні сьвет выказвае такую незнаёмасьць сяньняшніх падсавецкіх народаў, то ўжо аб іхных нацыянальна-вызвольных імкненьнях, як і аб рэальнасьці й мэтазгоднасьці гэтых імкненьняў ён арыентуецца яшчэ менш. У ўяўленьні людзей Захаду Расея — гэта нешта настолькі суцэльнае й арганічна зьвязанае, што ейны распадзел на нацыянальныя дзяржавы выдаецца нечым нерэальным, немэтазгодным, а навет — праступным. У той час, калі гэтыя людзі ўспрыймаюць распадзел Брытанскае імпэрыі й унезалежненьне ейных калёніяў як нешта зусім натуральнае й гістарычна неабходнае, яны ніяк ня могуць пагадзіцца з думкай, што падобны лёс павінен спаткаць таксама й Расею. Таму да нацыянальна-вызвольных рухаў нерасейскіх народаў ставіцца Захад недаверліва, вычэкваюча, а ў найлепшым выпадку — абыякава.

«Адзінанедзялімаўская» палітыка Захаду

Есьць дзьве аснаўныя прычыны такой заблытанасьці паняцьцяў у дачыненьні да ўсходняй праблемы: адна, калі так можна выразіцца, нутраная, а другая — вонкавая, якая зьяўляецца непасрэдным вынікам замежнай палітыкі заходніх дзяржаваў у дачыненьні да Расеі. Захад, а ў тым ліку й ЗША, доўгі час уважаў, што для раўнавагі сілаў у сьвеце ім патрэбная вялікая й сільная Расея, якая балянсавала-б дзве магутныя дынамічныя дзяржавы — Нямеччыну з захаду й Японію — з усходу. Да гэтага далучаўся мамэнт эканамічны — вя-

лікая й індустрыяльна адсталая Расея ўважалася за выгадны рынак збыту, на які Захад мог кідаць надвыжку сваёй прамысловай прадукцыі й адкуль мог даставаць патрэбную яму сыравіну. Заходнія дзяржавы ўважалі, што куды выгадней мець гандлёвыя інтарэсы з адным вялікім кліентам, чымсьці з цэлым радам кліентаў дробных.

Выходзячы з гэтых, чыста практычных, меркаванняў, заходняя палітыка аж да апошняга часу разьвівалася ў кірунку захаваньня вялікай Расеі, а таму ня толькі ня была яна зацікаўленая ў паддзержываньні незалежніцкіх рухаў нерасейскіх народаў, але наадварот, гэтыя рухі былі ёй не на руку, а таму й не знаходзілі яны на Захадзе ніякай сымпатыі. Ясна, што такая палітыка Захаду зрабіла сваё: яна на працягу доўгіх дзесяцігодзьдзяў сыстэматычна ўзьдзейвала на заходнія грамадзянствы й адпаведна фармавала іхную апінію аб нацыянальнай праблеме Ўсходу.

Але сяньня палажэньне дыямэтральна зьмянілася. Сяньня ані Нямеччына, ані Японія ня толькі Захаду загражаць ня могуць, але навет становяцца ягонымі саюзьнікамі. Затое сяньняшняя Расея ў форме Савецкага Саюзу, якая культывуе й да высокай ступені ўдасканальвае імпэрыялістычную палітыку царскае Расеі, сталася сьмяротнай загрозай для Захаду.

Наіўным ёсьць таксама пагляд, які яшчэ пакутуе ў многіх уплывовых заходніх сфэрах, што будучая «дэмакратычная» Расея, якая паўстане пасьля зьнішчэньня бальшавізму, вызбудзецца дасюлешніх імпэрыялістычных імкненьняў і станецца карысным сябрам у сям'і дэмакратычных дзяржаваў сьвету. Тыя, што гэтак думаюць, забываюцца, на жаль, што дынамічны імпэрыялізм, няўпыннае імкненьне да пашырэньня сваіх тэрыторыяў коштам іншых народаў, зьяўляецца неадлучнай рысай псыхалёгіі расейскага народу, якая зьяўляецца найважнейшым рухаючым маторам расейскае гісторыі ўжо ад XV стагодзьдзя. Гэтая рыса найяскравей сяньня выяўляецца ў савецкіх агрэсыўных плянах, з аднаго боку, і палітычнай плятформе даслоўна ўсіх расейскіх палітычных групаў на эміграцыі — з другога. Таму няма абсалютна ніякай гарантыі, што будучая Расея з драпежнага ваўка раптам станецца нявінным ягняткам, затое ёсьць шмат дадзеных на тое, што гэты драпежны воўк і надалей астанецца тым самым ваўком.

Захад яшчэ ня змог зразумець, што захаваньне ў будучыні вялікай і сільнай, хоць і не бальшавіцкай Расеі можа для яго быць больш небясьпечным, чымсьці адроджаныя нямецкі й японскі імпэрыялізмы, узятыя разам. Аб адраджэньні імпэрыялізму гэтых апошніх дзяржаваў да трэйцяй сусьветнай вайны ня можа быць і мовы, бо ў гэтым пэрыядзе часу абедзьве гэтыя дзяржавы будуць знаходзіцца пад непасрэднай кантроляй Захаду, у першую чаргу — ЗША. Але ў выпадку пераможнай новай сусьветнай вайны, як Нямеччына, гэтак і Японія, якія ў вайне такой прыймуць актыўны ўдзел, як раўнапраўныя партнэры, з-пад кантролі гэтай лёгка могуць выйсьці. А тады зусім праўдападобным можа быць зблякаваньне гэтых дзьвюх мілітарна сільных і індустрыяльна разьвітых дзяржаваў зь вялікай Расеяй супраць Амэрыкі, што для апошняй стварыла-б новыя й вельмі небясьпечныя камплікацыі. Блёк-жа аднэй Нямеччыны зь Японіяй без Расеі для ЗША, якія вырасьлі сяньня ў вялізарную мілітарную й эканамічную магутнасьць і якія, бясспрэчна, гэтую магутнасьць і пасьля эвэнтуальнай новай вайны захаваюць, ня будзе страшным.

Такім чынам захаваньне вялікай Расеі ў ейных сяньньшніх межах можа ў будучыні якраз зьвіхнуць тую раўнавагу сілаў у сьвеце, да якой імкнецца Захад, затое ейны распадзел на нацыянальныя дзяржавы гэтую раўнавагу, бясспрэчна, захавае на карысьць Захаду й загарантуе доўгатрывалы мір у сьвеце.

Магутная сіла ілжывай інфармацыі

Другая, або названая намі нутраная, прычына неразуменьня Захадам усходняе праблемы выплывае з нацыянальнай палітыкі царскай Расеі, а так-жа зь ілжывай інфармацыі аб Усходзе расейскай эміграцыі. Захад пазнаў запраўднае палажэньне й запраўдныя нацыянальныя асьпірацыі каляровых народаў у калёніях заходніх дзяржаваў дзякуючы таму, што гэтыя дзяржавы, абмяжоўваючыся толькі да палітычнага, а не нацыянальнага паняволеньня гэтых народаў і іхнай эканамічнай экспляатацыі, ніколі не хаваў праўды аб гэтых народах. Наадварот, дзяржавы гэтыя, будучы незацікаўленымі ў нацыянальным паняволеньні каляніяльных народаў, а тым больш у іхнай асыміляцыі,

якраз спрычыніліся да папулярызацыі найбольш аб'ектыўнай веды аб народах, засяляючых іхныя калёніі.

Зусім інакш прадстаўлялася справа ў царскай Расеі, якая, раўналежна зь няволяй палітычнай, сацыяльнай і эканамічнай, замацавала сыстэму жорсткага нявольніцтва нацыянальнага. Усе падбітыя ёю нерасейскія народы былі асуджаныя на поўную асыміляцыю, а таму нацыянальна-вызвольныя рухі да 1905 г. маглі там разьвівацца толькі падпольна. Найяскравейшым доказам русыфікатарскай палітыкі царскага рэжыму можа служыць факт, што да рэвалюцыі 1905 г. існавала суровая забарона беларускага друку.

Такім чынам у царскі пэрыяд толькі расейцы мелі магчымасьць інфармаваць сьвет аб Расеі, а народы нерасейскія, што станавілі бальшыню насельніцтва, усякага голасу былі пазбаўленыя. Інфармацыі-ж, даваныя расейцамі, былі, як правіла, хвальшывыя, груба тэндэнцыйныя. У іх звычайна прадстаўлялася, што Расея, нягледзячы на ейную этнічную шматскладовасьць, прадстаўляе сабою неразьдзельную цэласьць навет з гледзішча нацыянальнага, бо нерасейскія народы зьяўляюцца толькі паасобнымі плямёнамі й адгалінень нямі вялікага расейскага народу, які, дарэчы, і ўтварыўся зь мешаніны розных этнічных групаў на славянска-расейскай базе.

Аргумэнты расейскіх эмігрантаў

Пасьля бальшавіцкай рэвалюцыі ўва ўсіх краінах Захаду апынулася вялікая колькасьць расейскіх эмігрантаў, якія адыгрывалі й адыгрываюць сяньня ролю галоўных інфарматараў аб Расеі й нацыянальным у ёй пытаньні. Гэтыя эмігранты зьяўляюцца й да сяньня галоўнымі дараднікамі заходніх афіцыяльных і прыватных уплывовых інстытуцыяў, умела выкарыстоўваючы сваё становішча на карысьць расейскіх імпэрыялістычных інтарэсаў. І трэба прызнацца, што іхная роля ў хвальшаваньні запраўднага палажэньня на падсавецкай тэрыторыі вялізарная, бо Захад, трымаючыся традыцыйнага спосабу думаньня аб усходняй праблеме, ахвотна прыслухоўваецца да іхнага хвальшывага голасу.

На доказ канечнасьці захаваньня адзінай і непа-

дзельнай Расеі звычайна высоўваюць расейскія эміграцыйныя палітыкі чатыры аснаўныя аргумэнты:

1. Яны стараюцца пераканаць Захад у тым, што на тэрыторыі Савецкага Саюзу нацыянальнае пытаньне зусім ня існуе, што нерасейскія народы ніякіх нацыянальных асьпірацыяў ня маюць і ніякай дзяржаўнай незалежнасьці й аддзяленьня ад Расеі не жадаюць, а імкнуцца толькі, як і расейцы, ськінуць бальшавізм, дабіцца асабістай вольнасьці й сацыяльнай справядлівасьці. Яны ў дабавак цьвердзяць, што нацыянальная праблема ёсьць выдумкай толькі групкі сэпаратыстычна настроенай інтэлігенцыі, што нацыянальныя рухі былі штучна створаныя гэтай інтэлігенцыяй падчас апошняй вайны пры выдатным падтрыманьні нацыстаўскага акупацыйнага апарату й Розэнбэргаўскага ўсходняга міністэрства.

Ілжа такога цьверджаньня відавочная, калі ўзяць пад увагу спаміж многіх іншых толькі два наступныя факты: а) Амаль усе паняволеныя народы супольнымі высілкамі сваёй інтэлігенцыі й шырокіх, народных масаў аднавілі ў 1917—1918 гг. свае незалежныя дзяржавы, якія потым баранілі з аружжам у руках, аж пакуль ня былі пераможаныя перавагаю фізычнае сілы расейскага бальшавізму. б) Найбольш арыштаў, ссылак, расстрэлаў і адкрытых судовых працэсаў на тэрыторыі нацыянальных рэспублікаў адбывалася й адбываецца якраз за «нацыянал-дэмакратызм», «мясцовы нацыяналізм», «нацыянал-фашызм» і «нацыянальную абмежаванасьць», а гэта найлепшы довад, што нацыянальная апазыцыя там вельмі моцная, якой ня ў сілах зьнішчыць дагэтуль бальшавікі, нягледзячы на ведамыя мэтады крывавага тэрору.

Што-ж датычыцца цьверджаньня, што нацыянальна-незалежніцкія рухі былі створаныя пры выдатным падтрыманьні нямецкага нацызму, дык у запраўднасьці справа прадстаўлялася наадварот. У тых акупаваных немцамі зонах, у якіх была заведзеная нямецкая цывільная адміністрацыя, немцы наагул ня мелі выразнай нацыянальнай палітыкі й ставіліся да нацыянальнай праблемы нерасейскіх народаў вычэкваюча, церпячы, хоць і неахвотна, чыста культурную дзейнасьць, а катэгарычна забараняючы дзейнасьць палітычную. Затое на тых тэрыторыях, якія знаходзіліся пад ваенным упраўленьнем (на Беларусі на ўсход ад Барысава), немцы,

акружаныя расейскімі дараднікамі — «зондэрфюрэрамі», праводзілі выразна прарасейскую палітыку. Прыкладам, прэса для мясцовага насельніцтва выдавалася ваенным аддзелам прапаганды выключна ў расейскай мове (выдаваныя ў кажнай акрузе газэты — «Новый Путь» і інш.).

Таму цьвердзіць, што немцы стварылі незалежніцкія рухі нерасейскіх народаў у той час, калі ў запраўднасьці яны гэтыя рухі душылі, а прапагавалі расейшчыну, зьяўляецца нахабнай ілжой.

2. Другім аргумэнтам, якім хочуць расейцы застрашыць Захад, ёсьць цьверджаньне, што калі Захад стане на пазыцыях распадзелу Расеі, дык у будучай вайне будзе ён мець супраць сябе ўвесь расейскі народ.

Гэты аргумэнт зьяўляецца ня чым іншым, як палітычным шантажом, бо ня мае ён пад сабой ніякіх рэальных падставаў. Мы, знаючы расейскі народ, моцна сумняваемся, ці ён, будучы цэлымі стагодзьдзямі прызвычаены да нявольніцкага жыцьця, выступіў-бы наагул актыўна супраць бальшавізму, так як ні разу ня выступіў супраць яго ў шырэйшых маштабах дагэтуль, тады, калі на нерасейскіх тэрыторыях адбываецца ўвесь час бесьперапыннае змаганьне супраць бальшавізму, якое, у залежнасьці ад абставінаў, або выліваецца ў форму збройных партызанскіх войнаў, або абмежваецца да пасыўнага супраціву. Таму ёсьць усе падставы думаць, што на выпадак вайны, незалежна ад таго, зь якімі лёзунгамі будзе йсьці на ўсход заходняя армія, расейскі народ у найлепшым выпадку захаваецца пасыўна.

3. Трэйцім аргумэнтам, якім апэруюць расейскія эмігранты, ёсьць цьверджаньне, што ў той час, калі ў цэлым сьвеце што раз больш актуальным становіцца імкненьне да розных міждзяржаўных задзіночаньняў у форме вуніяў, блёкаў, фэдэрацыяў, зусім не мэтазгодным ёсьць усякае раздрабненьне, а таму й Расея павінна быць захаваная як непарушная цэласьць.

Гэты аргумэнт зьяўляецца ня менш слабым за папярэднія. Ніводзін з паняволеных народаў не зьяўляецца праціўнікам актуальнага сяньня ў сьвеце міждзяржаўнага задзіночаньня. Але кожны зь іх жадае ў такую задзіночаную канстэляцыю дзяржаваў увайсьці вольным і стацца ў ёй раўнапраўным партнэрам, разумеючы, што ня можа быць ніякага задзіночаньня, ні-

якай уніі ці фэдэрацыі між нявольнікам і паняволваючым, між вязьнем і турэмным вартаўніком.

4. Распадзел расейскае імпэрыі на нацыянальныя дзяржавы прывёў-бы — як цьвердзяць расейцы — да балканізацыі эўрапэйскага Ўсходу й падсавецкай Азыі, што ў далейшую чаргу магло-б толькі выклікаць бесьперапынныя споры, а навет міжусобныя войны.

Гэты аргумэнт спаміж усіх, вышэй прыведзеных, зьяўляецца бадай што найслабейшым. Калі-б, прыкладам, і заіснавалі некаторыя споры між паасобнымі дзяржавамі паняволеных сяньня народаў, то ў сваёй шкоднасьці для сусьветнай бясьпечнасьці не маглі-б яны быць настолькі грознымі й небясьпечнымі, як споры, змаганьня й навет збройныя паўстаньні паняволеных народаў супраць Масквы, якія, у выпадку захаваньня турмы народаў, напэўна будуць мець месца.

Нягледзячы на тое, што ўсе гэтыя аргумэнты зьяўляюцца ў істоце сваёй нясур'ёзнымі й іхны хвальш відавочны, усё-ж такі яны маюць яшчэ значны ўплыў на заходнюю мэнтальнасьць, прызвычаеную да закасьцянелага ў сваіх формах традыцыйнага спосабу думаньня.

Лёд памалу праломліваецца

У апошнія гады на Захадзе пачалася, аднак, павольная, але грунтоўная рэвізыя паглядаў на ўсходнюю праблему. Сярод многіх заходніх людзей, што пачалі вызваляцца ад агульна прынятага шаблёну думаньня й разумець нацыянальнае пытаньне падсавецкага ўсходу так, якім яно ёсьць у запраўднасьці, знаходзяцца ўжо ўплывовыя палітыкі й дзяржаўныя мужы, якія ня толькі ўважаюць за патрэбнае разьвязаньне нацыянальнага пытаньня Ўсходу ў духу нашых імкненьняў, але становяцца навет запраўднымі піянэрамі папулярызацыі на Захадзе нашых ідэяў і шчырымі абароньнікамі нашых нацыянальных інтарэсаў.

Да такіх людзей у Ангельшчыне належаць у першую чаргу старшыня Шкоцкай Лігі за Свабоду Эўропы Дж. Ф. Стуарт і выдатны вайсковец і ўплывовы публіцыст генэрал-маёр Дж. Ф. С. Фулер. Што раз болей такіх людзей паяўляецца і ў ЗША. Апрача былога рэспубліканскага кандыдата на прэзыдэнта сэнатара Г. Стасэна, да гэтай групы людзей належаць яшчэ сэнатар О'Ко-

нор, сэнатар Смітс, кангрэсмэны Кэрстэн, Смэтэрс, Борыс, Армстронг і іншыя.

Гэтыя людзі дамагаюцца распадзелу расейскае імпэрыі на нацыянальныя дзяржавы паняволеных народаў ня толькі ў імя дэмакратычных ідэяў, але й дзеля таго, што гэта зьяўляецца гістарычнай канечнасьцю й ляжыць у інтарэсах Захаду, што гэта адзіны спосаб перамогі над бальшавізмам і ўстанаўленьня трывалага міру ў сьвеце.

Трэба верыць, што на гэткі шлях раней ці пазьней будзе змушаная ўзыйсьці й афіцыяльная палітыка заходніх дзяржаваў, бо гэтага вымагаюць палітычныя інтарэсы самога-ж Захаду.

«Бацькаўшчына». 27 студзеня 1952 г.

ЯЗЭП МЕНСКІ[1]

НА ЗАГАД НАЦЫІ

«Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай». Гэтак ад імя народу 34 гады таму назад праклямавала Рада БНР.

Здавалася, праламаўшы цяжар стагодзьдзяў чужацкае няволі, уваскрэсла слаўная мінуўшчыня народу. Здавалася, народ узяў у свае собскія рукі свой лёс і шчасьце, адабранае ў яго ліхадзеямі-чужынцамі. Здавалася, збыліся найясьнейшыя мары,— бо што можа быць найвышэйшага за собскае незалежнае гаспадарства! Яно — аснова асноваў усяго. Створанае нацыяй, адно яно дае запраўдныя, неабмежаныя магчымасьці для станаўленьня й поўнага росквіту нацыі.

І ня віна народу, што гэтаму ўзьлёту ня было суджана тады стацца лётам, што нашае незалежнае гаспадарства было здушанае гэнай самай ліхадзейнаю сілай, адно на гэты раз перафарбаванай на чырвоны колер. Тое, што Сакавіковы Акт ня стаўся доўгатрывалай гаспадарстваўскай рэальнасьцяй,— ніколькі ня зьніжае ягонага вялізарнага нацыянальна-гістарычнага значаньня. Ён стаўся нашым ідэалам, за ўжыцьцёўленьне якога вось ужо колькі дзесяцігодзьдзяў трывае няўцішнае змаганьне. Змаганьне забрала нязьлічоныя тысячы ахвяраў, але не запыняецца, і гэта пераконвае нас, што яно ўкарануецца перамогаю.

У імя незалежнасьці былі хапіліся за зброю слуцкія паўстанцы. Навет каты нашае незалежнасьці мусілі былі лічыцца з патрабаваньнямі народу ды пайсьці на сякія-такія вымушаныя часовыя ўступкі. Хоць-бы той

[1] Псэўданім Ізыдара Плашчынскага, малодшага брата паэта Язэпа Пушчы.

факт, што была створаная БССР або палітыка гэтак званай беларусызацыі. Нам зьдзеклівым здаецца гэты тэрмін, бо якая гутарка можа ісьці пра беларусызацыю Беларусі. Гутарка можа быць адно пра стварэньне запраўднае нацыянальнае культуры ў найшырэйшым значаньні гэтага слова, улучаючы сюды й гаспадарственасьць. Гэтак і паставілася была беларуская інтэлігенцыя, выкарыстоўваючы «беларусызацыю» для будаваньня апрычонага нацыянальнага быцьця. Адно за колькі гадоў гэтак была сягнула наперад, разьвінулася нацыянальная справа, што трэ было дзіву даваццa, колькі меў энэргіі творчы дух народу.

Але ў тым-то й рэч, што БССР ніколі ня была беларускім нацыянальным гаспадарствам. І таму той, хто яе стварыў, мабыць, прыйшоўшы ў жах ад «беларусызацыі», рынуўся з узьюджанай сілаю вынішчаць усё нашае нацыянальнае. Падзьмуў ня вецер, а навальніца з Усходу. І гэтым разам вораг замахнуўся на самае галоўнае — наважыў адабраць мозаг у народу, сьцяць галаву — наважыў дазвання вынішчыць нацыянальна адданую інтэлігенцыю, каб пасьля лягчэй было апанаваць і ўвесь народ.

Катавалі, расстрэльвалі, ссылалі на далёкую поўнач нашых палітыкаў, якія ў тайніках душы бераглі мары пра адбудову незалежнага краю; нашых вучоных, у працах якіх беларускі народ ад даўніх стагодзьдзяў паўставаў у вобразе народу нацыянальна апрычонага з собскай гаспадарсьцьвенасьцю ды багацейшай ад іншых культурай; нашых пісьменікаў, якія ўслаўлялі красу нацыянальнасьці; нашых гаспадарнікаў, якія плянавалі гаспадарчае ўнезалежненьне краю; нашых інжынэраў, якія праектавалі нацыянальную прамысловасьць; нашых вучоных аграномаў, якія даводзілі пра нявычэрпныя сельскагаспадарчыя магчымасьці Беларусі; нашых настаўнікаў, якія ўзгадоўвалі дзяцей і моладзь у любасьці ды пашане да свайго народу й культуры. Гэтак пасьля «перадышкі» пачаў свой д'ябальскі паход супраць найменшых праяваў нацыянальнага неўтамаваны, разгойсаны чырвоны расейскі імпэрыялізм.

Адыходзілі адны, іх заступалі іншыя, зьменьваліся спосабы змаганьня, але яно не запынялася, каб празь нейкі час, ужо ня гэтак даўна, выбухнуць з новаю сілай і на гэты раз сілай збройнаю. Далёка за межамі Бе-

ларусі прагучэла слава нашых гэраічных партызанаў, якія вырушылі ў бой супраць чырвонага расейскага сатрапа.

І ўсё гэта змаганьне больш як праз тры дзесяткі гадоў у імя аднаго-адзінага ідэалу — у імя незалежнасьці. Ідэя незалежнасьці сталася ўсеабдымнай, сынтэзуючай ідэяй для ўсяго нашага змаганьня, сталася найвышэйшай, сьвятарнай ідэяй, ідэяй у дзеі. Гэта азначае, што яна стала народнай сьведамасьцяй і ў гэтым ейная неадольная ды пераможная сіла. Найменшае збочваньне ад гэтае ідэі ёсьць здрадай у нашых умовах.

Якое-ж месца займае беларуская эміграцыя ў гэтым народным ходаньні? Якраз на эміграцыю самой гісторыяй ускладзена асаблівая роля.

Ужо адно тое, што на выгнаньні знаходзіцца Рада БНР зь ягоным прэзыдэнтам як адзіна запраўдным рэпрэзантантам нашага народу — прамаўляе само за сябе.

Заслуга нашае эміграцыі самперш у тым, што яна, бадай як ніхто, прычынілася да папулярызацыі Бацькаўшчыны, імя ейнага народу сярод дэмакратычнага сьвету, які да гэтага мала, а то й зусім нічога ня ведаў пра нас. Усё, што робіцца ў гэтым кірунку — ад удзелу нашае эміграцыі ў палітычных акцыях паняволеных бальшавізмам народаў, ад выставаў народнага мастацтва й выступленьняў ансамбляў да звычайнае інфармацыйнае даведкі пра Беларусь — трэба горача вітаць, бо ўсё гэта ськівана да аднае мэты: расказаць пра край забраны, пра шматмільённы народ, які мае сваю гісторыю, багатую народную культуру, сваю адменную псыхалёгію, пра народ, у якога гвалтам адабралі ягоную нацыянальную гаспадарсьцьвенасьць, але не асілілі адабраць волі й наважанасьці адваяваць адабранае.

Людзі вымушана пакінулі Бацькаўшчыну, але пайшлі ў сьвет з пачуцьцямі й думкамі пра яе ды наважылі апэляваць перад вольным сьветам, каб ён заступіўся або хоць-бы напачатак пачуў голас пратэсту паняволенага народу.

І калі ўзяць на ўвагу, што бадай няма такой вольнай краіны на сьвеце, дзе ня было-б беларускіх эмігрантаў, ды калі скласьці разам усё зробленае — ад большага да самага на першы пагляд нязначнага — дык зьбярэцца спорная дзялянка. Хіба найважнейшае ў гэ-

тай справе тое, што яна зьяўляецца выражэньнем тое-ж ідэі, якая ўвасоблена і ў векапомным Сакавіковым Акце.

Але мы апынуліся на эміграцыі ў надзвычайна адказны мамэнт, у пераломную часіну.

Да гэтага часу дзейнасьць нашае эміграцыі насіла пераважна культурніцкі характар. Кажнаму зразумела вялікае значаньне культурна-нацыянальнай працы, асабліва для беларускае эміграцыі. Але запыняцца сяньня на гэтым будзе азначаць неразуменьне гістарычнае важнасьці мамэнту, будзе азначаць плясьціся ў хвасьце ды апынуцца наводшыбе ліхаманкава насьпявальных палітычна-грамадзкіх падзеяў, зь якімі ў канцовым выніку зьвязаны й лёс нашае Бацькаўшчыны.

Недаравальным злачынствам будзе, калі мы апынімся ў ролі адно стараньніх рэгістратараў падзеяў.

Галоўная ўвага мусіць быць ськіраваная ў палітычную плашчыню. Сюды трэба кінуць усё найбольш здольнае, нацыянальна сьведамае. Няблага скакаць «Лявоніху», але адно празь «Лявоніху» мы не здабудзем сабе месца ў палітычным сьвеце. Адно з галоўных заданьняў зьмяшчаецца ў тым, каб спрамагчыся вынесьці беларускую справу на балонкі заходняга друку. Усе высылкі трэба прыкласьці для дасягненьня гэтае мэты. Чым больш ды галасьней будзе пісацца, тым папулярнейшай будзе нашая справа. Гэта разам зь іншымі палітычнымі акцыямі дапаможа заняць нашаму народу пэўнае месца ў грамадзка-палітычнай думцы Захаду, што так патрэбна на будучыню.

Сяньняшняя палітычная сытуацыя ў сьвеце вымагае асаблівае актывізацыі й нашых палітычных дзейнікаў і ўсяе эміграцыі. Але ня можа быць запраўднае, мэтаімклівае актывізацыі без арганізаванасьці, без задзіночаньня эміграцыі. З сумам даводзіцца канстатаваць, што нам і не стае ўпаўніні гэтага самага істотнага. А якраз ад таго, як будзе зарганізавана нашая эміграцыя, будзе залежаць і размах ейнай дзейнасьці, і ейная гатовасьць актыўна прычыніцца да вырашэньня кардынальнага пытаньня — справы вызваленьня Беларусі. Адно праз арганізаванасьць мы можам станавіць пэўную сілу, пэўны грамадзка-палітычны дзейнік, зь якім могуць і будуць лічыцца, адно праз задзіночаньне мы можам дасягнуць пэўнае мэты.

Найгоршым ворагам нацыянальнае справы зьяўляецца той, хто чакае на гатовае ды пацяшае сябе бястурботным прыездам на вызваленую Бацькаўшчыну. Мы мусім узгадаваць у сябе самперш пачуцьцё абавязку ў імя вызваленьня Бацькаўшчыны. Мройнікі, якімі-б яны ні былі, будуць глыбака нялюбымі народу, калі яны ўжо сяньня ўважаюць сябе за «заслужаных» адно таму, што зьяўляюцца эмігрантамі ды яшчэ, як кажуць, палітычнымі. Пра заслугі яшчэ гутарка наперадзе — у змаганьні, у ахвярнасьці й самаахвярнасьці ў найбольш вызначальны, конавы мамэнт.

І практыка мінулага і сяньняшняе палітычнае афішаваньне нашых «дабрадзеяў» на эміграцыі сьцьвярджае адно: за Беларусь, мо як ніколі да гэтага, трэба будзе змагацца. Мы спадзяемся, што, раней ці пазьней, надыйдзе зудар бальшавіцка-мангольскага Ўсходу з дэмакратычным Захадам. Мы таксама верым, што ў працэсе гэтага ходаньня за перамогу сілаю самога ходаньня будуць створаныя найбольш спрыяльныя акалічнасьці для заваёвы свае нацыянальнае гаспадарсьцьвенасьці й нашым народам. Так, для заваёвы, бо ніхто нам яе гатовай, сьвежа сьпечанай ня дасыць.

У гэтым змаганьні й эміграцыя мае адыграць не апошнюю, а мо навет адну зь першых роляў — ад нашых палітыкаў да моладзі ўлучна. Мы можам сьніць пакутныя, гарачыя сны пра Бацькаўшчыну, але змушаны будзем разрываць нашымі, вось гэтымі рукамі ланцугі няволі ды змагацца, каб не скавалі новымі, змадэрнізаванымі, але зробленымі ўсё тымі-ж, добра нам знанымі, няпрошанымі аматарамі ад «апякунства», якім гэтак да смаку прыйшліся нашыя землі. Вось у гэтым кірунку й трэба ўзгадоўваць усю эміграцыю.

Выходзячы з вышэйзгаданых патрабаваньняў, мусім не для собскае карысьці сьцьвердзіць, што спорная частка эміграцыі надзіва маўклівая, маўклівая да неапраўданасьці. Найгорш тое, што сяньня людзі пачынаюць хварэць на апатыю, абыякавасьць і ў плашчыні грамадзкай і ў плашчыні прыватных дачыненьняў міжсобку. У шмат каго месца нацыянальнага абавязку заступае нізкая, дробязна-капеечная матарыяльнасьць, гойсаньне за мяшчанскім пульхным дабрабытам. Гэтак людзей зацягвае твань абыватальшчыны, яны глухнуць да нацыянальнае справы, трацяць навет звычайнае ча-

лавечае пачуцьцё ўзаемнае дапамогі. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на гэта, змагацца як з пошасьцяй, каб усьцерагчы людзей ад беззваротнага ідэйнага ўпадку.

Наша мэта — стварыць сцэмэнтаваную ад першага да апошнага, дынамічна дзейную грамаду. Нам гэтак патрэбная ўзаемная непарыўная лучнасьць, якая ў нашых эміграцкіх умовах выканае ролю магутнага стымулу да дзейнасьці, будзе несьці сьвежае паветра, сьвежы грамадзкі подых у вадцятую ад свайго сьвету, вымушаную эміграцкую адзіноту-пустэчу ды праз гэта падымаць людзей да занядбанай працы. Мы мусім берагчы кажную адзінку, бо з адзінак творыцца, вырастае грамада.

Мы стаімо перад абліччам конавага мамэнту. Сустрэць у поўнай гатовасьці вырашальны мамэнт — наш сьвяты, жыцьцём дадзены й прадыктаваны абавязак, які мусіць быць выкананы як загад нацыі. Мы мусім стацца штурмовым аддзелам ужо сяньня, каб ня быць бязраднымі, калі над сьветам успалыхне полымя ўсеагульнага змаганьня супраць тыраніі расейскага бальшавізму. А гэта вымагае ад нас ужо сяньня напорнае працы, запраўднае адданасьці справе, згуртаванасьці ды матар'яльных сродкаў, якія мы можам і павінны даць для фінансаваньня агульнае справы, без чаго ўсё ператвараецца адно ў недалужную балбатню.

Шукаць нам шляху ня трэба. Ён з гранічнай выразнасьцю вызначаны Сакавіковым Актам, паліты крывёю змаганьня самаахвярных сыноў нашага народу.

Не зважаючы на цемрашал, які спраўляе свой крывавы баль на нашай Бацькаўшчыне, мы разам з народам ні на часіну не перастаем верыць, што быць Уваскрошаньню Беларусі. І хіба адно на ўспамін — пастрашышча пра нялюдзка жудасную пару ў сваёй гісторыі народ насыпле капец з асінавым калом для «ўшанаваньня» крывавых прыблудаў-акупантаў ці то з-пад маскоўскае бальшавіцкае зоркі, ці то з-пад розных безгаловых арлоў.

З. Ш. А.

«Бацькаўшчына». 25 сакавіка 1952 г.

ДА БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ

Дарагія Сёстры й Браты, вітаю Вас усіх на чужыне з 34-й гадавінай абвешчаньня Беларускай Народнай Рэспублікі Сувэрэннай Дзяржавай і жадаю Вам сілы й вытрываласьці ў далейшым змаганьні за поўную рэалізацыю ідэалаў БНР.

Дарагія Суродзічы, Эмігранты!

32 гады таму Рада і Ўрад БНР пакінулі тэрыторыю Беларусі, выносячы з сабой сьцяг сувэрэнных правоў Беларускага Народу.

32 гады ворагі нашыя працягвалі безупынку свае хцівыя рукі да гэтага сьцягу.

Вырваць ім яго, аднак, не ўдалося. Ні правакацыі, ні дывэрсійныя падступы ім не памаглі. І сяньня вось, як штогоду, вы дэманструеце на цэлым сьвеце сваю нязломную волю ў абароне гэтага, нам сьвятога, сьцягу.

Але сяньня, як шчэ ніколі, не ўглядаўся з такой увагай і такім зацікаўленьнем цывілізаваны сьвет на гэтую нашую дэманстрацыю, на кожны наш рух.

Сяньня ўвесь цывілізаваны сьвет у прысьпешаным парадку мабілізуе ўсе свае маральныя і матэрыяльныя рэсурсы для змаганьня зь ненавісным усім, агрэсыўным бальшавізмам, ды шораз то мацней і з большым упэўненьнем чуюцца галасы больш адказных дзяржаўных мужоў сьвету, што збройны канфлікт з бальшавіцкай тыраніяй — няўхільны.

Такая міжнародная сытуацыя вымагае ад нас тым больш быць змабілізаванымі, быць гатовымі ў кожную часіну заняць сваё месца.

Было-б сьмяртэльна небясьпечным для будучыні Беларусі, калі-б мы, беларуская тут эміграцыя, будучы сьветкамі гарачкавай падрыхтоўкі вольнага сьвету да змаганьня з нашым акупантам, ня выкарысталі

нашых магчымасьцяў у мабілізацыі нашых тут маральных і матэрыяльных рэсурсаў ды не прарабілі шляху тэй падрыхтоўча-дыпляматычнай працы ў спакойны шчэ сяньня час, якую ў разгары ваенных падзеяў было-б мо прарабляць і немагчыма.

Высілкамі нашай перадавой і ахвярнейшай эміграцыі на чале з Радай і Ўрадам БНР шмат чаго ўжо праробленa, як на нутраным, так і вонкавым форуме, але шмат і вельмі шмат чаго яшчэ застаецца дарабляць, здабываць, умацоўваць здабытыя пазыцыі, бо ворагаў нашай вызвольнай справы маем ня мала і тут — па-за зялезнай заслонай, якія цікуюць за намі, каб у кожным адпаведным мамэнце выштаўхнуць нас звонку ці разьбіць, аслабіць знутра. Мы ня можам таму адпружываць свае ўвагі, свае пільнасьці ні на хвілінку.

Праца гэта — цяжкая, але абавязкі нашыя, сумленьне нашае, як вольных людзей зьняволенага народу, змушаюць нас да гэтае цяжкое працы, калі мы толькі ня хочым і надалей застацца на доўгія вякі нявольнікамі нашых злых суседзяў ды навекі вечныя быць праклінанымі нашымі пакаленьнямі.

У дзень сяньняшняга нашага нацыянальнага сьвята, у 34-ю гадавіну гэраічнага змаганьня беларускага народу, я заклікаю ўсю беларускую эміграцыю ўзважыць сур'ёзнасьць абставінаў і павялічыць як мага сваю актыўнасьць.

Я заклікаю ўсю патрыятычную беларускую эміграцыю выказаць максымум маральнай і матэрыяльнай падтрымкі нашым дзяржаўна-палітычным органам у іх так цяжкой і адказнай працы.

У імя агульнага дабра і шчасьця беларускага народу я горача заклікаю ўсё жывое беларускае за граніцай пад сьцяг БНР — сьцяг нязьменны, незаменны і нераможны.

Я заклікаю ўсю беларускую эміграцыю да братняй любові і згоды і да бескампраміснага змаганьня з тыранамі беларускага народу ды іхнімі памагачамі — ворагамі нашага адзінага, супольнага беларуска-вызвольнага фронту.

Жыве Беларусь у змаганьні! Жыве БНР!

Мікола Абрамчык

Прэзыдэнт Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. У сакавіку 1952 г.

«Бацькаўшчына», 30 сакавіка 1952 г.

АБ БЕЛАРУСІ НА МІЖНАРОДНЫМ КАСЬЦЕЛЬНЫМ КАНГРЭСЕ «КАСЬЦЁЛ У БЯДЗЕ»

Ад 21 да 24 кастрычніка сёлета арганізацыя «Ўсходняя Дапамога Сьвятарства» («Ostpriesterhilfe») зарганізавала ў Духоўнай Сэмінарыі ў Кэнінгштайне свой трэйці Кангрэс пад лёзунгам «Касьцёл у бядзе».

Арганізацыя «Ўсходняя Дапамога Сьвятарства» зьяўляецца ўжо сяньня ведамай інтэрнацянальнай арганізацыяй. Спачатку гэта была ініцыятыва аднаго бэльгійскага сьвятара-манаха а. Вэрэнфрыда ван Страатэна, якая імкнулася зацікавіць Бэльгію, Галяндыю, Швайцарыю, Заходнюю Нямеччыну й г. д. і знайсці ў іх дапамогу для касьцёла ў Усходняй Нямеччыне і сярод усходня-нямецкіх уцекачоў у Заходняй Нямеччыне, які знаходзіцца ў вялікай бядзе. Але хутка арганізацыя мусіла расшырыцца й зацікавіцца ўсімі ўсходняэўрапэйскімі ўцекачамі ў Заходняй Эўропе, і за некалькі год змагла яна ўжо прыйсьці ім зь вялікай дапамогай.

Ад 1951 году арганізуе «Ўсходняя Дапамога Сьвятарства» штогоднія кангрэсы сваіх супрацоўнікаў, успамагальнікаў і ўспамаганых. Рэфэраты II кангрэсу (1952) зьявіліся цяпер кніжным выданьнем („Kirche in Not", Königstein, 1943, бал. 156), якія зьмяшчаюць узрушаючыя справаздачы аб перасьледваньнях хрысьціянства амаль ува ўсіх краінах за зялезнай заслонай.

У гэтым годзе былі ў асаблівасьці прастудыяваныя праблемы цяжкага палажэньня сьвятарства. Гэтыя рэфэраты паявяцца таксама хутка ў кніжным выданьні.

На другім Кангрэсе справа перасьледваньня хрысьціян у Беларусі ня была рэфэраваная з прычыны адсутнасьці рэфэрэнта. У гэтым-жа годзе была заступленая й нашая краіна, праўда, ня ўроджанымі беларусамі, але двума шчырымі прыяцелямі нашае Бацькаўшчыны. Яго Эксцэленцыяй біскупам Слоскансам, Апостальскім Візытатарам для беларусаў, і нашаму грамадзянству вельмі добра ведамым а. Робэртам ван Кавэлертам. Першы быў ганаровым сябрам Кангрэсу; другі пастараўся падаць голас аб Беларусі, пайменна з палкім перакананьнем і самаадданасьцю, якімі ён ад раду гадоў абдарае нашую беларускую студэнцкую моладзь. Ягоны рэфэрат глыбака ўзварушыў сотні ўдзельнікаў Кангрэсу.

Пасьля гэтага адзін украінскі ўдзельнік Кангрэсу яго запытаў: «Ад якога часу знаходзіцеся Вы на Захадзе?» А калі ён пачуў, што рэфэрэнт зьяўляецца бэльгам, адказаў: «Ніводзін беларус ня мог-бы лепей гаварыць аб Беларусі».

Ніжэй мы перадаём рэфэрат а. Робэрта ў кароткім пераказе й вынятках.

Свой зьмястоўны і ўніклівы рэфэрат, абапёрты на глыбокай знаёмасьці беларускай гісторыі й гісторыі хрысьціянства на Беларусі, распачаў а. Робэрт наступнымі словамі:

«Із справаздачаў мінулага Кангрэсу вынікае, што на ім ня рэфэравалася аб цяжкім палажэньні касьцёлу на Беларусі. З тае прычыны, што таксама і ўчора вечарам, хаця пад старшынствам Беларускага Апастольскага Візытатара, падчас малітвы за перасьледваны касьцёл, імя Беларусі ня было ўспомненае, ня буду я рабіць вываду, што аб гэнай беднай краіне хоча забыцца й гэты Кангрэс, дзе гаварылася аб усіх іншых краінах за зялезнай заслонай, і ніводнага рэфэрату ня было прысьвечана Беларусі, апрача некалькі пераблытаных зацемак у расейскім рэфэраце. Дзеля гэтага я ўважаю, што тым больш зьяўляецца неабходным рэфэрат аб Беларусі. Хаця я сам не зьяўляюся беларусам,— і гэта найглыбей мяне засмучае — уважаю за сваю чэсьць магчы тут заступаць беларусаў».

Коратка ўспомніўшы аб геаграфічным палажэньні Беларусі і аб тым, што яна, нараўні з Украінай, фактам сяброўства ў міжнародных арганізацыях зьяўляецца вызнаная апрычонай нацыяй усімі камуністыч-

нымі й некамуністычнымі дзяржавамі, дакладчык коратка, але зьмястоўна насьветліў галоўныя этапы гісторыі Беларусі й гісторыі хрысьціянства ў нашай Бацькаўшчыне.

Нельга не прытачыць тае часткі рэфэрату а. Робэрта, у якой ён гаворыць аб гісторыі беларускага вызвольнага руху найнавейшае пары, а гэта з гледзішча на глыбокую знаёмасьць і правільнае разуменьне нашай нацыянальнай праблемы. І так а. Робэрт гаварыў:

«25 сакавіка 1918 году была абвешчаная незалежнасьць Беларусі, якая была вызнаная рознымі краінамі Эўропы дэ факто і дэ юрэ, калі ўзноў Рыскім трактатам (18 сакавіка 1921) была разьдзёртая між Расеяй і Польшчай.

Ад 1945 году былі ўзноў задзіночаныя абедзьве часткі Беларусі ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы. Згодна апошніх статыстык да беларускай нацыі належаць паводля мовы каля 15 мільёнаў душ унутры й вонках гэтай савецкай рэспублікі.

У 1918 годзе было каля аднэй пятай часткі, г. зн. каля трох мільёнаў беларусаў, каталікамі; чатыры апошнія пятыя належалі да арыентальнага абраду. Ад часоў Брэскай уніі (1595) былі яны афіцыяльна задзіночаныя з Рымам, але ў сярэдзіне XIX ст. пасьля высяленьня уніяцкіх каталіцкіх сьвятароў былі яны прымусова прылучаныя да Расейскай Праваслаўнай Царквы. Пасьля таго, калі яны ў 1905 годзе атрымалі рэлігійную свабоду, вярнуліся яны цэлымі парафіямі да каталіцкага касьцёла. Калі-б было тады дастаткова беларускіх сьвятароў і калі-б усходні абрад быў дазволены, каталіцкі касьцёл мог-бы бязь цяжкасьцяў здабыць для сябе амаль усю Беларусь».

Наступную частку свайго рэфэрату а. Робэрт прысьвяціў палажэньню праваслаўнай царквы й каталіцкага касьцёла на Беларусі пасьля Першай сусьветнай вайны, падчас нямецкай акупацыі ў Другую сусьветную вайну й сяньня, калі перасьледваньне рэлігіі асягнула свой кульмінацыйны пункт. Ён паінфармаваў, што ў 1921 годзе мела Беларусь паўтузіна каталіцкіх і сем праваслаўных біскупскіх дыяцэзіяў. Пасьля разьдзелу Беларусі Рыскім трактатам асталіся ў савецкай Беларусі толькі дзьве апастольскія адміністратуры: у Мен-

ску й Магілёве, у якіх апошнім Апастольскім Адміністратарам быў Я. Э. біскуп Слосканс. Толькі гэтыя адміністратуры абыймалі каля аднаго мільёну каталікоў лацінскага абраду й 60 сьвятароў: 40 у Менску і 20 у Магілёве. Перад тым, калі Я. Э. біскуп Слосканс у 1927 годзе быў арыштаваны, хацеў ён якраз у сваім прыватным памешканьні прытагаўляць кандыдатаў на сьвятароў. Пасьля гэтага сьвятары былі арыштоўваныя адзін за адным, што ня ведама, ці сяньня астаўся на Беларусі хоць адзін каталіцкі сьвятар.

У Польшчы былі беларусы падзеленыя між некалькімі дыяцэзіямі, зь якіх некаторыя мелі свае духоўныя сэмінарыі. Аднак беларускія кандыдаты на сьвятароў амаль ня мелі магчымасьці быць у іх прынятымі, бо «было ўжо дастаткова кандыдатаў», пайменна з Польшчы.

Перасьледваньне трывала й падчас нямецкай акупацыі, калі два апошнія беларускія біскупы Неманцэвіч і архімандрыт Абрантовіч былі нямецкім гэстапо арыштаваныя.

Сяньня ў Беларусі знаходзіцца каля 4 мільёнаў каталікоў лацінскага абраду і 25 000 усходняга абраду, але для іх няма аніводнага біскупа й аніводнага сьвятара. Есьць там толькі залежная ад Масквы праваслаўная царква, называная беларускай нацыянальнай царквой. Але яна зьяўляецца так сьцісла падпарадкаванай маскоўскаму патрыярху, што ні разу ня мела собскай мітраполіі і ніколі не тварыла собскай правінцыі патрыярхальнай царквы.

Далей а. Робэрт зрэфэраваў палажэньне беларускай праваслаўнай і каталіцкай царквы на эміграцыі. Ён адцеміў, што каталікі маюць свайго Апостальскага Візытатара у асобе Я. Э. біскупа Слосканса, назначанага на гэтае становішча ў 1952 годзе. Пад ягонай юрысдыкцыяй знаходзіцца 6 сьвятароў: 4 лацінскага і 2 усходнага абраду.

Беларуская праваслаўная эміграцыя парвала амаль усякую лучнасьць зь герархіяй маскоўскага патрыярхату. Яна абнятая Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквой, якая мае на эміграцыі двух япіскапаў і 5 сьвятароў.

Апошнюю частку свайго дакладу прысьвяціў а. Робэрт беларускім студэнтам у Лювэне, якімі ён спэцыяльна апякуецца.

Падчыркнуўшы вялікую нацыянальную салідарнасьць і глыбокую рэлігійную талерантнасьць гэтых студэнтаў, рэфэрэнт, як прыклад гэтага, падаў наступныя факты:

«Ад пяцёх год гэтыя студэнты із сваіх недастатковых стыпэндыяў зусім адны несьлі цяжар духоўнага абслугоўваньня ўсіх праваслаўных беларусаў у Бэльгіі. Апрача гэтага, яны ўмажлівілі студыі ў Лювэнскім універсытэце аднаму маладому праваслаўнаму сьвятару і, незалежна ад таго, што амаль усе яны зьяўляюцца праваслаўнымі, з хрысьціянскай і нацыянальнай салідарнасьці ўзялі на сябе цяжар памагаць у тэалягічных студыях аднаму каталіцкаму тэалёгу і аднаму каталіцкаму гімназістаму.

Як капэлян гэтых беларускіх студэнтаў, прыводжу я гэтыя ўзапраўды надзвычайныя і, магчыма, у сваім родзе адзіныя сьведчаньні зь вялікай гордасьцю і з тым большым падзіўленьнем, бо я асабіста ведаю, як гэтыя студэнты перавыдаткоўваюць і абцяжваюць кажнага году свой собскі бюджэт, каб забясьпечыць гэныя сэмінарыйныя стыпэндыі і гэную апастольскую дзейнасьць.

25 сакавіка 1952 году Ягоная Эмінэнцыя кардынал Тыссэран, сакратар Арыентальнай Кангрэгацыі, афіцыяльна вызнаў гэтыя заслугі, калі ён спэцыяльна быў прыбыў з Рыму ў Лювэн, каб высьвяціць новы інтэрнат беларускіх студэнтаў.

Я ўважаю, што й мы павінны гэтых студэнтаў сваім чынам таксама падбадзёрыць. Я ўпаўнамочаны гэтымі студэнтамі запэўніць «Усходнюю Дапамогу Сьвятарства» аб іхным сталым супрацоўніцтве, дзе-б гэта было патрэбным, прыкладам, удзелам іхнага надзвычайнага студэнцкага хору ў прапагандных імпрэзах і г. п. Я прашу высокапаважаных спадароў Прэзыдыюму «Ўсходняй Дапамогі Сьвятарства» не адхіляць гэтай прапановы, бо яна, на маю думку, можа быць вельмі вартасным удзелам у ўсходняй сьвятарскай дапамозе».

Свой глыбокі рэфэрат закончыў а. Робэрт словамі:

«Ужо раз у гісторыі Беларусі, пасьля 1905 году, вялікія масы верных із зрусыфікаванай праваслаўнай царквы ператрывалі ў рэлігійным і нацыянальным духу й захавалі свае рэлігійныя традыцыі, і гэта пасьля таго, калі яны, пазбаўленыя нацыянальных сьвятароў, на

працягу поўстагодзьдзя толькі пры Божай помачы перахавалі скарбы веры і ставілі іх вышэй усякіх рытуальных пытаньняў. Што беларускі народ даканаў тады, гэта зможа ён даканаць і ў будучыні пры помачы шматлікіх акадэмікаў, якіх выхоўвае цяпер Лювэнскі ўніверсытэт для будучыні Беларусі. І гэтым разам не апусьціць іх помач Божага провіду, якая станецца заслугай духа ахвяры й апастольскага ідэялізму нашых лювэнскіх студэнтаў».

«Бацькаўшчына», 15 лістапада 1953 г.

ЮРКА ВІЦЬБІЧ

МЫ ДОЙДЗЕМ!

Калісьці ў мінулым пяшчотна агарнула нас прыгожае, непаўторнае каханьне. З таго часу на суворым жыццёвым шляху прыастыгла сэрца, але каханьне назаўсёды засталося з вамі, як застаецца пад грубым і халодным ільдом бурлівы і неўтрапены струмень. Здаецца, яе звалі Марыля, а магчыма — інакш. Ейнае імя ведаеце сёньня толькі вы адны.

Часам, у гадзіны падарожжа, вы радасна ўздрыгнецеся, заўважыўшы напарадзе знаёмыя постаць і хаду. Вы мімаволі прысьпяшаеце крок і, параўняўшыся, адразу пераконваецеся ў сваёй памылцы. Не, гэта не яна. Тая мела прывабны славянскі твар з тонкімі абрысамі вуснаў, зь сінімі задуменнымі вачыма, і валасы ейныя нагадавалі кужаль. Гэта не яна. А часам пачуецца вам зводдаль знаёмы сьмех. Вы ўсхвалявана сьпяшаецеся туды, адкуль ён даляцеў, і, яшчэ не даходзячы, спыняецеся. Не, гэта таксама не яна. Сьмех тае нагадваў і гутарку лясное крыніцы, і сьпеў жаўрука над жытам, і водгульле далёкае жалейкі. Гэта не яна. Гэта не Марыля.

Чаму-ж зьдзіўляецца іншаземец, калі заўважыць, што мы зь юнацкім спрытам сьпяшаемся да нібы знаёмых рэкаў, а потым разгублена аглядаем іхнія берагі. Камусьці з нас спачатку прыгадаўся ціхі Сож пад сівым Крычавам, камусьці хуткаплынная Дзьвіна пад зацятым Вяліжам, камусьці-ж здалося, што гэта ахутаны паданьнямі бацька Нёман паволі агінае Новы Сьвержань. І толькі, трапіўшы на бераг, мы пераконваемся, што гэта нямецкі ідылічны Рэген плыве ў Дунай, адлюстроўваючы ў сабе крушні замкаў Обэрпфаль-

цу, што гэта амэрыканскі, руды ад нафты Дэлявэр сьпяшаецца праз пракураную хвабрычным дымам Пэнсыльванію, што гэта аўстралійскі Мурэй скочваецца з узвышшаў Уэльсу да лагчынаў кэнгуровае Вікторыі. Ня ідуць па іх лайбы і плыты, ня схіліліся над імі ніцыя бярозы і вербы, і не амываюць яны сьвятое Барысавае каменьне. Не, гэта ня Сож, ня Дзьвіна і ня Нёман.

Чаму-ж зьдзіўляецца іншаземец, калі мы, угледзеўшы наперадзе прыгожыя ўзгоркі, хутка ўзьбіраемся на іх, а потым з сумам дзівімся вакол. Адным з нас здалося, што гэта Віцебская Града, другім, што Наваградзкі Горб, а трэйцім прыгадаліся маляўнічыя Панары пад Вільняй. Але зь іх мы бачым не гасьцінцы й курганы, не гарадзішчы й капліцы, а гмахі Нью-Ёрку, капальні Льежу і докі Буэнас-Айрэсу. Не, гэта ня Віцебская Града, не Наваградзкі Горб і не Панары.

Чаму-ж зьдзіўляецца іншаземец, калі мы, дзеці адвечных пушчаў, пабачыўшы лес, кідаемся да ягоных абдымкаў і без спагады спакідаем іх. Хтосьці з нас спачатку прыгадаў Белавежу, некаторыя — Налібокі, а нехта Вокаўскі Лес. Але-ж у запраўднасьці — гэта Елаўстонскі Нацыянальны Парк на мяжы Уайёмінгу і Мантаны, а можа, амазонскія джунглі Бразыліі, калі не канадыйская тайга. Тут не вандруе зубр, ня кукуе зязюля і ня чырванеюць духмяныя суніцы. Не, гэта ня Белавежа, ня Налібокі і ня Вокаўскі Лес.

Чаму-ж зьдзіўляецца іншаземец, калі, пачуўшы, аддалены звон, мы набожна падымаем руку, каб перахрысьціцца, і нечакана апускаецца яна. Нам здалося, што гэта зьвіняць званы Сьвятой Сафіі, а можа, Жыровічаў, а магчыма, касьцёлаў Вільні, і Божая Маці з Войстрае Брамы ўздымае над намі свой амафор. Але-ж гэта толькі мары. Незнаёмыя праведнікі глядзяць каменнымі вачыма на нашае бесхацімнае вандроўе.

І мы ідзём далей. Ідзём празь дзень, праз ноч. Ідзём і ўзімку і ўлетку. Ідзём і ў навальніцы і ў сьпёкі. Мы цягнем з сабой у сьціплых хатылёх няўтольны сум, што балейшы ад Гімаляяў і глыбейшы за Атлянтыку. І ніколі ня можа таго стацца, каб мы не дайшлі нарэшце да свае непаўторнае любові, да сінявокае Беларусі. Занадта вялікае нашае замілаваньне ёю і занадта глыбокая варажнеча да ейных ворагаў, каб гэтае ня зьдзейсь-

нілася. Але я бачу, як нечакана спазма сьціснула вам горла і задрыжэлі вашыя вусны. На нашых нагах кроў, і крывёю сьцякаюць нашыя сэрцы. Дык дайце руку і пойдзем далей. Ву-унь бачыце там, далёка-далёка, дзе ясьнейшае неба, зноў сінеюць рэкі, чарнеюць лясы і ўздымаюцца ўзгоркі.

Мы дойдзем! Абавязкава дойдзем! Пашчасьліў нам, Божа! Так станься!

ЗША, Саўт-Рывэр, 1950.

«Бацькаўшчына», 29 лістапада 1953 г.

ПОСТАЦІ

СТАНІСЛАЎ СТАНКЕВІЧ

СНЫ «АБ ВЯСЬНЕ ПРЫГОЖАЙ І ДАЛЁКАЙ». Канстанцыя Буйла — новая ахвяра бальшавіцкае крытыкі

Адзінай пасьля А. Цёткі прадстаўніцаю жанчын у беларускай нашаніўскай літаратуры была Канстанцыя Буйла, мяккі й мэлянхалічны лірызм якой зьяўляўся галоўнай адзнакай ейнае творчасьці. Не паэтыцкія вобразы й слоўныя сродкі экспрэсыі, але іменна гэты мяккі й чулы лірызм зьбліжаў ейную паэзыю да народнае творчасьці й рабіў яе псыхалягічна блізкай для беларускага чытача.

Вершы Канстанцыі Буйлы паявіліся перад першай сусьветнай вайной у зборніку «Курганная кветка», а беларуская патрыятычная песьня на ейныя словы «Люблю наш край, старонку гэту» была прынятая беларускім народам як адна з найпапулярнейшых ягоных песьняў. Калі ў 1934 г. польскія настаўнікі вясковых школаў на тэрыторыі Наваградчыны на загад школьнага інспэктарыяту праводзілі запісваньне беларускай народнай творчасьці сярод мясцовага сялянства, дык вельмі часта напатыкаліся на гэтую песьню й запісвалі яе, як зложаную самым народам — народную. Гэта найлепшы доказ папулярнасьці Буйлы, якая змагла глыбака адчуць і перадаць мастацкім словам духовыя перажываньні беларуса.

Паміж першай і другой сусьветнай вайной, на працягу звыш 25 гадоў, бадай, нікому зь беларусаў ня прыходзілася ня толькі сустракаць новых твораў К. Буйлы, але й наогул пачуць што-небудзь аб выдатнай паэтцы. Мне прыпадкова ўдалося даведацца восеньню 1940 г. ад

Янкі Купалы, што Буйла, будучы ўжо паджылай, але шустрай жанчынай, пражывае ў Маскве й літаратурнай творчасьцю болей не займаецца. Была гэта сумная й адначасна радасная вестка. Сумная таму, што замоўк, праўдападобна назаўсёды, як магло тады здавацца, адзін з найбольш арыгінальных беларускіх паэтыцкіх талентаў. Радавацца прыходзілася таму, што Буйла яшчэ жыве й што, можа, лепей, што нічога ня піша, бо ў праціўным выпадку магла-б ужо даўно стацца ахвяраю бальшавіцкага тэрору, як дзесяткі й сотні іншых выдатных мастакоў беларускага слова. У той час, аб якім тут мова, спасярод вялікае колькасьці беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў із старэйшае гэнэрацыі, апрача Буйлы, былі ўцалелі толькі тры: Янка Купала, Якуб Колас і Зьмітрок Бядуля.

Цяперака даведваемся, што пасьля апошняй вайны Буйла ўзнавіла сваю паэтыцкую дзейнасьць, а дзеля гэтага, зразумела, сталася, як і ўсе іншыя паэты й пісьменьнікі нерасейскіх народаў, ахвяраю войстрых нападаў з боку бальшавіцкае крытыкі. У адным з нумароў менскае «Зьвязды» (№ 149 за 27 ліпеня 1951 г.), якія нядаўна папалі ў мае рукі, знаходзім вялізарны артыкул нейкага расейца Г. Шчарбатава п. н. «У палоне скажоных уяўленьняў і архаічных вобразаў», у якім слаўная беларуская паэтка цяжка абвінавачваецца ў адыходзе ад сучаснай бальшавіцкай запраўднасьці, у ідэялягічных скрыўленьнях (паводле «Зьвязды» — у «скажэньнях»), а галоўнае, у беларускім нацыяналізьме, значыцца, ува ўсіх тых праступленьнях, якія апошнім часам высоўваюцца ўсім беларускім паэтам.

У другім нумары літаратурнага часопісу «Полымя» за 1951 г. Буйла надрукавала цыкль сваіх вершаў, спасярод якіх лірычны верш «Сьнег» першым папаў пад абстрэл казённага бальшавіцкага крытыка. Цытуем за «Зьвяздой» некаторыя вобразы твору із злоснымі заўвагамі крытыка:

«Паэтка стварае ідылічны малюнак «добрага вечара» ў «утульнай сьвятліцы», калі на дварэ «сьнег пахучы, пуховы зямлю атуліў», а «ў печы агеньчык яшчэ не пагас». Буйла ўміляецца гэтым архаічным малюнкам і ў захопленьні ўсклікае:

Скуль такая на сьвет наплыла цішыня?

Аб якой «цішыні на сьвеце» гаворыць паэтка? Няўжо яна не разумее, што супярэчыць сама сабе, што амэрыканскія бомбы ў Карэі... не даюць ніякага права гаварыць аб цішыні на сьвеце. Але Буйла разьвівае думку далей:

Мне здаецца тады, што я ў тэй старане,
Дзе калісьці матуля расьціла мяне,
Дзе таксама прыціх і цябе акрыліў
Маладосьці і мар белапенны прыліў.

Аказваецца, вось для чаго спатрэбілася «цішыня на сьвеце» К. Буйле. Яна патрэбна ёй для таго, каб сказіць (пакідаем гэты русыцызм дзеля лепшага пераданьня думак «Зьвязды».— *Рэд.*) праўду аб беларускім народзе.

Беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў, у дружнай сям'і савецкіх народаў зь першых дзён вызваленьня рэспублікі ад нямецка-фашыстоўскіх захопнікаў прыступіў да самаадданай аднаўленчай працы...» І далей, пасьля цэлай тырады падобнай траскатні казённых прапагандовых прыёмаў, крытык ставіць жорсткае абвінавачаньне:

«Нічога гэтага, аднак, ня хоча бачыць К. Буйла. Замкнуўшыся ў шкарлупу сваёй «сьвятліцы», яна перастала бачыць багатую й мнагастайную савецкую запраўднасьць, апынулася ў палоне скажоных уяўленьняў аб Савецкай Беларусі, у палоне старадаўных вобразаў, якія даўно ўжо адыйшлі ў нябыт».

Значыцца, у ўмовах савецкае «свабоды» паэт ня мае права пісаць аб тым, што дыктуе ягонае сэрца, да чаго скланяюцца асабліваcьці ягонага таленту. Не! Ён павінен толькі вульгарна рыфмаваць усе казённыя лёзунгі бальшавіцкай прапаганды за кошт запраўднага паэтыцкага натхненьня. Паэт, як і кажны іншы падсавецкі чалавек, павінен вызбыцца ўсякай індывідуальнасьці, перарадзіўшыся ў бязвольны аўтамат, які павінен бяздушна рухацца на загад партыйнага апарату.

У 1950 г. быў выдадзены зборнік вершаў Буйлы «Сьвітаньне». У ім казённая крытыка знайшла адныя толькі «ідэялягічныя скажэньні», «архаічныя абразы» ды, што найгорш, «нацыяналістычныя ўхілы». Возьмем дзеля прыкладу верш «Мая Беларусь», які выклікае ў бальшавіцкага крытыка цэлы паток абурэньняў:

«Верш запоўнены архаічным паэтычным рэквізытам і выклікае пачуццё расчараваньня й пратэсту. Вось некаторыя радкі зь яго:

Беларусь мая — цёмны, вялікасны бор,
Дзе ў гусьцечы курлічуць, пяюць жураўлі...
Беларусь мая — люстры шырокіх азёр,
У якія ўглядаецца неба жывое...
Беларусь мая ў зелені стройных бяроз,
Што вядуць ля шырокіх дарог карагоды...
Беларусь мая — ў росквіце белых садоў,
Над ружоваю хусткай празрыстых туманаў...
Беларусь мая — ветлыя выгляды хат...
Беларусь мая — ветлы, прыхільны народ...

Што-ж у гэтым вершы выклікае ў крытыка «пачуццё расчараваньня й пратэсту»?

А вось што:

«Гэтую адвечную Беларусь пісьменьніца малюе адзінокай, па-за сувязьзю зь вялікім расейскім народам»... Сьпяяўшы шумлівыя дыфырамбы на чэсьць «сталінскай дружбы народаў», бальшавіцкі рэцэнзэнт ня можа ўстрымацца ад абурэньня, што «гэтай дружбы савецкіх народаў чамусьці не заўважае К. Буйла. Больш таго, ад некаторых ейных вершаў вее нацыянальнай абмежаванасьцю, імкненьнем абасобіцца й замкнуцца ў рамках сваёй нацыянальнай шкарлупы, імкненьнем ня бачыць таго, што зьбліжае й злучае ўсе нацыянальнасьці Савецкага Саюзу *(ведама, толькі расейшчына «злучае» й «зьбліжае» гэтыя нацыянальнасьці,— дадамо ад сябе.— Ст.)*. Пад словам «Радзіма» паэтка разумее ня ўвесь Савецкі Саюз, а толькі Беларусь. Прычым для яе Савецкая Беларусь ня роўная сярод роўных брацкіх рэспублік Савецкага Саюзу, а абасобленая, «прыгажэйшая», «найдаражэйшая», да якой няма роўных.

Жывучы паза межамі Беларусі, у другой савецкай рэспубліцы, К. Буйла пісала ў 1946 г.:

Зямля мая далёкая,
Зямля мая цудоўная,
Радзіма сінявокая,
Якая-ж табе роўная?
Мо ёсьць і прыгажэйшыя,—
Каму што ў сьвеце глянецца,—
Мая-ж — найдаражэйшаю
Да сьмерці мне астанецца.

Нічога дзіўнага, што падобныя думкі паэткі зьяўляюцца цяжкім праступкам у беларускім нацыяналізь-

ме, бо толькі Расея можа быць «найдаражэйшай» і «найпрыгажэйшай», а ня нейкая там Беларусь, якая, калі-б ня «братняя помач вялікага расейскага народу» й ня «бацькаўскія клопаты вялікага Сталіна», хіба ўжо даўно шчэзла-б з аблічча зямлі.

У зборніку «Сьвітаньне» зьмешчаны разьдзел «Малюнкі прыроды», які, на думку савецкага крытыка, «выклікае законнае абурэньне ў савецкага чытача» *(хіба такога, як сам крытык.— Ст.)*. Вось што чытаем аб гэтых вершах:

«Усе гэтыя «малюнкі» напісаныя пасьля вялікай Айчыннай вайны, калі савецкі народ, радасны й натхнёны сваёй перамогай, з такой-жа радасьцю прыступіў да мірнай стваральнай працы.

Аднак іменна гэтыя гады чамусьці не даспадобы паэтцы. Яна марыць аб нейкай іншай вясьне, аб нейкім іншым шчасьці. Верш «Сягоньня сонца глянула з-за хмар», напісаны ў 1946 г., прасякнуты чужым (у «Зьвязьдзе» проста па-расейску — «чуждым».— *Ст.*) савецкаму народу духам. Паэтка скаржыцца: «І мы пасьля халодных навальніц праменьнямі тваімі не сагрэты».

У вершы «Восень» — «аб вясьне прыгожай і далёкай ціха сьніць узораны папар». У вершы «Сакавік» — «сьпіць пад пухкім сьнегам поле, сьніць яно аб новай долі».

Бальшавіцкі крытык, ня могучы апанавацца ад абурэньня, пытаецца: аб якой «прыгожай і далёкай вясьне», аб якой «новай долі» ідзе гутарка? Савецкі народ з поўным правам называе наш цудоўны час слаўнай вясной камунізму... З пачуцьцём патрыятычнай гордасьці савецкі народ называе эпоху сацыялізму вясной чалавецтва. Ні аб якой іншай вясьне ён ніколі не марыў *(вось дык шчасьлівы гэты савецкі народ?! — Ст.)*. Якая-ж іншая вясна захапляе К. Буйлу? Такімі-ж настроямі прасякнутыя амаль усе вершы й апошняга разьдзелу кнігі «Сьвітаньне» — «Песьні й думы».

Усе гэтыя й іншыя, тут ня ўспомненыя, напады казённага бальшавіцкага крытыка як ня трэба лепей паказваюць, у якіх жахлівых умовах знаходзяцца беларускія паэты й пісьменнікі «пад сонцам Сталінскай канстытуцыі», дзе яны мусяць штучна заглушаць голас свайго сэрца, рабіць маральнае самагубства, а пісаць

толькі на тыя, хоць чужыя для іх, тэмы, што ім вызначаць «партыя й урад», ды пісаць так, як гэтага вымагае казённая бальшавіцкая крытыка. З артыкулу «Зьвязды» таксама бачым, што К. Буйла, сяньня адзіная побач зь Я. Коласам прадстаўніца беларускае паэзыі яшчэ дабальшавіцкага пэрыяду, знайшла ў сабе столькі мужнасьці й адвагі, каб, паміма жудаснага бальшавіцкага маральнага й фізычнага тэрору, апяваць Беларусь такую, аб якой мроіць і да якой імкнецца ўвесь беларускі народ.

«Бацькаўшчына», 31 кастрычніка 1951 г.

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА

У КАЗАХСТАНСКАЙ ССЫЛЦЫ

Вясною 1940 году некалькі пісьменьнікаў з Заходняй Беларусі былі запрошаныя Саюзам пісьменьнікаў БССР у Менск. Прышлося пазнаёміцца тады з Купалам, Бядулем і многімі іншымі. Уражаньні нашыя з усяго былі няцікавыя. Калі мы раз ішлі па Савецкай вуліцы, голасна гаворачы ды жартуючы па-беларуску, Кучар, які быў разам з намі, нейк спалохаўся, сказаў: «Ведаеце, не гаварэце так голасна па-беларуску — у нас гэта ня прынята». І гэта было ў сэрцы Беларусі, Менску!

Пару дзён пасьля звароту зь менскіх «гасьцей» у Вялейку, аднае прыгожае раніцы, калі я толькі ўставала з ложка, у нашыя дзверы пастукаліся ўзброеныя энкавэдзісты. Яны зь месца абшукалі мяне, дарма што я была яшчэ навет бяз сукенкі, і загадалі мне зараз-жа зьбірацца з хлапцамі. Куды — не сказалі.

Хлапцы былі ў школе. Па іх пайшло двух энкавэдзістаў із штыхамі «наперавес». Два іншыя тымчасам абшуквалі пакой і ўсе мае небагатыя рэчы. Хоць гімназыя, перароблена бальшавікамі на «дзесяцігодку», была ў іншым канцы гораду, энкавэдзісты вельмі хутка прывялі хлапцоў.

На падлогу вывернулі валізу, сьцягнулі з лавы, на якой была, маю пасьцель, коўдру й падушкі,— усё ператрэсьлі. Забралі альбом з фатаграфіямі, кнігі, лісты. Ярку (старэйшаму хлапцу) удалося схаваць некалькі фатаграфіяў пад кашуляй на грудзях, рэшта так і загінула.

Пасьля перагляду рэчы й пасьцель абы-як зьвязалі ў клумак, і неўзабаве мы ўжо стаялі ў машыне, якая імчала вуліцамі Вялейкі. Шмат такіх машынаў можна

было пабачыць у гэны сьцюдзёны, золкі дзень 13 красавіка ў горадзе!

Усіх высыланых звозілі на станцыю й ладавалі ў даўжэзны таварны цягнік. Уся станцыя была поўная людзей. Вартаўнікі — грубыя, брутальныя; сплаканыя, напалоханыя жанчыны (іх ды дзяцей было 99 %); сваякі й знаёмыя, якія — дарма што бальшавіцкія запалохваньні — прыбеглі праводзіць сваіх блізкіх у далёкую, невядамую дарогу. Усё гэта мітусілася, пхалася, лаялася, крычала й плакала. Энкавэдзісты шчыльна акружылі цягнік, але ўсё-ж той і гэты з натоўпу прарываўся, падбягаў да дзьвярэй вагонаў, падаваў тую ці гэтую забытую рэч, бутэльку малака, яшчэ раз разьвітваўся.

Нас ніхто не праводзіў. Нам ніхто нічога не падаваў, хоць мы й ехалі ў вялікую дарогу, ня маючы пры сабе навет куска хлеба. Ды ці да хлеба тады было? Пачуцьцё страшэннае крыўды сьціскала горла...

А людзей усё прыбывала й прыбывала. Было сьцюдзёна. Ішоў дробны дождж... Вясна ў гэтым чорным годзе не сьпяшалася прыйсьці на зьмену нябывала войстрай і маразянай зіме!

Толькі позна ўвечары цягнік рушыў зь месца. Усе плакалі. І гэтыя, сьцісьненыя шчыльна, як быдлё ў цёмных, брудных вагонах, і гэныя, абапал рэйкаў, што ўсьцяж адганяліся прыкладамі энкавэдзістых,— нябачны ў імглістай цемры вялікі, маўклівы натоўп. Плакала й я, уткнуўшыся ў клумак з пасьцеляй, плакала так доўга й балюча, аж заснула, закалыханая мерным стукатам колаў.

Падарожжа нашае трывала блізу тры тыдні. Цяжка сяньня паверыць, што знайшліся сілы ператрываць усе злыбеды, што выпалі на нашую долю падчас гэтага жудаснага падарожжа. Ехалі мы ўвесь час пад моцнаю эскортаю брутальных энкавэдзістых, у шчыльна замкнёных вагонах, пацёмку, у холадзе й голадзе.

Есьці нам упяршыню далі толькі на трэйці дзень, калі мы мінулі межы Беларусі. Тады-ж нас на часіну выпусьцілі «пад вагон», ня выпускаючы, аднак, ні на вобмірг з-пад нагляду. У нашым вагоне было 30 чалавек, жанчын і дзяцей, у іншых шмат больш, да 40. Усе ціснуліся на бруднай падлозе, на клумках, ахінуўшыся чым мага. З аднаго боку былі зробленыя з дошчак як-бы нары, дзе таксама сядзелі й ляжалі людзі. Вокны нашага вагону былі забітыя бляхаю, але праз пару дзён хлап-

цом удалося адарваць цьвякі й прыпадняць яе. Зрабілася крыху відней, і можна было па чарзе глядзець на мінаныя шэрыя, няветлыя аколіцы савецкага раю.

Ды што значыць чалавек! Мінула колькі часу, першая роспач крыху прытупілася, й у нашым вагоне завёўся такі-сякі лад. Усе пасябраваліся, зжыліся... Перасталі плакаць, ці, лепш кажучы, плакалі кажны сабе, паціху, у куточку. Дзеці павыцягвалі нейкія цацкі, пачалі гуляць. Моладзь, а яе ў нашым вагоне было шмат, хлапцоў і дзяўчатаў ад 12-цёх да 17-цёх год, узялася навет сьпяваць, часам навет жартаваць і сьмяяцца, хоць ніхто ня ведаў, калі й дзе будзе канец нашаму жудаснаму падарожжу.

Але ў іншых вагонах было горш. Найменшыя дзеці (былі такія па 2 тыдні) паміралі. Ня было ня толькі што малака, навет вады, каб даць ім. Раз на двое сутак цягнік прыпыняўся на вялікіх вузлавых станцыях і дзяжурныя па вагоне хадзілі пад вартаю па хлеб і зупу. Гэта было ўсё, што мы даставалі, каб не памерці.

Так, пераехаўшы вялікі кусок Расеі, мы перасеклі Урал, вельмі прыгожы ў сваім суровым, каменным харасьцьве, і апынуліся ў бязьмежных стэпах заходняга Сібіру.

Пачыналася вясна... Сьнег блізу згінуў. Абапал чыгункі, як вокам скінуць, рудзелі бясконцыя прасторы ссохлае леташняе травы. Дзе-ня-дзе на даляглядзе бялеліся рэдкія бярозавыя пералескі. Было страшэнна пуста, сумна й безнадзейна.

Я ўвесь час сядзела ля акна й глядзела на кавалачак сіняга неба, што было відаць праз шчэліну... «Толькі вясною бывае неба такое сіняе, толькі вясною бываюць далі такія чыстыя...» — настырліва, у такт колаў, зьвінела увушшу. Гэты верш, што ўвайшоў пазьней у зборнік «Сягоньня», нарадзіўся якраз аднае веснавое раніцы ў цягніку, што вёз нас у далёкую ссылку праз аднастайныя сібірскія стэпы.

Пасьля 20-цёх дзён пакуты мы дасягнулі нарэшце мэты. Цягнік, які ўжо ад колькіх дзён, не даяжджаючы Новасібірску, зьвярнуў быў проста на паўдня, спыніўся на маленькай стэповай станцыі на беразе няжывога салонага возера. Нас выгрузілі й машынамі разьвезьлі па бяскрайных прасторах.

Наш вагон, усе разам, трапіў у глухую калгасную вёску Дзьмітраўку, дзесяткі кілёмэтраў (больш 70-цёх)

ад чыгункі. Тут мы доўга сядзелі на вуліцы, у пяску, няведаючы, што рабіць і куды йсьці. Нас проста скінулі з машынаў сярод сяла, і ўсё.

Калі сьцямнела, мясцовыя калгасьнікі, украінцы, пераселеныя сюды яшчэ царскім урадам, якія дагэтуль маўклівым натоўпам прыглядаліся да нас здалёк, пасьмялелі, падышлі бліжэй. Тыя, што мелі мякчэйшыя сэрцы, запрапанавалі начлег. Нам пашчасьціла. Нейкая старая забрала нас да сябе, дала есьці. Пашчасьціла й яшчэ некаторым. Але былі й такія, што начавалі на дварэ.

Назаўтрае прыехала з раёну НКВД. Сабрала нас усіх у сельсавеце. Доўга перапісвала нас, дапытвала, а нарэшце сказала, што мы ня маем права нікуды з гэтае вёскі выходзіць, што маем штодня а 7 гадзіне раніцы мэльдавацца ў сельсавеце й што... мусім сабе радзіць як патрапім. «У каго няма грошай — а яны, пэўне-ж, ёсьць у кажнага, вы-ж памешчыкі,— сказаў адзін з энкавэдзістых,— той можа йсьці пабатрачыць у калгасьнікаў. Нам да вас справы няма, і працы мы вам ніякае даць ня можам, пакуль вы «не пераваспітаецесь» і «не раскулачыцесь».

І мы пачалі шукаць заработкаў, старацца хоць якколечы наладзіць жыцьцё. Заработкі знайшліся. Справа ў тым, што ўсе калгасьнікі, ня вылучаючы старое, у якой мы начавалі першую ноч і якой было ўжо 80 год, штодня мусілі хадзіць на працу ў калгас. Працавалі яны ад цямна да цямна далёка ў стэпе. Але і ў хаце, аднак, трэба было даваць раду, праца й тут была.

Трэба было нацягаць вады для кароваў апаўдні (студні ў Дзьмітраўцы былі страшэнна глубокія, і вады ў іх было мала), пачысьціць хлявы, вымазаць хату. Хаты ў Казахстане, абсалютна бязьлесным, усюды з гліны, і, прынамсі, раз у год іх трэба нанава абмазваць, каб не разваліліся ад дажджу й сонца.

І вось калгасьнікі пачалі нас наймаць, каб выконваць за іх гэтую працу, тым больш што НКВД афіцыйна гэтага не забараніла, хоць і сказала неафіцыйна, што калі хто зь мясцовых жыхароў будзе памагаць «палякам», дык таго вышлюць «на Камчатку».

Мы, гэта значыцца я з хлапцамі, за посьцілку й два ручнікі нанялі «кватэру» ў аднаго калгасьніка — месца ў хаце, дзе можна было спаць на глінянай падлозе, і ўзяліся за заработкі, каб не загінуць. Капалі гліну,

мясілі яе ў ямах ізь сечкай, лазілі на стрэхі, мазалі іх глінай, правілі камяны́, рабілі «саман» (цэглу з гліны, мяшанай ізь сечкай), цягалі ваду із студняў. За гэта нам плацілі пшаніцай, давалі хлеб, часам навет малако.

Бульбы й ніякага варыва ў Казахстане мы ня бачылі. Кажуць, калі ўдасца, бывае, добры год, дык родзіць там і бульба, і нават кавуны, але пры нас год быў зусім засушлівы й нічога па гародах ня толькі ня вырасла, але нават і не абыйшло.

Так-сяк мы пачалі новае жыцьцё. Мясцовае жыхарства й само жыло ў вялікай нястачы. Шмат якія калгасы год у год галадалі. У нашай Дзьмітраўцы было, праўда, крыху лепш. Леташні год быў выняткова ўраджайны, і кожны меў запас пшаніцы. Але ня было ні адзежы, ні абутку, ні пасьцелі, ні пасуды. З нашае посьцілкі гаспадары пашылі сабе па кашулі, й гэта было для іх вялізарнае сьвята. Спалі яны на голым гліняным прыпечку, падаслаўшы пад галаву брудную, падраную ватоўку, скіненую толькі што з плечаў. Хадзілі блізу босыя, дарма што стэп быў поўны атрутных скарпіёнаў. Ня мелі ні ложкаў, ні нават лаваў.

У працы, у тузе прамінула сьпякотнае, распаленае казахстанскае лета. Ні разу за ўсе летнія месяцы ня было дажджу. Зямля палопалася, голы, пусты й так стэп зрудзеў і ссох да рэшты. Пагражала няўрода й голад. У калгасе быў страшэнны непарадак і хаос. Валы здыхалі, трактары псаваліся. Калі што, раней пасеянае, і абыйшло, і дасьпела,— так і марнавалася на карані, бо не пасьпявалі зжаць і звазіць.

Сена часткаю згарэла ў стэповым пажары, часткаю зазімавала пад сьнегам. Калгасная жывёла засталася бяз корму на зіму. У калгасах па той бок чыгункі, у Алтайскім краі, пачаўся голад. Ад раніцы і да вечара праз нашую вёску пацягнуліся працэсьі галодных сібіракоў-калгасьнікаў, што жабравалі пад вокнамі хлеба. Але хлеба й у нашай Дзьмітраўцы ўжо мала ў каго было. Пад вясну шмат хто захварэў на цынгу.

Што-ж казаць аб нас! Дарма што цяжкой працай мы зарабілі былі крыху хлеба. Нам давялося пазнацца гэтаю зімою і з голадам, і з холадам. Зімавалі мы ў глінянцы, якую самі сабе змайстравалі і абмазалі з развалінаў старое, закінутае хаты, што калісьці належала

да будынкаў нейкага раскулачанага і выгнанага зь вёскі кулака. Такіх развалінаў — адных сьценаў — было ў нашым сяле вельмі шмат.

У нашай глінянцы было цёмна, цесна й сьцюдзёна. Была, праўда, печка, што вельмі курэла, але паліва было мала. Дроваў у Казахстане няма. Паляць там сухім палыном, саломай і кізякамі — высушаным каровім гноем. Усю восень мы хадзілі далёка ў стэп ірваць палын, які расьце там вышэй чалавека, і хоць і пакалечылі й паранілі рукі аб калючае цыбур'ё, а крыху апалу прызапасілі. Хадзілі таксама ў стэп, дзе пасьвіліся калгасныя каровы, зьбіраць высушаныя гарачым сонцам кізякі. Аднак ні палыну, ні кізякоў на ўсю даўгую сібірскую зіму не хапіла.

А зіма гэтая была запраўды жудасная, вятраная, маразяная, завейная. Тыднямі трымалася страшэнная сьцюжа (50° Ц. і больш), дзьмуў бязупынны ледзяны вецер з Паўночнага Ледавітага акіяну, на стэпе мяло сьнегам. 8 чалавек калгасьнікаў (у тым 3 жанчыны) з нашае вёскі замерзьлі на працягу зімы, заблудзіўшы ў мяцеліцу («буран») каля собскіх хатаў. Памірала й шмат ссыльных зь іншых вёскаў, але мы ўсе цудам дачакаліся вясны, хоць шмат хто захварэў на цынгу.

Усю зіму мы праседзелі ў нашай зямлянцы пацёмку, бо ня было газы, ні сьвечак. Адзін раз, памятаю, столькі было выпала ўначы сьнегу, што нас зусім засыпала й толькі праз суткі калгасьнікі-суседзі адкапалі нас. Ды ўсё-ж мы жылі й нават ніколі асабліва не распачалі. Відаць, ні голад, ні сьцюжа, нястача ці цемра не патрапяць зламаць чалавека.

У лютым, у канцы, калі ўжо дні пабольшалі і лятуцелася аб блізкай вясьне, зімовая манатоннасьць перарвалася для мяне адным здарэньнем. Прыяжджала НКВД, перапісвала ізноў усіх, а мне загадала ўзяць хлеба на 3 дні і з паштаром ехаць у раён. Пошту ў нашае сяло вазіў з раёну, за 40 км, гарбаты паштар-калгасьнік на санках, запрэжаных ледзь жывою сівою канягаю. Ведама, мы ўсе такім загадам вельмі ўсхваляваліся, але ня было рады, трэба было зьбірацца ў дарогу.

Даставалі кавалак хлеба, пазычылі вялізарны кажух і старыя валёнкі (маразы, хоць і вясна блізка, трымаліся ўсьцяж вялікія), і назаўтрае досьвіткам я паехала з па-

штаром у раён. Ехалі мы суткі, бо конь быў слабы, давялося начаваць у нейкім чужым калгасе.

Раённае НКВД пратрымала мяне ў страху й няведзе цэлы дзень, а ўночы, ізноў санкамі, адправіла ў «абласьць», даўшы ліст да самога начальніка абласнога НКВД у г. Паўладар. Дарогаю пачалася адліга, у Паўладары вуліцы абярнуліся ў рэчкі. Прабыўшы із станцыі да гораду пехатою ў сваіх валёнках добрых колькі кілёмэтраў, я прастудзілася й захварэла.

Начальніка НКВД у горадзе ня было. Агледзеўшы мой ліст, мне сказалі прыйсьці назаўтрае. Але куды было дзецца? Я з гарачкаю пабрыла па горадзе. Хадзіла аж дацямна. Нарэшце адважылася пастукацца ў нейкую хату ў канцы аднае доўгае вуліцы і толькі таму, што далей ісьці было немагчыма — вялізарная лужына, запраўднае возера, залівала ўсю вуліцу. Старая жанчына, што жыла ў хаце, адразу прыняла мяне пераначаваць і нават напаіла гарбатаю й паслала мне добрае ложка!

Я выляжалася й адпачыла, а назаўтрае ізноў пайшла ў НКВД. Сядзела я там, галодная, увесь дзень. Начальнік прыняў мяне толькі а 10 г. увечары і, доўга не гаворачы, перадаў мне ліст і грошы на дарогу й загадаў зь першым-жа цягніком ехаць у Маскву.

Я была страшэнна і зьдзіўленая, і зацікаўленая. Баялася я ўжо менш. Бо калі-б мяне меліся арыштаваць, як я раней думала, дык пашто было гэта рабіць аж у Маскве, а ня тут, на месцы? І вось я паехала. Кажух пакінула на станцыі, але валёнкі цягнула на нагах, дарма што ад вільгаці яны размоклі і зрабіліся вялічэзнымі. Ад прастуды астаўся кашаль, які мучыў мяне праз усё падарожжа.

На шосты дзень я шчасьліва заехала ў Маскву, знайшла па адрасе на канвэрце ліста маскоўскае НКВД (на Лубянцы), ізноў выпаўняла там бясконцыя анкеты, адказвала на бясконцыя пытаньні. Энкавэдоўцы стараліся намовіць мяне, каб я падпісала развод із маім мужам, але я адмовілася. І падумаць толькі, што муж мой быў яраз у гэтым часе там, на Лубянцы, можа, празь якую сьцяну ад мяне, а я і не падазравала гэтага!

Наагул, і па сяньняшні дзень я ня ведаю, пашто мяне маскоўскае НКВД выклікала аж з Казахстану? Ці яны хацелі паглядзець на мяне, ці намовіць на развод, ці

яшчэ што. У канцы яны сказалі мне, што за мяне «ходатайствуюць» важныя асобы й што я, магчыма, буду звольненая з ссылкі, а пакуль што маю ехаць назад у Казахстан і аб усёй справе маўчаць. Я так і зрабіла.

НКВД завязло мяне на станцыю, купіла білет і пасадзіла ў цягнік. Праз тыдзень я была ўжо ў нашым раённым мястэчку. Пагода зьмянілася. Пацяплела. Пачалося веснавое разводзьдзе. Па вуліцах імкнулі ручаі, усюды была вада, а я была ў сваіх цяжкіх, намоклых валёнках! Пошта ня езьдзіла, усякае спалучэньне з нашай далёкай Дзьмітраўкай было перарванае. І я наважыла ісьці да хаты пехатою праз стэп, бо ў раёне мне ня было куды дзецца.

Цяжка было ісьці ў кажуху, што цягнуўся па зямлі, праз мокры, падобны да кашы сьнег. Навокал была шэрая, маўклівая пустка, стэп. Дарогу было ледзь знаць. Пад нагамі плюхаў мокры сьнег, над галавою было шэрае неба.

Я мінула дзьве вёскі, адну зь іх кіргіскую (казахскую). Тут нейкі незнаёмы кіргіз, што стаяў на вуліцы, запрасіў мяне да сябе словамі: «Ты ссыльной? Дык хадзі да мяне чай піць». Я была вельмі стомленая, і піць мне страшэнна хацелася. Я пайшла за кіргізам. Ен прывёў мяне ў гліняную хатку, падобную да хатаў у нашай вёсцы, толькі ніжэйшую і звонку не пабеленую й бясформую, як куча гною.

Але ў сярэдзіне было даволі чыста. Жонка кіргіза заварыла вады ў мядзяным катле, і ўся сям'я села на падлозе вакол нізенькага століка. Мне падставілі скрыню, каб выгадней сесьці. Гарбату кіргізы п'юць зь цікавых місачак, падобных да вінных чарак; завуцца яны піяламі.

Адпачыўшы ў добрага кіргіза (усе яны цярпець ня могуць бальшавікоў, адгэтуль і сымпатыі да іхных ахвяраў), я яшчэ шпарчэй, паколькі дазваляў кажух і валёнкі, пайшла мясіць мокры стэповы сьнег. Калі цямнела, я даходзіла да вялікае вёскі, найбліжэйшае да нашае, зрабіўшы за дзень 32 кілёмэтры. Тут я пераначавала ў аднэй сям'і, таксама вывезенай зь Вялейкі, а назаўтрае пабегла апошнія 8 кілёмэтраў.

Ня была я ў хаце больш двух тыдняў, дык і ня дзіва, што мяне рупіла хутчэй пабачыць хлапцоў. Валёнкі так панаціралі мне ногі, што я ўжо не дала рады цярпець, скінула іх і апошнія 5 кілёмэтраў ішла босая

па сьнягу й вадзе. Ногі зрабіліся чырвоныя, і ані ня было холадна, а што найдзіўней, дык я ня толькі не прастудзілася, але й рэшткі папярэдняе хваробы як рукой зьняло!

Праз тры тыдні, ці мо крыху больш, з раёну прыйшла папера, што мы звольненыя й можам варочацца «на прежнее место жительства». Даручылі нам гэтую паперу а гадзіне 1-й уночы, а на 6-ю гадзіну мы меліся быць гатовыя да выезду! Ясна, што ўсю ноч мы ня спалі, пакаваліся, раздавалі рэчы сябром па няшчасьцю, зьбіралі ад іх лісты да сваякоў, даручэньні.

І вось ізноў мы стаялі на машыне і ймкнулі праз стэп, але ўжо дахаты! Быў першы запраўды вясновы дзень. Стэп прачынаўся да жыцьця, пачынаў зелянець... Недзе ў тумане гулі трактары, стэповыя птушкі пішчэлі й цьвіркалі на ўсе галасы. На душы было радасна, й радаснае было ўсё навокал.

«Бацькаўшчына», Вялікдзень;
27 красавіка 1952 г.

ЛЯВОН РЫДЛЕЎСКІ

З ЖЫЦЬЦЯ Й ДЗЕЙНАСЬЦІ М. АБРАМЧЫКА

Пераказаў мне надовячы прэзыдэнт М. Абрамчык, што ў яго просяць аўтабіяграфію, і ці ня мог-бы гэта штось напісаць я, бо яму і часу не стае і ня любіць сам пісаць свае «аўтабіяграфіі».

Раблю гэта з прыемнасьцю, бо запраўды напісаць біяграфію Абрамчыка мне ня так цяжка. Зьвязаны зь ім амаль што неразлучным жыцьцём, пачынаючы з вучыцельскіх курсаў 1920 г., пяць год затым супольных студыяў у Празе, супольнае затым «падарожжа па сьвеце» ды эміграцыя — Парыж, і гэтых больш дваццаці год неразлучнага жыцьця з Абрамчыкам дае мне магчымасьць гаварыць аб ім з такім знаньнем ягонага мінулага, як свайго собскага.

Выконваючы, аднак, просьбу рэдакцыі «Бацькаўшчыны», я дазволіў сабе біяграфію Абрамчыка прадставіць ня ў сухіх датах ці фактах, як — там і там радзіўся, тым і тым быў, а выкарыстоўваючы гэтую нагоду, асьветліць і дзе-якія мамэнты, як-бы пашырыць фон біяграфіі. Гэта ня толькі дапаможа лепш зразумець і ацаніць Абрамчыка як чалавека, як грамадзкага дзеяча, але адначасна й зафіксуе некаторыя мала каму вядомыя мамэнты з нашага вызвольнага руху, маючыя вялікае значэньне для будучых беларускіх гісторыкаў, бо-ж ці мала ў нас пазагінула гістарычнага матарыялу, дзякуючы таму, што ўсё адкладалася, а vita nostra brevis est[1].

Лявон Рыдлеўскі

[1] Жыццё нашае — кароткае *(лац.)*.

* * *

Мікола Абрамчык, сын незаможных сялянаў Сымона і Тацяны Абрамчыкаў, радзіўся 6 жнівеня 1902 году ў вёсцы Сычавічы Радашкаўскае вобласьці, на Віленшчыне. Дзяды й прадзеды Міколы належалі яшчэ да служылага стану — інтэлігенцыі, затрымаўшы ў сабе моцна той «літоўскі» «сэпаратызм», за які былі потым Абрамчыкі зрэдуаваныя да пралетарска-сялянскага стану.

Прадзед Міколы, Базыль Абрамчык, быў адміністратарам у маёнтку Калюзбэргу пад Радашкавічамі (у магната Сьніткі). Сваім трынаццацём сыном ён даў досыць высокую на той час асьвету — 2 зь якіх займалі пасады лясных аб'езжчыкаў, іншыя былі вышэйшымі паштовымі ўрадаўцамі.

Паўстаньне 1863 году, у якім прыймалі той ці іншы ўдзел сыны Базыля, кончылася для Абрамчыкаў вельмі трагічна. Адзін з сыноў Базыля быў павешаны, іншыя сасланыя ў Сібір або ў «отдаленные места России». Дзед-жа Міколы Янка, які яшчэ вучыўся ў духоўнай сэмінарыі, быў зь яе выгнаны й пазбаўлены цывільных правоў.

Янка Абрамчык потым уладзіўся мельнікам у в. Сычавічы, ажаніўся зь мясцовай сялянкай Тацянай Рудзь і, атрымаўшы пасагу 8 дзесяцін зямлі, пачаў гаспадарыць. Але па няведамых прычынах чамусь у 1890 годзе Янка з усёй сваёй сям'ёй, разам і з бацькамі Міколы, апынуўся таксама ў Сібіры.

Сымон Абрамчык (бацька Міколы), аднак, за пару гадоў павяртае назад у Сычавічы з мэтай абсесьці на пасажнай зямлі сваёй маткі. Царскія ўлады перадалі гэтую справу валасному сходу, які пастанавіў аднагалосна прыняць Сымона Абрамчыка пад «парукі» ў сваё «обчэства», а сычаўцы талакой памаглі Сымону паставіць хату.

Сымон Абрамчык хутка абжыўся і заваяваў пашану ў сычаўцаў. Няўпынна затым выбіраецца на розныя пасады свайго «обчэства» (чатырох сёлаў) як старасты, магазынера, потым валаснога судзьдзі, войта, а ў 1917 годзе быў выбраны дэпутатам на Першы Ўсебеларускі Кангрэс.

Будучы малапісьменным, Сымон Абрамчык заўсёды моцна адчуваў недахоп свае асьветы, дзеля чаго ён

потым намагаўся з усяе сілы даць як найбольшую адукацыю сваім тром сыном і дачцэ.

Хатняя атмасфэра, у якой працякалі дзіцячыя гады Міколы, вельмі прыяла сфармаваньню ягонага характару, глыбокай пабожнасьці, запалу да веды, ідэалізму й грамадзкай ахвярнасьці.

Сымон Абрамчык быў вельмі пабожны чалавек, і ў хаце ягонай зьбіралася досыць арыгінальнае рэлігійнае брацтва. Сходзіліся сюды ўсе старэйшыя людзі, што ў выніку насільніцкай царскай царкоўнай палітыкі неяк стыхійна замыкаліся ў сабе і, як-бы баючыся ці лепш хістаючыся ў дэфінітыўным выбары сабе веры — каталіцтва ці праваслаўя, горача маліліся і па-праваслаўнаму і па-каталіцкаму. На гэтыя малебныя вечары прыходзіў пехатой за 9 вёрстаў досыць часта і прадзед Міколы, Базыль, нягледзячы на свой сто зь лішнім гадовы век. У Вялікі-ж пост гэныя малебныя сходкі, а разам з тым і размовы на рэлігійныя тэмы й тэмы аб старадаўнасьці адбываліся амаль штовечара.

Але апроч рэлігійных сходак, адбываліся такія-ж, хоць і менш колькасныя сходкі ў хаце Сымона сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Вучыцель сычаўскай пачатковай школы Юзя Рудзь, заядлы рэвалюцыянер, быў амаль сталым гасьцём Сымона аж да свайго арышту і ўцёкаў з турмы, дзе ён быў засуджаны на сьмерць. Вучыцель Рудзь прыводзіў часамі на начлег да Абрамчыка розных праежджых сваіх сяброў «сацыялістых», і ў кажным такім выпадку дыскутаваліся, зразумела, палітычна-сацыялістычныя праблемы. У хаце Сымона заўсёды былі гутаркі, ствараючыя ідэйны настрой, і, як ведама, у сялянскай хаце дзеці заўсёды ня выключаліся ад удзелу, дзеля чаго ўся гэтая атмасфэра не магла астацца бяз уплыву на малога Міколу.

У пачаткавую школу свае вёскі Мікола пайшоў, калі яму споўнілася 7 год.

Сярэднюю асьвету здабываў Мікола спачатку ў Радашкаўскім чатырохклясавым гарадзкім вучылішчы, а потым у Менску. Увосень 1920 году, маючы падгатоўку за 6 клясаў рэальнай гімназыі, вытрымлівае канкурсны экзамен у новаарганізаваны праф. Ігнатоўскім палітэхнічны інстытут (на механічны аддзел). Рыжскі мір, адрэзаўшы бацькоў Міколы ад Менску, змусіў яго пакінуць навуку і пераехаць у Сычавічы (Заходняя Беларусь).

Зразумела, што ў вёсцы ўседзець ён ня мог, быў гэта да таго ўжо сьведамы нацыянальна 18-цігадовы студэнт. Цяпер Мікола выяжджае ў Вільню.

Старая сталіца Беларусі зрабіла на Міколу Абрамчыка моцнае ўзварушваючае ўражаньне. Пагоня Вострай Брамы, заўсёды поўная Вострабрамская вуліца паўшых на калені ў малітве людзей, Замкавая гара, магіла Льва Сапегі і старыя вуліцы Бакшты — будзілі ў успамінах Міколы ўсё тое, чаго ён наслухаўся ў свае дзіцячыя гады ад свайго прадзеда на малебных вечарох у сваёй хаце і ад кальварыстаў, якія штогод выпраўляліся ў Вільню — да Кальварыі з хаты Сымона за 150 км. пехатой. Наагул Вільня зрабіла ўражаньне на Міколу якогась сьвятога гораду, які ён быццам так добра знаў з самага свайго дзяцінства.

Прыйшоўшы ў Базыльянскія муры — гэтую беларускую цытадэлю,— Мікола меў на мэце паінфармавацца, дзе й як яму знайсьці ў Вільні палітэхнікум. Але спаткаўшы на калідоры аднаго свайго знаёмага па Менску (Я. Станкевіча), які адразу аблаяў Міколу, што вучыцца цяпер сьведамаму беларусу ёсьць нягодна, бо не хапае людзей вучыць нясьведамых, Мікола падпарадкоўваецца грамадзкай дысцыпліне і ўступае на экстарныя настаўніцкія курсы ды перад Калядамі 1920 году выяжджае на прызначанае яму месца настаўніка беларускай пачатковай школы ў вёску Ленкаўшчына Ашмянскага павету.

Да школьнага абводу, згодна атрыманай М. Абрамчыкам інструкцыі, належалі 4 вёскі, зь якіх Ленкаўшчына знаходзілася ў цэнтры і ў якой ужо была польская пачатковая школа, якая месьцілася ў канцы вёскі, у маёнтку пана Струтыжынскага.

Мікола Абрамчык закладае школу ў самай вёсцы і пачынае працу спачатку з 12-ма вучнямі. Адначасова адчыняе вячэрнія курсы для дарослых, на якія шугнула ўся пераросłая школьны век моладзь і нават бацькі дзяцей, ходзячых у польскую школу.

Энтузыязм маладога вучыцеля, як у школе, так і на курсах для дарослых, меў тыя вынікі, што за два месяцы школа яго налічвала ўжо 60 дзяцей, а польская толькі 4 (дзеці пана Струтыжынскага і аднаго ягонага парабка), і гэта нягледзячы на тое, што сялянства гэтага школьнага абводу было ў 50 % каталіцкае, значыцца, болей апалячанае. На наступны 1921/22

школьны год польская школа ў Ленкаўшчыне мусіла зачыніцца. Пачаўся таму націск на беларускую школу з боку польскай адміністрацыі й паліцыі, але рады даць не маглі. Цяганьне ў паліцыю некаторых сялян толькі яшчэ большы выклікала адпор у змаганьні за беларускую школу. Пасьля гэтага школьны інспэктар прысылаў па чарзе аж 7 польскіх вучыцеляў ці для самастойнай паралельнай польскай школы, ці як выкладчыкаў польскае мовы ў беларускай школе, але сяляне ніводнага з гэтых вучыцялёў ня пусьцілі ў вёску.

Падчас летніх канікулаў 1921 году, будучы на вучыцельскіх дапаўняючых курсах у Вільні, Абрамчык увайшоў у кантакт зь беларускім нацыянальна-рэвалюцыйным рухам, які, як ведама, у той час, пад кіраўніцтвам ураду БНР з Коўні, падгатаўляў (у саюзе зь летувісамі) паўстаньне ў Заходняй Беларусі. М. Абрамчык атрымаў назначэньне раённага начальніка БНР Радашкаўскай, Краснасельскай і Хаценчыцкай воласьці, а на восень 1922 году за ўдала праведзеныя «манэўры» ў сваім раёне быў назначаны начальнікам Вялейскага павету. Усе раённыя начальнікі Вялейшчыны, нягледзячы на свой паважны век, як прыкладам, начальнік Куранецкага раёну, вучыцель (пазьнейшы пасол у сойм) Гаўрылік ці іншыя пажылыя ахвіцэры, прынялі ахвотна начальства 19-цігадовага Абрамчыка, што ўжо зьяўляецца не малым доказам, якую апінію Абрамчык меў ужо тады сярод беларускага грамадзянства.

Да траўня месяца 1922 г. Абрамчык адначасна добра спраўляецца з сваімі дзьвюмя функцыямі — настаўніка і павятовага начальніка. Увосень гэтага-ж году польскі школьны інспэктар Ашмяншчыны, вырашыўшы, што пакуль будзе ў Ленкаўшчыне вучыцелем Абрамчык, беларускую школу перавярнуць на польскую ня ўдасца, дае загад Абрамчыку перанесьціся на настаўніка ў цэнтральную Польшчу (пад Варшаву). Абрамчык гэтага назначэньня ня прыняў і ў знак пратэсту адмаўляецца ад настаўніцтва зусім.

Цяпер ён пераяжджае ў Радашкавічы, каб заняцца выключна нацыянальна-рэвалюцыйнай працай свайго павету. Для ўладкаваньня свайго побыту ў Радашкавічах прыпісваецца вучнем 7-е клясы Радашкаўскай беларускай гімназыі. Вучыцялі гэтай гімназыі, добра ведаючы, што Абрамчык мае падгатоўку вышэй за сярэднюю школу, на ягоныя частыя месячныя адлуч-

кі глядзелі «праз пальцы», што дало Абрамчыку магчымасць з вучнёўскай легітымацыяй гібка паварачвацца па сваім павеце і навет пабываць некалькі разоў у галоўным беларускім паўстанскім штабе, які знаходзіўся ў Летуве (у Таўрагэнах).

У лістападзе месяцы 1922 году сталася важная падзея ў рэвалюцыйна-вызвольным руху Заходняй Беларусі. Да гэтага часу ўсе палітычныя й тактычна-стратэгічныя інструкцыі Цэнтральны Камітэт Вызваленьня Заходняй Беларусі атрымліваў з Коўні, ад Ураду БНР беспасярэдна ці праз галоўны паўстанскі штаб з Таўрагэнаў. У сувязі із спрэчкай Ураду БНР з Урадам Летувы за Вільню — Урад БНР, як ведама, пакінуў Коўню, а летувісы пачалі намагацца празь некаторых беларускіх урадаўцаў у Таўрагэнах праводзіць далей прыгатаваўча-паўстанскую акцыю ў Заходняй Беларусі, прапагуючы на міжнародным форуме гэны рэвалюцыйна-вызвольны рух, як рэзыстанс летувісаў за Вільню.

Беларускі Цэнтральны Рэвалюцыйны Камітэт Заходняй Беларусі, які ўзначальвалі дагэтуль паэты Леанід Родзевіч і Лагіновіч (сябра Слуцкай Паўстанскай Рады), парваў супрацоўніцтва зь летувісамі, утрымаўшы з сабой увесь вакансьпіраваны апарат на ранейшай чыста незалежніцкай беларускай пазыцыі. Разрыў, аднак, зь летувісамі змусіў Бел. Цэнтр. Рэв. Камітэт задумацца над далейшай тактыкай, бо спакладацца цяпер на выйгрыш паўстаньня выключна собскімі сіламі супраць ужо моцна зарганізаванай польскай дзяржавы — было больш чым рызыкоўна.

У Менску ў гэны час, як ведама, на чале БССР стаяў Чарвякоў, а камісарам асьветы быў праф. У. Ігнатоўскі — абодвы блізкія партыйныя сябры Л. Родзевіча й Я. Лагіновіча (па партыі сацыялістых-рэвалюцыянэраў). Цэнтральны Камітэт Вызваленьня Заходняй Беларусі пастанавіў увайсьці зь імі ў кантакт, і навязаньне гэтага кантакту даручаецца Міколе Абрамчыку. Атрымаўшы пісьмо ад Л. Родзевіча, Абрамчык прабіраецца нелегальна ў Менск і дастаецца на прыватнае памешканьне праф. Ігнатоўскага.

Праф. Ігнатоўскі, уважна выслухаўшы Абрамчыка, паклікаў да сябе якіхсь сямёх здаровых «дзяцюкоў» (у тым ліку быў і Чарвякоў). Тут-жа ў праф. Ігнатоўскага (у былым архірэйскім доме) адбылася нарада,

на якой М. Абрамчык зрабіў падробны агляд сытуацыі ў Заходняй Беларусі. Праф. Ігнатоўскі, пакінуўшы ў сябе начаваць Абрамчыка, доўга затым увечары праводзіў зь ім размову. На заўтрашні падвечар прыйшоў адзін з тых сямёх «дзяцюкоў» у бакешцы і заявіў Абрамчыку, што пойдзе зь ім зараз да Вільні. «Дзядзька» гэты потым атрымаў у Вільні клічку «Прынесены», бо Абрамчыку давялося яго пераносіць на плячох праз рэчку на паграніччы.

Кантакт і перагаворы Камітэту Вызваленьня Заходняй Беларусі зь менскімі эсэрамі мелі тыя насьледкі, што ў Менску таксама паўстаў Камітэт Вызваленьня Ўсходняй Беларусі на чале з праф. Ігнатоўскім.

Была ўзгодненая супольная тактыка абодвых камітэтаў у тым кірунку, што паўстаньня ў Заходняй Беларусі нельга інсьпіраваць на бліжэйшы час, а што трэба заняцца больш падгатоўкай кадраў. У сувязі з тым, што польскі ўрад ужо амаль поўнасьцю зьліквідаваў беларускае школьніцтва, было пастаноўлена прыступіць да разьвярненьня сеткі тайных беларускіх пачатковых школаў. Генэральным інспэктарам тайнага школьніцтва ў Заходняй Беларусі згадзіўся быць ксёндз А-ка, Абрамчык-жа быў прызначаны яму за памочніка.

На гэтым становішчы М. Абрамчык працуе аж да восені 1924 году. Няўпынна ён разьязджае па ўсёй Заходняй Беларусі, падшуквае пэўных настаўнікаў, закладае тайныя школы й адначасна склады нелегальнае літаратуры, якая потым, па загаду зь Вільні, у адну ноч разам раскідваецца. За гэтыя два гады ён зь місыямі ад ЦК Вызваленьня Заходняй Беларусі быў нелегальна ў праф. Ігнатоўскага аж 29 разоў. За гэты час Абрамчык настолькі здабыў сабе сымпатыі ў праф. Ігнатоўскага сваім спрытам і адвагай, што ён потым дапускаўся Ігнатоўскім на найбольш кансьпірацыйныя нарады менскага беларускага антыбальшавіцкага актыву.

У чэрвені 1924 году М. Абрамчык закончыў і фармальна сярэднюю асьвету. Намагаецца, каб паступіць у Віленскі ўнівэрсытэт, але ў тых гадох зь беларускіх гімназыяў пралезьці ў польскія вышэйшыя ўстановы было не лягчэй, як вярблюду праз вуха іголкі.

У Цэнтральным Камітэце Вызваленьня Зах. Беларусі было ўжо станоўча пастаноўлена, што Абрамчыка

трэба дзесь абавязкава ўсадзіць у высокую школу. Меркаваньні да гэтага былі розныя, а ў тым ліку й тое, што чатырохгадовая няўпынная праца Абрамчыка ў кансьпірацыі вымагала на некаторы час адпачынку, як і трэба было замазаць за ёй сьляды.

Увосень 1924 году праф. Ігнатоўскі выклікаў Абрамчыка ў Менск і запрапанаваў яму да выбару дзьве школы: 1. Ленінградзкую Ваенную Акадэмію, 2. Марынагорскую сельскагаспадарскую акадэмію ў Маскве. Праф. Ігнатоўскі найбольш радзіў выбраць першую, куды ён пасылаў наймацнейшых з нацыянальнага гледзішча беларусаў, каб потым мець свае пэўныя кадры вайсковых спэцыялістых. Але Абрамчык затрымаўся на сельскагаспадарскай акадэміі.

Прыехаўшы ў Маскву, М. Абрамчык зьявіўся ў сельскагаспадарскую акадэмію. Пасьля тыдня наведзінаў і знаёмства із «студэнтамі» і «прафэсарамі» гэтае школы, Абрамчык уцякае назад да Ігнатоўскага. «Дзядзька Ігнатоўскі, выбачце, але ўцякаю назад».— «Куды?» — «Да Прагі. Акадэмія зрабіла на мяне вельмі мізэрнае ўражаньне. Студэнты там па ўзроўню нашых гімназыстых сярэдніх клясаў. Ня вучыць-жа мне там зь імі арытмэтыку. Да таго і атмасфэра... зрабіла на мяне такое гадкае ўражаньне, што я цэлы тыдзень нічога ня мог есьці. Гэта-ж басяцкі прытон. Супольнае жаноцка-мужчынскае «общежитие» й супольныя «ўборныя», што «студэнты» й «студэнткі» разгарадзілі для змаганьня з астаткамі «буржуазных прадрассудкаў», і ўсе там парадкі змусілі мяне ўцякаць»,— расказваў М. Абрамчык. Ігнатоўскі на хвіліну задумаўся, напасьледак пацалаваў Абрамчыка й ціханька шапнуў: «Маё шчырае прывітаньне Пятру (Крэчэўскаму) і Захарку. Скажы, што ў Маскве іх часта ўспамінаюць. Хай трымаюцца моцна. Веру, што ты туды прабярэшся. Памажы табе Божа!» Усхваляваны Ігнатоўскі яшчэ раз абняў свайго пратэгаванага й пусьціў сьлёзы...

Аднэй раніцы ўвосені, калі днём туман так спавівае Чэскую Прагу, што ліхтары вуліцаў гараць цэлы дзень,— Мікола блудзіў ужо між будынкаў тэй «залатой» Прагі з адрасам у руцэ студэнцкага дому Albertov «Na Slupi», які ён меў зь перапіскі ад свайго старога сябры па партызанцы паэты Ўладзімера Жылкі. Дастаўшыся напасьледак да гэтага студэнцкага дому «На

Слюпі», Мікола знайшоў там некалькі дзесяткаў сваіх старых знаёмых сяброў як па вучыцельскіх курсах, так і па кансьпірацыйнай працы. Вестка аб прыбыцьці М. Абрамчыка хутка дайшла да прэзыдэнта Крэчэўскага, які наказаў таго-ж вечара прыйсьці да яго самому аднаму.

Абрамчык упяршыню спаткаўся цяпер так блізка за адным сталом з прэзыдэнтам Крэчэўскім і Захаркам, а праведзены вечар у доўгіх размовах Абрамчык часта ўспамінае як найшчасьлівейшы мамэнт у ягоным жыцьці, які яго так зблізіў потым з гэтымі вялікімі гістарычнымі постацямі нашае апошняе нацыянальна-вызвольнае пары.

У Чэхах Абрамчык за пяць гадоў скончыў адначасова два факультэты: у Ўкраінскай Акадэміі эканамічны факультэт із званьнем дыплямаванага інжынера эканамічных навук (аддзел консульскі) і на чэскім Карлавым Унівэрсытэце аддзел гісторыі й сацыялёгіі.

Падчас сваіх студыяў Абрамчык быў увесь час у кантакце з сваім «духовым бацькам» (як ён сам зваў) праф. Ігнатоўскім праз пасярэдніцтва часта тады выяжджаючых зь Менску на экскурсыі ці навуковыя камандзіроўкі блізкіх Ігнатоўскаму людзей, як Янка Купала, праф. П. і інш.

Ужо пад канец 3-га курсу Абрамчык меў падрыхтаваную да друку працу «Эканамічная геаграфія Беларусі», якая Ігнатоўскаму вельмі спадабалася і на падставе якой Ігнатоўскі прапанаваў Абрамчыку па заканчэньні навукі лектарат эканамічнай геаграфіі Беларусі на Менскім Унівэрсытэце.

Нягледзячы, аднак, на так вялікія сымпатыі Абрамчыка да праф. Ігнатоўскага і на давер да яго з аднаго боку, а з другога — нягледзячы на тое, што ў гэты час палякі, за напісаную Абрамчыкам брашуру ў французкай мове супраць польскага тэрору ў Заходняй Беларусі, якая, дарэчы, нарабіла шмат шуму ў заходняэўрапэйскай прэсе, пазбавілі Абрамчыка польскага грамадзянства й дамагаліся ад чэскіх уладаў выдачы яго, Абрамчык усё-такі ў Савецкую Беларусь ехаць адмовіўся.

Увосені 1929 году Абрамчык з аўтарам гэтых радкоў пускаецца ў дарогу «пехатой па сьвеце» для вывучэньня, практычна перадусім, сельскагаспадарскай эканомікі Заходняй Эўропы. За год зь месяцамі часу ванд-

равалі мы пехатой і на самакатах ад Прагі аж да Ліёну, абыйшлі ўсе цікавячыя нас раёны Чэхіі, Саксоніі, Баварыі, Швайцарыі, Надрэйншчыны, затым Францыі, наймаючыся па дарозе на розныя працы звычайнымі работнікамі, каб такім чынам глыбей прыгледзецца да самога жыцьця сяла, жыцьця работнікаў, а з другога боку, гэтым самым зарабіць сабе на пражыцьцё.

Маршрут падарожжа быў прадбачаны па Францыі, Гішпаніі, затым па паўночным беразе Афрыкі й Італіі.

У Ліёне, аднак, дзьве непрадбачаныя акалічнасьці спрычыніліся да радыкальнай зьмены пляну падарожжа:

1. Вестка аб самагубстве Ігнатоўскага.

2. Сьляды прысутнасьці ў Францыі масавай беларускай працоўнай эміграцыі.

І цяпер, як калісь у Вільні, Абрамчык пастанаўляе, што ня час для навукі, калі патрэбна змагацца. Мэтай далейшага падарожжа стаецца Парыж, куды й дабіраемся доўгімі этапамі і дзе ўжо пачаткам 1931 году быў зацьверджаны французскімі ўладамі «Хаўрус Беларусаў у Францыі».

Ад гэтага часу Абрамчык неразлучна падзяляе долю беларускай працоўнай эміграцыі. Працуючы сам звычайным работнікам на розных хвабрыках, у шахтах, на земляробстве ці розных гандлёвых прадпрыемствах, зарабляючы ўсякімі спосабамі на пражыцьцё, ён няўпынна вядзе змаганьне з усімі акупантамі Беларусі. Выдае свой собскі часапіс, піша да рознай чужой прэсы аб беларускім вызвольным руху, навязвае кантакты з рознымі палітычнымі й культурнымі дзеячамі Эўропы. Заўсёды ў кантакце з прэзыдэнтам Захаркам, Абрамчык робіцца яго галоўным супрацоўнікам і прадстаўніком на Заходнюю Эўропу.

У 1939 годзе з выбухам вайны польскі ўрад, пераехаўшы ў Францыю, на падставе француска-польскага дагавору, пачынае мабілізацыю палякаў, а ў тым ліку й беларусаў з Заходняй Беларусі. Змаганьне «Хаўрусу Беларусаў у Францыі» з польскім урадам здавалася для многіх справай безнадзейнай, але не для Абрамчыка. З прыроджанай яму адвагай Абрамчык, нягледзячы на суровыя французскія законы адносна прапаганды супраць саюзных арміяў, сьмела выступае з заклікам да беларусаў байкатаваць польскую армію й

закідае французскі ўрад мэмарыяламі аб дазволе ўступу беларусам у армію французскую (чужынецкага легіёну на час вайны), дзе дамагаецца сфармаваньня беларускіх нацыянальных аддзелаў. У выніку гэтай сьмелай і рашучай пазыцыі Абрамчыку напасьледак удаецца дабіцца ад французскіх уладаў пастановы аб дабравольным для беларусаў выбары — да польскай ці да французскай арміі.

Быў гэта ўзапраўды вялікі дыпляматычны сукцэс Абрамчыка, бо на падставе канвэнцыі польскага й французскага ўрадаў — «у выпадку вайны ўсе польскія грамадзяне мусілі быць дастаўленыя французамі ў польскую армію».

Дадзеная магчымасьць дабравольнага выбару арміі для беларусаў падняла была настрой старое нашае эміграцыі ў Францыі, і ўжо звыш 1200 беларускіх ахвотнікаў былі заявіліся ў французскі чужынецкі легіён (якога ня трэба зьмешваць з проста чужынецкім легіёнам). Рэалізацыі далейшай мэты ў Францыі, на вялікі жаль, перашкодзіў прыход немцаў.

Гэстапо вышуквала ў Парыжы сваіх праціўнікаў. Пачаліся арышты. Абрамчык як дасьведчаны кансьпіратар пастанавіў прабірацца ў Беларусь. Адзін стары знаёмы ў Бэрліне сп. Ш. дапамог яму перабрацца ў Бэрлін і абнадзейваў такім-жа парадкам дапамагчы прабрацца ў Беларусь. Але беларускі гэстапавец Ф. Акінчыц прычыніўся да здэмаскаваньня Абрамчыка і дзеля гэтага давялося апошняму быць заблякаваным у Бэрліне.

Але і ў гэткай нат сытуацыі Абрамчык не разгубліваецца. Найперш ён, па даручэньню ведамага беларускага патрыёта М. Шкялёнка, які яшчэ меў давер у немцаў, бярэцца арганізаваць беларускі дапамаговы камітэт у Нямеччыне, і разам з гэтым зь нябожчыкам ксяндзом Гадлеўскім пастанаўляюць разьвіць кансьпірацыйную сетку беларускага рэзыстансу, пасьля наладжаньня якой Абрамчык з кс. Гадлеўскім меркавалі перабрацца ў Ангельшчыну. Кс. Гадлеўскі, на жаль, быў раскансьпіраваны другім беларускім гэстапаўцам др. Ермачэнкам, за што і паплаціўся сваім жыцьцём. Абрамчык-жа трымаўся ў Бэрліне каля двух гадоў. Рэзыстанская праца, праводжаная Абрамчыкам сярод беларускай эміграцыі ў Нямеччыне, ахапіла ня толькі беларусаў у Нямеччыне. Беларускі Камітэт Самапо-

мачы ў руках Абрамчыка стаўся адным з вогнішчаў і прытулкам, маральнай падтрымкай усіх беларусаў. Ня было таго тыдня, калі ня дня, каб хтось зь беларускай адміністрацыі або навукоўцаў ці вайскавікоў, якіх немцы часта на ўзор бальшавіцкіх экскурсыяў прывозілі ў Нямеччыну, будучы ў Бэрліне, не завітаў патайком у «камітэт» Абрамчыка. З Бэрліну Абрамчык меў цяпер змогу, час ад часу, прабірацца да прэзыдэнта Захаркі ў Прагу.

У ліпені 1943 году дэлегат ад БНП (Беларускай Незалежніцкай Партыі), прыехаўшы ў Бэрлін з «экскурсыяй» журналістых, прывёз прапазыцыю сваёй партыі, асабліва просьбу ад сп. Родзь., пераехаць на Беларусь і абняць палітычнае кіраўніцтва й выдавецтва нелегальнай прэсы БНП. Абрамчык пачынае рабіць прыгатаваўчыя крокі для пераезду разам з жонкай у лясы Беларусі. Але арышт гэстапам і вываз у Парыж перашкодзілі ажыцьцяўленьню гэтых плянаў.

У Парыжы над Абрамчыкам быў устаноўлены сьціслы надзор. Гэстапо загадала Абрамчыку нікога ня прыймаць зь беларусаў ці спатыкацца зь беларусамі, а таксама весьці ліставаньне. Але й тут Абрамчык ня траціць часу. Нягледзячы на ўсё, ён уваходзіць у кантакт зь некаторымі асобамі французскага рэзыстансу і, у надчэківаньні прыходу саюзьнікаў, падгатаўляе рад мэмарыялаў, у якіх выясьнялася трагічная сытуацыя беларускага народу.

А потым зь першага дня вызваленьня Францыі ён аддае ўсе свае сілы ў справе абароны правоў перамешчаных асобаў у Нямеччыне.

Ведаючы так зблізка Абрамчыка, яго, мне здаецца, ніяк нельга йначай ахарактарызаваць як рэвалюцыянэра беларускага вызвольнага руху, зь няўтомнай энэргіяй чалавека, які ўсё сваё жыцьцё пасьвяціў змаганьню за волю беларускага народу. Не дарма прэзыдэнт Захарка, ведаючы так зблізка Абрамчыка, перад сваёй сьмерцю нікому іншаму не хацеў перадаць сваіх паўнамоцтваў, як М. Абрамчыку.

Аб цяперашняй дзейнасьці Абрамчыка як прэзыдэнта БНР, думаю, лішне пісаць. Яна вельмі добра ведамая беларускай эміграцыі, бо, здаецца, ня знойдзецца ніводнага беларускага асяродзьдзя ў Эўропе й Амэрыцы, дзе-б не пабываў гэты няўтомны і нязломны змагар.

Варта хіба толькі прыгадаць усю тую бессаромлівую пашквільную «прэсу» нашых зарубежнікаў, якія намагаліся прадставіць усю рэвалюцыйную нацыянальна-вызвольную працу Абрамчыка ў 1920—1924 гадох як быццам нейкую прыналежнасьць Абрамчыка да камсамолу. Аб недарэчнасьці гэтай пашквільнай пісаніны варта хіба прыпомніць, што (да 1925 году) у Заходняй Беларусі наагул не існавала ніякага беларускага камсамолу. А што Абрамчык нелегальна бываў у Менску, сьведчыць толькі аб адным: што моладзь тады нашая ня лічыла Рыскай граніцы за граніцу для сваёй нацыянальнай дзейнасьці.

«Бацькаўшчына», 7—14 верасьня 1952 г.

МІКОЛА РАВЕНСКІ

Кампазытар Мікола Равенскі пакінуў Бацькаўшчыну зусім сьпелым майстрам, шырака ведамым у галіне пэдагагічнае дзейнасьці й музычнае творчасці. Радзіўся ён на Ігуменшчыне ў 1886 г. У 1914 г. канчае трыгоднія рэгенцкія курсы ў Маскве. На пачатку 1919 г. пераяжджае на працу ў Менск, дзе ўжо ў наступным годзе пераймае абавязкі дырыгента хору пры Беларускім работніцкім клюбе. У 1922 г. ён запрошаны хормайстрам у Менскі гарадзкі тэатр.

У 1921 г. Равенскі бярэ ўдзел у вялікай экспэдыцыі, арганізаванай Інбелкультам дзеля зьбіраньня народных песьняў у Случчыне. У наступным годзе выходзіць з друку першы зборнік песьняў як народнай, так і собскай творчасьці. У гэтым-жа годзе пішацца музыка да «Залётаў» Дуніна-Марцінкевіча (апэрэта). У гадох 1923—1930 Мікола Равенскі канчае спачатку музычны тэхнікум ім. Стасава ў Маскве, а пазьней кансэрваторыю й зараз-жа ізноў вяртаецца ў Менск.

Яшчэ ў часе студыяў кампазытар піша вялікі сымфанічны твор на словы Янкі Купалы, а ў 1928 г. супольна з паэтам Ул. Дубоўкам працуе над опэрай «Браніслава». У тым-жа часе напісаныя 22 фугі для фартап'яна й шмат харавых твораў. Значная частка іх была выдадзеная Беларускім Дзяржаўным выдавецтвам у Менску, а між імі й «Ліпнёвы гімн» на словы Дубоўкі. Супрацоўнічае кампазытар і ў часапісе «Узвышша» як музычны крытык.

З 1930 г. кампазытар працуе ў Менскім музычным тэхнікуме як выкладчык музычна-тэарэтычных дысцыплінаў, а пазьней у новаадкрытай Беларускай кансэрваторыі. Зь вялікіх фарматаў у 1934—1935 гадох

напісаны смычковы струнны квартэт і сюіта, пабудаваныя на беларускіх народных тэмах.

На эміграцыі кампазытар аднаўляе пагінулыя ў часе ваеннага пажару ў Менску творы: вялікі харавы твор на словы Дубоўкі «Шыпшына», арыю Браніславы з опэры «Браніслава» і арыю на словы Дубоўкі «Ноч над Менскам». У 1947 г. ён піша фантазію для скрыпкі й фартап'яна на беларускія народныя тэмы. У 1948 г. музычна аформленыя п'есы: «Пінская шляхта», «Нечаканыя заручыны», «Вясёлы майстра» і шэраг іншых. Адначасна пішацца цэлы рад народных песьняў для хору, а таксама музыка на словы Натальлі Арсеньневай «Магутны Божа». Рыхтуецца для друку зборнік беларускіх народных песьняў, у які ўваходзіць 80 нумароў.

З асаблівым уздымам кампазытар разгарнуў творчую й практычную дзейнасьць, кіруючы студэнцкім харавым ансамблем у Лювэне. Вынікі ягонае працы апошніх гадоў вартыя ўвагі ня толькі як каштоўны ўклад у нашую музычную культуру, але й з боку знаёмленьня з гэтай культурай чужынцаў, паміж якімі дзейнасьць Равенскага ўжо даўно знайшла высокую ацэну.

Паважная музычна-тэарэтычная падрыхтоўка дазваляе кампазытару свабодна карыстацца разнастайнымі сродкамі тэмбравага, гарманічнага й контрапунктнага багацьця. Шматгадовая дырыгенцкая практыка працы з царкоўнымі, сьвецкімі й тэатральнымі харавымі калектывамі дала яму магчымасьць усебакова апанаваць сваеасаблівасьць вакальна-харавога пісьма.

Сяньня ў «творчым партфэлі» кампазытара — вынікі ягонае цярплівае працы за апошнія гады — царкоўная музыка, кампазыцыі для сьвецкага хору, сольныя сьпевы, «Вялікая сюіта на беларускія тэмы» для фартап'яна, «Фантазія для скрыпкі з фартап'янам», п'еса «На выгнаньні» для акардэону. Праз усе гэтыя творы, пры ўсёй іхнай эмацыянальнай разнастайнасьці й шырокім жанравым дыяпазоне, чырвонай ніткаю праходзіць прынцып беларускасьці ў музыцы. Кампазытар і сяньня няўтомна зьбірае ўзоры беларускага музычнага фальклёру, упарта вывучае яго, імкнецца знайсьці ягоныя сваеасаблівасьці (вынікам музычнадасьледчае працы Равенскага кніга «Характэрныя рысы беларускае народнае песьні») і выкарыстаць гэты музычны фальклёр як аснаўны матар'ял для собскае творчасьці.

У галіне царкоўнае музыкі Равенскім напісаныя для праваслаўнай Божае службы Літургія й Екціньня, якія складаюцца з шэрагу харавых нумароў на царкоўныя тэксты. Гэта — запраўды духоўная музыка харальнага складу, строгая й стрыманая па стылі, наскрозь прасяклая глыбокім рэлігійным пачуццём. З боку тэхнічнага яна вельмі выгадная для харавога гучаньня, ня мае шырокіх інтэрвалаў і скокаў, добра выкарыстоўвае вакальныя рэсурсы паасобных партыяў. Асабліва трэба адцеміць «Ойча наш» і «Верую» (солё на фоне хору), якія пакідаюць глыбокае ўражаньне на слухачоў. Вельмі ўдала выкарыстоўвае кампазытар у гэтых духоўных творах і беларускую народна-песенную тэматыку — «Ой, ня кукуй», «Ці сьвет, ці сьвітае» й г. д.

Для мяшанага сьвецкага хору кампазытарам напісаныя 14 песьняў. Гэта ў бальшыні мастацкія апрацоўкі народных мэлёдыяў — «Ой, на моры зялёным», «Вечарком за рэчкаю», «Пасею гурочкі», «Ой, ды ў нашым сяле», «Паласа», «Хмель лугамі», «Халімон», «Бабка», «Ой, вяду бяду», «Чаму-ж мне ня пець». Цалкам собскія кампазыцыі гэта — «Зіма» (на тэкст Я. Коласа), «Пагоня» й «Слуцкія ткачыхі» (на тэксты Багдановіча) й «Шыпшына» (на словы Дубоўкі). Усім гэтым творам, якія адлюстроўваюць шырокую гаму духовых настрояў, ад бястурботнага жарту («Халімон», «Бабка», «Ой, ды ў нашым сяле») да глыбокага суму («Ой, вяду бяду», «Слуцкія ткачыхі») й горкага сарказму («Чаму-ж мне ня пець»),— уласьцівыя індывідуальныя творчыя рысы кампазытара — ягоная любасьць да народных мэлёдыяў, імкненьне захаваць усю таямніцу прыгажосьці й багацьця выразу гэтага мэлясу, не пераабцяжыць яго гарманічнымі або тэмбравымі колерамі. Таму, свабодна карыстаючыся прыймамі тэматычнае распрацоўкі й паліфоніі, Равенскі заўсёды высоўвае на першы плян свае творчае ўвагі мэлёдыю ды тэкст і адпаведна да іхнага характару будуе ўвесь твор.

Даволі добра з боку фактуры распрацаванае й фартап'яннае суправаджэньне гэтых харавых твораў. На асаблівую ўвагу заслугоўваюць «Слуцкія ткачыхі» й «Чаму-ж мне ня пець» — шырокія музычныя палотны, прыймы разьвіцьця тэматычнага матар'ялу, якія дазваляюць гаварыць аб імкненьні аўтара сымфанізаваць харавую фактуру, надаць ёй тую лёгіку, эмацыянальную выразнасьць і дынаміку, якія ўласцівыя вышэйша-

му дасягненьню музычнай архітэктонікі — сымфоніі.

Для солё (баса) із суправаджэньнем фартап'яна цікава і ўдала распрацаваная кампазытарам народная песьня «Чалавек жонку б'ець».

Інструмантальныя творы кампазытара буйнейшае формы гэта — «Вялікая сюіта для фартап'яна» й «Фантазія» для скрыпкі й фартап'яна, абедзьве на беларускія тэмы. «Сюіта» складаецца з 6-ці часткаў, якія не замкнёныя ў сабе, але танальна й кадэнсава-лягічна пераходзяць адна ў адну. Рапсадычнасьць формы цэмантуецца тэмай першае часткі, яна складае як-бы ляйтматыў, задзіночваючы асобныя часткі ў адзінае цэлае. Матар'ялам для гэтае тэмы, якую кампазытар выкарыстоўвае ў 1—3—5 частках,— сталася павольная мэлёдыя народнае песьні «А ў бары». Першае Андантэ пераходзіць у скэрцавую па характары другую частку — Алегро, дзе кампазытар распрацоўвае мэлёдыю жартаўлівае песьні «Цераз сад-вінаград». Трэцяя частка вяртае слухача да першае тэмы й прыводзіць у наступны разьдзел, пабудаваны на новай тэме, якая інтанацыйна абагульвае народны характар. Пасьля новага павароту да першае тэмы кантрастна гучыць жвавая тэма фіналу. У цэлым «Сюіта» даволі разнастайная зьменаю тэмпаў, рытмаў і танальнасьцяў асобных эпізодаў. Значнае месца ў прыймах распрацоўкі тэматычнага матар'ялу займае паліфонія, якую кампазытар умела й удала выкарыстоўвае, супастаўляючы эпізоды празрыста-мэлёдыйнага характару з вялікай паліфанічнай тканінаю. Вартая ўвагі й добрая распрацоўка фартап'яннае фактуры, якая часам вымагае ад выканаўцы значнай піяністычнай падрыхтоўкі.

Таксама ў рапсадычнай форме напісаная «Фантазія» для скрыпкі з фартап'янам. І яна мае тэму, што цэмантуе ўвесь твор,— народную мэлёдыю жніўнае песьні «Ой, пайду я дарогаю». Складаецца «Фантазія» зь 5-цёх частак і, апрача ляйтматыўнае мэлёдыі, выкарыстоўвае як тэматычны матар'ял яшчэ мэлёдыі песьняў «Песьня сірацінкі» ў другой частцы й «Ой, пушчу я пажар» у чацьвертай і пятай частках. Партыя скрыпкі пераважае тут над фартап'яннай, як і трэба ў п'есе для скрыпкі, але й фартап'яна грае ў «Фантазіі» вельмі паважную ролю, далёка выходзячы за межы адно суправаджэньня. У апошняй частцы, напрыклад, кампазытар даручае якраз фартап'яну правядзеньне асноў-

нага тэматычнага матар'ялу. Умела пабудаваная «Фантазія» і з боку дынамікі, з паступовым ейным нарастаньнем, ад павольнага Moderato напачатку, праз усхваляванае Animato й сузіральнае Cantabile да жвавага Allegro фіналу.

Абодвы гэтыя творы — «Сюіта» й «Фантазія» — з поўным правам могуць заняць пачэснае месца ў беларускім канцэртным рэпэртуары.

Апошнім часам усьцяж значнейшае месца ў бытавой і канцэртнай музыцы займае акардэон. Улічваючы гэтае, а таксама нястачу беларускага рэпэртуару для акардэону, Равенскі піша п'есу «На выгнаньні» на тэмы песьняў «Ой, пушчу я пажар» і «У месяцы верасьні». Распрацоўка мэлёдыяў мае клясычны характар, набліжаючыся стылем да Гайдна ды Моцарта. З тэхнічнага боку п'еса патрабуе ад выканаўцы вялікае падрыхтоўчае працы (асабліва над басовай партыяй), але папрацаваць над гэтым поўным настрою музычным малюнкам роднага краю запраўды варта.

Гэткія вынікі творчае працы кампазытара Равенскага ў апошнія гады. Як відаць, зроблена — ці мала. Калі-ж дадаць да гэтага вялікую практычную дзейнасьць кампазытара як энэргічнага кіраўніка студэнцкага ансамблю, што сваймі канцэртамі ў эўрапейскіх сталіцах шырака прапагандуе беларускую музыку й песьню й заслужыў ужо аўтарытэт ды прызнаньне эўрапейскае аўдыторыі — дык трэба з яшчэ большым прызнаньнем аднясьціся да кампазытара, які аддае ўсяго сябе служэньню роднаму музычнаму мастацтву.

«Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва»
№ 2, 1952

АЛЕСЬ КАРПОВІЧ

ПАМЯЦІ МІКОЛЫ РАВЕНСКАГА

Памёр 9 сакавіка 1953 году
й пахаваны ў Лювэне 12 сакавіка 1953 году.

Памёр Мікола Равенскі... Для мяне гэта страта ня толькі выдатнага кампазытара, тэарэтыка і хормайстра, але і дарагога й блізкага мне чалавека, зь якім мяне зьвязвала шматгадовае цеснае сяброўства. Яшчэ ў Менскай кансэрваторыі працавалі мы разам зь ім, дзе ён выкладаў музычна-тэарэтычныя дысцыпліны.

Заўсёды шчыры, лагодны й сардэчны, гатовы кажнаму дапамагчы, ён вельмі спадабаўся мне і глыбокую пашану выклікаў сваёй самаахвярнай адданасьцю роднаму музычнаму мастацтву, беларускай народнай песьні. Ён браў удзел у этнаграфічных экспэдыцыях, няўтомна зьбіраў усюды ўзоры фальклёру, вывучаў, па-мастацку апрацоўваў і выкарыстоўваў іх у сваёй уласнай творчасьці. Праца над народнай песьняю вызначыла ягоны творчы шлях, дапамагла яму ўнікнуць бязмэтных блуджэньняў у мадэрных мастацкіх плынях, зрабіла зь яго запраўднага беларускага кампазытара, ня толькі па імені, але і па ўсяму зьместу ягонай музыкі.

Кампазытар цьвёрда трымаўся сваіх творчых пераканьняў, нягледзячы на тое, што яны далёка адыходзілі ад «генэральнай лініі», якую праводзіў Саюз савецкіх кампазытараў Беларусі. Мала спрыяла творчай папулярнасьці Равенскага і супрацоўніцтва яго з паэтам-узвышэнцам Ул. Дубоўкам (шэраг хораў, раманcаў, опэра «Браніслава»), які быў у 1930 г. арыштаваны НКВД і высланы.

«Нядрэмнае вока» пільна сачыла і за кампазытарам, ён мусіў сыстэматычна мэльдавацца ў адпаведнай

установе, і вельмі магчыма, што лёс шмат каго з прадстаўнікоў нашай інтэлігенцыі стаўся-б і ягоным лёсам, каб ня выбухнула вайна.

У часе нямецкай акупацыі Беларусі Равенскі не пакідае творчай і практычнай працы. Ён арганізуе харавыя калектывы, ансамблі, падрыхтоўвае да выданьня зборнік народных песьняў. Пасьля капітуляцыі мы з Равенскім апынуліся ў розных зонах Нямеччыны. Празь лістоўную сувязь ён трымаў мяне ў курсе сваіх творчых справаў. Ён аднаўляў кампазыцыі, якія загінулі ў Менску, пісаў музыку да тэатральных п'есаў, харавыя й ансамблевыя апрацоўкі.

Між іншым, у гэты час напісаная ім поўная глыбокага пачуцьця музыка на словы Н. Арсеньневай «Магутны Божа».

Спаткаўся я з Равенскім ужо ў Любэне, на пачатку 1952 году. Шмат чуў я перад тым аб плённай ягонай працы із студэнцкім харавым ансамблем, добра ведаў Равенскага як выдатнага знатака хору і запраўднага майстру-дырыгента, але тое, што я сустрэў і пачуў, перавысіла ўсе мае чаканьні. Каб зрабіць высока мастацкі ансамбль із цалкам прыпадковага вакальнага матарыялу, трэба было мець, апрача дасканалага пачуцьця харавога стылю, яшчэ й надзвычайную ўпартасьць і цярплівасьць у працы. І якую бязьмерна вялікую працу ўклаў Равенскі ў свой ансамбль, пакуль стварыў зь яго культурны мастацкі калектыў. Папулярнасьць яго цяпер выйшла далёка за межы Бэльгіі, дзякуючы насьпяваным пліткам, якія гучаць ужо ўсюды, дзе толькі ёсьць жменька беларусаў. Сьвецкія і царкоўныя хоры, напісаныя ім у гэты час, салёвыя п'есы і рамансы — усё гэта творы цалкам сьпелага майстры. Колькі бяссонных ночаў праседзеў кампазытар над нотнай паперай у сваім пакойчыку ў Студэнцкім Доме, бясконца перапісваючы, дарабляючы, зьмяняючы — «каб лепш гучэла!». Ужо цяжка хворы, ён трымаўся бадзёра і быў поўны творчых і жыцьцёвых плянаў на будучыню.

Колькі незабыўных гадзінаў правялі мы зь ім за фартэп'янам, абгаварваючы тую ці іншую кампазыцыю або гутарачы на ягоную ўлюбёную тэму — пра нявычэрпнае багацьце і прыгожасьць беларускай песьні. Колькі цікавага, каштоўнага і новага пачуў я ад яго ў гэтыя гадзіны нашых гутарак! Зь якімі таям-

ніцамі харавога майстроўства можна было пазнаёміцца падчас гэтых бяседаў!..

Апошняя наша сустрэча адбылася ў канцы мінулага году.

Мяне балюча ўразіла, як ён зьмяніўся вонкава за гэтых некалькі месяцаў. Хвароба бязьлітасна рабіла далей сваю справу. Але ён быў усё той-жа лагодны, мілы, гасьцінны, шчыры... І той-жа самаахвярны ў працы, як і раней, нягледзячы на цяжкую хваробу.

«Бацькаўшчына», 15 сакавіка 1953 г.

ПЕТРА СЫЧ

ЗАМОЎКЛА ЛІРА

Як буйныя сьлёзы, капаюць чырвоныя й белыя туліпаны ў адкрытую магілу... Бясслоўна праходзяць над магілкай людзі, і з рук іх на труну капаюць туліпаны, а з вачэй — пэрлы-сьлёзы. Пасьля страсаючы сэрца грукат зямлі, сыпанай на века дамавіны, і сумныя тоны надгробнай песьні. Маленькі копчык зямлі, а на ім аграмадны бела-чырвоны курган вянкоў і кветак ад сваіх і чужынцаў... Пасьля аб алявянае скляпеньне чужога неба адбіваюцца стройныя тоны беларускай песьні «Сьпі пад курганам гэрояў!..».

Ці гэта ўсё, што асталося на зямлі пасьля Міколы Равенскага?..

Моўчкі расходзяцца людзі і расьцярушваюцца ў шэрых калідорах вуліц, але кожны ў сэрцы носіць сьветлую памяць аб адыйшоўшым. Кожны з нас думае, верыць і кажа, што ён не памёр, што толькі адыйшоў адпачыць пасьля доўгай, упорыстай і сумленна выкананай працы, але будзе жыць так доўга, як доўга будуць на сьвеце беларусы, а зь імі родная песьня.

...Агонь разгрызе малюнкі падзеяў, Скарбы разграбяць з аружжам зладзеі, А песьня ня зьгіне...

Кажны, хто калі-колечы сустрэўся з прафэсарам Равенскім, ня мог не палюбіць, не захапіцца ім як чалавекам — добрым, ціхім, вялікім у сваёй скромнасьці.

Кажны, хто мае ў душы пачуцьцё прыгаства, адчуў і перажыў чар ягонай натхнёнай паэзіі, заклятай ім у стройныя акорды. У кажнай душы яна знаходзіла і знойдзе моцны рэзананс.

Пераглядаю паперы на ягоным стале. На лістку календара, побач запісаных тэмаў да песьняў, бачу

зробленая ягонай рукой, вечна нясьведама, у творчым задумленьні — рысункавая кампазыцыя; па-мастацку нарысаваная альфа і амэга, а пасярод слова — «Беларусь». Так! Яна была ягонай альфай і амэгай, пачаткам і канцом. Ейнай культуры ён аддаў сваё працавітае жыццё.

Каханыя ім і ў ім раскаханыя студэнты — кажны сказаў, што хацеў-бы так пражыць жыццё і так, з гэтакім пачуццём добра споўненага абавязку, памерці.

Але гэты ціхі, скромны, добраахвотны і чулы мастак змог быць зялезна цьвёрдым, непахісным перад моцнымі гэтага сьвету і перасьледваньнем лёсу. Не апаганіў сваёй ліры гымнам у чэсьць крывавага сатрапа, а будучы змушаным да гэтага — перастаў тварыць. Жыў і тварыў для Беларусі, беларускага народу, прыгаства — таму і песьня яго асталася арліна-свабодная, крыштальна чыстая, вечна маладая.

Калі гром вайны зьнішчыў ягоны дом, а ў ім найлепшыя творы — плён доўгагадовай працы,— Равенскі не заламаўся, але зь цярплівасьцю рупнай мурашкі пачаў будаваць нанава.

За ўсе свае бясцэнныя вартасьці цешыўся заслужанай любоўю і пашанай ня толькі сярод сваіх, але і выдатных чужынцаў, аб чым сьведчаць іх прысутнасьць на паховінах, вянкі і словы спачуваньня Беларусам у гарадох Бэльгіі. Добрым лёсам пасланы, хоць неакрэдытаваны амбасадар Беларусі на чужыне, выдатна прыслужыўся беларускай справе.

Над магілай паэта разьвіваецца ягоная песьня «Сьпі пад курганам гэрояў...». Нат цераз жалобныя тоны прабіваюцца акорды трыумфу, вера ў будучыя перамогі — рапсодыя несьмяротнасьці.

Сьпі пад курганам, Гэрой, ціхай, але вялікай і плённай працы, Беларускі Баян, Божы жаваранак! А мы песьні Твае панясём пад родныя стрэхі, каб жылі там вечна і ажыўлялі...

Бо «песьня не загіне»...

12.3.1953

«Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1953 г.

ЯЗЭП МЕНСКІ[1]

ЯЗЭП ЛЁСІК

Заўсёды мы да яго зварачаліся — «дзядзька Лёсік!», у савецкія часы, нават напярэдадні памятных трыццатых гадоў. Ня важыліся казаць — «таварыш Лёсік». Да яго гэта так не пасавала, было страшэнна чужым, нават зьняважлівым. А не паважаць Лёсіка нельга было.

Кажуць, Лёсік хадзіў у кажушку. Мабыць, гэта памылка памяці. Лёсік заўсёды быў адменным ад іншых, нават што да вопраткі. Ці ня самая характэрная рыса якраз і была ў тым, што ён ніколі не выглядаў «модным правінцыялам», што ў яго ніколі ня было нічога дэкаратыўнага, гэтай падробкі пад жыцьцё. У яго ня было вонкавага, «кажушковага» паказу беларускасьці. Яна станавіла ягоны духовы сьвет, ягоны інтэлект, была ў ягонай шматгадовай працы чалавека, які прайшоў мо найцяжэйшую школу змагара за нацыянальную справу.

Калі й гаварыць пра нейкую дэманстрацыйнасьць у дачыненьні да Лёсіка, дык у яго гэта выяўлялася хіба ў ягонай эўрапэйскасьці што да вонкавага выгляду. Якраз гэта й кідалася ў вочы ў тую пару «рэвалюцыйнай ломкі старога быту» і абыякавасьці да вонкавых «драбніцаў».

У менскім кінатэатры «Чырвоная Зорка» паказвалі (тады яшчэ дазвалялася) цудоўны нямецкі фільм «Нібэлюнгі». Па лекцыях мы сьпяшаліся засьпець першы сэанс. За кварталы два перад намі гойдалася чалавечая постаць, прастуючы ўніз па Савецкай вуліцы.

[1] Псэўданім Ізыдара Плашчынскага, малодшага брата Язэпа Пушчы.

«А ці адгадаеце, хлопцы, хто гэта гушкаецца сьпераду?» — жартам запытаўся адзін з нас. Студэнты адразу заўважылі. Зірнуўшы яшчэ раз, раптам адказалі: «Хто-ж іншы — Лёсік».

У густым вулічным натоўпе Лёсіка заўсёды можна было пазнаць. У часе хады ягоная высокая постаць здавалася яшчэ большай. Ён ступаў, нібы прападымаючыся на пальцы, і ад гэтага ствараласа ўражаньне сваеасаблівага гойданьня. Крок ягоны быў шырокі, і ў хадзе ўся постаць неяк нахілялася наперад. Але ён ніколі не пазіраў пад ногі, а неяк паўз натоўп, паўз чалавечыя галовы.

Пры першым знаёмстве Лёсік адразу рабіў уражаньне чалавека моцнай волі і глыбокіх перакананьняў, міжвольна прымушаў паважаць сябе. Выхаванцы бальшавіцкай прававерпасьці — студэнты-камсамольцы трымаліся здалёк ад Лёсіка. Яны яго ня любілі, бачылі ў ім свайго ідэйнага ворага, але напачатку не адважваліся на панібрацкае павучаньне.

Затое Лёсік быў вельмі гаваркім, па-сяброўску шчырым чалавекам зь іншымі студэнтамі, а іх была тады бальшыня. Шчырасьць, любасьць да блізкага чалавека мо найлепш выражала ягоная скупая ўсьмешка. У такія часіны гэтак сардэчна, цёпла пазіралі ягоныя вочы й таксама ўсьміхаліся.

Лёсік ніколі не спэкуляваў на палітыцы і таму сваіх думак не хаваў, а калі трэ было, дык проста абцінаў няпрошанага апанэнта. Прыгадваецца адзін выпадак з унівэрсытэту. Адчыніўшы дзьверы ў аўдыторыю, Лёсік пастараніўся і даў прайсьці двум студэнтам. Ён ня любіў, каб бразгалі дзьвярмі, калі пачне чытаць лекцыю. Гэным разам была лекцыя пра асаблівасьці беларускай мовы. Адна камсамолка ў форме пытаньня вельмі асьцярожна заўважыла лектару, што ён нібы замала аддаў увагі правядзеньню падабенства паміж беларускай і расейскай мовамі. Лёсік зірнуў на сваю апанэнтку, зьняў акуляры, працёр іх насаткай ды, акцэнтуючы, павольна, з агенчыкам у вачох сказаў: «Не падабенствы розныя, а якасьці, рысы апрычоныя твораць мову. Мы й вывучаем не падабенствы, а самперш беларускую мову. Жывём-жа мы на Беларусі, а не на нейкім Марсе». Сканфужаная камсамолка дыскутаваць не адважылася, бо лектар адказаў з гэнай уласьцівай адно яму сілай і іроніяй.

Мінула 18 гадоў, як апошні раз давялося бачыць Лёсіка ў Менску. Ён выходзіў з пошты. Гэта было на выгнаньні, калі ён завітаў хоць зірнуць на сваю родную Беларусь, якой ён аддаў сваё гарачае сэрца.

А першы раз я Лёсіка ўбачыў на трыбуне. Ён стаяў у вечаровым сьвятле і прамаўляў да сваіх вучняў-настаўнікаў. Ды як прамаўляў! Мінуў 31 год, а калі замкнеш вочы, дык расступаецца доўгая чарада гадоў з добрым і благім часам ды як жывое, як цяпершчына паўстае тое даўнае.

Быў выпуск вышэйшых курсаў беларусазнаўства. Вялізарная заля менскага дому працаўнікоў асьветы гаманіла маладымі галасамі. Разгарнулася заслона... Да трыбуны падыйшоў Лёсік. Мы выпадкам трапілі на тэкст тае ягонае прамовы. Падаем яе ўсю, бо яна гучыць, нібы была сказанай сяньня і сярод нас, выгнаньнікаў, і сярод нашых суродзічаў на Бацькаўшчыне. Разьвітальнае слова было натхненным заклікам да самаахвярнае працы для Беларусі:

«Вы ўжо ня тыя, што былі, бо пакаштавалі плоду з таго дрэва, што называецца беларускай справай, беларускім адраджэньнем. Вы былі ўведзеныя ў сьвятое сьвятых беларускай справы, і адчыніліся вам вочы вашыя, і пазналі вы таямніцы ўваскрошаньня айчыны нашай, Маці-Беларусі... Вашы сьвечкі запаленыя, і вы становіцеся апосталамі беларускае справы. Цяпер, як ясныя зоркі, разыйдзецеся вы па Беларусі, каб панесьці за сабою вялікую радасьць уваскрошаньня Беларусі. Вы скажаце народу беларускаму, што айчына яго ўваскрэсла, што ўжо разьбіта дамавіна яго і далёка адкінуты камень ад гробу яго. Вы скажаце яму, што Беларусь жыла, жыве і жыць будзе і што недалёка ўжо «абяцаная зямля» яе. А калі знойдзецца Хама няверны, што ўсумніцца ў праўдзе слоў вашых, дык скажэце яму, што вы самі бачылі яе, сваю Маці-Беларусь, і ўкладалі пальцы свае ў раны яе. А калі й гэта не паможа, то адыйдзецеся ад яго прэч, а пасьпяшайце туды, дзе ждуць вас, дзе слова ваша ня будзе голасам, гукаючым у пушчы. Але бойцеся, каб не пагасла сьвечка ваша, бо ня раз бура захопіць вас у дарозе і не адну навальніцу давядзецца перажыць вам у часе свае падарожы. Пільнуйце й бойцеся, каб не пагасла сьвечка заміласваньня вашага да свае многапакутнае Маці-Беларусі.

Пільна сачэце за сабою і не забывайце падліваць алею ў сьвяцільні вашы, каб было з чым сустрэць яе, сваю Белую Русь, калі яна прыйдзе судзіць нас ува ўсёй славе сваёй!»

А калі настаўнік скончыў прамаўляць да сваіх вучняў, дык здалося, заля расступілася ды ўся Беларусь сыйшлася на магутны покліч вечавога звону. Воплескі адбіваліся хвалямі ад сьценаў будынку, вырываліся на вуліцы ды разам зь імі воклічы, як нацыянальная прысяга гатовасьці зьдзейсьніць наказ-заклік.

Ад імя выпускнікоў Лёсіку адказваў тады яшчэ юнак, а праз колькі гадоў ведамы паэт. Абодва яны — настаўнік і паэт, ягоны вучань — праз 8 гадоў сустрэнуцца ў менскім падвале НКВД. Адсюль іх выправяць за нацыянальную справу, як і даўней, у царскія часы, на выгнаньне з Бацькаўшчыны з найстрашнейшым бальшавіцкім выпаленым кляймом «ворагаў народу». Для Лёсіка гэта было ўжо другое й апошняе выгнаньне.

Лёсік быў выдатным нацыянальным дзеячом, самым папулярным і заслужаным на Беларусі настаўнікам-моваведам, пісьменікам. Ён, як і бальшыня нашых дзеячоў, выйшаў зь вёскі. Нарадзіўся Лёсік у Мікалаўшчыне ля Стоўпцаў 6 лістапада 1894 году. Ён даводзіўся дзядзькам Якубу Коласу, хоць і быў на два гады маладзейшым за яго. Скончыў Маладэчанскую настаўніцкую сэмінарыю. Тады гэткіх сэмінарыяў было аж колькі на Беларусі, але ўсе яны нічым ня розьніліся адна ад аднае, мелі адну і тую-ж мэту: зрабіць будучых настаўнікаў паслухмянымі паслугачамі царызму ды адданымі вялікадзяржаўнымі расейскімі патрыётамі. Вось што піша ў сваім літаратурна-біяграфічным нарысе пра Я. Коласа Ул. Дзяржынскі пра выхаваньне вучняў у Нясьвіскай сэмінарыі, дзе навучаўся Колас:

«Для прышчапленьня расейскага вялікадзяржаўнага патрыятызму служылі бадай усе... прадметы і ўся цалкам выхаваўчая сыстэма сэмінарыі; расейская мова адыгрывала ў гэтым сэнсе першую ролю. Лекцыі яе мелі сваім асноўным заданьнем перш за ўсё выклікаць у вучняў агіду да беларускае роднае мовы, наогул да ўсяго мясцовага, беларускага і захапленьне да рускае мовы, культуры, нацыі і г. д. Для гэтай мэты пэдагагічным пэрсаналам была выпрацаваная цэлая сыстэма...

прыёмаў дэнацыяналізацыі беларускага студэнцтва. Складаліся, напрыклад, цэлыя слоўнікі беларускіх слоў, непадобных да рускіх, і вучні вывучалі гэтыя словы ў альфабэтычным парадку на памяць. За ўжытае ў пісьмовых працах беларускае слова вучань атрымліваў найніжэйшы бал.

Пры сэмінарыі была вучнёўская бібліятэка, у якой падбор кніжак быў вельмі тэндэнцыйным... а газэты проста не дапушчаліся ў сьцены сэмінарыі».

Усялякімі спосабамі ўлады намагаліся ўсьцерагчы сэмінарыстаў ад вальнадумства, таму ў бібліятэках ня было твораў Талстога, а іншых клясыкаў чытаць «не асабліва рэкамэндавалася». Адгароджваючы сэмінарыстаў ад жыцьця, ім, як калісьці пісаў Колас (сяньня гэтага нельга пісаць там), «дзяўблі на кожным кроку, як апякуецца царскі ўрад, царскае начальства і сам цар аб народзе, як гэты народ любіць свайго бацьку цара, як ён заўсёды знаходзіць у яго ласку й міласьць».

Але пры першым сутыку з жыцьцём ад усяе гэтае чмуры не заставалася й сьледу. Само жыцьцё давала праўдзівую асьвету ды скіроўвала чалавека на іншы шлях. Сэмінарскія ілюзіі зьнікалі, нібы памыйныя бурбалкі, і чаканыя «абаронцы» нямінуча ператвараліся ў зацятых ворагаў расейскага самаўладзтва. Няўмольная лёгіка жыцьця вяла на шлях нацыянальна-вызвольнага змаганьня. Сярод гэтых людзей малады Лёсік адразу займае адно зь першых месцаў.

Лёсік бярэ ўдзел у нелегальным настаўніцкім зьезьдзе, які адбываецца ўлетку 1906 году ў Вільні ў памешканьні пры летувіскім касьцеле сьв. Мікалая. І ўжо будучы перасьледваным паліцыяй, ён становіцца адным з галоўных ініцыятараў другога настаўніцкага зьезду ў Мікалаўшчыне, які адбыўся неўзабаве па віленскім у ліпені 1906 году. Мэтаю абодвух зьездаў было стварэньне ўсебеларускага настаўніцкага саюзу, каб аб'яднаць настаўніцкія сілы на змаганьне з царызмам. Тым больш гэта было важным, што пасьля прыдушэньня рэвалюцыі 1905 году над усім краем навісла ноч рэакцыі. Пасьля зьезду Лёсік аж да 1908 году жыве на нелегальным становішчы, за ім няўпынна ганяецца царская ахранка. У 1908 годзе Лёсік атрымаў найцяжэйшую кару — дажывотную высылку на Сібір.

У Сібіры Лёсік сустракаецца з другім катаржанінам-беларусам, паэтам Алесем Гаруном. Абодва яны былі ў далёкім выгнаньні аж да лютаўскай рэвалюцыі 1917 году. І Лёсік і Гарун адразу едуць у Менск, каб улучыцца ў змаганьне за незалежную Беларусь. У гэтым змаганьні Лёсік адыграў асаблівую ролю, і нездарма бальшавікі пазьней не маглі гэтага дараваць Лёсіку. Ён бярэ ўдзел у беларускіх зьездах, зьяўляецца адным з тварцоў Акту 25 сакавіка. Ад лета 1918-га да 1920 году быў старшынём Рады БНР.

Асаблівае значэньне ў гуртаваньні й задзіночаньні нацыянальных незалежніцкіх сілаў мела газэта «Вольная Беларусь», якую на працягу ўсяго часу рэдагаваў Лёсік ды ў якой супрацоўнічалі ведамыя нацыянальныя дзеячы. Ужо сам назоў газэты вызначаў ейную ідэйную лінію — змаганьне за незалежную Беларусь. Вось чаму бальшавікі й назвалі газэту «баявым органам беларускай контрэвалюцыі».

Запраўднае знаёмства беларусаў з бальшавікамі было ў часе разгону імі 1-га Ўсебеларускага Кангрэсу. У сваёй газэце Лёсік пісаў, што тады расейскія «бальшавікі... абыходзіліся зь мянчанамі, як татары пры наездзе Батыя».

У той час ня было суджана поўнасьцю зьдзейсьніцца нашым нацыянальным ідэялам. Але бальшавікі былі вымушаныя лічыцца з нацыянальнымі патрабаваньнямі беларускага народу. Якраз пад напорам гэтых патрабаваньняў яны былі вымушаныя адмовіцца ад струхлелай ад часу царскай намэнклятуры «Северо-западный край» (бальшавікі тады называлі Беларусь Заходняй вобласьцяй) ды абвесьціць БССР. Памылкова думаць, што бальшавікі з добрай волі самі абвесьцілі БССР. Беларусы ў іх вырвалі беларускую рэспубліку, няхай хоць і савецкую. Ня было-б абвешчаньня БНР — ня было-б і БССР. Гэткім-жа шляхам паўсталі і іншыя саюзныя ды аўтаномныя рэспублікі, безь якіх было-б шмат лягчэй упраўляцца ў «аднароднай»,— як гэта цьвердзяць нават цяперашнія расейскія эмігранты,— савецкай імпэрыі.

Жывучы ў БССР, Лёсік цалкам аддаецца навуковай і настаўніцкай працы. Ён працуе ў тэрміналягічнай камісыі Наркамасьветы, пасьля ў Інстытуце Беларускай Культуры і, нарэшце, у Беларускай Акадэміі Навук. Чытае лекцыі беларускай мовы на настаўніцкіх курсах,

у пэдагагічным тэхнікуме, які быў запраўднай кузьняй нацыянальных кадраў, і ў Беларускім дзяржаўным універсытэце. Таксама бярэ ўдзел у ведамай Акадэмічнай канфэрэнцыі. За колькі гадоў Лёсік напісаў ці мала падручнікаў беларускай мовы для розных школаў. Усе сілы аддаваў чалавек для асьветы свайго народу.

Калі ў дачыненьні да некаторых беларускіх дзеячоў можна гаварыць у некаторай ступені пра часовае «прымірэньне» з бальшавікамі, дык у дачыненьні да Лёсіка гэтага сказаць ніяк нельга. Таму й ішоў чалавек праз жыцьцё пад нясьціханым варожым абстрэлам. Але ніколі ня падаў, не скараўся, ня ўгінаўся перад ворагам. Нават арыштамі ня прымусілі вырачыся сваіх паглядаў. А Лёсіка ў часы ЧК, як там кажуць, забіралі вельмі часта. Мянчане ці адзін раз бачылі, як Лёсік, калі ўжо здавалася, што па ім і сьлед прастыў, варочаўся з ЧК дахаты, нясучы ў руках заўсёды адзін і тойжа куфэрак, які, мабыць, у яго й быў для «адмысловага прызначэньня».

У 1922 годзе выходзіць ягоная першая «Практычная Граматыка» ў выданьні Наркамасьветы. Газэта «Зьвязда», якая тады друкавалася ў расейскай мове, варожа сустрэла беларускую кніжку. Рэцэнзэнт пра Лёсікаву граматыку пісаў: «Так пад маркай каапэрацыйнага выдавецтва і нявінным назовам «Практычная Граматыка» вядзецца контррэвалюцыйная прапаганда».

Гэтак ужо ад самага пачатку складаліся дачыненьні паміж Лёсікам і бальшавікамі ў афіцыйнай іхнай савецкай дзяржаве. Бальшавікі ўжо адразу патрабавалі гымнаў на свой гонар. Але ня віна беларускіх дзеячоў, што гэтыя гымны не сьпяваліся. Гэта-ж было яшчэ зусім нядаўна, гэтак сьвежа трымалася ў памяці, як расейскія бальшавікі пры дапамозе штрыхоў наводзілі свае парадкі ў беларускіх справах і гэтым распаласавалі ўсялякую гымнавую магчымасьць. Было-б зрадай, каб гэткія гымны сьпявалі тварцы Сакавіковага Акту. Для Лёсіка ідэя нацыянальна-незалежніцкая была вызначальнай на ўвесь час ягонай дзейнасьці, ягоных жыцьцёвых паводзінаў.

Мы разумеем, што бальшавіком не да густу была Лёсікава граматыка, асабліва прыклады да розных граматычных правілаў. Пра Беларусь у савецкіх умовах гэтак добра гаварыў Лёсікаў прыклад: «Апанавалі чэрці месца сьвятое». У прыкладах гэтак ярка раскры-

валася ўсё ўбоства тагачаснай бальшавіцкай запраўднасьці ды сьцьвярджалася канечнасьць, няўхільнасьць перамогі нацыянальнага, што «будзе кірмаш і на нашай вуліцы», а таму «браты, хай кажны пасьпяшае, адно нам думаць і рабіць». Гэта ўжо гучэла як заклік да гуртаваньня нацыянальных сілаў ды ўпэўненасьці, што ўжыцьцёвяцца спадзяваньні.

А вось яшчэ адзін характэрны прыклад.

У 1921-1922 годзе Лёсік чытаў беларускую мову на менскіх настаўніцкіх курсах. Дзеля нацыянальнага ўзгадаваньня маладых настаўнікаў шырака практыкаваліся пісьмовыя працы. Аднойчы пісалі на тэму — «Як я пазнаў сябе беларусам». У сувязі з гэтай пісьмовай працай Лёсік друкуе ў часапісе «Вольны Сьцяг» артыкул, які ўжо набывае ня прыватнае, а агульнанацыянальнае значэньне. Лёсік найперш зварачаецца да ўсіх беларусаў, над якімі яшчэ вісіць праклён стагодзьдзяў, каб яны як мага хутчэй вызваліліся ад гэтага нацыянальнага грэхападзеньня ды сталі на шлях нацыянальнага змаганьня.

Лёсік пісаў: «Мы падобны да таго жыдоўства, што вывеў Майсей зь зямлі эгіпецкай... А ці ня чуем мы цяпер, як з усіх бакоў кажуць: «Нашто нам тая Беларусь? Нашто нам кідаць тое, да чаго мы прывыклі? Мы тут маем свае хаты, сталы прыпынак, а там — барацьба, змаганьне, сьмех і зьдзекі, фараоны з войскам на калясьніцах і цёмная няведамая будучыня!..» Але, слухаючы гэта, мацней сьціскаецца посах у руках і мацней адчуваецца прыродная няўхільнасьць. Ісход пачаўся, і ён ня спыніцца, а вывядзе туды, куды клічуць нас нашыя нацыянальныя прарокі...»

Гэтак навучаць і пісаць мог адно Лёсік, і гэтую сваю нязрушную веру ды гарачы тэмпэрамэнт ён укладаў у душы сваіх выхаванцаў.

Лёсік быў патрабавальным настаўнікам і разам пабацькаўску цёплым, блізкім чалавекам да сваіх выхаванцаў. Мова ў ягоным выкладаньні ператваралася з сухіх абстрактных граматычных катэгорыяў у жывы нацыянальны арганізм. Таму ягоныя лекцыі заўсёды пакідалі нязгладны сьлед у памяці, былі незаступным сродкам нацыянальнага ўзгадаваньня.

Лёсік бываў надзвычай задаволеным, калі ягоны вучань ці студэнт адказваў цьвёрда, разважна. У гэткія часіны настаўнік прахаджаўся па аўдыторыі, пазіраў

з боку ды ўсьміхаўся сваёй скупой і разам поўнай усьмешкай. А калі адказ быў блытаны, тады ён раптам запыняўся, як заўсёды, калі хваляваўся, скідаў акуляры і, жэстыкулюючы сваімі шырокімі далонямі, пытаў:

— Што-ж вы сабе думаеце? Дык як-жа гэта? З чымжа вы пойдзеце да нашых дзяцей, чаго вы іх навучаць будзеце?

І гэта дапамагала. Міжвольна кажны студэнт уважаў за свой найпершы абавязак не дакучаць Лёсіку благімі адказамі.

Лёсік, мабыць, быў найбольш папулярным, найбольш ведамым чалавекам на Беларусі. Зь ім, яшчэ ня бачыўшы яго ў вочы, ужо зналіся вучні розных школаў. Зь ім, нават мо ніколі ня сустракаўшыся, зналіся ўсе выкладчыкі мовы. Лёсіка нават ведалі і людзі няшкольнага веку, якія ў часы «беларусізацыі» мусілі вывучаць беларускую мову па Лёсікавых падручніках. А колькі моладзі навучалася ў самога Лёсіка, пачынаючы ад розных курсаў і канчаючы ўнівэрсытэтам!

Мове Лёсік надаваў асаблівае значэньне. Для яго мова была наймагутнейшым дзейнікам згуртаваньня народу ў сцэмэнтаваную нацыю, г. зн. вялізманым сродкам нацыянальнага ўзгадаваньня народу.

У 1918 годзе ў «Вольнай Беларусі» Лёсік пісаў: «Народ трэба навучыць, яму трэба паказаць, што пакуль не запануе ў краі яго наша родная мова, беларуская мова, да таго часу ён будзе бедны, цёмны й галодны». Жывучы ў БССР, у 1921 годзе Лёсік сьцьвярджаў: «Для нас мова становіць усё: нашу палітыку, эканоміку, наш грамадзкі лад жыцьця».

Такім чынам, значэньне нашае мовы ўздымаў на вышыню ролі й заданьня дзяржаўнага, бо яна найлепшы сьведка незалежнасьці самой дзяржаўнасьці. Гэтак змаганьне за мову ператваралася ў змаганьне за нацыю, за ейную чысьціню й незалежнасьць, гэтак мова ператваралася ў палітыку, у дзяржаўнасьць. Ня выпадкам і бальшавікі ў часе пагрому ці не галоўны свой удар скіравалі якраз сюды, супраць нашай нацыянальнай мовазнаўчай практыкі, а значыць, і супраць Лёсіка.

Аж да 1930 году Лёсік працаваў у Менску. Але праз увесь час, нават тады, калі ў Менску былі засяродка-

ваныя вышэйшыя навуковыя й навучальныя ўстановы, калі з кажным днём нацыянальная справа, пераадольваючы афіцыйныя перашкоды, набывала размаху, нават тады Лёсіка не пакідала думка пра Вільню. Лёсік быў закаханы да Вільні, называў яе калыскай беларускасьці, яна была для яго ўвасабленьнем нашых дзяржаўных і культурна-нацыянальных, гістарычных традыцыяў, якія вядуць нас у нашую слаўную мінуўшчыну Вялікага Літоўскага Княства. Гэтае значэньне Вільні добра разумелі й валадары чырвонага Крамля, для якіх не асабліва па нутру нашыя дзяржаўныя традыцыі. І вось, каб усьмерціць гэтыя традыцыі, каб адабраць іх ад нас, яны, няпрошаныя «зьбіральнікі беларускіх земляў», перадалі гістарычна беларускую Вільню іншаму народу, каб перакупіць яго на свой бок. «Прыгадваецца, як у той час для наданьня Вільні іншага «нацыянальнага калярыту», пачалі звозіць у сьпешным парадку з усяго краю летувісаў для дэманстрацыі адпаведнага «нацыянальнага дэ факто».

Улетку 1930 году разам з «шырокім сацыялістычным наступам на ўсім фронце» пачаліся арышты ў БССР, пачалася расправа маскоўскіх сталінцаў над беларускім нацыянальным рухам. Арыштавалі тады й Лёсіка.

Пазьней былі дайшлі чуткі, што ў часе асатанелай яжоўшчыны Лёсіка ўжо на выгнаньні зноў кінулі ў падвал НКВД. У адцятым ад сьвету падзямельлі сталінскія апрычнікі закатавалі Лёсіка.

Аднойчы выклікалі ў НКВД ягоную жонку Ванду Лявіцкую. Яна была ўлюбёнай дачкой беларускага пісьменьніка Ядвігіна Ш. У НКВД Вандзе Лёсік сказалі, што ейны муж памёр, і перадалі ёй ягоную вопратку. Гэтак бальшавікі абарвалі жыцьцё аднаго з выдатнейшых нашых нацыянальных дзеячоў.

Лёсіка дала Беларусі беларуская вёска, тая вёска, якая праз стагодзьдзі польскай і расейскай дэнацыяналізатарскай палітыкі пранесла ў сваёй вытрываласьці чысьціню нашае нацыянальнае апрычонасьці. Здавалася, што ў асобе Лёсіка нібы скандэнсаваліся нязрушнасьць і вытрываласьць, наважанасьць цэлага народу дайсьці да свае нацыянальнае мэты. Лёсік да Беларусі ішоў не праз кніжку. Ён сам нёс нашую Беларусь усюды, куды яго кон ні кідаў. З гэтага гледзішча ягоныя жыцьцёвыя паводзіны мо як ні ў кога

іншага, ад пачатку й да канца былі падпарадкаваныя адзінай мэце, да якой праставаў чалавек праз усё сваё жыццё і якой аддаў сваё жыццё.

Праз увесь час Лёсік ні разу не зрабіў рэвэрансу ў бок бальшавікоў. Не ў ягонай натуры было гуляць у флірт, нават у палітычны флірт. Ён ішоў раз вызначаным шляхам і ні разу ні на часіну ня збочыў ад абранай ім мэты, нават калі ішоў пад галасьлівым варожым крыкам. Таму бальшавікі нікога так не ненавідзелі, як Лёсіка (ды яшчэ хіба Ластоўскага), адно імя якога кідала іх у шалёную гарачку.

Вось гэткім нацыянальна нязломным, гранічна чыстым, зь няўломнай воляю й застаўся гэты чалавек у нашай памяці.

«Бацькаўшчына», 8 лютага 1953 г.

ЯНКА СТАНКЕВІЧ

ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ[1]

Вацлаў Ластоўскі пасьвяціў сябе ўсяго адраджэньню беларускага народу, належачы да тых нячысленных, што ня толькі ўсёй душою аддаліся справе беларускай, але і ўвесь час свой аддавалі ёй.

Із школьнае асьветы В. Ластоўскі меў толькі пачатную школу, але самаасьветаю ён усебакова разьвіўся й быў запраўдным і даволі высокім інтэлігентам. Сваёй інтэлігентнасьцю ён мог за пояс заткнуць шмат каго з вышшай асьветаю. У гэтым ён быў вельмі падобны да Янкі Купалы, каторы быў таксама самавук.

У адным месцы Бібліі сказана, што вол мае права есьці з тае баразны або з таго загону, каторы арэць. Але адно права, а другое — магчымасьць. Вось-жа, што датыкаецца беларускага нацыянальнага адраджэньня, то можна сказаць, што адно лічаныя рэдкія выняткі мелі такую магчымасьць, а не даводзілася, з гледзішча матар'яльнага, завідаваць таму, хто яе меў. Да лічаных выняткаў-адзінак, валоў беларускага адраджэнскага руху, хто меў магчымасьць есьці з аранага самым загону, належаў В. Ластоўскі.

З В. Ластоўскім пазнаёміўся я ў 1909 годзе, калі я прыехаў да Вільні. Ён тады быў сакратаром «Нашае Нівы» і заставаўся ім да нямецкае акупацыі ўвосені 1915 г. Ён атрымліваў пэнсію ад выдавецтва. Судзячы з таго, як Ластоўскі жыў, пэнсія была больш чымся сьціплая. Жыў ён ля Завальнае вуліцы, № 7. Там у першым вялікім пакоі памяшчалася спачатку рэдакцыя «Нашае Нівы», а потым беларуская кнігарня, а

[1] Рэфэрат, чытаны на акадэміі, зладжанай 31 кастрычніка 1953 г. у Нью-Ёрку ў гонар В. Ластоўскага Крывіцкім навуковым таварыствам Фр. Скарыны.

ў заднім малым пакоіку ды яшчэ ў меншай кухні жыў В. Ластоўскі з радзінаю — жонкаю й дачушкаю. Гэта было памяшканьне такое малое, што яго можна толькі прыраўнаваць да нашых гасподаў у табарах ДП у Нямеччыне, дый гэтыя напару былі лепшыя. Было яно й сьцюдзёнае, бо далавах, пад усёй гасподаю быў склеп, у каторым памяшчаўся архіў «Нашае Нівы» і быў склад кніжак.

Калі вы ўходзілі ў гасподу Ластоўскага, вы не пазнавалі, што гэта была гаспода прыватная. Вам здавалася, што ўходзіце ў мастацкае прадаўжэньне рэдакцыі або кнігарні: на сьценах былі паразьвешаныя абразы і іншыя памяткі старое беларускае культуры.

Асноўнай і, казаў той, службовай (гэтае слова так мала сюды падыходзе!) працаю Ластоўскага было сакратарства або рэдагаваньне «Нашае Нівы». Але не адным ён гэтым займаўся. Клясычны адраджэнец беларускі займаецца ўсім чыста магчымым, што спрыяе беларускаму руху. Чыста гэтак рабіў і Ластоўскі. Восьжа ня толькі друкам, але й вусна ён пашыраў беларускую справу — заўсёды, у рэдакцыі, дома й вонках. Сталым, але не аплачваным супрацаўніком «Нашае Нівы» і палітычным кіраўніком яе ад самага пачатку быў Антон Луцкевіч. Яго адылі ня часта можна было бачыць, ён рэдка бываў у рэдакцыі, а да гасподы Луцкевічаў проста «так», без патрэбы не выпадала йсьці. Можна сказаць, што Іван і Антон Луцкевічы мелі дачыненьне зь людзьмі як-бы вышшых сфэраў, з маючымі значаньне ў грамадзкім і палітычным жыцьці, і да ўсіх іншых у іх не заставалася часу. І Ластоўскі меў дачыненьне з гэнымі «вышшымі» сфэрамі, але ня толькі, колькі Луцкевічы. Затое ён вёў нацыянальна-ўсьведамляючую работу з усімі іншымі, каторымі былі прыяжджаючыя да Вільні беларускія сяляне і іншыя правінцыялы, розныя віленцы, што ў некаторай меры зацікавіліся сваёй справаю беларускай, прыпадковыя мясцовыя й падарожуючыя гуманістычныя, радзей палітычныя (гэтыя йшлі да Луцкевічаў) дасьледавальнікі, што заходзіліся даведацца, што думаюць або ведаюць пра тое або іншае пытаньне ў беларускай рэдакцыі. Але асабліва стыкалася з Ластоўскім беларуская моладзь.

Найперш у самых сабе людзі носяць свайго ворага. У адных ён меншы, у другіх большы; звычайна найне-

бесьпячнейшы ў моладзі. Хрысьціянства гэта добра зразумела і стварыла супроць яго глыбака прадуманыя абараняючыя сяродкі. Ня гэтымі сяродкамі, але «заражаючы» маладзёнаў ідэяй беларускага нацыянальнага адраджэньня Ластоўскі ратаваў іх і маральна. Мне здаралася сустракацца зь людзьмі, каторыя казалі, што калі-б Ластоўскі не прышчапіў ім беларускае ідэйнасьці ў іх школьным веку, дык яны ня толькі зьгінулі-б для свайго народу, але загінулі-б і маральна.

Трэба ведаць, што Ластоўскі ня быў даматур нат у менска-віленскім абсягу; ён нярэдка выяжджаў вонкі, маючы адмысловыя нацыянальна-адраджэнскія заданьні.

Няма што й казаць, што Ластоўскі браў дзейнае ўчасьце ў розным нацыянальным жыцьцю арганізацыйным.

Ластоўскі быў добрым публіцыстам. Ён друкаваў свае артыкулы ў «Нашай Ніве» пад рознымі мянушкамі, галоўна пад мянушкаю Юры Верашчака і Власт (скарачэньне імені й прозьвішча). Памятаю, што ягоныя артыкулы адзначаліся гарачым тэмпэрамэнтам і часта нацыянальным абурэньнем.

У сваёй вуснай і пісьменнай нацыянальнай прапагандзе Ластоўскі розьніўся ад Антона Луцкевіча і іншых публіцыстаў-сацыялістаў, а таксама ад такіх, як Антон Лявіцкі (пісьменік Ядвігін Ш.), што мелі (гэтыя другія) мякка-шляхоцкі падыход да здэнацыяналізаванага беларускага панства. Гэтыя, як адны, так і другія, пісалі пра край ізь пяцьма нацыямі (беларусы, летувісы, жыды, палякі і расейцы) ды што польскія (запраўды спалячаныя) паны ў Беларусі маюць павіннасьць закладаць (прыватныя) беларускія школы. Такі спосаб прапаганды не даваў рэзультатаў у тых, да каго ён быў зьвернены. Панове, ведама, мелі павіннасьць закладаць беларускія школы, але яны яе не спаўнялі, і, пакуль заставаліся ў чужанацыянальным палоне, ня было надзеі, што споўняць, як ім гэта ні прыпамінай. А што да «пяцёх нацыяў», дык, калі браць край у яго палітычна-гістарычнай цэласьці, былі толькі тры народы — беларусы, летувісы й жыды; а калі абмежыцца аднэй этнаграфічнай Беларусяй, дык два — беларусы і жыды. Палякі й расейцы ў Беларусі — гэта спалячаныя або змаскаленыя беларусы, і, замест таго, каб адклікацца да іхнага маральна-людзкога абавязку,

валей было вымагаць спаўненьня павіннасьці нацыянальнай. Гэтак Ластоўскі й рабіў. «Сплачвайце доўг!» — пісаў ён, зварочваючыся да здэнацыяналізаванага беларускага панства. Гэткі спосаб быў адзіна правільны. Пэўне, ён — прынамся, гэным часам — мала вырваў з чужое ідэялёгіі тых, што былі ў яе моцна ўгразьлі; затое ён ратаваў тых, што былі на дарозе да ўгразьненьня. Тым часам спосаб першы ня толькі разьмінаўся з праўдаю, але й быў небясьпечны з боку нацыянальнага: ён заглушаў, усоньваў сумленьне ў бязьдзейных, абыякавых або й проста зраднікаў, бо даволі ім уважаць сябе за небеларусаў, каб чуцца нявіннымі. Ластоўскі і падобныя да яго сваім шчырым прасталінейным спосабам вельмі траплялі да перакананьня тым, што былі беспасярэдна з народу, асабліва моладзежы. Што дыкжэ Ластоўскі тарнаваў такі спосаб, выясьняецца тым, што ён сам быў беспасярэдна з народу.

Пасьля даўгога паняволеньня, уціску, зьдзекаў, нішчэньня, нярэдка фізычнага, сыстэматычнай прадуманай асыміляцыі ў нашага народу засталася толькі мова і — мінуласьць. Мала які народ устоіць без свае мовы, а каторы і ўстоіць, як жыды, дык імкнецца аднавіць сваю мову. А бяз мовы й мінуласьці — гістарычнае традыцыі ніводзін народ ня можа ўстояць, каб ня стацца пагноем іншым. Дзеля таго мова й гістарычная традыцыя — гэта найпатрабнейшыя і найдарожшыя скарбы народу. Гэта зразумеў Ластоўскі і парупіўся пра долю гэтых скарбаў. Ён студыюе гісторыю Беларусі ды піша й друкуе сваю «Кароткую Гісторыю Беларусі». Але студыюе, яе і ўсё, саматугам, не здабывае навуковае мэтоды. Дзеля таго, дарма што ён ведаў шмат гістарычных фактаў, «Кароткая Гісторыя Беларусі» ягоная слабшая за ўперад іншымі напісаныя, прыкладам, шмат слабшая за гісторыю Беларусі М. Даўнара-Запольскага, як з гледзішча навуковага, так і нацыянальнага. Ёсць вялікае выданьне «Живописная Россия», у трэцім, таксама вялікім томе яе ёсьць гісторыя Беларусі, надрукаваная ў дзьвюх асобных часьцях, адна часьць завецца «История судьбы Белорусского Полесья». другая — «История судьбы Литовского Полесья»; абедзьве часьці адна адну дапаўняюць. Дзьве (а не адна) гісторыі Беларусі зьявіліся тут згодна із штучнымі расейскімі назовамі. (Расейцы, забіраючы Бе-

ларусь, Віцебшчыну й Магілеўшчыну назвалі «беларускай губэрняй», Меншчыны ніяк не назвалі, а за Віленшчынаю, Горадзеншчынаю разам з Ковеншчынаю пакінулі стары назоў задзіночанага гаспадарства беларускага — Літва.) Абедзьве менаваныя часьці гісторыі Беларусі напісаў Адам Кіркор, беларускі пан ізь Сьлівіна ў Магілеўшчыне, вельмі плодны аўтар. Хіба дзеля таго, што гісторыя Беларусі Кіркорава была нейкай ды багатай фактамі цэласьцяй, чаго не ставала іншым асобным гістарычным апрацаваньням, яе браў за зразу (пробку) Ластоўскі і ёю, відаць, найболей карыстаўся.

Але дарма што «Кароткая Гісторыя Беларусі» Ластоўскага, з прычыны нястачы навуковае прыгатовы ў яе аўтара, слабшая за папярэднія, яна зрабіла за іх шмат болей. Прычыны гэтага былі, што яна напісана па-беларуску, што ўжывала, хоць і толькі што неабдумана пашыраны, але ўжо зразумелы інтэлігенцыі назоў «Беларусь», «беларускі», а не якісь «западнорусский» і пад., што мела гатовых сваіх чытачоў і пашыральнікаў, якімі былі беларускія адраджэнцы,— адным чынам дзеля таго, што гэта было выданьне беларускага руху і дзеля гэтага руху.

Заняўся Ластоўскі і беларускай моваю. Сярод нашых людзёў ёсьць часта хвальшывае перакананьне, што беларусу беларуская мова веда ёсьць навукаю найлягчэйшай,— бо што-ж, і так беларус умее па-беларуску. А тым часам гэта ня так. І гэта бачым таксама з прыкладу Ластоўскага. Дарма што ён надта рупіўся пра родную мову, мог заняцца толькі слоўнікам ды, выдаўшы слоўнік, запраўды папсаваў багаты матар'ял. Ягоны слоўнік ані навуковы, ані практычны, ані матар'ял да аднаго або другога. І такім ён застанецца, пакуль ягоны зьмест ня будзе правеяны і ня будзе адлучанае зярнё ад мякіны, бо Ластоўскі памяшаў прыродныя словы беларускія із словамі, ім самым робленымі або някрытычна запісанымі й выпісанымі. Карыстацца такім слоўнікам трэба вельмі асьцярожна, а ня спэцыялістаму валей і зусім не карыстацца. Шкоднасьць такога карыстаньня адбіваецца на вершах Сяднёва. Але рупнасьць Ластоўскага пра родную мову заслугоўвае найбольшай пашаны. Каб сучасныя нам беларускія студэнты мелі хоць часьць такое рупнасьці, а зь ёй і беларускай мове не пагражала-б вялікая небясьпечнасьць.

Зь менаванага бачым, што Ластоўскі браў справы глыбака, з карэньня. Дзеля таго-ж ён стараўся аднавіць і пашырыць наш стары, праўдзівы нацыянальны назоў «Крывічы».

Ластоўскі й пісьменнік. Ён пісаў апавяданьні ды вельмі ўмела й хораша апрацоўваў легенды, што лучылася зь ягонымі гістарычнымі зацікаўленьнямі. Ён і этнограф, але тут такі, які і гісторык. Знаўся ён на памятках старога беларускага й чужога мастацтва, хоць і далёка быў у гэтым знацьцю ад Івана Луцкевіча. Наапошку трэба адцеміць, што ён заўсёды быў і палітык.

Хто мог спадзявацца ад самавука такога шырокага кругазору, вялікіх веданьняў, такое ўсебаковае дзейнасьці? Ён вялікі ў сваіх імкненьнях, у любові свайго народу і ў працы для яго. З прычыны паднявольнага палажэньня нашага народу Ластоўскі ня меў навуковае прыгатовы. Каб яе меў, дык быў-бы вялікім гісторыкам, у тым ліку гісторыкам мастацтва, а мо й моваведам, а напэўна добрым этнографам.

Наш край — гэта край вялікіх людзёў. Летувісы, што прысабечваюць сабе нашу гісторыю, гэта адзначаюць навет у сваім нацыянальным гымне. А калі-б ня нашая нацыянальная няволя, дык вялікіх людзёў у нас было-б шмат разоў болей і працавалі-б яны не на чужых, а свае таленты аддавалі-б свайму народу.

«Бацькаўшчына», 6 сьнежня 1953 г.

ЮРКА ВІЦЬБІЧ

У ПОШУКАХ АЛЬГЕРДАВАГА ШЛЯХУ

Аляксей Сапуноў (1852—1924)

...Так рупная пчала
Умее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак,
І бачанаму ім — ён годны веры сьветак.

Максім Багдановіч. «Летапісец»

Стагодзьдзе таму ў мястэчку Усьвятах Вяліскага павету Віцебскае губэрніі ў сям'і незаможнага кажамякі Пархвена Сапунова нарадзіўся сын Аляксей. Пачуўшы крык дзіцяці, заўсёды суворы, прапахлы скурай бацька, усьміхаючыся, заўважыў:

— Дзякуй Богу, яшчэ адзін гарбар у нашыя Ўсьвяты заявіўся.

Пэўне-ж бацькі не здагадваліся, што іхны сын, перамагаючы зусім няспрыяльныя для гэтага ўмовы, станецца навукоўцам. А сын, стаўшыся гэткім, будзе пры кажнай нагодзе зь цяплінёй падчырківаць, што сваю працаздатнасьць ён дастаў у спадчыне ад бацькі, а сваю любасьць да старасьветчыны ад месца свайго народжаньня, ад аднаго з найстарэйшых беларускіх гарадоў, аб якім упяршыню прыгадаў летапісец яшчэ ў сувязі з унукам Рагнеды, полацкім князем Брачыславам, сынам Ізяслававым, і ў якім жыў пазьней два гады Альгерд.

Сярэднюю асьвету Сапуноў атрымаў у Віцебскай гімназіі, вышэйшую — у Пецярбурскім універсытэце, дзе скончыў гістарычна-філялягічны факультэт. Потым на працягу некалькіх дзесяцігодзьдзяў ён выкладае ў Віцебскай гімназіі лацінскую ды грэцкую мовы, а з 1911 г. па 1922 г. чытае лекцыі ў Віцебскім археалягічным інстытуце. Ужо ў 1920 г. Сапуноў блізу цалкам згубіў зрок. Тым ня менш найгоршае надвор'е не перашкаджала яму штодня, часам з дапамогай павадыра, а часам намацваючы перад сабой дарогу кійком, наведваць інстытут. Студэнтам, якія выбягалі яму насустрач і пачыналі дакараць за тое, што ён ня дбае аб сваім

здароўі, Сапуноў адказваў словамі Плінія аб грэцкім мастаку Апээлесе: Nulla dies sine linea[1].

І запраўды няма нічога больш характэрнага для ўсяго жыцьця Сапунова, чымся гэтая ягоная ўлюбёная лацінская прыказка. І нават сьлепату нажыў ён не з хваробы або старасьці, але вылучна таму, што ня ведалі ніколі адпачынку ягоныя вочы. Тым часам сьляпы прафэсар гаварыў:

— Мае сяброве, адным з тых дасьледных заданьняў, якія мы, старыя, пераказваем вам, маладым, ёсьць адзначыць на гістарычных мапах Альгердаў Шлях. Пазьней гэты шлях зваўся, як вам вядома, Вітавым. Аб ім таксама прыгадвае Сьцяпан Баторы ў сваёй знанай грамаце полацкаму ваяводзе; ягоны схэматычны накід зрабіў і пакінуў нашчадкам годны пашаны Райнгольд Гайдэнштайн. Нам пашэньціла трапіць на сьлед Альгердавага Шляху. Мы пазналі яго па цяпер зарослых, але ўсё-ж дагэтуль прыкметных просеках у лясох і пушчах, па адхонных спусках да яроў і ручаёў, па перакопах праз узгоркі й капцы, па рэштках паляў і гацяў на рэках і балотах, па зламаных колах і конскіх касьцякох, па вугольлю ад спаленых вёскаў і жаўнерскіх вогнішчаў, па знойдзеных абапал яго шышакох і палашох. Мы ўстанавілі, што гэты шлях, пачынаючыся ад Полацку, ідзе праз задзьвінскія лясы, паўз мызы Рудні, праз раку Вушач, праз маёнтак Бязьдзедзічы, паўз Мядзьвежае возера проста на Чортаў мост, праз Бахонкавую гару й далей у кірунку да мястэчка Глыбокага. Тым часам для нас гэта гіпатэза, але няма ніякага сумніву, што ад Глыбокага ён ідзе на Вільню. І калі нам пашэньціла пачаць, хоць не ўдалося скончыць гэтае дасьледваньне, дык вы мусіце нарэшце знайсьці ўвесь Альгердаў Шлях.

Калі сумленнае выкананьне настаўніцкіх абавязкаў забясьпечвала Сапунова хлебам штодзённым, дык навуковая праца ў вольныя ад гэтых абавязкаў гадзіны была мэтай усяго жыцьця. Створанае адным ім, можа, пераважае сабой спадчыну таго ці іншага навуковага таварыства ў поўным ягоным складзе. Прынамсі, ён зьяўляецца аўтарам і складальнікам 72 выданьняў, прысьвечаных гісторыі Беларусі. Усе гэтыя выданьні дзеляцца на тры групы:

---

[1] Ніводнага дня бяз рыскі *(лац.)*.

1. Зборнікі гістарычных актаў і дакумантаў.
2. Навуковыя працы на падставе гэтых зборнікаў.
3. Артыкулы й нарысы, разьлічаныя на шырокія колы чытачоў.

У першай групе, найбольш капітальнай,— шматтомная «Витебская Старина», што патрабавала ці мала год упорыстае працы ў архівах і кнігасховах. Пераважная бальшыня зьмешчаных у ёй гістарычных дакумантаў дагэтуль заставалася невядомаю шырокім чытацкім колам і нават значнай колькасьці навукоўцаў. Стагодзьдзі яны ляжалі сукрыта, пахаваныя пад курганамі пазьнейшых дакумантаў. Між тым толькі празь іх можна было даведацца, як гаворыцца ў высокамастацкіх радкох Максіма Багдановіча:

Што тут чынілася у даўныя часы,
Што думалі, аб чым спрачаліся тады,
За што змагаліся, як баранілі веру,—
Пазнаюць гэта ўсё патомкі праз паперу.

Навуковы дасьледнік ведае, як прыемна нарэшце знайсьці гэткі далёкі па сваёй даце прывілей або кроніку ці акт, якія дададуць яшчэ адну непаўторную старонку ў гісторыю краіны. Знойдзены й апублікаваны дакумант назаўсёды застанецца дакумантам. Часам навуковец на падставе яго зробіць ня зусім аб'ектыўны выснаў. Яшчэ часьцей паспрабуе пабудаваць на ім хісткую ідэялягічную плятформу палітык. Аднак гістарычная праўда, адбітая ў гістарычным дакуманце, можа, не адразу, але нямінуча давядзе нясумленных навукоўцаў і палітыкаў да банкроцтва. Гэтае вылучнае значаньне гістарычных дакумантаў трапна падчырківае Н. Бантыш у сваім артыкуле «Старая Вільня», зазначаючы:

«Настаўніцкі пэрсанал Віленскага інстытуту ўваходзіў у «Комиссию по разбору древних актов». Выхаванцы ягоныя таксама прымалі ўдзел у абсьледваньні й аглядах гістарычных дакумантаў. Гэтак ім, беларусам, зусім ясным рабілася законнае гістарычнае права Беларусі і на Смаленск, і на Вяліж, і на Невель, і на Сураж, і на Аўгустоў, ня лічачы чатырох беларускіх губерняў... Яны бачылі, што Францішак Скарына — першы друкар беларускі й славянскі — пачаў друкарскую справу ў Вільні й Полацку... І вось акт па акце, грамата па грамаце, студэнты бачылі, што беларуская мова была абавязковай у старой «літоўскай» дзяржаве, у тым ліку

для віленскага ваяводзтва... Навуковыя досьледы Сапунова й Карскага памацняюць вядомасьці існаваньня беларускае самастойнае культуры й вымагаюць вывучэньня помнікаў мінулага»[1].

Аднак перш чымся гістарычны дакумант, які датычыць патрэбнага часу або тэмы, патрапіць у рукі навукоўца, той мусіць у гэтых пошуках перагледзець безьліч іншых дакумантаў. Ён мусіць добра ведаць старабеларускую й старапольскую мовы з усімі іхнымі апрычонасьцямі, свомымі толькі таму ці іншаму стагодзьдзю. Ён можа па русізмах і палянізмах вызначыць пачатак ціску з боку таго ці іншага суседа на Беларусь. Ён, узяўшы ў рукі пажоўклую ад часу паперу із зьбялелым атрамантам, мусіць па гатунку паперы й атраманту праверыць або знайсьці дату, калі яна не адзначаная на дакуманце. Ён вызначае таксама час па стылю пісьма, а ў дадатак мусіць безь цяжкасьцяў разьбірацца ў асабістых старадаўных людзкіх характарах пісаньня. Якраз таму Сапуноў пад старасьць і зьнявідзеў. А тады да «Витебской Старины», да Сызыфавае працы, ён із свомаю яму сьціпласьцю дадаў на стараславянскай мове кароткую, але яскравую прадмову:

«Отцы и братья! Оже ся где буду описал, або переписал, або недописал: чтите, исправливая Бога деля, а не клените, занеже книги ветшаны, а ум молод, недошел».

У другой групе працаў Сапунова першае месца займае ёмкі том «Западная Двина» (Віцебск, 1893). Сам аўтар кваліфікаваў гэтую сваю працу як гістарычна-геаграфічную, а ў запраўднасьці яна нішто іншае, як энцыкляпэдыя Дзьвіны. Можа ўзьнікнуць пытаньне — ці заслугоўвае наагул Дзьвіна энцыкляпэдыі? Ці ня будзе гэткая тэма адбіткам павятовага патрыятызму? Пасьля гэтага варта прыгадаць фаліянты, прысьвечаныя рознымі народамі Дунаю й Райну, Волзе й Місісіпі, каб пераканацца, што рака, на якой стаіць Полацак — калыска беларускае дзяржаўнасьці, аб якой адзін з зацятых ворагаў гэтае дзяржаўнасьці — Іван Грозны — заўважыў: «У Дзьвіны дно залатое, а берагі серабраныя» — заслугоўвае найвялікшае ўвагі з боку беларус-

[1] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX вв. Менск, 1929. С. 272.

кіх навукоўцаў. Сапуноў падрабязна затрымаўся ня толькі на гісторыі самае Дзьвіны і ў геалягічным сэнсе і як старадаўнага воднага шляху, але й на гісторыі ўсіх гарадоў і мястэчкаў, што знаходзяцца ў ейным басэйне. Ён ня толькі грунтоўна асьветліў рэчышча самае Дзьвіны ад Вокаўскага Лесу да Балтыцкага мора з усімі ейнымі шматлікімі парогамі, абтокамі і нават паасобнымі валунамі, зь ейным вялікім спадам і хуткім бегам, але апісаў усе ейныя вялікія й малыя прытокі, ня мінаючы ручаёў. Шмат старонак займаюць такія разьдзелы, як флёра й фаўна Дзьвіны, гісторыя вадаплаўства на ёй, адлюстраваньне ракі ў фальклёры й мастацкай літаратуры розных народаў, а ў першую чаргу тых, што здаўна насяляюць Наддзьвіньне. Наагул у гэтай багата ілюстраванай, із шматлікімі мапамі, кнізе можна знайсьці ўсё аб Заходняй Дзвіне, пачынаючы ад заўвагі Гэрадота аб ёй у сваёй «Мэльпамэне» й канчаючы аналізам ейнае вады. У прадмове да «Западной Двины» Сапуноў выказвае ўдзячнасьць Мікалаю II, які даў на выданьне 500 рублёў, але калі ўлічыць, што сам аўтар выдаткаваў на ейнае выданьне 6000 рублёў з собскага цяжкога настаўніцкага заробку, дык «царская ласка» набывае зусім іншы калярыт[1].

Цяжка нават пералічыць усе тыя выданьні, якія ўваходзяць у склад трэцяе групы працаў Сапунова. Звычайна яны друкаваліся спачатку на старонках тагачаснае газэты «Витебские Губернские Ведомости» або ў «Памятных книгах Витебской губернии», а потым выходзілі, як адбітак, асобна. Паміж гэтымі выданьнямі варта адзначыць такія, як «Памятники времен древних и новейших в Витебской губернии» (Віцебск, 1903) «Белоруссия и белорусы» (Віцебск, 1910), «Двинские или Борисовы камни» (Віцебск, 1897), «Полоцкий Софийский собор» (Віцебск, 1888), «Чей прах покоится в нише Софийского собора?» (Віцебск, 1889), «Губернаторский дворец в г. Витебске» (Віцебск, 1901), «Местечко Усвят» (Віцебск, 1902) і г. д. Гэтыя кнігі адразу знаходзілі свайго чытача, але не ў самым губэрнскім чыноўніцкім Віцебску, а галоўна паміж вясковых настаўнікаў царкоўна-парафіяльных і земскіх школаў. Калі калескія рэгістратары, ня прыгадваючы ўжо больш буйных урадаўцаў — пераважна расейцаў — адмысло-

[1] Стукалич В. А. П. Сапунов. Віцебск, 1905.

ва перакіненых у Віцебск з Арлоўскае і Калускае губэрніяў, набывалі нумар «Витебских Губернских Ведомостей», каб пазнаёміцца з урадавымі паведамленнямі аб чарговых сьвяточных узнагародах, дык вясковыя настаўнікі ўлучалі ў свой аж занадта сьціплы бюджэт сталую выпіску на губэрнскую газэту, каб чытаць і перачытваць артыкулы й нарысы Сапунова ды іншых краяведаў. Зь імі Сапуноў меў сталае сяброўскае ліставаньне.

Усе шматлікія навуковыя працы Сапунова сустрэлі прыхільны водгук сярод тагачасных навукоўцаў. «Витебской Старине» прысьвяцілі вялікія цёплыя рэцэнзіі гэткія часапісы, як «Русская Старина» (сакавік 1884 г., люты 1889 г.), «Правительственный Вестник» (№ 225, 1896), «Исторический Вестник» (сакавік 1897 г.) і г. д. «Западную Двину» сустрэлі із захапленьнем ня толькі вышэй адзначаныя выданьні, але й пэрыядычная прэса Нямеччыны, Ангельшчыны, Францыі, Швэдыі, Данііі г. д. Яшчэ да рэвалюцыі Сапуноў быў абраны сябрам каля дваццацёх навуковых таварыстваў, паміж якімі варта прыгадаць: Брытанскае каралеўскае гістарычнае таварыства, Таварыства гісторыі і старажытнасьцяў расейскіх пры Маскоўскім унівэрсытэце, Маскоўскае археалягічнае Таварыства, Гістарычнае таварыства пры Пецярбурскім унівэрсытэце і г. д.

Пасьля рэвалюцыі Сапуноў быў абраны сябрам-карэспандэнтам Акадэміі Навук. Але — «Няма прарока на сваёй бацькаўшчыне», або — «Што добрае можа прыйсьці з Назарэту?».

Віцебск у часы, калі Сапуноў пачаў у ім сваю навуковую працу, зусім не надаваўся на тое, каб спрыяць гэтай працы. Характэрна, што ў 1881 г. віцебскае мясцовае начальства прадало зь віцебскіх архіваў у Рыгу, як макулятуру, 3000 пудоў старых дакумантаў 16—17 вв. і ахіў Полацкага паʼмесьніцтва да 1772 г. Пуд прадаваўся па 1 р. 18 к., і грошы былі скарыстаныя для ўзнагароды чыноўнікаў[1]. Гэты барбарскі ўчынак цалкам адпавядаў жыцьцю чыноўніцкае інтэлігенцыі губэрнскага гораду. Прынамсі, безнадзейна правінцыяльны «Виленский Вестник» з прычыны адкрыцьця ў Батанічным садзе кафэ-шантану патэтычна зазначае:

[1] Как у нас охраняются исторические документы // Исторический Вестник, 1885. Т. XIX. С. 461—462.

«У нас пачынаюць прывівацца свае адаліскі, свае альтымбанкі, свае шансанэтныя сьпявачкі. Дай Бог, каб гэтая эўрапейская навіна саслужыла грамадзянству эстэтычную службу[1]. І Даўнар-Запольскі, характарызуючы Сапунова, адзначае: «Правінцыяльны тагачасны горад суліў шмат спакусаў маладому вучонаму, і нялёгка было ўстояць, каб не загразнуць у правінцыяльнай твані. У той час чыноўніку нашага краю, які займаўся навукай ды яшчэ служыў па міністэрству асьветы, пагражала паніжэньне па службе або нават звальненьне. Працаваць пры гэтых умовах ужо было заслугай, і немалой»[2]. Аб тым-жа сьветчыць Стукаліч: «Першапачаткавыя імкненьні Сапунова абудзіць цікавасьць мясцовае інтэлігенцыі да мінулага й сучаснага становішча Беларусі дрэнна ўспрыймаліся мясцовым грамадзтвам; ягоную «Витебскую Старину» чыталі вельмі мала, а начальства глядзела на яе скоса, ніяк не згаджаючыся, каб падобнага роду праца пісалася безь якіх-колечы старонніх «внушений» і тэндэнцыяў»[3].

Віцебскія благія ўмовы зусім ня былі спэцыфічна віцебскімі або адмыслова на Сапунова пашыранымі. Тое-ж дасьветчылі ў тым-жа Віцебску Нікіфароўскі, Даўгяла, Стукаліч і інш., у Магілёве — Раманаў, у Смаленску — Дабравольскі і г. д. Паводля Шлюбскага: «Раманаў ніколі не знаходзіў у грамадзтве, а тым больш у ўладаў патрэбнага прызнаньня й патрэбнага падтрыманьня»[4]. Зразумела, чаму Раманаў, якога ня здужала ніякая «правінцыяльная твань», гэтак цёпла й шчыра вітаў у 1913 г. Беларускі навукова-літаратурны гурток студэнтаў Пецярбурскага ўнівэрсытэту словамі: «Добрыдзень, племя маладое, незнаёмае,— але роднае! З прыемным пачуцьцём атрымаў я прывітаньне вашае, браценьнікі. Узаемна жадаю ўсім вам як хутчэйшага выхаду на шлях дзеячоў. Жніва, бо шмат ёсьць!»[5] Нікіфароўскі, аўтар дзесяткаў навуковых працаў па беларускай этнаграфіі, вялікую няпрыемнасьць меў у сувязі з тым, што ў дзень нараджэньня Мікалая II прыйшоў

---

[1] Виленский Вестник. № 5, 1879.

[2] Стукалич В. А. П. Сапунов. Віцебск, 1905.

[3] Тамсама.

[4] Шлюбскі А. Этнаграфічная дзейнасць Е. Р. Раманава. Гісторыка-этнаграфічныя нататкі. Менск, 1928. С. 363.

[5] Тамсама. С. 341.

як настаўнік Віцебскае мужчынскае гімназыі ў катэдральны сабор на ўрачысты й абавязковы для ўсіх службоўцаў малебен у старым латаным гарнітуры. Справа дайшла да куратара Віленскае навучальнае акругі, пакуль нарэшце ня высьветлілася, што «титулярный советник Никифоровский» зусім не хацеў гэтым дэманстрацыйна зьняважыць цара, але проста ня меў іншага гарнітуру — бяз малага ўвесь свой заробак ён прызначаў для выданьня сваіх кнігаў. Тое-ж самае із сваім заробкам практыкаваў і Сапуноў. Такая практыка спрычынілася да вельмі нешчасьлівага сямейнага жыцьця. Прынамсі, калі пад старасьць сьляпы Сапуноў вобмацкам ішоў адзін па вуліцах, дык ён проста ня меў сваякоў, якія-б рупіліся аб ім, а сяброў і знаёмых ён сьведама не турбаваў.

У нарысе, прысьвечаным Сапунову, нельга сьведама або нясьведама абмінуць тую гістарычна-палітычную плынь, да якой ён належаў. Прайсьці паўз гэтае плыні — значыцца зусім не зразумець Сапунова, які хаця й правёў большую частку свайго жыцьця ў архівах, кнігасховах і за габінэтным сталом, але адначасна прымаў дзейны ўдзел у грамадзкім і палітычным жыцьці. Назва гэтае плыні, а менавіта — «Западно-руссизм» — ня прыемна ўспрыймаецца нашым вухам. Аднак, апрача фігуральных у дадзеным выпадку вушэй, што з прыемнасьцю або зь непрыемнасью ўспрыймаюць усе вакольныя гукі, ёсьць розум, здатны да аб'ектыўнага аналізу. Менавіта таму аўтар гэтага нарысу не бярэ на сябе ролі пракурора або адваката ў дачыненьні да гістарычна-палітычнае плыні, якая ў дадатак сталася ўжо здабыткам гісторыі. Ён абмяжоўваецца роляй сьледчага, паклікаючыся на шматлікіх сьведкаў і маючы права на свой выснаў. І разам з тым ён спадзяецца, што сам высокашаноўны чытач зробіць на падставе сабранага сьледчым матар'ялу належны справядліваму судзьдзі прысуд.

«Западно-руссизм» ніколі, а тым больш у часы Сапунова, ня быў суцэльнай аднамыснай плыняй. Ён выразна дзяліўся на два крылы. Правае крыло прадстаўлялі Саланевіч, Кавалюк, Кулакоўскі, Бажэлка, Пшчолка, Вруцэвіч, Караневіч і інш; у склад левага крыла можна залучыць Сапунова, Раманава, Нікіфароўскага, Даўнар-Запольскага, П. Баброўскага, Стукаліча ды інш. Калі правае крыло складалася з палітыканаў,

якія з падтрымкай царскага ўраду выдавалі газэты й часапісы: «Крестьянин», «Окраины России», «Северо-Западная Жизнь» і г. д., дык левае крыло складалася з навукоўцаў, якія друкаваліся амаль вылучна за свой кошт. Паміж гэтымі двума крыламі ўвесь час ішло змаганьне. «Западно-руссизм» правых зусім не супадаў з «западно-руссизмом» левых.

«Ня зьелі нас, беларусаў, раней, не зьядуць і цяпер!»[1] — гэтыя словы, што ў той час гучэлі, як лёзунг, належаць Нікіфароўскаму й адрасаваныя Кавалюку ў сувязі із зьдзекамі апошняга зь беларускае мовы. Раманаў у 1908 г. друкуе адчынены ліст А. Пшчолку, у якім зазначае: «У сваіх творах вы імкніцёся прышчапіць чужынцам пагарду да свайго-ж народу, аблiваеце памыямі сваю-ж бацькаўшчыну, якую замучылі злыя ворагі»[2]. Шмат пазьней паўтарылі тое-ж самае ў дачыненьні да Пшчолкі Лявон Гмырак і Максім Гарэцкі. Можа, яшчэ больш характэрны для Раманава «Плач Белорусской земли», які спачатку «Вибетские Губернские Ведомости» адмовіліся друкаваць на сваіх шпальтах, угледзеўшы ў ім сэпаратыстычныя тэндэнцыі, і аўтар выдаў гэты твор асобным выданьнем ананімна[3]. Прадстаўнік правага крыла Бажэлка на старонках «Крестьянина» зьмяшчае артыкул, накіраваны адначасна супраць «Нашай Нівы» й левага крыла, якому непасярэдна адрасаваны закід: «Здрайцы й прадаўцы свайго народу зь нібы вучоных нам добра вядомыя!»[4] Гэтую палеміку Сапуноў нібы не заўважаў. У ягоным габінэце паміж іншымі партрэтамі не выпадкова вісеў і партрэт Адама Кіркора, якога яшчэ ў 70-х гадох усяляк зьневажалі духовыя бацькі правага крыла «западно-руссизма» К. Гаворскі і М. Каяловіч — тыя самыя, што паводля іхных-жа вернападаных словаў у кажную мясцовую справу «вбивали русский гвоздь»[5]. Аднак, памінаючы палеміку з правым крылом, Сапуноў пайшоў шмат далей за сваіх сябраў па левым крыле.

---

[1] Стукалич В. Н. Я. Никифоровский // Записки Сев.-зап. отдела Географ. Общества. 1900. Кн. 1. С. 144.

[2] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Менск. С. 321.

[3] Шлюбскі А. Этнаграфічная дзейнасьць Е. Р. Раманава. Менск, 1928. С. 342.

[4] Нашай Ниве // Крестьянин. Менск, 1909. № 29.

[5] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм» С. 235.

26 кастрычніка 1910 г., чытаючы ў Віцебскай Архіўнай Камісіі рэфэрат на тэму «Белоруссия и белорусы», які знайшоў водгук далёка па-за сьценамі таго пакою, дзе ён чытаўся, Сапуноў сказаў: «Я заклікаю Беларусь да самавызначэньня, да нацыянальнага ўсьведамленьня, да адроджанае будучыні, якая будзе ў руках самых беларусаў»[1]. Ён скончыў гэты свой рэфэрат прыгожым патрыятычным вершам Янкі Няслухоўскага. Сапунову пашэньціла крануць прыгаданае ў рэфэраце пытаньне з найбольшае трыбуны Расейскае імпэрыі — у 3-й Дзяржаўнай думе. Пасьля разгону царызмам 2-е Думы і закону аб зьмене выбараў у 3-ю Думу ў яе абіраліся дэпутаты паводля прынцыпу — «Чаго жадаеце-с?». Таму зь 9 дэпутатаў Віцебскае губэрні восем за ўвесь час існаваньня 3-е Думы не сказалі ніводнага слова, але затое зусім накш паводзіўся дзевяты — Сапуноў, які трапіў у Думу, дзякуючы падтрымцы вясковых настаўнікаў. З тае самае трыбуны, зь якое Сталыпін 27 красавіка 1911 г. крычэў: «Заходні край ёсьць і будзе краем рускім назаўсёды, навекі!»[2], Сапуноў сказаў: «Усе, нават самыя нязначныя народнасьці, імкнуцца цяпер да самавызначэньня; за імі ўсе прызнаюць права на гэта. Толькі адна народнасьць, народнасьць беларуская, ня сьмее й думаць аб гэтым»[3]. З тае-ж самае трыбуны ў сувязі з заявай дэпутата Дзяржаўнага Савету Корвін-Мілеўскага, што палякі здаўна й дагэтуль маюць права на рэпрэзантацыю жыхароў беларускіх губэрняў, Сапуноў у сваёй адказнай прамове заўважыў: «Залічаць да палякоў беларусаў-каталікоў толькі таму, што яны каталікі,— звычайнае этнаграфічнае грабежніцтва»[4]. Дарэчы, варта зазначыць, што гутарка тут якраз аб тым «рэпрэзантанце» беларусаў Корвін-Мілеўскім, які калісь у вузейшым коле шчыра выказаўся: «Няшчасьце маё, што мне давялося прадстаўляць у Дзяржаўным Савеце варты пагарды беларускі дэмас»[5].

---

[1] Сапуноў А. Белоруссия и белорусы. Віцебск. 1910.
[2] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». С. 303.
[3] Сапуноў А. Речи в Государственной Думе 3-го созыва. СПБ, 1912. С. 37.
[4] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». С. 177.
[5] Навіна Антон. Да пытаньня аб нацыянальных адносінах у Беларусі і Літве // Маладая Беларусь. Сэрыя I, зшытак 2. СПБ. 1912. С. 13.

Часам здавалася, што Сапунову, Раманаву, Нікіфароўскаму ды іншым досыць было зрабіць толькі адзін крок, каб пакінуць левае крыло «Западно-руссизма» і ўлучыцца ў беларускі нацыянальна-вызвольны рух, але зрабіць гэты адзін крок яны былі ня ў стане. Трапна зазначае аб іх А. Цьвікевіч: «Любячы этнаграфічную Беларусь, вывучаючы беларускі фальклёр, яны не маглі ня цешыцца з узьнікненьня ў краі беларускай літаратуры, не маглі не адчуваць ейнае прыгажосьці, сьвежасьці й блізкасьці да народу. Яны не маглі ісьці сьледам за панамі Бажэлкамі, Кавалюкамі й Саланевічамі ў ганьбаваньні беларускага нацыянальнага слова й «Нашае Нівы»[1]. Зусім правільна асьвятляе іхную ролю П. Крэчэўскі: «Пачэсныя імёны мясцовых гісторыкаў і этнографаў, што будзілі думку аб Беларусі,— Сапунова, Стукаліча, Нікіфароўскага, Даўгялы, Раманава ды іншых яскрава гавораць аб тым захапленьні, якое выклікала беларуская нацыя як старэйшая й найбольш чыстая галіна славянства ў навуковых колах»[2]. Добрым словам успамінае аб іх і М. Гарэцкі: «Зьбіраючы й парадкуючы матар'ял, надта важны для нармальнага разьвіцьця пісанага слова, яны сьведама ці нясьведама зрабілі нязрушным той грунт, на каторым расла навейшая беларуская літаратура»[3]. Паводля догмаў «марксызму-ленінізму» паставіўся да іх «дыялектычна-матэрыялістычны» акадэмік В. Шчарбакоў, зазначыўшы ў сваім нязграбным нават з боку формы абвінавачаньні: «Нездарма менавіта яны стварылі раскрытую слаўным НКВД змову супроць савецкай улады, зьяўляючыся агентамі, шпіёнамі й правакатарамі польскіх, нямецкіх ды іншых краін імпэрыялістаў, фашыстаў, рука аб руку працуючы з нацыянал-фашыстамі Заходняй Беларусі»[4]. Далей канкрэтызуючы гэтае «яны», ён складае ўсеабдымны, агульны для жывых і памерлых сьпіс, у які ўваходзяць — Сапуноў, Любаўскі,

---

[1] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». 1929. С. 330.

[2] Крэчэўскі П. Беларусь у мінулым і сучасным // Замежная Беларусь. Зборнік гісторыі, культуры і эканомікі. Кніжка першая. Прага, 1926. С. 49

[3] Гарэцкі Максім. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1924. С. 131.

[4] Шчарбакоў В., акад., др. Нарыс гісторыі Беларусі. Частка І. Інстытут гісторыі імя М. Н. Пакроўскага пры Беларускай акадэміі навук. Менск, 1934. С. 14.

Лаппа, Карскі, Ластоўскі, Цьвікевіч, Ігнатоўскі, Турук, Даўнар-Запольскі, Пічэта ды інш. Між іншым, В. Шчарбакоў, пэўне-ж, не здагадваўся, што праз некаторы час «слаўнае НКВД» далучыць да гэтага сьпісу й яго. І, можа, лепш за ўсіх схарактарызаваў дзейнасьць сваю й сваіх сябраў сам Сапуноў у вышэй прыгаданай лекцыі, прачытанай ім студэнтам Віцебскага Архэалягічнага інстытуту. Ці ён думаў тады, што ягоныя слобы аб Альгердавым Шляху набываюць сымбалічнае значаньне для ўсяго левага крыла «западно-руссизма»? Яны, старыя, перамагаючы розныя перашкоды, дайшлі ў пошуках Альгердавага Шляху — Шляху Вольнае й Незалежнае Беларусі да... Глыбокага. Яны, старыя, ня сумняваліся ў тым, што гэты Шлях ідзе далей да Вільні — да старадаўняе слаўнае сталіцы Вялікае Літвы-Беларусі. Аднак яны ўжо ня ў стане былі знайсьці гэты Шлях і пераказалі ягоныя пошукі беларускай патрыятычнай моладзі.

У савецкія часы Сапуноў больш нічога не стварыў. Ваенны камунізм і архэалёгія не супадалі. І хоць Акадэмія Навук надала Сапунову годнасьць сябра-карэспандэнта, але гэта да нічога не абавязвала тутэйшых камуністаў: У віцебскай газэце «Заря Запада» пачынаюць яго абвінавачваць у тым, што некаторыя акты з «Витебской Старины» — зброя ў руках антысэмітаў, пасьля прыгадваюць 500 рублёў, ахвяраваных царом на «Западную Двину», нарэшце, абураюцца з тае прычыны, што ў 3-й Думе ён не салідарызаваўся зь левымі партыямі, і гэтак без канца. Сапуноў прабаваў пратэставаць, але ягоныя лісты рэдакцыя не зьмяшчала. Нарэшце Віцебскі гарсавет пазбавіў яго акадэмічнае харчовае нормы, што ў тыя галодныя гады адчувалася асабліва балюча. Сапуноў больш ня скардзіўся. Усё бліжэй і бліжэй набліжаліся два канцы — турма й сьмерць. Аднак Сапуноў застаецца Сапуновым. У ягоных зьмястоўных лекцыях не адбіваецца савецкая рэчаіснасьць, але затое зь ейнае прычыны сам прафэсар хістаецца ад сталага недаяданьня. Студэнты няўпрыцям для сьляпога кладуць яму ў часе лекцыі ў кішэні ягонага старога пальта кавалак хлеба, колькі бульбінаў — больш у іх нічога няма. Тыя-ж студэнты на просьбу Сапунова пасыпаюць у ягоным садку дарожкі скуранымі абрэзкамі. Пах гэтых абрэзкаў нагадвае іхнаму прафэсару, што канчае сваё жыцьцё, пачатак гэтага

жыццця. І вось 2 кастрычніка 1924 г. прыходзіць сьмерць. Яшчэ ў лютым 1919 г. Чака расстраляла Стукаліча. У студзені 1921 г. памірае ў Стаўропалі галоднай сьмерцяй Раманаў. Той-жа голад прысьпешыў сьмерць Сапунова. Савецкія газэты адгукнуліся на ягоную сьмерць кароткімі зацемкамі ў колькі радкоў і ніводная зь іх не прысьвяціла яму нэкралёгу. Яго пахавалі на Трайчонкавых могілках ля дзьвярэй ахутанае лягендамі царкоўкі, ведамае ў народзе пад паэтычным назовам «Белае Тройцы». Несьлі труну й ішлі за ёй толькі ягоныя студэнты — будучыя нацдэмы, якім ён — былы «западно-русс» — пераказаў у спадчыне пошукі Альгердавага Шляху.

5-7 верасьня 1952 г., ЗША

«Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва».
№ 1, 1953

УЛАДЗІМЕР СЯДУРА

ПЁТРА МІРАНОВІЧ

1. Прыгажосьць роднага краю

У восені 1952 году мінулі 50-я ўгодкі нарадзінаў і 30-я ўгодкі мастацкай дзейнасьці беларускага мастака-маляра Пётры Мірановіча. Прызнаньне ягонага малярскага таленту было свайго часу сьцьверджанае ня толькі беларускай крытыкай, але й латыскімі мастацтваведамі ў Рызе, дзе 30 год таму ён пачаў свой шлях мастака.

Малярская творчасць Пётры Мірановіча мае для нас асаблівую вартасьць яшчэ й таму, што мастак не пайшоў лёгка-зводным шляхам адмаўленьня ад нацыянальных сваеасаблівасьцяў свайго мастацтва. Ён не паддаўся модзе космапалітычных пошукаў, хоць, пэўна-ж, можна аддаваць даніну й новым шляхом у мастацтве, знаходзіць гармонію й суладнасьць і ў наскрозь абстрактных нарамаджаньнях плямаў.

Усё-ж нам даражэй і прыямней пабачыць на абразе ня пляму, а кавалак нашае запраўднае бацькаўшчыны, адлюстраванай праз настрой і душу мастака-лірыка, якім якраз і ёсьць Мірановіч. Сёй-той з эмігрантаў перахоўвае некаторыя рэчы, вывезеныя з бацькаўшчыны. Яны для кажнага найдаражэйшыя памяткі, напаміны пра пакінуты край. Тым большае, ужо ня толькі асабістае, а ўсеагульнае значаньне маюць для нашай эміграцыі мастацкія абразы, прывезеныя ў Амэрыку Мірановічам. Яны абуджаюць у кажным з нас салодскія ўспаміны, стоячы перад імі, мы нібы зноў пераносімся на родныя палі й сенажаці, лясы й азёры. Мы бачым зноў, як жывуць і працуюць нашыя людзі, якія засяляюць нашыя вёскі й мястэчкі і перахоўваюць нашыя нацыянальныя асаблівасьці. Гэтак малярская творчасьць мастака-эмігранта становіцца фактарам, што спрыяе

захаваньню нашае культурна-нацыянальнае самабытнасьці ў сьвеце.

Можна бясконца доўга ўглядацца ў Міpановічавы абразы прыроды й людзей і з кажнай часінай усё глыбей і глыбей адчуваць адвечную прыгажосьць роднага краю. І тады на вусны, самі празь сябе, прыходзяць словы Янкі Купалы, гэтым разам ужо больш асэнсаваныя, глыбака адчутыя й зразумелыя:

Ня шукай ты шчасьця, долі
На чужым далёкім полі,
Гэй, за шумным лесам-борам,
За шырокім сінім морам
Ня шукай ты шчасьця, долі.
Ты ўсё знойдзеш гэта блізка
Там, дзе маці над калыскай
Табе песьні напявала,
Як малога калыхала,
Толькі ўмей шукаці блізка!

І мастак Пётра Мірановіч умеў шукаць прыгажосьць на родных палетках, знаходзіць яе й мастацка выяўляць на сваіх палотнах.

2. Прыход у мастацтва

Пётра Мірановіч, як ужо прыгадвалася,— належыць да мастакоў, якія не паддаліся модным уплывам і захавалі сваю мастацкую самабытнасьць. Мірановіч вучыўся колькі гадоў у Рыскай Акадэміі Мастацтваў, у акадэміка Кугі і прафэсара Эліяся. Маладзейшыя латыскія мастакі знаходзіліся пад уплывам заходніх мастацкіх школаў. На нашага мастака яны ня мелі істотнага ўплыву. Гэта было толькі творчае асяродзьдзе студыі, у якім фармальна дапамагалі вызначыцца кірунку Мірановічавае творчасьці — маляваньню абразоў з жыцьця беларускае вёскі. Ужо ў першых абразох-кампазыцыях 1935—1936 гг., як «Навальніца ў сенакос», «Жніво», «Над Дзьвіною» ды інш.,— Мірановіч паказаў сябе самабытным арыгінальным маляром беларускіх вясковых матываў. Гэта была новая тэматыка, гэтак не падобная да тае, што панавала ў Акадэміі. Новымі былі ягоныя абразы й паводле формы выкананьня. Калі латыскія мастакі ў Акадэміі захапляліся рознымі моднымі ў малярстве «ізмамі», дык Мірановіч узяў курс на выразны рэалізм, праўдзівае адлюстраваньне жыцьця. Але ён ня спыніўся на існуючых формах рэалістыч-

нага мастацтва, а ўзьняўся вышэй іх. Не адмаўляючыся ад галоўнага прынцыпу рэалістычнае плыні ў мастацтве — праўдзівасьці й паўніні адлюстраванага жыцьця, ён надаў сваім абразом яшчэ больш хварбнасьці тым, што выкарыстаў імпрэсіяністычны прынцып чысьціні хварбы. Ад гэтага ягоныя абразы асабліва сьвежыя й зыркія.

Калі ў Акадэміі пабачылі самастойныя Міхановічавы працы, яго дапусьцілі й да працы дыплёмнае. Гэтак мастак піша адразу аж дзьве — «Жніво» й «Сьнеданьне ў беларускай хаце», і абедзьве прымаюцца. Асабліва высокую ацэну мела дыплёмная праца «Сьнеданьне ў беларускай хаце». Яна была прынята аднагалосна. Запраўды, гэта й да сяньня шэдэўр Міхановічавае, ды й наагул беларускае, малярскае творчасьці. Ніводзін мастак у нас яшчэ не паказаў гэтак праўдзіва штодзённае жыцьцё ў сялянскай вясковай хаце. Звычайныя часаныя драўляныя сьцены, печ, акно, лавы, хатнія прылады, разьвешаныя на сьценах. На пярэднім пляне зьлева жанчына ў хустцы сядзіць на нізкім зэдліку й абірае бульбу. У цэнтры гаспадыня, яна запынілася каля засланага абрусом стала із збанком малака. Бліжэй да покуці — хлопчык за сталом каля міскі. Справа, збоку на тапчане сядзіць у шапцы гаспадар і дакурвае люльку. Ягоны твар здраджвае гаспадарскія клопаты й навагу ўстаць ды ісьці зноў працаваць каля гаспадаркі. Ува ўсіх тыпова беларускія спрацаваныя сялянскія твары. Нездарма прафэсары на ўрачыстым паседжаньні адзначылі прыход у мастацтва новага для іх народу — беларускага, іншага й ад расейскага і ад польскага (праф. Дэніс). Гэта, бязумоўна, перамога мастака-беларуса. За гэтую працу ў 1937 г. Пётра Міхановіч атрымаў дыплём вольнага мастака-маляра. Ад таго часу мастак намаляваў шмат новых абразоў зь беларускага жыцьця.

3. Краявід і чалавек

Пётра Міхановіч выявіў сябе маляром розных жанраў: жанравых кампазыцыяў, бытавых абразоў, партрэтаў, мініятураў, графічных зарысовак і г. д. Але найбольш выдатна выявіўся Міхановічаў мастацкі талент, мінаючы бытавыя абразы беларускае вёскі, у ягоных краявідах. Як пэйзажыст беларускай прыроды, Міха-

новіч дагэтуль ці мае сабе роўнага. У ягоных абразох беларускі краявід жыве й пераліваецца ўсёю сваёю шматхварбнасьцяй, нібы сагрэты людзкім пачуцьцём ды ізь любасьцяй перададзены палатну, ён працягвае сваё існаваньне ў новым мастацкім аспэкце. Тое, на што мастак глядзеў у далёкія гады маленства, устае цяпер праз празрыстае паэтычнае шкло. Жыцьцё ў месьце не дае нагоды дзень-у-дзень наглядаць прыроду. Мастак перакідае ўвагу на беспасярэднія дзіцячыя ўражаньні мінулага, калі ягонае ўспрыняцьце навакольнага сьвету ня было яшчэ скрыўленае ўмоўнасьцямі грамадзкага жыцьця й калі на чыстую, як габляваная дошка, дзіцячую душу клаліся прыгожыя, прасяклыя паэзіяй абразы беларускай прыроды. З гэтае скарбніцы дзіцячых уражаньняў мастак чэрпае цяпер сюжэты для мастацкае творчасьці. Ён прыгадвае загоны, дрэвы, рэчкі, хаты й палі, дубровы ды паплавы, і яны ўяўляюцца яму ў нейкім казачным сьвятле. З успамінаў маленства ўзьніклі «Навальніца ў сенакос», «Жніво» ды іншыя абразы. З успамінаў далёкага маленства, калі хлапчуком ён бегаў на Дзьвіну і там дражніў зь берагу плытагонаў на ганкох, гэтак званых цахуноў ці сячкоў,— узьнік выдатны абраз «На Дзьвіне». Гэтак, паводле ўспамінаў, апрацоўваюцца і ўсе вясковыя краявіды Мірановіча. Тут, мабыць, дзейнічае агульна ведамае ў мастацтве сьцьверджаньне, што добрыя рэчы творацца тады, калі пра іх згадваем з моцным сумам, тугой па нязбытным. Ведама, напр., што выдатныя абразы лета мастакі тварылі ўзімку, а зімовыя абразы — улетку, калі наймацней тужыць чалавек па мінулай пары году. Мабыць, гэты патас тугі дапамагаў і нашаму мастаку надаць згаданым абразом прыроды гэтулькі жыцьцёвасьці й паэзіі, гэтулькі каляровае разнастайнасьці.

Найбольш удаюцца Мірановічу хварбы восені й вясны — гэтых найбольш багатых колерамі пораў году («Раньняя вясна» ды інш.). Але й жоўтая восень, паказаная ў Мірановіча жыцьцёвымі мамэнтамі, ня выклікае сумных настрояў. У краявідзе «Даўгое возера» ўдала спалучаныя жоўтыя хварбы замірaньня ў прыродзе (бярозкі) із зырка-зялёнымі хварбамі руні. Колеры азіміны на тым баку возера добра гарманізуюць з восеньскімі тонамі й ствараюць бадзёры настрой, адчуваньне жыцьця нават напярэдадні зімы. Жыцьцё

не замірае,— нібы прамаўляе абраз,— будзе яшчэ чалавек і жыць, і цешыцца.

Як-бы ў суладнасьці з гэтым сьветлым аптымістычным тонам, у абразох-краявідах Мірановіча шмат сьвятла й прасторы. З гэтага гледзішча вылучаецца абраз «Рака Дзьвіна». Бяскрайні прастор воднае роўнядзі, далёкія бязьмежныя берагі Дзьвіны, залітыя зыркім сонцам, ад якога кажны каменьчык на беразе й прыбярэжным дне зіхаціць адбітым сьвятлом, лёгкія празрыста-бялявыя хмаркі, што прасьвечваюцца да далёкага далягляду,— усё нібы сьмяецца ад ущехі й асалоды, дарма што самога сонца ня відаць... Заліты сонцам, пакідаючы за сабою цень, засявае родны загон Мірановічаў «Сейбіт». Відаць, любіць мастак сьветлыя хварбы. Яны пануюць на шмат якіх ягоных краявідах. Сьветлымі, быццам серабрыстымі, выглядаюць пожня й жытнёвыя бабкі ў «Жніве», адлюстроўваецца сонца на хмарах у «Навальніцы ў сенакос», падчыркваючы тыповы для летняе буры пераходны нядоўгі момант перад дажджом.

Мірановічаў краявід рэдка бывае бязь людзей. Часьцей ён сагрэты прысутнасьцяй чалавека, пераважна чалавека за працай — сейбіта за сяўбой («Сяўба на хутары»), коньніка-хлопчыка на вадапоі («Дзьвіна»), касцоў на ўборцы сена («Навальніца ў сенакос»). Нават вясковыя жанчыны ў «Першай зіме на хутары» спыніліся адно на часінку пагутарыць у перапынку між працаю, бо адна зь вёдрамі вады, а іншая — з кошыкам. Мірановічавы пэрсанажы — людзі чыну, працы, дзеі. Таму пэйзаж ягоны набывае дзейны й бадзёры характар. Гэта мастацтва здаровых і простых людзей беларускае працоўнае вёскі. І гэта-ж паўстрымвала Мірановіча ад насьледаваньняў розных модных плыняў. Ягонае мастацтва самабытнае, здаровае й моцнае ў самой сваёй існасьці, бо карэньні ягоныя ў беларускай вёсцы.

4. Нараджэньне кампазыцыяў

Апрача вялікае ролі беспасярэдніх уражаньняў маленства на працэс узьнікненьня абразоў маюць вялікі ўплыў сталыя студыі натуры прыроды. Мастак павінен штодня рабіць замалёўкі прыроды. Перш чымся пачаць працу над вялікай кампазыцыяй, мастак звы-

чайна прысьвячае шмат часу й працы сотням, а нават тысячам папярэдніх накідаў. Не заўсёды яны робяцца ў сьведамасьці пэўных кампазыцыйных задумаў, часам яны адно самамэта. І толькі пасьля творчае ўяўленьне мастака спалучае іх аднэю ідэяй, а іхныя асобныя элемэнты ў адзін сабраны, абагулены абраз.

Латыскі мастак-пэйзажыст Пурвіт сыстэматычна вывучае прыроду — вясну, восень, сьнег, дрэвы, сонечнае сьвятло і г. д. Выдатнейшы беларускі пэйзажыст у Менску Мікола Дучыц не прапушчае ніводнага дня, каб ня выйсьці за горад ці ў парк, дзе ён штодня малюе прыроду. Гэтак працуюць усе вялікія мастакі. Таму й дасягаюць яны пасьля ў вялікіх кампазыцыях выдатных удачаў.

Гэтак працуе й Мірановіч. Ягоныя кампазыцыі ўзьнікаюць з маленькіх накідаў, што рабіліся яшчэ некалі, да вайны. Цяпер, калі мастак ня мае беспасярэдняе лучнасьці зь беларускай вёскай і прыродай, гэтыя старыя замалёўкі часам адзінае, што дае яму матар'ял для працы. Але раней, калі мастак меў магчымасьці часта студыяваць натуру, ён шмат папрацаваў над некаторымі тэмамі. Ягоныя абразы «Навальніца ў сенакос», «Даўгое возера», «Дзьвіна» ды інш.— вынік вялізарнае папярэдняе працы над вялікай колькасьцяй эскізаў. У сваім імкненьні даць нешта закончанае, сваё ён рабіў правільна, калі не распыляўся на безьліч тэмаў, а сканцэнтраваў сваю мастацкую ўвагу на абраных, асабліва ўлюбёных і дарагіх. Гэтым толькі ён дасягнуў свомай яму выразнасьці й дасьпеласьці.

5. Этнаграфізм і мастацкасьць

Мастака асабліва цікавіць беларуская вёска. Ён, праўда, ужо мала што зь яе засьпеў, бо ў Лацьвіі з 1926 г. адбыўся пераход на хутары. Але раней беларуская вёска й там мела свой асобны стыль і твар, які вырозьніваў яе ад расейскага ці ўкраінскага сяла.

Пётру Мірановіча беларуская вёска цікавіць і ў будны і ў сьвяточны дзень, бо кажны зь іх надае ёй свае адмены й прывабнасьць. Але, як заўсёды, і вёска даецца Мірановічам зь людзьмі за працай ці адпачынкам. Вось абразы першае групы, казаў той, працоў-

нае: «Выраз гною», «Мыцьцё бялізны», успомненыя ўжо вышэй «Вадапой», «Жніво», «Сейбіт» і «Сьнеданьне ў хаце». Кажны зь іх трапна падае той ці іншы момант працоўнага жыцьця вёскі і ў хаце з усімі ейнымі асаблівасьцямі, і па-за хатай.

А вось абраз «Хата» на тэму сьвяточнае вёскі. У зыркім сонечным сьвятле тыповыя беларускія хаты. Сьветларожавыя хварбы на ўсім абразе даюць адчуваньне сьвяточнага настрою. На вуліцы сядзяць асобна мужчыны, відаць, за паважнейшаю гутаркай, а асобна жанчыны ў сьвяточнай вопратцы. Вуліца па-сьвяточнаму замеценая й упрыгожаная зяленівам. Побач хатаў — гародчыкі з чырвонымі макамі ды іншымі краскамі. Гаспадыні нібы стараюцца адна перад адной мець лепшы кветнік у гэткіх гародчыках — тыповая зьява для беларускае вёскі ў Латгаліі.

Ад усяго гэтага гарбатыя саламяныя стрэхі й шэрыя хаты набываюць гэтаксама нейкую асаблівую сьвяточнасьць колераў і ўдала лучацца з настроем у агульнай кампазыцыйнай суладнасьці. Усё разам творыць абраз тыпова беларускае вёскі із сваім асаблівым стылем. Але заслугай мастака ёсьць тое, што этнаграфізм тут не самамэта. Наагул ён ня сушыць вобразнасьці й ня выпірае з арганічнае мастацкае цэласьці Мірановічавых кампазыцыяў пабочным элемэнтам. Ён сам ператварыўся ў адзін з мастацкіх кампанэнтаў і толькі ўзбагачае зьмястоўнасьць ягоных абразоў, удала спалучаючы этнаграфічны мамэнт з мастацкасьцяй і служачы мэтам праўдзівага мастацкага паказу беларускае вёскі ды ейнанага жыхарства. Гэтак і само мастацтва праз этнаграфічнасьць становіцца народным у поўным разуменьні гэтага слова.

6. Мірановіч — партрэтыст

Шмат маляваў Пётра Мірановіч і партрэтаў. У яго й жаноцкі, і мужчынскі, і вясковы, і гарадзкі партрэтны тыпаж. Маляваў ён партрэты сваіх рыскіх знаёмых і беларускіх дзеячоў (прыкладам, крыху ідэалізаваны партрэт К. Езавітава і праўдзіва рэальны партрэт Галіны Езавітавай, партрэт паэта Алеся Салаўя і партрэт літаратара й навукоўца Ул. Глыбіннага, а гэтаксама надта падобны партрэт беларускага дзеяча ў Рызе Сяргея Сахарава з унукам ды інш.). Рэальнае

падабенства — галоўны прынцып Мірановіча як партрэтыста. З гэтае катэгорыі працаў мастака вылучаюцца тонкасьцяй выкананьня і ўдалай мастацкай перадачай рысаў твару ды характару партрэты маладое жанчыны й беларускага інтэлігента. Гэта запраўдныя пэрлы ягонага партрэтнага мастацтва. Пэўныя ўдачы дасягненыя і ў партрэце маладога мужчыны, а таксама падвойным аўтапартрэце мастака.

Цікава таксама адзначыць перанясеньне Мірановічам партрэтнага прынцыпу ў кампазыцыі й агульныя абразы. Гэтак, тыповая беларуская жанчына — жняя за полуднем каля жытняе капы — нішто іншае, як партрэт самое маці нашага мастака.

У іншым абразе — «Жняя» — скарыстаны запраўдны твар аднае маладое, сьветлавалосае й здаровае ў сваёй лучнасьці з прыродаю й працаю сялянкі-жняі.

Надта тыповы як селянін-беларус і бацька мастака. На ягоным партрэце добра перададзеныя рысы й маршчакі старога спрацаванага твару і, побач з гэтым, свомая беларусу нейкая мяккасьць, задумённасьць і чалавечая дабрыня.

Бясспрэчна, і ў гэтым жанры Мірановіч праявіў сябе добрым маляром, з аднаго боку, на тыпажы сялянскім, як больш яму блізкім і зразумелым, а з другога боку — інтэлігенцкім, дзе ён паказаў сябе высокакультурным і праніклівым мастаком.

Варта прыгадаць і тое, што тэхніка маляваньня партрэтаў адзначаецца ў Мірановіча сьмеласьцяй і ўпэўненасьцяй валоданьня пэндзлем, вольным і лёгкім карыстаньнем вуглём у папярэдніх накідах контураў натуры й хуткасьцяй працягу сэансу пазаваньня. Гэта адзнакі запраўднага малярскага таленту.

7. Венская акадэмія

У 1944—1945 гг., жывучы ў Вене — асяродзьдзі мастацкіх шуканьняў і розных школаў,— мастак наведваў Акадэмію мастацтва па клясе малярства. Пэўна-ж, гэта нешта дадало да ягонага знаёмства із заходнеэўрапейскімі кірункамі й тэхнікай у малярстве. Аднак нельга сказаць, каб гэта паклала нейкі сьлед на ўжо выраблены кірунак Мірановічавае творчасьці. Працы гэтага пэрыяду нічым асабліва не вылучаюцца з агульнае ягонае творчасьці. Партрэт аўстрыйскае жанчыны,

як і ранейшыя партрэты,— выразісты ды экспрэсійны. Колькі краявідаў венскага пэрыяду напісаныя ў тымжа імпрэсіяністычным стылі зь перавагаю сьвежых, сьветлых хварбаў да сьведама падчыркненай гульнёй сьветлаценяў.

Нягледзячы на шырокі беспасярэдні сутык з сучасным заходняэўрапейскім мастацтвам, Пётра Мірановіч застаўся й надалей мастаком беларускае прыроды, людзей і працы. Гэткім ён увойдзе і ў гісторыю беларускага ды сусьветнага мастацтва.

«Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва».
№ 1, 1953

Н. ПАЛОНСКАЯ-ВАСІЛЕНКА

ДАЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ

Зацемкі да біяграфіі[1]

Сярод навуковых і грамадзкіх дзеячоў Беларусі ды Украіны першае чвэрці XX стагодзьдзя адно з выдатнейшых месцаў належыцца Мітрафану Даўнар-Запольскаму. Нягледзячы на тое, што ён пакінуў вялікі сьлед у навуцы й культуры, адно апошнім часам у прэсе пачалі зьяўляцца прысьвечаныя яму артыкулы — першы праф. Б. Крупніцкага ў «Украіне»[2], другі — А. Саковіч у «Ведзе»[3]. Артыкул Крупніцкага толькі пабежна кранаецца кароткага працягу часу, калі аўтар быў студэнтам Кіеўскага ўнівэрсытэту. Артыкул А. Саковіч — большы й дакладнейшы — прысьвечаны пераважна пары дзейнасьці праф. Даўнар-Запольскага ў Беларусі. Таму я хачу спрабаваць дакінуць некаторыя зьвесткі зь біяграфіі М. Даўнар-Запольскага.

Мітрафан Даўнар-Запольскі нарадзіўся ў 1867 годзе ў м. Рэчыцы Мазырскага павету, у сям'і дробнага ўрадаўца. Малым дзіцём ён пераехаў з бацькамі й рэштаю сям'і ў Мозыр, дзе бацька ягоны неўзабаве памёр. Маці засталася зь пяцярма дзецьмі (трыма дочкамі й двума сынамі) у вялікай нястачы. Калі старэйшая сястра М. Даўнар-Запольскага — Аляксандра — выйшла замуж і пераехала з мужам у Баранавічы, яна ўзяла малодшага

[1] Зьмяшчаем тут у перакладзе з украінскай мовы прысланыя для «Запісаў» цікавыя ведамкі зь біяграфіі нашага выдатнага гісторыка Мітрафана Даўнар-Запольскага пяра прафэсара Кіеўскага ўнівэрсытэту Н. Палонскай-Васіленка, якая была вучаніцаю Даўнар-Запольскага й доўгія гады блізкаю ягонаю навуковаю супрацоўніцаю.

[2] Б. Крупніцкі. З студентських спогадів історика. Київ, Україна, № 6. Парыж, 1951.

[3] А. Саковіч. Прафэсар Даўнар-Запольскі // Веда, № 7, 1952.

брата Мітрафана да сябе. Шчыра кажучы, ён з маленства пазбаўлены быў якога-колечы кіраўніцтва й рана пачаў зарабляць на пражыцьцё лекцыямі.

Даўнар-Запольскі вучыўся самперш у гарадзкой школе, а пасьля ў прагімназіі. Будучы яшчэ вельмі маладым, ён пачаў захапляцца этнаграфіяй Беларусі, запісваў казкі, песьні. А. Саковіч падае дату — 1887 г.— калі беларуская моладзь, з Даўнар-Запольскім на чале, згуртавалася была вакол газэты «Минский Листок» і пачала зьмяшчаць у газэце свае артыкулы з гісторыі ды этнаграфіі Беларусі. У 1888 г. М. Даўнар-Запольскі выдае «Северо-Западный календарь» з артыкуламі з гісторыі Беларусі. Частка гэтых артыкулаў была перавыданая аўтарам у 1909 г. у асобным зборніку[1].

Навуковыя зацікаўленьні, што захапляюць маладога дасьледніка, цесна вяжуцца з абуджэньнем у ім нацыянальнае сьведамасьці, жаданьнем культурнага й нацыянальнага адраджэньня беларускага народу. Маючы 17 год, ён ужо вандруе па беларускіх вёсках, запісвае народныя песьні й казкі ды вывучае жыцьцё й палажэньне свайго роднага народу. Вандруючы гэтак, ён бачыў і ўсе злыбяды тагачаснага беларускага жыцьця, і гэта штурхала яго насустрач рэвалюцыйным ідэям. Не магу дакладна сказаць, да якое арганізацыі належаў Даўнар-Запольскі, але думаю, што да аднае з тых, што набліжаліся да ідэяў «Народнае Волі». Прыналежнасьць ягоная была выяўленая, і ён быў пазбаўлены магчымасьці скончыць сярэднюю школу. Шмат пазьней, калі меў ужо больш 20 год, ён атрымаў, аднак, дазвол скласьці экзамен «сьпеласьці» ў кіеўскай гімназіі, а тады — запісацца на ўнівэрсытэт Сьв. Валадзімера.

У гэтую пару яму было ўжо 22 гады, тады, калі іншыя канчалі ўнівэрсытэцкія студыі, але ён пачынаў унівэрсытэцкую навуку як дасьпелы навуковы дасьледнік, што меў ці мала друкаваных працаў і навуковае імя.

Гістарычна-філялягічны факультэт унівэрсытэту Сьв. Валадзімера ў 1880-х гадох перажываў пару свайго красаваньня. Славаю ягонаю былі прафэсары І. В. Лучыцкі (навейшая гісторыя Зах. Эўропы), І. І.

---

[1] Исследования и статьи. Киев, 1908. Т. 1.

Фартынскі (сярэднявечча), М. М. Бубноў (чытаў самперш старадаўную гісторыю), М. П. Дашкевіч (гісторыя літаратуры) і, найвыдатнейшы з усіх,— В. Б. Антановіч. Даўнар-Запольскі адразу быў прыняты ў ягоны сэмінар і ўлучыўся ў кола выдатных вучняў Антановіча. Лепшыя вучні Антановіча атрымлівалі ад яго заданьні апрацаваць гісторыю нейкага раёну Украіны X—XIV стст. (П. Галубоўскі ды Д. Багалій — гісторыю Северскай зямлі, П. Іваноў ды А. Андрыяшаў — Валынскай, М. Грушэўскі — Кіеўскай і г. д.). Даўнар-Запольскі падаў «Очерк по истории кривичской и дреговичской земель до конца XII ст.». За гэтую працу ён атрымаў залаты мэдаль.

Скончыўшы ўнівэрсытэт, Даўнар-Запольскі застаўся пры ім дзеля падрыхтоўкі да прафэсуры й неўзабаве быў высланы ўнівэрсытэтам у Маскву, каб, працуючы ў архівах, мець магчымасьць падрыхтавацца да магістэрскай ды дакторскай дысэртацыяў.

Адначасна ён ня кідаў і беларускай этнаграфіі, зьмяшчаючы шэраг каштоўных працаў у «Этнографическом Обозрении» за 1890—1899 гады. Ён наведваў Беларусь, працаваў у архіве гр. Храптовіча-Буценева.

Гады, пражытыя Даўнар-Запольскім у Маскве, былі нязвычайна плодныя з навуковага гледзішча. Ён з захапленьнем працаваў у архівах над пытаньнямі з гісторыі Беларусі пары Літоўскага Гаспадарства. У 1897 г. ён надрукаваў «Документы Московского Архива Министерства Юстиции», т. 1 (Дакумэнты Літоўскай Мэтрыкі), «Польско-Литовская Уния на сеймах до 1569 года» (Масква, 1898), «К истории поземельной реформы в Ливонии 1580—1582 г.» (Масква, 1899) ды іншыя. Гэтыя досьледы далі маладому навукоўцу выдатнае месца сярод спэцыялістаў гісторыі Літоўскае Русі.

У 1898 годзе ён быў выбраны рэдактарам «Трудов» — часапісу, заснаванага зъ ягонае-ж ініцыятывы Археаграфічнай Камісіяй «Императорского Русского Археологического Общества». У 1900 годзе быў надрукаваны 1 т. ягоных «Акты Литовского Государства». У гэтымжа часе ён працаваў і над сваёю капітальнаю працаю «Государственное хозяйство Великого Княжества Литовского при Ягеллонах», якая была выданая ў Кіеве ў 1901 годзе.

Навуковая праца Даўнар-Запольскага злучалася з пэдагагічнай. Даўнар-Запольскі выкладаў гісторыю ў жаночых гімназіях і здабыў шырокую папулярнасьць як таленавіты пэдагог. Як дапаможнік для навучаньня гісторыі, пад ягонай рэдакцыяй была надрукаваная «Книга для чтения по русской истории», т. 1 — Киевская Русь. У гэтай кнізе былі зьмешчаныя працы выдатных вучоных, і яна мела вялікую ўдачу.

У 1898 годзе пасьля магістэрскіх іспытаў Даўнар-Запольскі быў выбраны прыват-дацэнтам Маскоўскага ўнівэрсытэту. Ягоныя лекцыі карысталіся вялікім зацікаўленьнем слухачоў. У 1902 годзе ён абараніў дысэртацыю на ступень магістра ў Кіеўскім унівэрсытэце Сьв. Валадзімера на тэму «Дзяржаўная гаспадарка Вялікага Княста Літоўскага за Ягелёнаў». Абарона мела вылучную ўдачу, Даўнар-Запольскі быў выбраны прафэсарам і зноўкі пераехаў у Кіеў.

У 1905 годзе ён абараніў дакторскую дысэртацыю «Очерки по организации зап. русского крестьянства в XVI ст.».

На працягу ўсяго гэтага часу Даўнар-Запольскі студыяваў, побач з гісторыяй Беларусі, і гісторыю дэкабрыстаў, выкарыстоўваючы тое, што сталіся даступнымі для досьледаў тайныя архівы. Ягоныя лекцыі, якія ён чытаў у Маскоўскім унівэрсытэце аб дэкабрыстах, здабылі яму вялікую папулярнасць. Леў Талстой, які хацеў скончыць свой раман «Декабристы», зьвярнуўся да Даўнар-Запольскага па параду, запрашаў яго да Яснай Паляны, і Даўнар-Запольскі быў у гэтую пару частым гасьцём у хаце Талстых у Хамоўніках.

Лекцыі з гісторыі дэкабрыстаў прычыніліся да вялізарнае ягонае ўдачы ў Кіеве. Вялікая актавая заля ўнівэрсытэту не магла зьмясьціць усіх, хто жадаў пачуць новыя весткі аб дэкабрыстах, а аўтару была створаная ці, лепш кажучы, адноўленая апінія «неблагонадежного», рэвалюцыянера, чаго ён ня мог пазбыцца на працягу ўсіх год, пражытых ім у Кіеве, і што, часткава, спрычынілася й да трагічных у ягоным жыцьці падзеяў 1917 году.

Наагул, і студэнты й прафэсары ў Кіеве ставіліся да праф. Даўнар-Запольскага зусім па-рознаму. У студэнтаў ён меў вялікую папулярнасць. Ягоныя лекцыі, а асабліва сэмінары, на якіх ён вывучаў пераважна

акты юрыдычнага характару — Рускую Праўду, умовы, граматы, Літоўскі Стутут ды Маскоўскія Судзебнікі,— надзілі студэнтаў. У 1903 г. Даўнар-Запольскі заснаваў «Гістарычна-Этнаграфічны Гурток» пры ўнівэрсытэце, сябрамі якога былі студэнты й «стыпэндыяты» — так звaліся тыя, што скончылі ўнівэрсытэт і былі пакіненыя пры ім дзеля падрыхтоўкі да прафэсуры. Былі сябрамі гуртка й дацэнты й нават прафэсары. На чале гуртка стаяў Даўнар-Запольскі, сакратаром быў хтосьці з студэнтаў, выбраны сябрамі гуртка. У гуртку чыталіся даклады, вяліся ажыўленыя дыскусіі. Працы друкаваліся ў «Университетских Известиях» і штогод выходзілі асобным зборнікам. Усяго выйшла 10 кніжак.

Даўнар-Запольскі ўмеў даваць сабе раду з студэнтамі. Ён захоўваў у дачыненьнях зь імі паставу старэйшага, блізкага сябра, цікавіўся справамі моладзі, дапамагаў студэнтам выходзіць на навуковы шлях, ніколі не шкадаваў часу на кансультацыі, на парады, дазваляў ім карыстаць з свае багатае бібліятэкі, спрыяў самастойнай працы, выпрабляў субсыдыі на навуковыя выезды ў архівы Масквы, Харкава, Кацярынаслаўлю, Адэсы й г. д. Наагул, на гістарычна-філялягічным факультэце Кіеўскага ўнівэрсытэту былі два выдатныя прафэсары — сябры моладзі, якія мелі найбольш вучняў і дапамагалі ім у іхнай навуковай працы,— гісторык М. Даўнар-Запольскі й філёляг ды гісторык літаратуры — В. Пэрэтц.

Штосуботы да Даўнар-Запольскага ў хату прыходзілі студэнты дзеля шырэйшага абмеркаваньня паасобных навуковых працаў, а таксама дзеля гутаркаў на навуковыя тэмы наагул. Тых, што здраджвалі здольнасці, ён пакідаў у сябе на вечар, калі да яго зыходзіліся пэдагогі, прафэсары. Гэтак студэнты ўцягваліся ў навуковыя зацікаўленьні, удзельнічалі ў абмеркаваньні навінкаў навукі, літаратуры, у няпрымушаных гутарках пры шклянцы гарбаты.

З вучняў Даўнар-Запольскага шмат хто асягнуў паважныя становішчы. Былі гэта — Г. Максімовіч, прафэсар Ніжынскага й Сымфэропальскага пэдагагічных інстытутаў, Д. Дарашэнка, прафэсар шэрагу ўкраінскіх унівэрсытэтаў, прэзыдэнт Украінскае вольнае акадэміі навук, П. Смірноў, Е. Сташэўскі, Мірза-Авакіянц, Палонская-Васіленка — усе прафэсары Кіеўскага ўні-

вэрсытэту, Б. Курц — праф. Камэрцыйнага інстытуту, В. Базылевіч — праф. Археалягічнага інстытуту, П. Курынны й В. Крупніцкі — праф. Украінскага вольнага ўнівэрсытэту ў Мюнхэне, А. Аглоблін — праф. Кіеўскага і Ўкраінскага вольнага ўнівэрсытэтаў ды шмат іншых. Усе пералічаныя навукоўцы працавалі ў галіне ўкраінскае гісторыі. З вывучэньнем гісторыі Беларусі на Кіеўскім унівэрсытэце справа была горшая, але ўсё-ткі колькі студэнтаў над ёю працавалі, між імі — П. Кліменка, які, на жаль, рана загінуў для навукі.

Рэвалюцыя 1905 году спрыяла росту папулярнасці Даўнара-Запольскага сярод студэнтаў. У 1905 годзе ён з групаю паступовае прафэсуры закладае ў Кіеве вышэйшыя жаночыя курсы. Узначальваў курсы праф. Пэрэтц, сакратаром быў М. Даўнар-Запольскі. Але з прычыны непаразуменьняў з прафэсураю ён пакінуў курсы ў 1906 годзе. У гэтым годзе ў Кіеве былі адчыненыя Дзяржаўныя вышэйшыя жаночыя курсы, дзе ён атрымаў катэдру. Тады-ж ён заснаваў Вышэйшыя камэрцыйныя курсы, якія былі неўзабаве ператвораныя ў Камэрцыйны інстытут. Гэты інстытут стаўся найбольш улюбёным творам Даўнар-Запольскага. Пабудаваны ён быў на іншых падставах, чымся ўнівэрсытэт: перадусім ён быў падпарадкаваны Міністэрству Гандлю й Прамысловасці, дзе начальства ставілася больш лібэральна да моладзі, чымся Міністэрства народнае асьветы, асабліва з часоў міністра Кассо. З другога боку, і нутраная арганізацыя інстытуту была апрычоная: яна была пабудаваная на грамадзкіх асновах. Інстытутам кіравала Рада з прадстаўнікоў гандлёвых і прамысловых арганізацыяў. Супольна з радаю прафэсароў Рада гэтая выбірала дырэктара. Аж да 1917 году дырэктарам інстытуту быў Даўнар-Запольскі. Падтрымка мясцовых гандлёва-прамысловых дзеячоў забяспечвала інстытуту матар'яльную й маральную незалежнасьць ад міністэрства й нязвычайна хуткі расьцьвет. У 1907 годзе інстытут мясьціўся ў маленькім дамку, у 1917 годзе — ён быў собсьнікам паловы кварталу (Несьцераўская, Бібікаўскі бульвар, Пірагоўская) шматпаверхавых будынкаў зь вялізнымі залямі, аўдыторыямі, багатаю бібліятэкай і адзіным на ўсю Ўкраіну гандлёва-прамысловым музэем. Штогод музэй высылаў сваіх прадстаўнікоў у замежжа дзеля азнаямленьня з пастаноўкаю

справы, здабыванне экспанатаў і г. д. Апрача гэтага, ён меў вялікую колькасць карэспандэнтаў з усіх куткоў сьвету. Гэта вельмі пашырала папулярнасць інстытуту.

У складзе студэнтаў унівэрсытэту й інстытуту была даволі вялікая розьніца: у інстытуце пераважалі асобы, якія скончылі камэрцыйныя школы й духоўныя сэмінарыі. Было шмат жыдоў, таму што сьпярша тут ня было працэнтнае нормы, было таксама ці мала жанчынаў. Студэнты карысталіся шырэйшымі, чымся ў унівэрсытэтах, правамі: апрача звычайных «зямляцтваў», студэнты мелі сваіх прадстаўнікоў у радзе прафэсароў.

Была розьніца і ў складзе прафэсароў: шырокая аўтаномія, якою яны карысталіся, дазваляла выкладаць у інстытуце тым палітычна «ненадзейным», перад якімі былі зачыненыя дзьверы ўнівэрсытэтаў, як, прыкладам, ведамы статыстык Русаў.

Кіеўскі Камэрцыйны інстытут (другі на ўсю Расейскую імпэрыю быў у Маскве) заняў вельмі паважнае месца сярод высокіх школаў. Але прыгаданы ягоны расьцьвет, які трэба было заўдзячваць галоўна адміністрацыйным здольнасьцям ды энэргіі Даўнар-Запольскага, спрычыніўся й да вялікіх для яго прыкрасьцяў, бо кансэрватыўная частка прафэсуры ўнівэрсытэту ставіліся варожа да парадкаў, якія панавалі ў інстытуце, абвінавачваючы Даўнар-Запольскага ў «неблагонадежности», у рэвалюцыйнай прапагандзе й г. д.

І запраўды, побач з ростам папулярнасьці Даўнар-Запольскага сярод моладзі, расло варожае стаўленьне да яго з боку кансэрватыўных і рэакцыйных колаў акадэмічных дзеячоў. Гэты недавер да яго нэгатыўна адбіваўся на палажэньні ягоных вучняў, якім куратары школьных акругаў шмат дзе не давалі пасадаў у дзяржаўных сярэдніх школах Кіева, ды вельмі неахвоча зацьвярджалі пэдагогамі нават у прыватныя школы. Гэтыя дачыненьні зырка адбіваліся на прыкладзе найстарэйшага Навуковага таварыства летапісца Нэстара пры ўнівэрсытэце Сьв. Валадзімера. Не зважаючы на тое, што праф. Даўнар-Запольскі меў катэдру прафэсара «русской истории», яго ніколі ня выбіралі ў прэзыдыюм таварыства, і калі ў 1912 ці 1913 годзе старшыня таварыства паведаміў аб сваёй адмове кіраваць далей таварыствам,— на выбары сабраліся ўсе рэакцыйныя

сябры, якія звычайна ніколі не наведвалі паседжаньняў, адно з мэтаю не дапусьціць да выбараў Даўнар-Запольскага на старшыню. Дачакаўся гэтага гонару ён толькі аж у 1918 годзе.

У 1910 г. Даўнар-Запольскі заснаваў Таварыства «Любителей социальных знаний», якое складалася з колькіх сэкцыяў: гістарычнай, пэдагагічнай і праўнай. Сябрамі ягонымі былі пераважна выдатныя навуковыя дзеячы — як, напр., В. Шчарбіна, адзін з найстарэйшых гісторыкаў Кіева, М. Істомін, А. Русаў, М. Васіленка й акадэмічная моладзь, стыпэндыяты, вучні Даўнар-Запольскага. У прыраўнаньні да паседжаньняў таварыства летапісца Нэстара паседжаньні «Таварыства Любіцеляў» мелі жвавейшы й больш сучасны характар. Даклады выклікалі гарачыя дыскусіі й прыцягвалі вялікую аўдыторыю. Да новага Таварыства й да новага старшыні кансэрватыўныя колы ставіліся варожа. Непакоіла іх ня гэтак сама дзейнасьць Таварыства, як ягоны назоў, і прысутнасьць паліцыі сталася блізу абавязкавай на кажным паседжаньні — чаго, ведама, ня было ў «Нэстары».

Успомню тут адно з гэткіх паседжаньняў. Адбывалася яно ў 1911 г. у вялікай залі й было прысьвечанае 50-м угодкам вызваленьня сялян з-пад прыгону. Згодна з загадам губэрнатара на паседжаньні быў прысутны маладзенькі «ўрадавец для адмысловых даручэньняў» Тальбэрг, які толькі кагадзе скончыў быў ліцэй. З дакладамі выступалі салідныя спэцыялісты — сам Даўнар-Запольскі, М. Васіленка, П. Сьмірноў... Аднак гэта не перашкаджала Тальбэргу перапыняць раз-па-разе даклады заявамі, што «ён гэтага ня ведаў», і ў канцы зачыніць паседжаньне. Тое самае паўтарылася, праўда ня ў гэткай грубой форме, на дакладзе ведамай дасьледніцы масонства Т. Сакалоўскай. Усе гэтыя драбніцы стваралі каля імя Даўнар-Запольскага нейкае ўражаньне палітычнае ненадзейнасьці, няпэўнасьці, уражаньне небясьпекі для тых, хто быў зь ім у бліжэйшых дачыненьнях. Зь іншага боку, скрайныя левыя элемэнты пашыралі чуткі аб ягоным пераходзе «направа».

Трэба сказаць, што ў Камэрцыйным інстытуце зусім ня ўсё йшло добра. Калі справа стала на пэўны грунт, калі інстытут стаўся собсьнікам вялікіх будынкаў, каштоўных музэяў ды бібліятэкаў, шмат хто з прафэса-

роў уголас заяўлялі, што немагчымая справа, каб Даўнар-Запольскі быў «нязьменным» ягоным дырэктарам, і, каб маглі, вельмі ахвоча зьнялі-б яго з пасады. Ягоная ўдача, а таксама й частая нетактоўнасць ды рэзкасьць не здабывалі яму сымпатыі з боку прафэсуры. Наўзьверх — шырылася нездаваленьне й сярод студэнтаў-габрэяў. У іншых вышэйшых школах для габрэяў існавала норма — ня больш 5 % агульнага ліку студэнтаў, але гэтыя 5% мелі права жыць у Кіеве. Камэрцыйны інстытут не даваў гэтага права, колькасць студэнтаў-габрэяў ня была ў ім абмежаваная, але студэнты гэтыя не маглі жыць у Кіеве. З гэтае прычыны яны дамагаліся, каб інстытуту былі наданыя правы дзяржаўнае школы, ня ўлічаючы, што, разам з гэтымі правамі, у інстытуце будзе ўведзеная й працэнтная норма.

У 1912 годзе ўправа інстытуту мусіла пагадзіцца на дамаганьні студэнтаў. Міністэрства дало інстытуту правы, але ўсьлед увяло й працэнтную норму. Праўда, яна была тутка вышэйшая, чымся ў унівэрсытэтах, а галоўнае, было дазволена рабіць выпускныя экзамены колькі раз на год, што давала магчымасьць прапушчаць праз інстытут большую колькасць габрэяў, чымся было зазначана ў афіцыйнай норме. Але нездаваленьне не паменшала: тыя-ж габрэі, што дамагаліся правоў, — вялі цяпер агітацыю супроць Даўнар-Запольскага за ўвядзеньне нормы, хоць яна была непазьбеглая пры наданьні правоў. Усё гэтае атручвала жыцьцё Даўнар-Запольскага й выклікала жаданьне пакінуць Кіеў. Ён хацеў пераехаць у Маскву, дзе яго надзілі багатыя архівы, рабіў стараньні атрымаць пасаду дырэктара архіву Міністэрства Юстыцыі, але міністар Шчаглавітаў адмовіў яму ў гэтым, тлумачачы адмову палітычнай няпэўнасьцяй Даўнар-Запольскага.

Гэткія былі ўмовы жыцьця Даўнар-Запольскага перад першаю сусветнаю вайною. Трэба сказаць, што не зважаючы на прыкрасьці й турботы, ён на працягу ўсіх гэтых год ня спыняў сваёй навуковай працы. Ён выдаў тры кнігі, прысьвечаныя дэкабрыстам[1], «Материалы для истории крепостного права в России» (Кіеў, 1905), «Украинские староства в первой половине XVI ст.»

[1] Тайное общество декабристов. Москва, 1906; Идеалы декабристов. Москва, 1906; Мемуары декабристов. Москва, 1907.

(Кіеў, 1908), «Баркулабовская летопись», (Масква, 1909), «Исследования и статьи» (Кіеў, 1909), «Из истории обществ. течений в России» (Кіеў, 1910), «Белорусское Полесье. Пинчуки», т. I; «На заре крестьянской свободы» (Кіеў, 1911), «История русского народного хозяйства», т. I (Кіеў, 1911; вельмі каштоўны курс, пабудаваны на матар'ялах археалёгіі), «Обзор новейшей русской истории», т. I. (Кіеў, 1912) ды шэраг каштоўных артыкулаў у выданьнях Сыціна, як: «Великая реформа», «Отечественная война», «Масонство в прошлом и настоящем» ды інш. У 1910—1914 гадох пад ягонай рэдакцыяй выйшлі тры тамы «Русской истории в очерках и статьях» — калектыўная праца, даведзеная да XVIII стагодзьдзя. Апошнія тры тамы не паспелі выйсьці з друку й загінулі ў рукапісах. У 1910—1914 г. выйшаў пад рэдакцыяй Даўнар-Запольскага «Историко-культурный атлас по русской истории» Н. Палонскай.

Сусьветная вайна й эвакуацыя Кіева ў 1915 годзе спынілі навуковую працу. Унівэрсытэт і Камэрцыйны інстытут былі эвакуаваныя ў Саратаў. Давялося жыць з дня на дзень як на этапе. Бібліятэкаў ня выймалі з скрыняў, навуковая праца стала блізу немагчымай. Аднак Даўнар-Запольскі ня губляў надзеі, энэргіі ды бадзёрасьці. Калі вярнуўся ў Кіеў у 1916 годзе, ён прывёз два гатовыя, апрацаваныя ў Сарататве, праекты інстытутаў — геаграфічнага й археалягічнага. Абодва праекты былі рэалізаваныя ў 1917 годзе. Пасьля рэвалюцыі дырэктарам інстытуту геаграфіі быў выбраны праф. К. Воблы, Інстытуту археалёгіі — М. Даўнар-Запольскі.

Рэвалюцыя 1917 году прынесла Даўнар-Запольскаму й усім, хто ведаў яго раней, вялікую неспадзеўку. Група студэнтаў-бальшавікоў захапіла Камэрцыйны інстытут, паклала пячаткі на габінэт дырэктара, пашчыняла сэйфы, забараніла дырэктару наведваць інстытут і, наўзьверх,— наладзіла над ім, у ягонай адсутнасьці, суд, у якім узялі ўдзел студэнты й нават некаторыя прафэсары. Паміж іншымі абвінавачваньнямі Даўнар-Запольскага вінавацілі і ў тым, што ён паўстрымліваў стараньні ў справе наданьня правоў інстытуту й... увёў норму для жыдоў. Але галоўным пунктам абвінавачаньня была перапіска прафэсара з губэрнатарам у справе прысутнасьці паліцыі ў інстыту-

це, што даўно было заведзенае ў універсытэце, але ня было яшчэ практыкаванае ў інстытуце. Акт абвінавачаньня й прысуд былі пераданыя ў «Совет солдатских и рабочих депутатов», і сябром Даўнар-Запольскага толькі зь вялікімі цяжкасьцямі ўдалося абараніць прафэсара.

Справа гэтая напалохала акадэмічныя колы. Даўнар-Запольскага ўважалі дагэтуль за скрайнага левага й меркавалі, што з рэвалюцыяй ён займе нейкую высокую пасаду. Цяпер-жа, калі шмат даўнейшых «правых» прызналіся ў сваіх рэвалюцыйных пераканьнях, справа Даўнар-Запольскага выклікала злую радасьць ворагаў.

Ягонае цяжкое палажэньне ўскладнялася яшчэ й сямейнымі абставінамі.

Эвакуацыя ў Саратаў мела трагічныя вынікі для Даўнара-Запольскага. Ён быў жанаты з Н. Зайфэрт. Іхнае сямейнае жыцьцё ня было шчасьлівае дзеля надта вялікай розьніцы ў характарах. Даўнар-Запольская была прыгожаю жанчынай, якая любіла таварыскае жыцьцё й іграла значную ролю ў дабрадзейных таварыствах Кіева, бываючы на ўсіх балёх і сходах. Даўнар-Запольскія мелі двох сыноў і дачку. У часе эвакуацыі Даўнар-Запольская засталася зь дзецьмі ў Кіеве. Калі М. Даўнар-Запольскі вярнуўся, ён пабачыў, што ў часе ягонае адсутнасьці абодвы сыны — хлапцы год 16—18 — выйшлі з-пад ягонага ўплыву і сталіся актыўнымі сябрамі падпольнай бальшавіцкай арганізацыі пад кіраўніцтвам В. Затоньскага, асыстэнта Кіеўскай палітэхнікі й блізкага зь сям'ёю прыяцеля сп-ні Даўнар-Запольскай. Свае-ж сыны абзывалі на мітынгах бацьку «рэакцыянэрам», «чарнасоценцам», «ворагам пралетарыяту» ды інш., і цярпець гэта Даўнар-Запольскаму было вельмі цяжка. Абодвы юнакі, асабліва старэйшы, Усевалад, займалі паважныя пазыцыі ў партыі. Увесну 1919 году малодшы хлапец, Вячаслаў, памёр на тыфус, а ў пачатках 1920 году й старэйшы быў забіты паўстанцамі.

Іхняе імя было ўвечненае ў Кіеве ў назове вуліцы й партыйнае школы Даўнар-Запольскіх. Насьмешкаю лёсу гэтак была названая даўнейшая II клясычная гімназія, дзе праф. Даўнар-Запольскі складаў калісьці экстэрнам экзамены. Дарэчы будзе ўспомніць, што ў Кіеве было ці мала людзей, якія думалі, што гэтая

школа мелася ўслаўляць якраз імя самога М. Даўнар-Запольскага.

Усё вышэй успомненае рабіла палажэньне Даўнар-Запольскага вельмі цяжкім. У сьнежні 1919 году, калі да Кіева ізноў набліжаліся бальшавікі, ён пакінуў места й паехаў у Навачаркаск, дзе жылі ў той час ягоная сястра ды дачка й дзе ён маніўся працягваць пачатую раней перапіску зь дзеячамі Сымфэропалю й прафэсарамі Кіева ў справе заснаваньня ў Сымфэропалі ўнівэрсытэту. Неўзабаве гэта й сталася на аснове плянаў, складзеных камісіяй пад ягоным старшынством, і некаторыя кіеўскія прафэсары пераехалі ў Сымфэропаль.

Але Даўнар-Запольскаму не пашэньціла. У дарозе ён захварэў, адбіўся ад сваіх спадарожнікаў і заместо Навачаркаску апынуўся ў канцы ў Керчы, куды празь нейкі час прыйшлі бальшавікі. Даўнар-Запольскага арыштавалі й прывязьлі ў Харкаўскую Чака на суд. Дзякуючы спруту ды энэргіі прыяцеляў, ён быў, аднак, вызвалены й выехаў у Азэрбайджан, на катэдру гісторыі Бакінскага ўнівэрсытэту.

У 1925 годзе М. Даўнар-Запольскі быў запрошаны Беларускім дзяржаўным унівэрсытэтам і Інстытутам беларускае культуры ў Менск. Здавалася, ён атрымаў нарэшце магчымасьць працаваць для свайго народу й распрацоўваць сваю й ягоную гісторыю. У артыкуле А. Саковіч гэты пэрыяд жыцьця Даўнар-Запольскага апісаны вельмі добра. На жаль, трываў ён толькі паўтара году.

У 1926 годзе ён мусіў назаўсёды разьвітацца з бацькаўшчынай і пераехаць у Маскву. Тамака ён ня быў гэткі небясьпечны для бальшавіцкага ўраду, як у Менску, дзе за параўнальна вельмі кароткі час ён зрабіў гэтак шмат і для беларускае культуры й для навукі[1].

Апошні пэрыяд жыцьця М. Даўнар-Запольскага быў, шчыра кажучы, парою дажыванья. Ён выкладаў у высокіх школах Масквы, працягваў навуковую працу, але не друкаваў блізу нічога. У 1928 годзе выйшла ў сьвет «Экономическая география СССР» пад рэдакцыяй

[1] У 1919 г. ён надрукаваў «Асновы дзяржаўнасьці Беларусі»; у 1925 г.— «Цэнтралізацыя ці фэдэрацыя». Менск, Полымя, № VIII; у 1927 г.— «Народная гаспадарка Беларусі», Менск.

М. Вольфа й Г. Мегуса. У ёй М. Даўнар-Запольскі даў разьдзел «Западный район».

Але тое, што было зьместам ягонага жыцьця — праца на дабро й славу свайго беларускага народу,— адыйшло назаўсёды. Загінула ў 1926 г. і напісаная ім у Менску «Гісторыя Беларусі», загінула й большая частка ягонае вялізарнейшае бібліятэкі, частку якое — 11 000 тамоў — ён падараваў Інстытуту беларускай культуры, пакідаючы Менск назаўсёды. Але цяпер ён меў маральнае падтрыманьне ў свае жонкі Надзеі Маркелаўны, якая ў свой час, калі ён сядзеў у Чака ў Харкаве, шмат у чым яму дапамагла.

«Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва».
№ 1, 1953

КВЕТКА ВІТАН[1]

«НАША НІВА» І ІВАН ЛУЦКЕВІЧ

Толькі я памятаю, на зьяўленьне ў продажы газэты «Нашай Нівы» вілянчукі мала ўзялі ўвагі. Шмат зь іх казалі з пагардай: «От, хлопска газэта». Але з часам яна, хоць і «хлопска», знайшла зацікаўленьне сярод інтэлігенцыі, як польскай, так і расейскай. Некаторыя з палякоў глядзелі на гэта як на «хлопоманство» і выяўленьне краёвага патрыятызму ды казалі, што прыпамінала гэта Яна Чачота зь ягонай працай «Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny». Але бальшыня віленскіх палякоў-шавіністаў глядзела на зьяўленьне беларускай прэсы варожа, бо гэта падрывала палянізацыю беларускага сялянства. А расейцы пабачылі ў беларускай прэсе праявы сэпаратызму, што перашкаджала русыфікацыі гэтага краю.

Такія пагляды я чула сярод знаёмых, калі, пачынаючы ад 1907 году, прыяжджала зь Пецярбурга, з Вышэйшых жаночых курсаў, дахаты на сьвяты й вакацыі. Мы часта спрачаліся на гэту тэму, бо як студэнтка філялёгіі я трымалася таго пагляду, што народ выяўляе свае здольнасьці й творыць найлепш у сваёй роднай мове. А што цяпер яшчэ мова гэтая мае адзнакі мовы «мужыцкай», дык гэта зьява часовая, калі над мовай гэтай папрацаваць, яна станецца такой жа «панскай», як і іншыя мовы. Гэтым я злавала польскіх і расейскіх шавіністаў, бо наагул не прызнавала неталеранцыі што да іншай веры ці нацыянальнасці. Гэтак я прызнавала беларускаму адраджэнскаму, руху raison d'êtr[2],

[1] Псэўданім Юльяны Мэнке, нарэчанай Івана Луцкевіча (пазьней — спадарыні Дубейкаўскай).

[2] Права на існаваньне *(франц.)*.

але бліжэйшага сутыку зь ягонымі прадстаўнікамі яшчэ ня мела. Цётка, якую я знала з гімназіі, вярнулася ў Вільню, калі я была на курсах, дзеля гэтага мы й не спаткаліся. У часе вакацыяў я была занятая хатнімі справамі нашай вялікай сям'і, а ў Пецярбурзе знала толькі сваю навуку.

Калі я на пачатку лета 1915 году (быў другі год вайны) пазнаёмілася зь Іванам Луцкевічам, дык зацікавілася ім ня толькі як чалавекам, але й ягонымі ідэаламі й працай, у якой я пасьля ўзяла жывы ўдзел. «Наша Ніва» тады яшчэ выходзіла, але я ў ейнай рэдакцыі ня бывала, ды шмат каго зь ейных калішніх працаўнікоў там ня было ўжо, яны былі пакліканы ў армію або выехалі зь Вільні дзеля ваенных падзеяў і пагрозы ня́мецкай акупацыі.

Актыўны ўдзел у працы «Беларускага камітэту дапамогі пацярпелым» я пачала толькі пасьля прыходу ў Вільню нямецкага войска і таму магла пазнаёміцца толькі з тымі супрацоўнікамі «Нашай Нівы», што засталіся ў Вільні: братамі Луцкевічамі, Вацлавам Ластоўскім ды зноў спаткалася зь Цёткай. З Аляксандрам Уласавам, мастаком Язэпам Драздовічам і праф. Вацлавам Іваноўскім я пазнаёмілася ў 1919 г., калі яны вярнуліся ў Вільню.

Аб газэце «Нашай Ніве», ейнай ідэялёгіі й фінансавых справах апавядаў мне Іван Луцкевіч. Утрыманьне газэты ляжала вылучна на ягоных плячох. (Падаю тут тое, што апавядаў мне сам Іван Луцкевіч.) Па заканчэньні сваіх архэалягічных студыяў у Вене Іван Луцкевіч варочаецца ў Пецярбург, дзе студыюе права. Але, калі па рэвалюцыі 1905 году была скасаваная забарона беларускага друку ды паўсталі магчымасьці пашырэньня беларускае працы ў краі, Іван Луцкевіч, як і ягоны брат Антон перапыняюць сваю навуку й настала перабіраюцца ў Вільню. (Антон Луцкевіч быў студэнтам унівэрсытэту ў Дорпаце — цяпер Тарту ў Эстоніі, студыяваў прыродаведу.)

Па сьмерці бацькі, калі браты Луцкевічы канчалі гімназію, на іхную долю прыпала невялікая спадчына па бацьку, што дала ім магчымасьць вучыцца далей, але яшчэ будучы студэнтамі яны часта давалі грошы на беларускую справу. Калі-ж яны перабраліся ў Вільню, дык арганізацыя беларускай працы, асабліва-ж друку, неўзабаве праглынула рэшту іхнае спадчыны, і,

каб не дапусьціць да заняпаду гэтае працы, трэба было шукаць новых сродкаў.

Параўнальна невялікая група беларусаў, што станавіла фактычны актыў беларускага руху ў Вільні, была бедная й грошай на справу даць не магла. Апрача братоў Луцкевічаў, што былі фактычнымі рэдактарамі «Нашае Нівы», да гэтае групы належалі: Аляксандр Уласаў — афіцыйны рэдактар «Нашае Нівы», Янка Купала, Ядвігін Ш., Вацлаў Ластоўскі, А. Чыж, Сяргей Палуян (памёр у 1910 г.), мастак Язэп Драздовіч ды яшчэ некалькі асобаў. Гэта былі маладыя ідэялісты, поўныя запалу й энэргіі ў працы на адраджэньне Беларусі. Грошай яны ня мелі. Мусілі ня толькі дарма працаваць у газэце ці на іншых дзялянках беларускага руху, але й часам выціскаць із сваіх мізэрных заработкаў для гэтага руху. Адзін А. Уласаў быў замажнейшы, бо меў хвальварак Мігаўку пад Радашкавічамі, але з гэтага хвальварку ён мусіў жыць сам, бо іншых прыбыткаў ня меў. Аднак, працуючы ў газэце разам з братамі Луцкевічамі, ён памагаў аплачваць кватэру для ўсяго штабу «Нашае Нівы». Мы бачылі, як грамадзтва Вільні, фактычна чужое, ставілася да «Нашае Нівы», дык ясна, што хоць і заможнае, але падтрымаць гэтую газэту яно не хацела. Выняткам быў Зыгмунт Нагродзкі (собсьнік складу ралейных машынаў — сябра Францішка Багушэвіча), які часамі даваў хоць невялікае падтрыманьне. Бальшыня-ж вілянчукоў глядзела на беларускі рух як на нешта варожае або недарэчнае.

Гэтак нашаніўцы мусілі лічыць толькі на свае собскія сілы.

«Наша Ніва» — асабліва спачатку — мела мала платных падпішчыкаў, на вёску высылалася пераважна дарма, а ў самой Вільні разыходзілася мала. З гледзішча гаспадарскага гэта было моцна дэфіцытнае падпрыемства, і, каб утрымаць яго, трэба было шукаць нейкіх пабочных крыніцаў. І вось гэтае заданьне ўзяў на сябе Іван Луцкевіч. Ён ня мог пайсьці на службу або заняцца нейкай сталай заработкавай працай, бо ўвесь час і энэргію сваю мусіў аддаваць маладому беларускаму руху, будучы галоўным маторам і кіраўніком яго. Проста дзіву даешся, як успомніш, як гэты чалавек, заараны штодзённай грамадзкай працай, знаходзіў часу і спосабаў здабываньня грошай на ўсю беларускую справу. Ён кідаўся на ўсе бакі, пры гэтым

ніколі не дбаў аб свае асабістыя патрэбы: што здабыў, тое йшло ў грамадзкі кацёл. Ён бярэ прадстаўніцтвы ад розных фірмаў, пасярэднічае ў транзакцыях з замежжам, мае шмат знаёмых сярод жыдоў і ў сваіх частых разъездах выконвае розныя гандлёвыя даручэньні, за што дастае пэўны працэнт. Але з усіх гэтых нясталых прыбыткаў ён ня мог-бы пакрываць выдаткаў на газэту й іншыя грамадзкія справы. Больш пэўны прыбытак прыносіла перапродаж антыкварных рэчаў. Іван Луцкевіч быў найлепшы знавец старасьвеччыны й мастацтва на ўвесь край. Усюды, дзе толькі ён ні бываў, ягоныя вочы шукалі старасьвецкіх і мастацкіх рэчаў: старой або народнай старасьвецкай разьбы, мастацкіх абразоў сьвецкіх і царкоўных, старых рукапісаў і друкаў ды іншых падобных рэчаў. Ён меў нейкі спэцыяльны нюх ці здольнасці, каб вынаходзіць гэтыя рэчы там, дзе, здавалася-б, зусім ня месца ім. Ён знаходзіць іх на кірмашох, на падстрэшшах старых двароў, у букіністаў, перакупнікоў і рызьнікаў або й ледзь што не на сьметніках. Набываў ён іх пераважна як бязвартасныя рэчы, за грашы. Тады ён ведаў, як гэтыя рэчы адрэстаўраваць, і калі яны мелі беларускую характарыстыку — пакідаў іх у сваіх музэйных зборах, калі-ж яны гэтай характарыстыкі ня мелі — прадаваў за належную ім цану й гэтак здабываў сродкі на беларускую нацыянальную справу. Дзякуючы ягонай стараннасці беларуская справа расла й дужэла, разам з тым расьлі зборы беларускай старасьвеччыны, зь якіх пасьля склаўся музэй — адзін з найбагацейшых у Вільні — музэй пад ягоным імём. Больш вартасныя рэчы не беларускага значаньня ён прадаваў у Пецярбургу, у Варшаве або й за межамі — у Кракаве ці Львове, дзе меў сталую сувязь з большымі антыкварыятамі. За некаторыя рэчы ён даставаў па колькісот рублёў (раз навет за абраз якогась старога французскага маляра дастаў больш як тысячу рублёў). Такія большыя транзакцыі былі для яго сьвятамі. Прыехаўшы ў Вільню, ён перш за ўсё плаціў даўгі за газэту — за паперу й друк, і іншыя старыя даўгі; плаціў задаўненую пэнсію хатняй наймічцы, купляў даўна нагледжаныя экспанаты для свайго музэю і, канечна, патрэбныя рэчы для сябе. Калі боты былі ўжо да немагчымасьці дзіравыя або вопратка занадта зношаная, дык купляў сабе ці брату Антону. Але неўзабаве зноў браў напавер паперу й рабіў іншыя даўгі,

пакуль зноў здабываў грошы перапродажай. Гэтак Іван Луцкевіч, жывучы вельмі сьціпла із сваім братам Антонам, фінансаваў газэту «Наша Ніва» ды бадай усю беларускую працу ў Вільні ў часе ад 1906 да 1919 г. (У гадох 1913—1915 Іван Луцкевіч выкладаў у прыватнай школе рысункаў Рыбакова мастацтваведу, але зарабляў там вельмі мала.) Ад іншых супрацоўнікаў «Нашае Нівы» нельга было вымагаць грашовага падтрыманьня на газэту. Досыць таго было, што яны ў ёй задарма працавалі ды так ці інакш самі сябе ўтрымвалі.

Апошнімі гадамі свайго існаваньня «Наша Ніва» мела ўжо ладна платных падпішчыкаў. З году ў год матарыяльны стан газэты папраўляўся. Тады пачалася й выдавецкая праца. Было заложанае Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні. Тады-ж паўстала й Беларуская кнігарня ў Вільні, якую вёў Вацлаў Ластоўскі як ейны собсьнік — аж да 1918 г. Ён і жыў пры кнігарні із жонкай і дзьвюма дачкамі ды там-жа складаў зборы старасьвеччыны (зьбіраць іх навучыўся ў Івана Луцкевіча).

У Пецярбурзе Вацлаў Іваноўскі арганізуе й спачатку фінансуе выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца...». Там выдаюцца галоўна літаратурныя творы й папулярныя брашуры для сялянства. Зь цягам часу гэтае выдавецтва пакрывала свае выдаткі й яно добра разраслося-б, як мне апавядаў пасьля праф. Вацлаў Іваноўскі, калі-б ня выбухла вайна. Зразумела, што й Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні трэба было спачатку паставіць на ногі і фінансаваць яго. І тут ізноў без грашовай дапамогі Іван Луцкевіча не абылося.

Калі ў 1914 годзе выбухла вайна і Вільня адчула блізіню фронту, магчымасьці здабыванья грошай Іванам Луцкевіча звузіліся. Сувязі з замежжам былі перапыненыя, пошукі антыкварных рэчаў на правінцыі спыніліся дзеля блізіні фронту. Трэбы было абмежыцца да малых купоўляў і продажаў у самой Вільні. Асабліва цяжкі быў 1915 год, калі фронт падыйшоў пад самую Вільню. Шмат беларусаў было мабілізавана ў армію, а сярод іх і супрацоўнікі «Нашай Нівы». Шмат падпішчыкаў было адрэзана фронтам. Дзеля ўсяго гэтага давялося спыніць далейшае выдаваньне «Нашае Нівы».

Аб сваіх удалых антыкварных транзакцыях апавядаў мне Іван Луцкевіч у часе нямецкай акупацыі, калі наракаў, што мусіць абмежыцца да дробных транзакцыяў. Нямецкія вайсковыя ахвоча куплялі антыкі, але Іван Луцкевіч мала што мог прадаць, калі беларускія экспанаты пакідаў для беларускага музэю. Я й так дзіўлюся, як ён мог пакрываць хатнія выдаткі праз увесь час нямецкай акупацыі, утрымваючы сябе й брата ды яшчэ падтрымваючы матар'яльна беларускую справу. Праўда, браты Луцкевічы жылі вельмі-ж сьціпла (пра гэта гл. Кветка Вітан: «Мае ўспаміны»).

«Конадні». № 7, 1963

ФРАНЦІШАК КУШАЛЬ

СОРАК ДВА ГАДЫ ТАМУ

Жменя ўспамінаў аб Алесю Гаруну

Першыя мае ўспаміны аб Алесю Гаруну, што друкаваліся недзе ўвосень 1941 г. у Менскай «Беларускай Газэце», былі, магчыма, паўнейшыя, чымся тая жменька, што даю тутака, бо тады, у 1941 г., ад трагічных падзеяў на Беларусі ў 1920 г. й майго апошняга разьвітаньня з Алесем Гаруном мінула было адно 21 год, сяньня-ж да іх дайшло яшчэ гэтулькі сама, а сорак два гады ў жыцьці чалавека шмат значыць, асабліва ў дачыненьні да гэткай нясталай ды нятрывалай рэчы, як людзкая памяць.

Упяршыню я сустрэўся з Алесем Гаруном у Менску ў 1918 г. Прыйшоў я тады ў Менск пехатою з Забор'я, дзе жылі мае бацькі, зь мясцовасьці, якая ляжыць у сямідзесяцёх вярстох ад Менску й належала ў тых часох да Ашмянскага павету. Мэтаю майго падарожжа ў Менск было дастаць там беларускіх кніжок для бібліятэкі гуртка беларускае моладзі, што я й мае сябры наважылі арганізаваць у мястэчку Івянцы. Беларуская кнігарня зьмяшчалася тады ў двупаверхавым доме на Захараўскай вуліцы, якраз насупраць «Новага» касьцёлу. Калі я ўвайшоў у дом, дык адразу пабачыў прылавень, на якім былі акуратна параскладаныя кнігі, а за ім — высокага, худога чалавека, апраненага ў жакетку із саматканага вясковага сукна, з-пад якое было відаць белую палатняную кашулю з каўняром, вышываным беларускім узорам. Я кагадзе якраз пакінуў быў царскую армію, што развалілася ў выніку рэвалюцыйных падзеяў, і не патрапіў яшчэ пазбыцца вайсковых звычкаў. Стануўшы на «зважай» перад чалавекам у саматканай жакетцы, я назваў сваё прозьвішча. «Прушынскі»,— адказаў мне ён, падаючы руку да прывітання.

Я ўжо ведаў, што Аляксандар Прушынскі — гэта запраўднае імя паэта Алеся Гаруна, творы якога я зь вялікім захапленьнем вучыўся на памяць і дэкламаваў, і адразу здагадаўся, з кім маю гонар пазнаёміцца. Мы разгаварыліся. Алесь Гарун зь вялікай цікавасьцяй распытваў мяне аб тым, што робіцца на правінцыі, як пашыраецца беларуская сьведамасьць сярод сялянства ды інш. Нарэшце ён напакаваў маю торбу кніжкамі, сказаўшы, што грошы за іх спагоніць з нас тады, калі нашая бібліятэка пачне мець прыбыткі.

Улетку 1918 г., апрача гэтага першага разу, я вельмі часта бываў у Менску то пехатою, то прыяжджаючы зь івянецкімі балаголамі. Кажны раз я наведваў беларускую кнігарню й сустракаўся там з Алесем Гаруном. У гэтым-жа доме на другім паверху зьмяшчалася рэдакцыя беларускай газэты «Вольная Беларусь». Там я пазнаёміўся і зь Язэпам Лёсікам і зь ягонаю жонкаю Вандай Лявіцкай, дачкой ведамага беларускага пісьменьніка Ядвігіна Ш.

На сьвеце ўсьцяж ня было супакою. Увосень 1918 г. выбухла рэвалюцыя ў Нямеччыне. Немцы былі змушаныя капітуляваць перад кааліцыяй. Нямецкія арміі пачалі пакідаць займаныя імі прасторы Беларусі. Сьледам за нямецкай арміяй, што адыходзіла на захад, з усходу йшло бальшавіцкае войска. Неўзабаве ўся Беларусь апынулася пад бальшавікамі. Увесну 1919 г. пачалася новая вайна — польска-бальшавіцкая. Палякі памаршыравалі на ўсход, і 19 красавіка 1919 г. польская армія здабыла Вільню, а колькі месяцаў пасьлей — 8 жніўня 1919 г. заняла Менск. Неўзабаве па заняцьці палякамі Вільні, у траўні 1919 г. у Вільні адбыўся беларускі зьезд Віленшчыны й Горадзеншчыны, на якім было пастаноўлена пачаць пад польскай акупацыяй арганізацыю беларускага войска. На зьезьдзе была абраная адмысловая вайсковая камісія, якой і было даручана пачаць захады перад польскім галоўным камандаваньнем аб дазволе на арганізацыю беларускіх вайсковых аддзелаў. Пасьля вельмі даўгіх намаганьняў і перамоваў, бо толькі 22 кастрычніка 1919 г. галоўнакамандуючы польскай арміяй Язэп Пілсудзкі выдаў нарэшце дэкрэт аб дазволе арганізаваць беларускае нацыянальнае войска. Гэтым-жа дэкрэтам паклікалася Беларуская Вайсковая Камісія (БВК), кажны

сябра пайменна. У склад камісіі былі пакліканыя дэкрэтам гэткія асобы: на старшыню БВК прызначаўся Паўла Аляксюк, адвакат паводля прафэсіі, вельмі актыўны ў тых часох беларускі дзеяч. На камандуючага беларускімі вайсковымі аддзеламі прызначаўся палкоўнік Канапацкі, беларус татарскага паходжаньня. У склад камісіі быў пакліканы й Аляксандр Прушынскі, а апрача яго, як сябры камісіі, гэткія асобы: Антон Аўсянік, маёр Якубецкі, Сымон Рак-Міхайлоўскі, палкоўнік-інтэндант Якубоўскі й я, капітан Францішак Кушаль. Месцам урадаваньня Беларускае Вайсковае Камісіі вызначаўся Менск (аб БВК быў мною ў сваім часе напісаны даўжэйшы артыкул «Ад Менску да Лодзі», які друкаваўся ў 1952 г., у лістападзе, сьнежні й студзені ў газэце «Беларус», нумары 21, 23, 24 й 25).

У сьнежні 1919 г. БВК пакінула Вільню й прыбыла ў Менск, дзе заняла даволі вялікі менскі гатэль «Гарні». На першым паседжаньні камісіі быў абраны ейны прэзыдыюм, заступнікам старшыні якога стаўся Аляксандр Прушынскі. Памятаю, што ён станоўка адмаўляўся ад гэтае функцыі, матывуючы сваю адмову слабым здароўем. І запраўды, дось было глянуць на яго, і кажны мог пераканацца, што перад ім моцна хворы чалавек. Аднак, дармо што ўсе слушныя адмовы, Алесю Гаруну не ўдалося пераканаць камісію, і ён застаўся заступнікам старшыні Прэзыдыюму БВК.

Паўла Аляксюк быў нязвычайна энэргічны чалавек, вельмі добры прамовец. Неўзабаве межы БВК сталіся яму зацесныя. Каб мець магчымасьць шырэйшае дзейнасьці, ён пачаў шторaз часьцей выяжджаць у Варшаву, дзе, як казалі тады ў Менску, рабіў «высокую» палітыку. Паказаўшыся час-часом у камісіі, ён узноў на даўжэйшы час недзе зьнікаў. Ясна, што ўвесь цяжар працы ў БВК зваліўся на плечы хворага Прушынскага, а праца гэтая была вельмі цяжкая й нэрвовая. Бо, не зважаючы на дэкрэт найвышэйшага аўтарытэту — галавы Польскае дзяржавы й галоўнакамандуючага польскай арміяй, Язэпа Пілсудзкага, справа арганізацыі беларускага войска ад пачатку сутыкнулася зь немагчымымі да абладжаньня перашкодамі.

Перашкоды гэтыя вынікалі найперш з палажэньня, што йснавала тады на Беларусі. Зламаўшы супраціў бальшавіцкае арміі, польскае войска рынула за ворагам

на ўсход, не даючы яму магчымасьці арганізаваць дзе-колечы абарону.

На прасторах Беларусі, займаных польскай арміяй, зараз-жа арганізоўвалася адміністрацыйная ўлада, ведама, вылучана із спалянізаваных паноў, панкоў ды паўпанкаў.

Неўзабаве ўсе адміністрацыйныя становішчы, а гэтаксама пасады ў паліцыі, былі занятыя гэтымі людзьмі. Зь вельмі малымі выняткамі ўсе яны былі эндэцкае арыентацыі, а значыцца — зацятымі польскімі нацыяналістамі, ворагамі ўсяго беларускага, бо-ж ведама, што няма горшага беларусаеда, як спалянізаваны беларус. Як і трэба было спадзявацца, гэтая зграя цалком сабатавала дэкрэт Пілсудзкага. Высыланыя БВК на правінцыю вэрбунковыя агенты звычайна арыштоўваліся й траплялі ў турмы. Ахвотнікаў ісьці ў беларускае войска не дапушчалі ў Менск і страшылі рознымі карамі. Можна сабе ўявіць, як перажываў усе гэтыя несправядлівасьці й перашкоды фактычны старшыня БВК Аляксандр Прушынскі, зьнясілены цяжкой хваробай, а таму асабліва чулы на кажную прыкрасьць ці няўдачу.

Тым часам дні йшлі, набліжаўся ліпень 1920 г. БВК удалося зь вялікімі цяжкасьцямі арганізаваць толькі адзін беларускі батальён. Сярод сяброў Камісіі пачало расьці й мацнець вялікае незадаваленьне. Нарэшце недзе ў канцы чэрвеня 1920 г. ў Менск прыехаў Паўла Аляксюк. Адбылося вельмі бурнае пленарнае паседжаньне БВК, і Аляксюку быў адназгодна выказаны недавер. Аляксюк падаўся ў дымісію. Тое самае зрабіў і палкоўнік Канапацкі. Беларуская Вайсковая Камісія апынулася ў крытычным палажэньні. Даць рады крызысу было вельмі цяжка, бо Аляксюк быў вызначаны на старшыню БВК дэкрэтам польскага галоўнакамандуючага. Справу трэба было ўзгадняць з польскім камандаваньнем. Аднак усе перашкоды ўдалося абладзіць. Новым старшынём БВК згадзіўся быць адзін з былых рэдактароў першае беларускае газэты ў Вільні ў 1906 годзе, «Нашай Долі», Франьцішак Умястоўскі, запрошаны на гэтае становішча ўжо самай БВК.

Прыняўшы становішча, Умястоўскі адылі ў Менск ня прыбыў. Давялося Аляксандру Прушынскаму й надалей узначальваць БВК.

За часамі польскае акупацыі, дармо што вайна й няпэўнасьць заўтрашняга дня, у Менску шырака разгарнулася беларускае культурнае жыцьцё. Тут стала жылі гэткія выдатныя беларускія пісьменнікі, як Янка Купала й Зьмітрок Бядуля, даездам зь Вільні падоўгу запыняўся драматург Францішак Аляхновіч, які сам рэжысэраваў свае рэчы дзеля паказу на менскай сцэне, часта выступаў ведамы хор Тэраўскага, стала выходзіла беларуская газэта «Беларусь» пад рэдакцыяй выдатнага журналістага й пісьменьніка Язэпа Лёсіка, якога лучыла з Гаруном асаблівая прыязьнь, паўсталая яшчэ за часамі супольна адбыванае імі ў Сібіры ссылкі. У гэтым шырокім культурным жыцьці Алесь Гарун браў заўсёды дзейны ўдзел, тым болей што быў ён у гэным часе й старшынёю Беларускага Нацыянальнага Камітэту, які займаўся арганізацыяй і кіраваньнем усяго беларускага жыцьця ў Менску. Ня было дня, каб у ягоным габінэце ў БВК, пасьля гадзінаў прыкрага й цяжкога ўрадаваньня, ня зьбіраліся на нарады, што цягнуліся да познае начы, беларускія культурныя працаўнікі дзеля абмеркаваньня пільных справаў з галіны выдавецкай, школьнай ды інш. Гэтак паважна хворы на сухоты Алесь Гарун, стаміўшыся за дзень да апошняга, мусіў, пасьля кароткага адпачынку, пачынаць назаўтрае гэткі-ж працоўны дзень, тыдзень па тыдні й месяц па месяцы. Нічога дзіўнога, што якраз да яго так хутка прычапілася яшчэ адна хвароба, стаўшыся беспасярэдняю прычынаю ягонае перадчаснае сьмерці.

5-га ліпеня 1920 г. бальшавікі пачалі на шырокім фронце наступ на польскую армію. Паляком давялося адступаць. У Менску была абвешчаная эвакуацыя. Сябры Беларускае Вайсковае Камісіі зыйшліся, апошні ў Менску раз, на паседжаньне. Яны перагледзелі й адабралі найважнейшыя й найпатрабнейшыя дакумэнты, бо забраць усяго ня было магчымасьці, падзялілі іх міжсобку, пехатою пайшлі на чыгуначную станцыю й селі ў апошні эшалён, што пакідаў Менск.

Ніхто з нас не ўяўляў сабе, якую жахлівую паразу дастала на Бярэзіне польская армія. Мы былі перакананыя, што бальшавікі будуць неўзабаве затрыманыя, праўдападобна на Нёмне, і наважылі далёка не падавацца, а затрымацца дзе-колечы ў заходняй частцы

Беларусі. Найдагаднейшым месцам супынку здаўся нам Ваўкавыск.

Лета 1920 г. было на Беларусі нязвычайна гарачае. Рана й вельмі багата ўрадзіла гародніна. Беларускія сады аж хінуліся долу ад цяжкіх пладоў. Асабліва надзілі стомленых жаўнераў польскае арміі, што адыходзіла на захад, сьпелыя, буйныя вішні. Яны ірвалі іх, елі і запівалі вадой з прыдарожных студняў ды ручаёў. Неўзабаве скрозь выбухла эпідэмія крываўкі (дызэнтэрыі).

Мы прыехалі ў Ваўкавыск каля паўдня наступнага дня ды пайшлі ў горад уладжвацца. Зайшліся на рынак. Сяляне прывезьлі сюды на продаж поўныя вазы вішняў. Вішні былі буйныя й сакавітыя. Мы ўсе ў ахвоту імі ласаваліся. Пад'еў усмак вішняў і Аляксандр Прушынскі. На другі дзень нашага пабыту ў Ваўкавыску сябры БВК зыйшліся ў залі мясцовае гасьцініцы, каб абмеркаваць становішча, у якім мы апынуліся, ды пастанавіць, што рабіць далей. Алесь Гарун на нараду ня прыйшоў. Ня памятаю ўжо, хто зь сяброў сказаў, што «Прушынскі ня прыйдзе, бо ляжыць хворы ў сябе на гасподзе». Я й Антон Аўсянік зараз-жа пайшлі да яго, каб даведацца, што зь ім. Гаспода Алеся Гаруна была на аднэй зь ціхіх бочных вулічак Ваўкавыску й выглядала як звычайная сялянская хата. Калі мы ўвайшлі ў гэтую хату, дык адразу-ж пабачылі на дзервяным сялянскім ложку, засланым саматканаю коўдраю, Аляксандра Прушынскага — Алеся Гаруна. Ён слабым голасам расказаў нам, што ўчора, пад'еўшы вішняў, пачуў вялікую смагу і напіўся, раз і другі, сьцюдзёнае вады. Пад вечар яму зрабілася дрэнна, забалеў жывот. Мучыўся ён ім усю ноч і цяпер адчувае нязвычайную слабасьць. Пачуўшы гэта, Аўсянік пабег шукаць доктара, а за гадзіну прывёў лекара з вайсковае камандатуры. Агледзеўшы хворага, лекар сказаў, што Аляксандр Прушынскі захварэў на тыповую дызэнтэрыю, і дадаў: «Я вам дам паперу, адвязеце хворага на чыгуначную станцыю й чакайце. Неўзабаве праз станцыю будзе праходзіць санітарны цягнік, вось і здайце хворага дзяжурнаму лекару гэтага цягніка». Селянін, у хаце якога прыпыніўся Алесь Гарун, сьведка ўсяе гэтае сцэны, згадзіўся адвезьці хворага на станцыю сваім канём. Мы дапамаглі Прушынскаму апрануцца і, калі пад ганак пад'ехала каламажка, вывелі яго пад рукі й пасадзілі на воз, бо

сам ён стаяць на нагах ужо ня мог. Аўсянік сеў побач з хворым і трымаў яго, абняўшы рукою, усю дарогу, я-ж з хурманом селі ў перадку. Прыехаўшы на станцыю, мы запраўды вельмі мала чакалі на санітарны цягнік.

Ён прыйшоў за якія паўгадзіны. Я й Аўсянік увялі зусім заслабелага Гаруна ў цягнік і перадалі санітару. Тутка, у цягніку, мы — Антон Аўсянік і я, апошні раз паціснулі руку Алесю Гаруну, жадаючы яму барджджэй ачуняць.

Колькі год пасьлей — памёр і Антон Аўсянік. І сяньня хіба жывы на сьвеце адзін я, што апошні зь беларусаў бачыў жывога Алеся Гаруна. У 1922 г. у часопісе «Беларускі Сьцяг», выдаваным у Коўні, зьявіліся ўспаміны аб Алесю Гаруну, падпісаныя крыптонімам А. А-к. Няма ніякага сумлеву, што аўтарам іх мог быць адно Антон Аўсянік, што разам са мною выпраўляў Алеся Гаруна ў апошняе ягонае падарожжа таго, гэтак памятнага й па сараку год, ліпеньскага дня на станцыі ў Ваўкавыску.

Падзеі тым часам не стаялі на месцы. Польская армія затрымалася адно пад самай Варшавай, дзе й разьбіла нарэшце бальшавікоў. Прыйшло замірэньне. Польскае камандаваньне вызначыла месцам дзеля рэарганізацыі й папаўненьня БВК места Лодзь. Неяк увосень 1920 г. БВК атрымала ўрадавы ліст з вайсковага шпіталю ў Кракаве, у якім паведамлялася, што Аляксандр Прушынскі, сябра БВК, памёр ад дызэнтэрыі, і падавалася дакладная дата сьмерці ды месца паховінаў.

Вестка аб сьмерці Алеся Гаруна вельмі цяжка нас уразіла. БВК пастанавіла дэлегаваць некага зь беларусаў у Кракаў, каб дакладна даведацца аб абставінах Гаруновае сьмерці ды знайсьці ягоную магілу, зазначыўшы яе так, каб заўсёды можна было яе адшукаць.

Гэткім дэлегатам ахвоча згадзілася паехаць у Кракаў Паўліна Мядзёлка, тады жонка ведамага беларускага дзеяча Тамаша Грыба, які ў тым часе як эмігрант жыў у Лодзі. За тыдні два яна вярнулася з Кракава й расказала нам, што ў Кракаўскім вайсковым шпіталі ёй далі ўсе патрэбныя інфармацыі аб сьмерці Аляксандра Прушынскага ды паказалі ягоную магілу.

Магіла гэта знаходзіцца сярод магілаў польскіх жаўнераў, і на ёй стаіць просты дзервяны вайсковы крыжык з таблічкай, на якой напісаныя два словы: Аляксандр Прушынскі.

Гэткая доля нашых вялікіх людзёў, нашых вялікіх паэтаў і нацыянальных прарокаў. Косьці Максіма Багдановіча тлеюць «над сіняй бухтай» у далёкім Крыме. Янка Купала знайшоў быў дамавіну ў нялюдзкай Маскве. Алесь Гарун супачыў навечна ў чужым польскім Кракаве... Але прыйдзе час, і ўсе яны знойдуць вечны супакой на роднай зямлі, у велічным пантэоне беларускіх нацыянальных гэрояў.

«Конадні». № 7, 1963

А. ЭССОН

МАЕ ЎСПАМІНЫ АБ АЛЕСЮ ПРУШЫНСКІМ

Упяршыню доля спаставіла мяне, паўночнага каўказца, зь беларусам Алесем Прушынскім у аднолькава далёкім нам абодвум Сібіру ў 1909 годзе ў перасыльнай частцы славутай Аляксандраўскай Цантралкі, недалёка ад г. Іркуцку.

У гэтую перасыльную Цантралку з усіх канцоў імпэрыі зганялі асобныя партыі палітычных ссыльных, засуджаных ваеннымі й іншымі судамі на вечнае пасяленьне. Пад канец 1909 году нас набралася шмат сотняў: былі тутака латышы ў цёпл іх арыштанцкіх куртках, падшытых самымі ссыльнымі, так што цёплага падшыцьця ня было відаць з-пад звычайных арыштанцкіх халатаў з адмысловага грубага сук на. Тутака былі беларусы, палякі й жыды з заходніх і паўдзённых губэрняў Расеі, колькі грэкаў, ладна расейцаў, грузіны, армяне, асеціны і расейцы з Каўказу; было навет двух кіргізаў. З усіх перасыльных найгорш былі апранутыя на зіму мінгрэльцы. Іх было чалавек 25. Ад самога пачатку, як толькі апынуліся ў паўдзённай частцы Расеі, каля г. Растову, мы, каўказцы, пачалі хварэць на тыфус. Мінгрэльцы былі апранутыя ў лёгкія чаркескі з башлыкамі на галаве, а зіма была ў самым гарце. Тэмпэратура часта трымалася на 25—35 градусах ніжэй за нуль тэрмомэтра Рэамюра: плюнь — і сьліна застыгала ў паветры ледзяной куляй перш, чым даляцець да зямлі. Перасыльныя турмы звычайна былі перапоўненыя, і таму колькасьць хворых была страшэнная; блізу ўсе мінгрэльцы перамерлі яшчэ перад Самарай.

Наша партыя каўказцаў прыбыла нарэшце ў Аляксандраўскую перасыльную турму, але ў куды меншай

колькасьці, як яна была ў Растове. Тутака нас разьмясьцілі па бараках сярод іншых, што прыйшлі раней. Ня лішне будзе сказаць колькі словаў пра гэтую турму. Яна складалася з колькіх карпусоў і баракаў рознага памеру, прычым катаржнікі, што адбывалі свой тэрмін да выхаду на вольнае пасяленьне, займалі большую частку іх, і турэмная арганізацыя базавалася, казаў той, на гэтай сталай частцы зьняволеных. Будынкі ўсе былі дзераўляныя. У кажным бараку ўздоўж сьценаў было па два рады юрцаў. Прамежак паміж юрцаў быў калідорам, сюды звозілася ежа і ўсё іншае. Па канцох бараку, тут-жа каля самых юрцаў, стаяла колькі парашак. Усе баракі й двары былі абгароджаныя высокімі частаколамі зь бярвеньня у 25—30 футаў увышкі, з завойстранымі вярхамі. Па рагох гэтай высокай агарожы ўзвышаліся будкі варты й вузкія пляцоўкі, па якіх вартаўнікі хадзілі ўзад і ўперад із стрэльбамі на плячох. Турэмная варта была ўкамплектаваная маладымі здаровымі сытымі хлопцамі, усе былі як на падбор. Бальшыню іх лёгка было падкупіць. Так празь іх можна было за грошы дастаць ня толькі белы хлеб, масла, малако й іншыя прадукты, але й такія рэчы, якія былі строга забароненыя турэмнай адміністрацыяй: нажы, чаравікі, акуляры, нелегальную пошту, і навет можна было наладзіць сувязь з мясцовай палітычнай нелегальнай арганізацыяй.

У бараку звычайна зьмяшчалася да 200 чалавек, даводзілася бадай увесь час быць у бараку, хадзіць паміж юрцаў, сядзець на юрцах і чытаць або гуляць у карты ці ў шахматы. З дазволу начальства мы навет арганізавалі даволі добры хор.

Неўзабаве па тым, як мы прыехалі, маю ўвагу прыцягнулі да сябе два перасыльныя, што прыехалі раней за нас із заходніх губэрняў Расеі, яны былі ў адным з намі бараку. Адзін быў Кулага, эсэр, здаецца, чыгуначнік, зь вялікай шаўковай сьветлай барадой, хоць яму было ня больш як 25—26 год. Гэта быў тыповы напышлівы чыноўнік. Ён быў за старасту ў нашым бараку, г. зн. вёў усе патрэбныя перамовы з наглядчыкамі й іншым начальствам у пытаньнях нашага барачнага жыцьця. Другі, Алесь Прушынскі, таксама беларус з заходняга краю, быў поўнай супрацьлежнасьцяй да Кулагі. Высокага росту, крыху суглобы й блізу заўсёды сур'ёзны, але ня гмырны, Алесь быў узорам спакойнага

і ўдумлівага чалавека. У гутарцы з кім-небудзь ён заўсёды быў без афэктацыі і, відаць, таму ад першага-ж знаёмства вельмі гарнуў да сябе кажнага. Ня ведаю, можа, таму, што мы зь ім былі зусім супрацьлежных характараў — я пахопісты, нэрвовы і гарачы каўказец, а ён — спакойны назіральнік усяго навакольнага, непрайманны беларус, а можа, проста ягонае спакойнае й сур'ёзнае аблічча спадабалася мне, але мы неўзабаве пасябравалі. Алесь быў дасканальны шахматыст, найлепшы з усіх нас, хто гуляў зь ім. Гулялі часта. Звычайна ён, гуляючы на памяць, г. зн. бяз дошкі, быў адна партыя, а колькі нас — другая партыя. Ён расьцягваўся на юрцах, накрываў твар хустачкай, і гульня пачыналася. Мы рэдка выйгравалі, дармо што часта перагаворваліся — кансультаваліся. У шахматнай гульні мяне найбольш уражала тое, што Алесь ніколі не нэрваваўся. Хіба толькі, калі ён часам забываўся палажэньне тае ці іншае фігуры пасьля нашых даўгіх нарадаў, можна было згледзець незадаваленьне на ягоным твары. Ведама, што гульня ў шахматы адна з самых нэрвуючых, газардавых; ніколі мы ня бачылі, каб у Алеся дрыжэлі рукі, як у нас, ці каб ён хваляваўся.

Я ня памятаю, каб я калі бачыў Алеся ў гневе ці ў злосьці, за выняткам аднаго выпадку. Тым разам на ягоным, звычайна непрайманным і спакойным твары было абурэньне. Гэта было аднойчы ў часе маёй спрэчкі з паляком-нацыяналістам. Калі ня мылюся, гэта быў граф Чапскі, таксама ссыльны. Чапскі даводзіў канечнасьць адлучэньня польскай нацыяналістычнай партыі ад расейскіх рэвалюцыйных партыяў на тэй аснове, што расейцы нагэтулькі менш культурныя за палякоў, што ня могуць мець аднае або аднолькавае з палякамі праграмы рэвалюцыйнага змаганьня. На мой бок неўзабаве стаў Алесь. Ён, відаць, бачыў, што я ня знаю ні палякаў, ні іхнае культуры і што таму бяру довады Чапскага за грунтоўныя; ён так даў майму апанэнту, што ўсе навакол паднялі на сьмех небараку Чапскага.

Алесь ня быў марксыстам і наагул ня выказваўся за ніводную лінію, што тады панавалі,— ні за народніцкую, ні за марксыстаўскую. Ад Алеся я ўпяршыню даведаўся, што ёсьць апрычоная беларуская мова, а не дыялект расейскае мовы. Ён пісаў вершы па-беларуску. Слухаючы яго ўважліва, я ня мог навет ухапіць сэнсу

таго, што ён чытаў. Для мяне гэта быў набор нейкіх незразумелых правінцыялізмаў. Агулам бяручы, тое, што я чуў, розьнілася ад расейскае гаворкі павольнаю плаўнасьцяй і мякчынёй зычных. Там, дзе расейская гаворка рэжа, як сякерай, або «ыкае», беларуская выдавалася мне расьцягванай наросьпеў. Гэта толькі маё ўражаньне бяз крытычнага аналізу, бязь веданьня мовы.

Мы прабылі ў Аляксандраўскай перасыльнай нядоўга. На пачатку вясны нашая партыя ссыльных, якіх разьмеркавалі на поўнач у розныя месцы Іркуцкай губэрні й Якуцкай вобласьці, рушыла ў дарогу. Для мяне абставіны склаліся так, што я ня мог навет зьберці свае манаткі: за тры дні да нашага адыходу я сьпяваў з хорам у бараку і быццам за «парушэньне цішыні» ды за «фізічнае ўзьдзеяньне» на аднаго з нагледачоў быў пасаджаны ў цёмны карцар. Пасьля бесьперапыннага агульнага пратэсту ўсяе перасыльное турмы й толькі пасьля таго, як прыбыў памочнік пракурора, выкліканы з гораду, мяне выпусьцілі перад самым выхадам партыі. Дык я і не пасьпеў разьвітацца зь нікім з тых, хто быў вызначаны на жыцьцё ў іншыя месцы, у тым ліку і з Алесем.

«Конадні». № 7, 1963

БУДУЧЫНЯ Ў МІНУЎШЧЫНЕ

ЛЕЎ АКІНШЭВІЧ

ПАРЛЯМЭНТ БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

У вялікай залі будынку старадаўняга стылю йдзе паседжаньне колькіх сотняў людзей. Дождж манатонна бубніць у закратаваныя вокны. У «д'ябальскі-прытульным краі», як назваў Ангельшчыну адзін зь ейных дзяржаўных мужоў, мала сьветлых і сонечных дзён. Але ў гэтым краі туманоў і дажджоў ёсьць іншае сонца, якое нельга пабачыць, хоць дотык ягоны адчуваецца намі зь першага нашага кроку ў ім: гэта сонца свабоды, што сьвеціць над ангельскім абтокам, што сягае да вольных даміньёнаў Вялікабрытаніі, кідаючы водблескі праменьняў па цэлым сьвеце.

Мужы, што сабраліся ў старадаўным будынку,— прадстаўнікі вольнага ангельскага народу. Сяньня ў крэслах ангельскае Гасподы Грамадаў, або Ніжняе Гасподы, мы знойдзем немалую частку прадстаўнікоў лейбарысцкае, г. зн. работніцкае партыі: былыя докеры, шахцёры, чыгуначнікі разам із шматлікімі прадстаўнікамі працоўнае інтэлігенцыі трымаюць у сваіх руках долю ангельскага народу, долю вялікае імпэрыі, у нейкай частцы — долю ўсяго сьвету.

Ангельскі парлямэнтарызм складаецца цяпер із сыстэмы ўстановаў, у якую ўваходзяць: Ніжняя Гаспода, або Гаспода Грамадаў, з выбранымі народам на нейкі час сябрамі; Верхняя Гаспода, або Гаспода Лёрдаў, у бальшыні сваёй складзеная зь сяброў, што ўвай-

шлі сюды, дзякуючы паходжаньню з заслужаных або выдатных радоў (з 1911 году правы Гасподы Лёрдаў значна абмежаныя), і — кароль, які мае права зацьвердзіць або адкінуць пастанову абедзьвюх гасподаў, але ўжо колькі стагодзьдзяў не карыстаецца сваім правам.

Уся выканаўчая ўлада належыць да рады міністраў ды ейнага прэм'ера, якім, як правіла, бывае лідэр партыі, што перамагла на апошніх выбарах у Гасподу Грамадаў, міністры-ж паклікаюцца зь сяброў парлямэнту.

Ангельскі парлямэнт разглядае й прыймае законы краю, г. зн. правілы, што на доўгі час маюць вызначаць жыцьцё ўсіх ягоных грамадзян. Ён зацьвярджае гадавы бюджэт дзяржавы, і ніхто з прадстаўнікоў выканаўчае ўлады ня можа выдаваць дзяржаўныя сумы на іншыя мэты, як гэта зазначана ў зацьверджаным парлямэнтам акце. Парлямэнт мае права кантролі выдаткаў, робленых адміністрацыйнымі ўладамі. Парлямэнцкімі запытаньнямі сяброў ураду ангельскі парлямэнт спаўняе кантролю над усімі справамі замежнае й нутраное палітыкі краю. Ягоныя сябры маюць поўную свабоду слова, і ў часе быцьця ў парлямэнце ім забясьпечаная асабістая незачэпнасьць.

Гэта сьведчыць, што ўдзельнікі паседжаньняў у старадаўняй залі старога Лёндану сапраўды гаспадары свайго краю. Як-жа дайшлі яны да ўлады, як-жа была ўстаноўленая тут гэтая парлямэнтарная сыстэма, што, не забясьпечаная пісанымі правамі, дзеіць зь вялікай спраўнасьцяй і сяньня, карыстаючыся агульнай павагай?

Пачаткаў гэтае сыстэмы трэба шукаць у далёкіх глыбінях ангельскае гісторыі. Да заваёвы Ангельшчыны нарманамі, гэта значыцца да XI ст., каралеўская ўлада кіравала край із памогай дваякіх сходаў. Адзін зь іх — гэта народнае веча, што складалася з усіх вольных грамадзян. Другі — вялікая дзяржаўная рада, што складалася з дваранаў і сяброў каралеўскае дружыны. Яна зьбіралася пэрыядычна, мела заканадатную ўладу й праводзіла выбары караля. За нарманскіх часоў заміж яе дзеіла так званая «пэрманэнтная» рада, якая ў гэты час складалася зь вялікіх земляўласьнікаў і мела характар заканадатнага сходу.

Пераломным часам ангельскага парлямэнтарызму

было XIII стагодзьдзе. У змаганьні з каралём Іванам Безьзямельным, братам славутага караля-рыцара Рычарда Ільвінае Сэрца, ангельскія бароны й рыцары дамагліся выданьня т. зв. «Вялікага Ліста Вольнасцяў», і кароль мусіў прызнаць за грамадаю права выбіраць сваіх прадстаўнікоў да ўдзелу ў заканадатным сходзе. За караля Адварда I у 1295 г. быў скліканы першы ангельскі парлямэнт, у які ўваходзілі прадстаўнікі ад рыцараў (па двох ад кажнага графства) і ад местаў (па двох ад кажнага места). У гэтым-жа часе за парлямэнтам было прызнанае права даваць сваю згоду на правядзеньне дзяржаўных падаткаў. Трэба думаць, што гэтым самым у ягоныя рукі лучыў той прывілей, што й забясьпечыў яму цьвярдыя й аўтарытэтныя пазыцыі ў гаспадарстве.

У XIV ст. парлямэнт Ангельшчыны падзяліўся на дзьве гасподы, што існуюць і дагэтуль: Гасподу Грамадаў і Гасподу Лёрдаў.

Парлямэнт перажыў трывожныя часы ангельскае рэвалюцыі ў XVII ст. і захаваў свае пазыцыі ў часох рэстаўрацыі, а ў XVIII ст. канчальна ўстанавілася тая сыстэма парлямэнтарнага ладу ангельскага гаспадарства, тая няпісаная ангельская канстытуцыя, што ў аснаўных рысах захавалася й дагэтуль. У даўгой гісторыі ангельскага парлямэнтарызму ўрады мяняюцца адзін па адным. Раз яны складзеныя з тораў (папярэднікаў пазьнейшых кансэрватараў), раз зь вігаў (пазьнейшыя лібэралы). Першыя зь іх данесьлі моцную палітычную арганізацыю да нашага часу, другія сяньня ўступілі месца новай, работніцкай партыі, што выйшла на арэну парлямэнтарнага жыцьця ў асноўным адно ў XX ст. Але хто-б ні меў бальшыні галасоў у парлямэнце, хто-б ні стаяў ля ўлады,— правы старога парлямэнту Ангельшчыны застаюцца непахіснымі. Гэта тарнуецца й да заканадатнае функцыі, як установы, што вызначае дзяржаўны бюджэт, і — як установы, што кантралюе ўсё палітычнае жыцьцё краю.

Найнавейшая гісторыя Эўропы знае блізу ў кажным краі існаваньне парлямэнтарных установаў падобных да ангельскага парлямэнту, із шмат якімі адменамі і зь яснай тэндэнцыяй правесьці той падзел улады на ўладу заканадатную, выканаўчую й судовую, які Монтэск'е ў XVIII ст. «адкрыў» у тагачаснай Ангельшчыне, ня зусім пры гэтым зразумеўшы ейны дзяржаўны лад.

Але, у гэты-ж час блізу кажная эўрапейская краіна яшчэ з далёкай мінуласьці мела свае ўстановы парлямэнтарнага тыпу.

Гэтак у Францыі яшчэ пры фэадальным парадку ў XI і XII стст. існаваў сход фэадальных магнатаў. Кароль склікаў на паседжаньні гэтага сходу сваіх найбольшых васалаў ды найвышэйшых пралатаў спачатку адно ў вялікія сьвяты. У 1302 г. кароль Піліп Прыгожы ўпяршыню паклікаў да жыцьця ўстанову, што існавала ў Францыі колькі стагодзьдзяў: гэта былі генэральныя станы. У гэтых генэральных станах дзеілі паасобку тры станы: шляхта, клер (сьвятарства) й месты (прадстаўніцтва г. зв. «трэцяга стану»). Галоўнай мэтай гэтага сходу была дапамога й рада валадару ў найважнейшых справах. Кажны стан радзіў асобна, а тады падаваў каралю свае пажаданьні або жальбы. Апрача гэтага, генэральныя станы мелі вялікі прывілей разглядаць і зацьвярджаць дзяржаўныя падаткі й зборы.

Як ведама, французскі тып парлямэнту ня здолеў абмежыць уладу караля і паставіць яе пад цяглую кантролю народных прадстаўнікоў (хай-бы й у умоўным значаньні гэтага слова — прадстаўнікоў якойсьці ягонае часткі). Генэральныя станы адсунуліся ад дзяржаўнага жыцьця, і французкія каралі заваявалі сабе абсалютную ўладу. Ведамыя вынікі гэтага: ізноў скліканыя ў 1789 г., генэральныя станы зьмянілі стары парадак паседжаньняў па трох курыях і, задзіночыўшы сваіх паслоў пад кіраўніцтвам трэцяга стану, далі пачатак вялікай буры Французкае рэвалюцыі.

У фэадальнай Нямеччыне таксама існавала парлямэнтарная адзінка (мо дакладней зародак парлямэнтарнага органу ў сяньняшнім разуменьні) — Райхстаг. Ён таксама складаўся з трох групаў: з групы курфюрстаў, з рады князёў і з групы местаў. Кажная група разглядала справы паасобку, але вымагалася агульная згода ўсіх трох. Згодна з Вэстфальскім мірам, дзяржаўнай радзе належала заканадатная ўлада, інтэрпрэтацыя правоў, пастановы аб вайне й супакоі, права прыняцьця дзяржаўных падаткаў і некаторыя іншыя. Як ведама, з гэтага старога Райхстагу разьвіўся пазьнейшы кволы нямецкі парлямэнтарызм XIX й пачатку XX стст. Апрача таго, зародкі парлямэнтарных установаў былі і ў кажным нямецкім княстве.

У Польшчы яшчэ да XIII ст. існаваў зародак прадстаўніцтва вышшых групаў жыхарства, спачатку у так зв. вечах. У XV ст. вечы зьнікаюць, уступаючы месца арганізацыі польскага сойму, асаблівага тыпу парлямэнтарнае ўстановы, дзе прадстаўніцтва народу было замененае прадстаўніцтвам аднаго зь ягоных станаў — станам шляхты. Польскі сойм дзяліўся на дзьве часткі: пасолькую гаспоту й сэнат. Пачынаючы ад XVII ст., кажны пасол меў права г. зв. «лібэрум вэто», права не дазваляць і зрываць пастановы сойму. Пры канцы XVIII ст. была зробленая спроба дадаць да складу сойму й прадстаўнікоў ад местаў, але рэформа гэтая не пасьпела ўвайсьці ў жыцьцё.

Таксама й на Ўкраіне існавалі ўстановы, подобныя да народных прадстаўніцтваў. У князёўскую пару раньняга фэадалізму гэткімі былі баярскія рады, пазьней — інстытуцыя т. зв. «старшынскіх зьездаў», «старшынскіх радаў». У другой палове XVII ст., за часоў гэтманату, калі за гэтманаў Самойлавіча й Мазэпы пры ўкраінскім гэтманаце стала існавала парлямэнтарнага тыпу прадстаўніцтва, яно разьвязвала розныя дзяржаўныя справы, разглядаючы ў тым ліку й устанаўляючы дзяржаўныя падаткі. Старшынскія рады захаваліся, праўда ўжо з абмежаванай кампэтэнцыяй, і ў XVIII ст., ператрывалі паразу паўстаньня гэтмана Мазэпы, ды існавалі да поўнае ліквідацыі ўкраінскае аўтаноміі ў межах расейскае дзяржавы.

Можна ўгледзець установу парлямэнтарнага тыпу і ў гісторыі Расеі. Тутка яна ізноў-жа мела двугасподнюю сыстэму. Вышшаю гасподаю ў XVI—XVII стст. была баярская дума, у якую ўваходзілі па паходжаньню ці па прызначэньню цара г. зв. «бояре введенные» (тыя, што мелі рангу баярына або «окольничего»), «думныя дворяне» й «думные дьякі». У адрозьненьне ад баярскай думы, што працавала стала, існаваў другі сход — «земские соборы», што зьбіраліся ад выпадку да выпадку. У «земскіх саборах» прыймалі ўдзел часткава выбраныя ад народу, часткава прызначаныя мясцовай уладаю прадстаўнікі ад розных станаў жыхарства тагачаснае Расеі (дваране, стральцы, купцы, пасадзкія людзі).

Мы спыніліся на некаторых народах, што ў працэсе свайго гістарычнага разьвіцьця стварылі розныя ў фармальных рысах, але аналягічныя ў сваёй істоце

ўстановы. Гаварыць аб іх можна было-б шмат. Але й бяз гэтага ясна, што ўсе яны прайшлі адну дарогу разьвіцьця.

На туманным ангельскім абтоку, пад лагоднымі праменьнямі сонца Францыі, у Нямецкай зямлі, у Польшчы, на шырокіх, вольных прасторах украінскага стэпу і ў бязьмежных лясох засьнежанае Расеі выраслі аднолькавыя ў сваім прынцыпе зьявы. Іх стварыў ня толькі горды з свае свабоды ангельскі народ. Іх тварыла й здольнае жыхарства Францыі, імі карыстаўся станаўкі немец, яны існавалі на зямлі ганарыстае польскае шляхты. Не абыйшлося бязь іх і бунтарнае ўкраінскае казацтва, будуючы ў гэтманскай дзяржаве сваю новую форму дзяржаўнасьці.

У чым-жа загадка гэтага аднолькавага ў сваіх аснаўных рысах дзяржаўнага парадку? У чым загадка стварэньня бальшынёй эўрапейскіх народаў (іншыя часткі сьвету пакідаючы ў баку) гэтых радаў пры князю, цары, каралі? Чым выясьніць тое, што ўдзел у гэткіх радах бяруць найбольш уплывовыя часткі жыхарства, спачатку — in corpore, а пасьля ўсё часьцей выходзячы на дарогу дасыланьня на іх сваіх прадстаўнікоў ды ўсё больш і больш разьвіваючы арганізацыю гэтага прадстаўніцтва?

Якія дзейнікі ўплылі на тое, што ўсе прадстаўніцтвы ды ўстановы гэтага тыпу загарнулі пад сваю кампэтэнцыю ўсю справу заканадаўства ў шмат якіх дзяржавах, што ў вялізарнай бальшыні народаў яны разглядалі й зацьвярджалі дзяржаўныя падаткі? Чым, нарэшце, выясьніць працэс іхнага разьвіцьця ў некаторых народаў, калі да прадстаўнікоў фэадальнае арыстакратыі крок за крокам далучаліся прадстаўнікі іншых народных станаў, калі ўсьцяж пашыраўся ўплыў парлямэнту, які сяньня там, дзе ён існуе, ёсьць ужо прадстаўніцтвам усяе нацыі, із здабытым вякамі палітычнага змаганьня шырокім абсягам кампэтэнцыі і моцным уплывам на ўсё дзяржаўнае жыцьцё?

Надта цяжка даць кароткі адказ на вялікае й вельмі складанае пытаньне. Адказваючы, даводзіцца затрымацца адно на некаторых пунктах. Па-першае, на тым, што ўжо ў такіх дужа прымітыўных задзіночаньнях людзкое грамады, якімі ёсьць род, старшыня роду кіруе ягоным жыцьцём і ягонымі справамі з дапамогаю рады старэйшых сяброў роду. Рада старэйшых і рада най-

мацнейшых, найздальнейшых, найбольш знаных існуе і ў пераходзе ад радавога быту да быту пляменнага і пры першых кроках арганізацыі людзкіх радавых грамадаў у дзяржавы, што ў нас у Эўропе, ня лічачы старавечных Грэцыі й Рыму, лёгка прасачыць на прыкладзе дзяржаваў раньняга, а далей разьвітага фэадалізму. У гэтай фэадальнай дзяржаве першае месца займала арыстакратыя. Тое, што яна валодала вялікімі зямельнымі маемасьцямі, гэта ўжо рэзультат даўгога працэсу, абумоўленага чысьленнымі прычынамі.

Земляныя, ленныя спачатку, а далей і вотчынныя дамэны не самавольна захапляліся ў заходняй Эўропе рыцарамі, графамі й герцогамі, а на ейным усходзе баярамі, княжатамі й панятамі. За землі й за палучаны з валоданьнем землянымі прасторамі ўплыў у фэадальнай дзяржаве плацілася цаною крыві, што пралівалі адважнейшыя, баронячы сваю нацыянальную справу. Гэты ўплыў здабывалі адно найздальнейшыя й найразумнейшыя, што сваймі радамі дапамагалі валадаром кіраваць дзяржаваю. Ён здабываўся ў выніку далёкіх і небясьпечных у тую пару падарожжаў на службе свае бацькаўшчыны. Яго мелі найбольш сьветлыя, найлепш вучоныя людзі.

Нельга недаацэньваць і ўплыву эканамічнага ў выніку сацыяльна-эканамічнае дыфэрэнцыяцыі жыхарства, тым больш што з часам, з уваходам на жыцьцёвую арэну ўсё новых і новых пакаленьняў, гэты эканамічны ўплыў пачаў расьці, выходзячы ў рэшце рэштаў на першае месца й адсоўваючы на другое й асабістыя заслугі, і здольнасьці. Але было-б няправільна ня помніць і аб значэньні апошніх, менавіта — у першую пару.

Удзел жыхарства ці паасобных ягоных часткаў у ўладзе найпрасьцей ужыцьцяўляецца ў форме беспасярэдняе простае працы ў ёй. Калі краем кіравалі із дапамогаю народных сходаў або вечаў — на іх зьбіраліся ўсе вольныя грамадзяне тагачаснае дзяржавы (ці, як гэта часта бывала — жыхары ейнага галоўнага места). Калі кароль ці князь кіраваў дзяржаваю разам із фэадальнай арыстакратыяй,— апошняя прыймала ўдзел у гаспадарскіх радах спачатку in corpore, зьбіраючыся да валадара ў вялікія сьвяты, каб павіншаваць яго й даць раду ў дзяржаўных справах. Найбліжэйшыя да валадара сябры гэтае арыстакратыі, найздальней-

шыя кіраваць дзяржаваю, прыймалі ўдзел у ягоных прыбочных радах часьцей, блізу штодня. Спачатку іх ня выбіраў ніхто, іх прыцягваў да сябе й дзяржаўнае працы сам валадар.

Але пазьней усё часьцей адчувалася патрэба зьмяніць спосаб надта ўжо шырокіх пагалоўных зьездаў фэадальнае арыстакратыі да валадара, у якіх прыймалі ўдзел і людзі, што зусім ня былі здольныя да дзяржаўнага жыцьця, і, гэтым самым, адчулася патрэба зьмяніць самыя нарады із самадумам абранымі валадаром сябрамі верхняга стану, якія, бяссумлеву, ня мелі належнае кантролі над справамі дзяржавы.

Само жыцьцё выразна ставіла пытаньне аб выхадзе з гэтага палажэньня. І выхад быў знойдзены. У выснаве, няраз даўгога працэсу, былі пастаўленыя далейшыя крокі да арганізацыі вузейшага прадстаўніцкага органу ўлады. Напачатку найбуйнейшыя фэадалы або прадстаўнікі мясцовае (каралеўскае, вялікакняскае) адміністрацыі пачалі запрашаць із сабою на зьезд, да валадара, колькіх прадстаўнікоў рыцарскага стану (шэвалье, дваран, шляхты, знатных вайсковых). Але памалу справы дайшлі да выбару гэтых прадстаўнікоў на сваім мясцовым станавым сходзе.

Далейшы цяг разьвіцьця парлямэнтарных установаў — гэта працэс пашырэньня іхнага ўплыву на шырэйшыя галіны дзяржаўных справаў і змаганьне ўсіх групаў і клясаў народу за ўдзел у выбары прадстаўнікоў у парлямэнт. Працэс гэты быў даўгі й цяжкі, але ўрэшце выбары ў парлямэнт сталіся ўсеагульнымі, а самы працэс іхны забесьпячаў тайну галасаваньня, прапарцыянальнасьць прадстаўніцтва розных партыяў і групаў і г. д.

Папраўдзе, простым шляхам гэтага разьвіцьця пайшла адна толькі Ангельшчына. У іншых гаспадарствах Эўропы старыя парлямэнтарныя ўстановы ў бальшыні замерлі. Некаторыя зь іх прыпынілі сваё быцьцё й дзейнасьць у выніку разьвіцьця каралеўскага абсалютызму, што не цярпеў каля сябе іншых органаў вышэйшае ўлады (Францыя), іншыя скончылі сваё жыцьцё, заваяваныя варожаю дзяржаваю, што, зачыняючы мясцовы парлямэнт, тым самым ліквідавала мясцовую дзяржаўнасьць (Чэхія, Польша, Літва [Беларусь], Украіна).

Але ход разьвіцьця парлямэнту ў незалежным краі

і ў народзе, што здолеў абараніць свае правы на ўдзел у ўладзе,— маю на ўвеце Ангельшчыну,— ясна сьведчыць, у які бок ішло заканамернае разьвіцьцё парлямэнтарных установаў. І мы ведаем, што ў вялікай бальшыні эўрапейскіх краінаў (як і ў краёх Амэрыкі й Аўстраліі) у XIX ст. прадстаўніцтва народу дзеля вырашэння заканадатных пытаньняў аднаўляецца ўжо ў новых формах, у большай ці меншай меры пазычаных з клясычнае формы ангельскага парлямэнту.

На паўночным захадзе ўсходняе часткі Эўропы ляжыць прастора, занятая адным з эўрапейскіх народаў — народам беларускім. Шырака раскінуліся там вялізныя лесавыя масывы, уробленыя рупнаю рукою чалавека палі, зялёныя лагі ды сенажаці. На гэтых прасторах ад Беластоку за Смаленск, ад Дзьвінску па Старадуб, на берагох прыгожых рэкаў Дняпра, Нёмну й Дзьвіны, Сожу, Бярэзіны ды інш. на працягу вякоў змагаўся за сваё быцьцё, працаваў і тварыў сваю апрычоную культуру беларускі народ.

Ціхім жыцьцём жылі да нядаўна пачарнелыя дзеравяныя хаты беларускае вёскі. Месты Беларусі й сяньня ня ёсьць цэнтрамі вялікае прамысловасці або магутнымі асяродкамі культурных установаў.

Але былі часы, калі беларускі край

Далёка быў знаны
За літоўскай і ляскай зямлёю.

У тыя часы жыцьцё ў беларускіх мястох кіпела, грознай сілай былі аддзелы беларускіх войскаў, горда, як роўны з роўным, гаварыў беларускі народ із сваймі суседзямі, і суседзі гэтыя, як і далёкія народы Заходняе Эўропы, паважалі й шанавалі беларускую сілу, багацьце й культуру. У гэныя часы прыгожа расьцьвіў і беларускі парлямэнтарызм, самастойны вынік разьвіцьця беларускага дзяржаўнага жыцьця.

Беларуская дзяржава пачала складацца ў X—XI стст. нашае эры, спачатку ў выглядзе асобных дзяржаўна-пляменных арганізмаў, яшчэ не задзіночаных у суцэльную нацыянальную адзінку. Далей, задзіночаная ў вялікай сваёй частцы аднэй князёўскай дынастыяй, яна ў той-жа час пачала распадацца на цэлы шэраг асобных земляў і княстваў, якія ў свой чарод, падобна да раньняе дзяржаўнае арганізацыі фэадальнага тыпу,

падзяліліся на апрычоныя, меншага памеру князёўскія ўдзелы.

Кажны з гэтых удзелаў, кажнае з гэтых княстваў было дзяржаўнай арганізацыяй фэадальнага тыпу, васальнай да большага й вышшага валадара і сюзэрэннай да меншых і ніжэйшых адзінкаў. Аднак беларускія княствы жылі задзіночаны ў адну дзяржаву ня толькі дачыненьнямі сувязі й падпарадкаваньня фэадальнага тыпу. Лучыў іх у адно яшчэ й орган гэтае сувязі, якім трэба ўважаць т. зв. князёўскія сьнемы.

Сьнем — тэрмін ня чужы славянскім мовам. У мове чэскай ён проста азначае парлямэнт. Цяпер чэскі народ укладае ў гэтае разуменьне зьмест прадстаўніцкае заканадатнае дзяржаўнае ўстановы. Але сьнемамі звaліся й першыя сходы чэскага народу ў даўнейшыя часы, калі элемэнту прадстаўніцтва на іх яшчэ ня было ці калі ён толькі зазначаўся. На Ўкраіне й Беларусі XI—XIII стст. (аб першай маем шматлікія ведамкі, бо да нас дайшоў украінскі летапіс, тады як беларускі летапіс ня знойдзены ці мо загінуў), сьнемамі звaліся зьезды князёў і баяраў з розных княстваў на разгляд справаў вонкавае палітыкі, а часамі й справаў заканадаўства. Наагул, мы ведаем аб сьнемах яшчэ так няшмат, што цяжка адтварыць іхны склад і працэс іхнае дзейнасьці. Але мы, бясспрэчна, можам уважаць, што якраз сьнемы й маглі быць тым зародкам, што, лучачы беларускія княствы, задзіночаныя пад уладаю Ізяслававага роду, у адну дзяржаўную арганізацыю (дарма што із слабымі яшчэ сувязямі), мог і павінен быў-бы стацца пры спрыяльных умовах тэй парлямэнтарнага тыпу ўстановаю, якой сталіся сьнемы Чэскае зямлі.

З другога боку, і баярскія думы асобных земляў і княстваў, гэтыя сходы «баяраў, што думалі» на нарадах пры князю аб справах замежнае й нутраное палітыкі, аб справах вайны й міру і аб справах заканадаўства (ёсьць ведамкі, што баярскія думы або баярскія рады разглядалі «ўставы і ўрокі» — тэрміны, якімі ў той час зазначалася разуменьне закону) маглі й павінны былі стацца жаралом для будучае ўстановы парлямэнтарнага тыпу.

Трэба ўважаць, што якраз баярскія думы й сьнемы беларускіх княстваў і сталіся зародкамі беларускага двухгасподняга парлямэнтарызму XV й XVI стагодзьдзяў. Як і бальшыня эўрапейскіх народаў, беларускі

народ у сваёй дзяржаўнай арганізацыі Вялікага княства Літоўскага меў дзьве парлямэнтарныя гасподы. Гэткімі былі: а) паны-рада і б) вальны сойм.

Абедзьвюм гаспадам беларускага парлямэнтарызму прысьвечаныя вялікія манаграфічныя дасьледваньні: аб панох-радзе ёсьць двутомная праца І. Маліноўскага, прафэсара Томскага ўнівэрсытэту, пазьней — акадэміка Ўкраінскае акадэміі навук; аб соймах — зьмястоўныя манаграфіі праф. М. Любаўскага і праф. Максімейкі. Адсылаючы сваіх чытачоў дзеля падрабязнага азнаёмленьня з парлямэнтарнымі ўстановамі Вялікага княства Літоўскага да гэтых працаў, скажам тут аб іх адно колькі словаў.

Верхняй гаспадаю Вялікага княства Літоўскага былі паны-рада. На месцы старых «баярскіх думаў» мы сустракаем яе ўжо на пачатку XV ст. За вялікага князя Вітаўта мы бачым тут біскупаў, васальных князёў, вялікакняжых намесьнікаў, ураднікаў дворскіх і земскіх, як канцлер, маршалак, падскарбі земскі, гэтман найвышшы і інш. Пазьней княскі элемэнт выходзіць з рады і на ягонае месца ўваходзяць кашталяны віленскі й троцкі, староста жамойцкі ды іншыя. Пры Казімеру паны-рада спаўняюць у часе выездаў вялікага князя (які быў і каралём польскім) агульнае кіраўніцтва дзяржавай. Судзебнік вялікага князя Казімера афармляе гэткае іх палажэньне ў заканадатным парадку, а пасьля гэта яшчэ падрабязьней вызначае прывілей вялікага князя Аляксандра 1492 г. А прывілей Жыгімонта ў 1506 г. вельмі ўзмацняе правы паноў-рады, устанаўляючы, што галава дзяржавы можа выдаваць правы толькі із згодаю рады. Акт 1506 г. ставіць вышэйшую гасподу Вялікага княства Літоўскага ў асабліва моцнае і ўплывовае палажэньне ў дзяржаве, ствараючы гэтым быццам асобную рысу старое парлямэнтарнае арганізацыі, што мае большы ўплыў, чымся гэта было ў іншых тагачасных эўрапейскіх дзяржавах.

Літоўскі Статут рэдакцыі 1529 году таксама надае паном-радзе заканадатную кампэтэнцыю. Апрача гэтае кампэтэнцыі, паны-рада бралі ўдзел у прызначаньні мясцовае адміністрацыі, у арганізацыі дзяржаўных фінансаў і кантролі над імі, разглядалі справы замежнае палітыкі, а нават займаліся справамі суду ў асобных выпадках.

Побач із панамі-радаю ад XV стагодзьдзя пачала

разьвівацца й ніжняя парлямэнтарная ўстанова, якою быў у Вялікім Княстве вальны сойм.

Сойм вырас із зьездаў шляхты, скліканае спачатку найчасьцей дзеля ўдзелу ў выбарах вялікага князя. На пачатку XVI ст. зьезд гэты быў яшчэ пагалоўны, г. зн. на яго ў прынцыпе мог прыехаць кажны шляхціч, які гэтага зажадае. Прывілей вялікага князя з 1447 г., што звальняе шляхту ад дзяржаўных падаткаў, згуляў вялікую ролю ў нараджэньні сойму як сталай установы. Адылі падаткі із шляхты ўсё-ж былі патрэбныя, і вось-жа даводзілася прасіць ейнага дазволу на іх. Так справы падатку, г. зв. «сярэбшчыны», сталіся галоўнай кампэтэнцыяй вальнага сойму і, гэтым самым, далі яму магчымасьць цьвёрда стаць у шэрагу вышэйшых установаў гаспадарства.

Побач з гэтым сойм заваяваў і іншыя галіны кампэтэнцыі ў дзяржаўных справах. Пачынаючы ад 1551 г., справы заканадатнага парадку пераходзяць на сойм (ягоны законапраект меў зацьвярджаць у форме свайго «адказу» вялікі князь). Статут 1566 г. выразна адзначае, што падаткі й правы (якія, як мы бачылі па статуце 1529 г., былі кампэтэнцыяй паноўрады) належаць ужо да кампэтэнцыі вальных соймаў. Апрача таго, на соймах разглядаліся ўмовы задзіночаньня (у форме пэрсанальнае вуніі, г. зн. аднаго караля — вялікага князя) з Польшчаю. На соймах, як мы ўжо гаварылі вышэй, праводзіліся й выбары вялікага князя па сьмерці папярэдняга. Сойм вызначаў памеры вайсковых кантынгентаў шляхоцкага «Паспалітага Рушэньня». Справы вайны й міру таксама належалі да кампэтэнцыі вальных соймаў, і, прыкладам, за Жыгімонта II Старога да вайны не дайшло адно дзеля таго, што гэтага не захацеў вальны сойм. Сойм 1563 г. спыніў абмежаньні для праваслаўнае часткі жыхарства. Вальны сойм 1564 году правёў судовую рэформу.

На вальным сойме былі прысутныя паны-радныя, дзяржаўныя ўрадаўцы, а таксама большыя магнаты, г. зв. «княжаты й паняты». Але галоўную ягоную частку складала шляхта. Яна зьбіралася спачатку пагалоўна, пасьля — прадстаўнікоў ейных прызначала мясцовая адміністрацыя. Але з часам шляхта дамаглася права самой выбіраць сваіх прадстаўнікоў.

За Жыгімонта-Аўгуста з вальнага сойму выйшлі княжаты й паняты, а шляхта паслала на сойм сваіх

выбраных прадстаўнікоў. Віленскі сойм 1565—1566 гг. пастанавіў, што шляхоцкія паслы, па 2 ад кажнага павету, маюць выбірацца на мясцовых (павятовых) соймiках, скліканых дзеля разгляду тых спраўаў, якія будуць разглядацца на вальным сойме, і даваць выбраным паслом сваю «навуку»-інструкцыю.

Мяшчанства — і ў гэтым была крыніца слабасьці вальнага сойму — было прадстаўленае на ім толькі ў форме ўдзелу на ягоных паседжаньнях прадстаўнікоў галоўнага места — Вільні. Сойм склікаўся непэрыядычна, але калі былі патрэбныя ягоныя пастановы. Месца паседжаньняў соймаў ня было вызначанае, аднак яны адбываліся найчасьцей у Вільні.

Дужа цікава, што побач з паседжаньнямі вальнага сойму йшлі пашыраныя сходы пленуму паноў-рады, якія разглядалі тыя самыя пытаньні, што й вальны сойм.

Калі гаварыць аб вальным сойме Вялікага княства Літоўскага ў цэласьці і калі прыраўнаваць яго да іншых аналягічных установаў тагачаснае Эўропы, дык трэба прыйсьці да выснаву, што вальныя соймы, якія беларускі народ стварыў у дзяржаве, званай Вялікім княствам Літоўскім, з памогаю народаў украінскага й летувіскага, жылі родам парлямэнтарнай установы дзяржавы, што пераходзіла ад фэадальных часоў да пары станавага падзелу жыхарства.

Як орган, нараджэньне й рост якога залежалі ад прычынаў аднолькавых у бальшыні эўрапейскіх краёў, ён вельмі быў падобны да іншых тагачасных эўрапейскіх парлямэнтаў, генэральных станаў, сьнемаў і г. д. Але як орган дзяржавы, што мела сваеасаблівыя рысы свайго гістарычнага разьвіцьця, вальны сойм заканамерна меў і розьніцы, раўнуючы да іншых тагачасных парлямэнтарных установаў. Адной з найважнейшых было прадстаўніцтва толькі ад аднаго стану, шляхты. Гэта сьведчыць аб меншым разьвіцьці мескага жыцьця й меншым уплыве мяшчанства на дзяржаўныя справы. І калі гэтая, у аснове ад'емная рыса, родніць беларускі сойм з соймам польскім, дык у той-жа час нельга не зацеміць і таго, што на вальным сойме Вялікага княства Літоўскага шляхоцкія масы ніколі ня мелі такога, даведзенага да скрайнасьці, станаўкога жаданьня для голасу кожнага зь іх, як гэта было ў Польшчы.

Цалкам сваеасаблівым у нас было й выключна

ўплывовае палажэньне Верхняе Гасподы — паноўрады, што адводзе парлямэнтарнай сыстэме Вялікага княства Літоўскага сваё, асобнае месца ў агульным разьвіцьці эўрапейскага парлямэнтарызму.

У 1569 г. вальны сойм Вялікага княства Літоўскага быў зьліквідаваны пасьля таго, як яно пайшло на цясьнейшую дзяржаўную сувязь з Польшчаю. Польскі сойм стаўся супольным парлямэнтам Польшчы й Літвы (Беларусі).

Але, як гэта пераканальна даводзяць працы расейскага прафэсара І. Лаппы й беларускага гісторыка Друшчыца, беларуская дзяржава ня згубіла й па Люблінскай вуніі сваёй дзяржаўнай прыроды. Застаўся й род беларускага парлямэнту, за які трэба ўважаць т. зв. галоўны соймік, на які беларускія й летувіскія шляхоцкія паслы зьбіраліся перад выездамі на агульны сойм із палякамі. Тут, на галоўным сойміку, яны вызначалі свае пазыцыі на будучых паседжаньнях сойму і, што асабліва важнае,— вырашалі справы Вялікага Княства як асобнае дзяржавы, не пераносячы іх на супольны сойм із палякамі.

У якой меры галоўны соймік быў пытаньнем права, а не адно факту, пераканальна сьведчыць тое, што Літоўскі Статут 1588 г. проста пастанаўляе, што галоўны соймік абавязкова мае быць скліканы кажны раз на два тыдні перад супольным соймам «Кароны» й «Літвы». Галоўны соймік існаваў да канца трываньня Вялікага княства Літоўскага й быў скасаваны толькі пасьля ліквідацыі беларускае дзяржаўнасьці.

«Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва».
№ 1, 1952

ЛЕЎ АКІНШЭВІЧ

ПРА «ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНЫЯ АСНОВЫ» БЕЛАРУСКАГА ГІСТАРЫЧНАГА ПРАЦЭСУ

Бясспрэчная рыса найнавейшае філязофіі гісторыі — ейная адмысловая ўвага да вывучэньня паасобных камплексаў г. зв. «культурна-гістарычных цыкляў» ці «цывілізацыяў». Гэты кірунак апраўдваецца тым, што пры больш глыбокім знаёмстве з гісторыяй паасобных людзкіх грамадаў усё з большай і большай выразнасьцяй выступаюць рысы нераўнамернасьці, нятоесамасьці, апрычонасьці гістарычнага разьвіцьця паасобных народных групаў. Усё ясьней становіцца, што супольны й тоесамы шлях агульнага разьвіцьця ўсіх людзкіх грамадаў адшукаць цяжка. Усё больш выразна зазначаецца й неаднолькавасьць гэтага гістарычнага разьвіцьця. Прыкладам, нават Марксу й Энгельсу давялося вылучыць адмысловы «азіяцкі спосаб вытворчасьці», які яны знаходзілі ў гісторыі Кітаю й старадаўнага Эгіпту, і гэты «спосаб» выразна выломваўся із стройнай нібы схэмы «сацыяльна-эканамічных фармацыяў», што прыходзяць на зьмену адна аднэй у гісторыі сьвету.

Справа, аднак, выходзіць далёка за межы Кітаю й Эгіпту, бо цэлы шэраг людзкіх арганізацыяў таксама мае тэндэнцыю выломвацца із схэмы агульнага й аднолькавага (у асноўных рысах) людзкога прагрэсу. Усё ясьней робіцца, што ўсе схэмы прагрэсыўнага разьвіцьця народаў сьвету ў запраўднасьці абапіраюцца на нібы «клясычным» прыкладзе гісторыі Заходняй Эўропы. З часам сталася ясным, што й сама гісторыя гэтай апошняй ня ёсьць адзінай і бесьперапыннай, што яна лучыць у сабе адменныя самастойныя цывілізацыйныя цыклі антычнага (грэка-рымскага) й мадэрнага (рамана-германскага) тыпу.

Шэраг рысаў сучаснай заходняэўрапейскай цывілізацыі выразна аддзяляюць ейнае разьвіцьцё ад разьвіцьця іншых людзкіх грамадаў. Апошнія ня ведалі й ня ведаюць такога выразнага й юрыдычна абгрунтаванага падзелу дзяржаўнае ўлады, як гэта было ў заходняэўрапейскім феадалізьме. Яны не стварылі на базе вынікаў фэадалізму грамады з усталенымі правамі грамадзянаў дзеля ўдзелу ў дзяржаўным кіраўніцтве й кантролю над ім. Яны ніколі не дайшлі да таго кансэквэнтнага выніку асабістае волі, пэрсанальнае ініцыятывы й цьвёрдасьці прынцыпу прыватнай уласнасьці, які стварыў клясычныя ўзоры заходня-эўрапейскага (а за ім і амэрыканскага) «капіталізму». Мы тут бярэм адно праўныя й гаспадарчыя катэгорыі. Але можна й трэба гаварыць і пра адменныя прынцыпы ў агульнакультурным, рэлігійным, маральным ды іншым жыцьці й прагрэсе розных людзкіх групаў.

За асобную й адмысловую рысу заходняй цывілізацыі F. S. C. Northrop («The Taming of the Nations». Ney York. 1952. бач. 186—213) уважае ейную рымскую спадчыну і, асабліва, засвоеныя ёй канцэпцыі цьвярдых і агульна-зьвязваючых усё жыхарства прынцыпаў рымскага права. У гэтай думцы ёсьць шмат праўды.

Гэтая заходняя цывілізацыя была і ў сваёй аснове ёсьць адзінай, нягледзячы на стракатую адменнасьць ейных паасобных нацыянальных кампанэнтаў. Пра гэта так пісаў расейскі славянафіл Н. Данілеўскі, адзін з заснавальнікаў тэорыі культурна-гістарычных «цыклічных тыпаў»: «Гэта, у сапраўднасьці, гісторыя аднаго цэлага... Як ніхто ня думае аб асобнай цывілізацыі Атэнаў ці Спарты, гэтаксама няма чаго гаварыць пра асобную гісторыю Францыі, Італіі ці Нямеччыны. Такой гісторыі ў сапраўднасьці няма зусім, а ёсьць толькі гісторыя Эўропы з французскага, італьянскага, ангельскага ці нямецкага гледзішча...» («Россия и Европа», б. 110.)

Ці пануе «клясычная» цывілізацыя Заходняе Эўропы на прасторы ўсяго эўрапейскага абшару? І ці належаць да гэтага цывілізацыйнага камплексу народы, якія засяляюць шырокія прасторы Ўсходу Эўропы? На гэтыя пытаньні даваліся розныя адказы. Калі расейскі гісторык Паўлаў-Сільванскі першы заявіў пра існаваньне феадалізму ў Расеі, ён гэтым самым ставіў гісторыю Расеі на адну роўню з гісторыяй Захаду. Калі савецкая

гістарычная навука прыймае гістарычную схэму Маркса — Энгельса, дык яна гэтым самым ізноў ставіць расейскую гісторыю на адзін шлях з гісторыяй Захаду. Калі ўкраінскія гісторыкі В. Ліпінскі й С. Тамашэўскі ставяць пытаньне пра заходнія асновы культурнага й палітычнага разьвіцьця ўкраінскага народу, яны гэтым самым вылучаюць гэты ўсходня-эўрапейскі народ з кола культурнага цыклю Ўсходняе Эўропы.

Што да народу расейскага, дык ягоная культурная сваеасаблівасьць і адменнасьць ягоных гістарычных шляхоў вызнаюцца цяпер шмат кім з гісторыкаў за бясспрэчныя. Адкінутыя й запярэчаныя ў свой час ідэі расейскіх славянафілаў і расейскіх народнікаў, якія верылі ў магчымасьць для Расеі мінуць капіталістычны шлях разьвіцьця, шмат у чым у наш час здаюцца ня гэткімі ўжо сьмешнымі й галаслоўнымі.

«У расейскага народу,— піша расейскі філёзаф нашага часу,— была вялізарная сіла стыхіі й параўнальная слабасьць формы... У народаў Заходняе Эўропы ўсё шмат лепш выясьнена й аформлена, усё падзелена на катэгорыі і ўсё нязьменнае. Расея ніколі ня была ў заходнім сэнсе краінай арыстакратычнай, як ня сталася яна й буржуазнай» (Н. Бердяев, «Русская идея», б. 6).

«Расейцы,— піша А. Тойнбі,— былі хрысьціянамі, й шмат хто зь іх і цяпер зьяўляюцца імі, але яны ніколі ня былі хрысьціянамі Захаду. Расея жыла наверненая ў хрысьціянства ня з Рыму, як Ангельшчына, але з Канстантынопалю, і, нягледзячы на іхную супольную хрысьціянскую аснову, усходняе й заходняе хрысьціянства былі заўсёды адно ад аднаго далёкія, а часам — адно аднаму антыпатычныя й варожыя» («The World and the West», p. 4).

«Расея,— пісаў ужо згаданы намі Н. Данілеўскі, — не належыць ані да эўрапейскага дабра, ані эўрапейскага зла, як-жа можа яна належаць да Эўропы?» (там-жа, б. б. 60—61). «Яе ня жывілі,— кажа ён,— ніводзін з тых карэньняў, празь якія Эўропа ўбірала як добрыя, гэтак і шкодныя сокі беспасярэдна зруйнаванага ёю антычнага сьвету, не кармілі яе й тыя карэньні, якія чэрпалі жыўнасьць з глыбіні нямецкага духу. Ня была яна й часткай адноўленай Рымскай імпэрыі Карлы Вялікага, якая творыць нібы супольны камель, праз падзел якога паўстала ўсё галінастае эўрапейскае

дрэва,— не ўваходзіла да складу той тэарэтычнай фэдэрацыі, якая заступіла сабою Карлаву манархію,— ня зьвязвалася ў адно агульнае цела фэадальна-арыстакратычнай сеткай, якая (як у часе Карлы, гэтак і ў часы свайго рыцарскага красаваньня) ня мела ў сабе нічога нацыянальнага, а была ўстановай агульнаэўрапейскай у поўным сэнсе гэтага слова. Пасьля, калі настаў новы век і пачаўся новы парадак рэчаў, Расея таксама ня брала ўдзелу ў змаганьні з фэадальным прыгнечаньнем, вынікам якога на Захадзе было забясьпечаньне тэй формы рэлігійнае свабоды, якая называе сябе пратэстанцтвам. Ня ведала Расея й гнёту, а зь іншага боку і ўзгадавальнага ўзьдзеяньня схалястыкі, ды ня вырабіла тэй свабоды думкі, якая стварыла новую навуку...» (там-жа).

Ня будзем разглядаць тут пытаньне, ці мае слушнасьць Данілеўскі ў дэталях свайго супроцьстаўленьня Расеі Заходняй Эўропе. Для нас даволі будзе прызнаць яму часткавую слушнасьць, каб ужо шмат у чым зразумець іншыя цывілізацыйныя асновы расейскае культуры.

Наступным і заканамерным будзе пытаньне: дзе ў гэтым цывілізацыйным камплексе канчаецца Расея й пачынаецца Ўсходняя Эўропа ў цэласьці? Пытаньне гэтае можа быць пастаўленае ў шмат якіх плашчынях. Можна, прыкладам, аднесьці да ўсходня-эўрапейскага культурна-гістарычнага камплексу саму Расею, далучыўшы да яе хіба ейных цюркскіх, усходня-фінскіх ды мангольскіх падданых. Гэта мы знойдзем ня толькі ў згаданых вышэй украінскіх гісторыкаў, але і ў найноўшых працах у ангельскай мове Оскара Галецкага. Можна, зь іншага боку, паставіць пытаньне й пра ролю іншых усходня-эўрапейскіх народаў: беларусаў, летувісаў, украінцаў ды інш. Куды належыць іхная гісторыя? Ці былі гэта далёка высунутыя на ўсход арганічныя часткі Заходняй Эўропы. Ці, наадварот, гэта былі арганічныя часткі Эўропы Ўсходняй, адно тэрытарыяльна бліжэйшыя да Захаду й якія з гэтае прычыны перанялі ад гэтага Захаду шэраг ягоных рысаў і культурных асаблівасьцяў. Ці, нарэшце, гісторыя гэтых народаў зьяўляецца гісторыяй глыбокіх нутраных канфліктаў, якія вынікаюць з прычыны паміжлежнага, «міжкультурнага» палажэньня іхных земляў.

Усё гэта вельмі паважныя праблемы, і ад іхнага

вырашэньня шмат у чым залежыць уся ацэна гісторыі гэтых народаў ды праўдзівае разуменьне яе.

Трэба адразу адкінуць кажную спробу падыйсьці да вырашэньня згаданых праблемаў з пазыцыі тых ці іншых палітычных інтарэсаў нашае сучаснасьці. Расейская імпэрыя, якая на цэлыя стагодзьдзі палучыла пад сваёй уладай шматлікія й разнародныя народы й нацыі Ўсходняе Эўропы, мае гарачых абаронцаў і зацятых ворагаў. Якраз выходзячы з гэтых пачуцьцяў і перакананьняў, шмат хто з гісторыкаў Усходняе Эўропы й дае кірунак сваім гістарычным паглядам. Сумлеўна, ці гэта справядліва.

Расейская імпэрыя, як і ўсё на сьвеце, зьявішча часовае. Усходняя Эўропа магла быць палітычна нязлучаная ў адну цэласьць (як гэта дагэтуль ёсьць з Эўропай Заходняй) і ўсё-ткі тэарэтычна быць адзіным цывілізацыйным цэлым. І наадварот, яна можа быць злучаная ў адно дзяржаўнае цела, але ўсё-ж быць разнародным у сваім агульна-культурным зьмесьце камплексам. (Гэткім яна ўжо, без усялякага сумлеву, і бывала, улучаючы ў сябе выразна заходніх фінаў ці палякаў ды выразна далёка-ўсходніх манголаў або карэйцаў.) Само злучэньне ўсходня-эўрапейскіх народаў — калі яно ўжо мела стацца — зусім не абавязкава мусіла адбыцца пад эгідай расейскае Масквы. Вельмі лёгка палітычным цэнтрам Усходняе Эўропы мог стацца ўкраінскі Кіеў, ці беларуская Вільня, або й татарскі Сарай-Бэркэ. Мы ведаем, што спробы й змаганьне за гэткае пяршынство іншых, нерасейскіх народаў запраўды мелі месца.

Падыходзячы з гэтага гледзішча спэцыяльна да гісторыі беларускага народу, трэба сказаць, што яна не дае выразнага й апрыёрнага адказу на пытаньне, арганічнай часткай якога «культурна-гістарычнага цыклю» было ягонае гістарычнае разьвіцьцё. А калі гэтак, дык трэба зьбіраць матар'ялы, якія могуць нам сказаць што-колечы ў справе вырашэньня гэтае праблемы. Тут, у гэтым артыкуле, можна закрануць хіба самыя агульныя (й далёка не вычарпальныя) аргумэнты.

У часы «князёўскія» (X—XIII стст.) беларускія княствы, бясспрэчна, менш за ўкраінскія й расейскія, мелі тэндэнцыю да злучэньня ў аднэй «рускай» цэласьці. Звычайна гэта тлумачаць тым, што тут была асобная князёўская дынастыя. Гэтае тлумачэньне мала пераканаць

нальнае. Нам думаецца, што яны вылучаліся нечым іншым і ў першую чаргу, як відаць, тым, што глыбіня супольных культурных уплываў (перадусім — уплываў бізантыйскіх) тут была меншая. Не малую ролю іграў таксама мамэнт расавай і культурнай блізіні да старых суседзяў (а магчыма, і старых родзічаў), народаў «балцкае» групы — да летувісаў і латышоў. Блізіня ды моц сувязяў з Заходняй Эўропай была тут ці не асабліва поўнай.

Ці рабіла гэта беларускія княствы часткаю Заходняй Эўропы, вылучаючы іх з усходня-эўрапейскіх камплексаў Кіеўскае імпэрыі й Суздальскае зямлі? Сьцьвярджаць гэта немагчыма: князёўская Беларусь была, агулам бяручы, усё-ж у коле палітычных і культурных уплываў усходня-эўрапейскага, «славяна-бізантыйскага» цыклю.

Ці прынесла якасныя зьмены новая эпоха, калі зарганізавалася вялікая «Літоўская» імпэрыя й калі (XIV—XVII стст.) беларуская культура й мова сталіся асноўнай базай палітычнай і культурнай сувязі паміж паасобнымі й рознымі часткамі вялікага цела гэтае імпэрыі? Каб даць адказ на гэтую праблему, трэба вырашыць некаторыя ейныя часткі. Аднэй зь іх мае быць пытаньне пра гістарычныя заданьні, якія ставіў перад сабой «Літоўскі» дзяржаўны саюз, другой — пытаньне пра кірунак і шлях культурных уплываў і ар'ентацыяў.

Яшчэ Макіявэлі ўважаў, што «арганічнай» рысай кажнай дзяржаўнай арганізацыі, калі яна здаровая дзяржаўная арганізацыя, зьяўляецца нахіл да пашырэньня ейных межаў. У наш час з гэтым паглядам ня шмат хто мог-бы пагадзіцца. Але наш час — гэта час перамогі тэндэнцыяў стрымліваньня й абмежаваньня вольнай гульні ў сфэры міждзяржаўных дачыненьняў. На гэта, ведама, ёсьць свае прычыны. Ды мы цяпер гаворым пра Вялікае княства Літоўскае й пра часы Макіявэлі. Для тае эпохі ягонае цьверджаньне ня было памылковым.

Як здаровы й моцны арганізм XIV—XVI стст. (гаворым цяпер адно пра гэты пэрыяд), Вялікае княства Літоўскае вяло палітыку заваяваньняў. Гэтая палітыка даўгі час была ўдалай, а ейны кірунак быў выразны: ён ішоў па лініі змаганьня дзеля задзіночаньня вакол беларускае Вільні ўсіх галоўных частак усходня-эўра-

пейскага цыклю. Мы ведаем, што арганічным удзельнікам у дзяржаўным жыцьці Літвы-Беларусі быў побач зь беларускім і летувіскі народ, да іх пазьней далучылася асноўная частка ўкраінскага жыхарства Прыдняпроўя, часткава й часова ўваходзілі сюды й часткі заходня-расейскіх княстваў. Даўгі час віленскі князь быў найбольш магчымым кандыдатам на галаву вялікае ўсходня-эўрапейскае імпэрыі, што лучыла ў сабе ўсю асноўную прастору Ўсходняе Эўропы.

Мы гаворым пра гэты працэс таму, што гісторыя Ўсходняе Эўропы не тварыла дагэтуль магчымасьці сужыцьця (хоць-бы й далёка ня мірнага) розных нацыянальных самастойных дзяржаўных адзінак, як гэта было ў Эўропе Заходняй. Тут адзін арганізм імкнуўся стаць гегемонам над іншымі, і, галоўнае, якраз тут ён здолеў гэтага дасягнуць.

Мы ведаем, што гэтая вялікая гістарычная наважнасьць літоўска-беларускіх князёў — злучыць пад знакам Віленскае Пагоні ўсю Ўсходнюю Эўропу — у канцы закончылася няўдачай. Вялікі паход на ўсход і поўдзень зьмяніўся палітыкай абароны перад усходам і поўднем, саюзу «Літвы» з Польшчай, вялікімі ўдачамі Масквы. Не беларуская Вільня, а расейская Масква сіламоц злучыла пад сваёй уладай народы вялікіх прастораў усходня-эўрапейскай раўніны. На даўгія гады расейская культура стала дамінантным выказьнікам творчых праяваў сваеасаблівага генія ўсходня-эўрапейскіх нацыяў.

Чаму гэтак сталася? Нам адказваюць: вайсковыя няўдачы «Літвы». Ці гэта можа здаволіць нас? Матар'яльныя рэсурсы Вялікага княства Літоўскага ня былі меншымі за рэсурсы Маскоўскага гаспадарства. Кажуць яшчэ: сацыяльны антаганізм паміж шляхтай і сялянствам. Але ці-ж ня было гэта скрозь у тагачасных дзяржавах? Нам кажуць: змаганьне спалячанае шляхты зь вернымі старой культуры народнымі масамі, змаганьне вуніі й праваслаўя. Але чаму мела месца гэтае змаганьне і ў чым прычыны ўсёй ягонай гарачыні?

Мяркуем, што ўсе гэтыя факты мелі сваё значаньне, але асноўнай прычынай паразы «Літвы» быў дэманстратыўны выбар ейнай элітай заходняга (а ня ўсходняга) шляху. Адразу зробім заўвагу: гэты выбар і гэты шлях абяцалі й запраўды далі вельмі памысныя вынікі.

Яны адкрылі жывую крыніцу больш сьпелае заходняе культуры, і з гэтай крыніцы пілі ды ёй жывіліся найлепшыя дзеячы беларускага й іншых народаў Вялікага Княства. І калі мы гаворым пра гэта як пра прычыну паразы, дык маем на ўвазе тое, што заходняя культура прывівалася да іншага культурнага пня. Гэта рабіла новую расьціну хай і часова, але слабой. А перад ёй стаялі іншыя ўсходня-эўрапейскія грамады, усё менш і менш закранутыя заходняй культурай, далейжа на ўсход незакранутыя зусім, ёй арганічна чужыя. Яны наважна супраціўляліся заходняй плыні, і чым больш «заходняй» рабілася «Літва», тым мацнейшай і наважнейшай была сіла іхнага супраціву.

Чым паўнейшай была вэстэрнізацыя Вялікага княства Літоўскага (у аснове якраз гэтак мае быць названы працэс вялікіх палітычных і культурных зьменаў XVI—XVIII стст.), тым большы яна сустракала адпор як унутры краіны, гэтак, і асабліва, звонку — з паўдня й з усходу. Калі вялікі князь прыняў каталіцтва й каталіцкі клер атрымаў шэраг прывілеяў ды калі беларускі й летувіскі шляхціч загаварыў па-польску,— супраціў набыў яшчэ большую вайстрыню. Вось-жа ў самым працэсе ўсё большай і большай вэстэрнізацыі «Літвы» мы бачым нейкі дзіўны парадокс: чым паўнейшым і, здавалася-б, больш плённым ён быў — тым слабейшай і менш задзіночанай рабілася нацыянальная грамада.

Праўда, такога наважнага выступу супроць вэстэрнізацыі, як гэта было, прыкладам, на Ўкраіне ў часы Багдана Хмяльніцкага, на Беларусі-Літве ня было. Але й тут быў у сярэдзіне XVII ст. казацкі рух. І тут было войстрае змаганьне паміж каталіцтвам і вуніяй з аднаго боку, і праваслаўем зь іншага. Было-б дзяцінствам думаць, што гэтае змаганьне было толькі выяўленьнем пэўных рэлігійных адменаў. Ягоная абвостранасьць і глыбіня гавораць нам пра іншае — пра вялікае змаганьне дзьвюх культурных асноваў.

Час вялікае Літоўска-Беларускае дзяржавы зьяўляецца часам вялікіх культурных здабыткаў. Ці ня першым зь іх было стварэньне дасканалай сыстэмы праўных нормаў, сабраных у славутых Літоўскіх Статутах. Зацемім: Літоўскія Статуты праводзілі ў беларускую (украінскую, летувіскую) грамаду вялікія прынцыпы праўнай сталасьці, праўнай адказнасьці,

значаньне прыватнае ўласнасьці й г. д. Гэта былі вялікія прынцыпы рымскае, а пазьней і заходня-эўрапейскае цывілізацыяў. Але ўспрыймаліся яны беларускімі праўнікамі не мэханічна, а творча перапрацоўваліся на базе старых, адвечных праўных звычаяў княжае эпохі. Жыцьцё, аднак, уносіла ў гэтую тэарэтычна-сталую пабудову юрыдычных правілаў сваю карэктыву, робячы часта беларуска-летувіскую грамаду краінай шляхоцкіх праўных парушэньняў.

У Вялікім княстве Літоўскім, як у пэўнай цэласьці, мы выразна бачым грамаду пераходнага тыпу, у якой змагаліся паміж сабой заходнія й усходня-эўрапейскія цывілізацыйныя ўплывы. Некаторая, прынамсе вонкавая, перамога першых адштурхнула ад Беларуска-Літоўскае дзяржавы суседнія землі з усходня-эўрапейскай культурнай асновай. Гэта аддало іх у канцовым выніку ў рукі Масквы. У самой-жа дзяржаве змаганьне дзьвюх цывілізацыйных асноваў гэтак і не прывяло да здаровай і арганічнай іхнай сынтэзы. У гэтым была прычына, што ў канцы XVIII ст. Вялікае Княства, паслабленае й нутрана вычарпанае, стала лёгкай здабычай Расеі.

Мінулі стагодзьдзі. У іхным часе беларуская грамада ня жыла творчым культурна-палітычным жыцьцём, аддаючы свае лепшыя сілы, сваіх найздальнейшых сыноў, ці расейскай ці польскай культурам. Сама-ж Беларусь заставалася краем, дзе спробы русыфікацыі мелі больш вонкавыя ўдачы, пакідаючы краіну ўсьцяж у тым-жа палажэньні наяўнасьці дзьвюх — заходняй і ўсходняй — эўрапейскіх культурных асноваў.

Вялікі рух беларускага нацыянальнага адраджэньня другой паловы XIX й першай паловы XX стагодзьдзяў меў перад сабой ня толькі заданьне адрадзіць ці пабудаваць нацыянальную народна-беларускую культуру. Перад ім павінны былі паўстаць і іншыя заданьні, а сярод іх адно з найважнейшых — вызначэньне «цывілізацыйнай базы» для гэтае пабудовы. У сувязі з гэтым наяўнасьць «шляхоцкіх» і «сялянскіх» плыняў у беларускай літаратуры й культуры не гавораць адно пра «клясавую» аснову гэтых адменаў. Наяўнасьць «каталіцкіх» і «праваслаўных» тэндэнцыяў гавораць ня толькі пра розьніцы ў рэлігійных паглядах. Культурнае «русафільства» ці «палянафільства» ня былі ад-

но перажыткамі «адукацыйных уплываў». Справа, бясспрэчна, была больш складанай.

Беларуская культура яшчэ ня вырашыла гэтых праблемаў. Да гэтага часу на згаданым шляху стаялі пераважна вонкавыя перашкоды. Трэба спадзявацца, што, здабыўшы магчымасьці вольнага разьвіцьця, яна дасягне таго, чаго не ўдалося вялікай Беларуска-Літоўскай дзяржаве XIV—XVIII стст.: здаровай, арганічнай, да апошняй грані праведзенай сынтэзы сваіх цывілізацыйных асноваў. І для ўдачы гэтае справы ёсьць запарука: вялікая любасьць і вялікая ахвярнасьць, якія былі асновай беларускага адраджэньня, пачынаючы ад ягоных першых крокаў.

Гэтая любасьць і гэтая ахвярнасьць неабходныя для творчага працэсу будовы ўсёй нацыянальнай асновы. Дасягнуўшы гэтай сваёй сынтэзы, беларускі народ будзе мець перад сабой вялікія творчыя магчымасьці. І хто ведае, можа,— карысныя ня толькі для яго аднаго. Бо, магчыма, яны асьвецяць новым сьвятлом зь беларускай Вільні ці Менску й вялікія прасторы іншых усходня-эўрапейскіх земляў.

«Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва».
№ 2, 1953

МІКОЛА КУЛІКОВІЧ

БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫКА

Залатая пара (XIV—XVII стст.)

1

Пэрыяд ад сярэдзіны XIII ст. і, блізу што, да канца XVII ст. стаўся *найбольш бліскучаю парою ў гісторыі Беларусі*. У гэты пэрыяд беларускія княствы задзіночваюцца ў адну магутную дзяржаву, ведамую пад назоваю *Вялікага княства Літоўскага* (мы захаваем у далейшым гэтую афіцыяльную назову), з тэрыторыяй ад Чорнага да Балтыйскага мора, ад Берасьця па Мажайск. На ўсіх прасторах гэтае тэрыторыі беларуская мова сталася афіцыйнаю дзяржаўнаю моваю, а *беларуская культура — галоўнаю, пануючаю*. Дадзеная эпоха атрымала ў гісторыі Беларусі вельмі вобразную назову *залатое пары*, залатога веку беларускае дзяржаўнасьці й культуры.

Дзеля ясьнейшага зразуменьня й асваеньня тых музычных зьяваў, што ахапляліся ёю, лепш разьбіць эпоху залатое пары на два пэрыяды: першапачатны ад сярэдзіны XIII ст. й да сярэдзіны XV ст. і другі (і найбольш яскравы) пэрыяд красаваньня — ад сярэдзіны XV й да канца XVII ст. Разгледзім іх у гэтым парадку.

Калі ў паасобных беларускіх княствах (і асабліва ў Полацкім) мы ўжо наглядалі шырокае разьвіцьцё музычнага мастацтва, дык у Вялікім княстве Літоўскім, і асабліва пры такіх выдатных валадарох, як кароль Мяндог, вялікія князі Гэдымін, Альгерд, Ягайла, Вітаўт і інш., гэтыя магчымасьці ў шмат разоў узрастаюць.

Арганізацыя цэнтральнага вялікакняскага двара, значнае ажыўленьне сталічнага жыцьця (спачатку ў Наваградку, потым у Вільні) ды перафармаваньне яго на эўрапейскі лад дае плодную глебу для *падвышэньня ўзроўню музычнага абслугоўваньня, прыцягвае* да дзей-

насьці *самыя разнастайныя музычныя спэцыяльнасьці ў галіне вакальнага й інструмэнтальнага мастацтва.* Усё мацнейшыя ды глыбейшыя сувязі з эўрапейскімі дзяржавамі судзеюць пранікненьню ў Беларусь і асяданьню тут *высокакультурнае заходняэўрапейскае* музыкі й *ейных прадстаўнікоў.*

Двор вялікага князя й сталічнае жыцьцё робяцца ўзорам, прыкладам для іншых беларускіх княстваў, падымаюць і там культурны ўзровень, які й дагэтуль у шмат якіх княствах быў вельмі высокі (Полацкае, Смаленскае, Віцебскае, Менскае), і яны пераживаюць лепшы час свайго існаваньня. У шмат якіх галінах жыцьцё беларускіх княстваў у гэты пэрыяд ня ўступала жыцьцю Заходняе Эўропы.

Ёсьць дадзеныя цьвердзіць, што ў гэты пэрыяд Беларусь таксама ведала тагачасныя *формы рыцарскае паэзіі ды музыкі.* Паводле сьведчаньняў нямецкае хронікі (Пётры Дюсбурга) мы ведаем аб пашырэньні ў Беларусі рыцарства й рыцарскіх ордэнаў (асабліва было знанае полацкае рыцарства).

Прыняўшы заходняэўрапейскія традыцыі, беларускае рыцарства не магло, зразумела, ня ведаць і не карыстаць з культурных праяваў рыцарскага жыцьця, формаў і жанраў заходняэўрапейскае *рыцарскае мэлёдычнае паэзіі* — культу каханьня ў жанчыны («дамы сэрца»): любоўныя навэлі, канцоны, танцавальныя песьні, нязвычайна папулярныя ў асяродзьдзі правансальскіх трубадураў, нармандзкіх трувэраў і нямецкіх міннэзэнгераў. Тыя-ж уплывы маглі спрычыніцца да знаёмства й карыстаньня лютнёваю музыкаю й лютнёвымі, флейтавымі ды скрыпачнымі інструмэнтамі.

Значнымі крокамі йдзе й разьвіцьцё музыкі па лініі іншага, царкоўнага, культавога цэнтру, разам із памацненьнем ейных уплываў у дзяржаўным і народным жыцьці. У гэты пэрыяд у Беларусі арганізоўваецца аўтакефальная беларуская мітраполія, якая абыймае сваёй юрысдыкцыяй усе беларускія землі (арганізаваная яшчэ ў 1291 г. у Наваградку, ужо ў наступным годзе зацьверджаная канстантынопальскім патрыярхам).

Пашыраючы свае ўплывы й моц, падтрымліваючы пышнасьць храмаў і царкоўнае службы, царква прынаджвае на службу шматлікія кадры *культавых музыкаў-прафэсыяналаў*: рэгентаў, харыстаў, настаўнікаў

сьпеву й музыкі. Ува ўсіх акадэміях, калегіях, школах і манастырох уводзіцца правільная *сыстэма музычнае адукацыі, асьветы й узгадаваньня.* Музыка й сьпеў робяцца тут *абавязковымі дысцыплінамі.* У багаслужбах пачынае культывавацца *шматгалоснае харавое пяяньне*, гэтак званае «партэснае пяяньне» (на партыі, на галасы), пяяньне па *нотах і дырыгаваньне.*

Як сьведка нотнага («крукавога» — пяяньня па «крукох») царкоўнага пяяньня гэтага часу захаваўся ўзор беларускае рэлігійнае творчасьці: гімнавы напеў няведамага аўтара. Час ягонага паходжаньня — прыблізна канец сярэднявечча. Запісаны гэты напеў крукамі ў рэлігійнай кнізе Апанаса Берасьцейскага (Піліповіча) «Дыарыюш» (1645).

Царква ўзмацняе таксама пашырэньне сярод народу *формаў рэлігійнае паэзіі ды музыкі.* Замест паасобных духоўных вершаў і псальмаў паяўляюцца шматлікія зборнікі малітваў і песьнясьпеваў, гэтак званых *«багаслоўнікаў»* і «багагласьнікаў», рэлігійных песьняў на сюжэты з жыцьця сьвятых, Новага Запавету, хрысьціянскага быту й г. д. Такая літаратура хутка асвойваецца, набывае папулярнасьці ў народных масах, робіцца шмат дзе прадметам бытавога музыкаваньня.

Нягледзячы на прасьледваньні царквой народнае творчасьці й мастацтва, вандроўныя музыкі — скамарохі, валачобнікі й дудары, праяўляюць сваю кіпучую дзейнасьць. Не абмяжоўваючыся народнымі коламі, народнае мастацтва пранікае й за царкоўныя ці манастырскія агарожы ды трапляе на вялікакняскія эўрапейзаваныя двары.

У летапісе княжаньня вялікага князя Альгерда (XIV ст.) ёсьць цікавая зацемка, што гэты князь «пацехам і йгрышчам скамарохаў ня ўнімаша». Трэба думаць, што Альгерд быў нагэталькі сваеасабліваю постацьцю сярод вялікіх князёў, што летапісец ня мог не адцеміць гэты выключны бок ягонага характару й што іншыя князі былі зусім ня гэткія й «пацехам і йгрышчам вандроўных музыкаў» нават вельмі «ўнімаша».

Вялікія князі наагул сталіся найлепшымі пашыральнікамі беларускага мастацтва. Бальшыня іх узгадоўвалася на беларускай культуры, і вернасьць ёй і любасьць да яе захоўвалася ў князёў праз усё жыцьцё. Яскравым прыкладам — вялікі князь Ягайла (XIV—XV стст.). Маленства сваё ён пражыў на Віцебшчыне

(ягоны бацька Альгерд быў 25 гадоў князем віцебскім), і беларуская культурная стыхія моцна ўрасла ў ягонае сэрца. Калі Ягайла пазьней стаўся польскім каралём, ён не асабліва захапіўся польскаю культураю, а кліча да сябе ў 1392 г. у Кракаў (паводле польскай кронікі Длугоша) зь Беларусі сьпевакоў, музыкаў і маляроў. Гэты факт сьведчыць таксама і аб тым, што ўжо ў той час беларускае мастацтва стаяла высака, калі яго можна было паказваць на бліскучым каралеўскім польскім двары.

Пануючае становішча беларускае культуры на вялізарнай прасторы Вялікага княства Літоўскага, дзе жылі людзі розных нацыянальнасьцяў, звычайна вяло да ейных *уплываў на іншыя народы.* У музыцы гэта праявілася галоўна *пашырэньнем беларускага песеннага фальклёру* далёка за этнаграфічныя межы Беларусі.

Яшчэ адзін важны фактар гэтага пэрыяду — гэта *нараджэньне* новае культурнае сілы: *беларускае інтэлігенцыі.* Разьвіцьцё палітычнага жыцьця, рост культуры высоўвае яе на гістарычную арэну, й яна пакрысе бярэ ў свае рукі шмат якія галіны дзяржаўных справаў, стаючыся асабліва *вялікаю сілаю асьветы й мастацтва.*

Сэнс першага пэрыяду залатое пары мы бачым у тым, што ў ім ува ўсіх культурных асяродзьдзях ідзе як-бы зьбіраньне сілаў і магчымасьцяў, каб давесьці культурны рост да ягонага вышэйшага ўздыму.

2

Кульмінацыйнае ўзвышша беларускае культуры прыпадае якраз на другі пэрыяд залатое пары — ад сярэдзіны XV й да канца XVII ст. і адбываецца ў часе культурнага заходняэўрапейскага руху, ведамага пад назваю *Рэнэсансу* (Адраджэньня).

Эпоха Рэнэсансу зрабіла поўны *ідэолёгічны пераварот у грамадзкім жыцьці.* Гэта быў моцны рэвалюцыйны рух супроць сярэднявечча, супроць схалястычнага, царкоўнага сьветагляду, за перамогу чалавечага розуму, за свабоду, незалежнасьць чалавечае думкі. Гэта быў *век гуманізму*, перамогі гуманітарных ідэяў.

У Беларусі новыя ідэі найбольш захапляюць *маладую беларускую інтэлігенцыю*, якая хутка прыймае новыя прынцыпы свайго веку. Карыстаючы з пастановы выдатнага дзяржаўнага акту — Літоўскага статуту

(XVI ст.), паводле якога «кажны чалавек мае вольнасьць і моц выехаць для навук», шмат (больш моцных матар'яльна) беларускіх сем'яў пачынаюць пасылаць сваіх сыноў для вучобы ў замежныя эўрапейскія ўнівэрсытэты (у Італію, Нямеччыну, Чэхію, Польшчу). Атрымоўваючы там эўрапейскую навуку, набіраючыся новага сучаснага духу, прадстаўнікі беларускае інтэлігенцыі падыходзяць да пастаноўкі пытаньня вялізарнае вагі: распаленьня ў *Беларусі свайго нацыянальнага Адраджэньня.*

У той час як Заходняя Эўропа ў эпоху Рэнэсансу адраджае антычную грэка-рымскую культуру, у Беларусі ўзьнікаюць першыя думкі аб адраджэньні свае старадаўняе культуры *з эпохі старога Полацкага княства.* Дзейнасьць прадстаўнікоў беларускага гуманізму й правядзеньне іхніх ідэяў мела, як мы ўбачым далей, вельмі важнае значаньне й для музычнага мастацтва.

У гісторыі сусьветнае музыкі эпоха Рэнэсансу зьвязаная з новымі прынцыпамі паўстаньня *сьвецкае музыкі*, яе пануючага значаньня (замест царкоўнае), адраджэньнем формаў грэцкага тэатру (нараджэньне опэры) і нараджэньнем камэрнае музыкі. Цэнтрам музычнага Рэнэсансу была Італія, дзе музыка дасягнула такое вышыні, што ўзоры ейныя абыйшлі ўсе дзяржавы Эўропы. Патрапілі яны і ў Беларусь, дзе была для гэтага ўжо дасьпелая глеба.

Мы зацемілі ўжо раней, што двары вялікіх князёў літоўскіх ня ўступалі шмат якім эўрапейскім дваром. У практыцы жыцьця тут ужо даўно пачалі ладзіць на балёх, банкетах, вечарох і ўрачыстых прыняцьцях розныя мастацкія імпрэзы: канцэрты, музычныя пастаноўкі, балеты. У дзёньніку пісьменьніка таго часу Тодара Еўлашэўскага (XVI ст.) ёсьць такая аб гэтым зацемка: «...рабіў яму (паслу) кароль і каралева (вялікі князь літоўскі спалучаў у сабе й асобу польскага караля) вялікую ўрачыстасьць і банкет вялікі з танцамі чынены».

Зусім зразумела, што першыя свае крокі італьянскае музычнае мастацтва зрабіла менавіта тут, у асяродзьдзі прыдворным. Значна спрычынілася да гэтага яшчэ й тое, што жонкаю вялікага князя Жыгімонта II (пачатак XVI ст.) сталася каралева Бона, дачка італьянскага князя (Сфорцы).

Каралева Бона згуляла ў справе насаджэньня ў Беларусі эўрапейскае музыкі выдатную ролю. Перадусім

яна сама была вялікаю аматаркаю музыкі, і любоў да італьянскага мастацтва яна ня толькі прывезла із сабою, але моцна распаўсюджвала і ў нас. Паводле сьведчаньняў дворскае хронікі, двор каралевы Боны «гучэў музыкамі». З другога боку, каралева Бона ў гэтай любові да музыкі ўзгадавала й свайго сына, вялікага князя Жыгімонта III.

У ягонае княжаньне, згодна із гістарычнымі сьведчаньнямі, пры двары ўжо была цэлая плеяда выдатных музыкаў, розных спэцыялістаў, што былі прывезеныя зь Італіі. Сярод іх спамінаецца ведамы вэнэцыянскі кампазытар Дыямэд Катон, капэльмайстар Аскрылі Потэлё, скрыпач Якуб Нідэрляндзкі, лютніст Галёт і шмат іншых.

Пад уплывам вялікакняскага двара мода на ўсё італьянскае агартае й замкі, і палацы арыстакратыі ды магнатаў княства, раскіненых па Беларусі. Выдатныя іхныя прадстаўнікі, як: князь Слуцкі, князь Радзівіл (Нясьвіж), гэтман Хадкевіч, князь Сапега (Друя) і іншыя, ладзяць у сябе мастацкія бібліятэкі, выставы, канцэрты, танцавальныя спэктаклі, балеты, прапагандуюць італьянскае малярства, паэзію, музыку, абкружаюцца іншаземнымі, галоўна італьянскімі, музыкамі-выканаўцамі.

Тыя-ж уплывы можна наглядаць і ў асяродзьдзі беларускае інтэлігенцыі, асабліва той, што студыявала на замежных унівэрсытэтах, зь якіх якраз больш папулярнымі былі італьянскія (у Падуі, Флёрэнцыі й Балёніі). Непасрэдна знаёмячыся зь італьянскаю музыкаю на месцы, яны прывозяць яе ўзоры й пашыраюць іх на бацькаўшчыне.

Гэтак у шмат якія колы пранікаюць новыя формы музычнага рэнэсансу, творыцца глеба для іхняга разьвіцьця. Асабліва карыстаецца любоўю практыка *камэрнае музыкі*, хатняе музыкі ў выглядзе пяяньня манодыяў, мадрыгалаў, канцонаў, стансаў, балядаў (вакальныя камэрныя формы) і граньня рэгэркараў, такатаў, танцавальных сюітаў і інш. (інструмантальныя камэрныя формы).

Праз тыя-ж колы патрапіў у Беларусь і тагачасны заходняэўрапейскі інструмантарый: клявікорд, клявісын, вірджынэль (клявішныя інструманты), іскрыпка, віёлядамур, лютня, цымбалы й. г. д.

Як мы спаміналі, у эпоху залатой пары творыцца

яшчэ адно асяродзьдзе, дзе разьвіваецца музычнае мастацтва,— асяродзьдзе *беларускае інтэлігенцыі*. Заданьні, якія яна ставіць, значна перавышаюць адно пашырэньне заходняэўрапейскае музыкі. Разьвіццё нацыянальна-адраджэнскага руху ў Беларусі ў галіне музычнага мастацтва прыводзіць да *зацікаўленьня беларускім песенным фальклёрам*, да першых спробаў адшуканьня, вывучэньня й пашырэньня народных беларускіх песьняў і танцаў, якія пачынаюць шораз часьцей трапляць у тэматыку хатняе музыкі.

На музыку глядзяць ужо як на *паважную, неабходную й вялікую рэч у галіне асьветы, узгадаваньня й агульна-культурнага разьвіцьця чалавека*. Гэты пагляд беларуская моладзь выносіць ізноў-жа з заходняэўрапейскіх унівэрсытэтаў, дзе музыка тады ўваходзіла ў склад гэтак званых *сямі свабодных навук* (граматыка, рыторыка, фізыка, лёгіка, матэматыка, астралёгія й музыка) і была *абавязкаваю навуковаю дысцыплінай*.

Апрача таго, той-жа паважны пагляд беларуская моладзь выносіла й з нагляданьняў гарадзкога эўрапейскага жыцьця, дзе яна ўспрыймала лепшыя ўзоры музычнага мастацтва, наведваючы опэру, канцэрты, лекцыі, выставы й гэтак далей. З тых часаў і ў беларускіх навучальных установах *музыка ўваходзіць у склад «чатырох вызваленых навук»*, стаіць нароўні з паэзіяй, лёгікай і рыторыкай.

Вялікую ролю ў гэтым новым паглядзе на музыку згулялі лепшыя перадавыя прадстаўнікі беларускае інтэлігенцыі: Будны, Рымша, Пашкевіч і асабліва *Францішак Скарына*, які пакінуў незабыўны сьлед і ў гісторыі беларускае музыкі.

Францішак Скарына (XVI ст.), слаўны сын Полацку, доктар філязофіі й мэдыцынскіх навук і беларускі першадрукар, быў нязвычайна разнабаковым, разнастайна адукаваным, здольным чалавекам. Цікавасьць, любоў і паважныя дачыненьні да музычнага мастацтва ён вынес із сваіх замежных студыяў і шматлікіх замежных падарожжаў (Польшча, Чэхія, Нямеччына, Італія). Ён заўсёды падчырківаў, што ўся ягоная як літаратурная, гэтак і друкарская дзейнасьць прызначаная дзеля навучаньня «седмі навук вызволеных» (а гэта значыцца й музыкі). У сваёй выдатнай прадмове да кнігі «Прамудрасьць Ісуса Сына Сірахава» Скарына зьвяртаецца да беларускае моладзі з заклікам вучыцца побач зь іншымі

й «музыкі, то ест пеўніцы». Скарына таксама добра ведаў і любіў *народную беларускую песьню*, якая ўвайшла ў ягонае сэрца з маленства, і ён колькі мог карыстаўся сваім уплывам дзеля ейнага вывучэньня й пашырэньня.

3

Удача насаджэньня й пашырэньня сьвецкае музыкі й новых формаў заходняэўрапейскага мастацтва ў колах двара, арыстакратыі й беларускае інтэлігенцыі зусім не аслабіла дзейнасьці культавое музыкі. Царква мела і ў гэты пэрыяд вялікую ролю.

Аднак новыя грамадзкія падзеі, зразумела, не маглі не адбіцца на характары гэтае дзейнасьці. Агульны ход царкоўнага жыцьця ў гэты час быў бурлівы й напружаны. У Вялікім княстве Літоўскім рэлігія была складаным, паблытаным і балючым вузлом на фоне грамадзкага жыцьця.

Праваслаўная, каталіцкая, уніяцкая й рэфарматарская цэрквы існавалі тут адна побач іншае й вялі паміж сабою зацятае змаганьне, уцягваючы ў яго й народныя масы. Гэтая варажнеча часта даходзіла да буйных збройных канфліктаў, бойкаў і паўстаньняў. Аднак гэтыя сутычкі розных рэлігійных плыняў для музычнага мастацтва мелі адно *пазытыўнае ды прагрэсыўнае значэньне*.

Справа ў тым, што кажная рэлігія, маючы за мэту распаўсюджваньне сваіх ідэяў і пашырэньне сваіх уплываў, аддавала галоўную ўвагу рэлігійнай асьвеце й таму стварала цэлую сыстэму сярэдняе й вышэйшае адукацыі, у якой салідную, паважную й нязьменную ролю мела й *музычная асьвета ды ўзгадаваньне*.

Тая-ж мэта прымушала царкву ўзвышаць узровень мастацкага абслугоўваньня культу, што *памацняла й павялічвала кадры культавых выканаўцаў*.

Царква таксама не магла ня ўлічваць і нараджэньне новых формаў у музычным мастацтве і ў сваю чаргу імкнулася тварыць *новыя формы мастацкай культавой практыкі*. Зацеміўшы асаблівую любоў народу да ўсялякіх сцэнічных дзеяў (успомнім тут папулярныя скамарошыя дзеі), прадстаўнікі царквы твораць свае *рэлігійна-тэатральныя формы мастацтва*. Гэтак ужо ад XV ст. па лініі каталіцкае царквы паяўляецца ў Белару-

сі *школьная, або вяртэпная, драма*, а крыху пазьней па лініі праваслаўнае царквы: *містэрыя*.

Школьная драма вырасла як запраўдны тэатральны спэктакль, што ставіўся вучнямі каталіцкіх школаў на Каляды. Зьместам ягоным былі падзеі з гісторыі нараджэньня Хрыста (адкуль і назоў: «вяртэпная драма»). Містэрыя ўяўляла сабой тэатральную інсцэнізацыю біблійных сюжэтаў, што гуляліся сьвятарствам, хорамі, вучнямі й службаю праваслаўнае царквы.

Як у школьнай драме, гэтак і ў містэрыі музыка (пяяньне, граньне на музычных інструмантах) займала *асабліва вялікае месца* й была *неад'емнаю часткаю*, арганічным кампанэнтам кажнага спэктаклю ці інсцэнізацыі.

Новая форма культавога мастацтва адразу-ж мела нязвычайную ўдачу ў народзе, хутка пашыралася й пакрысе, пад уплывам масы, пачала ўсё больш і больш *набліжацца й надавацца да народных дзеяў*.

Як ведама, школьная драма, спачатку выконваная на лацінскай мове, была незразумелаю й недаступнаю простаму народу. Каб прыцягнуць да пастаноўкі больш людзей, выклікаць большае зацікаўленьне, паміж дзеямі драмы пачалі ўводзіць адмысловыя сцэны, гэтак званыя *інтэрмэдыі* на бытавыя, блізкія народу сюжэты, якія ўжо выконваліся *па-беларуску*. Неўзабаве інтэрмэдыі сталіся зусім *народнай* бытавой, жартоўнай *дзеяю*, якая нават была больш папулярнаю за сам спэктакль. Такая зьмена мела для музыкі вялізарнае значэньне, ператварала яе ўжо ў *першарабны элемэнт дзеі*.

Фармальная пабудова інтэрмэдыі складалася звычайна з чаргаваньня тэксту зь пяяньнем, музыкай, танцам; паміж імі было поўнае ўзаемадзеяньне. Ілюстраваць гэта можна, напрыклад, такім адрыўкам з захаванае да нашых дзён школьнае інтэрмэдыі:

Селянін (пяе):

Сядзіць сава на каліне, сычык на другой,
Азірнемся, аглянемся, ажно на чужой.

(Гаворыць):

Сяргей! Гэй, Сяргей! За што ты мяне пхаеш, ня йдзеш?

(Ізноў пяе):

Быў, быў Сямён баяр,
Сем год, яшчэ ня стар,
Сам ляжыць на печы,
Ногі на паліцы... і г. д.

Гэтая форма чаргаваньня тэксту й музыкі давала вялікія магчымасьці пранікненьню ў школьныя драмы *народнае беларускае творчасьці*: народнай песьні, танцу, народных інструмэнтаў і выканаўцаў.

Таму й ня дзіва, што школьныя драмы сталіся ўлюбёнымі й папулярнымі ў Беларусі й на працягу стагодзьдзя (XVI—XVII) ахапілі сабою амаль што ўсе мястэчкі Віленшчыны, Піншчыны, Наваградчыны, Меншчыны, Случчыны, Полаччыны, Слонімшчыны й інш.

Калі школьныя драмы былі тэатральнаю формаю, што прыйшла ў Беларусь з Захаду, дык містэрыі ўжо *нарадзіліся ў самой Беларусі* і пайшлі *адсюль* у іншыя краіны. Адным зь першых іхніх аўтараў і арганізатараў быў выдатны беларускі дзеяч, япіскап *Сымон Полацкі* (XVII ст.). Атрымаўшы пазьней прызначаньне пры двары расейскіх цароў (пры Аляксею Міхайлавічу, царэўне Зофіі й Пятры I), Сымон Полацкі прывёз туды й *беларускія* (полацкія) *містэрыі*. Іхная ўдача пры двары была гэткая вялікая, што яны зрабілі *моцны ўплыў на тэатральнае мастацтва Расеі* таго часу.

З усяго вышэйсказанага можна бачыць, што царква ў разьвіцьці музычнага мастацтва захоўвала і ў гэты пэрыяд сваё вялікае значаньне, уплываючы на ход гісторыі музыкі. Трэба да таго яшчэ зацеміць, што й на адраджэнскі рух беларускае інтэлігенцыі царква мела значнае ўзьдзейнічаньне. (Гэтак, напрыклад, з рэфарматарскіх рэлігійных колаў выйшлі беларускія першадрукары ды асьветнікі Цяпінскі й Будны.) Гэта адбілася й на музычнай асьвеце і ўзгадаваньні, аб чым могуць сьведчыць таксама й практычная дзейнасьць, і выказваньні доктара Скарыны, які карыстаецца заўсёды нагодаю зьвярнуць увагу беларускае моладзі на рэлігійныя ідэі. У справе вывучаньня музыкі Скарына раіць Біблію, як найлепшы падручнік, дзе «прамноства вершаў і песьняў сьвятых па ўсёй кнізе сей знойдзеш».

4

Нязвычайна яскрава праявіўся другі пэрыяд залатой пары і ў народнай творчасьці й выканаўстве. Кіпучая дзейнасьць народнага мастацтва ня спынілася, а новыя зьявішчы прыносілі з сабою й новыя шляхі й новыя каналы ягоным жыватворчым плыням.

Буйныя палітычныя падзеі гэтага часу, вонкавае й нутраное змаганьне Вялікага княства Літоўскага, бойкі ды паўстаньні (войны супроць Маскоўскае дзяржавы, рэлігійныя й палітычна-эканамічныя паўстаньні супроць польскіх паноў), а таксама ўвядзеньне вайсковае службы ізноў *павярнулі народную творчасьць* (як гэта было ў пэрыяд старадаўных княстваў) да *ратных, вайсковых сюжэтаў і формаў*. Гэтак ад XVI ст. нараджаецца *жанр старой вайсковай песьні* (ня трэба мяшаць яго з больш пазьнейшаю салдацкаю песьняю).

Старая вайсковая песьня, з аднаго боку, працягвае традыцыю гераічнага, гістарычнага народнага эпасу (тэматыка баёў, паходаў, жыцьцё краю й правадыроў), а з другога боку — дае малюнкі бытавога вайсковага зьместу (быт беларуса-жаўнера, служба, думы аб радзіме й блізкіх). Прыкладам гістарычнае тэматыкі можа служыць вайсковая песьня XVI ст. пра вайну з Масквою (пры Жыгімонце II пад камандаю гэтмана Астрожскага) і перамогу на рацэ Воршы:

Ой, у нядзельку параненька
Узышло сонца хмарненька,
Узышло сонца па-над борам,
Па-над Сялецкім таборам.
А ў таборы трубы йграюць,
Да ваяцкае парады зазываюць,
Сталі рады адбываці,
Адкуль Воршы здабываці.

(Цікавы тут успамін аб ігры трубаў.)

За прыклад старой бытавой вайсковай песьні можна прывесьці беларускую жаўнерскую песьню каралеўскага войска «Бяжы, коню»:

Бяжы, коню, бяжы, коню, дарогаю.
Гэй, не якою — шырокаю...

Як у тэкставых, гэтак і музычных адносінах старая вайсковая песьня (асабліва бытавая вайсковая) паказвае *высокія якасьці* народнае творчасьці, робіцца *характэрнай* па сваіх беларускіх асаблівасьцях і атрымлівае *сталую традыцыю* (што потым адбіваецца на пазьнейшай рэкруцкай песьні).

Другою, ня менш яскраваю народнаю формаю гэтага пэрыяду была *тэатральная музыка*. Узаемныя ўплывы народнае творчасьці на культавую музыку (асабліва ў інтэрмэдыях школьных драмаў і містэрыяў) і, наадварот, царкоўнае музыкі (формы рэлігійных прастаўлень-

няў-выставаў) на народную прывялі да стварэньня ў Беларусі ў XVI—XVII стст. *беларускага народнага лялькавага тэатру* пад назоваю *батлейкі, або бэтлейкі.*

Народныя тэатральныя формы паходзяць зь вельмі старых часоў. Продкамі іхнымі былі народныя карагоды зь ігравымі дзеямі. Яны з агульнае харавое масы вылучалі паасобных салістаў-карыфеяў, і так паўставалі салёвае выкананьне, музычныя дыялёгі (дуэты), харавыя ансамблі. Сцэнічная дзея, акторская гульня прыдавалі такому карагоду ўжо ўсе элемэнты тэатральнага спэктаклю (народныя выразы вельмі ўдала падчыркваюць гэтыя якасьці: «вадзіць карагод», «іграць» карагод, а не пяяць карагод).

Гэтыя элемэнты яшчэ мацней праяўляліся ў народных абрадавых ігрышчах і потым атрымалі асаблівае разьвіцьцё ў скамарошых дзеях. Апошнія й сталіся асновою для найбольш простае й цікавае сцэнічнае дзеі ў выглядзе чаргаваньня паміж сабою тэксту, музыкі, пяяньня і танцу, што атрымала потым назоў «зіншпіля» (у Нямеччыне). Ітак, глеба для народнага спэктаклю была створаная ўжо з даўных часоў.

«Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва».
№2, 1952

ІГНАТ ДВАРЧАНІН

БЕЛАРУСЫ НА ПРАСКІМ УНІВЭРСЫТЭЦЕ
ад ягоных закладзінаў да паловы XVI стагодзьдзя[1]

Праблема вызваленьня беларускага народу ў сучасны мамэнт знаходзіцца ў самай непадзельнай сувязі з адраджэньнем беларускае нацыі, якая мусіць дамагацца агульначалавечых правоў перад «цывілізаваным грамадзтвам». Поймы «нацыя» й «народ» у беларусаў пакуль што ўжываюцца найчасьцей як сынонімы, а іх трэба адрозьніваць: nation — populus, die Nation — das Volk, the nation — the people.

Таму, каб выйсьці з стану «нацыі этнаграфічнай», побач з агульнымі заданьнямі сучаснага мамэнту, перад беларускім актывам паўстае пытаньне дасьледваньня свайго культурнага багацьця, захаванага пад попелам старасховаў. Адна зь цікавейшых бачынаў беларускага культурнага жыцьця ў мінулым гэта час пасьля ўсталеньня Беларусі як адзінага гаспадарства, калі яно пайшло шляхам набліжэньня да складу жыцьця Заходняе Эўропы. Ня менш цікавы, зь іншага боку, і пачатак тое вялікае эпапэі ў змаганні за новыя культурна-грамадзкія формы, якую адчыніла ў Эўропе гусыцкая рэвалюцыя. Таму важна ўстанавіць і ступень удзелу ў гэтай эпапэі беларусаў, асабліва з увагі на жывыя сутыкі тагачаснай Беларусі з крыніцаю выбуху рэвалюцыі — Чэхіяй.

Гэты артыкул мае на мэце закрануць справу сутычнасьці паміж чэскім і беларускім народамі ў дачыненьні да ў некаторай ступені агульнай Alma Mater —

[1] Гэтая праца доктара Ігната Дварчаніна была напісаная каля 30 гадоў таму ў часе ягоных студыяў у Празе. Д-р Дварчанін, як ведама, быў сасланы бальшавікамі ў 1933 г. на Салавецкую катаргу й там у 1936 г. памёр.

Праскага ўнівэрсытэту. Дакладней: зьвярнуць увагу на далучэньне беларусаў да агульнага культурнага руху праз здабываньне вышэйшай асьветы на гэтым унівэрсытэце.

1

Праскі ўнівэрсытэт заснаваны ў 1348 г. пры чэскім каралю Карле, які ведамы пад імем імпэратара Сьвятой Рымскай Імпэрыі Карлы IV. У той час беларусы перажывалі пару нутраной кансалідацыі паасобных княстваў у адно магутнае гаспадарства пры вялікім князю Альгердзе (летувіскую частку гаспадарства зьбіраў Кейстут). З гэтае прычыны сумніўна, ці Беларусь тады магла адразу пасылаць сваю моладзь у гэтую, толькі што закладзеную, цытадэлю веды. Але факты, пададзеныя беларускімі летапісамі, сьведчаць пра тое, што чэскую мову ведаў Ягайла, а магчыма, й Альгерд. Гэта ды даныя аб уплывах у тыя часы чэскай культуры на беларускую дазваляюць меркаваць, што Беларусь мела пэўную лучнасьць з Праскім унівэрсытэтам ужо ад самага пачатку.

У верагоднасьці гэтага нас могуць пераканаць яшчэ гэткія факты:

1. Праскі ўнівэрсытэт зараз-жа пасьля ягонага адчыненьня стаўся адным зь перадавых у Эўропе, побач з Парыскім, Оксфардзкім і Балёнскім.

2. Ён прыцягнуў да сябе гэтулькі моладзі з усяе Эўропы, што яму мог-бы пазайздросьціць ці адзін унівэрсытэт нашага часу.

3. Паводле некаторых вестак, беларусы каля гэтага часу здабывалі ўжо асьвету на ўнівэрсытэтах Захаду, прыкладам, у Балёнскім, ды тварылі там нават адзін з «ультрамантанных» (загорных) унівэрсытэцкіх народаў.

4. Праскі ўнівэрсытэт быў да Беларусі найбліжэйшы.

Гэтыя меркаваньні лягічна прыводзяць да думкі пра навучаньне беларусаў у Праскім унівэрсытэце ад самага пачатку. Пэўна-ж весткі аб гэтым мы маем ужо з 1387 г., калі пры ўнівэрсытэце была закладзеная г. зв. «Літоўская калегія». Але, на жаль, з прычыны зьнішчэньня чэскіх культурных помнікаў у часе «крыжовых» войнаў з гусыцтвам за панаваньня першых Габсбургаў, ды асабліва ў Трыццаціго днюю вайну, не засталося архі-

ваў Калегіі, адкуль можна было-б дастаць найпэўнейшыя весткі[1]. Цікава тут толькі адцеміць, што Гус на Канстанцкім саборы прыгадвае аб «русах» як аб сваіх вучнях і пасьлядоўніках.

2

Пазьней, калі з прычыны гусыцкага паўстаньня шмат хто з чужынцаў выехаў з Прагі і, найхутчэй з гэтае-ж прычыны, на пачатку XV ст. быў абноўлены Кракаўскі ўнівэрсытэт, дык пры ім ужо адразу была адчыненая «руская» калегія і на ейнага кіраўніка прызначаны прафэсар з Прагі Ян Існэры, які раней належаў да кіраўніцтва «Літоўскай калегіі» ў Празе. Пад «русамі» разумеліся беларусы разам з украінцамі, якія, аднак, у гэты час перажывалі цяжкі палітычны крызыс.

Гусыцтва ня толькі ня спыніла выезду беларускай моладзі ў Прагу на вышэйшую навуку, а наадварот — Прага сталася адным з папулярнейшых месцаў Эўропы ў гэтым сэнсе. Праваслаўная Беларусь зь вялікім зацікаўленьнем сачыла за разьвіцьцём падзеяў у сувязі з гусыцтвам, якое мела агульнаэўрапейскі характар, ды жыва адгукалася на іх, становячыся выразна на баку чэхаў. Довадаў на гэта маем вялікі лік.

Даволі прыгадаць тут хоць-бы наведаньне Беларусі Геронімам Праскім, абраньне чэхамі за свайго караля Вітаўта, фактычную ўладу ў Чэхіі ягонага намесьніка Міхала Карыбута Северскага, які нават прыняў гусыцтва. Да гэтага належаць яшчэ весткі пра тое, што ў Табары было поўна «русаў» (беларусаў ды ўкраінцаў), і факт абраньня за караля Ўладыслава Казімеравіча. Усё гэта апрацавана ўжо ў асобных манаграфіях.

---

[1] Гісторыя праскай «Літоўскай Калегіі» ў скароце была гэткая: Ягайлава жонка каралева Ядвіга з парады свайго капэляна чэха Шчэкны наважыла дапамагчы выезду на студыі ў Прагу моладзі зь Вялікага Княства. Яна дала грошы, за якія быў куплены ў Празе адумысловы дом. У ім і мелася быць адкрытая «Літоўская Калегія» (бурса) на 12 студэнтаў. Але Ядвіга хутка памерла (1399), і таму Калегія была ўладжаная праз колькі гадоў пазьней. Дзеля гусыцкіх войнаў яна не змагла адыграць тае ролі, якая ёй была прызначаная. Аднак, як падае ў сваёй хроніцы Длугош, яшчэ ў другой палове XV ст. Калегія існавала. Утрымлівалася яна тады галоўна колькімі вёскамі, купленымі бліска Прагі за «200 коп шырокіх грошаў праскіх», запісаных «вечным запісам» на гэтую мэту каралеваю Ядвігай. */Прыпіска рэдакцыі «Запісаў».*

Трэба мець на ўвеце, што ўнівэрсытэт у гэты час пачаў занепадаць і ў канцы XV ст. у ім застаўся бадай ці не адзін філязофскі факультэт і Liber decanorum падае весткі галоўна аб гэтым факультэце.

Да гэтага мусім дадаць, што ў Liber decanorum толькі імёны тых, што скончылі факультэт ці то ў ступені бакалара ці магістра. Іншыя імёны, а іх напэўна было куды болей, загінулі для досьледу.

Трэба таксама яшчэ зацеміць, што адзначэньнем беларускага паходжаньня таго ці іншага магістра ці бакалара служыць толькі ягонае імя й прозьвішча, якія вельмі часта перакручаныя й нічога нам не гавораць. Таму мы бярэм тыя імёны, якія з гэтага гледзішча найбалей пэўныя, пакідаючы ўбаку імёны спрэчныя. З прычыны немагчымасьці ў дадзены мамэнт карыстацца самой Liber decanorum, няможна паказаць гадоў, калі той ці іншы магістар або бакалар быў выпушчаны. Карыстаемся з выпіскаў, зробленых для іншай мэты. Рымскія лічбы паказваюць частку кнігі (Liber...), арабскія — бачыны, на якіх гэтыя асобы згадваюцца. Вось гэтыя прозьвішчы:

1. Dionysius de Smolnycz (відаць, з Смаленску), I, 220.
2. Gabriel Czobot (прозьвішча беларускае ці ўкраінскае), I, 185.
3. Joannes de Plocek (так называўся Полацк; Плоцк быў тады малым гарадком), I, 262.
4. Mathias Czobot, I, 317, 318, 347, 368.
5. Mathias de Plocek, I, 222, 241, 256.
6. Mathias de Wilna, I, 382, 397.
7. Nicolaus Czobot, I, 165, 213, 205.
8. Nicolaus de Dessna (зь Дзясны), I, 446, 447.
9. Nicolaus Welneri (магчыма, таксама зь Вільні), I, 184.
10. Petrus de Plocko, I, 329.
11. Petrus de Policz (магчыма, таксама з Полацку), I, 138.
12. Christophorus de Litwania, I, 367.
13. Elias Styrkobskya Wolonicz (зь ведамага беларускага роду), II, 432, 444.
14. Paulus de Podlessko (з Падляшша), I, rog.

15. Markus de Lutonia (імя Марка прамаўляе за праваслаўнасьць), I, 287.
16. Marcus de Luthonia, I, 377 g.
17. Michael de Luthonia, I, 404, 418, 419, 429, 438, 445.

Ёсьць яшчэ гэткія, як Sythuania, якія падыходзяць да згаданых de Lithuania. Апрача гэтага, шмат прозьвішчаў ёсьць з дапісам Orient (усходні) і Crhunensis, Crha (па-чэску Кірыла), якія таксама могуць нам нагадваць беларусоў, але, з прычыны няпэўнасьці, апушчаем іх, як і імёны шматлікіх украінцаў з Валыні ды Галіччыны.

Падсумоўваючы, можам сьцьвердзіць, што за XV і ў першай палове XVI ст. толькі адзін філязофскі факультэт Праскага ўнівэрсытэту скончылі каля 17 беларусаў. Гэта, бязумоўна, ня ўсё. Шмат губляецца для нас у няясных, перакручаных імёнах, ды шмат вучылася на іншых факультэтах.

Вось у канцы, для прыкладу, яшчэ адзінаццаць прозьвішчаў, зь якіх некаторыя маглі-б таксама быць прозьвішчамі асобаў зь Беларусі:

1. Joannes Bahdonensis, II, 390 (прозьвішча ад праваслаўнага імя Багдан — Багдановіч).
2. Joannes Orient, I, 418.
3. Joannes Ruthardi de Montinus (нібы «рус з гораў»), I, 348-9.
4. Georgius Harownik, II, 280 (прозьвішча, вельмі падобнае да беларускіх).
5. Ingemarus de Arosia, I, 225.
6. Joannes de Arosia, I, 314.
7. Paulus Lithanicus Raconicenius (нібы «Паўла ліцьвін з Аўстрыі»), II, 432.
8. Franciskus de Sythania, I, 172-3.
9. Franciskus de Litania, I, 256.
10. Jacobus de Arosya, I, 386, 397.
11. Jacobus Rusbach, I, 211.

«Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва».
№ 2, 1953.

Р. СКЛЮТ

ЗЬ «ЯСНАЙ ЯВЫ» — У «НОЧНАЕ ЦАРСТВА»

Сёлета зыходзіць якраз 25 год ад таго крытычнага пэрыяду, які перажываў наш народ у Савецкай Беларусі ў 1929 г. Добра даўся нам у знакі гэны год, год злому ад пагоршанага да найгоршага. То-ж бо ў ім ужо раней пачаты пад клічам «змаганьне зь беларускім нацыянал-дэмакратызмам» бальшавіцкі паход на нашую культуру й нацыянальную інтэлігенцыю, што культуру гэтую тварыла й несла, увайшоў у самы гарт. Адылі, што яшчэ горш — якраз у гэным годзе паход той пачынаў перакрыжоўвацца й перакрывацца яшчэ куды шырэй і страшней задуманым, адтульжа, ведзеным вялізманым зьнішчальным наступам на самую аснову нацыі, на сам народ, на сялянства, наступам, абвешчаным пад лёзунгам «калектывізацыі», а далей і «ліквідацыі кулацтва як клясы».

Запраўды, «часы былі трывожныя» — гэтыя словы аднаго з нашых пісьменьнікаў-адраджэнцаў прысталі-б куды больш да тае пары, чымся да далёкага зараньня нашае гісторыі, пра якое яны былі сказаныя. І хто-ж, як ня нашая паэзія, як заўсёды ў падобных крытычных мамэнтах, «у сэрцы трывожным пачула за краіну радзімую жах», кажучы словамі другога волата таго-ж нашага Адраджэньня,— хто-ж, як не яна, найперш і найлепш магла й мела адчуць і выявіць усю тую трывогу за край і народ, аканоўваны падступнымі варагамі на паступовае, але поўнае выгубленьне? І паэзія зазваніла на трывогу. Адным з найбольш няўтомных і бясстрашных званароў-паэтаў гэтых трывожных часоў стаўся ўзвышэнец Уладзімер Дубоўка. 1929 год, якому наканавана было стацца апошнім годам ягонага друкаванага творства, выпаў і найпрадукцыйнейшым годам

гэтага паэта. Тутака адзін па адным пачалі зьяўляцца ягоныя найбольшыя, найдасканальнейшыя й найвайстрэйшыя творы, і блізу кажны зь іх бальшавіцкая крытыка й г. зв. «грамадзкасьць» адразу-ж пераймала ў штыхі. У № 1 часапісу «Ўзвышша» за 1929 г. зьявілася вялікая Дубоўкава нізка вершаў «Пярэсты букет», у № 2 — паэма (паводле крыху пазьнейшае паэтавае тэрміналёгіі — «камбайн») «І пурпуровых ветразяў узьвівы», у № 4 — паэма «Браніслава». Найбольшы бой разгарэўся каля «Ўзьвіваў».

Найменш увагі прыцягнула «Браніслава», дзякуючы ўжытай удала тактыцы маскаваньня пад гістарычнасьць — назіркам за прыкладам старэйшага свайго сябры з «Узвышша», аўтара ведамай аповесьці «Салавей» Зьмітрака Бядулі, Дубоўка перанёс дзею свайго твору ў іншую гістарычную эпоху — эпоху прыгону. Але гэта якраз і стала ў прыгодзе, каб упяршыню ўзьняць голас пра той новы, беспараўнальна горшы прыгон-паншчыну, настаньне якога ўжо выразна вырысоўвалася ў тэй «калектывізацыі» і «ліквідацыі». І голас гэты загрымеў у перадсьмяротнай інвэктыве гэраіні паэмы Браніславы:

...Вы нашу радасьць адабралі,
замуравалі ў камяні,
вы шчасьце наша ў гразь стапталі,
ператварылі ў ночы дні.
Заміж вясёлае бяседы
у хатах бедных сьлёзы, стогн.
Сусед хаваецца суседа,—
за ўсё за гэта вам праклён.

. . . . . .

На вашы могілкі ня гляне
ніхто з спагадаю, ніхто...
Адпомсьцяць вам за ўсё сяляне,
аж здрыганецца ўвесь прастор.
За ўсе крывавыя банкеты,
за зьдзірства зь бедных і сірот —
цераз абшары ўсяго сьвету
вас праклінае мой народ.

Хоць фармальна ўсе гэтыя праклёны пасылаліся на галовы прыгоньнікаў XIX веку, але кажнаму зусім лёгка было пераадрысаваць іх на сучасных яму прыганятых — «калектывізатараў» і «ліквідатараў», тэрор якіх і даводзіў грамадзтва да таго стану, калі мусіў «сусед хаваццa суседа» — стану, нязнанага ніколі ў па-

пярэдніх вякох і гадох, а прыношанага якраз, цяпер, ува ўсёй жудаснай практыцы ўжо масавых крывавых «раскулачваньняў».

Адразу-ж па «Браніславе» Дубоўка бярэцца за найбольшы й наймацнейшы свой твор — «камбайн» — «Штурмуйце будучыні аванпосты», у якім пачаткі эпохі калектывізацыі ўжо знайшлі сабе нічым не завэлюмоўванае й войстрае адтварэньне. Твору гэтаму, аднак, не давялося пабачыць сьвету. Рэч у тым, што 1929 г. стаўся й годам асаблівага завайстрэньня г. зв. «пільнасьці» бальшавіцкае цэнзуры. Гэта-ж бо ў ім цэнзура тая «зарэзала» — не прапусьціла мацнейшых твораў нашых паэтаў больш як калі: тутака ад яе ўцярпелі й Пушчавы «Лісты да паэтаў» (адзін толькі зь іх — «Ліст да эўрапейскіх паэтаў» — быў прапушчаны й зьявіўся ў зборніку «Песьні на руінах», 1929 г., лісты-ж да нашаніўцаў, маладнякоўцаў і ўзвышэнцаў засталіся й дасталі некаторую ведамасьць адно ў рукапісах), тутака назаўсёды загінуў «трэці скрутак» славутых Мрыевых «Запісак Самсона Самасуя», у страху ад цэнзуравага гневу спалены аўтарам, тутака быў «абрэзаны» бліскучы раман Міхася Зарэцкага «Крывічы», трапіўшы ў друк адно сваім пачаткам (і крыху пасьля, у 1931 г.— самым сваім канцом), а ў галоўным сваім працягу забаронены, тутака-ж не прабілася ў друк і другая частка ўспомненых ужо вышэй «І пурпуровых ветразяў узьвівы» таго-ж Дубоўкі, напісаная ў пляне контратакі на бальшавіцкія напады, выкліканыя гэтым творам.

Адылі новаму Дубоўкаваму «камбайну» — «Штурмуйце будучыні аванпосты» — адразу нат неспадзявана было пашчасьціла ў гэтае суворае цэнзуры: яна была прапусьціла яго ды навет зусім беззасьцярожна й цалком. Але калі твор ужо быў набраны да друку ў «Узвышшы» й прайшоў усе карэкты, улучаючы й аўтарскую, цэнзары адумаліся й адклікалі дазвол, катэгарычна забараніўшы друкаваць гэтую, запраўды, «бомбу». Папярэдзіўшы гэтым большую для сябе й гаспадароў сваіх шкоду, не маглі яны, аднак, усьцерагчыся ад учыненьня шкоды меншае, выклікаўшы адразу сваёй забаронай сэнсацыйную цікавасьць да рэчы. І вось карэктурныя адбіткі зараз-жа пайшлі з рук у рукі, зь іх здымаліся рукапісныя копіі, што сваім пэрадкам пайшлі множыцца далей тым-жа шляхам, і

ў выніку «камбайн» пашырыўся гэтак, як ніводзін, бадай, твор нашае літаратуры тых год, што дазнаў падобную долю цэнзурнае забароны й нелегальнага рукапіснага пашырэньня. Шмат якія мясьціны твору, удзячныя для запамінаньня, адразу-ж асядалі ў памяці й ці ў аднаго дажылі й жывуць яшчэ дагэтуль.

Толькі ў 1931 г., калі сам Дубоўка, як шмат іншых нашых пісьменьнікаў і наагул «нацдэмаў», быў ужо назаўсёды «адцягнуты з ужытку» й кіраваўся этапам на далёкае выгнаньне, зьявіўся першы й адзіны ўспамін у друку пра ягоны «крамольны» твор у пагромнай кніжцы бальшавіцкага «егермайстры ад літаратуры», як добра прадражнілі яго тады ў Заходняй Беларусі,— О. Канакоціна — «Літаратура — зброя клясавай барацьбы» (Менск, 1931). Тамака Дубоўкаваму «камбайну» прысьвечана каля дзьвёх балонак, на якіх «крытычна» пераказана колькі мясьцінаў твору, а адна мясьціна нат даволі пашырана зацытаваная. Адыходзячы ад гэтых дадзеных Канакоціна ды дапаўняючы і ўдакладняючы іх, наколькі дазваляе памяць, пастараемся пазнаёміць сяньняшняга чытача з адным з найвыдатнейшых твораў нашае паэзіі, чвэрць веку таму, у такіх трывожных часох і пра іх-жа напісанага, ды загубленага катамі вольнае думкі й творства.

«Штурмуйце будучыні аванпосты» зьявіліся ў творстве Дубоўкі як трэцяя частка трылёгіі, першая частка якое — «Кругі» — была напісаная й выдрукаваная яшчэ ў 1927 г. (у № № 5 і 6 часапісу «Ўзвышша» за той год), а другую частку станазілі ўспомненыя ўжо «І пурпуровых ветразяў узьвівы». З чыста мастацкага боку ўсе тры рэчы становяць сабою Дубоўкаву спробу стварыць новы жанр паэмы, заснаваны на камбінацыі разнародных жанравых элемэнтаў — інтымнае лірыкі, эпісталярнага (лістоўнага) жанру, жанру падарожжа, адмыслова апрацоўваных народных казак і навет перакладаў з чужаземных паэтаў. На ўступе да разгляданае рэчы Дубоўка ўспамінае папярэднія ёй часткі трылёгіі, асабліва спыняючыся на тым, як яму «як-быццам праз шкло паэма зайльсьнела другая — «Узьвіў ветразёў пурпуровых» і як на яе адразу-ж пасыпаліся «ўпікі, асуды а словы» (калямбурная гульня словаў: «а словы» — «асловы»). Зазначаючы на жанравае адзінства ўсіх трох твораў, паэт і прапануе тут для экспэрымэнтаванага ім жанру адмысловы назоў

«камбайн». (Наступныя і ўсё далейшыя цытаты, за выняткам цытаваных у тэксьце Канакоціна, падаюцца з памяці.)

«Камбайн» падыходзіць якраз,
«Combine» у ангельскай вымове.
Зацьвердзіць ці выкіне час
Ці створыць яшчэ адмысловей —
Хай будзе, як будзе ямчэй:
Раскрыта дакладная мапа.
І покуль мы жывы яшчэ —
Наперад, да новых этапаў!

Тэрмін «камбайн» меў тымі часамі і, казаў той, надзённае значаньне, зьвязанае якраз з калектывізацыяй, паколькі «камбайнамі» зваліся складаныя сельскагаспадарскія машыны, што пра іх савецкая прапаганда цьвердзіла, быццам ужываньне іх магчымае адно ў вялікіх калектыўных гаспадарках, дзе яны тады й пачыналі ўводзіцца. Тэрмін гэты, відаць, так кінуўся ў вочы Канакоціну, што ён і завець увесь час разгляданы Дубоўкаў твор ня дадзеным яму самім аўтарам загалоўкам «Штурмуйце будучыні аванпосты» (што, дарэчы, становіць сабою адзін з радкоў папярэдняе часткі трылёгіі — «І пурпуровых ветразяў узьвівы»), а толькі падзагалоўкам «камбайн», у якім давалася адно жанравае азначэньне рэчы.

У ідэйным дачыненьні адзінства трылёгіі выяўлялася ў адзінстве ідэі — прынесенае Дубоўкам і ўзьнятае на шчыт узвышэнствам ідэі творчага нацыянальнага ўлучэньня ў сусьветны прагрэс узьвядзеньнем такіх узвышшаў духу, творства й культуры, якія «пабачаць вякі й народы», як казалася ў дэклярацыі «Ўзвышша». Адным з улюбёных Дубоўкавых ды іншых узвышэнцаў мастацкіх вобразаў гэтага імклівага нацыянальнага, у сусьветны ўлучанага прагрэсу стаўся вобраз цягніка. Прынесены ў нашую паэзію адным з фактычна найпершых узвышэнцаў, Жылкам, у ягоным вершы «Экспрэс» (1926), вобраз гэты стаўся асноўным ужо ў першым Дубоўкавым «камбайне» «Кругі» і цяпер ізноў зьяўляўся ў гэткай-жа якасьці ў трэцім «камбайне» — «Штурмуйце будучыні аванпосты». Дзея гэтага апошняга й адбываецца ў цягніку, як і ў «Кругох», адно што там цягнік гэны йшоў магістраляй Менск—Масква, а тутака ён ужо рухаецца па невялічкай чыгуначнай каляіне, што праходзіць у ўсходняй частцы БССР паміж станцыямі Ворша й Унеча:

Цягнік ідзе ад Воршы да Унечы,
Вязе людзкія клопаты і рэчы,
Грукачуць колы, ляскаюць рэсоры,
І так цераз даліны, цераз горы
Цягнік даганяе ўсё дзень,
А ноч паабапал дыжурыць,
Здрыгаючыся ён ідзе,
Цыгару вялізную курыць.
І дым, і туман, і вагонь
Пярэстую склалі заслону,
Калышацца ў далі вагон,
Гаворыць вагон да вагону...

Гэтымі радкамі й пачынаецца «камбайн», імі-ж, як увесь час паўтараным, сказаць-бы, ляйтматыўным рэфрэнам-прыпевам разьмяжоўваюцца-разразаюцца адрэзкі дзеяньня, свайго роду разьдзелы твору. Спыняе на сабе ўвагу рытмічнае й гукавое апрацаваньне гэтых радкоў, на якое заўсёды такім вялікім майстрам быў Дубоўка: рытмічная й гукавая імітацыя хады цягніка дае поўную ілюзію — паступовае набіраньне разгону ад старту ў першых чатырох радкох, самы разгон у графічна, адступам выдзеленых радкоў наступных — усё больш імпэтная пульсацыя хады тактамі, зь перабоямі («здрыгаючыся ён ідзе»), выраўноўванымі ў мернае калыханьне (апошнія два радкі). У нашай паэзіі гэта адзін з узораў найдасканальнейшае рытмічна-гукавое арганізацыі вершу, пры гэтым зусім натуральнай, супраць тае настырлівае й падчыркненае (праўда, знарочыста), якую даў Жылка ў сваім успомненым «Экспрэсе».

У гэтым цягніку гістарычнага прагрэсу, што «даганяе ўсё дзень» сярод цёмнае ночы, якая нясе заўсёды паабапал кажнага прагрэсу, казаў той, «дыжур рэакцыі», едуць два галоўныя гэроі твору, што адразу-ж прыгадваюць чытачу гэрсяў папярэдняга Дубоўкавага «камбайну» — «І пурпуровых ветразяў узьвівы», якія зваліся там Лірыкам і Матэматыкам. Тутака ўжо яны завуцца інакш — Селянінам і Кандуктарам. У дыялёгу-дыскусіі між імі ў справе калектывізацыі й разгортваецца асноўнае дзеяньне твору.

«У «Камбайне»,— пераказвае Канакоцін,— Дубоўка піша пра тое, як аршанскі кандуктар, пад якім ён разумее партыю, пасадзіў у вагон кур'ерскага цягніка селяніна для таго, каб павезьці яго ў калектыў, і пачаў угаворваць селяніна, каб той згадзіўся дабраахвотна ўступіць у калектыў. Селянін адказвае, што ён на гэта

ня згодзен. Кандуктар працягвае настойваць, прычым у сваіх довадах кандуктар паказаны адмоўным тыпам, а селянін, наадварот, паказан моцнай асобай, з псыхалёгіяй, якую гэтаму кандуктару не надламаць. І недарэмна Дубоўка ўкладае душу ў адказы гэтага селяніна, калі ён парыруе кандуктару. Селянін гаворыць кандуктару:

Цябе салавей не дагоніць,
Калі, навет, возьме лакотку.
І ночы ня стане сягоньня,
І ноч можа стацца кароткай.
Ды ўсё яно добра ў дарозе,
Калі ты ляжыш на паліцы,
Калі ты ў ніякай трывозе,
Ніякай няма навальніцы...
А вось, як увойдзеш у хату,
Як глянеш на шэрыя сьцены,—
Згадаеш і дзеда і тату,
Радню да дзясятых каленаў,—
Дык надта і не паскачаш,
Дык надта і не падскочыш,
І горка калі заплачаш,
Хоць хочаш ты сам ці ня хочаш.
Здалёку даваць парады,
Бадай, што ня вельмі і цяжка —
І казка здаецца, як праўда,
І праўда здаецца, як казка.
Бліжэй падыйдзі, чалавеча,
Да гэтай вясковай сядзібы,
Калі насуваецца вечар,
Калі нараджаюцца хібы...
Ты думаеш, лёгка пакінуць
Усё, што ў стагодзьдзях зьбірана?
Ня выганіш гэнага клінам,
Бо будуць няўгойныя раны...
Мне кажны памежак знаёмы,
Сьмяецца мне кажны лісточак,
Дык што ты мне раіш для злому?
Дык што ты мне раіш, браточак?
Павінен я кінуць, зрачыся
Ўсяго, што з маленства мне міла?

Увесь твор прасякнут ідэяй моцнай асобы селяніна, які супрацьстаўляецца партыі» (б. 71—72).

Канакоцінаў пераказ у агульным даволі адпаведна падае асноўны ход Дубоўкавага твору, але ўсё-ж вымагае некаторых удакладненьняў. Перш-наперш, пад «кандуктарам» паэт алегарызуе ці «разумее», як кажа Канакоцін, ня ўсю бальшавіцкую партыю, а толькі ейную нацыянал-камуністычную частку, што адыгравала ў гэтай партыі якраз ролю кандуктара, а не самога

машыніста, што вядзе цягнік. Дубоўкаў «селянін» гэтак і кажа таму «кандуктару»:

...Ты тормазы круціш з адхону,
Разгон ад цябе не залежыць...

на што апошні адказвае:

І тормаз пакруціць ня ўсякі:
Патрэбна й на гэта навука.
Каму — дык ніякага знаку,
Каму — гарацешная мука...

І хоць Дубоўкаў «кандуктар», як відаць, добра засвойтаў гэную «навуку» тармазіць у цягніку гісторыі вагон, куды пасаджаны ягоны-ж родны народ, ён тым ня менш дазнае й тую «гарацешную муку» ад сьведамасьці гэтае свае ролі ды імкнецца пазбыцца яе; вонкава й далей адбываючы павіннасьць, адначасна зраджвае яе й рашчыняе сваім суродзічам-«пасажырам» вочы на запраўдны сэнс рэчаў... І тады ў Дубоўкавым «кандуктары» алегарызуецца ня толькі нацыянал-камуністычная частка партыі, але й выяўляная ёю ўжо тады апазыцыйнасьць да гэтае партыі. Дый жыцьцёвым прататыпам Дубоўкавага «кандуктара» быў ніхто іншы, як выдатны наш нацыянал-камуніст, апазыцыянер Алесь Адамовіч, постаць якога падаў і Міхась Зарэцкі ў асобе аднаго з галоўных гэрояў сваіх, успамінаных ужо вышэй, «Крывічоў» (у асобе Сьляпня). Характэрны гэтаму прататыпу ў жыцьці сваеасаблівы мэтад апазыцыйнае прапаганды й падаў Дубоўка ў дыскусіі свайго «кандуктара» зь «селянінам». Мэтад гэты палягаў на тым, што пры апазыцыйным прапагандовым «апрацаваньні» кажнага сьвежага чалавека адразу яму разьвіваліся, як мага сушэй, афіцыйныя тэзы «генэральнае лініі», а на «довад» іх прыводзіліся жыцьцёвыя прыклады, анэкдоты, «прыпавесьці», якія фактычна адмаўлялі гэныя тэзы; з рэакцыі «апрацаванага» відаць было, ці варта весьці «апрацаваньне» далей і раскрыцца, ці трэба адступіць, на «генэральную лінію», як мага мацней «застрахавацца» ды наагул «заблытаць і замесьці сьляды». Гэтак і робіць Дубоўкаў «кандуктар»: ён, запраўды, агітуе за калектывізацыю, але толькі суха й казённа выкладаючы тэзы афіцыйнае прапаганды, а «на довад» пераказвае народныя казкі з «мараляй», скіраванай проста супраць сэнсу гэтых тэзаў. Як казённы агітатар, «кандуктар» зусім нагадвае Матэматы-

ка зь «І пурпуровых ветразяў узьвівы», які ўвасабляў сабою гэным бальшавіцкую партыю (адсюль і памылка Канакоціна, які не перадумаў глыбей свайго першага ўражаньня). Але, пераказваючы казкі, ён ператвараецца ў таго-ж Лірыка з успамінаных «Узьвіваў», што спэцыялізаваўся там на гэткім-жа пераказваньні. З другога боку, гэнага Лірыка прыгадвае і «селянін», асабліва ў тых мясьцінах, дзе паэт, як кажа Канакоцін, «укладае душу» ў ягоныя выказваньні — адну з гэткіх мясьцінаў (зь невялічкімі і, здаецца, няістотнымі пропускамі) і зацытаваў Канакоцін, а зь ім і мы, хоць, між іншага, наколькі памяць, гэта й не наймацнейшая мясьціна з прамовы «селяніна». Магчыма, што Канакоцін асьцерагаўся «даваць трыбуну ворагу», як кажуць у гэткіх разох бальшавікі, цытаваньнем мацнейшых мясьцінаў «селянінавае» прамовы, як, прыкладам, другога пасажу дзесь спаблізу зацытаванага, дзе «селянін» выказваў думку, што ў калгасе працавітаму давядзецца працаваць на дзяньгубаў і паразытаў ды выстаўляў іншыя падобныя важкія жыцьцёвыя аргумэнты. Контраргумэнты-ж «кандуктара» выглядалі ў гэткіх разох звычайнымі адчэпкамі й «агульнымі месцамі», што яшчэ больш узмацняла сілу «селянінавай» аргумэнтацыі. Гэтак на прыведзеную Канакоцінам «селянінаву» тыраду «кандуктар» проста толькі аськірзаецца:

Як падумаць, чорт-нячысьцік
Заганяе цябе сілай...

а аргумэнт пра дзяньгубаў і паразытаў збывае звычайнымі кепікамі:

А тое, што ты на палетак,
А ён — дык да чорта ў капэлю —
Ўсё гэта для дзетак, для дзетак,
Вось так вечарком, у нядзелю.

Імкнучыся «выясьніць мэту, якую прасьледуе паэма», Канакоцін пераказвае й адну з народных казак, якую расказаў Дубоўкаў «кандуктар» «на довад» свае агітацыі за калектывізацыю.

«У гэтай паэме,— піша ён,— у лірычным адступленьні Дубоўка апавядае казку,— а ён, між іншым, вялікі мастак на лірычныя адступленьні,— казку пра тое, што была некалі мазырская княжна, якая ўдавілася косткаю. Гэтая княжна, па звычаю заходніх народаў, была пакладзена ў склеп. Прыхо-

дзіць злодзей, пачынае яе рабаваць. Злодзей рабуе да апошняй кашулі, і калі пачынае зьнімаць з гэтай княжны, якая ўдавілася косткаю, кашулю, тады ад нялоўкага штуршка злодзея костка выскаквае з горла і княжна прачыняецца, крычыць. Злодзей кідае рэчы, баючыся, што яго зловяць вартаўнікі. Такі прыкладна зьмест казкі. Беларусь — гэта княжна, якая ўдавілася косткаю волі, цяпер абрабаваная бальшавікамі, абабраная да апошняй кашулі, закрычыць і закрычыць так, што прыбяжыць вартаўнік з Захаду й прагоніць злодзея-бальшавіка» (б. 72).

Асноўны сэнс гэтае казкі Канакоцін зноў пераказвае адпаведна, адылі ў пераказе сюжэту недакладнасьцяў ужо куды больш — ствараецца ўражаньне, што пераказьнік карыстаўся барджэй сваймі ўспамінамі, чымся беспасярэдня перад пераказам прачытаным тэкстам. Перш-наперш казаць тутака пра «лірычнае адступленьне» аўтара аніяк нельга, бо казка ўкладзеная ім у вусны «кандуктару» і становіць сабою пашыраную рэпліку-маналёг апошняга ў дыскусіі-дыялёгу зь «селянінам», дый аніякае лірычнасьці ў ёй няма. Сюжэт гэтае казкі Дубоўка ўзяў з другога зборніка «Казак беларусаў-паляшукоў» Сержпутоўскага, выданага Інстытутам Беларускае Культуры ў 1926 г. Дзеіць у гэтай казцы зусім не мазырская княжна, а частая асоба нашых казак — легендарная дачка ведамага зь Бібліі цара Салямона (у казках — «Салімона») мудрага, ад яго й называная ў нашым фальклёры Салімонкаю. «Цар Салімон», які таксама дзеіць тут,— вельмі часты гэрой нашых народных казак, адно што «царства» ягонае народная фантазія пераносіць з Палестыны ў нашае Палесьсе, а сьледам за ёй і Дубоўка зьмяшчае гэнае царства «недзе каля Мазыра», аднаго з палескіх цэнтраў. Далей, злодзей і ў народнай і ў Дубоўкавай казцы не пасьпеў зрабаваць сваю ахвяру «да апошняе кашулі»: ён аніяк ня мог адчыніць дамавіны і, каб разьбіць яе,

Прывалок вялікі камень,
Намагаючы рукамі,
Ды як грукнуў з усёй сілы,
Аж здрыгнуліся магілы.

Вось ад гэтага ўздрыгу дамавіна рашчынілася, а костка вызваліла Салімончына горла, яна ажыла й закрычэла. Нарэшце Канакоцін зусім апушчае самы кан-

чатак: варта, што прыбегла на крык, злавіла злодзея, але мудры Салімон мусіў дараваць яму ягоны ўчынак, бо ён зьвярнуў да жыцьця царову любую дачку. І «кандуктар» канчае сваю казку «мараляй»:

Часам зробіць і ліхое
Справу добрую на сьвеце —

адказваючы гэтым на папярэдняе ягонаму апавяданьню «селянінава» цьверджаньне, што калектывізацыя — гэта «ліхое». Гэтак «кандуктар», карыстаючыся сваім вышэйапісаным мэтадам, «даводзіць» свайму «пасажыру» карысьць калектывізацыі, як мерапрыёмства, гвалтоўнасьць і рабуства якога можа ажывіць «Беларусь, якая ўдавілася косткаю волі», паводле Канакоціна, і паспрыяць ейнаму вызваленьню (пры дапамозе Захаду, як добра зразумеў і Канакоцін).

У апрацаваньні гэтае казкі Дубоўка, між іншага, упяршыню выкарыстаў арыгінальны тэхнічны прыхватак, на якім ён пабудаваў ужо свой наступны пасьля «камбайну» (і апошні друкаваны) твор — нізку вершаў «Крыху восені й жменька кляновых лістоў» (выдрукавана ў «Узвышшы», № 7 за 1929 г.) — прыхватак вершаваных зносак на ніз балоны, у якіх паважныя, лірычныя ці трагічныя, мамэнты асноўнага тэксту як быццам-бы зьніжаліся гумарам, іроніяй ці сарказмам, што, з другога боку, кіраваўся сваёй вайстрынёй супраць пракуднае сучаснасьці, так далёкае і нат супраціўнае ўсякім узвышаным, лірычным ці трагічным, мамэнтам, так што, у канцовым выніку, зьніжалася й выкпівалася якраз гэная сучаснасць. Першая такая вершаваная зноска была ўведзена Дубоўкам да тае мясьціны казкі, дзе паказвалася гора цара Салімона й іншых, калі выявілася немагчымасць зьвярнуць да жыцьця дарагую ўсім Салімонку, што ўдавілася косткаю:

Гэта ўсё было калісьці,
У даўнейшыя часіны,
А цяпер, каб і давіўся,
Сумаваць ня так павінен:
Трэба толькі зразу зь піру
Клікаць доктара Шапіру —
Кажуць, добра памагае...
Сьцеражы нас, неба, раю!

Пра другую казку, пераказаную тым самым «кандуктарам» «селяніну», Канакоцін зусім маўчыць, а тым часам казка гэная становіць сабой адну з наймац-

нейшых мясьцінаў разгляданага Дубоўкавага твору. Паспрабуем, наколькі мага, аднавіць з памяці гэтае «народнае апавяданьне пра тое, як музыка прадаў чорту йскрыпку і што з гэтага выйшла» (гэткі падзагаловак, як памяць, мела дадзеная казка). Сюжэт і гэтае казкі Дубоўка ўзяў з таго-ж зборніка Сержпутоўскага, выкарыстаўшы яго на алегарызацыю змаганьня бальшавікоў за падпарадкаваньне сабе нашае паэзіі й мастацтва наагул, прадстаўленага тут у асобе народнага музыкі-самародка, у якім вельмі лёгка пазнаваліся характэрныя рысы падаванага ў гэтым вобразе самога карыфэя гэтага мастацтва — Янкі Купалы.

Жывучы — ўсяго пабачыш:
І даліны, і узвышшы;
Той жыве, як сын сабачы,
Тым і дзеці чорт калыша.
Неаднолькавыя дзеці —
Неаднолькава і шчасьце,
Так спрадвеку ўсё на сьвеце
Падзяляецца на часьці.
Вырас так і наш музыка,
Калыханы роднай маткай,
Абуваўся ён у лыкі,
Гора мераў поўнай шапкай.
Ды хоць рос, як сын сабачы,—
Талент песьціў сакаліны.
Жывучы — ўсяго пабачыш,
І узвышшы, і даліны —

так пачыналася гэтая Дубоўкава казка. Далей, як памяць, ішло апісаньне чароўнага граньня гэтага музыкі-самародка на йскрыпцы — памяць падае адно колькі абарваных радкоў:

...Скрыпка тая, як жывая,
Сама быццам вымаўляе...
...Грае йскрыпка ціха-ціха,
Аж спалохалася ліха,
Жабы крумкаць перасталі,
Дрэвы шапацець лістамі...

Гэтак і жыў музыка з сваёй іскрыпкай:

Граў за грошы, граў бяз грошы,
Піў «нарзан» ён з агуркамі.
Талент з часам не пагоршаў —
Паляпшаўся ўсё з часамі.

Тутака гэтым «нарзанам» (гэтак звалася папулярная тымі гадамі ў Саветах танная каўкаская мінэральная вада, нашым народным казкам, пэўна-ж, зусім нязнаная) паэт упяршыню выразна паказвае чытачу на

той запраўдны час і абставіны, аб якіх йшлося яму ў казцы — на гэтую, казаў той, «нарзанную» савецкую сучаснасьць, што падавалася ім пад абалонкаю фальклёрных вобразаў. У далейшым такое паказваньне й прыпамінаньне пра запраўдны час і месца дзеі «казкі» паэт практыкуе ўсё часьцей і яшчэ выразьней, пачынаючы ўжо ад наступнае сцэны, што дае самую завязку сюжэту апавяданьня. Аднойчы музыка сваім улюбёным звычаем граў на адзіноце на беразе возера, «аж аднекуль чорт-нячысьцік тут зьявіўся ў непакоі», і ў іх завязаўся дыялёг:

Чорт: Добры вечар, ягамосьцю!
Музыка: Вечар добры! К нам на гулі,
Ці з рэвізіяй, ці ў госьці
Ты зьявіўся, абтаптулік?
Чорт: Што такое «абтаптулік»?
Я у слоўніках ня бачыў!
Можа, гэта толькі жулік,
Можа, горш, як сын сабачы?
Калі ласка, без намёкаў —
Ня люблю я алегорый:
Пад вадой і так мне мокра,
А яшчэ і ты гаворыш...
Музыка: Ні «намёкаў», ні «адмёкаў»
Тут няма і быць ня можа,
Ты дарэмна загалёкаў
І скрывіўся так нягожа.
Чым служыць магу васпану?..

У гэтай сцэнцы ўмоўнасьць фальклёрнасьці праясьненая паэтам ужо нагэтулькі, што чытач выразна бачыць перад сабою не народна-казачных пэрсанажаў, а ўсяго толькі пераапраненых у іхныя вопраткі сучасных яму савецкіх людзей — «чорта»-бальшавіка, горка падазронага да словаў чужой яму, адно із слоўнікаў, казаў той, «у парадку беларусызацыі» ведамае беларускае мовы, а таксама і да ўсякіх алегорыяў ды «намёкаў», і — «музыку»-мастака, што ўвесь час іранізуе над гэтым бальшавіцкім «рэвізорам ад мастацтва» зь ягонымі барбарыстычнымі ў тэй чужой яму мове «намёкамі» і «адмёкамі». Ды гэты апошні, аказваецца, зьявіўся зусім ня «з рэвізіяй», а з прапановай да музыкі прадаць яму сваю чароўную скрыпку. Адразу музыка адкідае гэтую прапанову, але чорт гэтак неадчэпна намагаецца й дурыць галаву, што ў рэшце рэштаў музыка паддаецца, каб хоць адчапіцца, і адно вымаўляе сабе права зайграць апошні раз на прадаваным інструмэньце. Зноў даецца апісаньне

чароўнага «музыкавага» граньня, але чорт сьпяшаецца «да пекла» й перапыняе яго:

...Граеш надзвычайна пекна,
Але некалі мне, браце,
Дай-жа йскрыпку...

Тут адно зразумеў музыка, што значыць яму расстацца зь любаю «скрыпуляй»: станоўка адмовіўся аддаць новаму гаспадару прададзены ўжо яму інструмэнт, аж бяручыся зь ім узагрудкі:

...А цяпер — аддай скрыпулю...
Ці вы бачылі, ці чулі?..
Чорт за йскрыпку — чорту поўху,
Чорт за смык — яму па храпах:
Памятаць ён будзе доўга,
Як іскрыпку браў нахрапам...
Ды урэшце — чорт наверсе:
Як ня сілай — ўзяў на хітрасьць,
Не заўважыўшы, што ў лесе
Ён «душу» зь іскрыпкі вытрас.
Невялікая і штука —
Дзед стругаў з дубовай планкі,
Ды ня будзе добрых гукаў,
Грай хоць год бесьперастанку...

Гэтак алегарызуецца тутака змаганьне балышавікоў за падпарадкаваньне сабе нашае паэзіі й мастацтва, што скончылася вонкавай перамогай бальшавікоў — іхняе сілы, хітрасьці дый грошай, але тым-жа часам і няўзнак «вытрасла» самую душу з творства, безь якое — няма ніякае паэзіі, ніякага мастацтва. У гэтым мамэньце Дубоўка найбольш пераапрацаваў сюжэт народнае казкі зборніка Сержпутоўскага, унёсшы якраз гэтак змаганьне музыкі з чортам за скрыпку, якога зусім ня было ў тэй казцы — музыка там проста сам «скрыпку ён патрос, бы грушу, ды з грудзей і выняў душу». Пераапрацаваньне гэтае, пэўна-ж, спатрэбілася аўтару дзеля алегарызацыі мамэнту змаганьня за падпарадкваньне паэзіі, і гэтая акалічнасьць лішні раз пацьвярджае сьведамасьць усяго аўтаравага намеру алегарызацыйнага выкарыстаньня фальклёру.

Абрабаванаму чортам музыку не заставалася нічога, як толькі з гора прапіваць атрыманае за скрыпку золата (мамэнт, які выразна наводзіў чытачу на думку долю шмат якіх беларускіх паэтаў-мастакоў; у арыгінальнай казцы зборніка Сержпутоўскага, ізноў-ткі, гэтага мамэнту зусім няма). Чорт-жа пастанавіў сам асабіста ўзяцца за музыку:

Чорт у пекле гэным часам
Задае канцэрт вялікі,
Замяніўшы порткі пасам,
Удае зь сябе музыку.

Сярод чортавых памагатых на гэным канцэрце паэт падае выразныя сыльвэткі некаторых добра знаных тымі часамі бальшавізуючых «спэцыялістых ад мастацтва» — «крытыкаў»:

Два бамбізы, стаўшы ракам,
На сьпіне трымалі ноты,
Аж пішчэлі, небаракі,
Ад такога пераплёту.

Гэта — ведамыя стаўпы тагачаснае галоўнае апоры бальшавікоў у нашай літаратуры — арганізацыі БелАПП (Беларускай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменнікаў), Барашка й Мурашка. А вось адзін з найбольш агідных (і вонкава і нутрана) «тэарэтыкаў» і «крытыкаў» з таго-ж БелАППу, бязьмежны ў сваім падлабуньстве й выслугоўваньні перад вярхамі Гародня:

Нейкі гадзіч хударлявы
Поўзаў, віўся ля абсацаў,
Ляскаў вухам па халявах,
Языком брыду ўсё мацаў.
Бруха ён сваё адпоўзаў —
Падкавалі бруха цынам,
Стаў падлейшым ён ад поўзаў,
Хоць хваліла ахвіцына.

І нарэшце — з найбольшай дакладнасьцяй сфатаграфаваны з натуры «марксыцкі (праўдзівей — марксыцтвуючы) крытык» з часапісу «Полымя» Мікола Байкоў — глухі і фізычна і псыхічна, праняты адзіным імкненьнем зарабіць як мага больш «валюты» «на чорны дзень», на жаданьне гаспадароў хвалячы бязь меры каго трэба, а каго трэба — бязь меры-ж бэсьцячы:

А глухі прыйшоў сам-насам,
Праціраe акуляры,
Палівае розум квасам
І падлічвае даляры.
Трэба слухаць, хоць пакута
(Бо ў глухога курс узяты —
Меркаваў, як будзе крута,
Алалаху даць у Штаты).
Хоць ня чуе, але хваліць:
«Мілагучна, пачуццёва...»

Ды выхвалы аднаго толькі (і наверх глухога) падхаліма ня могуць задаволіць канцэртанта-чорта:

Але чорту гэта мала,
Бо вушастыя — ні слова...

і ён нарэшце сам пераконваецца ў сваёй няпрыдатнасьці да ўзятае ім на сябе ролі й зракаецца сваіх спробаў:

— Сам я бачу, што пагана...
Тут патрэбен арганісты
Ці музыка, каб ня п'яны.
Вы знайдзеце, прывядзеце —
Ён для нас іграць павінен,
Дзе схаваешся на сьвеце?
Людзі кажуць, толькі ў гліне.
Адшукалі вельмі скора
Гарацешнага музыку:
«У дрызіну», як гавораць,
Быў ён п'яны, ўзапар ікаў...

Але й гэты былы собсьнік інструмэнту ня мог ужо зайграць нічога на пазбаўленай душы скрыпцы:

Скрыпка тая, як нямая,
Быццам голасу ня мае,
Толькі струны смык шаруе,
Толькі пекла ірытуе...

Гэтак і канчаецца гэтая казка, пераказаная Дубоўкавым «кандуктарам» як перасьцярога «селяніну» супраць праводжанай і самым пераказвальнікам агітацыі «бяз душы», нат калі агітацыя гэтая й апранаецца часам у вонкава-паэтычныя формы (у арыгінальнай казцы зборніка Сержпутоўскага, ізноў-жа, канец інакшы крыху: «канцэрту ў пекле» зусім няма, а проста чорт, пераканаўшыся ў сваёй няздатнасьці да граньня на скрыпцы, знаходзіць музыку й кажа яму: «Бачыш, скрыпка бяз душы. На-ж, іграй і мне служы. От з тых час цыган і грае, толькі чорта пацяшае, бо ў ігры няма душы, хоць на Бога ты брашы» (б. 170 зборніка). Падпарадкавалі бальшавікі сабе мастацтва цаною пазбаўленьня яго душы і пакінула яно быць мастацтвам і ня можа больш «абслужыць» нат самых падпарадкавальнікаў, адно «ірытуе» іх — гэткі асноўны сэнс гэтае казкі, пераказаць якую не адважыўся нат у сваім «крытычным выкладзе» Канакоцін.

Не пераказвае Канакоцін і сьцягу іншых вельмі характэрных мамэнтаў Дубоўкавага твору, што завяр-

шаюць яго. Паспрабуем аднавіць іх тут з памяці. «Селянін», якога, паводле Канакоціна, «кандуктар» вёз у калектыў, туды не даехаў: часовыя спадарожнікі рассталіся на станцыі «Цёмны Лес»:

Адзін — дык на станцыі зьлез,
Другі — дык: «Білеты, білеты!»

Станцыя пад назовам «Цёмны Лес», на якой пакідае цягнік Дубоўкаў селянін, запраўды ёсьць на чыгуначнай каляіне Ворша — Унеча, але ў дадзеным творы назоў гэты мае перш-наперш алегарычнае значаньне, ды наверх і першым-жа чынам вельмі празрыстае кажнаму нашаму чалавеку, што вякамі звык разумець пад адыходам «у лес» адыход у паўстаньне, у партызанку... Значаньне гэтае паглыбляецца яшчэ й выкарыстаньнем у нашай літаратуры вобразу гэтага-ж «Цёмнага Лесу» Максімам Гарэцкім як вобразу «патаёмнага» (у апавяданьні пад гэткім назовам). Гэтак не ў Канакоцінавых бальшавіцкіх калектывах бачыць свайго «селяніна» паэт, а ў «патаёмным» лясным руху паўстаньня, партызанкі, у кажным разе — у «цёмным лесе» нейкае «патаёмнае» будучыні...

На месцы «селяніна», што пакінуў цягнік у нязнанасьць і патаёмнасьць «Цёмнага Лесу», у цягніку гэтым прыяўляецца паэту нямаведама адкуль выніклая агідная здань нейкага «Дон-Пузы» — чалавекападобнае істоты з галавою ў жываце — у «пузе» — і з адзінымі думкамі толькі пра інтарэсы гэтага-ж «пуза». Вобраз гэты быў задуманы паэтам як вобраз вульгарнага матар'яліста — антыпода таго бязьмежнага ідэаліста, якога ўвасобіў Сэрвантэс у сваім несьмяротным Дон-Кіхоце. Паасобнымі рысамі гэтага вобразу вульгарнага матар'яліста Дубоўка ўжо надзяляў некаторых гэрояў сваіх ранейшых твораў, асабліва таго-ж «матэматыка» ў «І пурпуровых ветразяў узьвівы». Крыху пазьней гэты-ж вобраз на ўвесь рост і шырыню разгарнуў другі ўзвышэнец, Язэп Пушча, у постаці Мярохі — аднаго з гэрояў цалком ненадрукаванага вялікага твору «Сады вятроў» (урыўкі друкаваліся ў часапісе «Ўзвышша», № 9—10 за 1929 г., № 3 за 1930 г.). Вобраз гэткага адпетага матар'яліста, што, паводле фактычных бальшавіцкіх імкненьняў, павінен быў заступіць сабою (дый заступіў) сьведама ліквідаваных ідэалістаў жыцьця і змаганьня і гэтым выклікаў трывогу за будучыню ў чулых паэтаў-

узвышэнцаў, у Дубоўкавым «Дон-Пузу» пададзены ў войстра скарыкатурызаваным выглядзе. Усе гаворкі гэтага персанажа толькі пра матар'яльны дабрабыт, толькі пра спажыву для «пуза», ён проста не разумее ніякіх іншых пытаньняў і на кажнае зь іх адказвае няўпотрап пытальніку, але з адзіна магчымай для сябе «пузавай» лёгікай:

...— Варэньня я шмат наварыў,
Ды сёлета вадкае дужа...
— Ты чым у змаганьні памог,
Для гэткай што ўнёс асалоды?
— Я больш на суніцы налёг,
Яны-ж гаркаваты заўсёды...

Няўжо будучыня й мае належаць да гэткае пачвары з галовою ў «пузе»?

...Ішчэ хваліцца: «Добра якраз,
Ня трэба капэлюш ці шапка...»
Схапіў яе зь месца ураз,
Схапіў тое «пуза» ў вахапку,
Шпурнуў праз вакно пад адхон,
Ня даўшы прахвосту ні слова.
У наспу урэзаўся ён
На поўнай хадзе цягніковай.

Гэтак хацеў-бы паэт расправіцца з накіданым бальшавікамі ідэалам, выкідаючы яго за борт цягніка гістарычнага прагрэсу.

Пасьля гэтага эпізоду з «Дон-Пузам» перад паэтавымі вачыма (але ўжо не ў цягніку, а за вакном) праходзяць здані двух вялікіх паэтаў мінуўшчыны — Пушкіна й Байрана. На фоне мэлянхалічнага нашага краявіду таго-ж тыпу, што й тыя — беларускія-ж такі, бо пскоўскія — краявіды, сярод якіх гадаваўся найбольшы расейскі паэт — «над рэчкаю Пушкін застыг», як нейкая імглістая эманацыя тае культуры, душою якое ён стаўся й якая празь яго й іншых убірала ў сябе, у тую сваю імглу, водарныя кадзівы й нашых гэткіх узрэчных далінаў сярод наскіх краявідаў, каб гэтай імглою пасьля ахутваць іх-жа, засталучваць ад сьвету, загартаць пад сябе... У вусны расейскаму паэту, «застыгламу» над нашым краявідам, Дубоўка ўкладае адзін зь ягоных вершаў, бліскуча перакладзены ў нашую мову й тут-жа ўлучаны ў твор:

Я перажыў свае жаданьні,
Лятункі зьнялюбіў свае,
І плён сардэчнага згасаньня
Адны пакуты мне дае.

І лёс у жорсткім сваім лёце
Квітушчы зблоціў мой вянец,
Жыву ў сумоце, у самоце
І жду, ці прыдзе мой канец.
Так познаю прыбіты сьцюжай,
Калі зімовы чуцен сьвіст,
Адзін на галіне нядужай
Трапечацца спазьнёны ліст.

Але мэлянхалічане taedium vitae (стома ад жыцьця) элегічных радкоў расейскага паэта, што адно пасыўна й пакорна, чыста па-ўсходняму «жджэ, ці прыдзе ягоны канец», гучыць нашаму паэту адно як taedium vitae прадстаўленай Пушкінам культуры, «квітушчы вянец» якое таксама ўжо «зблоціў лёс у жорсткім сваім лёце...». Куды больш паэту нашаму да душы заходні, як-бы больш пануры, але непакорны, бунтарны «кароль паэтаў» Байран, які прыяўляецца яму тутжа ў мамэньце свайго горкага, але гордага разьвітаньня з Бацькаўшчынай, калі сталася яна зацеснай і задушнай вольнаму й магутнаму паэтаваму духу:

Паэта пакінуў свой край —
У сьвет, хоць да чорта на рогі!
Вар'яюцца хвалі няхай,
Ня зьвернуць паэту з дарогі.

Байран наагул быў адным з найулюбёнейшых Дубоўкавых паэтаў ад самага пачатку. Паэт наш адмыслова навучыўся ангельскае мовы, каб мець магчымасьць чытаць «караля паэтаў» у арыгінале. Ужо сярод першых Дубоўкавых вершаў, што трапілі ў друк (у альманаху «Маладая Беларусь», выдадзеным у 1921—1922 гг. у Маскве групаю нашых студэнтаў), былі й пераклады з Байрана (наколькі памяць — зь ягоных «Гэбрайскіх мэлёдыяў»); Байранавы радкі часам выбіраліся ім за эпіграфы-«мотто» да некаторых сваіх твораў (як напр., да паэмы «Наля» — гл. «Узвышша», № 1 за 1927 г.). Яшчэ задоўга да стварэньня разгляданых тут «Будучыні аванпостаў» паэта пачаў працаваць над перакладам Байранавага «Чайльд-Гарольда» — скончыўшы гэты пераклад ужо толькі ў бальшавіцкай турме ў 1930—1931 гг. і там-жа пераклаўшы Байранавага-ж «Шыльлёнскага вязьня» (абодвы пераклады ня здолелі пабачыць друку, дастаўшы некаторае пашырэньне адно ў рукапісах). Урывак з «Чайльд-Гарольда» — ведамае «Разьвітаньне Чайльд-Гарольда» (між станзамі XIII і XIV песьні пер-

шай паэмы) — Дубоўка і ўкладае ў вусны Байрану, што зьяўляецца перад ім пасьля Пушкіна. На жаль, памяць захавала толькі першую і апошнюю (10-ю) станзу Дубоўкавага перакладу гэтага ўрыўку, зь якім выступае ў ягоным творы Байран; пакуль ня ўдасца з абрыўкаў паасобных радкоў, што вырынаюць з памяці, аднавіць усю цэласьць (на што, аднак, ня траціцца надзеі) — пададзём тутака хоць гэтыя ўспомненыя кавалкі:

1

Бывай, бывай, мой родны край,
Зьнікай у сінь вады;
Сьвіргочуць чайкі, вадаграй,
І ў ветры плач нібы.
Плыве за небакрай.
Плыве за небакрай.
Дабранач вам абодвым дам,
Мой родны край, бывай!
. . . . . .

10

Імчы-ж хутчэй, мой плаў, мяне
Празь пенны перакат:
Абы ў якой быць старане,
Каб толькі не назад.
Вітаю ўсьпенены прастор,
А змоўкне вадаграй —
Вітацьму пусткі, змрок пячор...
Мой родны край, бывай!

Пэўна-ж, настрой пакіданьня роднага краю, атмасфэра якога рабілася гэтак нязноснай для вольнага духу, ня мог ня быць асабліва блізкім нашаму паэту ў тым 1929 годзе, гэткім пракудным на ягонай бацькаўшчыне. Дый ці яму аднаму? Ці адзін ён тады гатова-б «пакінуў свой край», падаўся-б «у сьвет, хоць да чорта на рогі» з адзіным жаданьнем «абы ў якой быць старане, каб толькі не назад», калі-б гэта толькі было магчыма? Ды калі нельга было вырвацца з задухі прыгнобленага краю, каб змагацца за волю там, дзе змаганьне было магчымае, дык можна было й трэ было спрабаваць прыцягнуць увагу да нялюдзкага стану на бацькаўшчыне тых, хто мог-бы пераняць гэтае змаганьне ў вольным сьвеце й прыйсьці з вызвольнаю памогай пакутнаму краю. І наш паэта зварачаецца да такога вольнага сьвету, увасобленага для яго цяпер у постаці духу вялікага ангельскага паэты-змагара, што аддаў калісь нат сваё жыцьцё за вызваленьне аднаго, як

здавалася яму, з найбольш укрыўджаных народаў свайго часу:

Лёрд Байран! Вы йшлі бараніць
Ня грэкаў, а грэцкія міты.
Вяла вас антычнасьці ніць
На поўдзень, у лаўры спавіты.

Лёрд Байран! Мінула даўно
Ўся гэна рамантыка ваша,
І з грэкамі туркі ўвадно
Для кухняў лаўровы ліст важаць...

Лёрд Байран! Каб ведалі вы
Пра нашай краіны нядолю,
Здратованыя паплавы
І ўкорань стаптанае поле —

Вы, пэўна, пайшлі-б бараніць
Яе, а ня грэцкія міты...
Ды ўрвалася прошласьці ніць,
І мы ланцугамі спавіты...

Гэтак у запраўдным сэнсе сваім ізноў гучыць тут зварот да любага паэта, да таго, кажучы Канакоцінавымі словамі, «вартаўніка з Захаду», які мог-бы, як рыцар волі вольнага сьвету, прыйсьці із сваёй вызвольнай памогай туды, дзе воля гэтая гвалцілася ўжо ад вякоў, а цяпер засморгвалася канчальна пятлёй нячуванага яшчэ ў тых вякох гвалту. Гэтак, між радкоў гэтага звароту кідаўся той самы адчайны кліч «SOS» (ратуйце нашыя душы), што ўжо таксама ці раз перад тым спрабаваў данесьці да вольнага сьвету між радкоў свае паэзіі найбліжэйшы Дубоўкаў сябра-паплечнік у «Ўзвышшы» Язэп Пушча («Рабіндранату Тагору», 1927, «Ліст да Эўрапейскіх паэтаў», 1928 г.).

Горкая думка аб ланцугох не забівае, аднак, на духу паэта, і ён супрацьставіць ёй, закончваючы свой твор, загалоўны ягоны заклік да сваіх «сяброў-супольнікаў у працы», не зважаючы нінавошта, і далей «штурмаваць будучыні аванпосты», у надзеі, што прыйдзе ўсёткі час, калі будзе зьнішчаны нарэшце ўсякі «...прыгон над словам, над духам, над чынам...».

Зараз-жа па гэтых словах, такіх нядвусэнсавых у 1929 годзе, годзе нячуванага завайстрэньня таго бальшавіцкага ўсеабсяжнага «прыгону над словам, над духам, над чынам», і канчаецца Дубоўкаў «камбайн».

Неўзабаве па Дубоўку ўзьняў свой голас у тэй-жа справе, што хвалявала ўсіх у 1929 г.— у справе баль-

шавіцкага замаху на сялянства пад сьцягам «калектывізацыі»,— і сам той, што, паводле калішніх словаў таго-ж Дубоўкі, «адзін, ад усіх найвялікшы, маладых гадаваў сваёй песьняй» — сам Янка Купала.

Калі Дубоўку, як ужо казалася, 1929 год выпаў найбольш прадукцыйным у ягоным творстве, дык у Купалы, якраз наадварот, год гэны прайшоў на найніжэйшым узроўні творчае прадукцыйнасьці. Свой апошні найбольшы ўздым і колькасны і якасны Янка Купала перажыў тры гады перад тым — у 1926 годзе, што быў наагул найбольшым годам нацыянальнага ўздыму ў Савецкай Беларусі. У гэным годзе Купала напісаў і надрукаваў 21 вершаваны твор на 1122 вершаваныя радкі, тым часам як у папярэднім 1925 г.— усяго 1 твор на 89 радкоў, а ў наступных гадох — у 1927 г.— 6 твораў на 114 радкі, у 1928 г.— 1 твор на 100 радкоў і ў разгляданым 1929 г.— 2 творы на 85 радкоў. У гэным годзе вялікі наш трыбун і змагар мог і хацеў яшчэ дэманстраваць няўтомнасьць і нязломнасьць свайго творчага духу:

Есць-жа яшчэ ў мяне сіла
Крыўдзе ня дацца, змагацца,
Над сонных продкаў магілай
Вольна маланкай мігацца...
. . . . . .
Есьць-жа яшчэ ў мяне песень,
Поўных надзеі, жыцьця,—
Як-бы ня быў ім сьвет цесен,
Вырвуцца ў сьвет зь нябыцьця...
. . . . . .
Есьць-жа яшчэ ў мяне вера
Ў вольны мой родны народ,
Што у патрэбе зь сякерай
Выйдзе за волю ў паход!

Адылі, з другога боку, у тым-жа самым годзе Купала бачыў ужо сябе й перад судам гісторыі сярод тых, пра каго суд гэны павінен будзе рассудзіць, ці яны

...аб свой гонар дбайна дбалі
І дабравольна, бяз прынук,
Самі сабой не гандлявалі,
Ня несьлі ў петлі дум і рук...

і добра прадчуваў, як у рассудку гэным можа быць датычная й да яго сумная канстатацыя факту,

Што нейкі з нас, хоць быў ня зломак,
А плечы гнуў у крук ня раз;
Ня йшоў з адкрытымі вачыма

У сьвет і сьцежкі не прастаў,
А ўсёй магчымасьці магчымай
Таптаў сьляды, сябе таптаў...

ды мо прадчуваў навет, што шлях гэткага саматаптаньня ў яго яшчэ больш наперадзе, чымся адзадзя...

У кажным разе пасьля 1926 г. у Купалы ўсё меншала а меншала «песень, поўных надзеі, жыцьця», асабліва-ж «песень, зь якіх-бы можна было ўцяміць, што мы свабоднымі былі». Пятля несвабоды няўзнак тужэла на волі «дум і рук». Выразныя знакі гэтага й відаць ужо на тым творы 1929 г., што ім і адгукнуўся Купала на пазначаны гэным годам гвалт над народам нашым — на ведамым вершы ягоным «Зыходзіш, вёска, зь яснай явы», датаваным лістападам 1929 г. і ў тым-жа часе паданым у друку. Тутака найлепшы й найчулейшы сын ды найбольшы паэт нашае вёскі ўжо безь відавочных выяваў і «сілы крыўдзе ня дацца, змагацца» і «веры ў вольны свой родны народ, што ў патрэбе зь сякерай выйдзе за волю ў паход» — пяець мэлянхалічную адыходную гэтай вёсцы, ужо ад пачатку прасякнутую даволі мяшанымі пачуцьцямі:

Як сон маркотны, нежаданы,
Зыходзіш, вёска, зь яснай явы,
А твой народ вернападданы
Імкнецца, скінуўшы кайданы,
Да новай долі, новай славы...

Ужо ў гэтай зваротцы, што аблямоўвае ўвесь верш, пачынаючы й канчаючы яго, адчуваецца зусім выразна між радкоў (асабліва пачатных) глыбокі жаль самога паэта, што адпявае «зыход зь яснай явы», «як сну маркотнага, нежаданага», ягонай роднай і, пэўна-ж, дарагой яму вёскі, якая яго-ж і ўзгадавала. Праўда, пачуцьцё гэтае ён намагаецца ўсяляк перамагчы, адагнаць ці проста прыхаваць падбадзёрным усьпяваньнем быццам-бы абяцаючых (ці, можа, усяго толькі абяцаных) пэрспэктываў «новай далі, новай славы» для «народу вернападданага», як вельмі нядвусэнсоўна характарызуецца тутака той сялянскі беларускі народ, пра які афіцыйна было абвешчана, што ён «скінуў кайданы» й зусім «дабравольна» «імкнецца» да фактычна гвалтам накіданага яму новага прыгону — той самы селавы, вясковы люд, пра які Купала яшчэ ў 1926 г. пісаў як пра «вольны свой народ», а зусім не «вернападданы» каму-небудзь народ. І хоць на пра-

цягу ўсяго вершу паэт увесь час намагаецца як найбольш канцэнтравацца на гэткім-жа, што й напачатку, падбадзёрным усьпяваньні нейкіх пэрспэктываў, «новай долі, новай славы», ён абярняся зрываецца на поўнае глыбокага суму й жалю адпяваньне «зыходу» або, як ужо больш не хавае ён — гвалтоўнага й груба-жорсткага выгубленьня, «ліквідацыі» гэткага дарагога й мілага селавога, народнага ўкладу — нацыянальна-гістарычнага, паэтычнага, рамантычнага:

...Гарбы тваіх нямых курганаў,
Дзе сьпяць нявольнікі і князі,
Парэжа сталь, як нож баранаў...
...Тваіх жалеек сьпеў гаротны
Патопча трактарнае кола...
...Лясун з русалкаю пакіне
Палохаць сонныя сялібы,
І вадзянік загіне ў ціне...

Але-ж усё гэта мусіць загінуць — ці-то пад нажом (як бараны...), ці-то патаптанае колам — адылі ці так ужо бясьсьледна? То-ж бо ведала ўжо гісторыя падобныя «ліквідацыі», і ўсё-ж хрысьціянства, прыкладам, гэтак і не дало рады «зьліквідаваць» зусім створанае самым народам «паганства», а мусіла зьліцца зь ім, напластавацца на яго. Можа, й цяпер адно толькі творыцца новае, трэцяе напластаваньне?

Над вежамі тваіх бажніцаў
Хвабрычны комін возьме ўладу.
А звон зьбянтэжаных званіцаў
Гудка жывучая крыніца
Заглушыць гулкім гудам-ладам.

І будуць ладзіцца год кожны
На новы лад, на новы звычай
Дзяды кастрычнікавы збожна,
А кожны год больш пераможна
Для сьвята волі бунтаўнічай.

«Дзяды» — нашае народнае «паганскае» сьвята восенскага памінаньня прашчураў, захаванае й хрысьціянствам, блізу супаўшы ў часе з бальшавіцкім сьвятам «кастрычніцкае рэвалюцыі», запраўды, пачынала ўжо ў народзе зьліцца зь ім у адно. І Купалу гэта стаецца, можа, за найбольш падбадзёрны яму сымбаль — сымбаль прыйдучае перамогі несьмяротнага духу прашчураў і «волі бунтаўнічай» над усімі наноснымі напластаваньнямі, што іх змушаны прыймаць (ці не на тое толькі, каб пасьля адно памінаць?) «народ

вернападданы»... Гэтым сымбалем і завяршаецца Купалаў верш.

Але цікавы й ягоны, здавалася-б, чыста фармальны, тэхнічны бок. Напісаны ён чатырастопным ямбам і пяцірадковай звароткай з чарадаваньнем рыфмаў паводля схэмы а-в-а-а-в пры вылучна жаноцкім рыфмаваньні. Усё гэта пры чытаньні стварае нейкую панурую хаўтурную манатоннасьць, вельмі адпаведную для таго «адпяваньня», пра якое мы казалі, ды ніяк не для «падбадзёрнага ўсьпяваньня», якому вонкава быццам-бы прысьвячаная бальшыня зваротак і радкоў вершу. Калі ў аднэй прыватнай гутарцы зацемілі пра гэта Купалу, ён сказаў: «Я гэта ведаю. Калісьці я напісаў на гэткі лад адзін верш, і цяперака ён мне прыпомніўся, дык я напісаў і гэты на той самы лад». Зацікаўленыя, удзельнікі гутаркі кінуліся шукаць таго першага, «на той самы лад напісанага» вершу Купалавага і, перапароўшы ўсю ягоную паэзію, знайшлі там толькі адзін твор, запраўды напісаны паводля тае-ж рытмічнае, страфічнае й рыфмавае схэмы, што й «Зыходзіш, вёска, зь яснай явы». Гэта — зьмешчаны ў ведамым Купалавым зборніку «Шляхам жыцьця» (1913) верш «У ночным царстве». Варта прыгадаць тут цалком гэты невялікі твор, асацыяцыя зь якім, паводля собскага паэтавага прызнаньня, мела месца пры стварэньні ім свае апошняй «адыходнай» калектывізаванай вёсцы, бо асацыяцыя гэтая пралівае зыркае відно на той настрой, зь якім паэт тварыў гэную «адыходную»:

У ночным царстве

Скрыпяць трухляцінай асіны,
Над курганамі зьвяр'ё выe...
Гасьцінцам, чернявай пуцінай,
У ёрмах, скованай скацінай
Ідуць нябожчыкі жывыя.

Ідуць, ідуць... Сярод пустыні
Хрусьцяць надломаныя косьці,
І качанеюць ногі ў ціне,
І чахнуць вочы ў павуціне,
А шлях — як точаныя восьці.

Перад вачыма глуш нямая,
І плач і скрогат за вачамі.
Пракляцьце ў жылах кроў сьцінае,
Душу бясьсільле вынімае,
Гняце зьмяінымі кляшчамі.

У грудзі, здаўленыя здрадай,
Упіўшысь, рабская трывога
Шыпіць хаўтурнаю загладай;
На небе толькі, як прынада,
Бялее млечная дарога.

То там то сям запаланее
Іскра над скованаю шыяй;
Наскоча пошасьць трупавея,
І царства ночнае шалее,
Над курганамі зьвяр'ё вые.

Гэтак «зыход зь яснае явы» калектывізаванае вёскі асацыяваўся ў Купалы з паходам «нябожчыкаў жывых» у «ночным царстве», вобраз якога алегарызаваў сваім часам у паэта царства славутае «сталыпінскае рэакцыі» (па рэвалюцыі 1905 г.), а цяперака зь яшчэ большымі асновамі надаваўся на алегарызацыю рэакцыі сталінскае, што якраз і настала ў выглядзе таго называнага «вялікага наступу» 1929 году зь ягонай калектывізацыяй і ўсялякімі суправаджальнымі крывавымі «ліквідацыямі»...

Два з найбольшых нашых паэтаў, Янка Купала і Ўладзімер Дубоўка, першымі і найчулей «у сэрцы трывожным пачулі за краіну радзімую жах» у трывожным і жахлівым для гэтае краіны 1929 годзе, што пачаў сабою панурую пару зыходу кагадзе абуджанага й адроджанага народу нашага «зь яснай явы» вялікага шляху гістарычнага прагрэсу ў «цёмны лес», у «ночнае царства» беспрасьветнае рэакцыі, якая трымае ў сваіх шчамлётках народ гэты аж дасюль.

Хоць і на розных стадыях свайго жыцьцёвага й творчага шляху стаялі тады паэты гэтыя, ды абодвы яны былі з аднае й тае самае слаўнае чарады вялікіх сыноў народу, выданых ім у магутным размаху свайго адраджэньня і ўзвышэньня. Адзін, стары вэтэран таго адраджэньня, што, паводля прызнаньня другога, «адзін, з усіх найвялікшы, маладых гадаваў сваёй песьняй», даўно ўжо перад тым прызнаў і блаславіў гэтага другога, маладога піянера ўзвышэньня, на свайго простага наступніка ў правадырстве да ўзвышшаў прыйдучага. Адылі, малады й стары, як гэта заўсёды бывае, стоячы на розных ступенях веку, дазнаньня й сілы, не маглі глядзець на ўсё зусім аднолькава й бачылі часам адны й тыя-ж зьявы й рэчы ды рэагавалі на іх хоць-бы крыху, а па-рознаму.

Малады, Дубоўка, бачыў яшчэ й магчымасьць і патрэбу паказаць на «вытрасаньне душы» з мастацтва ягонымі пякельнымі «мэцэнатамі» ды станоўка на ўвесь голас заявіць, што «ня было і ня будзе ніколі ад паэзіі трактарам нафты» (нізка вершаў «Пярэсты букет»), тым часам як стары, Купала, мог ужо здабыцца адно на мэлянхалічнае сумаваньне-шкадаваньне таго, што «жалеек сьпеў гаротны патопча трактарнае кола...».

Малады, Дубоўка, спадзяваўся яшчэ бачыць і ў «ліхім» нячуванага гвалту чын «справы добрае на сьвеце», што магутным ускалотам ажывіць народ на штурм цьвярдыняў таго гвалту ды прыцягне да яго й спагаду й падмогу вольнага сьвету, спрычыняючыся да канчальнага вызваленьня яго з путаў «прыгону над словам, над духам, над чынам». Стары, Купала, адзіную надзею меў яшчэ толькі на несьмяротнасьць адвечнага духу Дзядоў, што ў даўгім, векавым мо працэсе перамаганьня-пераяданьня гэных путаў і розных іхных напластаваньняў прывядзе ўрэшце да «сьвята волі бунтаўнічай».

Малады, Дубоўка, у самым «зыходзе зь яснай явы» хацеў яшчэ бачыць сход у «Цёмны лес» «патаёмнага», падзямельнага паўстанскага й партызанскага руху, тым часам як старому, Купалу, ня вырысоўвалася тут нічога больш, апрача жудаснага паходу-шэсьця ў «ночным царстве» «нябожчыкаў жывых» — «у ёрмах, скованай скацінай...».

Адылі, самы «зыход зь яснай явы» ў непраглядную жуду аднолькава панурага ці-то «цёмнага лесу», ці-то «ночнага царства», абодва, і стары і малады, бачылі добра і, як мелі сілы й магі ў дадзеных абставінах, добра і паказалі. А за тым і абодва самі мусілі зыйсьці ў тую цемру й ноч. Бо як для Дубоўкі, гэтак і для Купалы разгледжаныя тутака творы іхныя сталіся апошнімі вялікімі й зыркімі ўспыхамі на іхным шляху. Бо як ня стала паэта Дубоўкі ў 1930 г., калі зачынілася за ім кутая брама бальшавіцкага астрогу й выгнаньня, гэтак ня стала больш і вольнага паэта Купалы пасьля замаху ягонага на самагубства ў тым-жа 1930 г. Застаўся бо толькі Купала — нявольнік і Купала — не паэт. Купала — запраўды «жывы нябожчык», рукою якога, як чужою, чужая-ж рука вадзіла па паперы, аж пакуль свая собская рука ня вызваліла з глуму ў другім, удалым замаху 1942 году...

...А «царства ночнае шалее, над курганамі зьвяр'ё вые» — шалеюць, выюць ужо дваццаць пяць гадоў. Толькі нам, некаторым лічаным адзінкам, паручыла доля вырвацца зь яго «у сьвет, хоць да чорта на рогі», каб жыць у штодзённым пачуцьці ўсё таго самага: «абы ў якой быць старане, каб толькі не назад...»

Так і жывом, пакуль той цемрашал, пакуль гэны «прыгон над словам, над духам, над чынам» паношыцца ў родным краі. Так і жыць мусім, будзем, пакуль... Бо няўжо-ж царству таму «няма бо канца»? Няўжо-ж?

«Штурмуйце будучыні аванпосты» — адзін толькі адказ і можна было-б пачуць з «глушы нямой» глухіх гадоў і лёхаў цёмнага лесу ночнага царства...

Бо толькі тады — «і дасца вам».

«Конадні». № 1, 1954

АНТОН АДАМОВІЧ

ЗАХОДНЯФРОНТАЎСКІ БАЛЬШАВІЗМ І БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ[1]

На глебе работы зь беларускім сялянствам бальшавікі мусілі сутыкнуцца яшчэ з адным праціўнікам, якога спачатку яны ацанілі вельмі нізка,— зь беларускім нацыянальным рухам. Ён быў выключна сялянскі і па сваіх вытоках і па асноўнай сваёй арыентацыі. Лютаўская рэвалюцыя адкрыла шырокі шлях і яму, асабліва ягоным палітычным формам, якія ва ўмовах дарэвалюцыйнага часу ўсяляк падаўляліся.

Ужо 25 сакавіка 1917 году ў Менску адбыўся першы зьезд беларускіх нацыянальных арганізацый, дзе быў абраны Беларускі Нацыянальны Камітэт як найвышэйшы прадстаўнічы і дзейны орган беларускага руху. На другім зьезьдзе (8—12 ліпеня) у гэтай ролі ён быў заменены Цэнтральнай Радаю Беларускіх Арганізацый і Партый, а тая на другой сваёй сэсіі, ужо ў самыя перадкастрычніцкія дні (14—25 кастрычніка 1917 г.), прыняла назоў Вялікая Беларуская Рада.

Імкнучыся пашырыць і ўмацаваць свой уплыў на асноўную масу беларускага народу — сялянства, нацыянальны рух у асобе сваіх прадстаўнічых і дзейных органаў ня мог не сутыкнуцца з армейскім заходняфронтаўскім бальшавізмам, што прэтэндаваў на выключны ўплыў у гэтай масе. Сутыкненьне адбылося найперш на тым груньце, дзе гэты бальшавізм пераважна праводзіў сваю работу зь беларускім сялянствам,— на сялянскіх зьездах і канфэрэнцыях.

---

[1] Разьдзел з дасьледаваньня: Н. Недасек (псэўданім Антона Адамовіча). Очерки истории большевизма в Белоруссии. Большевизм на путях к установлению контроля над Белоруссией. Інстытут па вывучэньні гісторыі і культуры СССР. Мюнхэн, 1954. С. 46—51.

Паводле сьведчаньня З. Жылуновіча, левага беларускага дзеяча і ўдзельніка падзеяў (у далейшым выбітны беларускі нацыянал-бальшавік, першы старшыня ўраду савецкай Беларусі, які звар'яцее і памрэ ў яжоўскай турме), «на Першым зьезьдзе сялянскіх дэпутатаў Менскай губэрні, на такіх самых зьездах Віцебскай і Магілёўскай губэрняў... давялося ўпершыню сутыкнуцца з нацыянальнай сьвядомасьцю беларусаў.»[1]. На першым сялянскім зьезьдзе Менскай губэрні гэтая сутычка нацыянальна настроеных беларусаў з бальшавізмам, агенты якога на чале з Фрунзэ кіравалі зьездам, набыла найбольш вострыя формы: «Калі на пасяджэньні было закранутае нацыянальнае пытаньне, дык сам прэзыдыюм (кіраваны Фрунзэ.— *А. А.*) пастараўся перад сялянскаю масаю скампраметаваць беларускі рух і спыніў яго абмеркаваньне. Гэткія-ж наскокі на беларусаў былі і на Віцебскім губэрнскім зьезьдзе сялянскіх дэпутатаў»[2].

Пра сутыкненьне з бальшавікамі на першым сялянскім зьезьдзе старшыня другога зьезду беларускіх арганізацый і партый заявіў: «Мы заўсёды трымаліся той думкі, што сяляне-дэмакраты па самой сваёй сутнасьці дабіваюцца толькі праўды і справядлівасьці і зусім адкідаюць думку аб прыгнёце адной нацыі другой. Таму я думаю, што зьезды сялянаў, якія праходзілі тут, у Менску, пад кіраўніцтвам чужых людзей (гаворка пра бальшавіка т. Міхайлава-Фрунзэ) не выражаюць самой волі сапраўднай дэмакратыі»[3].

Аднак на гэтым зьезьдзе ад бальшавікоў пацярпелі не адны беларусы, але і эсэры. Таму з боку апошніх нават былі выстаўлены да беларускіх нацыянальных арганізацый прапановы пра стварэньне адзінага антыбальшавіцкага фронту ў барацьбе за адцягненьне беларускага сялянства ад бальшавізму. Прадстаўнік эсэраўскага Аб'яднанага Расейскага Сялянскага Саюзу (АРСС), вітаючы другі зьезд беларускіх арганізацый і партый, што стварыў Цэнтральную Раду, між іншым, сказаў: «Як беларускія партыі, так і АРСС могуць ісьці разам, бо ім аднолькава пагражае небясьпека ад нейкага бальшавіка Міхайлава. Ня ведаю, ці то ён стрыечны

---

[1] Зборнік «Беларусь». Выд. ЦВК БССР. Менск, 1924. С. 185.
[2] Тамсама.
[3] Вольная Беларусь. № 8, 1917.

брат Леніна, ці то ў іншым сваяцтве зь Іюдам Іскарыёцкім, але ён пайшоў і супроць вас, і супроць нас; ён адарваў беларускае сялянства як ад вас, так і ад нас»[1].

Як бачым, дзейнасьць Фрунзэ на першым сялянскім зьезьдзе заслужыла і ад ягоных ворагаў атэстацыю не менш моцную, чым будучае яе ўсхваленьне сталінскімі фальсыфікатарамі; такім чынам, пасьпяховасьць працы менскага начмілу на сялянскай ніве на першым часе не падлягае сумненьню.

Аднак эсэры ўзялі рэванш за сваю паразу на першым менскім сялянскім зьезьдзе, апанаваўшы больш прадстаўнічы другі зьезд сялянаў Менскай і Віленскай губэрняў. Частковыя рэваншы бралі і беларусы, якім у далейшым таксама часам удавалася авалодваць настроем на некаторых зьездах беларускага сялянства. Вядома, пра гэтыя рэваншы бальшавіцкія крыніцы стараюцца прамаўчаць гэтаксама, як і пра эсэраўскія. Так, напрыклад, толькі ў аднаго Шчарбакова можна знайсьці наступнае паведамленьне, выкліканае, відаць, моцнай ахвотаю надаць сваім дасьледаваньням бачнасьць поўнае аб'ектыўнасьці: «Праўда, то тут, то там ім (беларускім дзеячам.— *А.А.*) удавалася павесьці за сабою невялікія групы жыхарства. Так, на губэрнскім сялянскім зьезьдзе Віцебскай губэрні, які адбываўся ў сярэдзіне чэрвеня, прымаецца пастанова патрабаваць аўтаноміі Беларусі, увесьці выкладаньне ў школе на беларускай мове, даць права Беларускай Радзе правесьці падзел зямлі, пасьля таго як Устаноўчы Сход пастановіць перадаць яе ў рукі працоўнага народу»[2].

Але дэмагагічны бальшавіцкі лёзунг пра неадкладны і самачынны падзел зямлі, не чакаючы Ўстаноўчага Сходу, найбольш вабіў сялянства. Ён рабіў усе гэтыя рэваншы, як беларускія, так і эсэраўскія, вельмі нятрывалымі і нядоўгатэрміновымі. Натхнёныя гэтым лёзунгам, сяляне ў некаторых мясьцінах Беларусі (напрыклад, у паўднёвых паветах Менскае губэрні) ужо на пачатку траўня спрабавалі практыкаваць такое самаўпраўнае землеўпарадкаваньне. Калі яны і ўстрымліваліся ад падобных чынных дзеянняў, дык, прынамсі,

---

[1] Вольная Беларусь. № 8, 1917.

[2] В. Шчарбакоў. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі. Мн., 1930. С. 52.

былі вельмі схільныя пасыўна падтрымліваць аўтараў такога звабнага лёзунгу бальшавікоў, якія дабіваліся, каб «каждому было всего **побольше**». (І зямлі, вядома, найперш — такое заснаванае на «народнай этымалёгіі» ўяўленьне пра бальшавікоў імкнуліся падтрымліваць у народзе і іхнія агітатары, што адлюстравана ў некаторых творах беларускай мастацкай літаратуры таго часу.) Такая пасыўная падтрымка асабліва яскрава праявілася ўжо пасьля кастрычніцкіх дзён, падчас галасаваньня ва Устаноўчы Сход.

Аднак калі ў надзённым для сялянаў зямельным пытаньні бальшавікі і маглі карыстацца прыярытэтам перад беларускім нацыянальным рухам, дык значнасьць моманту нацыянальнага, што быў асновай і галоўнай сілаю гэтага руху, яны на той час проста недацэньвалі. Яны лічылі яго ня толькі менш надзённым, але і зусім нават для беларускага сялянства неістотным.

Па часе яны вымушаны былі, бязумоўна, пашкадаваць. Хоць Кнорын, напрыклад, і спрабуе заяўляць, быццам «партыя на самым пачатку зразумела ўсю важнасьць нацыянальнага моманту ў працы сярод сялянаў»[1], але ён жа праз два-тры абзацы мусіць, магчыма, і няўпрыкмет для сябе самога, сьцвярджаць, што «зь беларускім пытаньнем у першым пэрыядзе яго існаваньня нашая партыя ня справілася»[2]. Тое самае прызнае, кваліфікуючы як памылку, і Шчарбакоў. Праўда, на доказ «разуменьня партыяй важнасьці нацыянальнага моманту ў рабоце сярод сялянаў» Кнорын намагаецца сьведчыць, быццам «летам 1917 г. ад імя Менскага савету быў выдадзены цэлы шэраг адозваў для пашырэньня ў вёсцы сярод сялянаў на беларускай мове»[3], але апрача гэтай згадкі ў Кнорына нічога пра тыя адозвы нідзе нельга знайсьці, як нельга адшукаць і ніводнага асобніка з таго «цэлага шэрагу».

Далей Кнорын падрабязна тлумачыць: «Але нязначнае пашырэньне гэтых адозваў, адсутнасьць у партыі работнікаў, якія ведаюць беларускую мову, зрабілі так, што надалей гэтую практыку закінулі: і партыя зьвярталася да вёскі цягам доўгага часу амаль выключ-

---

[1] Зборнік «Беларусь». Менск, 1924. С. 217.
[2] Тамсама. С. 218.
[3] Тамсама. С. 217.

на па-расейску. («Амаль» тут зусім лішняе.— *А.А.*) Дзякуючы гэтаму, на працягу году спэцыфічная беларуская праца праходзіла міма партыі і зрабілася справаю чужых для партыі элемэнтаў»[1]. Нашмат прасьцей Кнорыну было-б адно спаслацца на няраз згаданы ім самім факт, што Беларусь была чужая якраз для элемэнтаў, што складалі ягоную партыю (ужо па самім іх паходжаньні), або абмежавацца наступным апраўданьнем: «Партыя не ўзяла пад увагу той акалічнасьці, што ўмовы жыцьця сялянства хавалі ў сабе магчымасьці разьвіцьця нацыянальных настрояў. І адсутнасьць пэўна выяўленых нацыянальных інтарэсаў сярод сялянства партыя тлумачыла банкруцтвам нацыянал-згодніцкай палітыкі беларускіх нацыянал-сацыялістычных партый»[2]. Сапраўды, нацыянальную стрыманасьць беларуса, адметную, напрыклад, у параўнаньні з экспансыўнасьцю ўкраінца, закінутыя ў Беларусь бальшавікі, відаць, мелі за «отсутствие национальных интересов».

У кожным разе ні беларускай работай, ні хоць-бы нацыянальнай беларускай дэмагогіяй армейскі заходняфронтаўскі бальшавізм зусім не займаўся. Яго варожыя нападкі на беларускі рух як на «панскую інтрыгу», адно паўтаралі афіцыйную дарэвалюцыйную ацэнку таго ж руху як «польскай інтрыгі», і фактычная русыфікацыйная практыка адно ўмацоўвала пазыцыі беларускіх арганізацый, калі не для сучаснасьці, дык для бліжэйшае будучыні.

Дзеля паўнаты карціны варта дадаць, што беларускі нацыянальны рух не абмяжоўваўся працаю сярод сялянства, а імкнуўся абудзіць нацыянальную сьвядомасьць і сярод тых самых пераапранутых у салдацкія шынялі сялянаў — беларусаў. Праўда, з тае прычыны, што яны, паводле вядомага мабілізацыйнага прынцыпу, адбывалі сваю службу ў войску зазвычай па-за межамі Беларусі (асабліва часта на Румынскім фроньце), праца гэтая ў поле зроку заходняфронтаўскага армейскага бальшавізму не трапляла. Ён зацікавіўся гэтаю праблемай толькі тады, калі на Першым Беларускім Вайсковым зьезьдзе, што адбыўся ў Менску 20—22 кастрычніка, была ўтвораная спэцыяльная Беларуская

---

[1] Зборнік «Беларусь». Менск, 1924. С. 217.
[2] Тамсама.

Вайсковая Рада, якую Кнорын, дый усе іншыя бальшавіцкія крыніцы, справядліва прызнаюць «яўна варожай» бальшавікам.

Але калі ўвесь нацыянальны рух у Беларусі знаходзіўся з бальшавізмам у дачыненьнях «яўна варожых», дык у той самы час за межамі краіны пачалі зьяўляцца першыя прыкметы й іншых магчымасьцяў гэтых адносін. Рэч у тым, што беларускі рух разгарнуўся пасьля Лютаўскае рэвалюцыі ня толькі ў самой Беларусі, але й ахапіў масы ўцекачоў-бежанцаў, што добраахвотна ці прымусова пакінулі яе (паводле В. Шчарбакова, да лютага 1917 году з адной Менскай губэрні выехала 256 тысяч уцекачоў[1]). Яны расьсеяліся па Расеі і ў значнай колькасьці сканцэнтраваліся ў яе сталіцах, а ўадначас і ў сталіцах рэвалюцыі — Маскве і Пецярбурзе. І вось тут, адарваныя ад роднай краіны і ад непасрэднага назіраньня антынацыянальнай практыкі армейскага заходняфронтаўскага бальшавізму, а з другога боку, зазнаючы моцнае ўзьдзеяньне найбольш вытанчанай прапаганды самага цэнтральнага бальшавізму, які не саромеўся і ў спэкуляцыі на нацыянальных пачуцьцях, і ў гучных абяцаньнях «национального самоопределения вплоть до отделения» для ўсіх нацый, гэтыя беларускія масы, што нацыянальна ўсьвядомілі сябе і ўключыліся ў беларускі рух, пачыналі пакрысе схіляцца да настрояў своеасаблівага беларускага нацыянал-бальшавізму. На гэтай глебе ў чэрвені — верасьні 1917 году ў Пецярбурзе, на базе дзейнай там арганізацыі вядучай партыі беларускага нацыянальнага руху таго часу — Беларускае Сацыялістычнае Грамады, узьнікае Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Рабочая Партыя (бальшавікоў). Ею непасрэдна кіраваў Аляксандр Чарвякоў (у той час яшчэ вядомы пад сваім сапраўдным беларускім прозьвішчам — Чарвяк), пазьней — шматгадовы старшыня ЦВК Беларускай Савецкай Рэспублікі.

Як відаць ужо з самой назвы партыі, яна ўзьнікла як арганізацыя нацыянальная, а не тэрытарыяльная (у такім разе яна мела б назоў Сацыял-Дэмакратычнай Рабочай Партыі (бальшавікоў) Беларусі, а не Беларускай СДРП), як сталася пазьней з аналягічнымі нацыянал-бальшавіцкімі ўтварэньнямі ў беларусаў і ін-

[1] Шчарбакоў В. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі. С. 15.

шых нацыянальнасьцяў. (Напрыклад, у 1919—1920 гадах існавала Беларуская Камуністычная Арганізацыя, у адрозьненьне ад сучаснай ёй Камуністычнай партыі Беларусі, дзейнічалі таксама Ўкраінская камуністычная партыя і артадаксальная Камуністычная партыя Ўкраіны, Яўрэйская камуністычная партыя і да т. п.) Партыя гэтая і ёсьць тым зародкам першай фармацыі беларускага нацыянал-бальшавізму, якую больш дакладна трэба было-б назваць «фармацыяй беларускага бежанскага нацыянал-бальшавізму». Аднак выяўляць сваю дзейнасьць гэтая фармацыя пачынае ўжо ў пасьлякастрычніцкі пэрыяд, заклаўшы падваліны беларускага нацыянал-камунізму. Гэтай зьяве наканавана было расквітнець ужо на глебе Беларусі і таксама канчаткова адцьвісьці і быць пахаванаю.

Пераклаў з расейскай
Уладзімер Арлоў

СЫМОН БРАГА[1]

МІЦКЕВІЧ І БЕЛАРУСКАЯ ПЛЫНЬ ПОЛЬСКАЕ ЛІТАРАТУРЫ

Польскае грамадзтва адзначае сёлета стагодзьдзе ад дня сьмерці Адама Міцкевіча (24.12.1798—26.11.1855), найвыдатнейшага паэта польскае літаратуры. Міцкевіч — ураджэнец Беларусі, навагрудчанін. Ён і ўся ягоная творчасьць як найцясьней зьвязаныя зь беларускаю зямлёй, з бытам, культурай і гістарычнымі традыцыямі Беларусі.

Ён адначасна належыць да тэй немалой чарады пісьменьнікаў польскай літаратуры, якія апошнімі стагодзьдзямі выйшлі зь беларускага асяродзьдзя й на творчасьці якіх застаўся яскравы адбітак гэтага беларускага паходжаньня.

Пры нагодзе Міцкевічавага юбілею з трох гледзішчаў важна азірнуцца на яго й ягоную творчасьць і беларускай грамадзкасьці. Першае — Міцкевіч вялічынёю свайго таленту пісьменьнік бясспрэчна ня толькі лякальнага польскага значаньня, але й прызнаны пісьменьнік сусьветнай літаратуры, хоць у ёй ён і не належыць да ліку найбольшых. Другое — хоць у выніку гістарычных абставінаў Міцкевіч увесь свой геній аддаў польскай літаратуры, ён, аднак-жа, ураджэнец Беларусі, і элемэнтамі беларускімі насычаная скрозь ягоная паэтычная творчасьць. Трэйцяе — і з палітычнага гледзішча важна мець ясны й прадуманы пагляд на Міцкевіча дзеля таго, што ўжо раз польскія легіёны йшлі на ўсход па «Міцкевічаву зямлю». Дый цяпер у польскім друку ня раз намінаецца на факт,

[1] Псэўданім вядомага беларускага навукоўца Вітаўта Тумаша, у мінулым дырэктара Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью-Ёрку, рэдактара «Запісаў».

што Міцкевічава бацькавіна «засталася» на ўсходзе, за «Ялтанскай мяжой» Польшчы.

У нарысе гэтым будзе коратка адзначанае пытаньне беларускім краем. Адначасна будзе падчыркнуты факт дый характару духовых сувязяў паэта з родным яму беларускім краем. Адначасова будзе падчыркнуты факт існаваньня ў польскай літаратуры XVIII—XX стагодзьдзяў няспыннай яскравай плыні — г. зв. беларускае школы польскае літаратуры. Прытым коратка будзе разгледжаная справа вялічыні гэтай плыні, значаньня яе ў гісторыі польскае літаратуры й будучых гістарычных пэрспэктываў яе.

1

Ведамая рэч, што беларускія землі сталіся буйною калыскаю польскага рамантызму. Тутка, у Вільні, у 1822 г. паказаўся першы томік паэзіі Адама Міцкевіча — «Баляды й рамансы» — кніжкі, якая адкрыла новую эпоху польскай літаратуры. Тутка разам зь Міцкевічам дзеіў гурт студэнтаў Віленскага ўнівэрсытэту — тых першых рамантыкаў, якія пакінулі свой большы ці меншы сьлед у польскай літаратуры. Галоўнымі зь іх былі: Тамаш Зан зь Меншчыны, Ян Чачот з Наваградчыны, Антон Адварды Адзінец з Ашмяншчыны, Аляксандра Ходзька зь Віленшчыны.

У творах усіх гэтых польскіх рамантыкаў зь Беларусі выявіліся моцна мясцовыя беларускія элемэнты, асабліва — элемэнты беларускай народнай творчасьці. Згодна з духам новай пары, рамантыкі ўжо не пагарджалі вуснаю народнаю творчасьцяй, не ганьбавалі народнымі песьнямі, казкамі, легендамі, абрадамі, як гэта даводзілася сьцьвердзіць у прадстаўнікоў папярэдняга польскага псэўдаклясыцызму. Яны, наадварот, цікавіліся вельмі гэтай творчасьцяй, шукалі ў ёй сьлядоў даўно перажытага, рэха далёкіх, адойшлых у забыцьцё падзеяў і цэлых эпохаў; яны падзіўлялі ў ёй праявы народнай мудрасьці й спрадвечны народны сьветагляд.

Мы ведаем, што філяматы, філярэты дый сябры іншых тагачасных віленскіх студэнцкіх арганізацыяў зьбіралі й запісвалі памяткі беларускай вуснай народнай творчасьці. Асабліва адзначыўся ў гэтай галіне

Натальля Арсеньнева.
1935 г.

Юрка Віцьбіч.
Канец 1940-х гадоў.

Натальля Арсеньнева
з мужам Францішкам Кушалем
і сынам Уладзімерам.
1943 г.



Рэдактар газэты «Беларус»
Янка Запруднік.
1960-я гады.



Юрка Віцьбіч у сваёй кватэры.
Нью-Ерк. 1967 г.

Мікола Равенскі (скрыпка)
і Алесь Карповіч (піяніна).
Бэльгія. Лювэн. 1952 г.

Апякун беларускіх студэнтаў у Лювэне
айцец Робэрт ван Каўэлярт.
Пачатак 1950-х гадоў.

Рэдактар гумарыстычнага часапісу «Шарсьцень» (Мюнхэн) Пётра Сыч.
Сярэдзіна 1950-х гадоў.

Прафэсар Уладзімер Сядура-Глыбінны.
1953 г.

Францішак Кушаль.
1960-я гады.



Ізыдар Плашчынскі.
Пачатак 1950-х гадоў.

Старшыня «Хаўрусу» ў Парыжы
Лявон Рыдлеўскі.
1950-я гады.



Янка Станкевіч.
Партрэт работы Пётры Сергіевіча.
Пачатак 1940-х гадоў.

Прэзыдэнт Рады БНР
Мікола Абрамчык.
1950-я гады.

Юльяна Дубейкаўская
(Мэнке).
Каляды. 1957 г.

Мікола Шчаглоў-Куліковіч.

Рэдактар газэты «Бацькаўшчына»
Антон Адамовіч.
1950 г.

Мікола Равенскі.
Лювэн. 1952 г.

ведамы як паэт і ў гісторыі беларускай літаратуры Ян Чачот (1797—1847), вельмі руплівы зьбіральнік беларускіх народных песьняў, казак, прыказак, рэдкіх словаў і выразаў. Ён стаўся навет і насьледвальнікам народнае творчасьці дый напісаў па-беларуску колькі дзесяткоў песьняў дыдактычнага характару. З Чачотавымі фальклёрнымі запісамі былі знаёмыя віленскія рамантыкі. З гэтых-жа запісаў для свае кампазытарскае творчасьці пазьней сіліў народныя беларускія мэлёдыі найвыдатнейшы польскі кампазытар беларускага паходжаньня — Станіслаў Манюшка зь Меншчыны.

Няма дзіва, што пры такой атмасфэры вялікай увагі й пашаны да беларускай народнай творчасьці з пачутых і назьбіраных яе багацьцяў шырока карысталі ў сваёй творчасьці й віленскія польскія рамантыкі. Найперш-жа любіў дый мастацка яе выкарыстоўваў і найбольшы зь іх — Міцкевіч.

Ужо ў сваім маленстве Міцкевіч ці мала наслухаўся беларускіх песьняў, казак, легендаў ад сялянскага навакольля роднага паэту навагрудзкага Завосься. Песьняў шмат ведала й любіла іх пяць і адна, і разам з папрадухамі ўроджаная пяюня служанка Міцкевічаў Гансеўская. Народныя легенды апавядаў і казкі цікава баяў таленавіты казачнік — стары слуга Блажэй. Як гэтыя, пачутыя ў маленстве, песьні й казкі Міцкевіч цаніў, відаць зь ягоных пазьнейшых словаў пра тое, што: «З усіх славянскіх народаў беларусы, гэта значыць сяляне Пінскай, часткава Менскай і Горадзенскай губэрняў, захавалі найбольш агульнаславянскіх рысаў... У іхных казках і песьнях ёсьць усё... Іхная мова адна з найбо́льш мілагучных...»

Біяграфы кажуць, што беларускія песьні любіла пяць пазьней Міцкевічу-студэнту ў недалёкіх ад Завосься Туганавічах і Марыля Верашчака, ягонае першае й нешчасьлівае каханьне. Пачуцьці й свой сум выказвала яна маладому песьняру ведамай і ў шмат варыянтах пашыранай па ўсёй Беларусі народнай песьняй:

Ды цераз мой двор,
ды цераз мой двор
ляцела цяцера.
Ой, ня даў мне Бог,
ня судзіў мне Бог,
каго я хацела.

Вось гэтыя багацьці народнай творчасьці, якія Міцкевіч ад дзён свайго маленства ўспрыймаў і беспасярэдна ад беларускага навакольля, і пазьней праз Чачотавыя дый іншых запісы, ён і скарыстаў творча ў сваёй паэзіі. Ужо ў самым першым Міцкевічавым зборніку, у «Балядах і рамансах», апяянае харство прыроды й легендарны чар роднае паэту Наваградчыны. У вершах-балядах Міцкевіча («Гэта люблю», «Тукай», «Курганок Марылі», «Рамантычнасьць», «Паніч і дзяўчына», «Лялеі», «Упыр», «Дудар», «Рыбка», «Сьвіцязь», «Сьвіцязянка» і іншых) сюжэтна выкарыстана шмат народных мясцовых пераказаў, легендаў пра азёры, рэкі, пушчы, курганы, валуны. У балядах поўна беларускай народнай фантастыкі й вераньняў пра тапленіц, русалак-сьвіцязянак, нячысьцікаў, духаў, зачараваных у птушкі душ, ускрослых нябожчыкаў. Спрадвечны беларускі народны сьветагляд і вера ў сувязі зямнога жыцьця з замагільным сьветам прабіваецца з усёй сілай у гэтай пачаткавай Міцкевічавай творчасьці.

Дзеі Міцкевічавай драматычнай паэмы «Дзяды» таксама разгортваюцца на таямніча-настраёвым фоне спрадвечнага беларускага народнага сьвята-ўрачыстасьці на чэсьць памерлых прашчураў-Дзядоў. Біяграфы Міцкевіча цьвердзяць, што праўзорам сьвятара, які выступае ў IV частцы «Дзядоў», быў вуніяцкі сьвятар з наваградзкага Цырына, прыяцель Міцкевіча — айцец Іван Гарбацэвіч.

Як выясьнілі досьледы Л. Падгорскага-Аколава, месцам, у якім паэт разьвівае дзею II часткі сваіх «Дзядоў», мусіла быць каплічка цырынскага могільніка. За праўзор-жа Гусьляра, што кіруе ходам абрадаў, ці ня паслужыў яму стары а. Цімахвей Гарбацэвіч, бацька Івана. У гэтай частцы асабліва шырака й памастацку выкарыстаныя абрадавыя элемэнты беларускіх Дзядоў з арыгінальнымі сьпевамі, заклінаньнямі. Побач гэтага ў панурым вобразе, калі абернутыя ў птушкі душы прыгонных сялянаў клююць свайго панакрыўдзіцеля, маем ня што іншае, як вобразную паэтычную перадачу народнага, запісанага няраз і этнографамі, перакананьня пра нямінучую кару за прыгонныя зьдзекі й нялюдзкія крыўды народу.

Канкрэтны сюжэт для гэтай панурай драматычнай візіі даў Міцкевічу жыцьцёвы навочны прыклад з та-

го-ж Цырына. Усяго колькі гадоў перад напісаньнем II часткі «Дзядоў» памёр собсьнік Цырына, пан з Варончы й наваградзкі ваявода, Язэп Несялоўскі. Ён, як апісваюць ягоныя сучасьнікі, быў асабліва нялюдзкім і жорсткім да сваіх сялян-прыгоньнікаў[1]. Што гэта акурат Несялоўскага меў на думцы Міцкевіч, калі пісаў II частку «Дзядоў», сьведчаць нам гэтыя словы Пана-Здані ў паэме:

Я нябошчык пан ваш, дзеці,
То-ж мая была тут вёска,
Сяньня ледзь ідзе год трэці,
Як мяне ў труну вы клалі.

У сваёй прадмове да «Дзядоў» Міцкевіч сам апісвае характар беларускіх Дзядоў і кажа, што ён няраз быў навочным сьведкам гэткіх народных абыходаў: «Дзяды — гэта назоў урачыстасьці... у памяць дзядоў ці наагул памерлых прашчураў... У цяперашніх часох... народ сьвяткуе Дзяды ўпотайкі, у капліцах або пустых дамох недалёк магільніка. Застаўляецца тамака звычайна бясёдны стол з розных страваў, пітва, пладоў, і выклікаюцца душы нябошчыкаў... Нашыя Дзяды маюць тую асаблівасьць, што паганскія абрады памяшаныя ў іх з паглядамі хрысьціянскай рэлігіі... Народ верыць, што стравамі, пітвом і сьпевамі прыносіць палёгку чысцовым душам... Гэткая пабожная мэта сьвята, адлюднае месца, ночны час, фантастычныя абрады дзеялі некалі моцна на маё ўвабражэньне; я слухаў казак, апавяданьняў і песьняў пра нябожчыкаў, што вяртаюцца з просьбамі ці перасьцярогамі, а ўва ўсіх нязвычайных выдумах можна было зацеміць пэўную маральную тэндэнцыю й пэўныя, вобразна прадстаўленыя павучэньні. Гэтая паэма дасьць абразы падобнага духу, абрадавыя-ж сьпевы, чары й інкантацыі ў бальшыні дакладна, а часам даслоўна ўзятыя з народнай паэзіі».

Дык Міцкевіч абаснаваў сваю шырака задуманую (хоць, на жаль, і ня цалкам закончаную) паэму на абрадавым фоне Дзядоў пад уплывам тых беспасярэдніх моцных уражаньняў, якія зрабіў на яго ў гады

[1] Leonard Podhorski-Okotów: Tam gdzie się rozegrała «Dziadów» część czwarta. «Wiadomości Literackie», № 17 (756), Warszawa, 1938. Яго-ж: Ksiądz z Cyryna, «Pamiętnik Literacki», Warszawa-Wrocław, 1954, Zeszyt 3, str. 44.

ягонага маленства гэты старавечны беларускі народны абрад-урачыстасьць.

Увадваротнасьць «Дзядом» эпапэя «Пан Тадэвуш» — найбольшы й найважнейшы Міцкевічаў твор,— дае нам не абрады, а паэзію, густа ператканую мастацкімі апісаньнямі беларускіх краявідаў роднай і дарагой паэтаваму сэрцу наднямонскай навагрудзкай зямлі. Аснова-ж паэмы — манумэнтальны эпічны абраз быту шляхты Навагрудчыны на пачатку XIX стагодзьдзя. У паэме — нязвычайнае багацьце беларускіх бытавых і краявідных элемэнтаў. Там геніяльна амаляваныя поры дня й году ў Беларусі, краса неба ў буру і ў пагоду, дрэвы й пушчы, зьбіраньне грыбоў, паляваньне на медзьвядзя, пагоня гончых за зайцам, ігра на паляўнічым рагу, ігра на цымбалах. Мастацкім творам сусьветнага літаратурнага значаньня ўславіў Міцкевіч красу краю свайго маленства й юнацтва, сваю «Літву», свой родны беларускі край.

Усе гэтыя — і фальклёрныя, і бытавыя, і краявідныя — беларускія элемэнты ў творчасьці песьняра дзеля розных прычынаў мала дагэтуль выяўляліся ў крытычных і біяграфічных працах пра Міцкевіча, хоць паасобныя зацемкі пра гэтае пытаньне зьяўляліся ўжо даўно. Яшчэ ў пару польскага рамантызму замілаваньне Міцкевіча да беларускай народнай творчасьці й выкарыстаньне яе ў сваёй паэзіі адзначыў добра Антон Язэп Глінскі (1818—1866), спалячэлы шляхціч з Навагрудчыны, які назьбіраў шмат беларускіх народных казак, пачутых пераважна ў Шчорсах і Нягневічах Навагрудзкага павету. Гэтыя беларускія казкі Глінскі выдаў у пераказе ў польскую мову, як польскія. У сваёй прадмове да гэтых «польскіх» казак Глінскі пісаў пра дачыненьні Міцкевіча да беларускай народнай творчасьці гэтак:

«Вуснае народнае пісьменства нашае зямлі, што складаецца зь песьняў, казак, апавяданьняў, гутарак, легендаў, прыказак і загадак, прыгожае й багатае, перад сотнямі, перад тысячамі навет гадоў паўсталае, з пакаленьня ў пакаленьне пераходзячы праз усю гэтую плынь часу, нашых прадзедаў, нашых прабабак і нас самых пры калысцы й пры ўлоньні нянек забаўляючы... дайшло да нашых часоў у сваёй поўнай сьвяжыні й моцы, згубіўшы мала з свае першабытнае калярытнасьці...»

«Толькі ў нашых, нарэшце, часох мы пабачылі вялікага аматара-ахвотніка народных памятак, натхнёнага пяюна, што першы зазірнуў у скарбніцу легендаў і песьняў народу, пакахаў іх, як прыгожыя краскі радзімай зямлі, перасадзіў на поле польскай літаратуры... І вось на гэтай ураджайнай ніве зьявіліся працаўнікі... Брадзінскі, Залескі, Адзінец, Мальчэўскі, Кандратовіч, Ленартовіч і іншыя. Гэткі ўплыў на нашую літаратуру мелі песьні й легенды народу...»[1]

Дык сам факт шырокага перайманьня беларускіх фальклёрных элемэнтаў у Міцкевічаву польскую паэтычную творчасьць, тое, што Глінскі вобразна назваў «перасаджваньнем красак радзімай зямлі», быў ведамы добра яшчэ Міцкевічавым сучасьнікам. Пазьнейшымі дасьледнікамі паступова было выяўлена й шмат паасобных канкрэтных прыкладаў гэтага скарыстаньня ў творчасьці песьняра беларускага фальклёру. Зьявілася да гэтага пытаньня й колькі працаў беларускіх[2]. Дый дагэтуль не стае ўсё поўнага, манаграфічнага распрацаваньня гэтае цікавае тэмы.

2

Дый ня толькі сюжэтныя асновы твораў у Міцкевіча часта беларускія, ня толькі фальклёрныя, бытавыя дый прыродаапісальныя элемэнты чэрпаныя ў яго зь беларускага навакольля. Шмат беларускага і ў Міцкевічавай польскай мове. Ужо само Міцкевічава прозьвішча чыста беларускае, бо паходзіць ад народнага імя *Міцька*, падобна як *Хадкевіч* ад *Ходзька*, *Радкевіч* ад *Родзька* і г. д. Міцкевіч часта намагаўся захаваць і беларускую вымову свайго беларускага прозьвішча, калі пісаў яго няраз не празь цьвярдое *ц*, як гэтага вымагае польская вымова й правапіс, а насупроць гэтага правапісу, празь мяккое *ць*, як сустракаем гэта

[1] A. J. Glinski: Bajarz Polski. Baśnie, powieści i gawędy ludowe.

[2] Адзначыць тут трэба найперш працы й артыкулы: St. Stankiewicz — Pierwiastki białoruskie w polskiej poezji romantycznej. Część I. (Do roku 1830). Вільня, 1936: Ст. Станкевіч — Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі беларускай. «Бацькаўшчына». № 47—48 (277—278). Мюнхен, 1955: А. Лойка. Адам Міцкевіч і беларускі фальклёр. «Полымя», № 11. Менск, 1955: Л. Сагараў. Матывы беларускага фальклору ў «Балядах і рамансах» Адама Міцкевіча. «Беларусь». № 11. Менск, 1955: Рыгор Шырма. «Зь нявычэрпных крыніц». Літаратура і мастацтва, № 48. Менск, 1955.

часта ў беларускай народнай вымове, г. зн. Mićkiewicz, а не як пішуць палякі ягонае прозьвішча цяпер — Mickiewicz. Беларуская мова, слоўнікавыя, марфалягічныя й сынтаксычныя элемэнты якой тарнаваліся Міцкевічам у польскай мове ягонай паэзіі сьведама й падсьведама, была добра Міцкевічу ведамая. Ведаў ён добра, зразумела, беларускую народную мову, знаў ды высака цаніў і старабеларускую літаратурную кніжную мову. Вось зь якою пашанаю й прызнаньнем Міцкевіч казаў пра беларускую мову канца XVII ст. у аднэй з сваіх лекцыяў пра славянскія літаратуры, чытанай 21 студзеня 1842 г. на Французскім Коледжы ў Парыжы:

«Славянская мова ў межах дзяржавы Пётры В. мела тры гутаркі: маскоўска-расейскую або паўночную, маларускую або паўдзённую, беларускую, заходнюю. Кажнаю з гэтых гутарак гаварыла блізу 10 міліёнаў жыхарства. Паўдзённая, найбольш зычная й музыкальная, ня была аднак-жа нагэтулькі разьвітая, каб магла служыць пісьменству; заходняя, найбагацейшая, найчысьцейшая, што была некалі моваю двара й канцылярыі вялікіх князёў Літвы, выяўляла першараднае ўдасканальненьне; паўночная, адкінуўшы ад яе папсаваную мову колькі фінска-маскоўскіх правінцыяў, мела таксама вялікае багацьце першабытных элемэнтаў, ды ёй не ставала ўзвышанай прасьціні гаворкі літоўска-рускай дый тэй мілагучнасьці, якая свомая мове паўдзённай»[1].

Натуральня рэч, што асабліва шмат беларускіх моўных элемэнтаў сустрэнем у пачаткавай Міцкевічавай творчасьці з пары ягоных «балядаў і рамансаў», калі Міцкевіч быў пад беспасярэднім узьдзеяньнем беларускага народнага навакольля й вуснай народнай творчасьці. Але знойдзем іх і ўва ўсіх пазьнейшых ягоных творах, улучна з эміграцыйнымі. Для прыкладу адцемім некаторыя беларускія словы з «Пана Тадэвуша», ягонага апошняга твору, напісанага на эміграцыі ў Парыжы й выдадзенага ў 1834 г. Тамака між шмат іншых натрапім і на гэткія чыста беларускія выразы: poruczyć, chołodziec, derkacz, czereda, uszak, rozhowory, krobeczka, bruśnice, pokucie, kułak, rańniejszy, plik,

[1] Literatura Słowiańska wykładana w Kolegium Francuzkim przez Adama Mickiewicza 1841—1842. T. II. Пазнань, 1865. Б. 12.

skowroda, szurpaty, kaban, hołota, bizun, niże, lulka, sklut, kotuch, umurzany.

У «Пану Тадэвушу» і ўва ўсёй іншай Міцкевічавай літаратурнай спадчыне натыкаемся раз за разам і на гэткія тыповыя для яго беларусызмы, як *купля* замест польскага *«закуп»*, *надто* ў значаньні *«бардзо»*, *наказаць* у значаньні *вусна паведаміць*, *вшыстко* ў значаньні польскага *«цёнгле»*, *тамэчны* ў значаньні польскага *«тамтэйшы»*, *сіні* заміж польскага *«сіны»*, *«лашчыць сень»* заміж *«ласіць сень»* і мноства падобных іншых[1].

Сустрэнем шмат беларускага і ў сынтаксе Міцкевічавай польскай мовы. Прыкладам, у Міцкевіча, як і ў шмат іншых польскіх пісьменьнікаў зь Беларусі, спатыкаем характэрнае стаўляньне па дзеяслове się (як ёсьць заўсёды ў беларускай мове), хоць для польскае мовы больш характэрнае стаўляньне яго перад дзеясловам. Гэтак, этнаграфічныя палякі звычайна кажуць on się uczy, on się śmieje. Палякі-ж зь Беларусі, пад беларускім уплывам, найчасьцей скажуць on uczy się, on śmieje się. Гэткае ўпорыстае стаўляньне się на другім месцы сустракаем і ў мове польскай пісьменьніцы зь Беларусі Элізы Арэшчыхі[2].

Пададзеныя гэта толькі некаторыя прыклады беларушчыны ў Міцкевічавай мове зь вялікай колькасьці іх там сьведчаць нам даволі пра тое, пад уплывамі якой моўнай стыхіі фармавалася песьнярова польская мова й сярод якога народу вырас ягоны паэтычны талент.

Моўны, краявідны, бытавы й сюжэтны беларускі калярыт, які больш ці менш яскрава выявіўся ўва ўсёй творчасьці Міцкевіча, быў і аднэю з прычынаў хуткага зразуменьня, адчуцьця й успрыняцьця ягонай паэзіі польскімі чытачамі беларускіх земляў, якія самі жылі спрадвеку пад уплывамі таго-ж беларускага навакольля. Гэты-ж самы беларускі калярыт, з другога боку, спачатку быў ладнаю перашкодаю для адчуцьця й успрыняцьця паэзіі Міцкевіча ў самой Польшчы сярод этнаграфічных палякоў.

Варшава й Польшча бараніліся перад новаю паэзіяй Міцкевіча й ягоных сяброў зь Вільні ня толькі дзеля

---

[1] Ст. Станкевіч. Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі беларускай. «Бацькаўшчына». № 47—48 (277—278). Мюнхен, 1955.

[2] Manfred Kridl. Literatura Polska. New York, 1945. B. 393.

новых рамантычных формаў іхнай паэзіі. Важнаю справаю было тут і тое, што гэтая паэзія, выростаючы зь ня польскага, а беларускага асяродзьдзя, мела ў сабе ладную долю зусім чужых паляком ды Польшчы беларускіх і моўных, і фальклёрных элемэнтаў.

Вось якія нараканьні пісалі й слалі з Варшавы ў Вільню чытачы яшчэ на самых пачатках рамантычнага ўздыму ў Вільні: «Вы для Літвы, а не для Кароны пішаце... менш дбаеце пра тое, ці вас у Варшаве будуць разумець, абы ў Вільні ды Літве вас разумелі...»[1]

Пазьней, калі ўжо зьявіўся першы зборнік Міцкевічавай паэзіі, яшчэ вайстрэй заатакавалі варшаўскія літаратурныя крытыкі. Яны ўсю паэзію віленскай групы рамантыкаў ахрысьцілі пагардлівым назовам «смаргоншчыны», а тварцоў яе ня менш пагардліва дражнілі «пінскімі галовамі»[2].

Цікавы вельмі й Міцкевічаў адказ на гэткія рэзкія выступы варшаўскіх крытыкаў, на іхныя дакоры ў тым, што ён «псуе» польскую мову «правінцыялізмамі». У 1829 г. у артыкуле пад назовам «Аб крытыках і рэцэнзэнтах варшаўскіх» ён пісаў: «Вінавацілі мяне галоўна ў псаваньні польскага стылю ўводжаньнем правінцыялізмаў і чужых словаў. Прызнаюся, што ня толькі не высьцерагаюся правінцыялізмаў, але мо знарок іх ужываю». Ясна, што пад назовам «правінцыялізмаў» разумеюцца тутка не якія іншыя, а беларускія моўныя элемэнты Міцкевічавай паэзіі.

Хоць, як відаць з гэтай зацемкі самога Міцкевіча, шмат беларушчыны ў сваёй польскай мове ён ужываў сьведама, знарок, дык, напэўна, яшчэ больш гэтых беларускіх асаблівасьцяў трапіла ў ягоную творчасьць і нясьведама, міжволі, дзеля таго, што яны тады скрозь ужываліся ў штодзённай польскай мове шляхты й польскай інтэлігенцыі ў Беларусі, як яны сустракаліся тамака ў польскай мове й сто гадоў пазьней, перад апошняю сусьветнаю вайною.

Трэба тутка адцеміць, што ўжо з пэрспэктывы сярэдзіны XX ст. некаторыя польскія аўтары адкрылі, што, міжвольныя ці не, «правінцыялізмы» рамантыкаў

[1] List z Warszawy — «Wiadomości Brukowe». № 147. Вільня, 1819.

[2] Józef Kallenbach — прадмова да кнігі: A. Mickiewicz, Pisma, t. III. Броды, 1911. B. X.

у некаторай, прынамся, частцы мелі й сваю важную натады паэтычную функцыю. Хоць напачатку беларушчына ў мове рамантыкаў і рэзала моцна слых варшавякаў, дык з часам вуха польскага чытача «абабілася», прывыкла да іх і — калі яны былі толькі ўжываныя не ў завялікай колькасьці — пачало адкрываць у іх нейкую нязнаную, несустраканую раней у сваёй польскай мове арыгінальную навіну. Гэтая адкрытая навіна цяпер ужо не адпіхала польскага чытача, а надзіла яго, інтрыгавала й ладна спрычынілася да хуткай перамогі віленскага рамантызму ў польскай літаратуры. Польскі мовавед Т. Лер-Сплавінскі гэтую ролю «правінцыялізмаў» Міцкевіча й іншых рамантыкаў азначае сяньня гэтак:

«Уплыў рамантыкаў пакінуў назаўсёды ў нашай літаратурнай мове ладны асад словаў, што разам з ранейшымі наносамі,— якія, як ведама, не абмяжоўваюцца толькі да слоўніка,— стаўся адным з паважнейшых складовых элемэнтаў. Надаваў ён мове, асабліва ў пачатную пару расьцьвітаньня рамантычнай паэзіі, некаторае, быццам экзатычнае, таўро, што моцна дзеіла на чулую фантазію тагачаснага чытача й прычынілася да канчальнай перамогі новай літаратурнай плыні»[1].

Доля беларускіх моўных элемэнтаў у творчасьці пісьменьнікаў беларускага паходжаньня была дваякая. Бальшыня зь іх заставалася толькі характэрнаю асаблівасьцяй літаратурнай мовы таго ці іншага пісьменьніка й далей іхнай творчасьці ў польскай мове не прышчапілася. Іншыя былі з часам перанятыя ў польскую літаратурную мову, урасьлі ў яе назаўсёды й сталіся тамака тым «ладным асадам», пра які ўспамінае нам Лер-Сплавінскі,— сталіся агульнапрынятымі запазычаньнямі з мовы беларускай.

3

Зразумела, што творчасьць не аднаго Міцкевіча была насычаная беларускімі фальклёрнымі, моўнымі дый іншымі элемэнтамі. Тое-ж было ў большай ці меншай меры й зь іншымі пісьменьнікамі зь Беларусі — і рамантыкамі і нерамантыкамі. Творы некаторых зь іх былі гэтак прасякнутыя мясцовым беларускім каларытам у мове, вобразах, адлюстраваным быце, што хоць

[1] Tadeusz Lehr-Spławiński. Język Polski. Варшава, 1947.

яны былі пісаныя па-польску, аднак у сваім духу заставаліся фактычна беларускімі, чужымі, незразумелымі запраўдным этнічным паляком.

Яскравым прыкладам гэтага можа быць паэт польскага познага рамантызму Ўладыслаў Сыракомля, запраўднае прозьвішча Людвік Кандратовіч (1823—1862), які, як і Янка Купала, паходзіў з дробнай безьзямельнай шляхты, дзеля чаго бацькі былі змушаныя займацца арэндаю зямлі. Сыракомля — пясьняр дробнай, «шарачковай» шляхты Беларусі й беларускага сялянства. Дзеля гэтага ягоныя сучасьнікі й ахрысьцілі яго Вясковым Лірнікам. Пісаў ён крыху й па-беларуску. Гэта таленавіты й адначасна вельмі плодны пісьменьнік. Дарма, што век ягоны быў даволі кароткі,— самой паэзіі ён пакінуў больш за дзесяць тамоў.

І вось, дзеля вялікай насычанасьці элемэнтамі краявіду, быту, традыцыі й народнай творчасьці беларускай зямлі, пісаная па-польску паэзія Сыракомлі была чужою, малазразумелаю палякам Польшчы — этнаграфічным палякам. Яго любілі й прызнавалі за вялікага паэта толькі сярод палякоў беларускага нацыянальнага прастору. Гэтую цесную неразрыўную зьвязанасьць Сыракомлі й ягонай паэзіі зь беларускаю зямлёю й залежнасьць ад яе падгледзеў прафэсар Марыян Зьдзяхоўскі дый уняў у формулу, сэнс якое ў скарачэньні гэткі: тамака пачынаецца польская этнаграфічная зямля, дзе перастаюць разумець, цаніць і чытаць Сыракомлю[1].

Гэтая формула — ня што іншае, як прызнаньне важнасьці для пісьменьніка ведамага правіла, сьцьверджанага яшчэ Вольфгангам Гётэ: Wer den Dichter will verstehen, muss in Dichters Lande gehen[2]. У выпадку Сыракомлі натыкаемся адно на той парадокс, што для зразуменьня польскага пісьменьніка пазнаваць трэба ня польскі, а беларускі край!

[1] Арыгінальныя словы Зьдзяхоўскага: «...poezja Syrokomli stanowi duchową granicę między Litwą a Koroną. Gdzie jej rzewność nie wywołuje oddźwięku, jest to znakiem, że stanęliśmy w innym kraju, w innym klimacie psychologicznym, wśród ludzi inaczej czujących, w inny sposób do ojczyzny przywiązanych». Marian Zdziechowski. Władysław Syrokomla. Вільня, 1924. Б. 22. Зь беларускага боку думку Зьдзяхоўскага тады-ж падтрымаў і разьвіў У. Суліма ў нарысе: Прафэсар Зьдзяхоўскі аб беларускай душы Сыракомлі. Вільня, 1925.

[2] Хто хоча ўведаць паэта, павінен пабыць у краіне паэта *(ням.)*.

Гэтая непапулярнасьць, «неразуменьне» Сыракомлі ў Польшчы заўважваецца ня толькі ў мала прыгатаванага масавага чытача. Яно выразна праяўляецца й сярод польскіх літаратурна адукаваных кругоў аж да літаратурных гісторыкаў і крытыкаў улучна. Для ўсіх іх дух сваеасаблівай самабытнай рамантыкі беларускай зямлі, якім авеяная ўся паэзія Сыракомлі, застаўся чужым, незразумелым, недаступным. На прыклад гэтага вось ацэна Сыракомлі ведамага цяперашняга гісторыка й тэарэтыка польскае літаратуры Манфрэда Крыдля: «...быў лірнікам... ягоная ліра... была... сьціплая, малых памераў і з малым лікам струнаў, а й на тых нялічных струнах удалося выграць толькі вельмі нялічныя творы, што могуць мець прэтэньсію на паэзію. Спэцыялізаваўся ў вершаваных *гутарках*... Гутарка ўжо самым назовам паказвала на нешта простае, беспрэтэньсіяльнае, «хатняе», «камінковае», на што даволі малога апавядальнага таленьціку, крыху неперабарлівага гумару, крыху сэнтымэнтальнай сьлёзкі, крыху патрыятычных клічаў»[1].

А вось як зусім інакш ацэньвае Сыракомлю гісторык польскае культуры Ст. Касьцялкоўскі, сам, як і Сыракомля, грамадзянін «Вялікага Княства»: «У Літве... уважалі яго за вялікага таленавітага паэта... Піша ён эпічныя паэмы, і гістарычныя, і сучасныя... далей драмы... дый ён найперш лірык, але як шчыры, сардэчны, глыбокі й разнародны. Умее аддаць найразмавітшыя пачуцьці: ад найбольш узвышанай гарачай рэлігійнасьці, праз патрыятызм і каханьне да роднага краю... да ўсякіх нацыянальна-сацыяльных справаў... У сваёй лірыцы... усюды выяўляе замілаваньне да свойшчыны, братэрскую любоў да ўсіх, што церпяць і пакрыўджаныя... Нязьменна моцна й чыста зьвініць у Сыракомлі сацыяльная нота шляхотнага поступу, глыбака зразуметай дэмакратыі й абарона прыгнечаных...»[2]

Фармулёўка Зьдзяхоўскага расьцягваецца ў той ці

---

[1] Manfred Kridl. Literatura polska. New York, 1945. Б. 344.

[2] Stanisław Kościałkowski. Dzieje nauki i piśmienictwa polskiego w W. Ks. Litewskim. Dzieje Ziem Wielkiego Księstwa Litewskiego. Alma Mater Vilnensis. Лёндан. 1953. Б. 263. Апошнім часам «пачэснага месца» ў польскай літаратуры для Сыракомлі дамагаецца й яго абгрунтоўвае J. P. Dąbrowski ў артыкуле «O poczesne miejsce na Parnasie». «Wiadomoście», № 5 (513). Лёндан, 1956.

іншай меры на бальшыню польскіх пісьменьнікаў беларускага паходжаньня, улучна з самым Міцкевічам. Міцкевіч сваім геніем праламаў, зразумела, гэты беларуска-польскі парог (хоць, як мы бачылі, і не без пачаткавага змаганьня) і быў у канцы ацэнены дый прызнаны й палякамі Польшчы ўжо ня толькі за вялікага паэта, але й за польскага нацыянальнага прарока. Аднак-жа для глыбейшага адчуцьця хараства шмат якіх ягоных твораў, дый для зразуменьня асноўнага духу ўсяе ягонае творчасьці наагул, трэба ўсё-ж знаць ці пазнаць і Dichters Land[1] — паэтавы радзімы беларускі край.

Нязнаньне гэтага краю даводзіць да такой-жа, як і ў выпадку Сыракомлі, недацэны й Міцкевіча, і ня толькі даўнейшымі, але навет сучаснымі польскімі літаратураведамі.

Польскі паэт Часлаў Мілаш, сам «ліцьвін», нядаўна адкрыў гэты для яго неспадзяваны й уражаючы факт: «З жахам пераканаўся, што маладыя лёнданскія паэты (польскія — *С. Б.*)... Міцкевіча ўважаюць за ніжэйшага ад Норвіда»[2].

Падобную недацэну Міцкевіча знойдзем ня толькі ў «лёнданскіх паэтаў». Яна моцна вызірае і ў некаторых іншых, як, напрыклад, у сучаснага польскага дасьледніка Міцкевіча Віктара Вайнтраўба[3] або ў дасьледніка польскае літаратуры, не паляка, К. Баквіса[4]. Дзеля прычынаў тых-жа, што і ў выпадку Сыракомлі, дзеля пачуцьцёвай чужыні да асноўнага духовага асяродзьдзя, зь якога вырас Міцкевіч і ягоная творчасьць, дзеля нязнаньня яго, гэтыя літаратураведы даходзяць да зяпярэчаньня паважнейшай літаратурнай вартасьці калі ня ўсіх, дык бальшыні Міцкевічавых твораў. Яны даходзяць навет да адмаўляньня яму становішча польскага «нацыянальнага паэта». Яны сумляюцца й у тым навет, ці ён запраўды «клясык сусьветнага ўзроўню» (Баквіс).

---

[1] Паэтава зямля *(ням.)*.

[2] Czesław Miłosz. Literatura po dziesięciu latach. «Kultura», № 10/96 Парыж, 1955. Б. 108.

[3] Slawistische Drukken en Herdrukken uitgegeven door C. H. Van Shooneveld, hoogleraar at Leiden. II. The poetry of Adam Mickiewicz by Wiktor Weintraub. Harvard University. Haga, Mouton, 1954.

[4] Claude Backvis. Mickiewicz under western eyes. «Wiadomości», № 45 (501). Лёндан, 1955.

Гэткая ацэна Міцкевіча спрычыненая яўна тым, што гэтым дасьледнікам не стае тых духовых і пачуцьцёвых сувязяў з краем Міцкевічавага паходжаньня, таго канечнага «ключа», безь якога немагчыма раскрыць дый адчуць ува ўсёй глыбіні й паўніні чар Міцкевічавай паэзіі.

Падсумоўваючы наш агляд беларушчыны ў Міцкевіча, прыходзім да выснаваў, што ў Міцкевічавай творчасьці сустракаем беларускія элемэнты разнаякага характару: моўныя, фальклёрныя, бытавыя, сюжэтныя, краявідныя. Яны там у такім насычаньні, што перашкаджалі й перашкаджаюць шмат якім палякам успрыняць глыбей ягоную творчасьць, яны — частая прычына недацэны яго.

Беларускія элемэнты ў Міцкевічавай творчасьці ня нейкая толькі павярхоўная закраса для «калярытнасьці». Яны арганічна зь ёю зрослыя, яны неадлучныя, яны ў самых каранёх гэтай творчасьці. Гэта зусім натуральная зьява ў пісьменьніка, які радзіўся ў Беларусі, тамка рос і духова сфармаваўся пад беспасярэднім уплывам тагачаснага быту й культуры беларускага сялянства й мясцовае шляхты. Хай сабе палітычна й культурна гэтая шляхта была ўжо й ладна спалячэлая,— ейная польская мова ўсё роўна была сваеасаблівая, моцна адменная ад польскае мовы палякоў этнаграфічных. Гэта была мова, насычаная па берагі беларускімі моўнымі элемэнтамі. А ў сваім быце гэтая шляхта ўсё роўна надалей перахоўвала з пашанаю шмат адвечных традыцыяў сваіх беларускіх прашчураў і адначасна міжволі заўсёды пераймала элемэнты старавечнае народнае культуры, у моры якой яна спрадвеку жыла, а ўплываў якой усьцерагчыся не магла, калі-б навет і хацела.

4

Сьцьвердзіўшы факт паўсюднага існаваньня беларускіх элемэнтаў у Міцкевічавай творчасьці, пяройдзем цяперка да спробы абазначэньня характару ягоных духовых і пачуцьцёвых сувязяў з Польшчаю й з сваёй роднай «Літвою» (Беларусяй).

Шукаючы адказу на гэтае пытаньне, трэба найперш усьведаміць сабе адзін важны факт: край Нёмна й

Вяльлі, а ня Віслы й Варты быў прыроднаю й нявычэрпнаю крыніцаю Міцкевічавага паэтычнага таленту й натхненьня. Ён з гэтага «літоўскага», як тады казалася, краю вырас і быў ад маленства тысячмі ніцяў зьвязаны зь ім, зь ягонай тагачаснасьцяй і мінуласьцяй. Ні ў Варшаве, ні ў Кракаве Міцкевіч ніколі ня быў, польскай запраўднай зямлі блізу ніколі ня бачыў. Адзінае, вельмі кароткатрывалае й павярхоўнае знаёмства яго з заходнім памежжам этнаграфічнае Польшчы здарылася толькі ў 1831 г., калі ў красавіку месяцы ён ехаў празь Нямеччыну з захаду, каб далучыцца да польскага паўстаньня, але даехаў усяго да Пазнаншчыны й неўзабаве ізноў вярнуўся на захад. Дык ня дзіва, што ўва ўсёй пясьнярскай творчасьці Міцкевіча ня шмат знойдзем прысьвечанага самой Польшчы, Польшчы як рэальнай запраўднасьці, ейнаму краявіду, ейнаму народу, ейнаму быту.

Гэтага ў яго ня было й не магло быць. Польшча ў яго існавала толькі як палонячая яго ідэя, як накінутая школьным выхаваньнем абстрактная дзяржаўна-палітычная канцэпцыя, а ніколі не як жывая, наяўная й перажытая запраўднасьць, якую ён мог-бы — асабліва на чужыне — адчуваць з усёю вайстрынёй свае паэтычнае фантазіі, як гэта было зь ягонаю «Літвою» (Беларусяй), за якою й толькі за ёю ён заўсёды тужыў. З Акерманскіх сьцяпоў на Крыме ён лавіў голас з свае далёкае «Літвы».

З Парыжа ці Лязаны сваім сябром паэт пісаў: «Часта нападае сум па Літве, і ўвесь час сьню Наваградак і Туганавічы».

На дыскусійным вечары аб Міцкевічу ў Парыжы 6 сьнежня 1955 году Ч. Мілош гэткім навочным спосабам выясьняў французкім пісьменьнікам уражаючы парадокс польскай літаратуры — прыход найбольшага паэта яе звонку, зь няпольскіх прастораў: «Уявеце сабе цэнтральную постаць французкае літаратуры, якая нарадзілася-б у Канадзе, якая ніколі ня была-б у Парыжы, якая пабыла-б у Францыі ўсяго колькі тыдняў, недзе, для прыкладу, у ваколіцах Нанту. Гэтак было зь Міцкевічам...» («Культура», № 1/99. Парыж, 1956 г. Б. 113.)

Цераз гады маленства й юнацтва Міцкевіч усёю душой быў зрослы толькі з жывою беларускаю запраўднасьцяй, зь ейнаю прыродаю, людзьмі, трады-

цыяй, з народнаю творчасьцяй, зь якое й чэрпаў поўнымі жменямі для свае паэзіі. Гэткіх беспасярэдніх сувязяў і перажыванняў з польскім краем і народам у яго не ставала. Пра іх ён меў усяго бледнае кніжнае ўяўленьне. Вось дзеля гэтага жывая, рэальная Польшча й не магла адбіцца ў ягонай паэтычнай творчасьці, хоць творчасьць гэтая ідэйна й была прысьвячаная ўся бяз рэшты справе вызваленьня Польшчы дый адбудове старое Рэчы Паспалітае.

Гэткую цесную сузалежнасьць Міцкевічавага паэтычнага таленту зь беларускай зямлёю падчырквае яшчэ й той факт, што калі часам у творчасьці ён спрабаваў адарвацца ад свае радзімае стыхіі, дык адначасна пераставаў і быць вялікім паэтам, здабываўся толькі на слабую з мастацкага гледзішча публіцыстыку, упадаў у містычна-сэктанцкі товіянізм, у хваравіты польскі мэсіянізм. Паказваюць гэта добра ягоныя «Кнігі Народу й Пілігрымства Польскага».

Дык не зважаючы на блізу поўную ідэйна-палітычную польскую асыміляцыю, не зважаючы на вядучую ролю ў польскай паэзіі рамантычнай пары, Міцкевіч у польскай літаратуры застаецца адначасна й яскравым рэпрэзэнтантам этнаграфічна чужога Польшчы прастору дый чужой народнай стыхіі. З гэтага гледзішча ў польскай літаратуры ён займае падобную пазыцыю, як украінец з паходжаньня Гогаль у літаратуры расейскай. І Гогаль быў цалком у палоне палітычнай ідэі вялікадзяржаўнай Расеі, хоць усім сваім целам і душою быў зрослы найперш із сваёй роднай Украінай, якой красу, быт, гістарычную мінуўшчыну па-мастацку й з захапленьнем адбіваў у сваёй творчасьці.

Нацыянальную дваістасьць свае псыхікі адчуваў як найлепш сам Міцкевіч, які поўнай этнічнай польскай асыміляцыі ніколі не паддаўся, сьведама ёй працівіўся, захоўваў знарок свае «літоўскія» асобнасьці й традыцыі. Аб «дзьвёх душах» Міцкевіча вось што кажа польскі літаратурны крытык і гісторык, прафэсар Пігонь: «Трэба сказаць сабе ясна, што Міцкевіч, пры ўсёй гарачыні й шырыні польскага патрыятызму, заўсёды меў, навет знарок у сабе культываваў, сьведамасьць некаторай пляменнай асобнасьці. Пачуцьцёва ён якнайцясьней быў зьвязаны з радзімай зямлёй, быў літоўскім паляком, «ліцьвіном», ніколі ня чуўся за

нешта адно з «короняжэм» (паляком этнаграфічным.— *С. Б.*)»[1].

Вось дзеля гэтага на чужыне, зь сьцяпоў Крыму, Міцкевіч слухаў голасу зь «Літвы», а ня з Польшчы. Вось дзеля гэтага ён свой найвыдатнейшы паэтычны твор — «Пана Тадэвуша» — пачынае зваротам «Litwo, Ojczyzno moja!», а ня «Polsko, Ojczyzno moja!».

5

У гісторыі польскае літаратуры XIX стагодзьдзя група польскіх пісьменьнікаў рамантычнай пары — Антон Мальчэўскі, Сэвэрын Гашчынскі й Язэп Залескі — часта выдзяляецца ў асобную, гэтак званую «ўкраінскую школу» польскае літаратуры. Гэтае выдзяленьне абумоўленае ня гэтулькі самым фактам паходжаньня гэтых трох пісьменьнікаў з украінскіх земляў, колькі тым, што ў іхнай творчасьці вельмі яскрава адбіваецца ўкраінскі калярыт. Выяўляецца ён у скарыстоўваньні ўкраінскіх народных і легендарна-гістарычных сюжэтаў, у перайманьні ў сваю творчасьць элемэнтаў украінскага фальклёру, украінскіх моўных асаблівасьцяў, у яскрава адмаляваным у іхных творах украінскім краявідзе.

Калі ў гісторыі польскай літаратуры справа існаваньня «ўкраінскай школы» ў рамантычную пару агульна прызнаны факт, дык пра падобную «беларускую школу» ў ёй звычайна куды радзей гаворыцца, хоць і яна была й мела зусім ня меншае, але навет большае значаньне для польскай літаратуры за «школу ўкраінскую».

Адным-жа з галоўных прадстаўнікоў гэтай «беларускай школы» быў ня хто іншы, як сам Адам Міцкевіч, пачынальнік польскага рамантызму. Блізу ўся Міцкевічава творчасьць носіць на сабе ня менш яскравы калярыт беларускі, як творчасьць пісьменьнікаў «украінскай школы» калярыт украінскі. А Міцкевіч быў не адзіным рамантыкам, што ўрос у польскую літаратуру зь беларускага асяродзьдзя. Міцкевіч быў толькі адным зь іх, найважнейшым, найбольшым. Ужо ўспа-

[1] Stanisław Pigoń. Pan Tadeusz. Wzrost, Wielkość i Sława. Варшава, 1934. Б. 224.

міналася вышэй, што ў рамантычную пару побач Міцкевіча зь беларускіх земляў былі дзейнымі ў польскім пісьменстве Зан, Чачот, Адзінец, А. Ходзька. Да іх трэба яшчэ далучыць празаіка Гэнрыка Жэвускага, а з пазьнейшага пакаленьня рамантыкаў Ігната Ходзьку дый Уладыслава Сыракомлю.

Яшчэ перад рамантызмам выдатную ролю ў польскай псэўдаклясычнай літаратуры канца XVIII і пачатку XIX стст. гралі пісьменьнікі беларускага паходжаньня Адам Нарушэвіч, Дыянізы Князьнін, Франьцішак Багамолец, Юльлян Урсын Нямцэвіч. У псэўдаклясыкаў, аднак-жа, беларушчына не праявілася з гэткаю сілаю, як у польскіх рамантыкаў. Гэта сталася часткава таму, што псэўдаклясычная літаратура мела арыентацыю не на народную творчасьць, як гэта было ў рамантыкаў, а на клясычную літаратуру антычнага сьвету, найперш грэцкую дый рымскую. Галоўная-ж прычына была тая, што польскія псэўдаклясыкі беларускага паходжаньня тварылі й жылі блізу ўвесь час у Польшчы, у Варшаве, згуртаваныя навокала мэцэната літаратуры караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Іхныя сувязі дзеля гэтага з народам і краем свайго паходжаньня, зь беларускім краем, былі слабыя.

Гэта былі фактычна эмігранты зь Беларусі, што ўвесь час жылі й тварылі ў Польшчы.

Цесную сувязь зь беларускім народам і ягоным бытам мелі затое пісьменьнікі беларускага паходжаньня пары польскага «пазытывізму» другой паловы XIX ст. Найвыдатнейшым талентам зь Беларусі ў гэтую пару была Эліза Арэшчыха (Ожэшкова), родам з Горадзеншчыны, аўтарка сацыяльна-бытавых аповесьцяў з жыцьця беларускай вёскі, засьценкаў, мястэчкаў, як «Над Нёманам», «Дзюрдзі», «Хам», «У зімовы вечар». Не таямнічай фантастыкай беларускай народнай абрадавасьці ці казачна-легендарным сьветам чараў і духаў, як гэта было ў рамантыкаў, захаплялася Арэшчыха. У сваёй творчасьці яна адбіла шэры штодзённы быт народу, найперш гора, людзкую нядолю, цемнату й сацыяльныя злыдні.

Куды меншая талентам і значаньнем, хоць і даволі пладавітая, была й пісьменьніца Марыя Радзевічанка. Пышныя абразы прыроды, а асабліва пушчаў Беларусі, знойдзем таксама ў празаіка Юзэфа Вайсэнгофа,

які паходзіў зь Дзьвіншчыны, а пісаў у канцы XIX і пачатку XX стст. («Собаль і панна» й іншыя).

З польскага нэарамантызму вырас, а тварыў у міжваенную пару паэт Леанард Падгорскі-Аколаў зь Меншчыны, аўтар цэлай кніжыцы лірыкі, прысьвечанай Беларусі,— Białoruś. У міжваенную ўжо пару пісаў Мэльхіёр Ваньковіч свае ўспаміны, а Сяргей Пясецкі свае прыгодніцкага характару аповесьці («Каханак Вялікай Мядзьведзіцы», «Пяты этап», «Ніхто ня дасьць нам вызваленьня» й іншыя).

У трыццатых ужо гадох XX ст. зьявілася вельмі актыўная група паэтаў, у бальшыні беларускага паходжаньня, г. зв. «віленская авангарда». Адцеміць зь іх трэба імёны Тодара Буйніцкага, Язэпа Масьлінскага, Ежага Загурскага, Юзэфа Чаховіча, Ежага Путрамэнта.

Ужо цяперашняй, паваеннай парой, на эміграцыі, зьявіўся цэлы чарод польскіх пісьменьнікаў зь Беларусі, у творах якіх у большай ці меншай меры адбіваецца й знанае дый блізкое ім беларускае навакольле. Адзначыць зь іх трэба цікавую аповесьць пра духовую трагедыю «тутэйшага» Марыі Кунцэвічыхі «Лясьнік», дзея якой адбываецца ў палове мінулага стагодзьдзя на беларускім Падляшшы, г. зн. на захад ад Буга.

Ведамыя шырэй дзьве шавіністычна шляхоцкія «надбярэзінскія» аповесьці Флярыяна Чарнышэвіча — «Надбярэзінцы» й «Віцік Жывіца».

З талентам пісаныя аповесьці з быту Віленшчыны й Вільні Язэпа Мацкевіча «Прыяцель Флёр» і «Дарога нікуды».

У гэтым пераліку ўзятыя на ўвагу толькі польскія пісьменьнікі беларускага паходжаньня. У ім сьведама апушчаюцца польскія пісьменьнікі, у творчасьці якіх таксама праявіліся беларускія тэматычныя ці іншыя элемэнты, але якія ня былі беларускага паходжаньня, як, для прыкладу, Поль, Гомуліцкі, асабліва Крашэўскі.

Дык пачынаючы ад канца XVIII ст. праз увесь XIX век і аж па сяньня йдзе бесьперапынная чарада таленавітых польскіх пісьменьнікаў беларускага паходжаньня. Сустракаем іх шмат у кажную пару польскае літаратуры, ад псэўдаклясыцызму, праз рамантызм, «пазытывізм», нэарамантызм, міжваенную «аван-

гарду», аж да нашых дзён. Пачаткі-ж гэтай плыні й паадзіночных спарадычных прадвесьнікаў яе мы можам прасачыць і яшчэ раней за XVIII ст., бо сустрэнем іх ужо пачынаючы ад канца XVI ст., калі зьяўляюцца самыя першыя пісьменьнікі зь беларускіх земляў, што пісалі па-польску.

Падобная ў іх усіх псыхіка й мова, калярыт, адна літаратурная традыцыя надаюць гэтым пісьменьнікам агульную спэцыфічную беларускую закрасу й гэтым лучаць іх у адну асобную плынь польскае літаратуры, беларускую плынь. Часам, праўда, бывае навет цяжка й абазначыць, у чым выражаецца гэтая сваеасаблівая «закраска» ў паасобнага пісьменьніка, аднак-жа яна заўсёды адчуваецца. Марыян Зьдзяхоўскі абумаўляў гэтую цяжкаўхопную асаблівасьць «псыхалягічным кліматам» краю. Сучасны польскі пісьменьнік Часлаў Мілош кажа аб узьдзеяньні на асабовасьць пісьменьніка «геаграфіі»: «на спосаб адчуваньня ўплываюць дрэвы, рэкі, колер неба, абліччы народу, бачаныя ў маленстве, гэтае няўхопнае «штось», што складаецца на душу кажнага краю».

У рамантычнай пары ў асобную «беларускую школу» польскае літаратуры пісьменьнікаў зь Беларусі выдзяляў ня хто іншы, як сам Міцкевіч, які толькі называў яе тагачасным тэрмінам «літоўская». Міцкевіч гэтую «літоўскую школу»,— у якую, зразумела, залічаў і сябе,— ставіў у характары побач «школы ўкраінскай», а супроцьстаўляў яе «школе польскай» — «варшаўскай школе». Вось што Міцкевіч гаварыў пра «літоўскую», «украінскую» й «варшаўскую» школы ў сваіх выкладах пра славянскія літаратуры на Французскім Коледжы ў Парыжы, у лекцыі 17 чэрвеня 1842 г.: «Дзьве школы пачалі цяпер зарысоўвацца ў польскай літаратуры: літоўская й украінская. Літоўскія паэты першыя ўводзяць у літаратуру сьвет духаў, шукаюць у тэй краіне таёмных спружынаў усяго, што дзеецца на зямлі. Спн. Жорж Санд у сваім артыкуле, прысьвячаным разгляду твораў аднаго з аўтараў гэтай школы (ходзе тутка пра А. Міцкевіча.— *С. Б.*), увесь характар яе ахапляе заўвагаю, што «літоўскія пісьменьнікі ставяць асяродак дзеі ў духовым сьвеце, а бачны сьвет і людзей маюць толькі за ягоныя прылады». Гэтую-ж тэндэнцыю сустракаем і ў школе ўкраінскай. Яна ня йдзе гэтак далёка, як літоўская, аднак-жа заўсё-

ды дапушчае нясупынны ўплыў гэтага сьвету на зямны сьвет.

У кажнай паэме гэтых абедзьвюх школаў можна разрозьніць два бакі: рэальны й гэтак званы фантастычны, гэта значыць духовы. «Украінская» школа кідае ўжо хвальшывыя блуканьні даўнейшай паэзіі польскай, ня шукае ўжо сваіх герояў паміж палітычных дзеячоў, а славіць народных правадыроў, выдабывае імёны, дагэтуль няведамыя ў літаратуры, найперш стаецца папулярнаю».

«Гэты кірунак ліцьвіноў і ўкраінцаў вельмі не падабаўся школе старой, якую рэпрэзэнтавала варшаўская грамадзкасьць; крытыка наклеймавала гэтую новую літаратуру як наступ барбарства, і запраўды была гэта вайна супроць клясы цывілізаванай, клясы ўжо бясьсільнай і бясплоднай»[1].

Дык, як бачым, сам Міцкевіч існаваньне асобнай школы польскіх пісьменьнікаў зь Беларусі, «літоўскай школы», уважаў за наяўны й само сабой зразумелы факт. Ён-жа падчыркнуў духовае сваяцтва й супольныя рысы гэтай школы з «школаю ўкраінскаю» дый адзначыў і прагрэсыўна-рэвалюцыйную існасьць ейнага антаганізму з польскай «варшаўскай» школай, цьвярдыняй адміраючага псэўдаклясыцызму.

Аднак-жа пазьней гэткае выдзяляньне пісьменьнікаў зь Беларусі ў асобную «літоўскую» групу ў гісторыі польскае літаратуры было дзеля розных прычынаў закінутае. Адна зь іх, і хіба найважнейшая, была тая, што «літоўская школа», найперш дзеля Міцкевіча, сталася з часам пераможнаю на дзесяткі гадоў і галоўнаю школаю польскае літаратуры. Яна накінула свой духовы зьмест цэлай літаратурнай эпосе ў польскім пісьменстве. А паколькі гэтая школа заняла цэнтральнае месца ў польскай літаратуры дый набыла сынанімнае зь ёю значаньне, дык назоў рэгіянальны, назоў нейкай пабочнай правінцыянальнай адменнасьці, ня мог ужо ўтрымацца за ёю.

Дык выдзяляньне асобнай рамантычнай беларускай (ці «літоўскай») школы ў гісторыі польскай літаратуры было закінутае не дзеля таго, што гэтая школа была

---

[1] Literatura Słowiańska wykładana w Kolegium Francuzkiem przez Adama Mickiewicza. 1841—1842. Lekcyja XXX. T. II. Пазнань, 1865. Б. 281.

менш важная ці менш яскрава праявілася за «школу ўкраінскую», а, наадварот, дзеля таго, што яна была куды важнейшаю для польскае літаратуры рамантычнай пары. Факт гэты добра адзначае гісторык польскае культуры Ст. Касьцялкоўскі, калі кажа пра віленскіх рамантыкаў, што яны «...перасталі быць вартасьцяй лякальнай, літоўскай — сталіся пазыцыяй, аднэй з найбольш вартасных, у цэласьці нацыянальнага (польскага) жыцьця»[1].

Зразумела, што слова «літоўская» ў дачыненьні да віленскай літаратурнай школы, як і наагул слова «Літва» ў Міцкевічаву пару было звычайна роўназначным зь сяньня спапулярызаваным тэрмінам «беларуская», «Беларусь», а вельмі рэдка й выпадкова мела значаньне «летувіская» ці «жамойдзкая». Сяньня справа выясьненая, што Міцкевіч летувіскае мовы ня ведаў. Гэта добра відаць зь ягоных спробаў запісаць дзьве жамойдзкія народныя песьні ў часе ягонай настаўніцкай працы ў Коўні. Запісы гэтыя захаваліся й паказваюць, што запісваў ён на слых няведамую сабе мову[2]. Міцкевіч, праўда, напісаў колькі сваіх твораў на легендарна-гістарычныя сюжэты, якім намагаўся надаць летувіскі гістарычны калярыт (паэмы «Гражына», «Конрад Валенрод», пара балядаў). І гэта фактычна ўсё летувіскае, што ў яго можна знайсьці.

Дык дарма, што выдзяляньне асобнай беларускай плыні ці навет школы было закінутае ў гісторыі польскае літаратуры ад пары рамантызму. Яна, аднак, увесь час існавала ад канца XVIII ст. й існуе па сяньня. Некаторых-жа ейных прадвесьнікаў можна знайсьці навет і ў ранейшых як XVIII стагодзьдзе, ад канца стагодзьдзя XVI.

Па сяньняшні дзень няма, аднак-жа, сыстэматычнага й дакладнага вывучэньня гэтай цікавай для нас плыні ў гісторыі польскае літаратуры. Яшчэ перад другою сусьветнаю вайною заданьне выявіць «беларускія элемэнты ў польскай рамантычнай паэзіі» паставіў сабе Ст. Станкевіч. Першы том ягонай дакторскай

---

[1] Stanisław Kościałkowski. Dzieje nauki i piśmienictwa polskiego w W. Ks. Litewskiem. Dzieje ziem Wielkiego Księstwa Litewskiego. Alma Mater Vilnensis. Лёндан, 1953. Б. 259.

[2] M. Brensztein i J. Otrębski. Dajny litewskie zapisane przez Mickiewicza. Rozprawy i Materiały Wydziału I T-wa Przyjaciół Nauk w Wilnie. T. I. Сшыток 4. Вільня, 1927.

працы, надрукованы пад гэткім-жа загалоўкам, ахапляе, на жаль, толькі пару да 1830 г.[1]. Другі том, які меўся быць прысьвячаны найперш Міцкевічу й пазьнейшым рамантыкам, на жаль, ня выйшаў.

Дый беларускую плынь у польскай літаратуры трэба было-б прасачыць ня толькі ў пару рамантызму, але праз усе літаратурныя поры й кірункі, і ня толькі ў самой паэзіі. Толькі гэткія студыі дазволілі-б нам выявіць усю вялічыню беларускіх элемэнтаў у польскай літаратуры дый выясьнілі-б дакладней тую нязвычайна вялікую ўдзельную вагу, якую мела беларуская плынь для польскае літаратуры і для разьвіцьця польскае культуры наагул.

6

Ужо цэлыя два стагодзьдзі нясупынная чарада польскіх пісьменьнікаў беларускага паходжаньня пакаленьне за пакаленьнем ідзе праз усе літаратурныя эпохі й кірункі аж да сяньняшніх дзён. Толькі новыя палітычныя абставіны, якія зайснавалі на беларускіх землях у выніку другой сусьветнай вайны, хіба спыняць гэты працэс. Цяперашняя мяжа Польшчы на ўсходзе, што наглуха разьмяжоўвае беларускія землі й землі польскія (за выняткам Беласточчыны й часткі Падляшша), хіба стрымае на сучасным пакаленьні гэты жыцьцядайны паток беларускіх талентаў у рэчышча польскае літаратуры, як і ў рэчышча польскае культуры наагул. Ці захаваныя гэтак у Беларусі таленты знойдуць адпаведныя гістарычныя абставіны на творчую дзейнасьць для свае беларускае літаратуры й культуры, гэта пакажа будучыня. Тое, аднак-жа, ужо цяпер пэўна, што гэтая поўная ізаляцыя Беларусі ад Польшчы будзе вялікаю стратаю для культуры й літаратуры польскай.

Гэтым фактам польскія культурныя дзеячы ўжо сяньня вельмі затрывожаныя.

19 ліпеня 1952 г. у польскім часапісе «Ожэл Бялы» (№ 29/524) зьявіўся пра гэта артыкул польскага пісьменьніка Фэрдынанда Гетэля. Гетэль робіць выснаў,

[1] Stanislaw Stankiewicz. Pierwiastki białoruskie w polskiej poezji romantycznej. Część I. (Do roku 1830.) Вільня, 1936.

што стварэньне па другой сусьветнай вайне польскай *нацыянальнай* дзяржавы, г. зн. дзяржавы бяз чужых нацыянальных мяншыняў і тэрыторыяў, адаб'ецца трагічна на далейшым разьвіцьці польскае культуры. Польшча безь беларускіх ды ўкраінскіх прастораў на ўсходзе, пры адначасным шчэзьненьні, у выніку тэй-жа вайны, нямецкага ды жыдоўскага мяшчанстваў зь местаў Польшчы, паводля Гетэля, нямінуча дачакаецца вялікай перамены структуры й значнага зьбядненьня далейшых пакаленьняў польскай культура-творчай інтэлігенцыі.

Гетэль адзначае, што апошнімі стагодзьдзямі толькі самога нямецкага паходжаньня ведамыя былі гэткія выдатнейшыя тварцы польскае культуры: Лелевэль, Траўгут, Гротгер, Брандт, Ленц, Тэтмаер, Поль, Кольбэрг, Глёгер, Ліндэ, Эстрайхер. У тым-жа часе дзейнымі творча на полі польскае культуры былі гэткія таленты паходжаньня жыдоўскага: Клячка, Кронэнбэрг, Розэн, Фэльдман, Лесьмян, Тувім, Ашкеназы. Гэтыя абедзьве важныя крыніцы прыплыву працаўнікоў для польскае культуры — нямецкая й жыдоўская — у выніку ваенных і паваенных дэмаграфічных пераменаў цяпер больш у Польшчы ня йснуюць.

Гетэлеў пералік польскіх культурнікаў нямецкага й жыдоўскага паходжаньня вельмі пабежны й далёка ня поўны — гэта толькі некаторыя прыклады. Прозьвішчаў гэткіх можна падаць куды больш. У самой толькі польскай філялёгіі апошніх дзесяцігодзьдзяў адзначыліся нямала гэткія навукоўцы зь нямецкімі прозьвішчамі, як Брукнэр, Ніч, Лер-Сплавінскі; у літаратуры — Крыдль. У сучаснай польскай паэзіі важную пазыцыю займае творчасьць габрэя Слонімскага; сам Гетэль, як паказвае прозьвішча, зь немцаў. Трэцяю, паводля Гетэля, і вельмі важнаю крыніцаю талентаў для культуры Польшчы былі г. зв. палякамі «крэсы», г. зн. беларускія й украінскія землі... Гетэль падчырквае, што быў час, калі «што другі польскі геній меў прозьвішча ўкраінскае, беларускае, летувіскае ці яцьвяскае».

Яшчэ польскі маляр-мастак канца XIX — пачатку XX стст., Яцэк Мальчэўскі казаў, што «гонар польскага генія нашых часоў уратаваў Высьпянскі. Усіх іншых спарадзіла Русь!» (г. зн. беларускія й украінскія землі.— *С. Б.*).

Далей Гетэль разважае: «Кардонная лінія... між «крэсамі» й Польшчаю, шчыльная, як ніколі ня была... Для польскае інтэлігенцыі гэта азначае, што абарваўся даплыў крэсовых інсьпірацыяў на колькі пакаленьняў...» І дзеля гэтага: «Ад новай польскай інтэлігенцыі ня можна шмат спадзявацца. Ідзём у часы худых гадоў, у гады, у часе якіх трэба хоць-бы ператрываць дый зьберагчы ўжо біялягічную субстанцыю нацыянальнага жыцьця».

Дык канцавы выснаў з разважаньняў і прагноз на будучыню Гетэля ясны й канкрэтны: з Другою сусьветнаю вайною прыплыў талентаў зь Беларусі й Украіны для польскае культуры абарваўся надоўга, «на колькі пакаленьняў». Па-нашаму-ж — ён абарваўся назаўсёды, бо цяжка дапусьціць, каб спынены аж на колькі пакаленьняў працэс здолеў калі-небудзь ізноў аднавіцца.

Гісторыя звычайна ня любе паўтарацца. Сучасных польскіх пісьменьнікаў беларускага паходжаньня трэба барджэй уважаць за ўжо выміраючае апошняе пакаленьне беларускае плыні польскае літаратуры.

І гэткі лягічны вывад мусім зрабіць ня толькі дзеля «шчыльнай» новай мяжы паміж Польшчаю й Беларусяй. Магчымасьці далейшага існаваньня беларускай плыні польскае літаратуры пагражае сьмяротна й шпаркі рост нацыянальнага адраджэньня беларускага народу дый факт зьяўленьня на гістарычнай арэне новай адроджанай беларускай літаратуры й культуры.

Яны ўжо самою сваёй паяваю бураць дагэтуляшнюю спрыяльную гістарычную атмасфэру для працэсу адплыву талентаў Беларусі ў чужое польскае культурнае рэчышча.

Апрача гэтага, існуючы сяньня на землях Беларусі савецкі рэжым нішчыць дазваньня й самую сацыяльную базу гэтага працэсу. Ведама-ж, што польскія пісьменьнікі беларускіх земляў выходзілі блізу вылучна з дворска-шляхоцкага пласта, асяродзьдзя, сацыяльна-культурныя традыцыі якога сваім карэньнем сягалі старой фэўдальнай Беларусі. Дзеля гэтага іхная творчасьць і адбівала заўсёды ідэі, нуртуючыя гэтае асяродзьдзе.

Цяперка вось гэты сацыяльны пласт вынішчаецца

ў карані сучасным савецкім рэжымам Беларусі. Зь ягонаю-ж ліквідацыяй існаваньне ці нейкае аднаўленьне працэсу адплыву талентаў зь Беларусі ў польскае культурнае рэчышча стаецца й фізычна немагчымым.

Вось дзеля ўсяго гэтага маем поўную аснову выказаць ужо сяньня гэткае цьверджаньне: ні Міцкевічаў, ні Сыракомляў, ні Арэшчыхаў зь беларускіх прастораў Нёмна, Дняпра, ды Дзьвіны ў польскай літаратуры больш ня будзе.

Беларуская плынь польскага пісьменства перажывае сяньня свой апошні, свой канцавы замыкальны этап.

«Конадні». № 4. 1955

ЯНКА ЗАПРУДНІК

СПРАВА АЎТАНОМІІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ДУМЕ І «НАША НІВА»[1]

Нацыя можа складацца з розных элемэнтаў, але адным зь неадлучных і незаменных кампанэнтаў ейных павінна быць памяць пра сваю мінуўшчыну — як найпаўнейшая, як найглыбейшая.

У першай палавіне 1906 году, калі на Беларусі разьняволенае нацыянальнае слова ўбіралася ў сілу, каб увайсьці неўзабаве ў гісторыю вызначнай нашаніўскай традыцыяй, у сталіцы Расейскае дзяржавы, у Пецярбургу, засядала Першая Дзяржаўная Дума (ад 27 красавіка да 8 ліпеня паводля старога стылю). 478 пасланцоў з розных частак імпэрыі напружана й натхненна шукалі выхаду із затхлі зьбюракратызаванага самаўладзтва, з аднаго боку, ды ратунку ад рэвалюцыйнага катаклізму, з другога. Разам з гэтым прабіваліся на сьвет і палітычныя асьпірацыі падбітых нацыянальнасьцяў, якімі абрасла на працягу стагодзьдзяў маскоўская спадчына Раманавых. Прадстаўлена ў Думе была й Беларусь, афіцыйна званая тады ўсё йшчэ абезасабоўленым тэрмінам «Северо-Западный край».

Сярод пасланцоў Паўночна-Заходняга Краю былі мяшчане, сяляне, шляхта-дваранства, духавенства; былі людзі з вышэйшай асьветай (вялікая бальшыня), зь сярэдняй, з пачаткавай; былі праваслаўныя й каталікі; былі беларусы, палякі, летувісы, габрэі, расейцы, латышы; былі канстытуцыйныя дэмакраты, трудавікі, беспартыйныя, аўтанамісты.

---

[1] У аснове гэтага артыкулу даклад, прачытаны на навуковай канфэрэнцыі ў Беларускім Інстытуце Навукі й Мастацтва ў Нью-Ёрку 12 чэрвеня 1966 г.

Мы ня будзем займацца тут характарыстыкай усіх гэтых групаў, адкладаючы гэта да іншых нагодаў. Паглядзем адно тым часам, як у Першай Дзяржаўнай Думе Расеі была выказаная, на чым грунтаваная ідэя аўтаноміі Паўночна-Заходняга краю ды як разумець і чым вытлумачыць тую пазыцыю ў дачыненьні да гэтых выказваньняў, якую заняла «Наша Ніва», калі напрыканцы 1906 году яна пачала выходзіць.

Нацыянальнае пытаньне, разам із справаю палітычнае амністыі й зямельнае рэформы, было галоўным аб'ектам дэбатаў у першым парлямэнце імпэрыі. Пацьвярджаюць гэта й савецкія гісторыкі, праўда, упарыста ўхіляючыся ад дакумэнтаваньня ды распрацоўваньня самое тэмы.

Актуальнасьць нацыянальнага пытаньня ў Расеі, як ведама, вынікала з абмежаваньня й перасьледу нерасейскіх народаў. У Думе, установе, адданай дэмакратычным прынцыпам, патрэба разьвязаньня нацыянальнага пытаньня выплывала ўжо з самога пастуляту роўнасьці ўсіх грамадзянаў перад законам. І дзеля гэтага ўжо Дума, адказваючы цару на ягоную тронную прамову, задэкляравала:

«Дзяржаўная Дума апрацуе закон пра поўнае зраўнаньне ў правох усіх грамадзянаў, із скасаваньнем усіх абмежаньняў і прывілеяў, абумоўленых станам, нацыянальнасьцяй, рэлігіяй або родам»[1].

Дума ў тым-жа сваім адказе — вялікім дакумэнце расейскае канстытуцыйнае гісторыі — дзякуючы дамаганьням нацыянальных дэпутатаў, унесла і інтарэсы нацыянальнасцяў у праграму свае дзейнасьці:

«Дзяржаўная Дума ўважае, нарэшце, за канечнае адзначыць у ліку безадкладных заданьняў сваіх і разьвязаньне пытаньня пра задаваленьне даўно насьпелых дамаганьняў паасобных нацыянальнасьцяў. Расея становіць дзяржаву, заселеную шмат якімі плямёнамі й народнасьцямі. Духовае задзіночаньне ўсіх гэтых племяў і народнасьцяў магчымае адно пры задаваль-

[1] Государственная Дума. Стенографические отчеты. Т. I. Государственная типография, С.-Петербург, 1906. Б. 239. (Далей пры спасыланьні на гэтую крыніцу ўжываецца скарот «СО», г. зн. «Стенографические отчеты».)

неньні патрэбы кажнага зь іх захоўваць і разьвіваць сваеасаблівасьць у паасобных галінах быту. Дзяржаўная Дума парупіцца пра шырокае здавальненьне гэтых справядлівых патрэбаў»[1].

Адным з дынамічных і красамоўных абараньнікаў нацыянальных правоў быў у Думе дэпутат Менскае губэрні, кадэт, аўтанаміст — Аляксандар Лядніцкі. Ужо на чацьвертым паседжаньні Думы (3 (16). V. 1906 г.) Лядніцкі падаў голас нацыянальнага пратэсту й дамаганьняў. Выступаючы ў справе адрасу (звароту) у адказ цару на ягоную тронную прамову, Лядніцкі заяўляў:

«Мы, прадстаўнікі паасобных нацыянальнасьцяў і тэрыторыяў, уважаем за магчымае прыняць той адрас, які складзены камісіяй, але ў гэтым гістарычным мамэньце, ад імя гэтых прадстаўнікоў уважаю за свой абавязак заявіць і вытлумачыць, як мы разумеем задавальненьне тых справядлівых нацыянальных дамаганьняў, у імя якіх мы сюды зьявіліся»[2].

Лядніцкі, між іншага, будучы з нацыянальнасьці паляком, але родам, відаць, зь Беларусі, разрозьніваў нацыянальныя інтарэсы Беларусі й Польшчы, не атаесамляў гэтых двух краёў, а ставіў поруч, што відаць зь ягоных словаў:

«Калі мы слухалі прадстаўнікоў Царства Польскага, салідарных з намі ў агульным імкненьні да палітычнае свабоды, мы ўспомнілі, што там задыхаюцца ў атмасфэры пораху й дыму, у атмасфэры самавольства й гвалту; ...калі мы ўспамінаем, што мусульманскі зьезд яшчэ нядаўна ня мог сказаць свайго собскага слова ў абарону сваіх правоў, калі Ліфляндыя, Эстляндыя й Літва зьнябываюцца ў шчамлётках карных аддзелаў і таго самавольства, зь якім мы таксама змагаемся, дык я бачу, *як адтуль з нашых родных мясьцінаў працягваюцца рукі нашых братоў* (падчыркненьне наша.— *Я. З.*), тых-жа працоўных клясаў, тых-жа работнікаў, таго-ж працоўнага сялянства, якія клічуць-просяць расейскі народ пра дапамогу, пра тое, каб у гэтую ўрачыстую часіну ўсім стаць упоруч у змаганьні за

[1] Государственная Дума... Б. 241.
[2] Тамсама. Б. 102.

агульную свабоду, за ўстанаўленьне вялікіх пачаткаў справядлівасьці[1].

Я думаю,— казаў далей Лядніцкі,— ...што справядлівае імкненьне паасобных акругаў у прызнаньні ім поўнае свабоды ў арганізацыі самастойнага нацыянальнага быту, у арганізацыі яго на прынцыпах аўтаноміі й аўтаномнага самакіраўніцтва знойдзе тут задавальненьне... Мы ня толькі вітальна кланяемся прадстаўніком расейскага народу, але й уважаем за свой абавязак заявіць, што ад гэтага расейскага народу мы чакаем задавальненьня нашых нацыянальных дамаганьняў»[2].

Лядніцкі выказаў у Думе сваё моцнае перакананьне, што калі надыйдзе мамэнт падліку нацыянальных імкненьняў, «дык будуць узятыя на ўвагу канкрэтныя й этнаграфічныя асаблівасьці, якімі кажная асобная акруга або нацыянальнасьць, бясспрэчна, вызначаюцца»[3].

На адну з «канкрэтных» асаблівасьцяў беларускага народу зварачаў увагу дэпутатаў Думы прадстаўнік тае-ж Менскае губэрні, зь якое паходзіў і Аляксандр Лядніцкі, князь Геранім Друцкі-Любецкі. У часе абмяркоўваньня пытаньня зямельнае рэформы Друцкі-Любецкі казаў:

«Спадарове народныя прадстаўнікі! Я сам паходжу зь Менскае губэрні, гэта значыцца з аднае з губэрняў Паўночна-Заходняга Краю, да якога тарнаваліся ўсялякага роду вылучныя захады й дзе ўстанавілася поўнае панаваньне бюракратызму... Я сам рос сярод народу й ведаю, што гэты просты сельскагаспадарскі народ Беларусі мае таксама свае ідэалы. Ягоны ідэал — «Зямля Божая», але й народ Божы — таму ён уважае, што гэтая Божая зямля павінна належаць свайму Божаму народу, гэта значыць, што патрэбы дадзенае мясцовасьці, патрэбы дадзенае нацыянальнасьці павінны быць задавольненыя згодна зь ідэаламі гэтае нацыянальнасьці»[4].

Друцкі-Любецкі, між іншага, у адным із сваіх далейшых выступленьняў зварачаў увагу на псыхалягічную асаблівасьць жыхарства Паўночна-Заходняга

[1] Государственная Дума... Б. 103.
[2] Тамсама.
[3] Тамсама.
[4] Тамсама. Б. 197.

Краю, на пачуцьцё неадлучнасьці індывідуальнае зямельнае собскасьці.

«Гэтае пачуцьцё,— казаў ён,— гэтак глыбака прасякла ў душу жыхарства Паўночна-Заходняга Краю, што яно заве гэтую зямлю сваёй зямлёй, а прынцып собскасьці гэтак грунтоўна яму ўласьцівы, што, праўду кажучы, яно навет уважае, што ўся тэрыторыя павінна належаць вылучна жыхарству, што на ёй жыве»[1].

Мы бачым, як на аснове псыхалягічнае асаблівасьці беларускага народу фармуляваўся пастулят нацыянальна-палітычны: «уся тэрыторыя павінна належаць вылучна жыхарству, што на ёй жыве».

Выступаючы ў справе зямельнае рэформы — найгалаўнейшага й найскладанейшага пытаньня ў Першай Дзяржаўнай Думе,— дэпутат Горадзенскае губэрні ксёндз Анатоль Сангайла зварачаў таксама ўвагу на мясцовыя сваеасаблівасьці Паўночна-Заходняга Краю й грунтаваў на гэтым патрэбу дэцэнтралізацыі дзяржаўнае ўлады:

«Расея — дзяржава самая абшырная, мясцовыя ўмовы ейнага жыхарства гэтак разнастайныя, як разнастайнае й само жыцьццё... Што можа стацца выгодным аднэй мясцовасьці, аднэй губэрні нутраной, таго можа выявіцца зусім недаволі й навет на шкоду губэрні паўночна-заходняй ці якой-небудзь іншай. Мы ўвесь час змагаліся зь бюракратыяй; цэнтральнае кіраўніцтва краем давяло нам сваю поўную недасканальнасьць. І калі мы, імкнучыся да дэцэнтралізацыі, ужываем у дадзеным выпадку аднолькавыя захады, дык мы творым новы бюракратызм... Я адважуся прасіць, каб мы зазірнулі ў сэрцы ўсіх народнасьцяў ува ўсе ўскраіны нашае абшырнае бацькаўшчыны й разьвязалі аграрнае пытаньне згодна зь мясцовымі ўмовамі»[2].

Дэпутат Віцебскае губэрні ксёндз Франц Трасун, латыш з нацыянальнасьці, казаў тое самае:

«Мясцовыя палажэньні й спосабы земляўладаньня й землякарыстаньня гэткія розныя ў Расеі, што адзіны закон для ўсіх ніколі ня можна выдаць. Дзеля гэтага трэба было-б пакінуць гэта мясцовым установам, каб кажная з гэтых устаноў вызначыла тую форму й спосабы валоданьня, якія яна жадала-б мець у сябе»[3].

[1] СО. Т. І. Б. 624.
[2] СО. Т. І. Б. 198.
[3] СО. Т. 1. Б. 419.

«Для ўжыцьцёўленьня карэннае аграрнае рэформы,— казаў дэпутат Віленскае губэрні Ялавецкі,— перш-наперш павінна быць разьвязанае пытаньне пра аўтаномныя й краёвыя самакіраўніцтвы»[1].

Другі дэпутат зь Віленскае губэрні Міхал Гатавецкі дамаганьне аўтаноміі для свайго краю абгрунтоўваў даволі шырака:

«Я,— казаў ён,— селянін і дэпутат ад сялянскае курыі Віленскае губэрні. Асяродзьдзе, зь якога я паходжу, у якім асабіста прайшоў цяжкі працоўны шлях і якое мяне сюды прыслала, я ведаю даўно й добра, і толькі з гледзішча ягоных інтарэсаў я й буду гаварыць. Нашыя сяляне перш-наперш ясна ўсьведамляюць, што яны павінны быць самі гаспадарамі ў сваім краі і што яны павінны самі пастанаўляць пра сваю долю. Яны перакананыя, што гэткае права павінна ім быць прызнанае найперш у пытаньні, для іх так надзвычай істотным і важным, як пытаньне аграрнае. Дзеля гэтага яны станоўка дамагаюцца, каб мясцовыя, адмыслова дзеля гэтае мэты створаныя, выбарныя ўстановы кіравалі гэтай справай на месцы. Гэтыя мясцовыя выбарныя ўстановы павінны быць складзеныя так, каб мясцоваму-ж працоўнаму сялянству было ў іх поўнасьцяй забясьпечанае належнае яму паводля справядлівасьці месца. Ад цэнтральнага органу ім павінны быць перададзеныя адно самыя агульныя прынцыповыя настаўленьні што да кірунку справы, а справа сама ня толькі ў дэталях, але й у істотных рысах павінна быць абавязкава разьвязаная на месцах. Гэтага вымагае элемэнтарная справядлівасьць, гэтага вымагае пасьлядоўнасьць у правядзеньні дэмакратычнага прынцыпу, і гэта няўхільна выплывае з карэннае разнастайнасьці абставінаў у розных мясцовасьцях дзяржавы»[2].

Да аргумэнтаў, чэрпаных з эканамічных і псыхалягічных асаблівасьцяў Паўночна-Заходняга Краю, дадаваліся таксама й аргумэнты-дамаганьні характару нацыянальна-палітычнага: край павінна кіраваць карэннае жыхарства, а ня чужы прыйшлы й варожы элемэнт.

Найзырчэй выявіўся гэты аргумэнт у часе дэбатаў над пагромам габрэяў, што адбыўся ў Беластоку на

---

[1] СО. Т. І. Б. 606.
[2] СО. Т. І. Б. 883.

самым пачатку чэрвеня 1906 году. Хто быў адказны за гэты злачын?

Пытаньне прычынаў пагрому, ягоных спраўцаў і вінавайцаў дэтальна разглядалася ў Думе. Усе стрэлы зьвінавачаньня ляцелі ў бок ураду, паліцыйных органаў, камандаваньня вайсковымі часткамі царскае арміі, што знаходзіліся ў Беластоку ў часе пагрому, ды мясцовага чарнасоценнага элемэнту. Дэпутат места С.-Пецярбургу Вінавер гэтак, прыкладам, схарактарызаваў беластоцкія падзеі:

«У Беластоку, папраўдзе кажучы, ня было пагрому. У Беластоку была вайскова-паліцыйная экспэдыцыя дзеля застрашаньня рэвалюцыянераў шляхом забойства бязьвінных. Горадзенскі губэрнатар гэтак і сказаў: Там ня было пагрому, гэта была перастрэлка з рэвалюцыянерамі,— перастрэлка з аднаго боку, зразумела»[1].

З разглядам справы беластоцкага пагрому выступіў у Думе 26. VI. (9. VII) 1906 г. дэпутат Віленскае губэрні каталіцкі біскуп барон Адварды Роп. Пра дачыненьне да габрэяў карэннага жыхарства Паўночна-Заходняга Краю ён казаў:

«У нас вялікі працэнт габрэяў, але ўвесь наш народ, летувісы, беларусы й палякі, звыкліся з габрэямі, зь якімі яны жывуць сотні гадоў, звыкліся да такое ступені, што не разумеюць жыцьця йнакш: ува ўсіх справах гаспадарскіх і гандлёвых, усюды й заўсёды, габрэі для іх — патрэбнае злучво»[2].

Адкуль-жа тады браліся пагромы? Прычыну й актыўны ўдзел у іх біскуп Роп бачыў у «истинно-русских людях» Паўночна-Заходняга краю, асабліва ў стараверах, якіх дзеля праводжаньня пагромаў прывозілі ў патрэбнае месца навет зь іншых гарадоў: Дзьвінску, Лунінца, Бабруйску[3]. Роп выясьняў Думе, што значыць у нас «стараверы»:

«Стараверы,— тлумачыў ён,— пасяліліся ў нашым краю ў XVIII і часткава XIX стагодзьдзях. Гэта людзі вельмі дужыя, людзі працоўныя, што маюць добрыя якасьці, але маюць адно няшчасьце: яны былі ўвесь час пад апекаю ўраду сярод цэлае масы па-

---

[1] СО. Т. II. Б. 1734.
[2] СО. Т. II. Б. 1731.
[3] СО. Т. II. Б. 1730.

рыяў мясцовага жыхарства, якое ўрад прыгнятаў... У выніку даўгагадовага ўціску паўстала невялікае кола асобаў, што панавалі дасюль у гэтым краі, як у сваёй гасподзе. Гэтыя асобы, у выніку зьменаў, якія зайшлі апошнім часам, адчуваюць, што іхнае палажэньне пахіснулася, і яны хацелі-б, што-б там ні было, захаваць сваё ранейшае становішча. На няшчасьце, гэткія групы ўвесь гэты час дзеілі пад рэлігійным сьцягам. Яны звалiся «праваслаўнымі», але пасьля зьмянілі свой сьцяг з рэлігійнага на патрыятычны й назвалі сябе «истинно-русскими людьми». Ім было ўсяроўна, верыць чалавек ці не, няхай толькі ён будзе запісаны праваслаўным; ім усяроўна, дае школа асьвету ці не, была-б толькі школа расейская; усяроўна, якія духовыя вартасьці чалавека, абы толькі была шыльда навонкі — «праваслаўны», «рускі»[1].

Габрэйскія пагромы, на думку біскупа Ропа, былі намаганьнямі рэакцыйнага расейскага элемэнту ў Паўночна-Заходнім Краі зьнішчыць вызвольны рух, у якім асабліва актыўную ролю адыгравалі добра арганізаваныя габрэйскія арганізацыі. «У нас ніжэйшая ўлада часта належыць «истинно-русским людям»,— казаў біскуп Роп.— У запраўднасьці гэтая ніжэйшая ўлада напэўна й вінаватая ў пагромах, але ня думаю, каб вышэйшая ўлада брала ў гэтым просты ўдзел»[2].

На аснове гэткага аналізу прычынаў біскуп Роп выстаўляў цэлую палітычную праграму як шлях да палепшаньня, да ўнармалізаваньня палажэньня ў Паўночна-Заходнім Краю:

«Пакуль у нас будуць усюды тыя асноўныя палажэньні, розьніцы народнасьцяў, розьніцы свабоды дзеяньня, пакуль будуць пад апекай ураду кіраваць краем людзі, што, шчыра кажучы, ня маюць з краем нічога супольнага, пакуль будуць панаваць людзі, хоць-бы й з найлепшымі намерамі, што прыяжджаюць зь Пецярбургу, Тыфлісу, Табольску ды з усіх іншых канцоў Расеі, якія краю ня ведаюць і ня могуць зразумець ягоных патрэбаў, пакуль усё гэта будзе, заўсёды, апрача процьмы зла й несправядлівасьці, будзе й небясьпека пагромаў. Гэтыя вышэйшыя людзі ня маюць сувязі зь ніжэйшымі: ніжэйшыя-ж хочуць як-небудзь абара-

[1] СО. Т. II. ББ. 1731—1732.
[2] СО. Т. II. Б. 1732.

ніць сваё палажэньне. Як у абрусіцеляў краю, у іх зьяўляецца нейкая нянавісьць. У выніку-ж таго, што яны цягам даўгіх год карысталіся апекаю ўладаў, яны згубілі ўсякае разуменьне пра маральнасьць. І вось гэтыя ніжэйшыя нашы абрусіцелі — «истинно-русские люди» гатовыя строіць розныя штукі, а вышэйшыя, ня ведаючы краю, змушаныя кіравацца дырэктывамі гэтых ніжэйшых чыноў і таму ня ведаюць, што ім рабіць. Для нас адна разьвязка, але ня тая адзіная разьвязка, пра якую тут толькі й гаворыцца,— адыход міністраў. Сто міністраў можа зьмяніцца, але пакуль унізе застануцца тыя-ж асобы, усе гэтыя міністры нічога ня здолеюць зрабіць, губэрнатары навет ведаць ня могуць, што вытварае які-небудзь спраўнік, прыстаў ці ўраднік. Для нас, каб пагромаў ня было, каб край мог разьвівацца нармальна й добра, каб існаваў мір між усімі клясамі, між усімі народнасьцямі, што жывуць у нашым краі, *трэба, каб людзі мясцовыя там на мясцох панавалі* (падч. наша.— *Я. З.*). Пакуль не дасьцё нам мясцовага самакіраўніцтва, пакуль у запраўднасьці ўсе мясцовыя справы, уся ўлада ня будзе ў руках людзей мясцовых, да тае пары мы ня можам сказаць, што мы будзем у поўнай бясьпецы ад якіх-небудзь пагромаў»[1].

Выказваньні дэпутата Паўночна-Заходняга Краю біскупа Ропа станоўка падтрымаў прадстаўнік Чарнігаўскае губэрні Шраг, удакладняючы навет да пэўнае меры ягоную думку:

«Барон Роп, між іншага, адзначыў, што вінаватая ў беластоцкім пагроме тая кліка, што зьвіла сабе гняздо ў Горадні. Я магу далучыцца да бліскучае характарыстыкі, якую барон Роп даў гэнай кліцы абрусіцеляў; я магу далучыцца да таго, што, на думку барона Ропа, адхіліць пагромы можна толькі тады, калі мясцовае кіраваньне пяройдзе ў мясцовыя рукі; я поўнасьцяй далучаюся да гэтае думкі ды ўважаю, што толькі тады, калі стары рэжым будзе заменены новым, у аснову якога будзе пакладзеная свабода, дэцэнтралізацыя й аўтаномія народаў і акругаў, толькі тады мы будзем забясьпечаныя й вызбавімся ад зьяваў, што назіраем цяпер»[2].

---

[1] СО. Т. II. ББ. 1732—1733.
[2] СО. Т. II. ББ. 1812—1813.

Дамаганьні аўтаноміі Паўночна-Заходняга Краю, бязумоўна, выстаўлялі ня ўсе ягоныя дэпутаты, ня ўсе зь імі згаджаліся, не для ўсіх аўтаномія была аднолькава жыцьцёвая. Дамагаліся яе пераважна прадстаўнікі шляхоцкага стану й каталіцкага духавенства. Сярод прычынаў, што абумаўлялі іхныя дамаганьні, ня былі, пэўна-ж, на апошнім месцы блізкасьць гэных людзей да традыцыяў свайго краю, памяць мінуўшчыны сярод іх, сьведамасьць гістарычнае апрычонасьці.

Як-жа паставілася да гэтых дамаганьняў аўтаноміі газэта «Наша Ніва», што пачала выходзіць чатыры месяцы па тым, як Першая Дзяржаўная Дума, прайснаваўшы 72 дні, была разагнаная?

Сваё дачыненьне да Думы «Наша Ніва», напэўна, выявіла з самага пачатку выхаду ў лістападзе 1906 году. Дачыненьне гэнае было барджэй за ўсё адмоўнае[1]. «Наша Ніва» выказвала пагляды Беларускае Сацыялістычнае Грамады, будучы ейным неафіцыйным органам, а БСГ разам зь іншымі левымі сацыялістычнымі партыямі выбары ў Першую Думу байкатавала.

Дакладней пра стаўленьне «Нашае Нівы» да Першае Дзяржаўнае Думы можна меркаваць на аснове першых нумароў за 1907 год. Расея тады была напярэдадні выбараў у Другую Дзяржаўную Думу, і ў друку шырака вялася перадвыбарная кампанія. Выказваючыся да пытаньня Другое Думы, людзі часта займаліся ацэнай Першае. Таму вось і ў «Нашай Ніве» пачатку 1907 году мы знаходзім выказваньні пра Першую Думу ды, зразумела, пра дэпутатаў у ёй ад Беларусі.

Ужо ў першым нумары «Нашае Нівы» за гэны год, у артыкуле пра выбары ў Другую Думу, хтосьці Я. Гаравік прыгадваў, што ў 1906 годзе «ў Думу папалі ад Беларусі найбольш панскія дэпутаты». Як яны там захоўваліся? — «Гэтыя дэпутаты ні слова не гаварылі аб беднасьці й цяжкай долі дзеравенскага народу, а толькі нагвалт стаялі за тым, каб ні пядзіны панскай зямлі не адступіць мужыком... Блізка ўсе ксяндзы й біскуп барон Роп сталі на старану багачоў — памешчыкаў і ў Думе баранілі толькі іх інтарэсы»[2].

У тым-жа нумары «Нашае Нівы» нейкі Ясь, па-

[1] На жаль, у нашых руках няма нумараў «Нашае Нівы» за 1906 год.

[2] «Наша Ніва», № 1. 6. I. 1907. Б. 6.

ведамляючы пра настроі што да Другое Думы ў Васілішках Віленскае губэрні, прыгадваў:

«А быў у Думе з нашага Лідзкага павету — Гатавецкі, ды толькі зь яго пацехі было, што на пекным крэсьлі ў Думе сядзеў дый пэнсіі па дзесяць рублёў у дзень браў,— а як трэба было гаварыць, то маўчаў, як немка. Не, нам не такі патрэбны: няхай будзе чалавек сьмелы, няхай будзе язычлівы, каб патрапіў за бедны народ заступіцца!»[1]

І крыху далей у тэй-жа карэспандэнцыі:

«Стыд навет падумаць: з другіх старон дэпутаты ў Думе сьмела дабіваліся для народу сьвету, свабоды, зямлі-маткі. І ня любіць іх паліцыя за іх шчырае сэрца для народу. А нашы — што? Ці паказвалі яны ўсяму сьвету нашу бяду? Не! Ці гаварылі яны сьмела праўду ў вочы чыноўнікам? Не! А цяпер ці ня жывуць сабе бяз страху пад ласкавым на іх вокам паліцыі? Жывуць!»

Дэпутат Гатавецкі, пра якога пісаў Ясь, як ведама, у Дзяржаўнай Думе выступаў, і навет з даволі грунтоўнай прамовай на карысьць аўтаноміі (гл. вышэй). Вось-жа за месяц пасьля зьмяшчэньня карэспандэнцыі Яся «Наша Ніва» зьмясьціла папраўку пра недакладнасьць у карэспандэнцыі, але папраўку таксама вымоўную: «У карэспандэнцыі было сказана, што пан Гатавецкі маўчаў у Думе «як немка». Рэдакцыя заяўляе, што карэспандэнт абмыліўся — адзін раз п. Гатавецкі ў Думе гаварыў». Каб чытач не падумаў, аднак, што Гатавецкага перапісваюць з катэгорыі паганых у катэгорыю добрых, рэдакцыя ня толькі называла Гатавецкага «панскім служкам» і «лёкаем», але й узмацняла зьвінавачаньне: «Прыехаўшы ў Пецярбург, Гатавецкі для непазнаку запісаўся ў Трудавую Групу, але не пакінуў хаўрусу з панамі ды біскупам (Ропам.— *Я. З.)* і падаваў свой голас за тое, чаго хацелі паны»[2].

У аднэй із сваіх перадавіцаў «Наша Ніва», выказваючы надзею на вайстрэйшую ў будучыні палітычную празорлівасьць «упаўнамочаных ад валасьцей», перасьцерагала мінулым дазнаньнем:

«Гэтыя людзі, калі злучацца з гарадзкімі выбаршчыкамі, то перасіляць памешчыкаў, калі-ж ня злучац-

[1] «Наша Ніва», № 1. 6. I. 1907. ББ. 4—8.
[2] «Наша Ніва», № 5. 2. II. 1907. Б. 8.

ца — то сапсуюць справу, як гэта было летась. У Вільні мужыкі выбралі пад камандай паноў і біскупа Ропа панскіх і біскупскіх прыслужнікаў. А ў Менску расейскія чарнасотнікі так добра парадзілі мужыком, што тыя ня злучыліся ні з гарадзкімі выбаршчыкамі, ні навет з памешчыкамі і дзеля таго ня мелі ніякай сілы на выбарах»[1].

Перадавіца наступнага нумару прыгадвала йзноў здраду народных інтарэсаў у часе выбараў у Першую Дзяржаўную Думу:

«У прошлым гаду ў Вільні. калі сабраліся выбаршчыкі ад мужыкоў, то знайшлося між імі колькі прыслужнікаў памешчыкаў ды біскупа Ропа. Яны, як Юдашы, здрадзілі мужыкоў і працавалі для ворагаў мужыцкіх. А за гэта памешчыкі абяцалі выбраць іх дэпутатамі ў Думу — і выбралі»[2].

Праз тыдзень — яшчэ раз:

«У прошлым гаду нашы дэпутаты як паехалі ў Пецярбург, так мы аб іх і ня чулі, а як Думу разагналі, то ўсе яны пахаваліся недзе, дый не далі ніякага атчоту тым, хто іх выбіраў. Толькі дэпутат ад мужыкоў з Гродзенскай губ. Брэсцкага пав. Кандрашчук, вярнуўшыся з Думы, аб'яжджаў воласьці свайго ўезду й расказваў сваім ізьбірацелям аб тым, што рабіла Дума, што рабілі дэпутаты й за што іх разагналі. Аб другіх дэпутатах ніхто ня чуў і ня бачыў іх»[3].

Асаблівым аб'ектам атакаў у «Нашай Ніве» быў біскуп барон Роп, як правадыр усяе рэакцыйнае клікі. Паведамляючы пра ход выбараў на нізавых сялянскіх пластох (выбары былі шматступенныя), газэта пісала:

«У Віленскім пав. выбралі такіх людзей, што не прададуцца памешчыкам і ня зрадзяць сваіх братоў-мужыкоў. Біскупа барона Ропа пастанавілі не выбіраць: «Біскуп,— сказалі,— быў і ў першай Думе, а за мужыкоў усё роўна не закінуў слова. Ён цягне за памешчыкаў, бо й сам памешчык. У справах духоўных яму можна верыць, але ў палітыцы — не, бо што добра для мужыка, то ня надта добра для памешчыка»[4].

Як бачым, на балонках «Нашае Нівы» галоўная лінія падзелу й асноўная лінія фронту змаганьня пра-

[1] «Наша Ніва», № 3. 19. I. 1907. Б. 1.
[2] «Наша Ніва», № 4. 25. I. 1907. Б. 1.
[3] «Наша Ніва», № 5. 2. II. 1907. Б. 1.
[4] «Наша Ніва», № 5. 2. II. 1907. Б. 4.

ходзіла паміж «мужыкамі» і «памешчыкамі». Згодна з гэтым дзейнасьць дэпутатаў у Думе вымяралася й ацэньвалася аднэй-адзінай меркай: іхным стаўленьнем да зямельнага пытаньня. Іншай дыфэрэнцыяцыі палітычных інстынктаў і пачуцьцяў тады ня было. Дамаганьні ў Думе аўтаноміі для Паўночна-Заходняга краю ня выклікалі ніякае прыхільнасьці на балонах газэты. Наадварот, «Наша Ніва» расшыфроўвала гэтыя дамаганьні як змову, паказваючы на небясьпеку, што хавалася за ёю:

«Памешчыкі хочуць дабіцца таго, каб заместо цяперашніх расейскіх чыноўнікаў, назначаных ад правіцельства, панавалі й гаспадарылі ў нашым краю яны, памешчыкі. Жаданьні народу — другія. Народ хоча зямлі, хоча свабоды для ўсіх»[1].

Вартая ўвагі, між іншага, блізіня гледзішча паміж кагадзе працытаваным выказваньнем «Нашае Нівы» й выказваньнем да таго самага пытаньня сучаснага савецкага дасьледніка: «Шырмай аўтанамізму прыкрывалі сваё варожае стаўленьне да прымусовага адчужаньня (зямлі.— *Я. З.*) памешчыкі Царства Польскага, *Паўночна-Заходняга* (падч. наша.— *Я. З.*) й Паўдзённа-Заходняга Краю»[2].

Калі сацыялістычнасьць «Нашае Нівы» перашкаджала газэце падтрымваць ідэю аўтаноміі Беларусі ў выказваньнях кансэрватыўных дэпутатаў Першае Думы, дык гэная сацыялістычнасьць не перашкаджала ўсё-ж «Нашай Ніве» самой стаяць за аўтаномію Беларусі. Як актыўна «Наша Ніва» пашырала гэтую ідэю, як грунтоўна распрацоўвала палітычную праграму, што з гэтай ідэі вынікала,— застаецца справай далейшых досьледаў. Ясна тым часам толькі адно, што ідэя аўтаноміі Беларусі была нашаніўцам блізкая.

Пра гэта, між іншага, хоць і задняй датай, даведваемся ад аднаго з заснавальнікаў і ідэйных кіраўнікоў нашаніўства Антона Навіны (Луцкевіча).

У 1910 годзе ў С.-Пецярбургу выйшла кніга «Формы нацыянальнага руху ў сучасных дзяржавах». У кнізе зьмешчаны артыкул пра беларусаў Антона Навіны.

[1] «Наша Ніва», № 4. 25. I. 1907. Б. 2.

[2] С. М. Сидельников. Образование и деятельность Первой государственной думы. Изд. Московского у-та, Москва, 1962. С. 313.

Аўтар артыкулу выяўляе добрае азнаёмленьне з гісторыяй ідэі аўтаноміі Беларусі, ставіцца да гэтае ідэі прыхільна ды паказвае сьведамасьць таго, што думка пра аўтаномію Беларусі была пашыраная ў розных колах і клясах беларускага жыхарства. Навіна піша:

У 1904—1905 гадох, разам зь іншымі пытаньнямі, высунутымі на парадак дня, уздымаецца пытаньне пра самакіраўніцтва для беларускага краю. Гэтае пытаньне горача абмяркоўваецца на зьездах інтэлігентаў у Вільні, на якіх сустракаем прадстаўнікоў усіх нацыянальнасьцяў, што засяляюць Паўночна-Заходні Край. Уздымалася яно і ў саюзе аўтанамістаў-фэдэралістаў, у якім бралі ўдзел і прадстаўнікі ад беларусаў[1].

«Дамаганьне аўтаноміі для Беларусі,— кажа тамжа Антон Навіна,— знаходзім мы і ў праграме Беларускае Сацыялістычнае Грамады, прынятай другім зьездам на самым пачатку 1906 году». Прыгадайма тут яшчэ раз, што «Наша Ніва» была неафіцыйным органам БСГ[2].

У выказваньнях Антона Навіны знаходзім адно цьверджаньне, што асабліва завайстрае пытаньне палітычных гушчароў, празь якія прабівалася на сьвет думка пра аўтаномію Беларусі. Ант. Навіна кажа нам, што:

«Зь ініцыятывы паўсталага ў дадумаўскі пэрыяд «Беларускага Сялянскага Саюзу» ў Першую Дзяржаўную Думу пасылаюцца сялянскія пастановы й наказы, у якія, між іншага, улучаюцца дамаганьні аўтаноміі Беларусі з соймам у Вільні й нацыянальнай школай»[3].

Мы бачым, што ідэя аўтаноміі Беларусі выплывала і справа і зьлева. У 1906 годзе, аднак, гэтыя дзьве плыні былі разьдзеленыя сацыяльна-эканамічнымі, псыхалягічнымі й культурна-моўнымі (а то й рэлігійнымі) бар'ерамі. З аднаго боку быў абшарнік Раман Скірмунт, дэпутат Першае Думы, з другога — сацыяліст-нашанівец Антон Луцкевіч. Варожа настаўленыя

[1] А. И. Кастелянский (ред.). Формы национального движения в современных государствах. Изд. т-ва «Общественная Польза». С.-Петербург, 1910. Б. 391—392.

[2] Н. Недасек. Большевизм в революционном движении Белоруссии. Институт по изучению СССР. Мюнхен, 1956. С. 126—127.

[3] А. И. Кастелянский, цыт. праца. Б. 392.

адзін да аднаго ідэялягічна й палітычна ў 1906 годзе, яны тым ня менш апынуліся па адным баку лініі, у рэчышчы Беларускае Народнае Рэспублікі, у годзе 1918-м. Як адбыўся працэс гэтага зьмірэньня? Як гэныя два струмяні — правы кансэрватыўны й левы сацыялістычна-рэвалюцыйны — зьліліся ў адну дзяржаўніцкую плынь? Пытаньне гэтае вымагае грунтоўнага досьледу. Як ведама, палітычная публіцыстыка «Нашае Нівы» бадай зусім нявывучаная, як не распрацаваныя наагул шмат якія дзялянкі нашае палітычнае гісторыі.

Хацелася-б выказаць тут некаторыя меркаваньні што да мэтадалёгіі вывучэньня гэтага пытаньня.

Ці князь Друцкі-Любецкі, і ксёндз Сангайла, і селянін Гатавецкі, і барон Роп і іншыя, што, у адрознасьць ад Скірмунта, ня былі беспасярэдня зьвязаныя з пасьлейшай дзяржаўніцкай фазай беларускага руху, ці яны належаць да беларускае гісторыі, ці не? Ці яны — частка беларускага гістарычнага працэсу, а праз гэта й аб'ект зацікаўленьня, вывучэньня, ці іх мэханічна трэба выкасоўваць зь летапісу Беларусі, як гэта робіць савецкая гістарыяграфія? Ці гэныя аўтанамісты, дэпутаты Першае Дзяржаўнае Думы, зрабілі свой уклад у разьвіцьцё беларускага нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, ці былі толькі чужанацыянальнымі антынароднымі прыгнятальнікамі мужыка? І ці не зашмат, урэшце, канцэнтраваліся мы дасюль, вывучаючы сваю мінуўшчыну, на беларускамоўных творах і выданьнях? Ці ня стрыжэм мы сваю гісторыю пад грабень сялянскіх ідэалаў і сацыялістычных вартасьцяў? Ці ня помсьціцца гэта фатальна на разуменьні свае мінуўшчыны й сябе самых?

Мы часта адчуваем, як цяжка дыхаць на поўныя грудзі праз вузкую трубку культуралістычнае канцэпцыі нашага гістарычнага працэсу. Зазначма пры гэтым, што на культуралізм (толькі ў марксыцка-ленінскім варыяньце) хварэе ўвесь час і беларуская савецкая гістарыяграфія.

Гляньма, да чаго гэта вядзе.

На Беларусі, прыкладам, паміж 1901 а 1916 гадамі выходзіла, у розных часох, дзесьці пад 150 розных пэрыядычных выданьняў. Праўда, блізу ўсе яны былі ў расейскай мове. Але-ж тым ня менш гэта — арганічная

частка гісторыі Беларусі свайго часу. Чаму дасюль ніхто не пацікавіўся гэтымі крыніцамі? Чаму ніхто ня выведаў, што за гістарычныя плыні білі ў іх? Чаму ніхто не заглянуў у «Белорусский Вестник» (1904—5), «Брестский Листок» (1907—10), «Голос Белоруссии» (1906), «Минская Старина», «Минское Слово» (1906—12), «Отклики Белоруссии» (1906), «Северо-Западная Жизнь» (1913—15), «Бобруйская Жизнь» (1913—14), «Витебский Голос» (1905—7), «Придвинский Край» (1912), «Гомельская Мысль» (1910—14), «Полесский Курьер» (1914—15), «Гродненская Копейка» (1912), «Лепельский Вестник» (1911—12), «Лидское Слово» (1912—13), «Мозырянин» (1914—15), «Полочанин» (1909), ды іншыя, ды іншыя, ды іншыя?[1]

Мо ня ўсе яны поўнасьцяй захаваліся. Але ці рабіліся наагул спробы адкопваць іх, заглядаць у іх? І калі не, дык ці не перашкаджаў гэтаму культуралізм у падыходзе да нашае гісторыі, аўтаматычнае адкіданьне ўсяго, што ня зьвязана зь беларускай мовай, культурай?

Цяпер пастаўма сабе пытаньне: у 1906 годзе — якой шырыні была плынь нацыянальнага жыцьця Беларусі — Беларусі такой, якой яна была тады, не абавязкава беларускамоўнай, не абавязкава нацыяналістычнай? Якія нурты ў гэтай плыні абумаўлялі ход падзеяў, фармавалі будучыню?

Гэта пытаньне мэтадалёгіі. Якім-жа прынцыпам кіравацца тут?

Вось-жа так, як у геамэтрычнай прасторы паміж двума пунктамі можна правесьці лінію, гэтак у прасторы гістарычнай, часавай, паміж двума мамэнтамі (скажам, паміж 1906 і 1918 гадамі) можна правесьці лінію галоўнага разьвіцьця. На Беларусі разьвіцьцё гэтае йшло ад запярэчаньня існаваньня беларускае нацыі да абвешчаньня беларускае сувэрэннае дзяржавы. А таму — абавязак сучаснага гісторыка прасачыць лінію гэтага разьвіцьця: вытлумачыць тое, што было спачатку, з гледзішча таго, што сталася пасьля, з гледзішча таго, што ёсьць сяньня. Абавязак гісторыка, інакш кажучы, дасьледваць усе гістарычныя фактары, што ўзьдзейвалі на фармаваньне асноўнага факту на-

[1] Гл. Академия наук БССР. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.), т. III. Минск, 1953. Б. 305—309.

шае найнавейшае палітычнае гісторыі — беларускае дзяржаўнасьці — не зважаючы на тое, ці гэныя фактары былі расейскамоўныя, польскамоўныя ці беларускамоўныя.

Шукаць гэных фактараў трэба, бясспрэчна, пры дапамозе крытэрыяў не літаратурнамоўных, культуралістычных, а шырэйшых крытэрыяў — палітычна-дзяржаўніцкіх.

Паўстае тут, пэўна-ж, пытаньне: а што рабіць з тым, што нацыянальна-дэмакратычная дзяржава, Беларуская Народная Рэспубліка, была падмененая сацыялістычна-таталітарнай дзяржавай, Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай? Адказ на гэта такі, што адно другога не засталучае, не касуе. Гістарычныя падзеі, калі на іх глядзець праз вакно адчыненага розуму, а не праз прадушыны марксыцкіх догмаў ды ленінскіх цытатаў, разьвіваюцца як вынік сутыку розных сілаў і інтарэсаў, часам антаганістычных, часам хаўрусных, часам напоў- або начверцьхаўрусных. Лінія гістарычнага разьвіцьця абумаўляецца, так сказаўшы, і тым, што справа, і тым, што зьлева. Гэтак, прыкладам, БНР і БССР зьвязаныя неразрыўнай прычынавай сувязяй. Як паказвае ўжо храналёгія, БНР была акцыяй, БССР — рэакцыяй. А гэта не мяняе таго, што беларускі гістарычны працэс пачатку дваццатага стагодзьдзя трэба прасочваць з гледзішча ідэі беларускае сувэрэннае дзяржавы й ня звужаць яго да аспэкту — хоць і вельмі важнага — адраджэньня беларускае культуры. Адно гэтак мы вызвалімся з палону культуралізму ў разуменьні нашае мінуўшчыны ды рэгабілітуем свой гістарычны працэс. На мінуўшчыну трэба глядзець шырэй і сьмялей, бо толькі такім шляхом узбагачваецца будучыня...

Цэнтральнае пытаньне найнавейшае палітычнае гісторыі Беларусі такім парадкам: адкуль паходзіць беларуская незалежніцкая ідэя? Хто першы быў заражаны ейнымі мікробамі? Якое асяродзьдзе спрыяла іхнаму перахоўваньню й дасьпяваньню? Хто займаўся іхным пашыраньнем?

І як толькі мы дакранаемся да гістарычнага матар'ялу, дык адразу-ж упіраемся ў пытаньне ролі беларускага шляхоцтва; ролі кансэрватыўнага элемэнту; ролі людзей, часамі небеларускае культуры, якія, аднак, стаялі за аўтаномію Беларусі, што сталася,

як паказалі далейшыя падзеі, першай фазай руху да незалежнасьці.

Беларускасьць як ідэя, трэба памятаць, у шмат якіх выпадках ішла паперадзе тэрміналёгіі: часта тое, што ня было беларускім паводле свайго тэрміну, было ім у сваёй аб'ектыўнай існасьці. Тэрміналягічная дрыгва нашае гісторыі ўсё йшчэ чакае на сваіх мэліяратараў.

Савецкая гістарыяграфія, зазначма, ставіць таксама тое-ж кардынальнае пытаньне: адкуль незалежнасьць Беларусі (незалежнасьць у савецкім разуменьні)? Дзе бяруць пачатак вытокі беларускае дзяржаўнасьці? Толькі адказ на гэта даецца па-дагматычнаму спрошчана й па-агітатарску заежджана: дзяржаўнасьць беларускаму народу дала Кастрычніцкая рэвалюцыя!.. Ад яе пачынаецца будаваньне беларускае сацыялістычнае нацыі.

Беларуская сацыялістычная нацыя ня была, аднак, дэкрэтаваная й ня была абвешчаная тэлеграмай з Крамля. Фармаваньне нацыі, якое-б там ні было — буржуазнае ці сацыялістычнае,— працэс складаны й павольны. Дзеля гэтага зьяўленьне й беларускае сацыялістычнае нацыі мусіла быць абумоўленае цэлым сьцягам падзеяў папярэдніх дзесяцігодзьдзяў. На жаль, досьледам гэтага пытаньня ў Савецкай Беларусі дасюль ніхто як сьлед ня мог заняцца: усе адыходныя шляхі перарэзаныя загарадзяй — «партыйнасьць (плюс русыфікацыйнасьць) гістарычнае навукі!». Гэтак вось і выходзіць: беларуская савецкая гістарычная навука неўзабаве будзе адзначаць сваё 50-годзьдзе, а беларускі народ — блізу паўвеку сацыялістычнае дзяржаўнасьці, а дасюль гісторыя нацыянальнае сьведамасьці ляжыць няўзнятым аблогам. Савецкую гістарычную навуку аніяк не бянтэжыць тое, што ў трактаваньні гісторыі беларускае дзяржаўнасьці яна даходзіць да кур'ёзаў, на адзін зь якіх варта глянуць.

У 1958 годзе ў выдавецтве Акадэміі навук БССР выйшла калектыўная праца «Фарміраваньне і разьвіцьцё беларускай сацыялістычнай нацыі»[1]. Першы разьдзел гэтае кнігі кідае чытача адразу-ж з галавой у вір 1917 году. Разьдзел гэтак і загалоўлены: «Кастрыч-

[1] Акадэмія навук БССР. Інстытут філасофіі. Фарміраваньне і разьвіцьцё беларускай сацыялістычнай нацыі. Мінск, 1958. (Рэд. калегія: П. Ф. Глебка й інш.)

ніцкая рэвалюцыя і ўзьнікненьне асноваў беларускай сацыялістычнай нацыі». Тым часам нельга ўцячы ад пытаньня: а як-жа выглядала справа зь беларускай нацыяй да рэвалюцыі? І тут-жа кідаецца ў вочы мэтадалягічная непасьлядоўнасьць савецкіх дасьледнікаў. Калі, прыкладам, яны пішуць гісторыю сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры, дык разьбіраюць па костачках і Багрыма, і Дуніна-Марцінкевіча, і Багушэвіча, і ці мала іншых літаратараў XIX й пачатку XX стагодзьдзяў. Трэба, бачыце, паказаць на глыбокія гістарычныя карані «перадавога мэтаду сацыялістычнага рэалізму» ў беларускай літаратуры. Тож-ба! Тым самым тропам трэба было-б ісьці ў дарэвалюцыйныя дзесяцігодзьдзі, углыбкі, дасьледуючы пытаньне паходжаньня й беларускае сацыялістычнае нацыі. Але гэтага ня робіцца, каб ня будзіць прыспанае мінуўшчыны.

Савецкай гістарычнай навуцы, як бачым, не стае сьмеласьці заставацца пасьлядоўнай у рамках ёю-ж прынятага мэтадалягічнага прынцыпу: ісьці глыбей за Кастрычніка.

Ад гэтае непасьлядоўнасьці партыйнае навукі, зразумела, не мяняецца асноўны факт: як паказваюць ужо матар'ялы Першае Дзяржаўнае Думы, радаводу беларускае незалежніцкае ідэі й беларускае дзяржаўнасьці (а савецкім гісторыкам — і тае сацыялістычнае нацыі) трэба шукаць у дзесяцігодзьдзях, што йдуць далёка глыбей за Кастрычніцкую рэвалюцыю. Кастрычнік беларускае дзяржаўнасьці не спарадзіў і ёй ня спрыяў, ён перахапіў адно ідэю яе ды, пагвалціўшы, налажыў на яе сацыялістычныя клямры.

«Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва».
№ 4, 1966

ЯНКА ЗАПРУДНІК

ДВАРАНСТВА І БЕЛАРУСКАЯ МОВА[1]

Да праблемы «Асновы беларускага сьветапогляду»

Сёньня, калі мы шмат гаворым пра «нацыянальнае адраджэньне», пра «адбудову нацыі», вельмі важна паддаць аналізу само паняцьце беларускасьці, паколькі паняцьце гэтае было катастрафічна звужана да паняцьця сялянскасьці, мужыцкасьці, вясковасьці. Звужанасьць паняцьця беларускасьці сталася псыхалягічнай перашкодай на шляху да адраджэньня, да ўсьведамленьня сябе як паўнавартаснага нацыянальнага арганізму. Звужанасьць паняцьця беларускасьці перагароджвае доступ да разуменьня стратэгічна важных аспэктаў нашае мінуўшчыны, патрэбны для ўмацаваньня будучыні.

Заўважма, што звужэньне паняцьця беларускасьці адбылося ў моц фактараў як аб'ектыўных, гэтак і суб'ектыўных.

Аб'ектыўным фактарам было тое, што фармаваньне тэорыі беларускага адраджэньня (пачынаючы ад гомана ўцаў 1884 года) і фармуляваньне праграмы беларускага руху адбывалася ў імя сацыяльных нізоў, пастаўленых у цэнтр увагі народнікамі, а пасьля сацыялістычнай ідэяй. На пачатку стагодзьдзя беларус прамовіў вуснамі свайго абуджэнца Янкі Купалы: «Я буду жыць, бо я МУЖЫК!»

Суб'ектыўным фактарам было тое, што ворагі беларускага адраджэньня адразу-ж угледзелі ў гэтым мужыкоўстве беларуса аргумэнт супраць беларускага руху — і карыстаюцца гэтым аргумэнтам дасюль — у

[1] У аснову артыкула пакладзены даклад на Міжнароднай канфэрэнцыі «Фарміраваньне і разьвіцьцё нацыянальнай самасьвядомасьці беларусаў» 19—20 жніўня 1992 году ў Менску і Маладзечне.

намаганьні абніжыць беларускую ідэю, перш-наперш беларускую культуру, да сацыяльна найніжэйшага ўзроўню, каб пазбавіць гэтую ідэю агульнанацыянальнай радаслоўнай. А мы ў сваёй несьвядомасьці, у сваім яшчэ ў вялікай меры асяляненым мысьленьні, запраграмаваным нашаніўскай школай і замацаваным ленінскай мэтадалёгіяй, памагаем нашым ворагам у канцэптуальным абкраданьні паняцьця «беларускасьць». Гэтае зьбядненьне саміх сябе ідзе таксама і ад няпоўнага разуменьня існасьці гістарычнага працэсу.

Для разгляду пытаньня сацыяльнай генэалёгіі ідэі самабытнасьці Беларусі, а значыцца, і права беларусаў на дзяржаўную незалежнасьць стаўлю тэзу: гістарычны працэс — гэта сума ўчынкаў людзей, намеры якіх часта былі зусім іншыя, чым вынікі іх учынкаў (суб'ектыўнае і аб'ектыўнае ў гісторыі). На падмацаваньне гэтай тэзы падам ілюстрацыю, усім нам відавочную: намеры і мэты, якія ставілі перад сабой аўтары савецкай перабудовы, былі далёкія ад таго, што атрымалася ў сапраўднасьці, што мы называем аб'ектыўнай гісторыяй.

Газэта «Нью-Ёрк Таймс» за 21 ліпеня 92 г. падала выказваньне чэхаславацкага прэзыдэнта Вацлава Гавэла. Пакідаючы сваю прэзыдэнцкую пасаду ў выніку распаду Чэха-Славакіі, Гавэл сказаў пра гэты распад: «Я ня думаю, што які-небудзь адзін чалавек мог бы стрымаць тое, што гістарычна неабходна».

Чалавек праракуе, Бог выракуе. Непадуладнасьць сацыяльна-палітычных працэсаў чалавечай волі адзначана пагаворкамі ў шмат якіх мовах. Вось-жа падобную разьбежнасьць паміж намерамі і вынікамі мы можам прасачыць і ў складаным ды доўгім ходзе беларускага нацыянальнага адраджэньня, у працэсе станаўленьня нашае нацыянальнае сьвядомасьці, ідэі беларускае дзяржаўнасьці. Бяручы агульна, ідэю гэтую фармулявалі ня толькі выхадцы зь сялянства, але таксама людзі іншых станаў, у тым ліку і дваране. У сувязі з гэтым усё наша нацыянальнае адраджэньне дый увесь гістарычны шлях трэба разглядаць у шырэйшай пэрспэктыве, ня звужваючы яго да сялянскага аспэкту.

А што робіцца цяпер у беларускай гістарыяграфіі? Паглядзім, да чаго вядзе, так бы сказаць, мужыкоўскае разуменьне гісторыі свайго краю.

Вось рэфэратыўны зборнік АН Беларусі «Беларусістыка» (№ 11. Мастацтвазнаўства, этнаграфія, фальклярыстыка. Мінск, 1991, с. 71—81) апісаў выдадзеную ў Менску ў 1990 годзе кнігу «Сям'я і сямейны быт беларусаў». Рэдагаваў зборнік паважаны сп. Васіль Бандарчык са сваімі калегамі. Гэта першае дасьледаваньне сямейнага быту беларусаў у пэрыядзе ад XIV стагодзьдзя да нашых дзён. Вельмі важная тэма.

Але як разумеюць аўтары кнігі паняцьце «беларуская сям'я»? Я засьцерагаюся, бо самой кнігі ня чытаў і, магчыма, маё ўражаньне пра яе зьменіцца пасьля прачытаньня. Але, мяркуючы паводле даволі дэтальнага апісаньня гэтай публікацыі ў рэфэратыўным зборніку, беларуская сям'я для сп. Бандарчыка — гэта СЯЛЯНСКАЯ сям'я. Сем'і фэадалаў, купцоў, духавенства, бюракратаў і іншых сацыяльных груп, зь якіх складалася гарадзкое жыхарства сярэднявечнай Беларусі, выпалі з поля зроку дасьледнікаў, ня сталіся часткай беларускага гістарычнага ляндшафту.

Гэтак-жа звужана, дарэчы, прадстаўляюць беларускую сям'ю і рэдактары выдадзенай у 1989 годзе энцыкляпэдыі «Этнаграфія Беларусі»: паняцьце сям'і тут таксама зьведзенае да сялянскасьці. Працягваецца, такім чынам, канцэптуальнае абкраданьне свае мінуўшчыны, сябе саміх, перад чым перасьцерагаў яшчэ ў сярэдзіне 60-х гадоў Мікола Алексютовіч.

А можа, у мінуўшчыне сапраўды ня было беларускіх сем'яў, апрача сялянскіх ды рамесьніцкіх? Пытаньне, зразумела, рытарычнае. Тым ня менш для скептыкаў зазначу, што, прыкладам, гісторык Васіль Мялешка ў манаграфіі 1988 году пра Магілёў у XVI — сярэдзіне XVII стагодзьдзя піша (падаю ў перакладзе з расейскае): «Жыхарства Магілёва складалася з тыповых для фэадальнага гораду сацыяльных груп. Асноўнай сярод іх па сваёй колькасьці і значэньні былі мяшчане. Гэта былі буйныя купцы, сярэднія і дробныя гандляры, рамесьнікі, што знаходзіліся пад юрысдыкцыяй магістрата... Частка жыхарства была прадстаўлена невялікай групай шляхты, духавенства і замкавай адміністрацыі» (с. 160).

Прыклад з асьвятленьнем сям'і нам паказвае, што на беларускую мінуўшчыну яшчэ ня ўсе нашыя гісторыкі глядзяць інтэлектуальна разьняволеным зрокам. Тым часам справа адраджэньня беларускай нацыя-

нальнай сьвядомасьці, а разам з тым і навуковая грунтоўнасьць вымагаюць, каб у энцыкляпэдычных даведніках і дэталізаваных манаграфіях беларуская сям'я разумелася і асьвятлялася ва ўсёй сваёй сацыяльнай і культурнай паўнаце — гэтак, прыкладам, як зрабілі аўтары БелСЭ з артыкулам «Адзеньне», упрыгожыўшы артыкул малюнкамі адзеньня ўсіх сацыяльных пластоў гістарычнае Беларусі.

Шатляндзкі паэт Робэрт Бёрнс у адным са сваіх афарыстычных вершаў, якімі ён славіцца, выказаў пажаданьне, каб была гэткая сіла, якая дала б нам дар бачыць сябе такімі, якімі іншыя нас бачаць. Гэта, бясспрэчна, вялікі дар, якім мала хто валодае,— бачыць сябе такім, якім іншыя цябе бачаць. Але, з другога боку, трэба таксама памятаць, што вонкавы сьвет нас, беларусаў, сьпісаных гуртом у сялянства і аканаваных на сялянства, не пабачыць паўнакроўнай нацыяй, калі мы самі сябе такімі бачыць ня будзем.

Хачу тут зазначыць, што гэтае маё сцьвярджэньне аніяк ня трэба разглядаць як нейкую зьнявагу селяніна. Мае бацькі, хоць і мелі настаўніцкую асьвету, былі сялянамі, і да селяніна мы ўсе павінны ставіцца з глыбокай пашанай за ягоную працавітасьць і ягоны творчы талент. Сялянства захавала нашу родную мову, дало кадры адраджэнцаў. На пэўных этапах наш нацыянальны рух чэрпаў свае фізычныя і духоўныя сілы ў асноўным зь сялянства, і ў моц якраз гэтай акалічнасьці шмат хто атаясамляў паняцьце сацыяльнае з паняцьцем нацыянальным. У Дзяржаўнай Думе Расіі 1906—1917 гадоў у даведніках пра нацыянальнасьць дэпутатаў гэтак і пісалі: «белорус-крестьянин» або «крестьянин-белорус».

Але сёньня, калі мы дачакаліся магчымасьці свабодна азірацца на сваю мінуўшчыну, калі ад духовага адраджэньня залежыць — у большай меры, чым людзі звычайна думаюць,— адраджэньне эканамічнае, нам асабліва важна ставіць пытаньне пра ролю прадстаўнікоў вышэйшых і сярэдніх сацыяльных пластоў на Беларусі — дваранства і шляхты — у беларускім нацыянальным адраджэньні. Трэба вызваляцца ад догмаў і шаблёнаў у сваім разуменьні працэсу станаўленьня беларускай нацыянальнай сьвядомасьці і разьвіцьця беларускага адраджэнскага руху. Бо шмат хто з нас усё яшчэ глядзіць на сваю мінуўшчыну праз прызму раньш-

некупалаўскіх беларусаў, тых, што ідуць «агромністай такой грамадой» са сваёй «крыўдай» на «худых плячах, на руках у крыві, на нагах у лапцях». І пра літаратуру беларускую пішацца, што яна «ад мужыка, пра мужыка і для мужыка».

Пры ўсёй пашане да выдатнае трыбуны сучаснае нацыянальнае думкі, газэты «Літаратура і Мастацтва», нельга не зазначыць, што яе купалаўскі заклік «Людзьмі звацца», паўтараны штотыдня, перашкаджае ўспрыманьню нашае мінуўшчыны ва ўсёй яе шматклясавасьці, бо кладзе акцэнт, запозьнена ўжо для сёньняшняга дня, на гэтых абяздоленых купалаўскіх мужыках.

У нашых нацыянальных інтарэсах сёньня ўстанавіць як мага шырэйшую гістарычную панараму беларускага грамадзтва мінулых стагодзьдзяў. Калі мы будзем глядзець на беларусаў XIX — пачатку XX стагодзьдзя як на выключна плебейскую нацыю — так як на яе глядзелі народнікі 1880-х гадоў,— дык мы не зразумеем свае ідэйнае генэалёгіі ў сёньняшніх новых абставінах, мы ня будзем ведаць усіх вытокаў сучаснае беларускае дзяржаўнасьці. А ведаць іх вельмі важна і з гледзішча на навуковую грунтоўнасьць, і дзеля псыхалягічна-палітычных меркаваньняў. Гэты апошні момант, псыхалягічна-палітычны, важны ў тым сэнсе, што на беларускую дзяржаўнасць шмат хто яшчэ глядзіць як на байструка гісторыі, як на нейкую анамалію сацыяльнай прыроды.

Вось чаму зноў і зноў трэба ставіць пытаньне: хто ж на працягу апошніх двух стагодзьдзяў пракладаў канцэптуальны шлях да незалежнасьці Беларусі ў сэньсе фармуляваньня ідэі апрычонасьці і самабытнасьці беларускага народу? Дзе ідэйныя вытокі Акту 25 сакавіка 1918 году і, паслядоўна, Дэкляцыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі 27 ліпеня 1990 году?

Ці была якая-небудзь роля беларускага дваранства ў зацяжным працэсе станаўленьня беларускае дзяржаўнасьці? Няхай нас не бянтэжыць факт, што ў сваёй большасьці дваране XIX — пачатку XX стагодзьдзя не выглядаюць беларусамі, калі мераць іх сёньняшняй меркай. Гэткае мераньне было-б мэтадалягічна памылковым і палітычна шкодным. Ды мы і ня можам вымагаць ад якога-б там ні было беларуса, ані ў мінуўшчыне, ані ў сучаснасьці, нейкае стопрацэнтнае адпаведнасьці пэўнаму стандарту ў поглядах, бо такое

вымаганьне — гэта дагматычны і антыдэмакратычны нонсэнс. Значыцца, у кожнага свайго папярэдніка на ніве беларушчыны, разумеючы беларушчыну ў самым шырокім сэнсе, трэба шукаць элемэнтаў, якія працавалі б на карысьць нашага нацыянальнага адраджэньня.

У падыходзе да гістарычных постацяў патрэбны сьветапаглядная талерантнасьць і разуменьне, што кожная эпоха, кожны пэрыяд мае свае ідэйныя асаблівасьці. Урэшце, паўтараюся, трэба глядзець на гістарычны працэс як на пэўнага роду будаўніцтва, у якім той, хто ўкладае сваю цагліну, ня ведае, як ягоная будыніна будзе выглядаць пры наступных пакаленьнях.

Мяшчане акадэмік Яўхім Карскі і этнограф Аляксей Сапуноў, дваране-памешчыкі Аляксандр Ельскі, Раман Скірмунт і князь Іеранім Друцкі-Любецкі, як і шмат іншых прадстаўнікоў дваранскіх родаў на Беларусі, пры ўсіх іх сьветапоглядных і палітычных сваеасаблівасьцях, унесьлі кожны свой уклад у тую Беларусь, якую мы бачым перад сабой сёньня. І можна сьмела сказаць, што ніхто зь іх ня мог прадбачыць, якой гэтая Беларусь будзе пад канец XX веку, так як тысячы заходніх саветолягаў не маглі прадбачыць нават тры гады наперад, які будзе вынік гарбачоўскае перабудовы зь яе канцом камуністычнае «імпэрыі зла».

Акадэмік Карскі гаварыў пра беларускую мову як пра «наречие» або «западно-русский язык» і быў далёкі ад думкі пра палітычную незалежнасьць Беларусі. А на самой справе Карскі, як ніхто іншы, спрычыніўся да ўмацаваньня гэтага «наречия» як мовы, што сталася галоўным аргумэнтам у нашым змаганьні за незалежнасьць.

Этнограф Сапуноў быў, паводле нашых сучасных мерак, «западна-русам». На «западна-русаў» сёньняшнія незалежнікі глядзяць як на ідэйных недаросткаў. Але гэта Сапуноў бараніў у Дзяржаўнай Думе, дзе ён быў дэпутатам ад Віцебскай губэрні, права беларусаў на нацыянальнае самавызначэньне і сваімі публікацыямі падтрымліваў веру, што да гэтага самавызначэньня дойдзе. У 1910 годзе ў «Витебских Губернских Ведомостях» у нарысе «Беларусь і беларусы» (нарыс выйшаў таксама асобнай брашурай) Сапуноў надаваў вялікае значэньне гістарычным ведам як фактару нацыянальнай сьвядомасьці і жыцьцяздольнасьці нашага народу. Пра этнаграфічныя працы Раманава, Гільдэбранта,

Бяссонава, Шэйна, Нікіфароўскага ды іншых Сапуноў казаў, што яны «зьняпраўдзілі пашыраную думку пра кволасьць і друзласьць натуры нашчадкаў гэных грозных палачанаў, як пра іх кажацца ў «Слове аб палку Ігаравым».

Дваранін Раман Скірмунт, род якога стагодзьдзямі жыў на Палесьсі, быў асуджаны абэцэдараўцамі як «рэакцыйны памешчык і контррэвалюцыянер» на гістарыяграфічную сьмерць, на замоўчваньне. Контррэвалюцыянерам Скірмунт, бясспрэчна, быў, але не рэакцыянерам. Наадварот, ён належаў да ліку прагрэсіўных гаспадарнікаў. Як дэпутат Першай Дзяржаўнай Думы ў 1906 годзе Скірмунт выказваў погляды, да якіх варта было б прыслухацца шмат якім дэпутатам сучаснага Вярхоўнага Савета Беларусі. Скірмунт выступаў супраць нацыяналізацыі зямлі, але за права сялянаў на павялічэньне іх гаспадарак. За нацыяналізацыяй зямлі Скірмунт празорліва бачыў тое, што сталася пасьля ў выніку калектывізацыі — валадарства бюракратаў. На чыю карысьць нацыяналізацыя пойдзе? — ставіў ён пытаньне. І адказваў: «Адзіным спадкаемцам, адзінай юрыдычнай асобай, якая прыняла-б у сваю собскасьць усе адчужаныя землі, была-б дзяржава. Ізноў лахва бюракратыі Эльдарада... Сын ня будзе карыстацца вынікамі працы свайго бацькі. Пладамі працы ранейшых уласьнікаў будуць карыстацца новыя, чужыя людзі».

Пра Рамана Скірмунта ў шмат якіх дарэвалюцыйных выданьнях можна прачытаць як пра «паляка». Тым жа часам сам Скірмунт сябе за паляка не ўважаў. У Дзяржаўнай Думе ён быў адным зь ініцыятараў руху за аўтаномію Беларусі насуперак некаторым польскім дзеячам. Вынікам гэтага руху было тое, што дэпутаты беларускіх губэрняў, якія стаялі за аўтаномію, не ўвайшлі ў аўтанамістычнае Польскае Кола, а ўтварылі сваю асобную групу. Да гэтае групы, апрача Скірмунта, належалі дэпутаты Лядніцкі, Масоніус, віленскі епіскап Роп, Ялавецкі, ксёндз Сангайла ды іншыя прадстаўнікі беларускіх губэрняў.

У жніўні 1906 года пасьля разгону Першай Дзяржаўнай Думы вядомы польскі палітычны дзеяч Раман Дмоўскі пісаў пра свае разыходжаньні са Скірмунтам у кіеўскай польскай газэце «Дзеньнік Кіевскі» гэтак: «Скірмунт перш-наперш не ўважае сябе за паляка.

У гутарцы са мною ён заявіў, што ён беларус, які адно ўзгадаваны ў польскай культуры,— што... ён ня мае найменшае патрэбы залічаць сябе да народнасьці, зь якою яго зьвязвае адно культура».

Князь Іеранім Друцкі-Любецкі, прадстаўнік старажытнага беларускага дваранскага роду, быў у Першай Дзяржаўнай Думе дэпутатам ад Менскае губэрні. Ягоныя ідэйна-палітычныя погляды за часамі рэвалюцыі 1905—1906 гадоў былі ў духу часу. Друцкі-Любецкі ня толькі захапляўся інтэрнацыяналісцкімі ідэямі сацыялізму, але арганічна спалучаў зь імі і ідэю нацыянальнага самавызначэньня Беларусі. У адным са сваіх думаўскіх выступленьняў у часе абмеркаваньня зямельнага пытаньня ён заяўляў: «Пачуцьцё ўласнасьці гэтак глыбока прасякла ў душу жыхарства Паўночна-Заходняга краю, што яно заве гэтую зямлю сваёй зямлёй, а прынцып собскасьці гэтак грунтоўна яму ўласьцівы, што, уласна кажучы, яно нават уважае, што ўся тэрыторыя павінна належаць жыхарству, якое на ёй жыве».

У гэтых словах князя Друцкага-Любецкага быў выказаны галоўны палітычны пастулят цэлае групы дэпутатаў беларускіх губэрняў, гэтак званых «тэрытарыялістаў», што дамагаліся ў Першай Дзяржаўнай Думе Расіі аўтаноміі для Беларусі як перадумовы правядзеньня зямельнае рэформы.

Пра што гавораць нам прыклады з Карскім, Сапуновым, Скірмунтам і Друцкім-Любецкім? Ды пра тое, што беларускасьць у розных формах і з рознай ступеньню інтэнсыўнасьці праяўлялася сярод розных сацыяльных пластоў, у тым ліку сярод дваранства. Погляды гэтых людзей, іх дзейнасьць не маглі ня мець уплыву на станаўленьне ідэі беларускага нацыянальнага адраджэньня, на разьвіцьцё беларускага руху ў кірунку да свае дзяржаўнасьці. Гэта значыць, што беларускі нацыянальна-гістарычны гмах другой палавіны XIX стагодзьдзя ня быў канчаткова зруйнаваны аж да свайго сацыяльнага падмурку — сялянства, а былі яшчэ ў ім сьцены і нават крыху даху.

Мяне ўразіў пададзены гісторыкам Паўлам Церашковічам факт (гл. «Весці АН БССР», серыя грамадзкіх навук, № 5, 1986, с. 94), што «згодна зь перапісам 1897 году з 153 тысяч прадстаўнікоў саслоўя дваран 43,3 працэнта прызналі роднай моваю беларускую». Гэта больш за 65 тысяч беларускамоўных дваран!

Маса народу! Дзе-ж у нашай гістарыяграфіі сьляды гэтых дзесяткаў тысяч людзей?! Яны-ж у моц свайго прызнаньня беларускае мовы павінны былі неяк выявіць гэтую сваю беларускасьць. Пошукі іх сьлядоў стаяць сёньня на парадку дня перад беларускімі гісторыкамі. «Пачнём някратаны паданьні сачыць пад бацькаўскай страхой»,— заклікаў Янка Купала.

Трэба думаць, праўда, што для шмат каго з тых беларускамоўных дваран 1897 году беларуская мова была проста «наречием русского языка», а палітычны ідэал ня выходзіў за рамкі «западнорусизма». Але былі і дваране-аўтанамісты, што сталіся пасьля незалежнікамі. Быў дваранін Аляксандр Уласаў, выдавец «Нашай Нівы»; былі дваране браты Іван і Антон Луцкевічы, арганізатары і галоўныя публіцысты «Нашай Нівы»; была княгіня Магдалена Радзівіл, якая фінансавала выданьне Багдановічавага «Вянка», газэты «Беларус» (1913—1915).

У цудоўным зборніку матэрыялаў Генадзя Кісялёва «Пачынальнікі», у рэдагаваньні якога браў удзел і наш паважаны Адам Мальдзіс, XIX стагодзьдзе поўніцца дваранамі, пачынальнікамі беларускага нацыянальнага Адраджэньня. І яны сёньня сьведчаць перад намі, што за іхнымі часамі — гэта сярэдзіна XIX стагодзьдзя — беларускай мовай «любілі размаўляць паміж сабой старыя паны, што яшчэ жывуць». У 1868 годзе дваранін Вінцук Дунін-Марцінкевіч у сваім прывітальным вершы на прыезд Концкага, Сыракомлі і Манюшкі, гаворачы пра Сыракомлю, які паралельна з польскай ужываў у сваёй творчасьці беларускую мову, пісаў: «Другі дудар як запяе пад дудку сваячу, вось і добры пан заплача — і я зь ім заплачу». Свой пераклад «Пана Тадэвуша», «перавернутага на беларускую гаворку», як зазначыў сам Дунін-Марцінкевіч, ён ахвяраваў, кажучы ягонымі словамі, панам і простаму народу з-над Дняпра, Дзьвіны, Беразіны, Сьвіслачы, Віліі і часткова Нёмана.

Статыстыка — нудная рэч, але часамі яна бывае больш красамоўнай за слова. Чаго сёньня вельмі патрабуе беларуская гістарычная навука, а разам зь ёй і грамадзкая псыхалёгія, гэта — адпаведнай статыстыкі беларускага руху апошніх 150 гадоў. Гэта нам патрэбна, каб паглядзець, да якіх сацыяльных груп належалі тыя, што ўкладалі цэглы ў падмурак і ў сьцены нацыя-

нальнае будыніны, якую мы сёньня завём сувэрэннай Рэспублікай Беларусь. Думаю, што такая статыстыка, належна пракамэнтаваная, адчыніла-б шмат каму з нашых сучасьнікаў вочы на беларушчыну ва ўсёй яе сацыяльна-культурнай шматграннасьці, каб беларушчына для іх перастала быць лапцюжнай і мужыцкай.

Хачу тут далучыцца да закліку ўніклівага нашага філосафа Уладзіміра Конана, выказанага ў леташнім жнівеньскім нумары часопісу «Полымя»: «Давайце будзем супрацоўнічаць у адбудове Беларусі — з усімі, хто адмовіўся ад палітыкі ліквідацыі беларусаў як нацыі,— з дэмакратамі і беларускімі камуністамі, з каралямі і вялікімі князямі, зь «левымі» радыкаламі і «правымі» кансэрватарамі — з усімі, хто шчыра прызнае гістарычнае права беларускае нацыі на яе будучыню».

І памятайма, што наш маральны абавязак перад памяццю папярэднікаў, а разам з тым і прынцып добрай гаспадарлівасьці вымагаюць, каб у далейшым адбудоўваньні Беларусі выкарыстоўваліся абсалютна ўсе рэсурсы, якія гэтае будаўніцтва мацуюць і забясьпечваюць яму трывалую будучыню.

ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК

А

Абрамчык Янка 119
Абрамчык Базыль 119, 120
Абрамчык Мікола 7, 49, 70, 93, 118—130
Абрамчык Сымон 119, 121
Абрамчык Тацяна 119
Абрантовіч 97
Аглоблін А. 185
Адамовіч Алесь 259
Адамовіч Антон 280
Адзінец Антон Адварды 288, 293, 305
А-ка (ксёндз) 124
А-к. А — гл. Аўсянік Антон
Акінчыц Ф. 128
Акіншэвіч Леў 211, 225
Александровіч Міхаіл Ізаакавіч 74
Алексютовіч Мікола 335
Аляксандар (вялікі князь літоўскі) 221
Аляксандра (Даўнар-Запольская) 180
Аляксей Міхайлавіч 244
Аляксюк Паўла 201, 202
Альгерд 158, 235, 237, 248
Аляхновіч Францішак 203
Андрыянаў А. 182
Антановіч В. Б. 182
Армстронг 85
Арсеньнева Натальля 109, 132, 137
Арэшчыха Эліза (Ожэшкова) 295, 305, 313
Астрожскі (гетман) 245
Астроўскі Радаслаў 7, 67
Аўсянік Антон 201, 202, 205
Аўфрасіньня — Прадслава 32—35, 37

Б

Баброўскі П. 165
Бабчонак Павал Гарасімавіч 74
Багалій Д. 182
Багамолец Францішак 305
Багдановіч Максім 18, 48, 133, 158, 160, 206, 341
Багрым 332
Багушэвіч 195, 332
Бажэлка 165, 168
Базылевіч В. 185
Базыль — гл. Абрамчык Базыль
Байкоў Мікола 266
Баксвіс К. 300
Бандарчык Васіль 335
Бантыш Н. 160
Барашка 266
Баторы Сьцяпан 159
Баўч Сямён Ківавіч 74
Беларускі Тодар 8, 27
Берасьцейскі Апанас (Піліповіч) 237
Болтнеў Г. 60
Бона (Сфорца) 239, 240
Борыс 85
Брага Сымон 287
Брадзінскі 293
Браткоўскі Мікалай Гіпалітавіч 73
Брачыслаў 158
Буйноў М. М. 182
Будны 241, 244
Буйла Канстанцыя 103—108
Буйніцкі Тодар 306
Бэрман 75, 76
Бядуля Зьмітрок 203, 253
Бярдзяеў М. 227
Бяссонаў 339

В

Вайнтраўб Віктар 300, 302
Вайсэнгоф Юзаф 305
Ван Каўэлярт Робэрт (а. Робэрт) 95—98
Ван Страатэн Верэнфрыд 94
Ваньковіч Мэльхіёр 306
Васіленка М. 187
Верашчака Юры 154
Верашчака Марыля 289
Вінавер 320
Вітаўт 36, 221, 235, 249
Віцьбіч Юрка 100, 158
Власт — гл. Ластоўскі Вацлаў
Вобла К. 189
Вольнатс Іван Сьцяпанавіч 74
Вольф М. 192
Вруцэвіч 165

Г

Гаворскі К. 166
Гадлеўскі (ксёндз) 128
Гайдэнштайн Райнгольд 159
Галецкі Оскар 228
Галёт 240
Галубоўскі П. 182
Гаравік Я. 323
Гарбацэвіч Іван 290
Гарбацэвіч Цімахвей 290
Гарбачэўскі 71
Гародня 266
Гарошка Леў 52
Гарун Алесь (Прушынскі Аляксандар /Алесь/) 146, 199—206
Гарэцкі Максім 166, 168, 268
Гатавецкі Міхал 319, 324, 328
Гаўрылік 122
Гашчынскі Сэвэрын 304
Гедымін 235
Гетэль Фэрдынанд 310—312
Гётэ 298
Гільдэльбрант 338
Глінскі Антон Язэп 292
Глыбінны Ул. 177
Гмырак Лявон 166
Гомуліцкі 306
Гогаль 303
Грушэўскі М. 182
Грыб Тамаш 205
Грышкевіч — гл. Жук-Грышкевіч Вінцук
Гус Ян 36, 37, 249
Гэпштэйн 75, 76
Гэрадот 162

Д

Дабравольскі 164
Данілеўскі Н. 226—228
Дарашэнка Д. 184
Даўгяла 164, 168
Дашкевіч М. П. 182
Дварчанін Ігнат 247
Дворак Адам Васільевіч 72
Дзекуць-Малей Л. Н. 59
Дзяржынскі Ул. 144
Дзмітракоў 71
Дмоўскі Раман 339
Даўнар-Запольская Аляксандра 180
Даўнар-Запольская (Надзея Маркелаўна) 190, 192
Даўнар-Запольскі Мітрафан 155, 164, 165, 168, 180—192
Друцкі-Любецкі Геранім 317, 328, 338, 340
Дубоўка Ўладзімер 20, 21, 131, 133, 136, 252—263, 265, 267—273, 277, 278
Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт (Вінцук) 131, 332, 341
Дучыц Мікола 176
Дык Я. 60
Дэніс 173

Е

Езавітава Галіна 177
Езавітаў К. 177
Ельскі Аляксандар 338
Ермачэнка 67
Еўлашэўскі Тодар 239

Ж

Жук-Грышкевіч Вінцук 49, 52
Жыгімонт 221
Жыгімонт Аўгуст 222
Жыгімонт II Стары 222, 239, 245
Жыгімонт III 240
Жылінскі Фама Фаміч 74
Жылка Ўладзімер 125, 256, 257
Жылуновіч З. 281

З

Завілейскі Іван Іванавіч 73
Загурскі Ежы 306

Зайфэрт Н. (Даўнар-Запольская Надзея Маркелаўна) 190, 192
Залескі Язэп 293, 304
Зан Тамаш 288, 305
Запруднік Янка 11, 314, 333
Зарэцкі Міхась 254, 259
Затоньскі В. 190
Захарка 125—127, 129
Зофія (царэўна) 244
Зьдзяхоўскі Марыян 298, 300

І

Іван Грозны 161
Іваноў П. 182
Іваноўскі Вацлаў 194
Ігнатоўскі У. 123—127, 168
Ізяслаў 158
Існэры Ян 249
Істомін М. 187

К

Кавалюк 165, 168
Казімер (вялікі князь літоўскі) 221
Канакоцін О. 255—258, 260—262, 267, 268, 272
Канапацкі 201, 202
Кандратовіч 293
Кандрашчук 325
Карановіч 165
Каранеўскі Язэп 65, 77
Караткевіч Пётр Віктаравіч 73
Карповіч Алесь 131, 136
Карскі Яўхім 161, 168, 338, 348
Кассо 185
Касьцялоўскі Ст. 299, 309
Катон Дыямэд 240
Кацаў 71, 72
Каяловіч 166
Кветка Вітан 193, 198
Кейстут 248
Кіркор Адам 156, 166
Кісялёў А. 71—76
Кісялёў Генадзь 341
Кліменка П. 185
Кнорын 283—285
Князьнін Дыянізы 305
Колакаў 71
Колас Якуб 104, 108, 133, 144, 145
Конан Уладзімір 342
Концкі 341
Корвін-Мілеўскі 167
Крашэўскі 306
Крупніцкі Б. 180
Крупніцкі В. 185
Крыдль Манфрэд 299
Крэчэўскі Пётр 125, 126, 168
Куга 172
Кулага 208
Кулакоўскі 165
Куліковіч Мікола 235
Кунцэвічыха Марыя 306
Купала Янка 103, 104, 109, 126, 152, 172, 195, 203, 206, 263, 273—278, 333, 341
Курынны П. 185
Курц Б. 185
Кучар 109
Кушаль Францішак 199, 201
Кэрстэн 85

Л

Лагіновіч Я. 123
Лаппа І. 168, 224
Ластоўскі Вацлаў (Власт) 151—157, 168, 194, 195, 197
Лашук 49
Ленартовіч 293
Ленін 282
Леў-Сплавінскі Т. 297
Лёсік Язэп 141—151, 200, 203
Ліпінскі В. 227
Лісоўскі Канстанцін Сямёнавіч 73
Луцкевіч Антон (Антон Навіна) 59, 153, 154, 326, 327
Луцкевіч Іван 153, 157, 193—198
Луцкевічы 194, 195, 198, 341
Лучыцкі І. В. 181
Лысуха 49
Любаўскі М. 168, 221
Лявіцкая Ванда 150, 200
Лявіцкі Антон — гл. Ядвігін Ш.
Лядніцкі 316, 317, 339

М

Мазэпа 215
Максімейка 221
Максімовіч Г. 184
Малевіч Міхаіл Міхайлавіч 73
Мальдзіс Адам 341
Мальчэўскі Антон 293, 304
Мальчэўскі Яцэк 311
Манькоўскі Пётр 49, 52

Манюшка Станіслаў 289, 341
Маркс 225, 227
Масоніус 339
Масьлінскі Язэп 306
Мацкевіч Язэп 306
Мегус Г. 192
Менскі Язэп 86, 141
Мерляк 51
Мікалай II 162
Мілаш Часлаў 300, 307
Міранавіч Пётра 171—179
Мірза Авакіянц 184
Міхал Карыбут 249
Міцкевіч Адам 7, 287—297, 300—304, 307—310, 313
Мрый 254
Мурашка 266
Мядзёлка Паўліна 205
Мялешка Васіль 335
Мяндог 235

Н

Навіна Антон — гл. Луцкевіч Антон
Нагродзкі Зыгмунд 195
Надзея Маркелаўна — гл. Зайфэрт Н.
Нарушэвіч Адам 305
Наседкін 75, 76
Неманцэвіч 97
Несьцяровіч Язэп Сьцяпанавіч 72
Несялоўскі Язэп 291
Нідэрляндзкі Якуб 240
Нікан Мікола 52
Нікіфароўскі 164, 165, 167, 168, 339
Нямцэвіч Юльлян Урсын 305
Няслухоўскі Янка 167

О

О'Конар 84

П

П.— 126
Падгорскі-Аколаў Леанард 290, 306
Палонская Н. (Палонская-Васіленка) 180, 184, 189
Палуян Сяргей 195
Панкрацьеў 71
Панятоўскі Станіслаў Аўгуст 305
Паўлаў-Сільванскі 226
Пашкевіч 241
Пётр I (Пётра В.) 244, 294
Пігонь 303
Пілсудскі Язэп 200—202
Пічэта 168
Плавінская Анэля Валяр'янаўна 72
Плавінская Станіслава Валяр'янаўна 72
Полацкі Сымон 244
Поль 306
Потэлё Аскрылі 240
Праскі Геронім 36, 249
Прушынскі Аляксандар (Алесь) — гл. Гарун Алесь
Прысутны 48, 22
Путрамэнт Ежы 306
Пушча Язэп 254, 268, 272
Пшчолка А. 165, 166
Пэрэтц В. 184, 185
Пясецкі Сяргей 306

Р

Равенскі Мікола 131—133, 135—137, 139, 140
Рагнеда 158
Радзевічанка Марыя 305
Радзівіл 240
Радзівіл Магдалена 341
Рак-Міхайлоўскі Сымон 201
Раманавы 314
Раманаў 164, 165, 167, 168, 170, 338
Родзевіч Леанід 123
Роп Адварды 320—322, 325, 328, 339
Рудзь Тацяна 119
Рудзь Юзя 120
Русаў А. 186, 187
Руткоўскі Аляксандар Сямёнавіч 73
Рыдлеўскі Лявон 52, 118
Рымша 241

С

Сабалеўскі 67
Сакалоўская Т. 187
Саковіч А. 180, 181, 191
Салавей Алесь 177
Саланевіч 165, 168
Самойлавіч 215
Сангайла Анатоль 318, 328, 339

Санд Жорж 307
Сапега 240
Сапега Леў 121
Сапуноў Аляксей 158, 159, 161—170, 338—340
Сапуноў Пархвен 158
Сахараў Сяргей 177
Сержпутоўскі 261, 263, 265, 267
Скарына Францішак 58, 59, 160, 241, 242, 244
Скірмунт Раман 327, 328, 338—340
Склют Р. 252
Слосканс 95, 97
Слуцкі 240
Смітс 85
Смэтэрс 85
Спарыгін Барыс Вячаслававіч 74
Смірноў П. 184, 187
Сталін 76, 107
Сталыпін 167
Станкевіч Станіслаў 61, 103, 309
Станкевіч Янка 121, 152
Стасэн Г. 84
Сташэўскі Е. 184
Стаяноўскі 76
Струтыжынскі 121
Стуарт Дж. Ф. 84
Стукаліч 164, 165, 168, 169
Сурвіла Янка 49, 51
Сымон — гл. Абрамчык Сымон
Сыракомля Уладзіслаў (Кандратовіч Людзьвік) 298—300, 305, 313, 341
Сыцін 189
Сыч Пётра 139
Сьнітка 119
Сьпічонак 49
Сядура Ўладзімер 171
Сяргей (япіскап) 49, 52

Т

Талстой Леў 145, 183
Тальбэрг 187
Тамашчык Ул. 49, 52
Тамашэўскі С. 227
Тарашкевіч Браніслаў Адамавіч 74
Тойнбі А. 227
Трасун Франц 318
Тумаш В. 60
Турук 168
Тыссэран 98
Тэраўскі 203

У

Уладыслаў Казімеравіч 249
Уласаў Аляксандар 194, 195, 341
Умястоўскі Францішак 202

Ф

Фартынскі І. І. 182
Фрунзэ (Міхайлаў) 281, 282

Х

Хадкевіч (гетман) 240
Хмяльніцкі Багдан 232
Ходзька Аляксандар 288, 305
Ходзька Ігнат 305
Храптовіч-Буценеева 182

Ц

Церашковіч Павел 340
Цётка А. 103, 193, 194
Цьвікевіч А. 168
Цяпінскі Васіль 58, 244

Ч

Чапскі 209
Чарвякоў Аляксандар (Чарвяк) 285
Чарнышэвіч Фларыян 306
Чарняўскі Францішак 52
Чаховіч Юзэф 306
Чачот Ян 193, 288, 289, 305
Чыж А. 195

Ш

Ш. 128
Шкялёнак М. 128
Шлюбскі 164
Шраг 322
Шчаглавітаў 188
Шчарбакоў В. 168, 283, 285
Шчарбатаў Г. 104
Шчарбіна В. 187
Шыманец Уладзімер 49, 52
Шэвудскі Генрык 305
Шэйн 339

Э

Эліясь 172
Энгельс 225, 227
Эссон А. 207

Я

Ягайла 235, 237, 238, 248
Ягода 75
Ядвігін Ш. (Лявіцкі Антон) 154, 195, 200
Яжоў 75
Якубецкі 201
Якубовіч Сямён Міхайлавіч 74
Якубоўскі 201
Ялавецкі 319, 339
Янушэўскі Павел Адамавіч 73
Ярка 109
Ясь 323
Ясько Д. 57

ЗЬМЕСТ

Янка Запруднік. Уводнае слова 6

БАЦЬКАЎШЧЫНА ЗДАЛЁК

Бацькаўшчына 11
Дэклярацыя Рады БНР 15
БНР жыве — жыве БНР! 17
Вітаючы зьезд 22

Тодар Беларускі

Нашая прамова на Агульным зьезьдзе Задзіночаных Нацыяў 27
Сьвятая праца 32
І. К-к. Канстанца 36
Сплачвайма наш доўг! 40
У вялікую гадавіну 44

Прысутны

Першы Сусьветны зьезд беларускае эміграцыі 48
Зварот Першага Сусьветнага зьезду беларускае эміграцыі да беларусаў і беларусак ува ўсім сьвеце . . . 53
Рэзалюцыя Першага Сусьветнага зьезду беларускае эміграцыі 56

Д. Ясько

Новы Запавет у беларускай мове 58

Станіслаў Станкевіч

У новых краёх — новыя заданьні 61

Язэп Каранеўскі

Распачынаючы новы этап... 65
Крывавы зьдзек над беларускім народам 70

Язэп Каранеўскі

Чаму нас не разумее Захад? 77

Язэп Менскі

На загад нацыі 86
Да беларускай эміграцыі 92

Аб Беларусі на Міжнародным касьцельным кангрэсе «Касьцёл у бядзе» 94
Юрка Віцьбіч
Мы дойдзем! 100

ПОСТАЦІ

Станіслаў Станкевіч
Сны «аб вясьне прыгожай і далёкай». Канстанцыя Буйла — новая ахвяра бальшавіцкае крытыкі 103
Натальля Арсеньнева
У казахстанскай ссылцы 109
Лявон Рыдлеўскі
З жыцьця й дзейнасьці М. Абрамчыка 118
Алесь Карповіч
Мікола Равенскі 131
Алесь Карповіч
Памяці Міколы Равенскага 136
Пётра Сыч
Замоўкла ліра 139
Язэп Менскі
Язэп Лёсік 141
Янка Станкевіч
Вацлаў Ластоўскі 152
Юрка Віцьбіч
У пошуках Альгердавага Шляху 158
Уладзімер Сядура
Пётра Міранович 171
Н. Палонская-Васіленка
Даўнар-Запольскі 180
Кветка Віган
«Наша Ніва» і Іван Луцкевіч 193
Францішак Кушаль
Сорак два гады таму (Жменя ўспамінаў аб Алесю Гаруну) 199
А. Эссон
Мае ўспаміны аб Алесю Прушынскім 207

БУДУЧЫНЯ Ў МІНУЎШЧЫНЕ

Леў Акіншэвіч
Парлямэнт беларускай зямлі 211
Леў Акіншэвіч
Пра «цывілізацыйныя асновы» беларускага гістарычнага працэсу 225
Мікола Куліковіч
Беларуская музыка. Залатая пара (XIV—XVII стст.) 235

Ігнат Дварчанін
Беларусы на Праскім універсытэце 247
Р. Склют
Зь «яснай явы» — у «ночнае царства» 252
Антон Адамовіч
Заходняфронтаўскі бальшавізм і беларускі нацыянальны рух. *Пераклаў з расейскай Уладзімер Арлоў* 280
Сымон Брага
Міцкевіч і беларуская плынь польскае літаратуры 287
Янка Запруднік
Справа аўтаноміі Беларусі ў Першай Думе і «Наша Ніва» 314
Янка Запруднік
Дваранства і беларуская мова. Да праблемы «Асновы беларускага сьветапогляду» 333
Імянны паказальнік 343

З-11 З гісторыяй на «Вы»: Артыкулы, дакументы, успаміны / Уклад. і ўводнае слова Я. Запрудніка.— Мн.: Маст. літ., 1994.— 347 с.: [8] л. іл.

ISBN 5-340-01322-7.

Кнігу склалі артыкулы вядомых літаратараў, публіцыстаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў беларускага замежжа. Чытача чакае знаёмства з гісторыяй эміграцыі, яе палітычнымі і духоўнымі лідэрамі. Успаміны і нарысы замежных суродзічаў дадаюць шмат новага да партрэтаў выдатных дзеячоў беларускага адраджэння — Івана Луцкевіча, Алеся Гаруна, Вацлава Ластоўскага, Язэпа Лёсіка. Сярод аўтараў зборніка — Наталля Арсеннева, Юрка Віцьбіч, Янка Станкевіч, Янка Запруднік.

Магчыма, у артыкулах і дакументах, змешчаных у зборніку, выказваюцца не зусім звыклыя для нашага чытача думкі і ацэнкі, але, спадзяёмся, ведаць іх карысна кожнаму, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

З 3250200000—094 / М 302(03)—94 — 134—94

ББК 63.3(4Беи)62

Літаратурна-мастацкае выданне

З ГІСТОРЫЯЙ НА «ВЫ»

Артыкулы, дакументы, успаміны

Укладальнік *Запруднік Янка*

Рэдактар У. А. Арлоў
Мастак П. М. Драчоў
Мастацкі рэдактар А. М. Малышава
Тэхнічны рэдактар Г. Г. Федарук
Карэктар І. М. Паланейчык

Здадзена ў набор 28.05.93. Падп. да друку 01.06.94. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура школьн. Высокі друк. Ум. друк. арк. 18,48 + 0,84 укл. Ум. фарб.-адб. 19,74. Ул.-выд. арк. 17,70. Тыраж 6000 экз. Зак. 300.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

ТОДАР БЕЛАРУСКІ
Нашая прамова
на Агульным зьезьдзе
Задзіночаных Нацыяў

ПРЫСУТНЫ
Першы Сусьветны зьезд
беларускае эміграцыі

Д. ЯСЬКО
Новы Запавет
у беларускай мове

СТАНІСЛАЎ СТАНКЕВІЧ
У новых краёх —
новыя заданьні

ЯЗЭП КАРАНЕЎСКІ
Распачынаючы
новы этап

ЯЗЭП КАРАНЕЎСКІ
Чаму нас не разумее
Захад?

ЯЗЭП МЕНСКІ
На загад нацыі

ЮРКА ВІЦЬБІЧ
Мы дойдзем!

СТАНІСЛАЎ СТАНКЕВІЧ
Сны «аб вясьне
прыгожай і далёкай».
Канстанцыя Буйла —
новая ахвяра
бальшавіцкай крытыкі

НАТАЛЬЛЯ
АРСЕНЬНЕВА
У казахстанскай ссылцы

ЛЯВОН РЫДЛЕЎСКІ
З жыцьця й дзейнасьці
М. Абрамчыка

АЛЕСЬ КАРПОВІЧ
Мікола Равенскі

АЛЕСЬ КАРПОВІЧ
Памяці
Міколы Равенскага

ПЕТРА СЫЧ
Замоўкла ліра

ЯЗЭП МЕНСКІ
Язэп Лёсік

ЯНКА СТАНКЕВІЧ
Вацлаў Ластоўскі

ЮРКА ВІЦЬБІЧ
У пошуках
Альгердавага шляху

УЛАДЗІМЕР СЯДУРА
Пётра Мірановіч

Н. ПАЛОНСКАЯ-
ВАСІЛЕНКА
Даўнар-Запольскі

КВЕТКА ВІТАН
«Наша Ніва»
і Іван Луцкевіч

ФРАНЦІШАК КУШАЛЬ
Сорак два гады таму

А. ЭССОН
Мае ўспаміны
аб Алесю Прушынскім

ЛЕЎ АКІНШЭВІЧ
Парлямэнт
беларускай зямлі

ЛЕЎ АКІНШЭВІЧ
Пра «цывілізацыйныя
асновы» беларускага
гістарычнага працэсу

МІКОЛА КУЛІКОВІЧ
Беларуская музыка

ІГНАТ ДВАРЧАНІН
Беларусы
на Праскім Унівэрсытэце

Р. СКЛЮТ
Зь «яснай явы» —
у «ночнае царства»

АНТОН АДАМОВІЧ
Заходняфронтаўскі
бальшавізм і беларускі
нацыянальны рух

СЫМОН БРАГА
Міцкевіч
і беларуская плынь
польскае літаратуры

ЯНКА ЗАПРУДНІК
Справа
аўтаноміі Беларусі
ў Першай Думе
і «Наша Ніва»

ЯНКА ЗАПРУДНІК
Дваранства
і беларуская мова

З ГІСТОРЫЯЙ НА «ВЫ»